С3-3 (Мбеи)
П15

ПАМЯЦЬ



ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ПАМЯЦЬ

СЕННЕНСКІ РАЁН

Мінск
ПК "Паліграфафармленне"
2003

УДК 947.6
ББК 63.3(4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Ул. С. БОГАЎ, А. І. ЗАЛЕСКІ, Б. В. УЛЬЯНКА, С. В. ШАЙКО.

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

С. В. ШАЙКО (старшыня камісіі), А. І. ЗАЛЕСКІ (намеснік старшыні), А. М. ЖУДРО, В. А. ЗЛОТКА, І. Е. ЛАЗУКА, Ул. Р. СКАПА.

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:

Б. В. УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), Ул. І. ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар), М. З. БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р. А. ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар).

УКЛАДАЛЬНІК

С. В. ШАЙКО.

МАСТАК

Э. Э. ЖАКЕВІЧ.

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА.

ISBN 985-6351-18-9

© ПК “ПАЛІГРАФАФАРМЛЕННЕ”, 2003

Вас сустракае горад Сянно.

Каля XI тысячагоддзя да н. э. Першыя пасяленні людзей на тэрыторыі Сенненшчыны.

VI. ст. да н. э. Першыя гарадзішчы на тэрыторыі раёна (вёскі Ганчарова, Замошша, Новае Сяло, Машчоны).

Канец V—пачатак VI стагоддзяў. Засяленне Сенненшчыны крывічамі.

Канец XIII ст. Сенненшчына ў складзе Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ).

Памятны знак на месцы дома Машэравых каля в. Шыркі.

1442 г. Першае пісьмовае ўпамінанне пра Сянно.

1566 г. Сянно згадваецца ў апісанні граніц Віцебскага ваяводства.

1569 г. Уваходжанне Сенненшчыны ў склад Рэчы Паспалітай.

1609 г. У Сянне пабудаваны касцёл ордэна францысканцаў.

Спакойная плынь Абалянкі.

1772 г. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай тэрыторыя сучаснага Сенненскага раёна ўвайшла ў склад Расійскай імперыі.

1773 г. Сянно атрымала статус горада Аршанскай правінцыі. Затым стаў цэнтрам павета Магілёўскай губерні.

16 жніўня 1781 г. Зацверджаны герб г. Сянно.

1812 г. Сенненскі павет спустошаны ў час вайны Расіі з Напалеонам.

Маўклівы сведка тысячагоддзяў. Чортаў камень каля в. Вароніна.

1840 г. Каля в. Паграбёнка пабудавана паштовая станцыя.

1862 г. Адкрыта першае народнае вучылішча ў в. Расна.

1864 г. Заснавана Сенненскае прыходскае вучылішча.

1865 г. Адкрыта Сенненскае павятовае 2-класнае вучылішча.

Лясное возера Леванова.

1867 г. Пабудавана Мікалаеўская саборная царква.

1898 г. Пачала працаваць вінакурня (зараз Багушэўскі спіртзавод) у в. Янова.

1903 г. Заснавана Сенненскае жаночае прыходскае вучылішча.

1903—1904 гг. Іван Дамінікавіч Луцэвіч (Янка Купала) служыў у маёнтку Беліца.

Сучасная в. Машканы з вышыні птушынага палёту.

1905 г. На Сенненшчыне адбыліся сялянскія выступленні.

1907 г. Выйшла кніжка К. Ц. Апікіевіча "Сенненский уезд Могилевской губернии".

2(15) студзеня 1908 г. У в. Маўчаны нарадзіўся беларускі скульптар З. І. Азгур.

19 жніўня 1910 г. У г. Сянно нарадзіўся беларускі паэт Алесь Жаўрук.

Музей Машканскай сярэдняй школы

1914 г. Антываенныя выступленні ў Сенненскім павеце.

27 лютага 1915 г. У в. Машканы парадзіўся Герой Савецкага Саюза А. К. Гаравец.

Сакавік 1917 г. Стварэнне Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Лістапад 1917 г. У г. Сянно ўстаноўлена Савецкая ўлада.



Крыніца Каплічка ў г. Сянно.

26 лютага 1918 г. У в. Шыркі нарадзіўся Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы П. М. Машэраў.

27 лютага 1918 г. У г. Сянно адбыўся першы павятовы з'езд Саветаў сельскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

1 мая 1918 г. У г. Сянно выйшаў першы нумар газеты "Известия Исполкома".

Жнівень 1918 г. Падаўленне леваэсэраўскага мецяжу.

Дачны пасёлак на беразе Тухінскага возера.

З 1919 г. Сянно ў складзе Віцебскай губерні РСФСР.

17 ліпеня 1924 г. Створаны Сенненскі раён у складзе Віцебскай акругі.

1924—1926 гг. Праз Сенненскі раён пракладзена чыгунка Орша—Лепель.

27 снежня 1923 г. У в. Машканы нарадзіўся беларускі паэт Анатоль Вялюгін.

Фальклорны ансамбль "Вечарынка".

1924 г. Багушэўск становіцца мястэчкам Аршанскай акругі.

1930 г. У г. Сянно пабудавана першая электрастанцыя.

1932 г. У г. Сянно пачаў працаваць ільнозавод.

1934 г. Сенненскаму раёну прысуджаны Чырвоны сцяг Наркамзема СССР за перавыкананне плана продажу льнопрадукцыі.

Сенненскі раённы краязнаўчы музей.

6—10 ліпеня 1941 г. На тэрыторыі раёна адбылася адна з буйнейшых танкавых бітваў пачатку Вялікай Айчыннай вайны (Лепельскі контрудар 20-й арміі).

10 ліпеня 1941 г.—25 чэрвеня 1944 г. Акупацыя раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Красавік 1943 г. Пачаў дзейнічаць Сенненскі падпольны райком КП(б)Б.

Ліпень 1941 г. Пачаў дзейнічаць Багушэўскі падпольны райком КП(б)Б.

Панарама г. Сянно.

24 і 25 чэрвеня 1944 г. Чырвоная Армія ва ўзаемадзеянні з партызанамі вызваліла Багушэўск і Сянно ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

20 студзеня 1960 г. У склад Сенненскага раёна ўвайшла большая частка Багушэўскага раёна разам з Багушэўскам.

1969 г. Пачаў дзейнічаць Сенненскі завод сухога абястлушчанага малака.

1977 г. Сенненскаму раёну ўручаны пераходны Чырвоны Сцяг Савета Міністраў СССР і ВЦСПС за дасягненне лепшых вынікаў у вытворчасці і продажы дзяржаве льнопрадукцыі.

1981 г. Саўгасу "Машканы" прысвоена імя П. М. Машэрава.

Жнівень 1996 г. Адкрыты Сенненскі раённы краязнаўчы музей.

ДА ЧЫТАЧА

Памяць народа... Без яе людзі трацяць свае гістарычныя карані, мову, культуру, нацыянальную свядомасць. Толькі гістарычная памяць вызначае месца народа ў агульным працэсе развіцця ўсяго чалавецтва, дапамагае знайсці сілы для пераадолення перашкод на шляху да лепшай долі.

Археалагічныя раскопкі даюць магчымасць прасачыць гісторыю насельнікаў гэтай зямлі, развіццё іх матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Першыя людзі з'явіліся тут каля 11—13 тысяч гадоў таму. Паслядоўна праходзілі эпохі: першабытнаабшчынны лад, феадалізм, зараджэнне капіталізму. Адбыліся рэвалюцыйныя пераўтварэнні пачатку XX стагоддзя. Нябачных поспехаў дасягнуў азёрны край у перадваенны час і ў перыяд аднаўлення гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Шмат варожых нашэсцяў зведаў наш край у даўнія часы, неаднойчы, нібы легендарная птушка Фенікс, паўставаў ён з папялішчаў. Зямля, на якой мы сёння жывём, паліта крывёю і потам нашых продкаў. Кожны раз адраджалася Сенненшчына, адбудоўваліся і прыгажэлі яе вёскі, зарубцоўваліся раны, пакінутыя ваенным ліхалеццем.

Асабліва цяжкія выпрабаванні выпалі на долю жыхароў раёна, як і ўсяго беларускага народа, у Вялікую Айчынную вайну 1941—1945 гадоў. Вялікія матэрыяльныя і духоўныя страты панесла Сенненшчына. Загінула шмат нашых землякоў. Разбуранае можна аднавіць, адбудаваць, людскія ж страты — незваротныя. Гартаючы старонкі кнігі, нашы чытачы змогуць яшчэ раз асэнсаваць гістарычны лёс краю, светлыя і драматычныя старонкі гэтага лёсу.

Гордасць нашай зямлі — яе людзі. На Сенненшчыне нарадзіліся Героі Савецкага Саюза А. К. Гаравец, С. А. Каваленка, І. І. Камінскі, А. Дз. Мацюшаў, П. М. Машэраў (таксама Герой Сацыялістычнай Працы), А. Ф. Пятаковіч, І. Г. Тамашэўскі. У мірны час сталі Героямі Сацыялістычнай Працы нашы землякі П. Л. Бабак, З. І. Баркоўскі, М. А. Лісецкі, І. Р. Паўлоўскі, А. Дз. Сарокіна, Л. Е. Сіроткіна. З нашага краю выйшлі генералы Савецкай Арміі У. М. Каваленка, І. С. Касабуцкі, А. Х. Кузняцоў, Ф. З. Лазарэвіч, Б. Д. Супран, С. І. Сурын, Б. Л. Юроўскі і інш.

Нямала сярод нашых землякоў славутых вучоных, творцаў, заслужаных людзей самых розных прафесій, якія вядомы на Беларусі і ў іншых краінах. За сумленную працу ордэнамі і медалямі ўзнагароджаны сотні жыхароў Сенненшчыны. Расказы аб іх змешчаны ў кнізе.

Значнае месца адведзена ў выданні матэрыяльнай і духоўнай спадчыне, гісторыі населеных пунктаў.

Кніга стваралася вялікім калектывам гісторыкаў і краязнаўцаў, літаратараў, журналістаў і навукоўцаў на падставе дакументаў, успамінаў, навуковых даследаванняў. У ёй выкарыстаны дакументы Нацыянальнага і Нацыянальнага гістарычнага архіваў Рэспублікі Беларусь, Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва, Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, матэрыялы з Сенненскага краязнаўчага музея, школьных музеяў раёна, успаміны ўдзельнікаў падзей, што адбываліся на тэрыторыі раёна. Гэта дазволіла ўзнавіць многія старонкі гісторыі Сенненшчыны, а галоўнае — удакладніць і надрукаваць спісы загінуўшых землякоў — мірных жыхароў, воінаў Чырвонай Арміі і партызан, тых, хто аддаў жыццё пры вызваленні раёна. Не забыты і імёны нашых землякоў, якія, выконваючы свой салдацкі доўг, прайшлі дарогамі вайны ў Афганістане.

Няхай гэтая хроніка стане своеасаблівым помнікам гераічным справам былых і цяперашніх пакаленняў, крыніцай для вывучэння роднага краю.

СЕННЕНСКІ РАЁН



СЕННЕНСКІ РАЁН размешчаны на паўднёвым усходзе Віцебскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 1964 кв. км, насельніцтва 34400 чалавек (2002). Цэнтр раёна — г. Сянно, 9 тыс. чалавек (2002). Раён мяжуе з Віцебскім, Лёзненскім, Аршанскім, Талачынскім, Чашніцкім, Бешанковіцкім раёнамі.

У складзе раёна г. п. Багушэўск (3,7 тыс. чалавек), 334 сельскія населеныя пункты. Раён падзяляецца на Багушэўскі пасялковы і 12 сельскіх саветаў — Алексініцкі, Багданаўскі, Багушэўскі, Беліцкі, Какоўчынскі, Машканскі, Нямойтаўскі, Обальскі, Расненскі, Студзёнкаўскі, Ульянавіцкі, Ходцаўскі.

Працягласць тэрыторыі раёна з поўначы на поўдзень — 42 км, з захаду на ўсход — каля 70 км. Паверхневы рэльеф пераважна раўнінны, на паўночным захадзе Чашніцкая раўніна, на поўдні адгор'і Аршанскага ўзвышша. Па тэрыторыі раёна цякуць 27 рэк і ручаёў працягласцю каля 300 км, найбольшая з іх — Абалянка. Вялікія азёры — Сянно, Бярозаўскае, Кічына, Серакаротня. Карысныя выкапні: торф, гліна і суглінкі, будаўнічы пясок і пясочна-жвіравы матэрыял. Сярэдняя тэмпература студзеня — -7,5°С, ліпеня — 17,8°С. Ападкаў выпадае 592 мм за год. Вегетатыўны перыяд 185 дзён. Пад лясамі 42% тэрыторыі. Лясы мяшаныя, пераважна хваёвыя. Глебы ў асноўным дзярнова-падзолістыя, дзярнова-падзолістыя забалочаныя, тарфяна-балотныя. У раёне 14 сельгаскааператываў, 5 сельгаспрадрыемстваў, Віцебская эксперыментальная гаспадарка; 8 прамысловых прадпрыемстваў; 16 сярэдніх, 9 базавых, 10 пачатковых школ, школа-інтэрнат, санаторна-аздараўленчая школа, дзіцячая спартыўная школа; 2 дзіцячыя школы мастацтваў, 1 сельская музычная школа, 12 дамоў культуры, 25 клубаў, 45 бібліятэк, Дом рамёстваў, музей, карцінная галерэя У. К. Гоманава; 5 бальніц, 2 раённыя паліклінікі, 3 амбулаторыі, 23 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгункі Віцебск—Орша, Орша—Лепель, аўтадарогі на Віцебск, Оршу, Бешанковічы, Талачын, Чашнікі, нафтаправод "Дружба". З 1918 г. выдаецца раённая газета "Голас Сенненшчыны".

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

ГОРАД СЯННО

Прыгарадныя пасёлкі Дружба, Труд, школы-інтэрната.

Алексініцкі сельсавет: вёскі Адамава, Алексінічы, Алёхнава, Аўсеева, Барок, Заслонава, Застадолле, Зямковічы, Каменка, Кімейка, Курэйшына, Леснікова, Луг, Мацкава, Папіна, Папінка, Тур'ева, Утрылава, Шынкава, Шыпы.

Багданаўскі сельсавет: вёскі Багданава, Броўкі, Вялікае Сяло, Галоўск, Гарадзец, Гарывец, Запруддзе, Канева, Капланы, Каралевічы, Лугінавічы, Лук'янава, Малішы, Міхалполле, Падворьца, Пожанькі, Поўзікі, Свабодная, Свечы, Турава, Тухінка, Чырвоная Лука, Чырвоны Прамень, Шашалы, пасёлак Пожанькі.

БАГУШЭЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ: Г. П. БАГУШЭЎСК

Багушэўскі сельсавет: вёскі Александрова, Александрыя, Андрэеўшчына, Астапенкі, Бугаі, Вакары, Варашылы, Галашчакіна, Града, Добрына, Заазер'е, Заветнае, Засценак, Казакі, Калянькі, Кічына, Колпіна, Куляшы, Луг, Лукты, Лучазарнае, Магілёўка, Мяшкі, Навасёлкі, Навязкі, Паграбёнка, Пасад, Пастушкі, Песачанка, Платоны, Рабцава, Роднае Сяло, Рыбнае, Рэчкі, Ског, Філёва, Фурманы; Цыпкі, Цясы, Шчытоўка, Шылы, Шыркі, Яноўшчына, база адпачынку "Віцязь".

Беліцкі сельсавет: вёскі Апечкі, Асінаўка, Атраднае, Бурбін, Відокі, Вялікая Пярэспа, Глебаўск, Заполле, Каралі, Лапатнікі, Малая Беліца, Малая Пярэспа, Манголія, Маргойцы, Мянюцева, Мяшчэнцы, Новая Беліца, Нярэйша, Оўсішча, Полымя, Рулёўшчына, Рэчкі, Станюкі, Старая Беліца, Чараўкі, Чырвонае Сяло.

Какоўчынскі сельсавет: вёскі Балбасава, Бортнікі, Буда, Бяленева, Выгада, Вялікае Сяло, Германава, Града, Грузды, Даганаўка, Жохава, Забараўе, Заважанне, Зубава, Івашкава, Какоўчына, Калантаёва, Канашэва, Крупяжына, Кулікі, Ледневічы, Ліплянск, Літусава, Лясная Паляна, Майская, Міхнава, Міцюкова, Мішукова, Някрашава, Нярэйша, Пашкава, Пількавічы, Пляцы, Прыхабы, Рошчына, Рындзева, Савецкая, Студзянец, Стэцава, Ударная, Харэўшчына, Ходасы, Шуплякі, Шчытнікі, Шыркаўшчына, Шэметаўка, Янова.

Машканскі сельсавет: вёскі Бікава, Бялькі, Госмірава, Задарожжа, Застадолле, Масоры, Машканы, Обаль, Парнева, Рамшына.

Нямойтаўскі сельсавет: вёскі Аляксандраўская, Баравікі, Баяршчына, Будзішча, Буй, Галавачы, Дамашэва, Дварэц, Дубаўцы, Забор'е, Казлоўка, Крыльцова, Ладзікава, Марозаўка, Нямойта, Папоўка, Парэчча, Ракаў Засценак, Расходна, Розмыслава, Сукрэмна, Хамінічы, Ціміразева.

Обальскі сельсавет: вёскі Дубаўцы, Замошша, Кадукова, Казлы, Канстантова, Карчэўшчына, Кругляны, Марцінаўка, Масяйкі, Обаль, Раманаўка, Рудкоўшчына, Слабада, Станькі, Стрыгі, Углы, Ходараўка, Цеплякі, Чудня, Ярошкі.

Расненскі сельсавет: вёскі Андрэйчыкі, Бабаедава, Багданава, Будна, Вароніна, Васількова, Вейна, Кажамякі, Камарова, Клімавічы, Кузьміно, Мажулева, Пацкава, Першамайская, Пурплева, Рай, Расна, Серкуці, Сычэва, Сякірына, Цясішча, Чуцькі.

Студзёнкаўскі сельсавет: вёскі Александрова, Аўчынкава, Бор, Буйнічкава, Бярозкі, Валодзькі, Вітунь, Града, Гуліна, Заазер'е, Івоні, Кавалі, Копцы, Келісы, Кляпчэва, Лазоўка, Машкі, Новае Сяло, Падграддзе, Пальчыкі, Пустынкі, Пушкары, Рассвет, Савінічы, Сінягорская, Студзёнка, Хамёнкі, Целяшоўшчына, Цыганкі, Яхімаўшчына.

Ульянавіцкі сельсавет: вёскі Асінаўка, Вялікі Азярэцк, Гарнакі, Горы, Дольдзева, Дубнякі, Заазер'е, Замашанская, Замошша, Каміншчына, Кішуроўшчына, Латыгаль, Леснікі, Малы Азярэцк, Малыя Ульянавічы, Мар'янова, Новае Сяло, Партызаны, Прыветак, Рудніца, Сіманаўка, Смалоўка, Сяргейкі, Уздорнікі, Ульянавічы, Шалухі.

Ходцаўскі сельсавет: вёскі Арляны, Асінаўка, Астроўшчына, Белая Ліпа, Беляі, Берашова, Бесцвіна, Войлева, Гарнова, Горныя Ходцы, Дабраполле, Дубкі, Жарцы, Заазер'е, Закратунне, Кавалькі, Карпавічы, Ладынец, Лазова, Латыгава, Ліпна, Машчоны, Мелехава, Навасёлкі, Паршні, Паўлавічы, Перакопава, Рабцы, Рубежніца, Садовая, Самсоны, Сапегі, Слабодка, Соіна, Сычыкі, Тыльцы, Ходцы, Шацяні, Якубова.

Населеныя пункты раёна, якія зараз не існуюць

Алексініцкі сельсавет: вёскі Мастычына, Папін Выселак, Папіна Слабада, Філонава; хутары Азер'е, Анеліна, Брунькі, Дзярожычына, Касцёлава, Кубічына, Купаваць, Лапцева, Леванава, Луг, Міхайлава, Новае Круцькава, Нямейкава, Обаль, Паддуб'е, Пясок, Скрабіна,

Старое Круцькава, Старыя Брады, Тур'ева, Трыполле, Узгор'е, Ферма, Шумкі, Шчамілаўка, Юзафова, Юзэфаполле.

Багданаўскі сельсавет: вёскі Абалонне, Камер-Бор, Кордава, Крывіна, Крыўнікі, Пераброды, Роспаш, Русінава, Скрынішча, Сяброўнка, Фольварак, Шубкі; хутары Бараны, Канева, Клявец, Куклы, Курэнь, Новая Ніва, Петухоўшчына, Пожанькі, Сучча.

Багушэўскі сельсавет: вёскі Апорчанкі, Барсукі, Верхняя Александрыя, Вускоўе, Выгар, Гайдукі, Гута, Капелішча, Каралёўшчына, Каўрыжкі, Кедзіна, Косарава, Косы, Кузьмы, Ланды, Ліпкі, Літоўскі Бор, Мастакі, Ніжняя Александрыя, Новая Паграбёнка, Пецькі, Піскавацік, Рабыя, Радчыны, Сабалі, Туркаўка, Храмейкава, Яромы; хутары Бурдзялі, Заазер'е, Цыпкаўскі Млын; станцыя Паграбёнка.

Беліцкі сельсавет: вёскі Бачарова, Гарбуны, Даргейкі, Дубкі, Дубняк, Загарода, Зара, Зарэкі, Леснічоўка, Новы Трудавік, Пашчынкі, Прудзіны, Пустаселле, Сінянка, Станькава, Старожка, Старое Заполле, Старынка, Філатава, Чысцік, Шылькі, Юркевічы; хутары Відокі, Зыбалаўка, Нярэйша.

Какоўчынскі сельсавет: вёскі Антаколле, Ануфрыенкі, Барэйшына, Браніслававa, Буглаі, Бураўцы, Гаўрылкава, Гаручкі, Добрынка, Дубкі, Заазер'е, Заважанне-2, Заважанне-3, Зуі, Карпавічы, Ліпка, Лісы, Лунішча, Ляды, Лясная Старожка, Марозаўка, Ніжняе Рындзева, Падсаддзе, Паўлышкава, Пікава, Пількавічы Вялікія, Пількавічы Малыя, Пунішча, Рукалева, Селіханаўшчына, Сідорнічы, Сітцы, Стаселькі, Ступенькі, Трухаўшчына, Чырвонае Забараўе, Шаўлі, Юркава, Ярошкі; засценак Грузды; хутары Гаручкі, Глінішча, Добрынка, Заазер'е, Звягі, Какоўчына, Ледневічы, Някрашава, Падгусава, Падмошша, Селіханаўшчына, Сіманаўшчына, Стаселькі.

Машканскі сельсавет: вёскі Абісінія, Абрамаўшчына, Бабовішча, Бабінцы, Балонне, Берасні, Благія, Буева, Бутоны, Віхры, Вялікае Рамшына, Гарадзішча, Гараўцы, Гаручкі, Дубрава, Забалацце, Забор'е, Загацце, Зарэшчына, Іванаўка, Калюціна, Кірэева, Ляхаўшчына, Маўчаны, Мінуўшчына, Піліпцы, Плентаўка, Сангрэтаўшчына, Старакоўшчына, Студзёнка, Студзянец, Цагельня, Шафранішчына, Юганава; хутары Абрэзкава, Апіянаўка, Выгарка, Гаёк, Гарэлая, Грыбы, Дворня, Заднія, Крутаніца, Кручэўе, Крывыя Часткі, Маецішча, Пабойня, Падалешчына, Пад'яблыняй, Саўкін Узмежак, Сітаўка, Талоўка, Таросы, Чырвоная Гара, Чырвоны, Шашкі.

Нямойтаўскі сельсавет: вёскі Вялікі Мяжнік, Гатоўшчына, Кублішчанка, Малы Мяжнік, Масцішча, Прудзнікі, Размяслова, Ракі, Сасноўка, Спіцы, Стукалава, Чартова, Чырвоны Араты; хутары Беразуха, Васількова, Круча, Крыльцова, Петраград.

Обальскі сельсавет: вёскі Гаравыя, Дабрынка, Дубрава, Жукаўшчына, Заручэўе, Казачы Ручай, Капнішча, Касавец, Мікалаева, Навіны, Палядкі, Пуцішча, Пятрова, Узрэчча, Узрэчча-1, Ульянава, Хадзюшынкі, Ціханаўка; хутар Баган.

Расненскі сельсавет: вёскі Бакунова, Дземяхі, Загаранькі, Красноўшчына, Кузьмінка, Лісіныя Норы, Ляўкова, Мачулішча, Сываратка, Тупічына; хутары Багданава, Вейна, Гарадок, Клімавічы, Кузьміно, Сякірына, Цярнюкі.

Студзёнкаўскі сельсавет: вёскі Аксёнаўшчына, Ананьева, Андрэева, Багаі, Бондарава, Бубалы, Васількова, Гараватка, Дзіхманава, Забеліна, Заглажава, Зайкі, Заполле, Лазараўшчына, Латышоўка, Лісічына, Лугаўцы, Лядзіна, Матарэйшына, Новае Забеліна, Новы Двор, Носікава, Пішчуры, Прудок, Пушча, Ракіты, Рыпанава, Сахны, Сашанава, Семяніца, Слузыня, Соіна, Стар, Цароўшчына, Цеалінава, Шафраны, Шубкі, Шэбіна, Ямачкі, Яромы; хутары Алькоўка, Бычок, Жардукова, Замошша, Копцы, Чырвоны Бычок, Янкаў.

Ульянавіцкі сельсавет: вёскі Азярышча, Арцюшэўшчына, Барок, Бірацінa, Вядзец, Ганчарова, Казінец, Каменікі, Каменка 1-я, Каменка 2-я, Касцялішча, Лазовічы, Ліпкі, Навасёлкі, Новае Бірацінa, Рыбакоўшчына, Рыцькова, Старое Бірацінa, Пашкова, Піліпаўшчына, Фасаўшчына, Федэратыўная, Чырвоная Гара, Шыпулёўшчына, Яноўшчына; хутары Архіпаў, Барысаў, Вусава, Гарнакі, Ільюшоў, Карбоўшчына, Кароткі, Кароткія, Іванечкаў, Лейчанок, Лісецкага, Міклева, Наталлін, Папоўка, Піліпіхін, Рудніца, Рэўтаў, Рэчышча, Стафаніхін, Уруцкага, Фёдараў, Хмельнікі, Ціханаў, Чарназём, Юркоўшчына.

Ходцаўскі сельсавет: вёскі Арэхвіна, Бароўка, Бялужанкі, Галашоўка, Галькова, Гарнова, Гарнова 2-я, Гарнова 3-я, Горы, Дзябетаўка, Длябіна, Дубрава, Загацце, Запруддзе, Коцікава, Курмялёва, Логвінава, Ляды, Марозаўка, Падданы, Савушы, Торбіна, Хабаціна, Цакуліна, Цішкавічы, Цыганова, Ясная Паляна; хутары Берашова, Войлева, Разумаўка, Пні.

Прыналежнасць да сельсавета не ўстаноўлена: вёскі Бачарова, Булаўкі, Буканава, Горкі, Грабенікі, Грабяні, Далговічы, Дубраўка, Ермашкова, Залессе, Зарэчча, Зелянькі, Калгунова, Калодніца, Каменны Бор, Кулікоўка, Купіна, Куроўшчына, Лутчына, Малашкі, Міхалінаўка, Мялешкі, Новае Забараўе, Падгузкава, Прамень, Пчальнік, Саракоўшчына, Саўчанкі, засценак Пятрова; пасёлкі Зорка (Камуна), Чырвоны Кастрычнік; хутары Астраўкі, Броды, Залессе, Кузьмянкі.

Вёскі, якія перайменаваны:

Новае Заполле ў выніку ссялення жыхароў Старога Заполля атрымала назву Заполле (1939); Казадоі — Заслонава (1945); Абідаўка — Атраднае, Гапоны — Заветнае, Дзяругі — Роднае Сяло, Жабіна — Дабраполле, Звягі — Рошчына, Канец — Арляны, Канстанцінава — Сіманаўка, Карнілавічы — Ударная, Лізуны — Майская, Серакаротня — Лучазарная, Трубаносы — Сінягорская, Чартоўшчына — Рассвет, Худалеі — Рыбнас, Юдзенічы — Савецкая (усе 1964).

СЯННО

Былі няблізкімі дарогі,
Дзе толькі не ляглі сляды!
Былі сумненні і трывогі,
Былі другія гарады.
Былі чужыя небасхілы,
Але цягнула ўсё адно
У край мой родны,
Край мой мілы,
У горад з назваю Сянно.
У сумятні надзей і будняў,
Калі наўкола ўсё гудзе,
Я верыў, ведаў: прыйдзе цуда,
І я вярнуся да цябе.
Лугі, духмяную атаву,
Звон конікаў сярод травы
Мне не забыць, такая справа,
Мне з імі быць, пакуль жывы.
А за ваколіцай калоссе
Ад спёласці ажно звініць,
І колькі мне ні засталося,
Мае з табою будуць дні.
Вось тут, дзе поўняцца крыніцы
Жывой празрыстаю вадой,
Тут, дзе да сонца аканіцы
Адкрыты летняй раніцой,
Адкрыта й сэрца маё шчыра
Чужому шчасцю і бядзе.
Няхай кагосьці кліча вырай,
А мне тут лепей, як нідзе...

І. Е. Лазука

ПРЫРОДА СЕННЕНШЧЫНЫ

Ландшафт, радовішчы, глебы

Паверхня паўднёвай часткі ўзгорыста-платопадобная, у межах Аршанскага ўзвышша, паўночная і паўночна-заходняя часткі раўнінныя, з асобнымі ўчасткамі астраўных павышэнняў у межах Чашніцкай раўніны; на крайнім усходзе Лучоская нізіна. Найвышэйшы пункт 263 м (каля в. Папіна), найбольш нізкая адзнака 154 м (урэз вады воз. Серакаротня каля в. Рыбнае).

У тэктанічных адносінах раён прымеркаваны да Аршанскай упадзіны. Зверху залягаюць марэнныя і водна-ледавіковыя адклады паазерскага, сожскага і бярэзінскага зледзяненняў магутнасцю ад 30—40 да 240 м (у ледавіковых лагчынах), ніжэй — дэвонскія пясчанікі, гліны, мергелі і даламіты — да 350 м, верхнепратэразойскія гліны, алеўраліты і пясчанікі — да 900—1000 м. Пароды крышталічнага фундамента на глыбіні 750—900 м на захадзе і 1200—1400 м ніжэй узроўня мора на ўсходзе. Вядомы 184 радовішчы торфу з агульнымі запасамі 36,7 млн тон (найб. Мох-Ніжняя Крывіна, Капланскі Мох, Крыпец, Кічынскае, Забоціна-Бярозка); 5 радовішчаў пясчана-жвіровага матэрыялу з запасамі 6,4 млн м³ (найб. Оўсішчанскае, Латыгальскае, Дубнякоўскае, Яноўскае); 5 радовішчаў гліны і суглінкаў з запасамі 5,2 млн м³ (найб. Ракіта, Тупічанскае, Мелькавіцкае, Папоўскае); 3 радовішчы пяскоў з запасамі 24,2 млн м³ (Маргойскае, Папоўскае 1-е, Мішчукоўскае). Зараз распрацоўваюцца Оўсішчанскае і Дубнякоўскае радовішчы. Глінай з радовішча Ракіты карыстаецца цагельны завод, размешчаны ў пас. Труд.

Глебы сельскагаспадарчых угоддзяў (у %): дзярновыя і дзярнова-карбанатныя — 0,7, дзярнова-падзолістыя — 57,8, дзярнова-падзолістыя забалочаныя — 19,8, дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя — 11,5, поймавыя (алювіяльныя) забалочаныя — 1,3, тарфяна-балотныя — 8,9; па механічнаму складу (у %): сугліністыя — 55,8, супясчаныя — 30, пясчаныя — 5,3, тарфяныя — 8,9. Плоскасная эрозія на 24,4% плошчы ворных зямель, у тым ліку слабая на 18,8%; 18,5% ворных зямель завалунена.

Балоты належаць да Гарадоцка-Чашніцкага тарфянога раёна, агульная плошча іх 15,4

тыс. га, з іх 0,7 тыс. га — вярховыя, 13,6 тыс. га — нізінныя, 11 тыс. га — пераходныя. Найбольшыя балотныя масівы: Мох-Ніжняя Крывіна, Хабоціна-Бярозка, Капланскі Мох, Замашанскі Мох, Рудзецкае.

Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 48,2% тэрыторыі (33,8% ворных зямель, 13,7% сенажацей і пашаў). Сярэдні бал банітэту сельскагаспадарчых угоддзяў 34, найвышэйшы 44, найніжэйшы 28. Спецыялізацыя калгасаў і дзяржгасаў — ільнаводства і малочна-мясная жывёлагадоўля, пашыраны пасевы збожжавых і бульбы.

Рэкі і азёры

Рэкі Сенненшчыны належаць да Верхнедняпроўскага гідралагічнага раёна. Буйных рэк няма. Агульная даўжыня 27 рэчак і ручаёў складае каля 300 км. Гушчыня натуральнай рачной сеткі 0,43 км². Агульная даўжыня асушальнай сеткі — 8,2 тыс. км, у тым ліку магістральных і падводных каналаў — каля 700 км, рэгуляцыйных каналаў — каля 500 км.

Сенненшчына — азёрны край. У раёне 71 возера і 8 буйных сажалак (штучных вадаёмаў).

Абалянка — рака ў Талачынскім і Сенненскім раёнах, левы прыток Лучосы (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 89 км. Пл. вадазбору 809 км². Пачынаецца каля в. Данілкава ў Талачынскім раёне, цячэ ў Сенненскім раёне, у ніжнім цячэнні — на мяжы з Віцебскім раёнам — па Лучоскай нізіне. Асноўныя прытокі: Субота, Камянчанка, Нерайшанка, Чудзінка. Рэчышча звілістае, шырыня 5—10 м. Каля в. Утрылава Сенненскага раёна на рацэ плаціна і Утрылаўская сажалка пл. 27 га.

Абразцы — возера ў басейне р. Бярозка, за 0,5 км ад в. Мелехава. Плошча 0,12 км². Даўжыня 0,5 км. Найбольшая шырыня 0,32 км. Злучана прытокай з возерам Альшанка.

Адроў — рака ў Аршанскім, Сенненскім і Талачынскім раёнах, правы прыток Дняпра. Даўжыня 75 км. Пл. вадазбору 676 км².

Пачынаецца меліярацыйнай канавай каля в. Дубніцы Аршанскага раёна. Асноўныя прытокі: Камяніца, Дзярноўка, Сакалянка, Барань. Рэчышча ў вярхоўі каналізаванае, далей звілістае, шырыня ракі 15—20 м.

Альшанка — возера ў басейне р. Бярозка, каля в. Карпавічы. Плошча 0,36 км². Найбольшая глыбіня 11,1 м. Даўжыня 1,68 км. Найбольшая шырыня 0,31 км. Злучана пратокай з возерам Абразцы.

Ардышэва — возера ў басейне р. Лучоса, за 2,5 км ад в. Сафіёўка Аршанскага раёна. Плошча 0,52 км². Найбольшая глыбіня 2,4 м. Даўжыня 1,22 км. Найбольшая шырыня 0,74 км. Выцякаюць рэкі Зелянуха і Ардышэўка. На беразе паляўнічая база.

Ардышэўка — рака ў Сенненскім і Лёзненскім раёнах, левы прыток р. Лучоса (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 16 км. Пл. вадазбору 93 км². Выцякае з возера Ардышэва.

Багданаўскае возера — у басейне р. Крывінка (выцякае з возера) каля в. Багданава. Плошча 1,19 км². Найбольшая глыбіня 16,2 м. Даўжыня 3,37 км. Найбольшая шырыня 0,45 км. Злучана пратокай з возерам Сянно.

Бароўка — возера ў басейне р. Бярозка, каля в. Гуліна. Плошча 0,13 км². Упадае ручай Слузінка.

Бярозаўскае возера — у басейне р. Крывінка, каля в. Студзёнка. Плошча 2,6 км². Найбольшая глыбіня 15,8 м. Даўжыня 5,7 км. Найбольшая шырыня 1,05 км. 4 астравы агульнай плошчай 3,8 га. Выцякае р. Бярозка.

Бярозка, Верхняя Крывіна — рака, левы прыток Зах. Дзвіны. Даўжыня 34 км. Пачынаецца з возера Бярозаўскае, цячэ ў Сенненскім і Бешанковіцкім раёнах.

Вітунь — рака, левы прыток р. Бярозка (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 15,6 км. Пачынаецца каля в. Кляпчэва.

Вялікае Святое — возера ў басейне р. Свячанка (выцякае з возера), за 2 км ад в. Ульянавічы. Плошча 0,77 км². Найбольшая глыбіня 2,5 м. Даўжыня 1,53 км. Найбольшая шырыня 0,73 км. Зарасло поўнасцю.

Добрына — возера ў басейне р. Бярозка каля в. Цыганкі. Плошча 0,46 км. Найбольшая глыбіня 19,1 м. Даўжыня 1,49 км. Найбольшая шырыня 0,47 км.

Добрынка — рака, левы прыток Серакаратнянкі (бас. Лучосы). Даўжыня 19 км. Пачынаецца каля в. Аланцьева.

Карасёва — возера ў басейне р. Абалянка, каля в. Нярэйша. Плошча 0,14 км². Даўжыня 0,5 км. Найбольшая шырыня 0,3 км. Выцякае ручай у р. Нерайшанку.

Кічына, Кічынскае возера — у басейне р. Абалянка каля в. Кічына. Плошча 1,74 км². Найбольшая глыбіня 3,7 м. Даўжыня 3,85 км. Найбольшая шырыня 0,84 км. Выцякае ручай у р. Абалянку.

Крывінка, Крывіна, Ніжняя Крывіна — рака ў Сенненскім, Бешанковіцкім раёнах, левы прыток р. Бярозка (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 34 км. Выцякае з возера Багданаўскае каля в. Запруддзе. Рэчышча ад вытоку на працягу 19,5 км каналізаванае, яго шырыня 4—8 м, у ніжнім цячэнні — 10—15 м.

Крыльцова — возера ў басейне р. Крывінкі, за 1 км ад г. Сянно. Плошча 0,21 км². Даўжыня 0,8 км. Найбольшая шырыня 0,3 км. На поўначы выцякае ручай у возера Сянно.

Крыльцоўка, Безымянка — рака. Бярэ пачатак з ручаёў азёр Крыльцова, Рахальскае і Кулікоўскае, якія зліваюцца ў межах г. Сянно, і ўпадае ў Сенненскае возера. Шырыня 4—5 м. Даўжыня 3 км. Найбольшая глыбіня 0,5 м.

Кулікоўскае возера — у басейне р. Крывінка, на паўднёвай ускраіне г. Сянно. Плошча 0,1 км². Даўжыня 0,42 км. Найбольшая шырыня 0,27 км. Выцякае ручай у возера Сянно.

Леванова, Адамаўскае — возера ў басейне р. Абалянка, за 1 км ад в. Адамава. Плошча 0,16 км². Даўжыня 0,65 км. Найбольшая шырыня 0,32 км.

Ліпна — возера ў басейне р. Чарнагосніца, каля в. Ходцы. Плошча 1,18 км². Найбольшая глыбіня 5,8 м. Даўжыня 3,88 км. Найбольшая шырыня 0,5 км. 4 астравы агульнай плошчай 2,9 га.

Малое Святое возера — у басейне р. Свячанка, каля в. Замошша. Плошча 0,11 км². Даўжыня 0,4 км. Найбольшая шырыня 0,35 км. Выцякае ручай у р. Свячанка.

Немайцянка — рака, левы прыток р. Субота (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 24 км. Пачынаецца на ўсход ад в. Каралі. У верхнім цячэнні называецца Брус.

Нерайшанка — рака, правы прыток р. Абалянка (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 16 км.

Песачанка — рака, левы прыток р. Серакаратнянка (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 21 км. Пачынаецца каля в. Калантаёва.

Рагожыца — рака ў Сенненскім і Чашніцкім раёнах (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 13,4 км. Пачынаецца за 1,2 км ад в. Мар'янова.

Рубаўскае возера — у басейне р. Крывінка, за 1 км ад в. Запруддзе. Плошча 0,16 км². Даўжыня 0,75 км. Найбольшая шырыня 0,28 км.

Рыбакоўскае возера, Рыбакоўка — у басейне р. Свячанка, каля в. Рыбакоўшчына. Плошча 0,11 км². Даўжыня 0,55 км. Найбольшая шырыня 0,26 км. Ручаямі злучана з р. Свяча.

Саро — возера ў Бешанковіцкім раёне на мяжы з Сенненскім раёнам, у басейне р. Чарнагосніца. Плошча 5,31 км². Найбольшая глыбіня 36,3 м. Даўжыня 9,47 км. 2 невялікія астравы плошчай 0,04 га. Возера вызначаецца чысцінёй вады. Упадае ручай з возера Тросна, на поўначы выцякае ручай у возера Астровенскае.

Свячанка — рака ў Сенненскім, Чашніцкім і Бешанковіцкім раёнах, правы прыток ракі Ула (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 84 км. Выцякае ў возера Вялікае Святое. Прытокі — р. Свінка, невялікія ручаі і меліярацыйныя каналы. Пераважная шырыня рэчышча 5—10 м, у ніжнім цячэнні — да 15 м.

Серакаратнянка — рака, левы прыток р. Лучоса (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 24 км. Выцякае з возера Дзевінскае (у некаторых даведніках за пачатак ракі прымаюцца сутокі рэк Добрынка і Зерамнянка за 1 км на ўсход ад в. Добрына, дзе яна вядома пад назвай Серакаротня), цячэ праз возера Серакаротня. Асноўныя прытокі: Зелянуха і Песачанка.

Серакаротня — возера ў басейне р. Лучоса каля г. п. Багушэўск. Плошча 1,75 км². Найбольшая глыбіня 5,8 м. Даўжыня 5,24 км. Найбольшая шырыня 0,65 км. Праз возера цячэ р. Серакаратнянка.

Сосна — возера ў басейне р. Бярозка за 2 км ад в. Ходцы. Плошча 0,54 км². Найбольшая глыбіня 8,2 м. Даўжыня 2,73 км. Найбольшая шырыня 0,34 км.

Стрэшна-1 — возера ў басейне р. Абалянка за 1 км ад в. Варашылы, сярод лесу. Плошча 0,1 км². Даўжыня 0,43 км. Найбольшая шырыня 0,3 км.

Стрэшна-2 — возера ў басейне р. Лучоса каля в. Шчытоўка, сярод лесу. Плошча 0,18 км². Даўжыня 0,88 км. Найбольшая шырыня 0,3 км.

Субота — рака, левы прыток р. Абалянка (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 14 км. Пачынаецца за 2 км на паўднёвы захад ад в. Вейна. Упадае ў раку Немайцянка.

Сянно, Сенненскае возера — у басейне р. Крывінка, на ўскраіне г. Сянно. Плошча 3,15 км². Найбольшая глыбіня 31,5 м. Даўжыня 6,03 км. Найбольшая шырыня 0,92 км. Аб'ём вады 26,8 млн м³. Плошча вадазбору 67,9 км². Катлавіна падзяляецца на глыбакаводны паўднёвы і мелкаводны паўночны плёсы. У паўночным плёсе востраў плошчай 0,018 км². Упадаюць каля 20 ручаёў, у тым ліку з Кулікоўскага возера. Пратокай злучана з Багданаўскім возерам.

Сенненскае возера

(па звестках 1927 года)

Сенненскае возера, якое ляжыць на поўнач ад горада Сянно, мае, паводле вестак Анікіевіча ("Описание Сенненского уезда Могилевской губернии"), найвялікшую даўжыню ў 7 вёрст, а шырыню паўтары вярсты. У паўднёвы канец яго ўліваецца маленькая рачулка, а з паўночна-ўсходняга канца выцякае таксама невялічкая рэчка; апошняя злучае Сенненскае возера з Багданаўскім возерам, якое, у сваю чаргу, праз рэчку Ніжнюю Крывінку ў мястэчку Бешанковічы, злучаецца з ракою Заходняй Дзвіною. У мясцовасці, дзе ляжаць вышэй памянёныя азёры, ёсць яшчэ некалькі азёр, усе яны ствараюць як-бы нейкі ланцуг, які цягнецца з паўднёвага ўсходу на паўночны захад. Такім чынам, можна думаць, што гэтыя азёры прадстаўляюць рэштку якойсьці мінулай ракі. У паўночнай палове Сенненскага возера знаходзяцца два востравы, з якіх адзін супраць вёскі Каралевічы, паводле вестак Анікіевіча, займае плошчу ў тры дзесяціны. Ён пакрыты хмызняком, лесавым маладняком, як хвойка, дуб, вярба і іншыя. Другі востраў, бліжэй да горада, невялікі, увесь зарос лазой, таксама як і частка мяліны навокал яго, дзе растуць чарот, аер, сітнік. Завецца ён "Стрэлкай". Берагі возера досыць звілістыя, у некаторых участках утвараюць паўвостравы адходныя і толькі ў 3—4 месцах (каля в. Турава) стромкія; складзеныя яны больш з пяску (Каралевічы, Ф. Заазер'е). Па берагах возера мала дрэў, большасць хмызняку, вярба, вольха і інш.

Рэльеф дна няроўны, прычым найбольш глыбокія месцы ў 32—34 метры знойдзены на сярэдзіне возера і ідуць яны ў кірунку з поўдня на поўнач. Гэта яшчэ больш узмацняе думку аб тым, што возера гэта ляжыць у лагчыне старога рэчышча. Там, дзе няма расліннасці, дно пескавое, а ў іншых мясцінах гліністае. Тэмпература вады, згодна вымерам Заржэцкага (навуковы працоўнік, якому было даручана вывучыць геалогію былога Сенненскага павета), пасля некаторых хістанняў застанаўліваецца на 7°. Паводле таго ж Заржэцкага, колер вады Сенненскага возера падобны да крайняга жаўтаватага колеру скалы Форэляіле. Празрыстасць вады ў розных месцах хістаецца ад 2-х да 3-х метраў (вымеры рабіліся ў чэрвені месяцы 1926 г.). У працягу году змены роўню ў залежнасці ад надвор'я вельмі значныя. І, напрыклад, сёлета, з прычыны вялікай засухі, у некаторых месцах возера адышло на 6—7 метраў, прычым ровень яго значна панізіўся. Працэс усыхання возера не назіраецца, а што датыча забалочвання, дык працэс асабліва яскрава прыкмячаецца ў паўночнай яго частцы, дзе вялікі абшар заняло балота, якое напэўна прадстаўляла калісьці частку возера. Каля берага там, у вадзе, вялікая колькасць вадзяных раслін, асабліва разаку, вадзяніцы.

У жніўні была абгледжана флора возера, прычым былі заўважаны наступныя расліны ў цвеце. У вадзе: чарот, лазоўка, шылынік, сітнік, аер, стрэліца, урэчнікі, хвашчы, плюшчэй, банцушнік, казяльцы, вадзяніца, збанкі і некаторыя іншыя. Разам з берагавымі знойдзена ўсяго 252 віды раслін.

Фауна возера даследавана не дасканала з прычыны адсутнасці азначнікаў казюлек. Заўважаны: начовачкі, шмат іншых відаў мякуноў, шыцікі, плывунец, пляшчак, павукі, чарва камароў, бабак, жабы. З рыб трапляюцца наступныя віды: шчупак, карась, лінь, акунь, верхаводка (вуклейка), плотка, калека (калега), усьцяра, ёрш, краснапёрка, курмель, лешч.

З птушак найчасцей трапляецца сустрэць: чаплю, нырка, вутку, чайку, пелікана (мясцовыя назвы).

С. Вялішчанка. // "Наш край". 1927 г.

Ходцы, Любач — возера ў басейне р. Чарнагосніца, каля в. Ходцы. Плошча 0,53 км². Найбольшая глыбіня 7,2 м. Даўжыня 1,6 км. Найбольшая шырыня 0,5 км. Упадае ручай з возера Ліпна, выцякае ў возера Тросна.

Чарвінка — рака ў Сенненскім і Чашніцкім раёнах, правы прыток р. Усвейка (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 23 км. Пачынаецца каля в. Старая Беліца.

Чудзінка — рака, правы прыток р. Абалянка (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 12 км. Пачынаецца каля в. Пасад.

Акрамя названых, ёсць яшчэ невялікія рэчкі: Арлянка, Брус, Зелянуха, Зерамянка, Лучка (Турчанка), Паграбёнка, Палонка, Рудніца і на межах раёна — Лучоса і Усвейка.

Значная колькасць малых азёр: Аксюціна, Алес, Арляны, Безымяннае, Безымяннае-1, Белае, Бугаеўскае, Бяздоннае, Вінкава, Вобранка, Гарэлькава-1, Гарэлькава-2, Глыбокае, Гуліна, Даганаўскае, Здзевінскае, Дарскае, Заазёрскае, Зелянец, Канстантова, Канстантоўскае, Карчэўшчына, Кеўдзіна, Круты Ручай, Кузь-

мічова, Лімнаўскае, Любачы, Лясное, Маеўскае, Рабцаўскае, Семянец, Серакаратнянскае, Сукрэменскае, Тросна, Хотлінскае, Цагельня, Чорнае, Чудня, Шэбіна, Яршова і сажалкі: Безыменная, Бурдзялі, ВЭХ, Ледневіцкая, Мошканы, Роднае Сяло, Серкуці, Шчытнікі.

Флора і фауна

Прыродная расліннасць належыць да Заходне-Дзвінскай геабатанічнай акругі, паўднёвай падзоны таёжна-лясной зоны. Утварэнне глебавага покрыва тут праходзіла пад уплывам лясной расліннасці. Раслінны покрыў раёна прадстаўлены лясамі, лугавой і балотнай расліннасцю. На тэрыторыі раёна лясы займаюць значную плошчу. У карыстанні калгасаў і саўгасаў 7574 га лесапакрытых зямель, у тым ліку 731 га лесу.

Агульная плошча лесапакрытых зямель раёна на 1.1.2002 г. складае 82,3 тыс. га (41,8%), у тым ліку 52,2 тыс. га лесу. Агульная плошча зямельнага фонду Сенненскага раёна на 1.1.2002 г. — 196,5 тыс. га.

У адміністрацыйных межах Сенненскага раёна размешчаны лясы дзяржаўнага ляснога фонду.

Склад лясоў (у %): хваёвыя — 32,9, яловыя — 20,4, дубовыя — 0,5, ясянёвыя — 0,9, кляновыя — 0,1, бярозавыя — 22,5, асінавыя — 6,1, шэраальховыя — 9,4, чорнаальховыя — 7,2. Штучных лясоў 10%, пераважна хваёвыя і яловыя насаджэнні. Адметныя лясныя масівы: Цёмная пушча, Абалянская лясная дача, Канеўская дача, Сенненская пушча, Казённік, Купаваць, Іванькаўская пушча, Бор, Барок.

Размеркаванасць на тэрыторыі раёна галоўных лесастваральных парод залежыць ад рэльефу і глебаўтвараючых парод.

На ўзвышаных плато з лёсападобнымі суглінкамі ў паўднёвай частцы раёна лясы складаюцца з елкі з нязначным дамешкам лісцевых парод. У падлеску яловых лясоў пераважаюць ляшчына, крушына, маліна. Травяны покрыў з прычыны вялікага зацянення глебы нізкі і рэдкі і складаецца з майніка двухлістага і кісліцы. Сустракаюцца чарніцы, брусніцы, суніцы. Махавы покрыў звычайны, добра развіты, але ў залежнасці ад ступені і характару вільготнасці глебы ён можа быць розны. Часцей за ўсё ў яловых лясах растуць зялёныя мхі і лугавы лён.

У месцах, дзе рэльеф утвораны канцавымі марэнамі, а гэта значная частка тэрыторыі раёна, расліннасць іншая. На вяршынях павышэнняў, на лясных глебах звычайна сустракаюцца хваёвыя бары. Ніжэй па схілах яны пераходзяць у хваёва-яловыя. На глебах расце верас, папараці. Махавы покрыў не развіты.

Пашыраны ў раёне ялова-шыракалістыя лясы. З шыракалістых парод сустракаюцца клён, ясень, вяз, дуб, ліпа ў выглядзе дамешка да асноўных парод. Распаўсюджаны таксама дробналістыя пароды — бяроза, вольха, шэрая асіна.

Ярус хмызняковых складаецца з рабіны, крушыны, розных пладова-ягадных раслін (маліны, ажыны). На звышвільготных і тарфяных глебах расце чорная вольха.

Лугі па ўмовах свайго развіцця дзеляцца на сухадольныя, балотныя, тарфяныя і пойменныя (абалонныя). Агульная плошча лугоў 27,5 тыс. га.

З паляўніча-прамысловых жывёл водзяцца лось, дзік, ліс, воўк, казуля, янотападобны сабака, заяц-бяляк, заяц-русак, вавёрка, тхор, куніца, выдра, норка, андатра, бабёр, цецярук, глушэц.

З ахоўных жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, трапляюцца барсук, белая курапатка, звычайны зімародак, з раслін — пералеска высакародная, ворлікі звычайныя, сон шыракалісты, наперстаўка буйнакветная, лінея паўночная, тафільдыя чашачкавая, шпажнік чарапіцавы.

Прыродныя ўмовы і рэсурсы раёна вызначаюць своеасаблівасць развіцця сельскай гаспадаркі і магчымасці размяшчэння месц масавага адпачынку.

Камяні

Адкуль узяліся камяні на Сенненшчыне? Іх прынёс ледавік у далёкія часы, калі тэрыторыя, на якой знаходзіцца зараз Беларусь, падверглася аледзяненню. Камяні знайсці можна ўсюды. На палях і лугах яны перашкаджаюць сельскагаспадарчым работам, таму іх пастаянна збіраюць.

Трапляюцца і агромністыя валуны, якія прыцягваюць увагу людзей сваімі памерамі. Паблізу вёскі Вароніна знаходзіцца Чортаў камень, або Кравец. Яго даўжыня 10,2 м, шырыня 6 м, вышыня 4 м. Ён другі па велічыні ў Беларусі.

Пра яго існуе некалькі паданняў. Паводле аднаго з іх, у балоце, побач, жылі чэрці, якія нярэдка жартавалі над п'янымі мужыкамі, што вярталіся з карчмы. Завядуць у балота, падвядуць да каменя, а небарака думае, што дабраўся да ўласнай печы. Распранецца і кладзецца спаць. А калі прачынаецца, то здзіўляецца, як трапіў сюды. Чэрці ж рагочуць у хмызняку. Паводле ж другога падання, пад гэтым каменем жыў чорт, які займаўся краўцоўскай справай. Ён шыў адзенне сялянам, а тыя разлічваліся з ім пятакамі. Нібыта адбіткі тых пятакоў і цяпер можна ўбачыць.

Каля вёскі Забор'е ёсць яшчэ адзін Чортаў камень. Яго памеры 4,7×3,3×1,8 м. Пярун-камень, або Вялікі камень, памерамі 4×3,8×2 м знаходзіцца за 1 км на ўсход ад вёскі Расходна. Побач з вёскай Арляны ёсць Клін-камень (4,2×2,8×2 м). Пярун-камень памерамі 5,4××4,1×0,8 м ёсць і каля вёскі Дубкі. Недалёка ад вёскі Пушкары ляжыць так званы камень-следавік (4,2×3,5×1). Дарэчы, даюцца памеры толькі той часткі камянёў, якая знаходзіцца над паверхняй. Усе камяні складаюцца ў асноўным з граніту-рапаківі, што ў перакладзе з фінскай мовы азначае "гнілы камень".

Падрыхтаваў да друку С. В. Шайко.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Сляды сівой даўніны

Засяленне тэрыторыі Сенненскага раёна адбылося ў 11 тысячагоддзі да н. э., калі наступіла так званае аляродскае пацяпленне, і ледавік канчаткова пакінуў тэрыторыю Беларусі. Прасторы яе паўночнай часткі пакрыліся змешанымі хваёва-бярозавымі лясамі, у далінах рэк басейна Заходняй Дзвіны сфарміраваліся надпоплаўныя тэрасы, прыдатныя для пасялення тут першабытнага чалавека.

Характэрнай рысай гэтага часу было зніканне ці адступленне на поўнач і паўночны ўсход маманта і шарсцістага насарога. Былая ледзяная пустыня пакрывалася азёрамі і лясамі. Сфарміраваўся вельмі разнастайны жывёльны свет. Тыповыя яго прадстаўнікі — зубры, туры, мядзведзі, ваўкі, алені, рысі і інш. У азёрах вадзілася шмат рыбы. Спрыяльныя прыродныя ўмовы прываблівалі сюды першабытнага чалавека.

Вынаходніцтва лука і стрэл прывяло да рэгулярнага забеспячэння мясной ежай. Вынікам гэтага быў значны рост насельніцтва.

Засяленне ішло, у асноўным, па далінах рэк басейна Верхняга Дняпра, аб чым сведчыць адкрыццё археолагамі шэрага стаянак гэтага часу каля в. Каромка Рагачоўскага, Бароўка, Звойная Магілёўскага раёнаў і інш. Найбольш цікавая стаянка Берасценева Аршанскага раёна, размешчаная на першай надпоплаўнай тэрасе правага берага р. Дняпро, на мяжы Аршанскага і Сенненскага раёнаў. Тут выяўлены рэшткі бытавых і гаспадарчых пабудоў, шматлікія крамянёвыя прылады: сіметрычныя і асіметрычныя наканечнікі стрэл, канцавыя і авальныя скрабкі, сярэдзінныя, вуглавыя і бакавыя разцы. Стаянкі такога тыпу адносяцца да ранняга этапа грэнскай культуры фінальнага палеаліту. Паходжанне гэтай культуры звязваюць з больш старажытнымі культурамі верхняга палеаліту басейнаў Сажа, Дняпра, Дзясны.

Знаходка помніка ранняга этапа грэнскай культуры каля мяжы Сенненскага раёна сведчыць, што гэта тэрыторыя ўжо была асвоена першабытнымі паляўнічымі ў час фінальнага палеаліту (11—10 тысячагоддзі да н. э.). Асобныя наканечнікі стрэл грэнскага часу знойдзены і на тэрыторыі Сенненскага раёна.

Далейшыя археалагічныя даследаванні могуць выявіць больш старажытныя помнікі першабытнага чалавека на поўначы Беларусі: знаходкі рэштак паўднёвага слана каля в. Старое Сяло Віцебскага раёна, які жыў на гэтай тэрыторыі каля мільёна гадоў таму, у пачатку антрапагену, сведчыць, што ўжо ў той вельмі далёкі час на гэтай тэрыторыі склаліся спрыяльныя ўмовы для жыцця першабытнага чалавека.

8300 гадоў да н. э. наступіў сучасны геалагічны перыяд — галацэн. Жывёльны і раслінны свет паступова прымаў сучасны выгляд. Эпоху старажытнага каменнага веку змяніў мезаліт, ці сярэдні каменны век. Першабытныя людзі па-ранейшаму рухаліся на поўнач, паўночны за-

хад па далінах Дняпра, Прыпяці, Бярэзіны, Случы, Пцічы і паступова засялялі басейн Заходняй Дзвіны. Рэшткі іх паселішчаў знойдзены па берагах Заходняй Дзвіны і шматлікіх азёр (в. Крыжы Віцебскага раёна, в. Крумплева, Пятроўцы Полацкага раёна, Гарадок пад Новалукомлем, каля межаў Сенненскага раёна), асобныя крамянёвыя прылады (наканечнікі стрэл, скрабкі, ножападобныя пласціны і інш.) трапляюцца на берагах азёр на тэрыторыі Сенненскага раёна.

У культурных пластах гэтых помнікаў знойдзены вербалістыя наканечнікі стрэл, канцавыя скрабкі, ножападобныя пласціны, разцы, сегментападобныя і трапецападобныя крамянёвыя прылады.

У эпоху сярэдняга каменнага веку была заселена ўся тэрыторыя Падзвіння.

У канцы 5-га — пачатку 4-га тысячагоддзяў да н. э. пачаўся новы каменны век — неаліт. Галоўным зместам яго было з'яўленне глінянага ляпнога посуду, авалоданне навыкамі жывёлагадоўлі і земляробства. Спрыяльныя для жыцця ўмовы, вынаходства новых і ўдасканаленне старых прылад працы і тэхнікі палявання прывялі да рэзкага павелічэння сродкаў існавання і хуткага росту насельніцтва.

Самым раннім помнікам неалітычнага часу на Сенненшчыне з'яўляецца паселішча Асавец-4, якое знаходзіцца на Крывінскім тарфяніку, на мяжы Сенненскага і Бешанковіцкага раёнаў. Яно датуецца 4-м тысячагоддзем да н. э. Тут, на беразе возера, цяпер затарфаванага, знойдзены шэраг неалітычных паселішчаў, вывучэнне якіх дае магчымасць характарызаваць матэрыяльную і духоўную культуру, заняткі, быт і светапогляд мясцовага насельніцтва ад 4-га тысячагоддзя да сярэдзіны 2-га тысячагоддзя да н. э. У ніжніх пластах стаянак Крывіна-1 і Крывіна-2, Асавец-2 знойдзены рэшткі вялікіх шыракагорлых гладкасценных гаршкоў, выраблены з гліны з дамешкамі тоўчаных ракавін. Арнаменты разрэджаныя, рэдка занальныя, складаюцца з насечак, грабеньчатых водціскаў, водціскаў вусеня. Сустракаюцца рэшткі тэкстылю, узоры з прачэрчаных ліній. На фрагменце аднаго

Фігурка качкі на фрагменце гаршка са стаянкі Крывіна-1 каля в. Галоўск.

з гаршкоў выяўлены схематычны малюнак вадаплаўнай птушкі.

Апрача керамікі, знойдзены і касцяныя вырабы: цёслы, сякеры, наканечнікі стрэл, рэшткі гарпуноў. Крамянёвых прылад мала. Яны падобны да мезалітычных. Матэрыялы з ніжніх пластоў тарфяных стаянак Крывіна-1 і Крывіна-2 адносяцца да Крывінскага варыянта нарвенскай культуры.

У верхніх пластах стаянак Крывінскага тарфяніка знойдзены рэшткі жылля з двухскатнымі дахамі. У іх размешчаны агнішчы на пясчаных подсыпках, якія пасланы драўлянай карой. На абломках гаршкоў захаваліся рэшткі ежы ў выглядзе шкарлупінак вадзяных і лясных арэхаў, ракавін, лускі рыб. Кераміка верхніх пластоў больш разнастайная: рэшткі вялікіх пласкадонных ці вастрадонных гаршкоў, паўсферычных місак, невялікіх гаршкоў і кубкаў. У іх матэрыяле знойдзена многа тоўчаных ракавін. Сценкі посуду заштрыхаваны і арнаментаваны гарызантальнымі паясамі насечак, грабеньчатых водціскаў, лапчатых і накольчатых водціскаў. Сустракаюцца і водціскі шнура. Большая колькасць прылад працы зроблена з рога і косці. Гэта тлумачыцца адсутнасцю мясцовых запасаў крэменю. У культурных пластах знойдзены касцяныя праколкі, іголкі, сякеры, цёслы, долаты, гар-

пуны, рыбалоўныя кручкі, наканечнікі стрэл, кінжалы. Выяўлены ўпрыгожванні: касцяныя і бурштынавыя падвескі, пацеркі, пранізкі, кольцы, фігурныя накладкі. Шырока распаўсюджаны ўпрыгожванні з прасвідраваных зубоў жывёлін. У верхнім пласце паселішча Асавец-2 трапляюцца арнаментаваныя касцяныя і рагавыя вырабы, выявы птушак з іклаў кабана, фігуркі змей і птушак, статуэтка лася, выраблены з рога, дзве вельмі рэалістычныя выявы галоў першабытных людзей, выраблены з дрэва і рога.

У культурных пластах крывінскіх паселішчаў знойдзены косткі свойскіх жывёлін: коней, свіней, прасочаны зачаткі земляробства. Аднак знаходкі костак дзікіх жывёлін і рыб, паляўнічай зброі, рыбалоўнага начыння, рэштак чаўноў, раслінных рэштак сцвярджаюць аб значнай ролі ў жыцці нарвенцаў паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва.

У бронзавым веку (першая палова 2-га тысячагоддзя да н. э.) развіваліся жывёлагадоўля і земляробства, мацярынскародавыя адносіны паступова замяняліся патрыярхальнымі.

Археалагічныя матэрыялы помнікаў Крывіны і Асаўца сведчаць, што ў неалітычнага насельніцтва на тэрыторыі сучаснага Сенненскага раёна склалася пэўная сістэма вераванняў і культаў, абрадаў і рытуалаў — першабытная рэлігія.

З першай паловы 2-га тысячагоддзя да н. э. на Сенненшчыне жылі нашчадкі мясцовых неалітычных плямён, якія паступова ўспрымалі рысы, характэрныя для культуры бронзавага веку. Сюды праніклі плямёны культуры шнуравой керамікі, якія сяліліся абапал водных шляхоў. Іх уплыў на мясцовае неалітычные насельніцтва прасочваецца па кераміцы з верхніх пластоў паселішчаў Крывіна-2 (Сенненскі раён), Асавец-2 (Бешанковіцкі раён). Тут, побач з неалітычнымі рысамі керамікі (вастрадоннасць, порыстасць сценак большасці посуду), трапляюцца арнаменты ў выглядзе адбітка шнура і наразных ліній, характэрныя для культуры бронзавага веку. Знаходкі ў верхніх культурных пластах Крывіна-1 і Асаўца-2 матыкі і семяльну сведчаць аб занятках земляробствам, а касцей свойскіх жывёл — аб узнікненні жывёлагадоўлі. Такім чынам, у паўночнай Беларусі, у тым ліку і на Сенненшчыне, склалася своеасаблівая культура бронзавага веку, у аснову якой ляглі мясцовыя неалітычныя традыцыі. Яна атрымала назву паўночнабеларускай культуры. Самыя раннія этапы яе развіцця адносяцца яшчэ да позняга неаліту.

У VII ст. да н. э. на тэрыторыі Віцебшчыны пачаўся жалезны век. Адкрыццё жалеза азначала пачатак вялікага тэхнічнага пераварота ў гісторыі чалавецтва. Металургія жалеза, падсечнае земляробства станавіліся асновай эканомікі старажытнага насельніцтва.

У пачатку ранняга жалезнага веку на тэрыторыі паўночнай Беларусі склалася своеасаблівая культура плямён, якая атрымала назву днепра-дзвінскай. Асноўным тыпам яе паселішчаў былі ўмацаваныя гарадзішчы, якія размяшчаліся на надпоплаўных тэрасах, на мысах, па берагах рэк і азёр. Яны ўяўлялі сабой добра абароненыя прыроднымі ўмовамі месцы з сенажацямі і ўчасткамі прыдатнай для апрацоўкі зямлі (в. Лукомль на мяжы Сенненскага і Чашніцкага раёнаў).

На раннім этапе развіцця культуры (VIII—V ст. да н. э.) днепра-дзвінскае насельніцтва яшчэ не ўмацоўвала пляцоўкі гарадзішчаў, будавала жыллё слупавой канструкцыі — падоўжныя наземныя дамы памерам 2,5—3×7—8 м, выраблялі прылады працы з рога і каменя, ляпны гладкасценны посуд цыліндрычных слоікавых форм і слаба прафіляваны з арнаментам у выглядзе выціснутых уверсе ямак.

Асноўным заняткам насельніцтва былі жывёлагадоўля, паляванне і рыбалоўства. Земляробства насіла падсобны характар (в. Замошша Полацкага, Машчоны Сенненскага раёнаў).

На сярэднім этапе (IV ст. да н. э. — I ст. н. э.) днепра-дзвінцы ўжо ўмацоўвалі пляцоўкі гарадзішчаў кальцавымі валамі, будавалі наземнае жыллё слупавой канструкцыі, якое, у адрозненне ад жытлоў ранняга этапа, ужо раздзялялася на асобныя

памяшканні з агнішчамі ў цэнтры. Адначасова з касцянымі прыладамі працы прымяняліся жалезныя, выразныя ляпны слоікападобны і слабапрафіляваны посуд з арнаментам у выглядзе прачэрчаных ліній. Асноўны занятак насельнікаў гарадзішчаў — жывёлагадоўля (в. Новае Сяло Сенненскага, Паддубнікі Міёрскага раёнаў).

На познім этапе (I—пач. V ст. н. э.) пляцоўкі і схілы гарадзішчаў умацоўваліся складанай сістэмай валоў з драўлянымі канструкцыямі і равоў, невялікія наземныя жылыя будынкі мелі чатырохвугольную форму, агнішча ў цэнтры. Шырокае распаўсюджанне атрымалі жалезныя прылады працы і зброя. Вядучымі галінамі гаспадаркі з'яўляліся падсечнае земляробства і жывёлагадоўля. Ляпны слабапрафіляваны посуд адрозніваецца ад папярэдняга падоўжнай формай венчыка (в. Лукомль).

Другая палова 1-га тысячагоддзя з'яўляецца вельмі важнай у гісторыі плямён. На тэрыторыі Усходняй Еўропы праходзілі складаныя этнічныя працэсы, якія былі звязаны з вялікімі вандроўкамі плямённых аб'яднанняў. У канцы V—пачатку VI ст. на тэрыторыю Паўночнай Беларусі пачалі пранікаць раннеславянскія плямёны, якія асімілявалі ці аказалі моцны ўплыў на мясцовае насельніцтва днепра-дзвінскай культуры. Утварылася новая культура, якая атрымала назву банцараўскай. Помнікі яе распаўсюджаны ў цэнтры і на поўначы Беларусі і ў суседніх раёнах верхняга Падняпроўя. Цікавым з'яўляецца гарадзішча Лукомскае, якое размешчана ў вёсцы Лукомль, на правым беразе р. Лукомкі, на пагорку 15—20 м вышынёй, на мяжы Сенненскага і Чашніцкага раёнаў. У культурным пласце магутнасцю 2,2—5 м выяўлены рэшткі некалькіх археалагічных культур. Гэтыя культуры храналагічна змяняюць адна другую: днепра-дзвінская, прадметы якой датуюцца I—IV ст., банцараўская — V—VIII ст. Матэрыялы пачатку X ст. н. э. належалі крывічам. Выяўлены і культурныя рэшткі XI—XIII ст. На поўнач ад гарадзішча знаходзіцца селішча банцараўскай культуры, якое датуецца V—VIII ст.

Насельніцтва банцараўскай культуры займалася земляробствам, жывёлагадоўляй. Паляванне і рыбалоўства насілі дапаможны характар, былі развіты здабыча і апрацоўка жалеза, вытворчасць бронзы, ганчарства, апрацоўка дрэва, косці і інш. Насельніцтва жыло ў наземных ці паўзямлянкавых пабудовах чатырохкутнай формы з адкрытымі агнішчамі ці печкамі-каменкамі ў сярэдзіне. Пабудовы былі зрубныя ці слупавой канструкцыі, плошчай каля 12—20 кв. м і меншыя, побач з жытламі — ямы-склепы. На кожным даследаваным паселішчы знаходзіліся сляды вытворчасці жалеза — абломкі печаў-домніц, крыцы, кавалкі жалезнай руды, рэшткі тыгляў, ліцейныя формы для вырабу лунніц, якія датуюцца VII—VIII ст.

Пахавальны абрад, характэрны для гэтай культуры — трупаспаленне на бескурганных і курганных могільніках. Крэмацыя нябожчыкаў адбывалася за межамі некропаляў, пасля чаго ачышчаныя ад попелу косці змяшчаліся ў гліняныя пасудзіны-урны або ссыпаліся на дно магільных ям.

Курганы па форме падзяляюцца на круглыя, падоўжныя і доўгія. У іх таксама знойдзены урнавыя і бязурнавыя пахаванні, змешчаныя на гарызонце, у насыпе або адразу пад дзёрнавым пакрыццём насыпу. Пахавальны інвентар вельмі бедны: гэта цэлыя пасудзіны ці іх фрагменты. Носьбіты банцараўскай культуры выраблялі слабапрафіляваныя пласкадонныя ляпныя гаршкі. У гліну дадавалася жарства і буйназярністы пясок. Посуд меў крыху адагнуты венчык, слаба выражаную шыйку, моцна спушчаны плячук, злёгку пукатае тулава. Трапляюцца слоікападобныя гаршкі, што характэрна для Падзвіння. Звычайна на помніках банцараўскай культуры знаходзяць біканічныя гліняныя прасліцы, жалезныя нажы, сярпы, наканечнікі коп'яў, шпоры, падковападобныя фібулы, бронзавыя бранзалеты, падвескі, пярсцёнкі, рэшткі бронзаліцейнай вытворчасці. Да трэцяй чвэрці 1-га тысячагоддзя адносяцца нажы, верхняя частка якіх заканчваецца двума спіралепа-

добнымі завіткамі (Лукомль). Такія нажы, характэрныя для старажытных славян, прымяняліся пры выкананні рэлігійных абрадаў.

У матэрыяльнай культуры помнікаў банцараўскай культуры прасочваюцца славянскія рысы. Напэўна, ужо ў гэты час тут рассяляліся славяне. Археалагічныя матэрыялы дазваляюць меркаваць, што носьбіты банцараўскай культуры былі раннімі славянамі, якія пачалі пранікаць у басейн Заходняй Дзвіны яшчэ ў VI ст. і распаўсюдзіліся ў цэнтры, на поўначы Беларусі і ў суседніх раёнах Верхняга Падняпроўя. Аб гэтым сведчыць наяўнасць славянскіх рыс на паселішчах VI—VIII ст. У гэты час асноўным тыпам паселішчаў станавіліся адкрытыя селішчы, а гарадзішча выкарыстоўвалася як сховішча.

Насельніцтва, якое жыло на тэрыторыі Сенненшчыны ў VI—канцы VIII ст., аказала моцны ўплыў на фарміраванне славянскага саюза крывічоў. Аб гэтым сведчаць археалагічныя матэрыялы гарадзішча ў Лукомлі, дзе культурны пласт са знаходкамі банцараўскай культуры перакрыты культурнымі рэшткамі пачатку X ст., якія належалі летапісным крывічам. Полацкія і Віцебскія крывічы займалі тэрыторыю сучаснай Віцебскай вобласці і іншыя раёны. Летапісец у "Аповесці мінулых гадоў" называе іх палачанамі.

Распад першабытна-абшчынных адносін прывёў да станаўлення феадалізму — новай грамадска-эканамічнай фармацыі. З'явіліся познія гарадзішчы, сядзібы феадалаў — грады. Так, на Лукомскім гарадзішчы знойдзены культурныя рэшткі сядзібы феадала, якія датуюцца IX—пачатакам X ст.

Адным з першых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі былога Сенненскага павета было Лукомскае ўдзельнае княства з цэнтрам у Лукомлі, аб чым сведчыць магутны культурны пласт XI—XIII ст., які залягаў над культурнымі рэшткамі X ст. Сярод знаходак сустракаюцца вырабы

Раскопкі стаянкі Крывіна-1 каля в. Галоўск. 1961 г.

з жалеза (наканечнікі стрэл, сякеры, сашнікі, сярпы, косы, ключы ад замкоў і інш), з каляровых металаў (бранзалеты і іншыя жаночыя аздабленні); з косці (грабяні, праколкі); з каменя (праселкі, тачыльныя брускі); з шкла (бранзалеты, каралі). Да рэдкіх знаходак адносіцца шахматная антрапаморфная фігурка, касцяная пласціна з выявамі звяроў, залатая ажурная пацерка.

Вывучэнне стаянак Крывіна і Асавец дазваляе зрабіць вывад, што іх насельнікі ведалі аб асаблівасцях і багаццях мясцовага краю, мелі звесткі ў галіне геаграфіі, батанікі, мінералогіі і г. д. Каб падтрымаць сваё існаванне, трэба было добра ведаць тэрыторыю, выбраную для палявання, рыбалоўства і збіральніцтва, карысныя асаблівасці раслін, мінералаў, дрэў, каб выкарыстаць іх для сваіх патрэб, умець арыентавацца на мясцовасці.

Уяўляюць цікавасць знаходкі з крывінскіх паселішчаў. Знойдзены каралі, зробленыя з іклаў мядзведзя ці ваўка. Насельнікі гэтых паселішчаў лічылі, што воін ці паляўнічы, на шыі якога знаходзіліся такія каралі, будзе дужы і спрытны, як звяры. Каралі з зубоў лісіцы павінны былі дадаць паляўнічаму хітрасці. Такім чынам, чалавек надаваў каралям з зубоў жывёлін звышнатуральную магічную сілу. Чалавек хацеў, каб і ў яго былі некаторыя спецыфічныя асаблівасці той ці іншай жывёліны.

Амулеты-каралі з іклаў жывёлін, знойдзеныя ў Крывінскім тарфяніку.

У культурных пластах паселішчаў Крывінскага тарфяніка знойдзена шмат зубоў мядзведзя, лася, ваўка, сабакі с прасвідраванымі ў прыкаранёвай частцы адтулінамі, праз якія працягваліся ніткі. Сустракаюцца замест адтуліны нарэзкі. Насельнікі паселішчаў Крывіна і Асавец для вырабу караляў больш за ўсё карысталіся карэннымі зубамі лася. Гэта рабілася таму, што лось быў асноўнай здабычай паляўнічага, а мяса яго ратавала жыхароў ад голаду. Таму каралі з зубоў лася, на думку першабытнага паляўнічага, павінны даць яму ўладу над гэтай жывёлай і забяспечыць супляменнікаў ежай. Шматлікія знаходкі караляў з зубоў мядзведзя, ваўка, сабакі сведчаць аб значнай ролі гэтых жывёл у паляўнічым промысле першабытных насельнікаў тэрыторыі Сенненшчыны. Такім чынам, яшчэ ў глыбокай старажытнасці ў насельнікаў паселішчаў Крывіны і Асаўца склалася прамысловая магія, як адна з першых разнавіднасцей першабытных рэлігійных вераванняў.

У культурных пластах неалітычных стаянак знаходзяць амулеты-каралі са сківіц бабра. Яны прасвідроўваліся і прыстасоўваліся для нашэння на шыі.

У новым каменным веку, калі ўзрасла роля жывёлагадоўлі і земляробства, у першабытным грамадстве выросла роля мужчыны ў вядзенні гаспадаркі абшчыны. Адпаведна вобраз мужчыны займаў усё большае месца ў міфалогіі і рэлігіі першабытнага чалавека. У сувязі з гэтым у культурных пластах неалітычных стаянак часта знаходзяць пластычныя выявы мужчын.

Найбольш старажытная для тэрыторыі Беларусі статуэтка мужчыны была знойдзена ў 1966 г. у культурным пласце тарфянікавай стаянкі Асавец. Выява выразана з цвёрдага ліставога дрэва, мае даўжыню 9,5 см. Ніжняя частка яе абламана. Фігурка ўвасабляе сабой рэалістычны вобраз чалавека з выразнымі і нават рэзкімі рысамі твару. Глыбокія вачніцы і апушчаныя куткі вуснаў прыдаюць выяве суровы выгляд. Краі надброўяў закругленыя, нос прамы і крыху сплюшчаны. Выдзелена ніжняя частка твару, якая рэльефна выступае ўперад. Відавочна, пер-

шабытны мастак так абазначыў вусы і бараду. Выдзелена шыя. Рукі не выдзелены.

Другая выява галавы мужчыны знойдзена ў 1972 г. Яна выразана з рога. Гэта галава мужчыны з высокім ілбом і прадаўгаватым тварам, рэзка абазначанай бародкай. Абазначаны вочы ў выглядзе глыбокіх прасвідраваных конусападобных ямак. Пераносся выяўлена слаба. Рот акрэслены гарызантальна прарэзаным паглыбленнем. Адзначаны правільныя рысы твару. Статуэтка абламана ў старажытнасці, але захавалася шыя, уверсе якой прасвідравана адтуліна, відавочна, для падвешвання. Даўжыня — 4,2 см. Назіраецца, пры параўнанні, адзін і той жа стыль выканання абодвух статуэтак.

Трэба таксама адзначыць знаходку абломкаў добра прафіляванага глінянага гаршка, на пукатым брушку якога кароткімі адбіткамі перавітага шнура выгравіраваны дзве постаці чалавека. Постаці перададзены схематычна, але па дэталях гравіроўкі можна меркаваць, што яны мужчынскія.

Знойдзена фігурка лася, выразаная з рога, якая перадае дынаміку руху. Знойдзены выявы птушак, якія выразаны з расшчэпленых іклаў дзіка. Гэта, у першую чаргу, — выявы качкі, чаплі.

Сярод рэчаў можна выдзеліць прыгожыя фігурныя накладкі, касцяныя плоскія кольцы, пласціны з зубчастымі краямі.

Выяўлены аздобы, выраблены з бурштыну — выкапнёвай зацвярдзелай смалы некаторых хваёвых дрэў. З кавалкаў бурштыну выраблялі разнастайныя каралі з прасвідраванымі адтулінамі, трубачкі, гузікі, кольцы.

Важнай крыніцай вывучэння духоўнага свету старажытнага насельніцтва можа служыць арнамент на керамічы. Самым яркім арнаментам вызначалася паўночна-беларуская культура. Тут назіраецца вялікая разнастайнасць узораў. Наносіліся гарызантальныя, ромбападобныя, косанакіраваныя і яшчэ больш складаныя палоскі. Пазней выкарыстаны паўсферы і акружнасці, схематычныя малюнкі, якія нагадваюць выявы раслін, а таксама



Гліняны посуд.

акружнасці, запоўненыя радыяльнымі лініямі. Верагодна, многія з малюнкаў можна тлумачыць як сімвалы старажытнай міфалогіі, а таксама як салярныя знакі. Не выключана, што і шнуравы арнамент меў сакральны сэнс: шнур — гэта адна з форм спіралі, а спіраль — знак агню, сонца, жыцця.

У арнаментах адлюстроўваліся некаторыя паняцці аб геаметрыі, арыфметыцы. У той час чалавек ужо ўмеў вычэрчваць геаметрычныя фігуры, вызначаць адлегласць, не быў пазбаўлены пачуцця гармоніі і сіметрыі.

На стаянках Крывінскага тарфяніка былі знойдзены фрагменты трубчастых птушыных костак з прасвідраванымі адтулінамі, рэшткі старажытных духавых інструментаў.

Вывучэнне археалагічных матэрыялаў з тарфянікавых стаянак Крывіна і Асавец дазваляе зрабіць выснову, што ў насельніцтва гэтых паселішчаў ужо існавалі такія зачаткі першабытнай рэлігіі, як паляўнічая магія, культ продкаў. Першабытны чалавек верыў, што на тым свеце памерлы жыве, займаецца гаспадаркай, паляваннем, — вядзе такое жыццё, як і на гэтым свеце, што з таго свету ён уплывае на лёс жывых суродзічаў — ці дапамагае, ці шкодзіць. Знаходкі скульптурных выяў людзей — яркі таму доказ. Чалавек новага каменнага веку лічыў, што некаторыя жывёлы з'яўляюцца яго суродзічамі і дапамагаюць яму ў цяжкую хвіліну. Да такіх свяшчэнных жывёл адносіліся лось, качка. У этнаграфіі гэта галіна першабытнай рэлігіі атрымала назву татэмізму. Вялікае значэнне набывалі культы, звязаныя з нябеснымі свяцілами, са зменамі пор года. Значнае месца ў вераваннях займала сонца, якое было добрым бажаством, яно пасылала людзям цяпло, без чаго немагчыма было існаванне самога чалавека. Сляды такіх касмаганічных культаў мы знаходзім у позненеалітычных арнаментах. Усё гэта атрымала ў далейшым сваё развіццё ў паганскай (язычніцкай) рэлігіі насельніцтва эпохі жалеза і ранняга сярэднявечча на тэрыторыі паўночнай Беларусі.

У. Дз. Будзько.

Помнікі археалогіі

СЯННО

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 1,5 км на паўднёвы захад ад г. Сянно, каля былой в. Горы. Займае марэннае ўзвышша вышынёй 9—10 м, з захаду і ўсходу абкружана балотам. Адкрыў у канцы XIX ст. Е. Р. Раманаў, у 1959 г. раскопкі праводзіў Л. В. Аляксееў, у 1972 г. абследаваў П. Ф. Лысенка. Знойдзена ляпная гладкасценная кераміка. Гарадзішча адносіцца да жалезнага веку. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі і Інстытуце археалогіі Расійскай Акадэміі Навук (РАН).

АЛЕКСІНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Адамава. Курганны могільнік. Мясцовая назва Французскія магілы. На паўднёва-усходняй ускраіне вёскі, каля могілак, у лесе побач з дарогай. 16 курганоў, якія зараслі лесам. Выявіў у пачатку XX ст. К. Ц. Анікіевіч, абследавалі ў 1956 г. Л. В. Аляксееў, у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Вёска Кімейка. Курганны могільнік. Мясцовая назва Французскія магілы. Каля вёскі, ва ўрочышчы Кімейскі Бор. 8 насыпаў размешчаны кампактнай групай, зараслі лесам. Асобна каля дарогі ў вёску знаходзіцца яшчэ адзін курган. Каля асновы захаваліся рэшткі раўкоў. Выявіў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Вёска Шынкава. Курганны могільнік. Мясцовая назва Французскія курганы. На поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Хвойнікі, недалёка ад р. Абалянка. 5 курганоў. Насыпы здзірванелыя, зараслі лесам. Каля падножжа відаць раўкі. Выявіў і абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

БАГУШЭЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Навасёлкі. Курганныя могільнікі. Мясцовая назва Валатоўкі, Курганы, Французскія магілы. Могільнік-1. На поўнач ад вёскі, на заходнім беразе возера Бароўна, у лесе, ва ўрочышчы Бор. 2 курганы, зараслі лесам.

Могільнік-2. На поўнач ад вёскі, у лесе. 3 насыпы, зараслі лесам.

БАГДАНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Капланы. Курган.

На паўночны ўсход ад вёскі, злева ад дарогі ў г. Сянно, на сучасных могілках. Выявіў у канцы XIX ст. Е. Р. Раманаў, абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка.

БЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Каралі. Курганны могільнік. Мясцовая назва Французскія магілы. За 2 км на

поўнач ад вёскі, у лесе, абапал дарогі Сянно — в. Старая Беліца. 3 насыпы. Курганы здзірванелыя, зараслі лесам, адзін пашкоджаны. Выявіў у 1959 г. Л. В. Аляксееў, абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Вёска Маргойцы. Курганны могільнік. Мясцовая назва Французскія магілы. За 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на поўдзень ад былога Масютава хутара, абапал дарогі 4 курганы: 3 паўсферычныя насыпы, пашкоджаны ямамі; адзін падоўжны. Выявіў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Вёска Старая Беліца. Гарадзішча. На ўсход ад вёскі, на поўдзень ад павароту на станцыю Бурбін. Займае высокі астанец. Пляцоўка абкружана валам, які з поўдня прыкрываў уезд. Вядома з 1873 г., абследавалі ў 1892 г. Е. Р. Раманаў, у 1955 г. Л. В. Аляксееў, у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

МАШКАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Задарожжа. Курган. За 4,5 км на поўнач ад вёскі, у хмызняку. Адкрыў і абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка.

НЯМОЙТАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Будзішча. Курган. На поўнач ад вёскі. Насып здзірванелы, захаванасць добрая. Выявіў у 1959 г. Л. В. Аляксееў, абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка.

Вёска Буй. Курганны могільнік. За 1,5 км на захад ад вёскі. Захаваліся 4 курганы ва ўрочышчы Доўгая Пожня. Яшчэ ёсць два курганы ва ўрочышчы Маханіца. Курганы і могільнік выявіў Ф. В. Пакроўскі, абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Вёска Сукрэмна. Курганы. Курган-1 ва ўрочышчы Сукрэменскі Бор. Курган-2 ва ўрочышчы Намарча, у полі каля дарогі. Курган-3 на паўднёвы захад ад вёскі, на гары за могілкамі. Выявіў курганы ў канцы XIX ст. Е. Р. Раманаў, абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка.

Вёска Цімірязева. Курганны могільнік. Мясцовая назва Французскія магілы. На паўночнай ускраіне вёскі, часткова на агародах, полі, лузе. Паўсферычныя курганы. Вядомы па звестках 1873 г. Абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

ОБАЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Слабада. Курганны могільнік. У хваёвым лесе ва ўрочышчы Гірына. 8 курганоў, здзірванелыя, зараслі лесам. Выявіў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

РАСНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Расна. Курганны могільнік. На паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Дзядоўка, на ўзлессі. 4 насыпы, зараслі дрэвамі. Выявіў у 1907 г. К. Ц. Анікіевіч, абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

СТУДЗЁНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Кошцы. Курган. На поўнач ад вёскі, сярод поля. Вядомы з 1873 г. Абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка.

Вёска Новае Сяло. Гарадзішча. На поўнач ад вёскі, недалёка ад правага берага ракі Свяча. Займае паўночную частку высокага марэннага астанца. Пляцоўка авальная, з паўночнага і паўднёвага бакоў умацавана 2 валамі. Гарадзішча здзірванелае, зарасло лесам. Выявіў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Вёска Савінічы. Курган. На могілках. Вядомы з канца XIX ст. Абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка.

Вёска Студзёнка. Курганны могільнік. На паўночны ўсход ад вёскі, за паўкіламетра налева ад дарогі на Обаль, на берагавой тэрасе ўсходняга берага возера Бярозаўскае. Два насыпы. Выявіў і абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

УЛЬЯНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Вялікі Азярэцк. Курганны могільнік. На паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Янаўскі Лес. 20 курганоў. Насыпы здзірванелыя, зараслі лесам. Каля падножжа вялікіх курганоў прасочваюцца паўкруглыя раўкі. Выявіў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Вёска Заазер'е. Курганны могільнік. На захад ад вёскі, у лесе, па дарозе на Ульянавічы. Захаваліся 3 насыпы, здзірванелыя, зараслі лесам. Паводле звестак 1873 г., былі 22 курганы. Абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Вёска Малы Азярэцк. Курганны могільнік. Мясцовыя назвы Балваны, Французскія магілы. На поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Камуна, на ўсходнім беразе возера Маеўскае. У літаратуры вядомы пад назвай былой вёскі Вядзец. Больш за 50 курганоў. Частка іх размешчана на полі, большасць — у хмызняку.

Курганы крутабокія, здзірванелыя, зараслі хмызняком і драбналессем. Захаванасць добрая, на полі абворваюцца. Даследаваў у 1893 г. Е. Р. Раманаў. Ён раскапаў 5 курганоў. Пахавальны абрад — трупаспаленне і трупапалажэнне. Знойдзены ляпныя і ганчарныя гаршкі, у адным насыпе дырхем 914 г. дынастыі Саманідаў, паясны набор і гаршчок. Могільнік адносіцца да X—XIII ст., належаў крывічам. Абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка.

Знаходкі захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве.

Вёска Ульянавічы. Курганны могільнік. Каля ўсходняй ускраіны вёскі, злева ад дарогі на г. Сянно. 3 курганы. Выявіў у канцы XIX ст. Е. Р. Раманаў, абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

ХОДЦАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Берашова. Курган. На захад ад вёскі. Вядомы з канца XIX ст. Абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка.

Вёска Машчоны. Гарадзішча. На левым беразе ракі Бярозка. Займае круглаваты марэнны ўзгорак. Абарончыя збудаванні не захаваліся. Уся пляцоўка гарадзішча занята могілкамі. Вядома з 1873 г. Даследавалі ў 1955 г. Л. В. Аляксееў, у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Знойдзена ляпная гладкасценная кераміка з жарствой у сценках пасудзіны.

Адносіцца да ранняга жалезнага веку. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Вёска Ходцы. Курганны могільнік. На заходняй ускраіне сучасных могілак. 5 насыпаў. Курганы параслі дрэвамі. Выявіў у 1893 г. Е. Р. Раманаў, абследаваў у 1972 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

У СКЛАДЗЕ ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА

Тэрыторыя сучаснага Сенненскага раёна ў старажытнасці была заселена славянамі-крывічамі і ўваходзіла ў склад Полацкага княства — самага ранняга на беларускіх землях дзяржаўнага ўтварэння. Крывічы жылі пераважна ў вёсках, аднак на выпадак варожых набегаў мелі і ўмацаваныя гарадзішчы, якія з часам ператварыліся ў гарады — цэнтры княжацкіх удзелаў. Адным з такіх старадаўніх крывіцкіх цэнтраў з'яўляецца Лукомль.

Неспакойнае існаванне выпала Сенненшчыне ў старадаўнія часы. Полацкае княства, якое мела выхад па Заходняй Дзвіне да Балтыкі, сапернічала з Ноўгарадам і Кіевам. Кіеўскія князі не маглі мірыцца з існаваннем моцнага і незалежнага Полацка. Таму ў X—XI ст. нашы землі неаднаразова станавіліся арэнай узброеных сутыкненняў і, канечне, пастаўлялі ваяроў у княжацкую дружыну ў час паходаў або пры неабходнасці абароны межаў Полацкай зямлі. У барацьбе супраць Кіева полацкаму князю Усяславу ўдалося дабіцца поспеху. Ён уладарыў у Полацку на працягу 57 гадоў (1044—1101), хадзіў з дружынаю на Пскоў (1065) і Ноўгарад (1066). У адказ на гэта кіеўскія князі разбурылі Менск, разбілі войска Усяслава на Нямізе (1067). Ва ўсіх паходах і бітвах полацкіх князёў бралі ўдзел і нашы продкі. Дзякуючы іх мужнасці, Полацкае княства захоўвала свае землі, мела·пэўную палітычную самастойнасць і пры нашчадках Усяслава Брачыслававіча.

З канца 1120-х гг. у Полацку вялікую ролю пачало адыгрываць веча, якое вырашала важнейшыя палітычныя пытанні, запрашала да кіравання зямлёй князёў і выганяла іх, калі праводзімая імі палітыка не задавальняла палачан. Аслабленне княжацкай улады, супярэчнасці паміж феадаламі, войны і міжусобіцы адбіліся на лёсе Полацкага княства. У ім у пачатку XII ст. утварылася некалькі самастойных удзелаў, у тым ліку Віцебскі, Друцкі, Менскі і Лукомскі. Тэрыторыя Сенненшчыны да сярэдзіны XV ст. была непарыўна звязана з Лукомскім княствам, якое, магчыма, узнікла як удзел князёў Лукомскіх.

Татара-мангольскае нашэсце не закранула Сенненшчыны. Аднак усёй Полацкай зямлі з паўночнага захаду пагражалі крыжакі, якія з пачатку XIII ст. умацаваліся ў Прыбалтыцы. І межаванне з

Пскоўскай і Смаленскай землямі не давала спакойна жыць нашым продкам. У гэтых умовах удзелы Полацкай зямлі шукалі падтрымкі ў літоўскіх князёў.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У пачатку XIV ст. уся Полацкая зямля ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ). Першыя князі ВКЛ не парушылі раней усталяванага тут дзяржаўнага і грамадскага ладу. Яны пакідалі на ўдзелах мясцовых князёў, задавальняючыся іх васальнай залежнасцю.

Лукомскае княства аказалася ўцягнутым у барацьбу за правы праваслаўнай шляхты, супраць акаталічвання. Пасля заключэння Крэўскай уніі 1385 г. Ягайла стаў польскім каралём, прыняў каталіцтва і загадаў будаваць касцёлы па ўсёй тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. У 1385 г. князь Полацкі Андрэй Альгердавіч аб'явіў яго вераадступнікам і пачаў з ім барацьбу. У саюзе з Андрэем Полацкім былі Смаленскае княства і Лівонскі ордэн. Не паспеўшы ўзяць Лукомль, крыжакі спалілі яго наваколле і пайшлі на Оршу. (Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии. Кн. I. Могилев, 1882. С. 17).

У барацьбе Андрэй Полацкі пацярпеў паразу, быў захоплены ў палон і адвезены ў ланцугах да Ягайлы. Для папярэджання новага непадпарадкавання Ягайла ўвёў у многія гарады ВКЛ ваенныя гарнізоны.

Палітыка Ягайлы выклікала незадаволенасць многіх літоўскіх магнатаў, і яны дамагліся ў 1392 г. кампраміснага Востраўскага пагаднення, па якому Ягайла заставаўся толькі польскім каралём, а князем Вялікага княства Літоўскага станавіўся Вітаўт (1392—1430). Ён імкнуўся да стварэння самастойнага Літоўска-Рускага каралеўства, ліквідаваў самастойнасць Полацкага і Віцебскага княстваў, але павінен быў выдаць статутныя граматы, якія гарантавалі права перамяшчэння ўнутры і за межы дзяржавы, маёмасныя правы і зацвярджалі пэўныя абавязкі па выкананню дзяржаўных падаткаў і павіннасцей. У Віцебск і Полацк былі прысланы намеснікі.

Пасля смерці Вітаўта на кароткі час вялікім князем літоўскім стаў брат Ягайлы Свідрыгайла, якога падтрымлівалі праваслаўныя феадалы. У акце ўзвядзення яго на вялікакняжацкі трон сярод уладанняў упамінаецца і Лукомль. Трэба адзначыць, што ў пачатку XV ст. такія маленькія княствы, як Лукомскае і Чарэйскае, адыгрывалі ўжо нязначную ролю.

Другая палова XV ст. характэрна аслабленнем вярхоўнай улады ў Вялікім княстве Літоўскім. Гэта вымусіла ўрад правесці адміністрацыйныя рэформы. У 1500 г. ліквідаваны ўдзельныя княствы і ўтворацы ваяводствы. Гэта не закранала ўласніцкіх правоў мясцовай знаці, але нанесла моцны ўдар па яе палітычных уплывах.

Шматлікія падзеі на тэрыторыі Сенненшчыны звязаны са знешнепалітычнай дзейнасцю Вялікага княства Літоўскага. Вялікі князь Альгерд тройчы (1368, 1370, 1372) нападаў на Маскву, а Вітаўт у 1404 г. захапіў Смаленск (належаў ВКЛ да 1514), дайшоў да вярхоўяў рэк Акі і Дона і ўстанавіў заходнія межы ВКЛ да ракі Угра (левы прыток Акі ў сучаснай Калужскай вобласці).

Аднак у далейшым умацаванне Масквы прывяло да таго, што з канца XV ст. вялікія князі маскоўскія пачалі адваёўваць памежныя землі. Маскоўскія войскі ўрываліся на тэрыторыю ВКЛ. Такім нападам падвяргалася і Сенненшчына.

Летапісы таго часу расказваюць аб тым, што рускія войскі ваявалі "каралёву зямлю". У апісанні аднаго з такіх паходаў і ўпамінаецца Сянно. Ёсць звесткі аб тым, што яшчэ ў час праўлення вялікага князя літоўскага і караля польскага Казіміра Ягайлавіча (1440—1492) "на Рше у Обольцех село Сено Милошу Воишловичу отдано". Але паколькі канкрэтны год не ўказаны, то першай пісьмовай звесткай лічыцца 1534 г. У гэтым годзе маскоўскае войска пад камандаваннем князя Барыса Гарбатага "предало огню и мечу город Сенно".

У сярэдзіне XVI ст. Сянно ўваходзіла ў склад Віцебскага ваяводства, аб чым

сведчыць апісанне паветаў і межаў ваяводства за 1566 г., дзе, акрамя Сянна, упамінаюцца Беліца і Палонка.

Да сярэдзіны XVI ст. большая частка тэрыторыі сучаснага Сенненскага раёна занята была непраходнымі лясамі, дзе вялося шмат звяроў: тураў, расамах, собаляў, зуброў, ласёў, вепрукоў, вавёрак і інш. Паляванне было важным заняткам насельніцтва. Ворнай зямлі на тэрыторыі раёна было мала, большасць яе складалі пясчаныя і балотныя глебы, таму, каб атрымаць добры ўраджай, патрабавалася вялікая колькасць угнаення і ўмелая апрацоўка зямлі. Вырошчвалі жыта, азімую пшаніцу і "ярыцу", авёс, агародныя і бабовыя культуры, а таксама лён і каноплі. Многа звестак захавалася аб жывёлагадоўлі, для яе былі вельмі спрыяльныя ўмовы: вакол рэчак, азёр і ручаёў было мноства лугоў і сенажацей. У рэчках і азёрах вялося каля 40 відаў рыбы, нават такая рэдкая, як сіг.

На Сенненшчыне ў невялікай колькасці меліся паклады балотнай руды, што дазваляла саматужным спосабам выраблять жалеза. Акрамя таго, былі вельмі развіты ганчарная, гарбарная і кушнерская справа.

Існаваў унутраны гандаль паміж мястэчкамі і сельскімі паселішчамі. Акрамя прадуктаў харчавання сяляне нарыхтоўвалі дровы і прадавалі іх жыхарам замкаў і мястэчак. Аб знешнім гандлі звестак зусім мала, таму што Сянно стаяла далёка ад гандлёвых шляхоў і сплаўных рэк. Але паляванне на каштоўных звяроў давала вялікую колькасць футра, якое складала важны прадмет гандлю. Ужо ў 1387 г. прывілей Ягайлы ўпамінае даніну футрам баброў і вавёрак. Выраблялся паташ (вуглякіслы калій), які ўжываўся ў вялікай колькасці для ачысткі воўны і льняных тканін, вырабу мыла і ў фармацэўтычнай справе. Попел і паташ вывозіўся ў Рыгу. Ёсць звесткі, што ў канцы XV ст. віцебскі намеснік Міхаіл Жаслаўскі адпраўляў попел і паташ на продаж у Рыгу, а там купляў соль.

Да сярэдзіны XVI ст. палова ворнай зямлі Сенненшчыны была ў дзяржаўнай маёмасці, а другая палова належала буйным і дробным феадалам. Так, напрыклад, вялікае сяло Алексінічы ў сярэдзіне XVI ст. належала Сапегам.

З пачатку XVI ст. пастаянна ўзнікалі спрэчкі паміж аболецкімі ксяндзамі (касцёл у Абольцах быў пабудаваны ў 1387 г., зараз на тэрыторыі Талачынскага раёна) і суседнімі землеўласнікамі аб межах уладанняў. Праходзілі бойкі, рабіліся наезды і рабункі, захоплівaліся сумежныя землі. Аб гэтым сведчаць шматлікія дакументы. У 1542 г. кароль і вялікі літоўскі князь Жыгімонт I сваім указам загадаў аболецкаму ксяндзу Івану Разняткоўскаму, каб ён няправільна засеянага збожжа не ўбіраў, а вырашаў гэта з уладальнікам маёнтка Сянно формаю суда. У 1543 г. кароль загадаў віцебскаму ваяводзе Несілоўскаму выклікаць да сябе аболецкага ксяндза на суд і ўчыніць князю Дзмітрыю Відуніцкаму-Любецкаму "кампенсацыю" за дапушчаныя з боку ксяндза парушэнні межаў, за бойкі і рабункі ў адносінах да сенненскіх сялян. А ў 1544 г. Жыгімонт II Аўгуст выклікаў аболецкага ксяндза Гайка, у адносінах да якога ў 1545 г. справу разбіраў суд камісарскі па скарзе князя Дзмітрыя Відуніцкага-Любецкага і яго пасынка князя Рыгора Іванавіча Сенненскага-Грыбоўскага. Гэта першыя вядомыя ўладальнікі Сянна.

Прыкладна да канца XV ст. галоўнай формай эксплуатацыі сялян быў натуральны аброк, у якім, акрамя жыта, аўса, ячменю, гусей, курэй, мёду, значыліся пянька, прадзіва, сеці і нават дровы. Натуральны аброк дапаўняўся адпрацовачнай рэнтай і грашовым чыншам. Памер грашовага чыншу землеўладальнік вызначаў асабіста. Асноўнай адзінкаю абкладання быў "дым", або сялянская гаспадарка. Сяляне сельскіх і валасных абшчын неслі калектыўную адказнасць за выкананне ўсіх павіннасцей.

"Паншчына", або праца сялян ў маёнтках з сахою, сярпом і касою, у Віцебскім і Полацкім ваяводствах называлася "прыгонам", ці "службаю цяглай". У пачатку XVI ст. на Сенненшчыне, як і ўсюды на ўсходзе Беларусі, паншчына складала 1 дзень на тыдзень, а ў сярэдзіне стагоддзя — ужо 2 дні. Паншчыну адбывалі зімой і летам, мужчыны і жанчыны. Акрамя паншчыны, натуральнага аброку і чыншу сяляне выконвалі падворную павіннасць, старажоўшчыну і інш.

У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

У выніку заключэння Люблінскай уніі 1569 г. Сенненшчына, як і ўсе землі Вялікага княства Літоўскага, увайшла ў склад Рэчы Паспалітай. Маючы ў цэлым станоўчыя палітычныя вынікі для ВКЛ, унія садзейнічала аднак паланізацыі шляхты і гарадскога насельніцтва, пашырэнню каталіцызму. Асабліва стараўся ў насаджэнні каталіцкага касцёлу запрошаны Стэфанам Баторыем ордэн езуітаў. Баторый шчодра раздаваў землі ордэну, і за кароткі час езуіты атрымалі на Беларусі ўладанні, дзе жыло 16 тысяч сялян.

80-я гг. і пачатак 90-х гг. XVI ст. праходзілі пад знакам падрыхтоўкі царкоўнай уніі. Прыхільнікі уніі мелі надзею атрымаць статус каталіцкага духавенства, а вярхоўная ўлада разлічвала на тое, што прыняцце царкоўнай уніі аслабіць уплыў на насельніцтва маскоўскай патрыярхіі.

У кастрычніку 1596 г. заключана Берасцейская царкоўная унія, паводле якой праваслаўная царква ў Рэчы Паспалітай аб'ядноўвалася з каталіцкай на ўмовах прызнання вяршэнства папы Рымскага. Годам раней, у 1595 г., фелінскі староста Марцін Курч даў купчую свайму сыну Яўстафію Курчу на чвэрць маёнтка, замка і мястэчка Сянна "з фундушамі і цэрквамі". У гэты час тут былі толькі праваслаўныя храмы, і сам фундатар быў праваслаўны, але ўжо ў 1609 г. той жа Яўстафій Курч будуе ў Сянне мураваны каталіцкі касцёл.

Унія выклікала пратэст часткі духавенства і насельніцтва. Абарона праваслаўя падтрымлівалася маскоўскай патрыярхіяй. Антыуніяцкія выступленні прывялі да таго, што на ўсходзе Беларусі засталіся ў XVII ст. праваслаўныя храмы. У 1625 г. у духоўнай грамаце Чэлінскага ўпамінаецца Кічынская праваслаўная царква, для якой жонка Чэлінскага павінна купіць рызы і кнігі для пастаяннага богаслужэння на "памін яго душы". У 1665 г. упамінаецца царква Спаса ў сяле Буй, у 1670 г. — Лугінаўская царква, у 1673 г. — царква святой Параскевы ў Пустынках і царква ў Нямойце.

Да 1700 г., пры уніяцкім епіскапе Кіпрыяне Жахоўскім, былі перададзены уніятам Беліцкі, Машчонскі, Буйскі, Нярэйшанскі і Кічынскі праваслаўныя храмы.

Павелічэнне попыту на хлеб у краінах Заходняй Еўропы садзейнічала развіццю гандлю збожжам. Павялічваючы колькасць ворнай зямлі, памешчыкі прымушалі працаваць на гэтай зямлі сялян. На змену ранейшай патрыярхальнай панскай гаспадарцы прыйшла фальварковая, якая арыентавалася, галоўным чынам, на рынак. Тут працавала ўжо не "чэлядзь нявольная", а селянін на паншчыне.

Фальваркова-паншчынная сістэма ва ўсходняй частцы Беларусі не мела такога развіцця, як у цэнтральнай частцы і на захадзе. Гэта тлумачылася блізкасцю рускай граніцы і пастаяннай барацьбой паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, у ходзе якой разбураліся і памешчыцкія, і сялянскія гаспадаркі, сяляне ўцякалі на Украіну і ў Расію.

Цікавасць уяўляе карта маёнткаў і дзяржаўных зямельных уладанняў, складзеная М. Ф. Спірыдонавым. У канцы XVI ст. на тэрыторыі сучаснага Сенненскага раёна ўпамінаюцца маёнткі ў Беліцы, Вялікім Сяле, Лемніцы, Ледневічах, Аксінічах, Кічыне, Машчонах, Лугінавічах, Ходцах, Берышаве і Гарыўцах. У Сянне і Машчаніцы былі замкі.

Частка вялікага сяла Алексінічы з прысёлкам, якія належалі Сапегам, у 1594 г. былі прададзены Стаброўскім "с людьми стародавно оселыми, зо всим на все ловы звериными и пташиными, з гоны бобровыми, з службами и повинностями подданых, з даньми грошовыми и медовыми" (Аникиевич К. Т. Сенненский уезд... с. 148).

Як сведчаць гэтыя звесткі, на Сапегу працавалі людзі "непахожыя (стародавно оседлые)", якія не мелі права пераходу з аднаго маёнтка ў другі. Паводле Статута ВКЛ 1588 г. яны былі канчаткова запрыгонены. Алексініцкія сяляне выконвалі "службу" і павіннасці. "Службу" — комплекс павіннасцей — выконвалі 2—3 ся-

лянскія гаспадаркі ("дымы"). Акрамя паншчыны 2—3 дні на тыдзень, сяляне плацілі даніну мёдам і грашыма ("чынш"). Памер грашовага чыншу на ўсходзе Беларусі з сярэдзіны XVI ст. да сярэдзіны XVII ст. узрос ў 1,5—2 разы.

У 1596 г. у Сянне, якое належала Яўстафію Курчу, павіннасці выконвала 21 сялянская гаспадарка ("дым"). Па існуючай градацыі ўсе землеўласнікі, на якіх працавалі менш за 24 сялянскія гаспадаркі, адносіліся да дробнапамеснай шляхты.

У пачатку XVII ст. Я. Курч скардзіўся на аболецкіх ксяндзоў і сялян маёнтка Вядцы, якія захоплівалі землі і рабавалі Сянно, Канеў і Пажэнкі. І толькі ў 1634 г. уладанні былі размежаваны. Пры гэтым размежаванні ўпамінаюцца сёлы Азярэцк, Ульянавічы, Русінава. Як і Алексінічы, гэта старэйшыя сёлы раёна.

У сярэдзіне XVII ст. у Сянне паявіўся новы ўладальнік, яго набылі буйныя магнаты Сапегі, якім ужо належала ў акрузе некалькі сёл.

У першай палове XVII ст. адбывалася далейшае павелічэнне паншчыны. Расла яна як у магнацкіх уладаннях, так і ва ўладаннях дробнай і сярэдняй шляхты. Акрамя паншчыны, шырокае распаўсюджанне мелі гвалты, талокі, загоны — надзвычайныя работы, якія былі звязаны са жнівом, сенакосам, ворывам, рамонтам млыноў, грэбляў, гацяў. Гэтыя павіннасці ў залік паншчынных работ не ўваходзілі. Не менш цяжкай была і падводная павіннасць. Селянін павінен быў дастаўляць панскія грузы на прыстань ці ў гандлёвыя цэнтры.

Паншчына ў сярэдзіне XVII ст., як і раней, была універсальнай. Сяляне лавілі рыбу для панскага двара, абмалочвалі ў "свае дні" збожжа з панскага поля, выходзілі на праполку агародаў у фальварку. Жанчыны, акрамя таго, абавязаны былі выпрабляць пражу, якую здавалі на панскі двор.

Галоўнымі плацельшчыкамі чыншу ў XVII ст. былі чыншавыя (кунічныя) сяляне. Істотных змяненняў у XVII ст. натуральны аброк не меў. Інвентары за гэты час, аднатыповыя ў пераліку натуральнай даніны, упамінаюць жыта, авёс, сена, дровы, пяньку, пражу, сеці.

Захаваўся інвентар, складзены ў 1665 г. па Палонненскаму землеўладанню. Уладанне складалася з двух маёнткаў: Палоннае і Нямойта. Да Палоннай належалі: а) м. Буй і ў ім 17 пляцаў і 15 маргоў зямлі, мяшчан-гаспадароў — 5, кожны меў па 1—2 пляцы і па 1 маргу зямлі і плацiў чынш па 30 грошаў; б) сёлы: Расходнае і Гарбуны (тут жылі цяглыя сяляне Фёдар і Андрэй Гарбуны і казак Неляповіч), Глебаўскія, Мікуліна, Баярскія і Шарапы, Клімовічы (населеныя выключна казакамі), Спіцы, Хамінічы, Чудскія (тут жылі кунічнікі Анікіевічы і цяглыя Ляпешкі). У пералічаных паселішчах было сялян-гаспадароў — 32, кожны меў па 1/4—2 валокі*, а плацілі чынш з валокі па 3 капы грошаў. Да маёнтка Нямойта належалі мястэчкі: а) Нямойта, у ім мяшчан-гаспадароў — 12, кожны меў па 1 пляцу, а плацiў чыншу з пляцу па 18 грошаў; б) Пустынкі і паселішчы: засценкі Валкоўшчына, Пеннае, Тукоўскі, сяло Забароўе, засценкі Скобелеўшчына, Гарбуноўскі, Колпыні, Савіна, Цішкоўшчына, сёлы Марозаўка, Домашава, Дварэцкія, Ракіты, Валодзькі, Хамёнкі, Чэртава, Зазер'е, Поршні, Мошкі, Кавалёва, Келесы, Івоніна, Лукоўцы, Галавачы, Вітунь. Сялян-гаспадароў — 62; кожны меў па 1/4 — 2 валокі зямлі і плацiў чыншу з валокі па 3—12 коп грошаў (Аникиевич К. Т. Сенненский уезд... С. 93—94). Як бачым з гэтага інвентара, у асноўным у маёнтках жылі кунічныя сяляне, якія плацілі грашовы чынш. Інвентар дае магчымасць вызначыць, што паселішчы былі вельмі маленькія, у асноўным у іх жылі 3—5 гаспадароў. Да нашага часу многія з гэтых паселішчаў не дажылі, а многія аб'ядналіся з буйнымі сёламі.

У 20—30-я гг. XVII ст. на Беларусі адбываліся выступленні сялян і гарадской беднаты супраць феадальна-прыгонніцкага ўціску. Многія далучаліся да казакоў.

Пасланцы Багдана Хмяльніцкага, пераапранутыя гандлярамі, жабракамі, ма-

---

* Валока — адзінка вымярэння зямельнай плошчы ў ВКЛ, роўная 21,36 га.

нахамі, у 1648 г. прыходзілі на Беларусь, заклікаючы сялян да сумеснай барацьбы супраць магнатаў і шляхты. "Ездят в Витебском уезде казаки, называются хмельницкого полку черкасами и к ним пристают многие голодные крестьяне". Антыфеадальныя выступленні сялян былі задушаны, але незадаволенасць сялян сваім становішчам прымушала іх шукаць падтрымкі на ўсходзе.

У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. жыхары ўсходняй Беларусі шукалі падтрымкі ў Маскве. Лавіна чалабітных грамат ішла да цара Аляксея Міхайлавіча з просьбай звярнуць увагу на становішча ўсходніх раёнаў Беларусі. Ад яго імя былі выданы граматы ваенным ваяводам аб тых паветах, якія схіляліся да таго, каб перайсці на бок Расіі. У гэтых граматах забаранялася рабаваць праваслаўнае насельніцтва. Непрыязна настроеная ў адносінах да рускага войска каталіцкая шляхта старалася таксама прывабіць на свой бок вялікую колькасць сялян. Бязлітасныя расправы над мясцовым насельніцтвам і рабаўніцтвы з боку расійскага войска прымусілі сялян абараняцца. Многія з тых, хто раней шукаў паратунку ў маскоўскага цара, выступалі ўжо супраць расійскіх ратнікаў, стварaючы атрады самаабароны. У афіцыйных расійскіх дакументах такіх сялян называлі шышамі. З імі рускія вялі жорсткую барацьбу. Як сведчыць адпіска ваяводы Пятра Далгарукага да Аляксея Міхайлавіча, шышы жывуць у сёлах Бікава, Машчонае, Гарадзец і Ульянавічы (Сапунов А. Витебская старина. т. IV, ч. 2. Витебск. 1885. С. 272).

Працяглая вайна Расіі з Рэччу Паспалітай скончылася для беларускага народа разарэннем і невымернымі людскімі стратамі. Тэрыторыя Беларусі заставалася ў складзе Рэчы Паспалітай.

Другая палова XVII ст. характарызуецца ўзмацненнем каталіцкай царквы як афіцыйнай у Рэчы Паспалітай. Пры садзеянні цэнтральнай улады, магнатаў і шляхты будуюцца новыя каталіцкія і уніяцкія касцёлы і кляштары. Акрамя кляштара ордэна францысканцаў, які быў пабудаваны ў 1609 г. ў Сянне, праз 60 гадоў быў узведзены дамініканскі манастыр у Беліцы.

У другой палове XVII ст., у неспрыяльных умовах паслявaеннага разарэння, аднаўляліся гарады і мястэчкі, асабліва прыватнаўласніцкія. Гэтаму працэсу садзейнічала павелічэнне долі грашовых плацяжоў у феадальнай рэнце. На чынш пераводзілася ўсё большая частка сялянства. Акрамя таго, магнаты мелі магчымасць выдаткаваць значныя сродкі на аднаўленне сваіх гарадоў і мястэчак. Так, напрыклад, Сапегі стараліся ператварыць усе свае гарады і мястэчкі ў развітыя гандлёва-рамесныя цэнтры, у тым ліку і Сянно.

Апошняя трэць XVII ст. была перыядам адносна мірнага развіцця, нягледзячы на цяжкасці аднаўлення. Але ў гэты час у асяроддзі магнатаў разгарнулася жорсткая барацьба за вярхоўную ўладу ў ВКЛ. У ёй удзельнічалі Радзівілы, Сапегі, Пацы і іншыя. У 80-я гады XVII ст. саперніцтва скончылася перамогай Сапегаў. Яны атрымалі ад караля высокія пасады ў дзяржаве. Але ў канцы XVII ст. беларуская і літоўская шляхта была незадаволена ўсеўладствам і злоўжываннямі Сапегаў. У лістападзе 1700 г. сумеснымі намаганнямі войска Сапегаў было разбіта і шляхта пачала рабаваць іх маёнткі. Не абышоў такі лёс і маёнткі ў Алексінічах, Сянне.

Не паспела поўнасцю аднавіцца сельская гаспадарка пасля вайны 1654—1667 гг., як на Беларусь прыйшла новая навала. Паўночная вайна Расіі са Швецыяй у 1-й чвэрці XVIII ст. яшчэ больш пагоршыла эканамічнае становішча на Беларусі, якая стала арэнай барацьбы ваюючых бакоў.

Праз Сенненшчыну праходзілі рускія войскі, што суправаджалася паборамі і бясчынствамі, асабліва з боку казакоў. Ёсць звесткі, што ў 1712 і ў 1714 гг. віцебскім ваяводам Пацеем былі вызвалены ад усялякіх павіннасцей маёнтак Шэлегаўка ў Машканскай воласці, а таксама маёнткі Кічына, Палоннае, Нямойта і Пустынкі (Аникиевич К. Т. Сенненский уезд..., с. 70). Пераходы і пастоі, а таксама зборы арміі на свае патрэбы былі вельмі цяжкімі для насельніцтва.

Пасля Паўночнай вайны вельмі марудна аднаўлялася сельская гаспадарка, эканамічнае ажыўленне назіралася ў асноўным у прыватнаўласніцкіх мястэчках і гарадах. Сянно да сярэдзіны XVIII ст. належала Сапегам, а затым перайшло да буйных магнатаў Агінскіх. Магчыма, яны набылі і іншыя ўладанні Сапегаў на тэрыторыі Сенненшчыны.

Да сярэдзіны XVIII ст. Рэч Паспалітая апынулася ў становішчы найвялікшай анархіі. Старыя феадальныя формы дзяржаўнага ладу зжылі свае магчымасці і прынялі пачварны выгляд. Магнаты і шляхта знясільвалі дзяржаву канфрантацыяй паміж сабой і цэнтральнай уладай. Сялянам жылося вельмі дрэнна. Нават прывілеяваным гарадам цяжка было пазбавіцца ад насілля вяльмож, бо ў кожнага было ўласнае войска, а суды ператварыліся ў пасмешышча. Асобныя групы магнатаў імкнуліся трымаць уладу ў сваіх руках, уплываць на караля, на сойм.

У гэты час на беларускіх землях узмацніўся і рэлігійны прыгнёт. У асяроддзі праваслаўных беларусаў быў моцны рух супраць акаталічвання. У асобе архіепіскапа магілёўскага Георгія Каніскага праваслаўнае беларускае насельніцтва бачыла цвёрдага барацьбіта не толькі за праваслаўе, але і за нацыянальную справу. Патрабаванні беларускай шляхты не ішлі далей за права выбірацца на ніжэйшыя пасады і ў сойм, але нават гэтыя патрабаванні здаваліся каталіцкай шляхце празмернымі.

Раздзіраемая ўнутранымі супярэчнасцямі, знясіленая войнамі, Рэч Паспалітая была падзелена паміж больш моцнымі суседнімі краінамі.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (да 1861 г.)

Пасля першага падзелу (1772) да Расіі адышлі частка Полацкага ваяводства на правым беразе Дзвіны, Віцебскае і Мсціслаўскае ваяводствы, памежныя тэрыторыі Мінскага ваяводства (Рагачоў, Гомель, Прапойск). З новых правінцый была створана Магілёўская губерня на чале з губернатарам генералам Кахоўскім. Полацкі і Віцебскі паветы былі далучаны да Пскоўскай губерні, аддадзенай пад кіраванне генералу Крачэтнікаву. Губернатары ад імя імператрыцы Кацярыны II склалі адозвы да насельніцтва, у якіх абяцаліся свабоды веравызнання, сцвярджэнне правоў на законную маёмасць, правы і вольнасці расійскіх падданых.

Палітыка Кацярыны II у адносінах да далучаных губерняў вызначалася з самага пачатку ўвядзеннем у краі расійскага заканадаўства, расійскага адміністрацыйнага падзелу і расійскай мовы ў якасці дзяржаўнай мовы навучання.

У 1773 г. Сянно было аб'яўлена павятовым цэнтрам Магілёўскай губерні. У 1778 г. зацверджаны план горада, а ў 1781 г. горад атрымаў герб: "в зеленом поле две золотые косы в знак изобилия сеном, от которого сей город и названье свое получил".

Як і ў кожным павеце, тут быў утвораны павятовы суд і ў ім так званая ніжняя расправа, у якой судзіліся недваранскія элементы: дзяржаўныя сяляне, што жылі ў былых старостаўскіх маёнтках, даволі шматлікі тут слой стараабраднікаў і вольныя людзі. Для дваран існавала верхняя расправа. Былі ўведзены таксама дваранская апека, павятовы спраўнік, або капітан, павятовыя казначэй, каморнік і доктар з вучнямі і іншыя павятовыя ўстановы і пасады. Для іх дзейнасці быў пабудаваны драўляны дом. У 1783 г. у Сянне была адкрыта паштовая кантора.

Далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расіі не сустрэла ніякіх перашкод. Насельніцтва прыняло прысягу і нават большасць беларускай шляхты не выявіла ніякіх варожых адносін да Расіі. Кацярына II вельмі лагодна паставілася да тых памешчыкаў, якія доўгі час упарціліся і не прымалі прысягі, павялічваючы тэрміны для прыняцця прысягі. Секвестраваныя (канфіскаваныя) маёнткі ў апазіцыйнай шляхты разам з казённымі землямі раздаваліся рускім памешчыкам.

Архівы зберагліі цікавыя дакументы Сенненскага павятовага суда канца XVIII ст.

У ім разглядаліся розныя справы, але больш за ўсё там знаходзіцца так званых купчых крэпасцяў і закладных распісак. Прадаваліся маёнткі поўнасцю альбо часткамі. Сярод пакупнікоў шмат вайсковых і грамадзянскіх чыноўнікаў. Маёнткі закладваліся таксама. Многа купчых крэпасцяў на продаж прыгонных сялян і іх дзяцей.

З сярэдзіны XVIII ст. Сянно належала буйным магнатам Агінскім і заставалася прыватнаўласніцкім горадам. Перапіс 1803 г. прыводзіць даныя, што ў гэты час у Сянне быў каменны францысканскі кляштар, пры ім вучылішча, каменны рымска-каталіцкі касцёл, пабудаваны яшчэ ў 1609 г. Я. Курчам. У ім знаходзіліся мошчы святога Фартуната, перанесеныя з Рыма ў 1772 г. па хадайніцтву Агінскіх. Гэта адзіныя мураваныя пабудовы ў Сянне. Была тут і праваслаўная драўляная царква ў імя прарока Іллі. Жыхароў у Сянне было 860 чалавек мужчынскага полу (яўрэяў — 480), каля 600 дамоў, усе драўляныя і старыя.

Аб становішчы сялян усходняй часткі Беларусі адразу пасля першага падзелу пісаў магілёўскі губернатар М. В. Кахоўскі. "Евреи обычно берут аренды всеми корчмами, напитками, мельницами заведуют, в контрактах домогаются, чтобы крестьянин покупал у них соль, рыбу, косы, вино, деготь и иные вещи. Крестьянину нельзя было продавать свои продукты: пеньку, мёд, хлеб, скот, птицу никому, кроме арендаря, так же крестьянин и на мельницу другую окромя арендаторской не властен ехать, а если на чужой мельнице смелет, то большому штрафу себя подвергнет. Если же крестьянин, не доложась арендарю, что ни на есть на сторону мог продать, такого вконец разоряет, который и после суда сыскать не может" (Державин Г. В. Соч. т. VII. СПб. 1872. С. 312).

Складаючы палову мужчынскага насельніцтва Сянна, яўрэі ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. займаліся гандлем, трымаючы большую частку лавак і пітных устаноў, а таксама трымалі ў арэндзе невялікія маёнткі, былі арандатарамі ў буйных магнатаў Агінскіх, якім належала Сянно і некалькі сёлаў. У 1826 г. Сянно перайшло да графа Серакоўскага.

У 1812 г. Расія падверглася ваеннаму нашэсцю французскай арміі. Не абмінула гэтая навала і Сенненшчыну. Насельніцтва падверглася рабаванню. Французы забіралі коней, жывёлу, прадукты харчавання, абкладалі насельніцтва непасільнымі падаткамі і кантрыбуцыяй. На ваенныя патрэбы забіралі збожжа, сена, гарэлку, кажухі, абутак і інш. Усё гэта заносілася ў раскладачныя ведамасці, якія складаліся ў Магілёве і накіроўваліся ў паветы.

За невыкананне паставак насельніцтва сурова каралася. Калі заможная, асабліва спаланізаваная, шляхта звязвала з Францыяй надзеі на аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., то сялянства ўсходняй часткі Беларусі аказвала французам супраціўленне. Яно пакідала свае дамы і цэлымі вёскамі накіроўвалася ў лясы. Захаваліся дакументы, якія сведчаць аб размаху партызанскага руху ў Багушэўску і акрузе.

На Сенненшчыне адбываліся і ваенныя дзеянні. Па дарозе з Бешанковічаў на Віцебск камандуючы 1-й рускай арміяй Барклай-дэ-Толі, закрываючы дарогу на Пецярбург, пакінуў на правым беразе Дзвіны войскі генерала Вітгенштэйна, супраць якога дзейнічалі французскія карпусы маршалаў Удзіно, Віктора і Сен-Сіра. Пасля некалькіх бітваў у Дрысенскім і Полацкім паветах Вітгенштэйн выціснуў непрыяцеля з Чашнікаў, пры гэтым французскія войскі пад камандаваннем Удзіно панеслі значныя страты і адступілі да Сянна. У Сянно прыбылі 3-і і 9-ы карпусы і прастаялі тут два тыдні. Французы абрабавалі правіянцкі магазін, дзе быў

Францысканскі касцёл Святой Тройцы ў г. Сянно. Не існуе.

значны запас збожжа, мукі, круп. Наступленне халадоў, нястача ежы і недахоп матэрыялаў для буданоў дрэнна адбіліся на здароўі французскіх салдат, распаўсюдзіліся захворванні. Пад націскам рускіх войскаў абодва карпусы адышлі да Чарэі, а затым да Лукомля.

Вайна 1812 г. прынесла Сенненшчыне вялікія бедствы. Шмат людзей загінула ад рук непрыяцеля, памерла ад голаду і холаду, скарацілася пагалоўе жывёлы, асабліва коней. Насельніцтва па-ранейшаму займалася земляробствам, але, як і ў другіх паветах, тут ішло абеззямельванне сялян.

Паўстанне 1830—1831 гг. да Сенненскага павета не дайшло. Яго ўдзельнікі былі разгромлены на мяжы Барысаўскага павета, але за ўдзел у паўстанні быў ліквідаваны Беліцкі дамініканскі кляштар, а манахі Лукомскага францысканскага кляштара пераведзены ў Сенненскі, які заставаўся да 1864 г. З 1833 г. па ўсяму Сенненскаму павету пачалі ўкараняць загад аб выкарыстанні маскоўскага служэбніка ў мэтах збліжэння уніяцкай царквы з праваслаўнай, быў зроблены новы іканастас для Пустынскай царквы. Уніяты аказвалі супраціўленне, але ў 1839 г. іх прымусова аб'ядналі з праваслаўнымі.

У 40-х — пачатку 50-х гг. вялікая частка маёнткаў Сенненскага павета ўсё яшчэ належала памешчыкам розных веравызнанняў. Так, напрыклад, маёнтак Ходцы належаў двараніну-лютараніну О. А. Рэйтэльну, Нямойта — дваранцы-каталічцы Т. А. Жукоўскай, а Берышава — праваслаўнай А. Лявонавай. Але сярод уладальнікаў ёсць ужо сельскія таварыствы і валасныя праўленні (Пустынкі і Аляксінічы) і царква.

Інвентары сведчаць, што ў большасці маёнткаў надта пашыранай была паншчына ў шэсць дзён: тры дні "работы мужчынскай" і тры дні "работы жаночай". Акрамя таго, сяляне павінны былі выконваць дадатковыя павіннасці. Гэта выклікала незадаволенасць, яны ўцякалі ад сваіх памешчыкаў. Такое становішча было да адмены прыгоннага права ў 1861 г.

Прамысловасць у той час амаль не існавала. У Сянне меліся два невялічкія гарбарныя і адно дрэваапрацоўчае прадпрыемствы. Некаторыя буйныя памешчыкі мелі невялікія бровары, дзе перапрацоўвалі частку збожжа на гарэлку і спірт. Дастатковая колькасць лясоў давала магчымасць выпрацоўваць смалу, дзёгаць і паташ. Нарыхтоўкай лесу і яго сплавам займаліся яўрэі. Гандаль не быў вельмі развіты, бо Сянно знаходзілася далёка ад асноўных шляхоў зносін. Гандлявалі з Віцебскам, Бешанковічамі і Оршай. Ажыўляўся гандаль толькі ў часы кірмашоў, якіх было ў Сянне 3: пакроўскі, мікалаеўскі (6 снежня) і навагодні. Вельмі вядомы быў кірмаш у Пустынках. На кірмашы сяляне везлі прадукты харчавання, скуры, мёд. Сюды прыязджалі купцы здалёку. У сярэдзіне XIX ст. у Сянне было 47 крамаў, якія вялі штодзённы гандаль. Толькі адна з іх была казённая, а 46 належалі гандлярам-яўрэям.

Асвета ў XVIII — першай палове XIX ст. на тэрыторыі сучаснага Сенненскага раёна была развіта слаба. Існавалі яўрэйская школа і вучылішча пры кляштары францысканцаў, заснаваным ў 1609 г. Была школа пры кляштары базыльянаў у Беліцы. Дзеці буйных памешчыкаў маглі вучыцца ў Полацку, Віцебску, Чарэі. Памешчыкі імкнуліся падрыхтаваць з асяроддзя сялян кваліфікаваных работнікаў, якія б асвоілі асновы аграноміі за параўнальна кароткі тэрмін. Недалёка ад Сянна знаходзілася Горы-Горацкая земляробчая школа, дзе рыхтавалі спецыялістаў як для дзяржаўных землеўладанняў, так і для маёнткаў.

З 40-х г. XIX ст. у вёсках адкрываліся пачатковыя школы, але ў Сенненскім павеце такіх школ было мала. Царскі ўрад не вельмі клапаціўся аб простых людзях. Да 1864 г. Сянно ўсё яшчэ заставалася прыватнаўласніцкім горадам, даходаў у гарадскую казну не паступала. У той час у Сянне пражывала 1007 мужчын і 723 жанчыны.

У 1848 г. у Сянно была занесена халера, ад якой памерла 118 гараджан і вельмі многа жыхароў навакольных вёсак. У 1860 г. Сянну зноў давялося перажыць няшчасце: здарыўся вялікі пажар, які знішчыў амаль усе драўляныя будынкі. Паколькі ў Сянне было толькі тры мураваныя пабудовы, то горад давялося будаваць нанова.

А. І. Залескі, В. Р. Федарасава.

Дакументы сведчаць

З АПІСАННЯ ПАВЕТАЎ І МЕЖАЎ ВАЯВОДСТВА ВІЦЕБСКАГА. 1566 г.

На первей почавше границею Московского зь Усвят и сь Всвята аж по Оболю реку у Двину, а рекою Двиною у верх до границы села Милковичъ, а оттоле суходоломъ селы на право у границу села Свежища, и в границу Лугиновскую, у границу Кривинскую, у границу Светскую, у границу Селедцовскую, у границу Бочейковскую, у границу Селецкую, Ведренскую, Чашнецкую и иных селъ, у границу Лошицкую, у границу Тяпинскую, у границу Белинскую, кгрунтом Болинским в реку Березыню, где впадывает Кривина у Двину, уверх Кривиною займуючи Сено зо всим и вятцо плебаньское, по границу князей Лукомских, Белицу со всим, Полоное и Лемница, а Оболцо, вси смолняне вси засекли на Белевъ брод, сельцо Мошковый баран со всим Романово, Дубровно со всим, Рососне, Любавичи, Микулино и вси княжата, панята в той границы, подлугъ постановил к его королевское милости маютъ одни суды и роки быти у Витебску, а в другие у двух недель у Ворши.

Сапунов А. Витебская старина. Т. IV, ч. 2. Витебск, 1885. С. 251.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ВАЯВОДЫ МІКІТЫ БАБАРЫКІНА З ВІЦЕБСКА АБ ВАЕННЫХ СПРАВАХ І НАВІНАХ. 1658.

А бывший де ротмистр Витепской шляхтич Аляксандра Юндил, да полоцкий шляхтич Казимир Храповицкий, да козачий сотник Шелепина, да Витепской шляхтич Ян Янушковской, с воровскими козаками собрався, стоять в Витепском уезде, в Мощенской волости, от Витепска за 50 верст и к ним Витепского уезда многие люди и мужики из сел, из деревень прибираются и пишутца в козаки, а собрався де, им ити в сход къ полковникамь: къ Слонскому, да к Лукомскому и к Лисовскому с товарыщи.

Сапунов А. Витебская старина. Т. IV, ч. 2. Витебск, 1885. С. 95.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ВАЯВОДЫ ПЯТРА ДАЛГАРУКАГА АБ РОЗНЫХ ВАЕННЫХ СПРАВАХ І НАВІНАХ. 1658.

В нынешнем, государь, году, декабря в 28 день, писал ко мне, холопу твоему Петрушке, голова московских стрельцов Василей Пушечников: пришел де он, Василей, в Витепске декабря 14, и околничей де и воевода Микита Михайлович Боборыкин сказывал ему, Василью: в Витепском де уезде во многих местечках бунтуютъ присяжная Витепская шляхта Янко Юндил съ товарыщи и шиши де в многих местах, и по садам и по деревням переезжая, живуть, а большое де тем ворам и присяжной шляхте и шишам пристанище в селехъ: въ Бикове, да в Мощеномъ, да в Городце, да в Ульяновичах, да в Сеньне, да в Пересецкого маетности, а те все близко подошли к селу Лукомлю. 11 декабря де в 16 день пришел он, Василей, в село Биковичи, в том селе поймали дву человек мужиковъ: и те мужики в разпросе сказали, что есть в двух местах в лесахъ станы — мужичье шишуютъ, а от села до Бикова с милю, а он де, Василей, на тех шишей посылал двести человекъ стрельцов и стрельцы де техъ шишей побили и станы их разорили и село Биково выжгли. 17 декабря та же участь постигла село Мощеное, а 20-го Городець.

Сапунов А. Витебская старина. Т. IV, ч. 2. Витебск, 1885. С. 99.

ВЫСОЧАЙШЕ УТВЕРЖДЕННЫЙ ДОКЛАД СЕНАТА ОБ УТВЕРЖДЕНИИ ГЕРБОВ ГОРОДОВ МОГИЛЕВСКОГО НАМЕСТНИЧЕСТВА.



ДОКЛАД

По именному Вашего Императорского Величества указу Могилёвская Губерния учреждена Намесничеством, и к оному приписаны города, но как Намеснический город Могилев и другие гербов не имели, то по приказанию Сената правящего должность Герольдмейстера Действительным Статским Советником Волковым, городам, сие Намесничество составляющим, гербы сочинены и представлены с описанием их оных за правило постановлено, что во всяком гербе города Могилевского Намесничества в щите была часть из герба Намеснического города по примеру прежде уже опробованных Вашим Императорским Величеством гербов как красками оных и обозначано. Сенат, рассмотрев, осмеливается всеподданнейше представить оные на высочайшую Вашего Императорского Величества комфирмацию и просить высочайшего указа.

ОПИСАНИЕ ГЕРБОВ ГОРОДОВ МОГИЛЕВСКОГО НАМЕСТНИЧЕСТВА

1. Могилевский. *В верхней части щита половина Российского герба, в нижней же старый* Могилевский герб, всадник на коне в красном поле, в знак того, что Намесничество присоединено к Империи Российской.

Верхняя часть щита с означением половины Российского герба в золотом поле, внесена во все вновь сочиненные гербы: в знак того, что те города принадлежат Могилевскому Намесничеству.

2. Чаусы.
3. Старый Быхов.
4. Оршанский.
5. Копысский.
6. Сенный.

В зеленом поле две золотые косы, знак изобилия сеном, от которого сей город и название свое получил.

7. Мстиславль.
8. Чериковский.
9. Климовичи.
10. Рогачевский.
11. Бабиновичи.
12. Белицкий.

Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. Г. Вільнюс. Полное собрание Законов Российской Империи. Т. 21. № 15206.

З ТАПАГРАФІЧНАГА АПІСАННЯ г. СЯННО

В Могилевское намесническое правление Бригадира Сенненского оберкоменданта и ковалера Ивана Дувана

1784 г.

РАПОРТ

Ея Императорского Величества указ из аднога намеснического правления 8 апреля 1784 года о присылек с запроса[1] выписок сведения личного сего года апреля 14 числа получили, по которому городу Сенну топографическое описание учиненное сведения в намесническое правление при сем представляются.

Сквозь город Сенно протекает речка малая, название никакого не имеет. Вершина оной у озера Куликовского, впадает в лежащее подле города озеро, названия не имеющее, а течение ее на две версты. Рыбы отменной в оной не имеется. Озеро возле города в правой стороне при большой дороге, вершина его зачинается от предместья, ширина его 220, глубина 33 сажени, длины на 5 верст[2] течение имеет в реку Двину, а в нём ловится рыбы щука, окунь, лещи, караси, редко — сомы.

Город окружен горами, лесами, малыми стоячими озерами, текучими речками.

Местное положение в окружность 3 версты 400 сажень[3], в длину 620 сажень, в ширину 390 *сажень, фигурою трапеция.*

Город Сенно название имеет по изобилию сеном, который разделен на три квартала. В первом квартале дом для правительства один, крестьянских домов 20, партикулярных 3, евреев 36, во втором — крестьянских — 8, партикулярных — 3, евреев — 37, в третьем — крестьянских — 18, партикулярных — 1, евреев — 5.

Построен шляхтичем Курчем и заселен сперва крестьянами.

Под владением был шляхтича Курча лет 100, у Станкевича — 10, у Залуцкого — 20, у воеводы Агинского — 25, а ныне у владении старосты Сироковского третий год.

Монастырь Францисканский каменный, в нём мощи святого Фортуната, которые перенесены из Рима в 1770 году, деревянная ветхая церковь, школа еврейская, деревянный казённый дом, почтовый дом деревянный, магазин деревянный, судебные места посещения с подвалами, владельческий дом, обывательский дом, крестьянских домов 6, партикулярных 7, еврейских 78, а всего 131, лавок деревянных 9, а гостинных дворов, училищ, воспитательных домов, больниц, богаделен, фабрик и городского укрепления, и для житья власти управляющими оные не имеются.

В городе Сенно раскольников не имеется, крестьянских душ мужчын 126, женщин 150, евреев мужчин 159, 140 — женщин.

Приходских церквей, а при тех священных церковных служителей, не имеется.

(Населен) католиками, униатами и евреями, а всех жителей мужского 285, женского 290.

Жители города евреи торгуют шелковыми материями, сукнами, нитками, холстами, сахаром, чаем, кофеем и прочими деревенскими товарами, а получают товары из Риги и близлежащих местечек Шклова и Смольян, от себя отправляют в Ригу пеньку, хлеб, семя льняное и конопляное суммою до 500 рублей, ремесло имеет изо евреев серебряное двое из крестиян кожевничают 4, кузнец 1, портных 4, сапожников 3.

Ярмарки бывают в городе мая 9 августа 15 декабря 6 по одному дню, приводят на те ярмарки рогатый скот и привозят хлеб, холст, колёса, сани деревянную посуду, простые деревенские продукты из близлежащих деревень.

Бригадир[4] и оберкомендант.

З запроса выписка.

Апреля 19 дня 1784 года города Сенно топографическое описание.

Библиотека Литовской Академии Наук, г. Вильнюс.

---

[1] Пытанні апушчаны, адказы аб'яднаны і скарочаны.

[2] Верста — 1,06 км

[3] Сажень — 2,13 м

[4] Бригадир — офицер русской армии XVIII в.

АХВЯРАВАННІ ЖЫХАРОЎ СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА НА ВАЙСКОВЫЯ ПАТРЭБЫ. 1812 г.

1. Хлеба естественного: муки — 3111 3/4; крупъ — 427 1/2, овса — 4942 1/2.

Составляет деньгами по существующим ценам в уезде — 95938 1/2; сена — 33087 1/4; составляет деньгами — 33087 1/4;

горячего вина — 1124 1/4; составляет деньгами — 5058 1/2;

рогатого скота — 355; составляет деньгами — 2425;

тулупов — 300; составляет деньгами — 3000;

сапог — 300; составляет деньгами — 1500;

лошадей подъемных артиллерийских — 72; составляет деньгами — 8640; подводы под курьеров — 3;

подводы на военные нужды — 600; содержание подвод в деньгах — 4338 1/4; лошадей не вернулось домой — 48.

Всего пожертвований составляет деньгами 163986 1/2.

Сверх вышесказанного, за взятые подводы во время проходов воинскими командами и полками взято в разные места и разстояния для своза аммуниции, обозов и прочих военных тягостей, кои по исчислению на одни сутки всего 4203 одноконные подводы, а считая за каждую 1 руб. 15 коп., всей суммы составляет 4833 руб. 45 коп.

Подписали: Маршал Иван Эрдман, земский исправник Полорацкой и земский заседатель Маевский.

Акты, документы и материалы для истории 1812 г. Т. III. СПб, 1912. С. 108—109.

З ГІСТОРЫІ г. СЯННО

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі выяўлены дакументы, якія ўяўляюць выключную цікавасць і несумненную каштоўнасць для гісторыі г. Сянно.

Вось адзін з гэтых дакументаў:

“Его сиятельному господину, тайному советнику, Могилёвскому гражданскому губернатору и кавалеру, графу Дмитрию Александровичу Толстому

Сенненского городничего

РАПОРТ

В выполнение указа Могилёвского губернского управления прошлого 1817 года от 31 июня под № 22582 о доставке Вашему сиятельству разных сведений, необходимых к отчётам Министерству полиции, эти по городу Сенно составленные за 1818 год, при этом Вашему сиятельству предоставляю, Генваря 11 дня 1819 года.

Ведомость о положении города Сенно, владетеля графа Сераковского, 1818 года

Число жителей	Мужчин	Женщин
церковных	11	7
дворян	29	23
дворовых людей	5	4
крестьян графа Сераковского, проживающих в городе и слободе	164	164
военных	91	20
мещан евреев	405	381
католических монастырей, каменных	1	
еврейских школ	1	
домов деревянных	198	
гаубтвахт	1	
будок для военных часовых	3	
шлагбаумов	2	

Лавок — 37, питейная контора — 1, пансион для дворянских детей — 1, винный погреб — 1, трактир — 1, мясной ряд — 1, баня еврейская, общая — 1, мельницы водяныя, графские — 2, колодцы — 6, кузницы — 2, рынок — 1.

Поскольку город Сенно владетельский, то наивысше конфирмованного о городах плана при полиции нет и потому в городе собственных домов построено не было.

В городе Сенно рек не протекает, а возле озера Сенненское, в которое течет по правой стороне ручей Кривцово (Крильцово — *ред.*).

...Прайшло 25 год з часу прадастаўлення гэтых звестак. 18 красавіка 1844 года сенненскі гараднічы прадаставіў губернатару гадавую справаздачу аб становішчы горада за 1843 год.

"Город Сенно, — адзначалася ў справаздачы, — находится при озере. Жители города удовлетворяются водой частью из озера, частью из колодцев, находящихся при домах, которых насчитывается 5. В городе находится мостов деревянных — 6, улиц и переулков немощеных — 6, площадь — 1, садов, частным лицам принадлежащих — 3, под садами и огородами — 279 квадратных саженей земли, огородов — 120, кладбищ — 3. В 1843 году озеро вскрылось 30 марта и покрылось льдом декабря 24 дня".

Гараднічы паведамляў далей, што ў Сянне ёсць адна драўляная царква і адзін манастыр, адна яўрэйская сінагога і 5 малітоўных школ, а ўсяго 246 драўляных і два мураваныя збудаванні, у якіх пражывае 843 мужчыны і 553 жанчыны. На працягу года нарадзілася 65 чалавек, а памёр 81 чалавек.

На асабістае харчаванне жыхароў забіта на працягу 1843 года быкоў і кароў — 150, бараноў — 80, цялят — 100, коз — 30, свіней — 20, або ў сярэднім на кожнага жыхара прыходзілася каля 20 кілаграмаў мяса ў год. У той час у горад было завезена 5270 пудоў хлеба, г. зн. у сярэднім на чалавека каля 6 пудоў хлеба. За год насельніцтву было прададзена каля 2000 вёдзер гарэлкі, віна і спірту.

У тым жа годзе ў Сянно гандлявалі 4 крамы, былі: 1 тракцір, 1 гасцініца, 1 вінны склеп і 27 піцейных дамоў. Насельніцтва горада абслугоўвалі 10 краўцоў, 5 шаўцоў, 4 кавалі, 3 гарбары, 5 мяснікоў і 2 рымары. Ніякай прамысловасці не было...

А. Кутузаў.

У парэформенны час

Звесткі аб сацыяльнай структуры насельніцтва Сенненскага павета напярэдадні адмены прыгону дае 10-ы (1858) перапіс падатковых саслоўяў Расійскай імперыі. Пераважную большасць складалі сяляне — каля 83% ад агульнай колькасці жыхароў. На другім месцы ішлі гарадскія саслоўі (мяшчане, гандляры, асабовыя і ганаровыя грамадзяне) — 11%. Дваранства не перавышала 2%. На долю ваеннага саслоўя прыпадала 2,6; духавенства ўсіх канфесій — 0,9; іншых — 0,5%.

Сярод сялянства асноўнай катэгорыяй да рэформы 1861 г. з'яўляліся памешчыцкія — амаль 74%. Гэта былі сяляне прыгонныя, яны лічыліся ўласнасцю сваіх гаспадароў, якія маглі іх закладваць у крэдытных установах, прадаваць, дарыць, распараджацца іх маёмасцю і г. д. За прадастаўлены памешчыкам надзел прыгонныя абкладаліся феадальнай зямельнай рэнтай, пераважна паншчынай.

Другой па колькасці катэгорыяй былі сяляне дзяржаўныя. Іх налічвалася 3824 душы абодвух полаў, ці 7,1% ад агульнай колькасці сельскага насельніцтва. У адрозненне ад памешчыцкіх сялян, яны былі асабіста свабоднымі, вялі ўласную гаспадарку на казённых землях, плацілі дзяржаве феадальную рэнту ў выглядзе грашовага аброку. Яны мелі права самастойна распараджацца сваёй рабочай сілай, весці гандаль, адчыняць фабрыкі і заводы, "владеть ненаселенными землями" (гэта значыць без прыгонных сялян) і інш.

Менш значнай катэгорыяй сельскага насельніцтва Сенненшчыны з'яўляліся так званыя аднадворцы. Напярэдадні сялянскай рэформы 1861 г. іх налічвалася 1689 чалавек, або 2,1%. Да іх адносілі былую шляхту, не зацверджаную ў дваранскіх правах. Яны абкладаліся асобым падушным падаткам, натуральнымі і грашовымі павіннасцямі нароўні з іншымі сялянамі ў залежнасці ад таго, на чыёй зямлі яны гаспадарылі — дзяржаўнай, уласнай, або памешчыцкай. Жылі яны пераважна асобнымі дварамі ў засценках ці ваколіцах і амаль нічым не адрозніваліся ад сялян.

Невялікую колькасць сельскага насельніцтва складалі яўрэі-земляробы, якіх налічвалася 506 душ абодвух полаў (0,6%). Пасля рэформы яўрэі былі пазбаўлены права набываць зямельную ўласнасць, ім

толькі дазвалялася арандаваць і прымаць у заклад прыватнаўласніцкія землі.

19 лютага 1861 г. быў абнародаваны царскі маніфест аб адмене прыгоннага права. На Беларусі рэформа ажыццяўлялася на аснове "Агульнага палажэння" і двух "Мясцовых палажэнняў". На Магілёўскую губерню, у якой знаходзілася большая частка сучаснага Сенненскага раёна, распаўсюджвалася "Мясцовае палажэнне аб пазямельным упарадкаванні сялян, уселеных на памешчыцкіх землях у вялікарасійскіх, новарасійскіх і беларускіх губернях" (далей — "Мясцовае палажэнне").

Паводле "Агульнага палажэння" сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і права свабодна распараджацца сваёй маёмасцю. Памешчыкі захоўвалі ўласнасць на ўсе землі, якія ім належалі, аднак былі абавязаны аддаць у карыстанне сялянам "усадебную оседлость" і палявы надзел "для обеспечения их быта и для выполнения их обязанностей перед правительством и помещиком".

"Мясцовым палажэннем" вызначалася пазямельнае ўпарадкаванне сялян і спецыфіка правядзення рэформы ў дадзеным рэгіёне. Устанаўліваліся вышэйшыя і ніжэйшыя памеры надзелаў. Вышэйшы надзел у Сенненскім павеце быў устаноўлены ў 4,5 дзес., ніжэйшы надзел — ад 1 да 2 дзес. на душу мужчынскага полу. Калі дарэформенны сялянскі надзел быў большы, чым вышэйшы, памешчык меў права адрэзаць лішак на сваю карысць. Так, паводле захаваўшыхся ўстаўных грамат па 232 маёнтках Сенненскага павета, сяляне валодалі да рэформы 84763 дзес. прыдатнай зямлі. Але ім было прадастаўлена ў выкуп толькі 69711 дзес., г. зн. адрэзкі склалі 17,8%. Пасля 1863 г. умовы рэформы палепшыліся, але адрэзкі захаваліся і складалі 10,4%. Пастаянныя зямельныя адносіны памешчыкаў і сялян, якія вызваляліся ад прыгону, вызначаліся ўстаўнымі граматамі.

Рэформа не задаволіла сялян. Ім цяжка было ўсвядоміць паняцце аб асабістай свабодзе ў спалучэнні з абавязковымі павіннасцямі на карысць памешчыка. Незадаволенасць спараджала чуткі аб фальшывасці Маніфеста і "Мясцовых палажэнняў". Сялянскі рух ахапіў усе беларускія губерні. Адбываліся хваляванні ў Сенненскім павеце, хоць ён і лічыўся адносна спакойным. Даводзячы да ведама Аляксандра II становішча спраў у Магілёўскай губерні ў лютым 1861 г., губернатар адзначаў: "Выпадкаў... непаслухмянасці сялян у Магілёўскай губерні было больш за 50... больш спакойнымі паветамі былі: Сенненскі, Чавускі, Чэрыкаўскі, у паветах жа Рагачоўскім, Гомельскім і Аршанскім хваляванне было больш моцным...".

У 1863 г. на Беларусі пачынаецца новы этап правядзення рэформы. Ён быў непасрэдна звязаны з паўстаннем у Польшчы, на Літве і Беларусі. Не абмінулі гэтыя падзеі Магілёўскую губерню, і непасрэдна Сенненшчыну.

Асаблівае значэнне надавалася паўстанню ў Магілёўскай губерні. Меркавалася, што адсюль рэвалюцыйныя падзеі распаўсюдзяцца і на ўнутраныя расійскія губерні. У пачатку красавіка 1863 г. сюды быў накіраваны Людвік Звяждоўскі (Тапор), якому было даручана кіраўніцтва ўсімі дзеяннямі паўстанцаў на ўсходзе. Да гэтага ў губерню прыбылі афіцэры К. Жаброўскі, А. Алендскі, Т. Будзіловіч, Я. Жукоўскі, якія пачалі фарміраваць паўстанцкія атрады ў Аршанскім, Сенненскім і Чэрыкаўскім паветах. Атрад Сенненскага павета пад кіраўніцтвам Жаброўскага, паводле планаў Звяждоўскага, павінен быў зацвердзіцца каля Лукомля, у тамтэйшых лясах, каля азёр і балот, і дзейнічаць на поўнач ад Магілёва. Але калі Жаброўскі прыбыў у вызначанае месца, замест 150 чалавек там сабралася толькі 23. Не падтрымалі паўстанцаў тутэйшыя сяляне. У Сенненскім павеце, на які кіраўнікі паўстання так разлічвалі, да іх прымкнулі толькі некалькі дзесяткаў чалавек. У выніку атрад Жаброўскага, які лукомскі ксёндз прывёў да прысягі, не налічваў і 100 чалавек. Зразумела, ісці з такімі сіламі на Сянно, дзе стаялі тры роты рэзервовых батальёнаў (у кожнай ад 50 да 100 салдат), было немагчыма. Жаброўскі на-

кіраваў свой атрад у Мінскую губерню. З таго часу ён з'яўляўся ў Сенненскім павеце толькі час ад часу. Неяк у пачатку мая, калі атрад Жаброўскага стаяў на маляўнічым беразе возера каля вёскі Падберцы, на яго натрапіла рота салдат. Хто здолеў, збег у лес. Астатнія, разам з абозам, трапілі ў палон. Рэшткі атрада Жаброўскага рассеяліся па Мінскай губерні, сам ён у хуткім часе трапіў у палон.

Масавае паўстанне не ўдалося, бо яго не падтрымалі сяляне. Здараліся і даносы. Аб гэтым сведчыць наступны факт. 6 снежня 1863 г. у Магілёве ўручаны медалі 63 асобам, якія асабліва вызначыліся ў барацьбе з паўстанцамі. Сярод іх аказаліся 56 сялян, 4 радавыя і 1 вольнаадпушчаны.

Але паўстанне ўсё ж вымусіла царскі ўрад пайсці на паляпшэнне ўмоў адмены прыгону. У беларускіх губернях пачала ажыццяўляцца праверка павіннасцей, прызначаных сялянам па ўстаўных граматах.

Разам з тым для беларускіх сялян уводзіўся абавязковы выкуп.

У жніўні 1863 г. генерал-губернатар Мураўёў выдаў цыркуляр аб надзяленні зямлёй сялян, зусім абеззямеленых памешчыкамі.

У выніку гэтых дадатковых мерапрыемстваў царскіх улад сяляне Сенненшчыны атрымалі ў надзел у сярэднім па 5 дзес. зямлі на адну рэвізскую душу. Такі надзел перавышаў сярэдні памер душавога сялянскага надзела адпаведна па Курскай губерні ў 2,3, па Маскоўскай — у 1,5 раза.

Да 1876 г. былі скончаны работы па зямельнаму ўладкаванню дзяржаўных сялян. У выніку рэформы агульная плошча землеўладанняў гэтай катэгорыі сялян павялічылася. У 1877 г. на кожны двор былых дзяржаўных сялян у Сенненскім павеце прыпадала на 14,3 дзес. зямлі, ці на 73,2% больш, чым у памешчыцкіх.

У парэформенны перыяд насельніцтва Сенненскага павета павялічвалася значна хутчэй, чым у феадальную эпоху. З 1861 г. па 1906 г. дынаміка яго характарызавалася наступнымі паказчыкамі:

Гады	г. Сянно			Павет			Усяго
	мужчын	жанчын	усяго	мужчын	жанчын	усяго	
1861	1112	1111	2223	31109	32493	63602	65825
1865	1557	1149	2706	38520	40781	79301	82007
1905	2509	2375	4884	95662	90302	185964	190848

Такім чынам, агульная колькасць насельніцтва за 45 год пасля адмены прыгону павялічылася амаль утрая (у 2,9 раза). У 1905 г. жанчыны складалі 48,6%, мужчыны — 51,4%.

Колькасць непадзеленых патрыярхальных вялікіх сем'яў скарачалася. У 1897 г. двары, на якія прыпадала больш за 10 чалавек, складалі 10,5%, па 6—10 чалавек — 24,4%, па 5 чалавек — 24,7%, па 4 чалавекі — 19,6%, па 3 чалавекі — 12,6%, па 2 чалавекі — 8,2%.

Звесткі аб складзе насельніцтва па саслоўях, веравызнанню, роднай мове дае ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. У Сенненскім павеце пражывала ўсяго 161652 чалавекі, з іх дваран 3369 (2,1%), духавенства — 466 (0,3%), купцоў — 117 (0,07%), мяшчан — 23470 (14,5%), сялян — 133754 (82,7%), прадстаўнікоў іншых саслоўяў — 476 (0,3%); праваслаўных — 134827 (83,4%), іудзеяў — 12544 (7,8%), рыма-католікаў — 9265 (5,7%), стараабраднікаў — 4605 (2,6%), пратэстантаў — 405 (0,3%), іншых — 6. Сваёй роднай мовай лічылі наступныя: беларускую — 138338 (85,6%), яўрэйскую — 12544 (7,8%), рускую — 5500 (3,4%), польскую 3823 (2,4%), латышскую — 365 (0,2%), нямецкую — 139 (0,08%), літоўскую — 79 (0,05%), мардоскую — 39 (0,03%), іншыя — 86 (0,05%).

Трэба адзначыць, што людзі розных веравызнанняў і нацыянальнасцей жылі

дружна. Гэта было абумоўлена добразычлівым характарам мясцовых жыхароў. "Тутэйшы беларус, — адзначана ў кнізе "Сенненский уезд Могилёвской губернии", — адрозніваецца многімі сімпатычнымі рысамі ў характары. Ён праўдзівы, смірны, добразычлівы, працалюбівы, з вялікім цярпеннем пераносіць усе нягоды жыцця... Сялянскія дзеці ў школах паказваюць добрыя поспехі, нягледзячы на неспрыяльныя хатнія ўмовы".

Пасля адмены прыгону паскоранымі тэмпамі развіваліся капіталістычныя адносіны. Але, як і ў першай палове XIX ст., галоўным заняткам асноўнай часткі насельніцтва было земляробства. Паводле перапісу 1897 г., ім займалася 87% жыхароў у павеце і 9% у м. Сянно.

Развіццё гэтай галіны гаспадаркі стрымлівалася рэшткамі прыгонніцтва, найцяжэйшым з якіх было буйное дваранскае землеўладанне. На пачатку XX ст. зямельныя ўгоддзі ў Сенненскім павеце былі размеркаваны наступным чынам: прыватныя ўладанні складалі 61,2% (258579 дзес.); надзельныя сялянскія землі — 35% (147942 дзес.), землі царквы, казны, розных устаноў — 3,8% (15892 дзес.). Прыватная ўласнасць падзялялася на 2 віды: асабістую і ўласнасць грамадстваў. І калі першая за 1877—1905 гг. зменшылася больш чым на 17 тыс. дзес., дык другая павялічылася амаль на 28 тыс. дзес.

У 1905 г. дваранам належала 180732 дзес. у 322 уладаннях. Гэта значыць, што 23,6% дваранскіх уладанняў уключалі амаль 70% асабістай зямельнай уласнасці ў павеце. У сярэднім на 1 гаспадарку тут прыпадала больш чым па 560 дзес., у той жа час у былых прыватнаўласніцкіх сялян прыходзілася ў сярэднім на 1 двор па 7,9 дзес., а ў былых дзяржаўных — па 9,6 дзес. зямлі.

Дадзеныя Магілёўскага губернскага статыстычнага камітэта сведчаць аб вядучай ролі зерневых у сельскай гаспадарцы Сенненшчыны. У канцы XIX — пачатку XX ст. амаль 90% пасяўных плошчаў прыпадала на зерневыя і каля 10% — на тэхнічныя культуры (у 1905 г. пад бульбай было занята 8,4%, ільном — 3,0% агульнай пасяўной плошчы).

Гаспадарыла на сялянскіх палетках, як і даўней, азімае жыта, на якое прыпадала больш за палову агульных плошчаў.

Ураджайнасць была невысокай. Так, у 1905 г. з казённай дзесяціны атрымлівалі: жыта, пшаніцы і грэчкі каля 4 чвэрцей (5,4 цэнтнера — *Э. С.*), ячменю 3,5 чвэрці (4,7 цэнтнера — *Э. С.*), аўса 5—6 чвэрцей (6,8—8,2 цэнтнера — *Э. С.*), бульбы 41 чвэрць (55,8 цэнтнера — *Э. С.*). І гэта не дзіўна. Буйных памешчыцкіх уладанняў з інтэнсіўнай гаспадаркай тут не было. Дробныя ўладальнікі і сяляне ўводзілі новае марудна. І на пачатку XX ст. галоўнай прыладай для апрацоўкі зямлі ў сялян была саха з двума жалезнымі лемяхамі і драўляная барана. Толькі заможныя сяляне абзаводзіліся плугамі, пачыналі выкарыстоўваць мінеральныя тукі. Сеялі ўручную, малацілі цэпам, ачышчалі зерне праз рэшата.

Лён і каноплі вырошчваліся сялянамі ў абмежаванай колькасці для ўласных гаспадарчых патрэб. Прамысловы характар ільнаводства мела толькі ў гаспадарках стараабраднікаў. Агародніцтва і садаводства ў сялян не было развіта. Сады разводзілі памешчыкі і потым часта здавалі іх у арэнду.

У другой палове XIX ст. прыйшла ў заняпад некалі даходная галіна сельскай гаспадаркі — пчалярства. Перапіс 1897 г. зарэгістраваў на ўвесь Сенненскі павет толькі 129 чал., для якіх пчалярства з'яўлялася дадатковым заняткам. Гэтым тлумачыцца і заняпад бобрскіх кірмашоў, дзе мёд быў асноўным таварам.

У нездавальняючым стане знаходзілася жывёлагадоўля. Адной з прычын гэтага была нястача пашы. І хаця назва Сенненскага павета, відаць, паходзіла ад таго, што тут было калісь шмат добрых лугоў, да другой паловы XIX ст. — пачатку XX ст. гэта ўжо не апраўдвалася. Пры існуючай цераспалосіцы травасеянне было немагчымым. Буйная рагатая жывёла, што разводзілася ў сялянскіх гаспадарках, была мясцовай дробнай пароды, не адрозніваласа добрымі якасцямі ні ў мясным, ні ў малочным накірунках. У маёнтках памешчыкаў можна было бачыць племян-

ную жывёлу, аднак на паляпшэнне пароды сялянскай жывёлы гэта не ўплывала. Вельмі дбайна адносіліся мясцовыя жыхары да авечкагадоўлі. Нават прымаўка існавала ў сялян: "Авечка кругом чалавека". Аднак распаўсюджванню авечкагадоўлі перашкаджаў часты паморак жывёлы, які адбываўся па прычыне неспрыяльных кліматычных умоў. Не дасягнула высокага развіцця і конегадоўля. За выключэннем некаторых памешчыцкіх гаспадарак, коні тут разводзіліся беларускай маларослай пароды.

Нізкі ўзровень тэхналогій сельскагаспадарчай вытворчасці, не вельмі ўрадлівыя землі былі прычынамі таго, што сяляне жылі вельмі бедна, ледзьве задавальняючы свае патрэбы ў самым неабходным. Недахоп хлеба звычайна кампенсавалі бульбай, ячменем, гароднінай. А вось як відавочца малюе жыццё і побыт сялянства: "Сям'я з 10—12 чалавек месціцца ў адным пакоі, зімой разам з цялятамі і авечкамі, спяць усе ўпокат на палацях і печы; карыстаюцца агульным посудам для ежы і піцця вады, агульнымі ўціральнікамі, часта і агульнымі лыжкамі".

Сацыяльна-эканамічныя падзеі другой паловы XIX—пачатку XX ст. спрыялі пэўным зрухам і ў развіцці прамысловасці, што можна праілюстраваць наступнай табліцай:

	Сянно			Павет		
	1881	1900	1906	1881	1900	1906
Прадпрыемствы	6	5	11	67	111	90
Рабочыя	7	12	20	198	324	410
Вытворчасць прадукцыі, руб.	950	4400	6520	80747	384145	390205

Каб прыстасавацца да капіталістычных змен, памешчыкі распачалі будаваць у сваіх маёнтках невялікія прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, а таксама дрэваапрацоўчыя. У 1906 г. на першую з гэтых галін прамысловасці прыпадала 83,5% усёй вытворчасці, на другую — 15,4%.

Распаўсюджанай галіной прамысловасці было вінакурэнне (амаль 70% агульнай вытворчасці). Галоўнай сыравінай для вытворчасці спірту была ў асноўным бульба, менш выкарыстоўваліся жыта і ячмень. Апроч таго, у Беліцы — у невялікай колькасці і авёс. Найбольш буйным вінакурным заводам на тэрыторыі сучаснага раёна быў завод Свяцкага ў Беліцы. У 1905 г. тут працавала 10 рабочых, якія вырабілі прадукцыі на 20872 руб.

Працавалі на такіх прадпрыемствах у асноўным сяляне з навакольных вёсак. Умовы былі надзвычай цяжкія. Пачыналі працу ў 2—3 гадзіны ночы, заканчвалі ў 18. Рабочы сезон цягнуўся з 15 кастрычніка да 15 мая, і ўвесь час рабочыя не мелі ніводнага дня адпачынку, акрамя калядных і велікодных свят. Частка рабочых з аддаленых вёсак мусіла спаць на бровары, на паравых катлах, у кажухах ці ў іншым верхнім адзенні.

Важнае месца ў прамысловасці займалі заводы па перапрацоўцы драўніны — галоўнага багацця краю. Выраблялiся прасцейшая мэбля, дошкі, гонта. Такі лесапільны завод быў у маёнтку Ходцы, які ў 1906 г. нарыхтаваў 3071 дошку на 214 руб.

Гарбарных заводаў на ўвесь павет было толькі пяць з 7 рабочымі, 3 з іх — у Сянно.

Побыт сялянства ў той час быў цесна звязаны з сельскагаспадарчым календаром. У вольны ад палявых работ час сяляне займаліся саматужнымі промысламі, у асноўным звязанымі з апрацоўкай дрэва. Бандарным промыслам зімою займаліся сяляне ў вёсках Пасемкавічы, Лагі, Забор'е, Глінаўка. Майстры вырабаў з лыка і кары жылі ў вёсцы Шарнева. Былі таксама свае шаўцы і краўцы, кавалі, кушняры, ганчары і г. д. Аднак з развіццём у Расійскай імперыі фабрычнай вытворчасці саматужныя промыслы пачалі прыходзіць у заняпад. І калі на пачатку 1880-х гг. у

Сенненскім павеце амаль 5 тыс. чалавек займаліся саматужнымі промысламі, дык перапіс 1897 г. зарэгістраваў толькі 2100 чалавек. Прычынай слабага развіцця саматужных промыслаў была таксама дарагавізна лясной і іншай сыравіны, адсутнасць прафесійных школ і крэдыту для саматужнікаў, якія ў выніку беднасці сваёй не мелі ўласных абаротных сродкаў. Вось і вымушаны былі сяляне ўсю зіму сядзець без працы, у той час як на мясцовыя кірмашы завозілі свае тавары саматужнікі з Калужскай губерні, дзе промыслы былі добра развіты.

Цяжкія жыццёвыя ўмовы вымушалі сялян час ад часу ўступаць у канфлікты з уладамі. Выступленні сялян у другой палове XIX ст. не вызначаліся масавасцю, упартасцю і наступальнасцю. Яны больш паходзілі на ўсплескі адчаю, якія хутка заціхалі.

Толькі ў канцы XIX—пачатку XX ст., калі да сялянскага руху далучыўся пралетарскі, які стаў дамінуючым, рух працоўных стаў больш арганізаваным і масавым. Асабліва бурны характар прынялі народныя хваляванні на пачатку XX ст. Пра ўдзел сялянства Сенненшчыны ў рэвалюцыі 1905—1906 гг. у павеце зарэгістравана 39 выступленняў. Але ўжо з пачатку 1907 г. наступіла пара глухой рэакцыі. Дынаміка выступленняў і іх характар бачны з наступнай табліцы:

Асноўныя формы сялянскага руху ў Сенненскім павеце ў 1905—1906 гг.

Віды руху	1905	1906	1907
Захопы раллі	—	—	—
Захопы сенажаці і пашы	1	—	—
Пасьба жывёлы	—	—	—
Парубкі лесу	2	—	—
Захопы фуражу, хлеба	—	—	—
Разгромы млыноў, запрудаў	3	—	—
Разгромы маёнткаў	—	—	—
Падпалы	—	—	—
Зняцце з работ батракоў	6	2	—
Забастоўкі батракоў	1	4	—
Адмаўленне ад выканання павіннасцей	—	1	—
Сутычкі з войскамі і паліцыяй	4	1	—
Сутычкі з памешчыцкай адміністрацыяй	—	—	—
Палітычныя выступленні	1	9	—
Іншыя віды руху	4	—	—
УСЯГО:	**22**	**17**	—

Развіццё капіталістычных адносін ва ўсіх галінах эканомікі патрабавала пашырэння пісьменнасці і асветы. Царскія ўлады мусілі прымаць пэўныя захады ў гэтым напрамку, правесці рэформу школы, каб прыстасаваць яе да патрэб эканамічнага развіцця краіны.

І на Сенненшчыне раслі культурныя запатрабаванні, разуменне ў народзе неабходнасці адукацыі. Але на развіццё школьнай сістэмы дзяржава выдаткоўвала нязначныя сродкі, а магчымасці насельніцтва былі абмежаваныя. Таму колькасць пісьменных расла вельмі марудна. Паводле перапісу 1897 г., пісьменнымі ў Сенненскім павеце былі 11,9% насельніцтва, у Сянне — 39,9%. Пісьменныя сярод сялян складалі 7,7%, а сярод жанчын гэты паказчык быў у 9 разоў меншым.

Сістэма школьнай адукацыі на тэрыторыі сучаснага Сенненскага раёна складалася ў капіталістычную пару з народных вучылішчаў, царкоўнапрыходскіх школ і школ граматы. Сярэдніх навучальных устаноў не было.

Народныя вучылішчы пачалі ствараць ца ў 1870-я гг., пасля таго, як у 1862 г. выйшаў указ аб адкрыцці пачатковых народных вучылішчаў у заходніх губернях. Прадметамі выкладання былі: навучанне дагматам праваслаўнай веры і царкоўным спевам, вывучэнне царкоўнаславянскай мовы, арыфметыкі і рускай граматы.

Працэс заснавання народных вучылішчаў ішоў марудна. У пачатку 1906 г. на Сенненшчыне іх было 20 (з 1699 навучэнцаў дзяўчынкі складалі толькі 11,5%). Адным з першых было заснавана ў 1862 г. Раснянскае народнае вучылішча. У 1864 г. адкрыта Сенненскае прыходскае вучылішча, у 1865 — Сенненскае павятовае 2-класнае вучылішча, ператворанае ў 1903 г. у гарадское 3-класнае, у 1866 г. — Ульянавіцкае, у 1869 г. — Машканскае, Хадчанскае, у 1871 г. — Какоўчынскае, Беліцкае, у 1903 г. — жаночае прыходскае вучылішча.

Вучэбны год у гэтых навучальных установах пачынаўся 1 верасня і завяршаўся 1 мая. На самой жа справе пачатак навучальнага года заўсёды адцягваўся і нават у кастрычніку яшчэ палова дзяцей не прыступалі да вучобы, бо былі заняты з бацькамі ў гаспадарцы. Ды і на працягу ўсяго навучальнага года бацькі час ад часу вымушаны былі адрываць сваіх дзяцей ад вучобы для хатніх работ або перарываць вучобу з-за адсутнасці цёплага адзення ці абутку. Тэрмін навучання складаў у аднакласных вучылішчах 3 гады, у двухкласных — 5 гадоў.

З пачатку 1880-х гг. пачалі адкрывацца царкоўнапрыходскія школы. Усе епархіі, у склад якіх уваходзілі беларускія губерні (Магілёўская, Літоўская, Полацкая, Мінская), знаходзіліся ў ліку пяці першых па колькасці школ, у разліку на 100 цэркваў. На тэрыторыі Сенненскага раёна іх колькасць вагалася. Так, у 1896—1897 навучальным годзе царкоўнапрыходскіх і школ граматы было 147, у 1904 — адпаведна 31 і 95.

Гэтага недастаткова для таго, каб народная асвета развівалася на належным узроўні. Трэба ўлічваць і малую напоўненасць царкоўных школ. Вучэбны працэс у іх вёўся на нізкім ўзроўні. Беднасцю сялян тлумачылася тое, што некаторыя школы, утвораныя як царкоўнапрыходскія, з цягам часу пераходзілі ў разрад больш нізкі — у школы граматы.

У пачатку XX ст. пачаўся працэс беларускага Адраджэння. З'явіліся першыя масавыя беларускія газеты "Наша доля" і "Наша Ніва". Адкрываліся першыя беларускія школы. У гэты час вельмі яскрава праяўляецца талент выдатных класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы, Я. Коласа, А. Пашкевіч (Цёткі).

З снежня 1903 г. да вясны 1904 г. Я. Купала працаваў на Сенненшчыне ў маёнтку Беліца.

Яшчэ горш, чым асвета, было наладжана медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. Бывалі выпадкі, калі эпідэміі ахоплівалі да 30 населеных пунктаў, як, напрыклад, брушны тыф у 1905 г. На павет прыпадала ўсяго па аднаму ўрачу, не хапала лячэбніц, медыцынскага персаналу, аптэк.

У выніку такога становішча працягласць жыцця была невысокай. Па перапісу 1897 г. бачна, што насельніцтва, узрост якога перавышаў 60 гадоў, складала ў Сенненскім павеце толькі крыху больш за 6%. Людзі ва ўзросце да 40 гадоў складалі 80%. Тыя, хто дасягаў 40—49 гадоў, складалі 7,7%, 50—59 гадоў — 5,6%.

У эканамічным жыцці сенненскай вёскі пэўную ролю адыграла сталыпінская аграрная рэформа, бо тут абшчыннае землеўладанне складала 86,7%.

Асноўным прынцыпам сталыпінскай рэформы быў дазвол свабоднага выхаду з абшчыны і ўстанаўлення асабістай гаспадаркі. А галоўны змест рэформы — разбурэнне абшчыны, стварэнне хутароў і адрубоў. Да 1916 г. у Сенненскім павеце выйшла з абшчыны і замацавала ўчасткі ў асабістую ўласнасць каля 60% усіх абшчыннікаў. Што ж тычыцца перасялення, дык даведзеным да галечы сялянам не пад сілу было асваенне ўскраінных зямель. З 159074 чалавек, якія перасяляліся з Магілёўскай губерні (47,3% усіх перасяленцаў з 5 беларускіх губерняў) у 1907—1914 гг., вярнуліся дадому 17138 чалавек, ці 10,8%.

Голад і разарэнне прынесла працоўным першая сусветная вайна. Асабліва згубны ўплыў аказала вайна на гаспадарку тых мясцін, якія апынуліся ў прыфрантавой зоне. Да іх адносілася і Сенненшчына.

З самага пачатку вайны беларускія губерні былі аб'яўлены на ваенным ста-

новішчы, царскія ўлады ўвялі тут люты рэжым тэрору. Яшчэ 25 ліпеня 1914 г. міністр унутраных спраў загадаў магілёўскаму губернатару: "надо стрелять при усмирении беспорядков... их усмирять надо беспощадно". Да пачатку ўсеагульнай мабілізацыі былі прыведзены ў баявую гатоўнасць паліцыя і жандармерыя.

Але гэта не дапамагло. Гады, якія папярэднічалі вайне, характарызаваліся ўзмацненнем рэвалюцыйнай барацьбы беларускага сялянства з царызмам, памешчыкамі і кулакамі. Сацыяльна-эканамічныя перадумовы — аб'ектыўная аснова сялянскага руху ў рэвалюцыі 1905—1907 гг. — не былі ліквідаваны. Стальпінская ж рэформа, не знішчыўшы прыгонных перажыткаў, яшчэ больш узмацніла расслаенне сялянства, абвастрыла класавыя супярэчнасці ў вёсцы. Глыбіня народнага гневу і нянавісці да эксплуататараў і самадзяржаўя найбольш яскрава выявілася з аб'яўленнем мабілізацыі. У той ці іншай форме хваляванні ахапілі 20 з 35 беларускіх паветаў.

Найбольш моцнымі яны былі ў Сенненскім павеце. У данясенні ў Міністэрства ўнутраных спраў магілёўскі губернатар адзначыў: "Мобилизационный период сопровождался рядом учиненных запасными в различных пунктах губернии беспорядков и грабежей, принявших особо острый характер в Сенненском уезде, где при содействии крестьян был разграблен ряд помещичьих усадеб и экономий... Настроение запасных и всего населения Сенненского уезда неспокойное. Запасные в особенности питают злобу к помещикам".

У Сенненскім павеце былі разгромлены 11 казённых вінных крам і 12 маёнткаў, а ў Пачаевічах і Ходцах, апроч таго, правялі масавую парубку памешчыцкіх лясоў і падпалілі пасевы збажыны.

Карны атрад у Сенненскі павет узначаліў асабіста губернатар. Ён аддаў загад падвяргаць удзельнікаў нападаў на памешчыцкія маёнткі лупцоўцы розгамі і спальваць іх жыллё і маёмасць. Чатырох удзельнікаў антыпамешчыцкіх выступленняў ваенна-палявы суд прыгаварыў да пакарання смерцю праз павешанне, і 23 ліпеня прыгавор выкананы. Аб'явы аб гэтым пакаранні былі распаўсюджаны па ўсёй губерні з пагрозай ужываць такую ж меру да ўсіх удзельнікаў хваляванняў.

Найбольш цяжкія страты вайна нанесла сялянскай гаспадарцы, асабліва бядняцкім і серадняцкім дварам. Сярод фактараў, якія адмоўна паўплывалі на стан сельскай гаспадаркі, трэба перш за ўсё назваць памяншэнне колькасці рабочых рук на вёсцы. Па афіцыйных дадзеных у Сенненскім павеце было мабілізавана больш за палавіну мужчын працаздольнага ўзросту. На пабудову абарончых збудаванняў, перавозку вайсковых грузаў, прагон гуртоў жывёлы, ахову чыгунак прыцягвалася практычна ўсё працаздольнае насельніцтва.

На сялянскіх гаспадарках таксама цяжка адбівалася перамяшчэнне бежанцаў і армейскіх атрадаў з абозамі, якія на сваім шляху забіралі харчаванне, фураж, спусташалі пасевы, сенажаці. Так, толькі ў 1914—1915 гг. цераз Магілёўскую губерню прайшло больш за мільён бежанцаў. На прадметы першай неабходнасці існавала небывалая дарагавізна. Забеспячэнне харчаваннем да пачатку 1917 г. было цалкам дэзарганізавана. Да сакавіка 1917 г. цэны ў Магілёўскай губерні ў параўнанні з ліпенем 1914 г. павялічыліся, напрыклад, на збожжа на 507%, аржаную муку — 524, на мяса — 527, на масла на 750% і г. д.

Такім чынам, імперыялістычная вайна шматкроць паскорыла працэс збяднення працоўных. На пачатак 1917 г. насельніцтва апынулася на мяжы голаду.

Натуральным вынікам усяго сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Расіі ў першыя два дзесяцігоддзі XX ст., нарастаючага па ўсёй імперыі рэвалюцыйнага руху, з'явілася падзенне ў лютаўскія дні 1917 г. самадзяржаўя. Улада перайшла да Часовага ўрада.

У Сенненскім павеце раззбраенне і арышты паліцыі адбыліся ў першы тыдзень сакавіка 1917 г. Савет у Сянне быў створаны ў другой палове месяца. На чале новых органаў улады станавіліся ў асноўным памешчыкі. Бальшавіцкія агітатары,

выступаючы на сялянскіх сходах, заклікалі не падпарадкоўвацца ўладам, дзяліць памешчыцкія землі, ствараць новыя органы ўлады. Пачалі стварацца валасныя і сялянскія камітэты, якія дзялілі памешчыцкую зямлю і маёмасць, праводзілі арышты, вобыскі, змяшчалі з пасад багацеяў. Падзеі працягвалі развівацца далей, бо Часовы ўрад не вырашыў важнейшыя праблемы: не ліквідаваў памешчыцкае землеўладанне, не скончыў вайну. Голад і разруха ўсё больш ахоплівалі краіну.

Э. М. Савіцкі.

Дакументы сведчаць

1862 г., СНЕЖНЯ 22. ДАНЯСЕННЕ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ ПРАЦЯГУ ХВАЛЯВАННЯЎ СЯЛЯН МАЁНТКА СОРЖЫЦЫ СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА

Из донесений моих в. в. п. известно, что в Соржицком имении помещика Глушановского Сенненского у. в последнее время обнаружилось неповиновение крестьян. Хотя командирование военной команды водворило, казалось, спокойствие, но вскоре по выходе ее оказалось, что покорность крестьян была только временной, вызвана моральным влиянием военной команды, и беспорядок затем возобновился: крестьяне стали вновь уклоняться от исполнения повинностей и противиться введению уставных грамот. Вследствие чего данной по этому делу помещиком Глушановским записки в губернское присутствие, оно нашло необходимым командировать особого чиновника для более серьезных распоряжений и окончательного водворения порядка в имении. Я пригласил поэтому съехать в им. Соржицы г-на вице-губернатора с капитаном Корпуса жандармов Вечесловым. Ныне д. с. сов. Буцковский уведомил меня, что меры кротости не имеют влияния на соржицких крестьян, что они решительно отказываются от принятия уставных грамот, отказались выслать по требованию г-на Буцковского поверенных от обществ для разъяснения им правил Положения из одного опасения, что им будут говорить про грамоты, отняли у старост штемпеля, чтобы на случай они не приложили их к грамотам, Становому приставу, пытавшемуся собрать крестьян, наделали дерзости, забили в кандалы одного из крестьян, изъявившего желание принять грамоту, и объявили, что они [ждут] от царя милости через посланного в Петербург просителя (Филиппа Матвеева), который еще не возвратился, — предписание в. в. п. 12 декабря № 10703, и что у них есть своя грамота, как оказалось, — копия проповеди архимандрита Александро-Невской лавры.

Д. с. сов. Буцковский просил поэтому моего распоряжения о высылке в Соржицы 2 рот гарнизонного батальона. Принимая во внимание, что беспорядки в Соржицком имении, по значительности его, имеют влияние на соседние имения, что в имении этом не раз и в прежние годы была военная команда и что поэтому без нее нельзя надеяться на водворение прочного порядка, я просил по телеграфу г-на начальника Витебской губ. сделать распоряжение о командировании в Соржицы 2 рот Витебского гарнизонного батальона (Витебск от Соржицы 40 верст, а Могилев до 175), командиру же Могилевского батальона внутренней стражи предложил командировать туда 1 роту, которая, по прибытии, сменит витебских и во всяком случае должна будет остаться на некоторое время на квартирах в Соржицах.

О последующем буду иметь честь донести в. в. п.

Гражданский губернатор *Беклемишев.*

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.). Мн., 1959. С. 428—429.

1863 г., СТУДЗЕНЯ 24. ДАНЯСЕННЕ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ ПАДАЎЛЕННІ ХВАЛЯВАННЯЎ СЯЛЯН МАЁНТКА СОРЖЫЦЫ СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА

В дополнение к донесению моему от 22 декабря № 7567 имею честь донести в. в. п., что по прибытии 23 декабря в Соржицкое имение 2 рот из Витебска и по арестовании при помощи солдат 2 главных виновных в возбуждении крестьян к беспорядкам и неповиновению 24 числа собраны были в с. Соржицу все наличные крестьяне Черногостянской вол., и когда д. с. сов. Буцковский разъяснил им их права и обязанности по Положению и ответственность, какой они подвергают себя за сопротивление распоряжениям начальства, а также про-

чел им слова, сказанные г. и. в Москве 25 ноября крестьянам, то хотя собранные крестьяне стали на колени с видом покорности, но не выказали никакого раскаяния, не хотели назвать главных зачинщиков, крича, что все они одинаково виноваты, и с дерзостью отзывались против помещиков.

При таких обстоятельствах, когда меры убеждения и кротости не оказывали никакого успеха, г-н Буцковский вынужден был снять знаки с 3 старост, оговариваемых в действии заодно с крестьянами и отдавших им добровольно свои штемпеля, и отдать под суд арестованных зачинщиков. Затем, дав крестьянам 2 дня одуматься и раскаяться, с предварением, что если они и после того останутся при том же упорстве, то будут приняты более строгие меры к вразумлению их, вынужден был подвергнуть легкому телесному наказанию 8 чел. крестьян как за ослушание его распоряжениям, так и обнаруженную дерзость при разговоре его с крестьянами, тем более, что между крестьянами существовало твердое убеждение, что наказывать их никто не смеет. В продолжение этого времени задержаны и другие укрывавшиеся виновные, а также дьячок Соржицкой церкви и мещанин мест. Островно Балтович, обвиняемый в подстрекательстве крестьян и сборе денег, и затем сделано распоряжение о производстве по этому возмущению формального следствия в присутствии капитана Корпуса жандармов Вечеслова.

Последствия всех этих мер сказались 26 числа утром благодетельными: крестьяне начали сознавать свои заблуждения и раскаиваться.

При такой благоприятной перемене в настроении умов крестьян 2 роты Витебского батальона 27 числа отправлены в Витебск, а место их заняла прибывшая 26 числа рота Могилевского батальона впредь до окончательного восстановления в Соржицком имении спокойствия и порядка. Затем, по введении в действие уставных грамот в остальных деревнях Соржицкого имения, крестьяне, собравшись 31 декабря в Черногостяно в волостное правление, дали обещание, что между ними не произойдет уже более беспорядков и что они будут беспрекословно исполнять приказания начальства, вследствие чего рота Могилевского батальона отправлена 2 января в Могилев, и порядок и спокойствие с того времени не нарушались.

К сему долгом считаю присовокупить: 1) что главные виновники возмущения 5 крестьян подвергнуты судебным следователем тюремному заключению, главнейший же агитатор — отставной унтер-офицер Герасим Иванов — успел скрыться, но к отысканию его приняты самые деятельные меры и 2) что по выходе из Соржицкого имения солдат и по выезде г-на Буцковского крестьяне вошли с владельцем в соглашение о выкупе, и составленный в том договор 16 января представлен в губернское по крестьянским делам присутствие.

Обращаясь затем к причинам возникших в Соржицком имении беспорядков, не могу умолчать, что первоначальным поводом к неудовольствиям крестьян к владельцу были неблагоразумные распоряжения экономии как в отношении поздней подачи уставных грамот в цели продолжать 3-дневную барщину, так и в разграничении угодий, последствием коих некоторые из пахотных крестьянских земель предположено было отрезать в пользу владельца, а крестьянам предоставить в надел заросли. Это обстоятельство при 3-дневной барщине и вообще худом качестве почвы земли, а также при несправедливых стеснениях крестьян относительно топлива, возбудило явное неудовольствие и недоверие их к действиям экономии.

При таком положении дела явились подстрекатели. Одни из них начали обрисовывать крестьянам 40-дневную барщину самыми ужасными красками, угрожая бесконечной послугой, непосильными урочными трудами, невыносимыми расчетами и пр., другие, под предлогом избавить их от такого тяжелого положения, не замедлили указать им путь к бессмысленным затеям. Так, унтер-офицер Герасим Иванов принес им из Петербурга печатную проповедь архимандрита Александро-Невской лавры, называя ее царской грамотой, которую будто бы дал ему кн. Суворов. В этой мнимой грамоте крестьяне не нашли ничего о 40-дневной барщине и еще более утвердились в намерении не принимать более никаких грамот и не слушать властей, действия которых, по их мнению, были противны воле государя. Руководимые такими убеждениями, крестьяне бессознательно решились жертвовать последним достоянием и снарядили несколько человек в Петербург, чтобы тем лично от государя услышать истинную его высочайшую волю.

Много нужно было опытности и благоразумия, чтобы, не принимая строгих мер, разубедить крестьян в их твердо сложившихся и окрепнувших заблуждениях и восстановить нарушенный порядок, и в этом отношении я приятной обязанностью считаю заявить пред в.в. п. как об усердии и распорядительности д. с. сов. Буцковского, который с таким успехом окончил это дело, так и полезном содействии в этом деле члена от правительства в мировых съездах Лешко, который, будучи хорошо знаком с крестьянским делом, много способствовал к мирному окончанию соржицкого дела.

Гражданский губернатор *Беклемишев.*

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.). Мн., 1959. С. 429—431.

ЗАХОП СЯЛЯНАМІ ВЁСАК УЗДОРНІКІ І РУДНІЦЫ СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА МАЁНТКА ВАНЬКОВА

Тэлеграма памешчыка Багушэўскага міністру ўнутраных спраў 1899 г. (верасень...)

Крестьяне деревень Уздорники и Рудницы Сенненского у. разоряют мое им. Ваньково. 7 сентября подожгли лес, умышленно разорили изгородь, стравили поля, луга, гумно, самоуправно засеяли семенами обработанную и унавоженную мною мою землю, не пускают моих рабочих сеять рожь, насильственно прогнали моих рабочих, бросают [в них] камнями. Местная администрация не принимает никаких мер к моей защите. Всепокорно прошу защиты в. в.

Дворянин Могилевской губ. Сенненского у. Ульяновичской вол. Ольгерд Богушевский.

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Т. 3. Мн., 1953. С. 359.

Сялянскі рух на Сенненшчыне

Напярэдадні і ў ходзе першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг. сялянскі рух на Сенненшчыне па свайму размаху займаў адно з першых месц у Магілёўскай губерні.

У верасні 1899 г. жыхары вёсак Уздорнікі і Рудніца паўсталі супраць прыгнятаўшага іх памешчыка Багушэўскага. У маёнтку Ванькова яны падпалілі панскі лес, зрабілі патраву пашы і лугоў, захапілі частку зямлі.

Восенню 1904 г. на Сенненскім прызыўным пункце ўспыхнула хваляванне салдат запасу, для падаўлення якога былі кінуты казакі і паліцыя.

У час рэвалюцыі працоўныя павета з новай сілай выступілі на барацьбу з самадзяржаўем. На гэты раз імі кіравалі сацыял-дэмакраты. У красавіку 1905 г. група сялян распаўсюджвала сярод насельніцтва рэвалюцыйныя заклікі ("Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!"), гаварылі аб цяжкім становішчы працоўных павета, аб неабходнасці барацьбы супраць самадзяржаўя.

Талачынская арганізацыя РСДРП распаўсюджвала сярод насельніцтва Сенненшчыны адозвы Магілёўскай раённай арганізацыі Палескага камітэта РСДРП аб узмацненні барацьбы супраць памешчыкаў і капіталістаў.

Адным з кіраўнікоў сялянскіх выступленняў быў слесар Пуцілаўскага завода Афанасій Іванавіч Шыбека, які прыбыў на радзіму з Пецярбурга. У данясенні магілёўскіх жандараў Дэпартаменту паліцыі гаварылася, што А. І. Шыбека "стаў агітаваць сялян да ўжывання насілля над памешчыкамі, прычым меў вялікі ўплыў на іх. Пад яго кіраўніцтвам жыхары вёсак Луг, Леснікова Раснянскай воласці ў колькасці 300 чалавек 27 лістапада прыйшлі ў маёнтак Барок памешчыка Каралька і прагналі ўсіх рабочых, патрабуючы павышэння заработку. 29 лістапада сяляне вёсак Вуглы, Буглаі, Казлы, Падворыца Какоўчынскай воласці ў колькасці 150 чалавек прагналі рабочых з маёнтка Канстантова памешчыка Абязерскага. У гэты ж дзень жыхары вёсак Стрыгі, Дубаўцы і Замошша Машканскай воласці (да 100 чалавек) з'явіліся ў маёнтак Шыркаўка да памешчыка Валчанскага і выгналі рабочых з маёнтка Янова, які належаў памешчыку Сульжынскаму, а 4 снежня ў Обалі — памешчыка Дамброва. Ва ўсіх выпадках сялянамі кіраваў Шыбека, які гаварыў, каб яны прагналі памешчыкаў і забралі іх землі".

У 1906 г. на Сенненшчыне мелі месца неаднаразовыя выступленні сялян, высечкі лесу, прычым сяляне аказвалі ўзброенае супраціўленне карным атрадам.

Нягледзячы на разгул рэакцыі, рух "за зямлю і волю" працягваўся.

У 1907—1909 гг. у 5 паветах Віцебскай і Магілёўскай губерняў адбыліся 163 сялянскія выступленні, накіраваныя супраць хутарызацыі. Большасць іх прыходзілася на Чавускі, Сенненскі, Горацкі і Віцебскі паветы.

На працягу 1913 г. і 7 месяцаў 1914 г. найбольш актыўным сялянскі рух быў на Сенненшыне. Сяляне вялі барацьбу супраць памешчыцкага землеўладання, прыгонніцтва, сталыпінскай рэформы, кулакоў. Шэраг такіх выступленняў насіў форму адкрытай барацьбы з царскімі ўладамі.

У ліпені 1914 г. па Магілёўскай губерні пракаціліся хваляванні салдат-прызыўнікоў. Пракурор Магілёўскага акружнога суда данасіў у Міністэрства юстыцыі, што ў горадзе Сянно селянін з вёскі Замошша Захар Елішаў агітаваў запаснікоў не ісці на вайну, змагацца з памешчыкамі. На другі дзень той жа Захар Елішаў гаварыў: "Навошта нам, сялянам, ваяваць? Мы зямлі не маем. Уся яна ў памешчыкаў, а іх на вайну не бяруць".

У гэты час вялікую работу сярод насельніцтва праводзілі бальшавікі. Пад уплывам іх прапаганды навабранцы і сялянская моладзь грамілі маёнткі, вінныя крамы, склады. Так былі разгромлены маёнткі Ходцы і Бікава. Для падаўлення хваляванняў на Сенненшчыну былі кінуты карнікі на чале з самім губернатарам. Апошні паведамляў у Міністэрства ўнутраных спраў, што "хваляванні, ахопліваючы ўсё большую тэрыторыю павета, узнікалі адначасова ў розных месцах. Акрамя дакладаў службовых асоб, да мяне прыходзіла многа тэлеграм ад прыватных асоб з просьбамі аб дапамозе. Прыходзілася дзейнічаць хутка". Аднак патушыць полымя барацьбы было цяжка.

Адначасовыя выступленні навабранцаў і сялян мелі месца і ў наступныя гады імперыялістычнай вайны. Так, у верасні 1916 г. яны секлі лес у вёсках Вялікае Сяло, Падворыца і ў іншых.

Царызм жорстка распраўляўся з паўстаўшымі. У Сенненскім павеце пасля ліпеньскіх падзей 1914 г. і разгрома маёнткаў былі павешаны 4 чалавекі, многія зняволены.

Але ніякія жорсткасці не спынялі развіцця рэвалюцыйных падзей. Краіна набліжалася да рэвалюцыі.

А. Кутузаў.

Дакументы сведчаць

ВЫСТУПЛЕННІ СЯЛЯН СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА

ДАНЯСЕННЕ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ

1905 г., СНЕЖНЯ 12.

Секретно

Имею честь донести Департаменту, что крестьянин дер. Курей Каковчинской вол. Сенненского у. Афанасий Иванов Шебеко прибыл на родину из гор. Петербурга, где находился на Путиловском заводе слесарем, и стал агитировать среди крестьян к устройству насилий над помещиками, причем имел сильное влияние на крестьян. Под его руководством крестьяне деревень Луг, Лесниково Ряснянской вол. в числе 300 чел. 27 ноября пришли в им. Борок Пустниской вол. помещика Королько и согнали всех рабочих, требуя повышения платы. 29 ноября крестьяне деревень Углы, Буглаи, Кодуко, Козлы, Подворица Каковчинской вол. в числе до 150 чел. согнали рабочих в им. Констант помещика Обезерского. В этот день крестьяне дер. Стриги, Дубовец и Замошье Машканской вол. около 100 чел. явились в им. Ширковку помещика Волчанского и выгнали из леса рабочих, рубивших лес на дрова. 1 декабря крестьяне согнали рабочих в им. Яново помещика Сульжинского и 4 декабря в им. Оболь помещика Домброво. Во всех случаях крестьянами руководил Шебеко, который говорил крестьянам, чтобы они всеми силами старались стеснять помещиков, чтобы последние оставили имения, которые передадут крестьянам.

Полицией производится дознание.

Ротмистр (подпись).

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Т. 3. Мн., 1953. С. 529.

МАЛАЗЯМЕЛЛЕ СЯЛЯН И САМАВОЛЬСТВА ПАМЕШЧЫКА Ў В. ШЫНКАВА СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА

СКАРГА СЯЛЯН МІКАЛАЮ II

1906 г. СТУДЗЕНЯ 16

Представляя при сем приговор сей, имеем честь просить в. и. в., передать на разбор в устроенную в. в. Думу и оказать нам великую милость в наших нуждах так, что нас крайне заставляют жить, как жили за крепостным правом наши предки, а именно:

1. Указанные нами нужды в настоящем приговоре видны, и желаем пояснить в. и. в., что нас помещики крайне разоряют за обруба арендою, за которую платим от самой нарезки земли, и не хотят, чтобы мы платили деньгами, а служили бы по той цене, которую они дают сами, — платят рабочему косцу 40 коп., а женщине 25 коп. и харчи рабочего.

2. Когда зайдет [наш скот] нечаянно в прогон или в обрубы наших предков, то помещик или приказчики его нас штрафуют без суда, снимая при расчете то, что они хотят за потраву и самоуправство.

3. Что наделы наши состоят без генерального межевания, а указаны только частным землемером, нет ни ям, ни столбов по границам, а линии состоят на несколько углов так, что нельзя обойтись без помещичьего пастбища и прогона на свое поле скота. А потому имеем честь просить сделать распоряжение совместно с составленной в. и. в. Думою рассмотреть наши нужды и предоставить для нашего сельского быта расширить наши полосы по возможности обрубами и прогоном на выгоне от помещика г-на Владимира Михайлова Королько, по цене, ассигнованной правительством, и выдать нам в наше пользование, а для поверки наших выкупных наделов выслать генерального землемера.

В чем и подписуемся: крестьяне дер. Шинкова Пустынской вол. Сенненского у. Могилевской губ.

Помета управляющего делами императорской канцелярии от 4 марта 1906 г.: "Главноуправляющий приказал отклонить".

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Т. 3. Мн., 1953. С. 231.

Са спіса населеных месц Магілёўскай губерні. 1910 год

Город Сенно лежит при озере Сенно, на впадающей в него небольшой безымянной речке, в 147 3/4 верстах от Могилева. Время основания города неизвестно; сохранившиеся о нём сведения говорят только о том, что в 16 столетии, во время войны России с Польшей и Литвою Сенно подвергалось разорению от русских.

Панарама г. Сянно. 1912 г.

Особенно большое опустошение произведено было в 1535 году воеводою князем Горбатым. В 1773 году Сенно назначен был уездным городом, план утверждён в 1778 году, а герб дан в 1781 году. Герб города: на зеленом поле две золотые косы в знак обилия сена, от которого и получилось название города, в 1780 году город посетила императрица Екатерина II по пути в Могилёв. В настоящее время в Сенно насчитывалось жителей 2688 душ мужского пола и 2535 душ женского пола; из них православных 32 процента, раскольников 1 процент, католиков 9 процентов, евреев 58 процентов. Заселенная площадь города 105 десятин. Улиц и переулков 14 общим протяжением 3423 сажени, из коих 1196 сажень мощеных. Тротуары каменные и деревянные на протяжении 2087 сажень. Имеется два сада, размером общим 290 квадратных сажень и улицы на протяжении 339 сажень обсажены деревьями. Жилых строений 543, из которых каменных 3, деревянных 540, крытых железом 2, деревом 541. Улицы города освещаются керосином, для чего и имеется 72 простых фонаря. Водою жители пользуются из озера, речки и колодцев. Нечистоты вывозятся за город на особо отведенные места. Имеется Городская пожарная команда с двумя машинами и шестью бочками. Есть Городская скотобойня, на которой ежегодно убивается до 1000 голов скота. Церквей — 2, костелов — 1, молитвенных домов — 6. Учебные заведения: общественная четырехклассная женская прогимназия — 1; городское училище — 1; приходское училище — 2, церковно-приходские школы — 2. Больницы — 2, аптека — 1, аптекарский склад — 5, врачей — 2, ветеринаров — 1, акушерок — 3, фельдшеров — 5, гостиниц — 6, трактиров — 1. Имеется одна паровая и три водяных мельницы. Ремесленных заведений — 54. Благотворительная деятельность одна богадельня и две частные. Общество посо-

Мікалаеўскі сабор у г. Сянно. 1912 г.

бия бедным (хрестиянское и еврейское), одно ссудно-сберегательное товарищество. Ярмарок — 5, нотариусов — 1, типография — 1, фотография — 1.

Наёмная плата за квартиры: большие (8 комнат) — 360 рублей, средние (5 комнат) — 180 рублей, малые (3 комнаты) — 60 рублей в год.

Стоимость розничной продажи:

1 фунт ржаного хлеба — 4—5 копеек.

1 фунт пшеничного хлеба — 7—8 копеек.

1 фунт мяса — 10—14 копеек.

1 фунт сахара — 16 копеек.

1 фунт керосина — 5 копеек.

Дрова — 8—14 рублей — сажень.

Прислуга мужеская — 5—10 рублей в месяц, женская — 2—7 рублей в месяц.

Подённая оплата чернорабочих: мужчина — 80 копеек, женщина — 50 копеек.

Нищих 7.

Штат полиции: надзиратель и 10 городовых.

Тюрьма — 1.

Бюджет города за 1907 год: доход — 3000 рублей, расход — 3000 рублей.

Падрыхтаваў да друку С. В. Шайко.

Выбары ў Думу

Перад намі пажоўклыя ад часу дакументы Магілёўскай губернскай камісіі па выбарах у Дзяржаўную думу. Гэта яскравае сведчанне жорсткасці і дэспатызму царскай улады, неабвержны доказ палітычнага бяспраўя працоўнага горада і вёскі ў Расійскай імперыі.

У цыркуляры № 3557 Міністэрства ўнутраных спраў Расіі ад 14 кастрычніка 1906 г. чытаем: “Беззямельныя сяляне, якія не маюць гаспадаркі і сядзібы, роўна як і асобы, хоць і прыпісаныя да сельскай абшчыны, але не пражываюць у сваім сяле і не маюць там палявога надзелу, а таксама сяляне, якія не маюць у грамадстве ні аседласці, ні гаспадаркі, не могуць удзельнічаць у валасных сходах пры выбарах упаўнаважаных ад воласцей і самі не могуць быць выбраны ў гэтыя ўпаўнаважаныя”.

У дзень выхаду ў свет гэтага цыркуляра Міністэрства ўнутраных спраў разаслала губернатарам новы загад, у якім гаварылася, што рабочыя фабрык і заводаў, а таксама рабочыя чыгуначных майстэрань “не могуць быць унесены ў выбарчыя спісы. У сілу гэтага прашу ваша Правасхадзіцельства зрабіць неабходныя ўказанні ўстановам, якія складаюць спісы гарадскіх выбаршчыкаў...”

Аднак і гэтай дыскрымінацыі правоў працоўных царызму было мала. 24 кастрычніка сенат зрабіў яшчэ адно “тлумачэнне” да палажэння аб выбарах. Сутнасць іх у наступным.

Асобы, якія сумесна займаюць асобную кватэру ці па беднасці карыстаюцца кватэрай бясплатна, не могуць удзельнічаць у выбарах і не ўносяцца ў спісы гарадскіх выбаршчыкаў.

Ніжнія служыцелі — вахцёры, кур’еры, швейцары, кур’ерныя рамізнікі і іншыя не могуць быць унесены ў спісы выбаршчыкаў і ўдзельнічаць у выбарах на гэтай аснове не маюць права.

Не маюць права ўдзельнічаць у выбарах чыгуначныя служачыя: сігналісты, дарожныя і маставыя майстры, паравозныя машыністы і іх памочнікі, рамонтныя рабочыя, пуцявыя вартаўнікі, качагары, стрэлачнікі, сцэпшчыкі, кандуктары і іншыя.

У выніку антынароднага закона аб выбарах права голасу не мелі больш за 2 мільёны рабочых, студэнтаў, жанчын, ваеннаслужачых, моладзь да 25-гадовага ўзросту. Аб няроўнапраўі выбараў у Дзяржаўную думу гаворыць такі факт: буйныя землеўладальнікі мелі аднаго выбаршчыка ад 2 тысяч чалавек, сяляне — ад 30 тысяч, рабочыя — ад 90 тысяч.

Аб тым, хто меў права выбіраць дэпутатаў у Дзяржаўную думу ў Сенненскім павеце, сведчаць наступныя даныя. Ад усіх валасцей і г. Сянно на Магілёўскі сход па выбарах у IV Дзяржаўную думу былі выбраны: ад сялян — старшыня Бобрскай воласці, старшыня Пустынскага ваяснога суда і валасны старшыня Какоўчынскай воласці; ад землеўладальнікаў — па-

мешчык, уладальнік маёнтка Вейна-Раснянскай воласці Вейсенгоф І. В.; два добрапрыстойных і два царскія чыноўнікі; ад гарадскіх жыхароў — гандляр Лейба Пейзнер.

Са 125 такіх "народных" прадстаўнікоў, якія сабраліся ў Магілёве 18 кастрычніка 1912 г. для выбараў членаў IV Дзяржаўнай думы, ад усіх прадпрыемстваў Магілёўскай губерні быў толькі адзін рабочы і ніводнага селяніна.

А. Кутузаў.

Яны нарадзіліся на Сенненшчыне

ПАТРЫЁТ І КРАЯЗНАВЕЦ

АНІКІЕВІЧ Кірыла Цімафеевіч. Беларускі краязнавец, археолаг і этнограф 2-й паловы XIX—пачатку XX ст. Выдаў кніжку "Сенненскі павет Магілёўскай губерні" (Магілёў, 1907) пад дэвізам: "Хто не хоча ведаць сваёй айчыны, той не заслугоўвае называцца яе сынам".

На жаль, аб жыцці і навуковай дзейнасці К. Ц. Анікіевіча не знойдзена падрабязных звестак. Вельмі сцісла аб ім паведамляе вядомы беларускі этнограф і фальклярыст Е. Р. Раманаў. У канцы VIII выпуска "Беларускага зборніка" ён піша пра сваіх супрацоўнікаў, у тым ліку і пра К. Ц. Анікіевіча: "Анікіевіч К. Ц., з сялян Сенненскага павета, мой вучань па Сенненскаму павятоваму вучылішчу, потым сельскі настаўнік. Мой спадарожнік у экскурсіях (экспедыцыях — *В. Б.*). Запісы яго надрукаваны ў выпусках III, IV, VI "Беларускага зборніка". У гэтым выпуску (VIII — *В. Б.*) змешчаны песні яго запісу, стар. 134, 139, 153, 197, 215, 513". (Е. Р. Романов. Белорусский сборник. Вып. VIII—IX. Вильна, 1912. С. 597).

З гэтых радкоў відаць, што К. Ц. Анікіевіч нарадзіўся ў сельскай мясцовасці, магчыма побач з Сянно, ці на яго ўскраіне, таму што вучыўся ў Сенненскім павятовым двухкласным вучылішчы, у якім Е. Р. Раманаў з 1873 з перапынкамі да 1886 г. працаваў настаўнікам, а потым, з 1884 г., з'яўляўся штатным наглядчыкам і выкладчыкам рускай мовы гэтага вучылішча. К. Ц. Анікіевіч, па звестках Раманава, быў сельскім настаўнікам. Аднак гэтыя звесткі не даюць поўнага ўяўлення аб працоўнай і навуковай дзейнасці К. Ц. Анікіевіча. Спробы знайсці ў архіве Віленскай вучэбнай акругі фармуляр (анкету) аб яго паслужным спіску не далі вынікаў.

Са звестак Е. Р. Раманава добра відаць, што К. Ц. Анікіевіч прайшоў у свайго настаўніка і школу краязнаўства, выступіў са сваім самастойным даследаваннем. У даследаванні "Сенненскі павет Магілёўскай губерні" К. Ц. Анікіевіч даў геаграфічную, гістарычную, эканамічную і этнаграфічную характарыстыкі Сенненшчыны.

Звесткі па культуры і быту насельніцтва Сенненшчыны згрупаваны аўтарам у трэцім раздзеле кніжкі. Прыводзячы падрабязныя звесткі аб колькасці насельніцтва павета па саслоўнаму, канфесійнаму і нацыянальнаму складу, К. Ц. Анікіевіч апісаў жыллё, адзенне, сямейнае і грамадскае жыццё сялян, заняткі насельніцтва.

Характарызуючы пасяленні і жыллё, ён выдзяляе наступныя іх тыпы: горад, слабада, фальварак, сяло, вёска, пасёлак, ваколіца, хутар, выселак, засценак, ферма, пагост, пасад і інш. Аўтар прасочвае змены, якія адбыліся ў развіцці пасяленняў і жылля. К. Ц. Анікіевіч сцвярджае, што ў пачатку XX ст. у павеце курныя хаты амаль зніклі, у хатах сталі з'яўляцца каменныя падмуркі, паступова знікаюць саламяныя стрэхі, хоць і зрэдку, з'яўляліся пакрыцці з гонты ў больш заможных сялян. Заўважаюцца змены і ў адзенні вяскоўцаў. "Арыгінальнага крою белага армяка, — піша ён, — абшытага чырвонымі і сінімі шнурочкамі — "ірхамі" — ужо няма ў павеце, яго замяніў армяк са свайго ж сукна, але ўжо шэрага колеру з вялікім вісячым каўняром... Кажух зараз паўсямесна жоўтага колеру замест былога белага" (с. 106), даматканыя штаны часта замяняюцца фабрычнымі".

Апісанне Сенненшчыны сведчыць аб вялікай прыхільнасці К. Ц. Анікіевіча да свайго народа. "Тутэйшы беларус, — піша ён, — адрозніваецца многімі сімпатычнымі рысамі ў характары". Селянін сумленны, працалюбівы, кемлівы і здольны. "Сялянскія дзеці ў школах паказваюць добрыя поспехі, нягледзячы часта на неспрыяльныя дамашнія ўмовы" (с. 108, 109).

У сваёй кніжцы К. Ц. Анікіевіч вялікую ўвагу ўдзяляе характарыстыцы заняткаў і эканамічнага стану сялян Сенненскага павета. Нягледзячы на тое, што земляробства ў пава-

це з'яўляецца асноўным заняткам, але яно "стаіць на нізкай ступені развіцця" (с. 118) і сялянскія надзелы з'яўляюцца "у многіх выпадках недастатковымі для пракармлення сям'і, асабліва пры сучасных спосабах гаспадарання" (с. 117). "Слабая ступень развіцця сельскай гаспадаркі, — піша далей К. Ц. Анікіевіч, — у сувязі з так званым малазямеллем прымушае свабодныя рабочыя рукі шукаць сабе пабочныя заняткі, працаваць на фабрыках, заводах, займацца рознымі промысламі" (с. 122).

Паляпшэнне эканамічнага стану сялян К. Ц. Анікіевіч бачыць у асветніцтве. "Для далейшага ж эканамічнага паляпшэння вёскі, — піша ён, — неабходна шырокая адукацыя народных мас, веды і самыя розныя мерапрыемствы ў галіне сельскай гаспадаркі" (с. 133).

Звяртаючыся да характарыстыкі сямейнага побыту, Анікіевіч адзначае, што ў Сенненскім павеце нераздзеленыя сем'і — рэдкае выключэнне. Збядненне сялянства ён тлумачыць разбурэннем вялікай патрыярхальнай сям'і, у якой у адной гаспадарцы сумесна жылі дзяды, бацькі, жанатыя і нежанатыя дзеці. "Раздзелы, — піша ён, — усё больш і больш пранікаюць у вёску, раздрабляючы і збядняючы гаспадарку" (с. 108).

З вялікага цыклу сямейных абрадаў К. Ц. Анікіевіч звяртае сваю ўвагу толькі на абрады і звычаі, якія адносяцца да нараджэння і вяселля. Пры гэтым заўважае, што "вясельныя абрады, як і іншыя абрады, за апошні час падвяргаюцца вялікім зменам і скарачэнням і вельмі розняцца (маюць свае асаблівасці. — *В. Б.*) у асобных пунктах павета" (с. 118).

Вышэй ужо адзначалася, што К. Ц. Анікіевіч збіраў фальклорныя і бытавыя матэрыялы для III—VIII выпускаў "Беларускага зборніка" Е. Р. Раманава не толькі з Сенненскага павета, але і з іншых паветаў Магілёўскай губерні, а таксама ў экспедыцыях Раманава па іншых губернях. Так, у VIII выпуску "Беларускага зборніка" ён змясціў этнаграфічныя матэрыялы з Чэрыкаўскага павета.

У Сенненскім павеце ў час, калі жаніх едзе за нявестай, пяюць такую песню:

Паехаў сужэнька ў дарогу,
Прывязаў коніка к бярозкі,
Атламаў ад бярозкі тры розкі,
Як цяў коніка пад ножкі:
"Ступай, мой, косю, шырока,
Яшчэ мая дзевунька далёка!
Ступай, мой косю, узенька,
Ужо мая дзевунька блізенька!
Ступай, мой косю, ступою,
Ужо мая дзеванька са мною! (с. 506).

У Сенненскім павеце запісаны дзіцячыя гульні "У шыла". "У палачку-булавачку", "У рагадана", "У мак", "Дзікуны і рускія", "У крука", "У рэдзьку" і інш. Усяго ў VIII выпуску "Беларускага зборніка" апісана 67 дзіцячых гульняў. Прывядзем некалькі прыкладаў. У Сенненскім павеце, у вёсцы Латыгава, Анікіевічам запісана гульня "У рагадана".

У кола становяцца ўсе, хто хоча гуляць. Адзін з іх гаворыць: "Рагадан, рагадан, на чатыры загадан. Кацярынін нос на пятнаццаць вёрст. Шалжэ-балдэ, бушмак барада!" Пры кожным слове ён паказвае рукою па чарзе, і на каго падае слова "барада", той пачынае лавіць удзельнікаў гульні. Злавіўшы каго-небудзь, ён пытае:

— Чый ты?

— Цароў! Ну, памажы мне коней лавіць.

Злоўленыя таксама ловяць іншых, пакуль не будуць злоўлены ўсе. Пасля гэтага гульня пачынаецца з пачатку.

І яшчэ адна гульня з Сенненскага павета, "У рэдзьку".

Гульцы садзяцца па двое і моцна трымаюцца адзін за другога. "Матка", аб'ехаўшы паўз іх на пруціку, крычыць:

— Стуку-груку пад вакно!

— Хто там?

— Сам пан!

— Для чаго?

— Паня сына нарадзіла, на стоўб пасадзіла, сама захварэла, рэдзькі захацела. Ці пара рэдзьку рваць?

— Не, яшчэ толькі пасеялі.

У наступныя разы адказваюць, што рэдзька з пальчык, потым з таўкач. За трэцім разам гавораць:

— Пара рваць, — ужо па ступу (выросла).

Тады "матка" ходзіць вакол і спачатку бракуе рэдзьку, на адну пару кажа, што яна гнілая, на другую, што яна чарвівая, і г. д., каб заблытаць пары. Потым знянацку вырывае аднаго з пары і б'е прутом яго. А потым ідзе вакол пар і зноў бракуе рэдзьку, зноў вырывае аднаго з пары і г. д. (с. 582).

Жыхары Сенненшчыны да гэтага часу шануюць памяць свайго славутага земляка і чытаюць яго кнігу аб мінулым роднага краю.

В. К. Бандарчык.

БЕЛАРУСКІ СКУЛЬПТАР

Астроўскі Ян. Нарадзіўся ў 1811 г. у г. Сянно. Беларускі скульптар, прадстаўнік класіцызму, вучыўся ў Вільні. Ствараў пераважна медальёны, бюсты гістарычных асоб і дзеячоў культуры Беларусі, Польшчы, Літвы: М. Рэя, К. Ельскага, М. Балінскага, У. Сыракомлі, Ю. Корсака, Т. Нарбута, Б. Панятоўскага, Ю. Нямцэвіча, Я. Каханоўскага, Я. Тышкевіча і іншых (знаходзяцца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве). Кампазіцыі бюстаў тыпу антычнай гермы, элементы ўмоўнасці спалучаюцца ў творах Я. Астроўскага з перадачай рэалістычных рысаў мадэлі. Памёр у 1872 г.

ВЫЗНАЧАЎСЯ ПАЭТЫЧНЫМ ТАЛЕНТАМ...

У энцыклапедычных даведніках пра **Тадэвуша Ладу-Заблоцкага** сказана вельмі сціпла: нарадзіўся ў 1811 г. у вёсцы Лугінавічы на Сенненшчыне ў шляхецкай сям'і. Паэт і перакладчык. Пісаў на польскай, французскай, рускай і, магчыма, беларускай мовах. Скончыў Віцебскую гімназію. У 1831 г. паступіў у Маскоўскі універсітэт. Там заснаваў тайнае студэнцкае таварыства, зблізіўся з В. Р. Бялінскім. У 1833 г. выключаны з універсітэта за нелегальную дзейнасць і распаўсюджванне патрыятычна-дэмакратычных вершаў, высланы на радзіму. У 1834 г. арыштаваны, пасля сасланы на Каўказ.

У 1845 г. выдаў зборнік "Паэзія". На польскую мову перакладаў творы англійскай, французскай, лацінскай, грузінскай, румынскай паэзіі. У рукапісах пакінуў "Матэрыялы да гісторыі славянскай цывілізацыі і літаратуры". У творах апяваў прыгажосць роднай Беларусі (паэма "Ваколіцы Віцебска", вершы "Да Дзвіны", "Да Лучосы", "Даўжанскае возера"), Каўказа ("Алазанская даліна") і інш.

Памёр Тадэвуш Лада-Заблоцкі ў 1847 г.

Гэта скупыя энцыклапедычныя радкі. Для нас жа, яго землякоў, важна больш ведаць аб жыццёвым і творчым шляху Лады-Заблоцкага.

У 1830 г. куратару Беларускай навучальнай акругі Р. І. Карташэўскаму прадставілі вельмі здольнага, добра падрыхтаванага вучня Віцебскай гімназіі Тадэвуша Ладу-Заблоцкага, які да таго ж "пісаў вершы як на польскай, так і на рускай мовах". Гэта сустрэча стала паваротным пунктам у жыцці юнака. Р. І. Карташэўскі звярнуўся з хадайніцтвам да міністра народнай адукацыі аб залічэнні Т. Лады-Заблоцкага на далейшую вучобу ў Маскоўскі універсітэт за кошт Беларускай навучальнай акругі. 26 кастрычніка 1831 г., як сведчыць адпаведны дакумент, малады паэт стаў "казённакоштным студэнтам" славеснага аддзялення універсітэта. Умова залічэння была такая: пасля вучобы ён павінен быў не менш шасці гадоў папрацаваць настаўнікам на Беларусі.

У той жа час "казённакоштным студэнтам" быў ва універсітэце і В. Р. Бялінскі. І жылі яны з Т. Ладам-Заблоцкім у адным інтэрнаце. Неўзабаве зблізіліся. Наш зямляк пачаў наведваць студэнцкі гурток, створаны В. Р. Бялінскім разам са сваім таварышам Чысцяковым (гурток вядомы пад назвай "Литературное общество 11-го нумера"). Малады паэт зблізіўся з найбольш радыкальнымі коламі маскоўскай грамадскасці, з многімі студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта. Былі сярод іх і землякі з Беларусі: у мінулым старшыня славутага Таварыства філаматаў у Вільні, пазней прафесар універсітэта Юзаф Яжоўскі, член Таварыства філарэтаў Ян Вернікоўскі, былы вучань Полацкай уніяцкай семінарыі, член "Литературного общества 11-го нумера" Ян Савініч і іншыя. Разам з землякамі-беларусамі Т. Лада-Заблоцкі стварыў тайнае літаратурнае таварыства, мэтай якога было пашырэнне вальнадумства і патрыятычных ідэй сярод студэнцкай моладзі. Гэтыя ж ідэі выказваў ён у сваіх паэтычных творах.

"Крамола" не засталася незаўважанай. Універсітэцкай адміністрацыі трапіўся ананімны верш на польскай мове з заклікам да звяржэння царскага самадзяржаўя. У ім былі такія радкі:

Пекла для нас — царскі трон.
Сёння сядзіць на ім чорт.
Ён варты шыбеніцы.
Помста, братва, альбо смерць!

Гэты верш распаўсюджваўся і сярод выхаванцаў Віцебскай гімназіі. Следствам было выяўлена, што "крамола" атрымана ад студэнта Т. Лады-Заблоцкага, аб чым было паведамлена А. К. Бенкендорфу. 29 чэрвеня 1833 г. маладога паэта арыштавалі. Неўзабаве яго прывезлі ў Віцебск, дзе справай занялася следчая камісія, якую ўзначаліў віцебскі губернатар Шрэдэр. Выяўлялі асоб, з якімі Т. Лада-Заблоцкі быў звязаны ў Маскве. Паліцыі быў дадзены загад зрабіць вобыскі. Але пад суд, які адбыў-

ся ў Віцебску ў 1835 г., трапіў толькі наш зямляк. Згодна з рашэннем суда студэнта Т. Ладу-Заблоцкага чакала шматгадовая катарга. Але цар Мікалай I "змякчыў" прысуд: аўтара "абуральных вершаў" было вырашана адправіць радавым "у Каўказскі корпус".

Гэта было месца ссылкі. Тут радавымі салдатамі служылі дзекабрысты, петрашэўцы, удзельнікі паўстанняў у Польшчы, на Літве і Беларусі. Сюды трапіў адбываць пакаранне і наш зямляк.

"...Ці можа што-небудзь ажывіць астылую душу? — пісаў Т. Лада-Заблоцкі грузінскаму паэту-рамантыку князю Міхаілу Туманішвілі, з якім пасябраваў. — Наўючаны ранцам і сухарамі, са стрэльбай у руцэ, караскаючыся па высях і абрывах, я не раз праклінаў каўказскія горы, не заўважаючы іх прыгажосці, і яны болей давілі на мяне, чым абуджалі вытанчанае пачуццё эстэтычнай красы. Вы яшчэ малады і глядзіце на свет праз шкло чараў фантазіі... Але мая душа нямая — і калі з яе глыбіні вырвецца які-небудзь стогн, то ён болей падобен на крык Праметэя, які прыкаваны да аграмадзін Каўказа і нутро яго раздзіраюць нябесныя арлы".

На Каўказе Т. Лада-Заблоцкі зблізіўся з многімі іншымі вядомымі паэтамі, вучонымі-асветнікамі. У 1846 г. яму ўдалося вызваліцца ад салдацкай службы. Ён быў прызначаны ўпраўляючым Кульпінскімі салянымі промысламі ў Грузіі. Але пабыў ён там нядоўга. У жніўні 1847 г. яго не стала (на 36-м годзе жыцця). Памёр ад хваробы ў час эпідэміі.

Творчая спадчына паэта-земляка не вельмі багатая: салдацкая служба, на якую ён быў аддадзены ва ўзросце 25 год, не вельмі спрыяла паэтычнай творчасці. І тым не менш яму ўдалося выдаць у Пецярбургу (з дапамогай Р. Падбярэзскага) кнігу "Паэзія", у якую ўвайшлі і арыгінальныя творы, і пераклады.

Для нас, чытачоў Віцебшчыны, несумненную цікавасць уяўляюць паэмы і вершы, у якіх Т. Лада-Заблоцкі выказвае тугу па Беларусі, Віцебску, услаўляе нашу прыроду, гістарычнае мінулае краю. Польская "Усеагульная энцыклапедыя" С. Аргельбранта, даючы ацэнку творчасці паэта, адзначала ў 1868 г., што Т. Лада-Заблоцкі "вызначаўся паэтычным талентам, вылучаючыся сярод паэтаў так званай беларускай школы".

Прачулыя радкі пра творчасць нашага земляка Т. Лады-Заблоцкага можна знайсці ў энцыклапедычным даведніку "Мысліцелі і асветнікі Беларусі" (Мн., 1995, с. 475): "Як рамантык Лада-Заблоцкі адмаўляў тагачасную рэчаіснасць, у алегарычнай форме заклікаў да барацьбы з самаўладствам. Як паэт-патрыёт беларускай школы апяваў прыгажосць роднай Беларусі. Лепшыя свае творы ён прысвяціў Радзіме, яе людзям, гісторыі і помнікам. Галоўная тэма паэтычных твораў, напісаных на чужыне, — туга па роднай Беларусі..."

У. Р. Скапа.

САЦЫЁЛАГ, ПРАВАЗНАЎЦА, ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ

Петражыцкі Леў Іосіфавіч. Нарадзіўся 13.4.1867 г. у вёсцы Калантаёва. Сацыёлаг, правазнаўца, заснавальнік псіхалагічнай школы права, грамадскі дзеяч, адзін з лідэраў партыі кадэтаў, доктар права (1878), прафесар (1899). Закончыў Віцебскую гімназію, юрыдычны факультэт Кіеўскага універсітэта, слухаў лекцыі ва універсітэтах Берліна і Парыжа.

З 1898 г. загадчык кафедры энцыклапедыі і гісторыі філасофіі права Пецярбургскага універсітэта, выбіраўся дэканам юрфака. Адначасова супрацоўнічаў у часопісах, адзін з рэдактараў выданняў "Право" і "Вестник права".

З кастрычніка 1905 г. член Цэнтральнага і Пецярбургскага камітэтаў партыі кадэтаў. Адмоўна адносіўся да ірасследвання інтэлігенцыі. У 1906 г. дэпутат I Дзяржаўнай думы ад Пецярбургскай губерні, выступаў з прамовамі, член юрыдычнай камісіі. Пасля роспуску Думы падпісаў Выбаргскую адозву, быў арыштаваны, змешчаны на час следства ў пецярбургскую турму "Крыжы", потым асуджаны на тры месяцы зняволення.

Аўтар многіх навуковых прац: "Очерки философии права", вып. 1. СПб, 1900; "О мотивах человеческих поступков". СПб, 1904; "Университет и наука", т. 1—2. СПб, 1907; "Введение в изучение права и нравственности. Эмоциональная психология". СПб, 1908; "Теория права и государства в связи с теорией нравственности", т. 1—2, Спб, 1909—1910. Яго працы перакладаліся на польскую і іншыя мовы. З 1912 г. член Польскай акадэміі. У 1917 г. эмігрыраваў у Польшчу, з 1918 г. узначальваў кафедру сацыялогіі Варшаўскага універсітэта. Памёр 15.5.1931 г. Пахаваны ў Варшаве.

Э. А. Карніловіч.

Аб сумленні, палітыцы і эканоміцы

При некотором умении наблюдать (вспоминать и т. п.) и анализировать собственные душевные явления нетрудно убедиться, что в составе нашей психики можно найти вообще немало примеров и случаев такого сознания должноствования, когда мы считаем себя обязанными делать что-либо или не делать чего-либо, но не в том смысле, что это необходимо для доставления удовлетворения чьему-либо основательному притязанию; точно также многие приписываемые нами другим обязанности мы рассматриваем, как дело их воли и совести, как такое дело, по поводу которого всякие притязания и требования представляются нам неуместными. (с. 19)

Законы человеческих восхвалений, представлений, рыночной оценки и т. п. значительно отличаются от законов необходимости и полезности. Восхваляется и высоко ценится на житейском рынке то, что редко, "аристократично", а то, что и у гусей есть и всем необходимо и полезно, то не возбуждает похвалы и удивления, и тому в людском мнении не велика цена. (с. 40)

Как показывает история, в частности история хозяйственной политики разных государств, уже значительно легче впасть в заблуждение относительно значения золота, по сравнению, напр., с хлебом, железом, и т. п., под влиянием особенно высокой рыночной ценности этого металла. И теперь имеется немало людей, даже и не слабоумных вообще людей, которым бы не бесполезно было проверить правильность своих взглядов на золото и некоторые другие блага и ценности. (с. 41)

И "барин" не барин даже для лакея, где дело идет о его (лакея) правах, если у него здоровое и сильное правосознание. Право "не взирая на лица" поднимает малых до высоты" "великих" мира сего. (с. 58).

З кнігі Л. І. Петражыцкага "О мотивах человеческих поступков". СПб., 1904.

О СТАРОЙ ШКОЛЕ И НОВЫХ ТЕЧЕНИЯХ В НАУКЕ ПРАВА

...Во всяком случае было бы ясно известно, что дело идет о насаждении произвола, подчас грубого и жестокого, вообще мало осмысленного, и что в области права вообще элементарным требованием, с точки зрения "разумности", является именно определенность и незыблемость прав; а в особенности частного права, составляющего фундамент и директиву народнохозяйственного процесса, требующего по природе своей прочности и определенности правно-хозяйственных дел и отношений, возможности спокойно и уверенно предпринимать, предвидеть и рассчитывать, и подавно нельзя людей подвергать правовой и хозяйственной неизвестности и неожиданностям, в зависимости от последующих "усмотрений" кого бы то ни было, хотя бы и лучших людей в мире.

З публікацыі ў часопісе "Право". 1911. № 50.

ИЗ РЕЧИ НА ЗАСЕДАНИИ ПЕРВОЙ ГОСУДАРСТВЕННОЙ ДУМЫ (1906)

Предоставление женщинам политических прав и возложение на них политических обязанностей и ответственности — это могучее средство насаждения общественности в высоком смысле слова, высшей психики и культуры, это средство заставить людей оставить эгоистическую узость интересов и поднять их на более высокую ступень общественной точки зрения — радения об общем благе. Поэтому нас вовсе не должно смущать то, что матери будут интересоваться политикой; напротив, именно важно, чтобы матери сами интересовались общественными делами и могли внушить такие же интересы детям.

Падрыхтаваў да друку Э. А. Карніловіч.

Звязаны лёсам

Літаратурная спадчына манаха Жэры

Имя **Караля Антонія Жэры** было доўгі час несправядліва забытым, а гэтым чалавекам, які жыў у другой палове XVIII ст., па праву можа ганарыцца і Падляшша (зараз Рэспубліка Польшча), дзе ён нарадзіўся, і Сенненшчына, дзе ён правёў большую частку свайго жыцця і стварыў вельмі цікавую кнігу, а дакладней, кнігу-зборнік, у якую, разам з аса-

бістымі назіраннямі і адкрыццямі Жэры, выкладзенымі ў празаічнай і паэтычнай формах, *увайшлі народныя прымаўкі, апавяданні* і анекдоты. Таму кніжка гэта ўяўляе каштоўнасць не толькі літаратурную — як адзін з нешматлікіх дайшоўшых да нашых дзён помнікаў беларускай літаратуры часоў позняга барока, але і фальклорную, бо гэта свайго роду звод "вытрымак" з народнай мудрасці, а таксама этнаграфічную — у ёй шмат звестак пра жыццё і побыт, характар, звычкі і ўяўленні людзей таго часу, якія жылі на Сенненшчыне, Лепельшчыне і Полаччыне. Кніга Жэры была выяўлена ў аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу літаратуразнаўцам А. І. Мальдзісам (апублікавана ў Варшаве ў 1980 г.).

Пра самога Жэру вядома няшмат. Нарадзіўся ён 1.1.1743 г. у вёсцы Тварогі Выпыхі на Падляшшы ў сям'і дробнага шляхціца з родавым гербам "Дубна". Як было прынята ў тыя часы, спачатку вучыўся грамаце дома, а каля 1754 г. яго аддалі ў езуіцкую школу ў Драгічыне. Як не вельмі стараннага вучня, Жэру часта каралі. Пазней ён скажа пра гэта ў гумарыстычнай форме: "Хто гэта зараз чытаціcмус, то яму смехаціcмус, а мне было бядыcмус". Далей звесткі пра яго губляюцца аж да 1765 г., калі ён у Пінску ўступае ў ордэн францысканцаў і прымае манаскае імя Гаўдэнцый. Напэўна, менавіта прыняцце сану паспрыяла таму, што Жэру накіроўваюць "на Белую Русь", у Сянно, у якасці выкладчыка мясцовага канвенту (школа з інтэрнатам), — дакладна невядома, бернардынскага ці францысканскага. Тут Жэра жыве і працуе да сваёй смерці, якая наступіла прыкладна пасля 1798 г.

Манаскі сан не перашкаджаў Жэры атрымліваць асалоду ад жыцця. І адзін з яго ўлюбёных заняткаў быў слухаць і запісваць гарэзлівыя фацэцыі-анекдоты, забаўныя і павучальныя гісторыі, якія расказвалі мясцовыя жыхары або якія адбываліся з ім самім. Гэтыя запісы і ляглі ў аснову літаратурнай працы яго жыцця — кнігі, створанай прыблізна ў 1773—1798 гг., якую Жэра назваў па-барочнаму кваціста і складана (нават блытана): "Процьма рэчаў, торба смеху, гарох з капустай, а кожны сабака з іншай вёскі, або Кніга, якая ўключае ў сябе збор розных цікавых і мудрых, дасціпных і забаўных, сэнсоўных і сентыментальных твораў, пытанняў і адказаў, без ладу і ніякага парадку ўкладзеных дзеля ўцехі і забавы, а часам служыць кожнаму і дзеля выратавальнага павучання, нядаўна пачатая, а да сканчэння свету незавершаная. Хто яе распачаў, таго знойдзеш у наступных радках".

На першы погляд, кніга Жэры — сапраўдны "гарох з капустаю": тут маналогі і дыялогі, проза з вершамі, якія, у сваю чаргу, злучаюць самыя розныя пачаткі: камічны і трагічны, фантастычны і рэальны, кніжны і фальклорны. Больш таго, аўтар злучае не толькі розныя жанры і стылі, але і розныя мовы: з польскай пераходзіць на лацінскую, з лацінскай на беларускую, прычым карыстаецца апошняй з такой жа лёгкасцю і натуральнасцю, што і польскай. У беларускамоўных тэкстах шмат прыслоўяў, кшталту: "у ліхога бортніка і мёд горкі", "голы разбою не баіцца", "прыйшла свіння да каня, аж і шэрсць іншая, і ногі кароткія", часта сустракаюцца фразеалагізмы і фразеалагічныя абароты. Напрыклад, у апавяданні "Як баба чорта, што яе на вузкай кладцы сустрэў, хітрасцю ашукала", калі д'ябал пытаецца ў жанчыны, хто лепшы: ён ці Бог, тая адказвае: "Бог добры, але і вашэць няліхі, толькі што вашэцю ліхія людзі на зуб узялі", — іншымі словамі — распускаюцца дрэнныя плёткі.

Аднак, хаця і сам Жэра не раз падкрэслівае, што ягоны зборнік складзены "без ладу і ніякага парадку", за знешняй вольнасцю выкладання адчуваецца прадуманая сістэма: апавяданні аб'яднаны ў цыклы, дзе творы звязаны паміж сабой і ўзаемна дапаўняюцца. Можна вылучыць некалькі буйных цыклаў — пра жаночую хітрасць, пра паноў, пра папоў і ксяндзоў, пра кемлівасць і спрытнасць селяніна і інш. Апавяданні з цыклаў пра папоў і ксяндзоў і пра паноў часта здзіўляюць сваёй смеласцю, — яе можна высока ацаніць, ведаючы час, у якім жыў Жэра. То ён словамі кухара, які, нарэзаўшы вяндліны "для ксяндзоў", рэжа яе "для людзей" і заяўляе, што "ксяндзы не людзі", то ў выглядзе павучання, як выхаванне надае сяброў, расказвае пра паноў Быкоўскага і Бараноўскага, якія, моцна закусіўшы ў карчме, катэгарычна загадалі зачыніць яе для іншых наведвальнікаў, аднак праз колькі часу самі адкрылі дзверы для пана Свінярскага, які, даведаўшыся прозвішчы пастаяльцаў карчмы, просіцца: "Ах, дзеля Бога жывога, у такім прыгожым хляве ці не можа тут і пан Свінярскі змясціцца". Усяго зборнік уключае 233 пацешныя і павучальныя гісторыі, большая частка якіх заснавана на беларускім матэрыяле, насычана мясцовымі рэаліямі.

Цікавую думку выказалі даследчыкі творчасці Караля Антонія Жэры. Яны мяркуюць, што Жэрам быў створаны не адзін, а некалькі зборнікаў, указваючы на другую кнігу Жэры — знаходку польскага этнографа Зыгмунта Глогера (была выдадзена ў Варшаве ў 1893 г., якая пры аднолькавай назве з санкт-пецярбургскай знаходкай, па складу дастаткова адрозная ад яе. Таму ёсць сэнс працягваць пошукі літаратурнай спадчыны Караля Антонія Жэры.

І. М. Каранеўская, навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

АКАДЭМІК В. М. СЕВЯРГІН У СЯННО

СЕВЯРГІН Васіль Міхайлавіч (1765—1826). Рускі вучоны ў галіне мінералогіі і хіміі. Акадэмік.

У 1803 г. Васіль Міхайлавіч "аглядаў" вучылішчы Віцебскай і Магілёўскай губерняў, што знайшло адлюстраванне ў яго кнізе "Працяг запісак падарожжа па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы", выдадзеных на наступны год у Пецярбургу. З іх бачна, што 12 чэрвеня (ст. стылю) вучоны прыбыў у павятовы горад Сянно, выехаў з яго 14 чэрвеня. Ён пакінуў кароткае апісанне горада, у якім паведаміў, што дамы ў Сянно "большею частию деревянные, ветхие, кроме здания, принадлежащего старосте Сераковскому, которое прекрасный представляет вид при въезде в город. Здесь находится каменный монастырь францисканов и при оном малое училище, в коем было только двенадцать учеников. Есть также греко-российская церковь во имя Илии пророка. Жителей считается около 380 христиан и 480 евреев. Домов около 600". (стар. 99).

Далей Севяргін расказвае аб занятках жыхароў і аб мясцовасці вакол Сянно. "Хотя хлеб в сих странах родится изрядный, однако жители наиболее занимаются возделыванием льна, как по давней к сему привычке, так и потому, что в некоторые годы бывает он в хорошей цене и расход ему великий. Кроме сего, сеют на полях наиболее рожь и гречиху. Мера овса в две четверти стоит 1 рубль 30 копеек. Некоторые занимаются также садоводством; и огороды есть изрядные, изобилующие, между прочим, особливо маком... Близ помянутого дома старосты Сераковского, за почтовым двором находится в глинистом возвышении колодец, коего вода имеет серный запах, притом прозрачна и солоновата, слабит низом и облегчает грудь, когда пьют оной стакана два поутру" (стар. 90—100).

Як і паўсюдна, Севяргін і ў Сянно праяўляў інтарэс не толькі да "сваіх" навук. Ён даведаўся ад жыхароў і паведаміў чытачам, што "в озере Сенном водятся язи, щука, лещи".

А. Іваноў.

АПОШНІ ЗЯМНЫ ПРЫТУЛАК ПАЭТА

ЗАН Тамаш. Нарадзіўся 21.12.1796 г. у вёсцы Мясота Навагрудскага павета Мінскай губерні ў беларускай шляхецкай сям'і па прозвішчы Зань. Паэт-рамантык, удзельнік рэвалюцыйнага руху. У 1807 г. паступіў у Мінскую гімназію, пасля хваробы працягваў вучобу ў павятовай школе ў Маладзечне. У 1815 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта і адначасова займаўся на літаратурным факультэце. Разам з А. Міцкевічам і Ю. Яжоўскім быў ініцыятарам стварэння таварыства філаматаў, якое стала ядром іншых прагрэсіўных арганізацый, таварыства філарэтаў (сяброў дабрачыннасці). Я. Чачот прысвяціў яму верш "У дзень урачыстасці ў гонар Тамаша Зана 29 мая 1821 года", дзе ёсць радкі: "О, брацці! Нам заўтра шчаслівае ззяе! Яго перад намі Тамаш расчыняе!"

У 1824 г. высланы ў Арэнбург, там прабыў 13 гадоў. У час ссылкі аб'ездзіў Урал, Прыуралле, Тургайскі стэп. Знайшоў каля Самары нафту, каля Троіцкай крэпасці — медную руду, у Зауральскім стэпе — багатыя паклады золата. У 1841 г. вярнуўся на радзіму, набыў маёнтак Какоўчына і займаўся літаратурнай дзейнасцю. Тут ён і памёр. Больш за 10 год наша зямля была крыніцай натхнення паэта, вытокам паэзіі і зямнога клопату.

Зан — адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, апяваў прыгажосць роднай Беларусі, уваскрашаў гісторыю беларускага народа. У камедыі "Грэцкія піражкі" (1817) выкарыстаў беларускі фальклор, у паэме "Табакерка" (1818) апісаў беларускае вяселле, свята Купалля, звычаі і абрады беларусаў. Ён аказаў значны ўплыў на паэтычную творчасць А. Міцкевіча, сябраваў з Я. Чачотам, А. Адынцом і іншымі нашымі знанымі літаратарамі. Памёр 19.7.1855 г.

Паводле кн.: Мысліцелі і асветнікі Беларусі X—XIX стагоддзяў. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 434—435.

ЭТНОГРАФ, ФАЛЬКЛАРЫСТ, АРХЕОЛАГ

РАМАНАЎ Еўдакім Раманавіч. Нарадзіўся 11.9.1855 г. у мястэчку Нова-Беліца (цяпер у межах Гомеля) у сям'і мяшчан. Этнограф, фальклярыст і археолаг. Скончыў Гомельскую прагімназію (1870), курсы настаўнікаў рускай мовы і гісторыі (1872). Зрабіў значны ўклад у вывучэнне культуры Сенненшчыны (1855—1922). У 1876 г. ён прызначаны настаўнікам рускай мовы Сенненскага павятовага вучылішча, у якім працаваў да жніўня 1881 г. Праз тры гады Раманаў зноў вярнуўся ў Сенненскае двухкласнае вучылішча, але ўжо на пасаду штатнага наглядчыка і выкладчыка рускай мовы. У Сянне яго служба працягвалася да 1.8.1886 г.

Гады знаходжання Е. Р. Раманава ў Сянне былі перыядам станаўлення яго як вучонага, даследчыка мовы, быту і вуснапаэтычнай творчасці беларускага народа. Е. Р. Раманаў пераканаўся, што расійская грамадскасць дрэнна ведала тады Беларусь, яе народ, культуру і "багацейшую скарбніцу беларускай мовы, якая нагадвала мову Нестара і прадстаўляе, або прынамсі яшчэ нядаўна прадстаўляла сабой, невычарпальны запас рысаў старажытнарускай мовы" (Романов Е. Белорусский сборник. Вып. V. Витебск, 1891. С. 11).

Е. Р. Раманаў пачаў тут рыхтаваць працу "Вопыт беларускага слоўніка", і да канца 1878 г. колькасць запісаных ім слоў дасягнула 7000. Акрамя гэтага, ім было запісана некалькі песень, расказаў анекдатычнага зместу, некалькі соцень прымавак і прыказак. Пазней Е. Р. Раманаву стала вядома, што гэтая частка "Вопыту беларускага слоўніка" была разгледжана акадэмікам А. Ф. Бычковым, які параўнаў яго са слоўнікам І. І. Насовіча і адзначыў, што напісанне беларускіх слоў у Е. Раманава было больш правільным, чым у слоўніку Насовіча.

Работа над беларускім слоўнікам і беларускай граматыкай навяла Раманава на думку стварыць "Падручнік рускай граматыкі". Першы выпуск яго быў выдадзены ў 1881 г. і перавыдаваўся яшчэ 3 разы. Апошні раз падручнік быў выдадзены ў 1990 г.

Адначасова з работай над слоўнікам і граматыкай Раманаў супрацоўнічаў у перыядычным друку. Ён падрыхтаваў кнігі "Краткий очерк военных действий 1877—1878 г." (Киев, 1885).

Сістэматычна збіраць фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы Раманаў пачаў толькі з 1876 г.

Да 1884 г. матэрыялаў назбіралася столькі, што Раманаў рашыў апублікаваць іх шматтомным выданнем у выглядзе "Беларускага зборніка". Кожны том павінен быў змяшчаць фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы адной беларускай губерні. Першы том, у які намечана было ўключыць сабраныя матэрыялы па Магілёўскай губерні, павінен быў складацца з пяці выпускаў.

Толькі ў Кіеве, у друкарні газеты "Заря", карэспандэнтам якой быў Раманаў, была знойдзена магчымасць выдаць у 1886 г. першы і другі выпускі "Беларускага зборніка" адной кнігай.

У першыя два выпускі "Беларускага зборніка" ўвайшлі беларускія песні, сабраныя за 10 гадоў.

Першае выданне "Беларускага зборніка" было самай значнай публікацыяй беларускай народнай творчасці таго часу, як па колькасці тэкстаў (1210 песень, 757 прыказак і прымавак і 451 загадка), так і па багаццю іх зместу.

Адначасова з работай над слоўнікам і "Беларускім зборнікам" Раманаў у 1882—1883 гг. займаўся таксама антрапалагічнымі даследаваннямі па даручэнню Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі. У 1884 г. яго выбралі членам гэтага Таварыства. Ён вывучаў і саматужныя промыслы Беларусі.

З глыбокім спачуваннем да сялян паказвае Раманаў, як жорсткая капіталістычная эксплуатацыя без пары калечыць людзей. "Паглядзіце, у якім выглядзе яны вяртаюцца дадому вясной, калі ў заводах буракі перапрацаваны і работы спынены да новага ўраджаю, а дома пачынаюцца палявыя работы.

Вось ледзь ідзе абшарпаны хлопчык, яму ўсяго 14—15 год, але ён выглядае старым: голас — дрыжыць, бас, з грудзей глухі кашаль... Жудасна становіцца за чалавека, паглядзеўшы на такога пятнаццацігадовага старога! Сялянская беднота добра разумее пагубнасць такой працы для іх дзяцей і "праклінае" заводы ў сваіх песнях".

У пацвярджэнне гэтага Раманаў прыводзіць урывак з запісанай ім песні:

...Каму надакучыла ў роскашы жыці,
Няхай ён ідзе ў завод служыці.
У праклятым заводзе горш за няволі —
Выйду за вароты, наплачусь даволі...

"Заря", 1884, № 161. Киев.

Перажыўшы ломку старых феадальна-прыгонніцкіх адносін, адчуўшы на сабе і на сям'і бацькі цяжкую эксплуатацыю, Е. Раманаў горача спачуваў народу і шукаў шляхі для паляпшэння яго становішча.

Раманаў поўнасцю аддаваў сябе вывучэнню быту народа, яго гісторыі, мовы і вусна-паэтычнай творчасці, праводзіў антрапалагічныя і археалагічныя даследаванні. Такім чынам, ужо ў пачатку працоўнай дзейнасці на Сенненшчыне ў Раманава вызначылася шырокае кола навуковых інтарэсаў па вывучэнню роднага краю.

Выяўлены 4 лісты ў Аддзяленне рускай мовы і славеснасці Расійскай Акадэміі навук акадэміку Якаву Карлавічу Гроту, пасланыя Е. Р. Раманавым у 1878 г. з г. Сянно, а таксама 6 пісем з Сянна Я. К. Гроту за 1884, 1885, 1886 гады. Выяўлена таксама справаздача аб камандзіроўцы Е. Р. Раманава ў Магілёўскую губерню ў 1889 г., у якой паведамляецца, што з 14 чэрвеня да 8 ліпеня ён працягваў вывучаць Сенненскі павет, сабраў вялікія матэрыялы па фальклору і быту народа.

23 снежня 1893 г. Раманаў паслаў рукапісы акадэміку А. М. Весялоўскаму з апісаннем купальскіх абрадаў Магілёўшчыны. Вось некалькі вытрымак з гэтага рукапісу, якія адносяцца да Сенненскага павета.

"Ноччу дзеўкі і хлопцы, маладыя мужчыны і жанчыны збіраюцца на выган і раскладваюць там агонь. Тут іграюць на дудзе або на скрыпцы, скачуць, пяюць песні, п'юць гарэлку і закусваюць. Мужчыны ходзяць (не абавязкова) у лес, у папаратнік, сачыць, як ён будзе ў поўнач цвісці... Увечары на Купалу ...дзеўкі плятуць вянкі і кідаюць у ваду, а на Івана ідуць глядзець іх: куды вянок заплыў, у той бок гаспадыня яго і замуж выйдзе. Чый вянок патануў, тая памрэ..."

Сваю навуковую спадчыну па Сенненшчыне Е. Р. Раманаў пакінуў і ў вялікай колькасці сабраных ім этнаграфічных матэрыялаў, якія папоўнілі Санкт-Пецярбургскі музей этнаграфіі народаў Расійскай імперыі (Рускі музей). У студзені 1903 г. з 10 экспанатаў з Магілёўскай губерні ў музей здадзена пастухоўская труба з Сенненскага павета. У тым жа годзе — мадэлі сялянскага двара на 1/20 яго вялічыні, гумна, пуні, лазні, ветрака, вадзянога млына і курнай хаты (не захаваліся да нашых дзён), у 1905 г. — 34 прадметы адзення, абутку, рушнікі, узоры ткацтва, драўляны посуд, рыбалоўныя сеткі, ганчарны станок.

У I—IX выпусках "Беларускага зборніка" Е. Р. Раманава ў спасылках на мясцовасці, у якіх збіраліся апублікаваныя матэрыялы, а таксама аб сваіх карэспандэнтах змешчаны дадатковыя звесткі, якія адносяцца да Сенненскага павета, у тым ліку і аб К. Ц. Анікіевічу, яго вучню і супрацоўніку па "Беларускаму зборніку".

Памёр Е. Р. Раманаў у 1922 г.

В. К. Бандарчык.

Яны былі на Сенненшчыне

АЛЯКСАНДР СЯРГЕЕВІЧ ПУШКІН

Вялікі рускі паэт Аляксандр Сяргеевіч Пушкін (1799—1837) заязджаў у в. Колпіна, каб пазнаёміцца з мясцовым памешчыкам Ігнаціем Дэспатам-Зяновічам, які перакладаў яго творы на польскую мову.

КАЦЯРЫНА II

Расійская імператрыца Кацярына II (1729—1796) праездам з Полацка ў Магілёў на сустрэчу з аўстрыйскім імператарам Іосіфам у 1780 г. пабывала ў Сянне. Выехаўшы з Полацка ў 9 гадзін раніцы, яна прыбыла ў Сянно 22 мая ў 19 гадзін. Начавала тут у замку. 23 мая ў 9 гадзін раніцы адправілася праз Шклоў у Магілёў, куды і прыбыла вечарам. У сваім дзённіку Кацярына II запісала: "Дорога между Сенно и Шкловом местами очень живописна и похожа на английский парк".

НАПАЛЕОН ОРДА

Кампазітар, піяніст, педагог і мастак Напалеон Орда (1807—1883) нарадзіўся ў вёсцы Варацэвічы Пінскага павета (цяпер Іванаўскі раён) у сям'і інжынера. У 1823 г. паступіў у Віленскі універсітэт, з якога быў выключаны ў 1827 г. за ўдзел у тайным студэнцкім таварыстве. Удзельнік паўстання 1830—1831 гг. у Польшчы, на Літве і Беларусі. Эмігрыраваў. Жыў у Аўстрыі, Швейцарыі, Італіі.

У 1856 г. вярнуўся на радзіму. У 1877 г. Н. Орда наведаў Сянно. Тут ён напісаў карціну "Сенна губернія Магілёўская 30 ліпеня 1977 года". Карціна выканана ў акварэльных фарбах і знаходзіцца ў зборы малюнкаў Н. Орды ў Нацыянальным музеі ў Кракаве. Па Беларусі ім зроблена больш за 200 малюнкаў.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Шляхам барацьбы і выпрабаванняў

Буржуазны Часовы ўрад, прыкрываючыся фразамі аб абароне заваёў "рэвалюцыі і айчыны", выступаў за працяг вайны да пераможнага канца. Каб дагадзіць саюзнікам, было вырашана летам кінуць расійскія войскі ў наступленне.

У тыя дні, быццам патрывожаны вулей, бурліў і 303-і Сенненскі полк. Салдаты ў сувязі з наступленнем вынеслі рэзалюцыю супраць працягу крывавай бойні. Скончылася тым, што полк акружылі казакі, 138 найбольш рэвалюцыйна настроеных салдат арыштавалі і кінулі ў Дзвінскую турму.

У пачатку верасня 1917 г. салдат-франтавікоў, арыштаваных за выступленні супраць вайны, спецыяльным эшалонам накіравалі ў Маскву, змясцілі ў Бутырскую турму. На дзевяты дзень зняволення ў Бутырцы франтавікі аб'явілі галадоўку. Бальшавікі Масквы, рабочыя рашуча выступілі за неадкладнае вызваленне салдат-франтавікоў. Часоваму ўраду нічога не заставалася, як выпусціць іх з-пад варты. Але на волі франтавікі не маглі бяздзейнічаць. Адны абучалі чырвонагвардзейцаў ваеннай справе, другія неслі на фабрыкі, заводы і ў вайсковыя часці рэвалюцыйныя ідэі. Не ўсе выжылі ў віхуры рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

10.11.1917 г. працоўная Масква, перамогшы контррэвалюцыю, аддавала апошнія ўшанаванні загінуўшым рабочым і салдатам. Усе яны пахаваныя ля Крамлёўскай сцяны. У гэтых брацкіх магілах пахаваны і салдаты гераічнага 303-га Сенненскага палка.

У Сянне савецкая ўлада была ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. 26 лістапада I з'езд сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў Сенненскага павета прыняў рэзалюцыю, у якой адзначалася, што "уся ўлада ў Сенненскім павеце пераходзіць да Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў і Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта".

У маі адбыўся II з'езд Саветаў Сенненскага павета. У яго рэзалюцыі ўказвалася, што ўзяцце ўлады ў рукі працоўных — гэта палова справы, самая ж галоўная задача заключаецца ў тым, каб ажыццявіць сацыялізм на справе. З'езд заклікаў усіх працоўных усямерна садзейнічаць аднаўленню народнай гаспадаркі, актыўна праводзіць работу па стварэнню Чырвонай Арміі.

У гэты час ажыццяўляліся рэвалюцыйна-дэмакратычныя і сацыялістычныя пераўтварэнні ў вёсцы. Першым крокам ў гэтым напрамку была канфіскацыя памешчыцкіх маёнткаў і нацыяналізацыя зямлі. Бальшавіцкія агітатары растлумачвалі сялянам сутнасць ленінскага Дэкрэта аб зямлі, канкрэтныя шляхі яго ажыццяўлення. На базе канфіскаваных памешчыцкіх маёнткаў пачалі арганізоўвацца савецкія (дзяржаўныя) гаспадаркі. У Сенненскім павеце першым быў створаны такі саўгас у былым маёнтку Беліца памешчыка Свяцкага.

Устанаўленне савецкай улады выклікала шалёнае супраціўленне звергнутых класаў. Контррэвалюцыя пачала грамадзянскую вайну. Германскае камандаван-

не, скарыстаўшы адмову Троцкага падпісаць мірны дагавор, заявіла аб спыненні перамір'я. 18.2.1918 г. германскія і аўстра-венгерскія дывізіі перайшлі ў наступленне. Органы савецкай улады на месцах мабілізавалі ўсе сілы на барацьбу з ворагам. Тысячы рабочых і сялян, былых салдат запісваліся ў Чырвоную Армію. Вось што пісалі "Известия губернского исполкома" у адным са сваіх нумароў: "Заклік губернскага выканкома аб арганізацыі рэвалюцыйнай Чырвонай Арміі выклікаў вельмі спачувальныя адносіны з боку насельніцтва паветаў нашай губерні. З Сянна, Чэрыкава, Талачына і іншых месц атрыманы тэлеграмы аб тым, што сяляне ахвотна запісваюцца ў Чырвоную Армію". У даведцы вучэбнага аддзела Усерасійскай Чырвонай Арміі ад 5.4.1918 г. указвалася, што ў Сянне ёсць атрад добраахвотнікаў колькасцю ў 310 чалавек, яго ўзбраенне — 3 кулямёты, 50 гранат, 10 тысяч патронаў.

Вясной і летам 1918 г. у падтрымку Чырвонай Арміі выказаліся другі з'езд Саветаў Сенненскага павета, сход членаў сельскіх саветаў і камуністычных ячэек Латыгальскай воласці, агульны сход жыхароў в. Міхнава. У канцы 1918 г. з добраахвотнікаў быў сфарміраваны Сенненскі народны полк, які актыўна ўдзельнічаў у барацьбе за ўмацаванне савецкай улады ў павеце.

Летам і восенню 1918 г. на тэрыторыі Беларусі актывізавалі свае дзеянні левыя эсэры і кулацтва, якія ставілі мэтай ліквідацыю мясцовых Саветаў, іншых савецкіх устаноў. Паўстаўшы полк, які дыслацыраваўся недалёка ад дэмаркацыйнай лініі на тэрыторыі Сенненскага павета, разагнаў мясцовы Савет і, парушыўшы Брэсцкі мір, уступіў на тэрыторыю, кантралюемую нямецкімі войскамі. Гэтай правакацыяй левыя эсэры імкнуліся аднавіць вайну з Германіяй. Аднак рашучымі мерамі Савецкага ўрада пагроза ваенных дзеянняў была ліквідавана. 26—27 верасня германскія войскі былі выведзены з тэрыторыі Сенненскага павета. Мясцовыя жыхары з радасцю сустракалі воінаў-чырвонаармейцаў. У Сянне і іншых населеных пунктах павета адбыліся сходы і мітынгі працоўных, на якіх яны выказвалі шчырую ўдзячнасць савецкай уладзе за вызваленне ад акупантаў і гарачае імкненне абараняць яе да апошняй кроплі крыві. На вызваленай тэрыторыі паўсюдна ствараліся органы савецкай улады — ваенныя Саветы, рэвалюцыйныя камітэты, выканкомы Саветаў.

19 ліпеня 1918 г. выканком Сенненскага павятовага Савета прыняў пастанову аб тэрміновым ажыццяўленні дэкрэта аб хлебнай манаполіі і арганізацыі камітэтаў беднаты. Харчоваму аддзелу даручалася ўзяць на ўлік увесь ураджай.

Рашуча выказаўся за стварэнне камбедаў трэці з'езд Саветаў павета, які адбыўся 19 жніўня. У яго рэзалюцыі валасным Саветам прапаноўвалася прыняць энергічныя меры па арганізацыі камітэтаў вясковай беднаты.

На наступны дзень з'езд зацвердзіў рэзалюцыю па харчоваму пытанню. Было вырашана правесці дакладны ўлік хлеба новага ўраджаю і лішкаў 1917 г., перадаць іх у распараджэнне павятовага харчовага камітэта. Для практычнага ажыццяўлення гэтых мерапрыемстваў з'езд пастанавіў стварыць камбеды і рэквізіцыйныя атрады. Рашэнне з'езда ў штыкі сустрэлі заможныя сяляне, якія не жадалі добраахвотна здаваць хлеб. Яны забівалі савецкіх актывістаў, разганялі сходы беднякоў.

Газета "Известия Западной Комуны" 2.11.1918 г. пісала, што ў Сенненскім павеце створаны камісіі ад камбедаў, якія павінны "неадкладна прыступіць да рэквізіцыі жывёлы ў тых, у каго яна ёсць звыш устаноўленай інструкцыяй нормы і перадаць сем'ям, маючым у ёй патрэбу". А 15 лістапада газета паведамляла, што 3 кастрычніка ў Пустынках адбыўся надзвычайны з'езд камбедаў, на якім "даклады з месц паказалі, што ў сёлах настрой бадзёры, насельніцтва воласці свядома стаіць за савецкую ўладу, кулакі і спекулянты зусім прыціхлі, улік хлеба праводзіцца без усялякіх эксцэсаў і амаль ужо закончан". Аб канфіскацыі лішкаў харчавання ў павеце 19 снежня паведамлялі

"Известия Могилевского губревкома". Каб хутчэй завяршыць гэтую работу, у воласці былі накіраваны прадстаўнікі павятовага харчовага камітэта і чырвонаармейцы.

10.11.1918 г. Сенненскі павятовы выканком Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў прыняў пастанову аб узмацненні барацьбы са спекуляцыяй. У ёй гаварылася, што "спекуляцыя з'яўляецца такім жа ворагам савецкай улады, як і ўсякая контррэвалюцыя", што яна "імкнецца анулявать нацыяналізацыю прыватнага гандлю і хлебную манаполію, а таксама стварае разруху на транспарце і ў харчаванні, чым асуджае насельніцтва горада на галодную смерць..." Валасным выканкомам і сельскім камітэтам беднаты прапаноўвалася арыштоўваць і дастаўляць у павятовую надзвычайную камісію ўсіх асоб, якія прывозяць любыя прадукты харчавання без адпаведнага дазволу. Усялякі вываз прадуктаў з вёскі і воласці без ведама камітэта беднаты лічыўся незаконным.

Пасля вываду нямецкіх войск шмат жывёлы і неабмалочанага збожжа аказалася ў маёнтку Беліца. Харчовы атрад сумесна з камітэтам беднаты адразу ж наладзіў тут абмалот жыта. Хлебам былі забяспечаны мясцовыя батракі і чырвонаармейскія ўдовы. Болей за 10 тыс. пудоў жыта адправілі ў Сянно на склад.

Шмат вагонаў з харчаваннем адпраўляў Сенненскі павет рабочым Масквы і Петраграда, а таксама на фронт. Гэта вымагала вялікай працы і немалых ахвяр. Разгаралася бязлітасная класавая барацьба. У схватках за хлеб загінулі многія супрацоўнікі харчовых атрадаў. У Какоўчынскай воласці ворагі штыком закалолі І. Е. Тарасевіча. Па дарозе з Сянна на станцыю Багушэўская яны адсеклі галаву Міхневічу, які суправаджаў падводы з прадуктамі харчавання. Балтыйскага матроса Нікалаева па-зверску забілі ў Лісічанскай воласці, прымацаваўшы да грудзей паперку з надпісам: "Харчразвёрстка выканана". Ф. І. Курашэвічу з вёскі Кажамякі кулакі прастрэлілі грудзі.

Акрамя рэквізіцый хлеба, мясцовыя органы ўлады праводзілі вялікую работу па расшырэнню пасяўных плошчаў, прыцягненню ў вытворчасць бяднейшага сялянства, стварэнню калектыўных гаспадарак. Як і ў іншых паветах Беларусі, на Сенненшчыне ствараліся гаспадаркі трох тыпаў: таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, арцелі і камуны. Работа гэтая была складаная, не дапускала спешкі, патрабавала захавання добраахвотнасці і паслядоўнасці. Усяго ў павеце ўзнікла першапачаткова 12 калектыўных гаспадарак, у тым ліку тры камуны — у Пустынкаўскай, Латыгальскай і Машканскай валасцях. У Машканах камуне далі імя У. І. Леніна.

Першыя камуны існавалі таксама ў вёсках Белая Ліпа, Падворыца, Баравікі, у некаторых іншых. Беззямельныя сяляне вёсак Сапегі, Ладынец, Шацяні, Машчоны стварылі камуну пад назвай "Чырвоны маяк". Яе арганізатарам быў Сямён Сапежка. Камунары пабудавалі дамы, памяшканні для жывёлы, крыху пазней адкрылі клуб, сталоўку, дзіцячы садок. З многіх бліжэйшых вёсак прыходзілі да камунараў сяляне паслухаць радыё, паглядзець канцэрт мастацкай самадзейнасці. Некаторых з іх затым прынялі ў камуну. У перыяд калектывізацыі сельскай гаспадаркі члены камуны перайшлі на статут сельгасарцелі. Побач з дамамі, дзе жылі камунары, з'явіліся новыя. Так узнікла вёска з паэтычнай назвай Белая Ліпа. Цяпер яна ў калгасе імя Суворава.

У вёсцы Баравікі камуна называлася "Мір". Першымі яе членамі былі Міхаіл Шарпіла, Пракоп і Васіль Цапковы, Навум Саўлевіч, Сцепаніда Ціхановіч.

29.11.1920 г. у Сянне адбыўся з'езд прадстаўнікоў калектыўных гаспадарак.

Паступова ажыццяўляліся мерапрыемствы савецкай улады ў галіне культурнага будаўніцтва. У складанай абстаноўцы пачалася перабудова ўсёй сістэмы народнай адукацыі. У Сенненскім павеце толькі ў студзені 1918 г. было адкрыта пяць вышэйшых пачатковых вучылішчаў. Пры існаваўшым у Сянне вышэйшым вучылішчы былі адкрыты паралельныя класы.

Новыя савецкія школы пачыналі работу ў надзвычай цяжкіх умовах: не было

дастатковай колькасці прыстасаваных памяшканняў, вучэбных дапаможнікаў, настаўніцкіх кадраў. У Сянне пад вышэйшае вучылішча быў прыстасаваны закрыты перад пачаткам імперыялістычнай вайны казённы спіртаачышчальны склад. Каб забяспечыць школы настаўнікамі, адданымі савецкай уладзе, адкрываліся кароткатэрміновыя курсы. Такія курсы працавалі ў Сянне. У 1919 г. у павеце, як і ва ўсёй Беларусі, была завершана работа па ліквідацыі старой сістэмы народнай адукацыі і створана адзіная працоўная савецкая школа.

1—2.3.1919 г. адбылася Сенненская павятовая канферэнцыя РКП(б), на якой прысутнічала 35 дэлегатаў. Абмяркоўвалася галоўнае пытанне — аб рабоце мясцовых партячэек. На канферэнцыі быў зроблены грунтоўны даклад аб рабоце ячэек. Выступаўшыя ў спрэчках гаварылі аб рабоце камуністаў у вёсцы, аб цяжкасцях, з якімі яны сутыкаюцца ў практычнай дзейнасці.

У Пустынкаўскай воласці ячэйка арганізавалася вясной 1918 г. і налічвала 48 чалавек. 18.11.1918 г. арганізавана ячэйка ва Ульянавіцкай воласці. У ёй налічвалася 30 чалавек. У Раснянскай воласці багацейшыя сяляне ўсімі сіламі імкнуліся перашкодзіць арганізацыі ячэйкі, раздзяліць беднякоў і сераднякоў. І ўсё ж ячэйка была арганізавана.

Вясной 1919 г. Магілёўская губерня была ліквідавана. Сенненскі павет увайшоў у склад Віцебскай губерні РСФСР. Абстаноўка ў маладой рэспубліцы Саветаў у той час была вельмі складанай.

Загадам рэўваенсавета Заходняга фронту ад 6.10.1919 г. быў створаны Віцебскі губрэўком, які ў сваю чаргу ўтварыў павятовыя рэўкомы. У склад Сенненскага павятовага рэўкома ўвайшлі Г. С. Стэльмах (старшыня), В. Н. Красноўскі, В. М. Лугаўцоў, Ф. І. Баранок, Т. Г. Мурашкевіч і яшчэ некалькі чалавек. У баявую гатоўнасць былі прыведзены войскі ўнутранай аховы, атрады міліцыі.

11.7.1919 г. у Сенненскай павятовай газеце "Факел" было апублікавана пісьмо чырвонаармейцаў І. Кулікова і А. Кучынскага, у якім гаварылася: "Мы, чырвонаармейцы, мабілізаваны Ульянавіцкай камуністычнай ячэйкай як стойкія абаронцы савецкай улады. Калі мы адпраўляліся на фронт, то нас і нашыя сем'і абсмяялі дэзерціры. Сапраўды, таварышы, няхай бы яшчэ больш смяяліся кулацкія сынкі, а то крыўдна, што па сваёй несвядомасці смяецца іншы бядняк... Прывітанне сумленным тылавікам і просьба звярнуць увагу на нашы сем'і, а мы з гатоўнасцю пойдзем супраць Дзянікіна..."

У верасні 1919 г. Сенненскі павятовы камітэт РКП(б) правёў мабілізацыю ўсіх членаў партыі. Вось што пісала з гэтай нагоды газета "Факел": "Пастановай агульнага сходу членаў Сенненскай камуністычнай арганізацыі ад 30.9.1919 г. усе члены арганізацыі лічацца мабілізаванымі і перадаюцца ў распараджэнне ваенкома... Тыя, хто ўхіляецца ад мабілізацыі, будуць выключаны з арганізацыі і перадаюцца ў распараджэнне камітэта па барацьбе з дэзерцірамі".

Аб класавай барацьбе і рашучасці беднякоў абараняць савецкую ўладу сведчыць пісьмо чырвонаармейца сенненскай ахоўнай роты, апублікаванае ў газеце "Факел" і падпісанае ініцыяламі "А. Е.". "Тыя, хто належыць да пралетарыяту, — пісаў ён, — павінны ўсведамляць вялікую небяспеку, якая пагражае пралетарыяту ў выпадку вяртання капіталізму, і рашуча выступіць супраць агульных ворагаў рабочых і сялян... Няхай жыве класавая свядомасць чырвонаармейцаў!"

24 студзеня 1920 г. Сенненская павятовая беспартыйная канферэнцыя звярнулася да працоўных з заклікам "добраахвотна прыняць удзел у нарыхтоўцы дроў, каб усе, хто можа, дапамаглі пазбавіцца ад небяспечнага ворага". 8 мая 1920 г. Сенненскі павятовы рэўком прыняў пастанову аб мабілізацыі падвод для надзвычайных ваенных патрэб. Для выканання баявога задання воласці павінны былі прадставіць пэўную колькасць падвод: Ульянавіцкая — 150, Раснянская — 500, Какоўчынская — 200.

Гераічная барацьба працоўных закончылася поўнай перамогай над інтэрвен-

тамі і белагвардзейцамі. Наступілі гады аднаўлення народнай гаспадаркі.

Першыя пасляваенныя гады, асабліва 1921-ы і 1922-і, былі для працоўных павета вельмі цяжкімі. Не хапала паліва, сыравіны, матэрыялаў, абсталявання. Прамысловыя прадпрыемствы, не звязаныя з выкананнем ваенных заказаў, не працавалі. Ратуючыся ад голаду, рабочыя ішлі ў вёску, займаліся саматужніцтвам. У 1920—1923 гг. колькасць жыхароў у Сянне скрацілася на 21,1%.

У справаздачы аддзела ўпраўлення Сенненскага павятовага выканаўчага камітэта Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў ад 2.10.1922 г. адзначалася, што буйной дзяржаўнай прамысловасці ў павеце няма, за выключэннем чатырох вінных заводаў, якія знаходзяцца ў падначаленні губернскага Савета Народнай Гаспадаркі (а менавіта Обаль, Янова, Відокі і Пурплева). Паблізу Сянна для абслугоўвання гэтых прадпрыемстваў быў абсталяваны вінны склад. На справаздачную дату з чатырох вінных заводаў тры не працавалі.

У маёнтку Ходцы быў крухмальна-цёрачны завод, тут жа працавалі лесапільня, сукнавальня і млын. Усяго ў павеце налічвалася 47 вадзяных і паравых млыноў. Раней яны належалі памешчыкам, а ў перыяд рэвалюцыі перайшлі ў падпарадкаванне дзяржавы. Штогадовы прыбытак ад мукамольнай прамысловасці складаў у сярэднім 45 тыс. пудоў зерня.

У кастрычніку 1922 г. у павеце мелася 5 дробных гарбарных прадпрыемстваў (па 2 ў Сянне і Лукомлі і адзін у Чарэі) з колькасцю рабочых ад 3 да 6 чалавек. Акрамя таго, працаваў маслабойны завод у вёсцы Оўсішча Ульянавіцкай воласці.

У запушчаным стане знаходзілася сельская гаспадарка. У 1920 г. пасяўныя плошчы, у параўнанні з 1916 г., складалі толькі 40 працэнтаў. Асабліва скараціліся пасевы льну, каноплі, канюшыны. У сярэднім на адну гаспадарку прыпадала коней — 0,87, кароў — 1,37, авечак — 1,67, а зямлі на душу насельніцтва — каля паўтары дзесяціны. Пераважала трохпольная сістэма земляробства. На больш высокім узроўні знаходзілася сельскагаспадарчая вытворчасць у латышскіх пасяленнях Машканскай і Какоўчынскай валасцей. Тут разводзілася больш жывёлы, сустракаліся гаспадаркі са шматпольным севазваротам.

У павеце разгарнулася вялікая работа па падрыхтоўцы да веснавой пасяўной кампаніі 1921 г. Галоўнай яе задачай было пашырэнне пасяўных плошчаў. Цяжкасці заключаліся ў тым, што значная частка сялянскіх гаспадарак адчувала востры недахоп насення, інвентару, коней. Ім аказвалася значная дапамога.

Важным выпрабаваннем для новага эканамічнага курса Савецкай дзяржавы з'явілася правядзенне першай падатковай кампаніі, якая пачалася ў жніўні 1921 г.

Нарыхтоўка сельгаспрадуктаў ішла і па лініі тавараабмену. З гэтай мэтай у сельскай мясцовасці стварылі сетку кааператываў і тавараабменных пунктаў. У верасні 1921 г. у Сенненскім павеце для абмену на сельскагаспадарчую прадукцыю паступіла 275 пудоў солі, 800 аршын мануфактуры, 1018 пар абутку, 1600 кос, 1798 сярпоў, 50 плугоў, 5 веялак, 10 пудоў зубоў для барон. На падтрымку бяднейшых слаёў сялянства арыентавалася дзейнасць камітэтаў сялянскай грамадскай узаемадапамогі.

У 1921 г. пачалася работа па арганізацыі народнай асветы, медыцынскага абслугоўвання. Да верасня 1922 г. у павеце было 5 бальніц, 11 фельчарскіх пунктаў, 7 зубаўрачэбных кабінетаў. У Сянне дзейнічала гарадская амбулаторыя, урачэбна-кантрольная камісія і судовая эксперты-за. Апарат лячэбных устаноў складаў 53 чалавекі.

7.3.1924 г. была зацверджана пастанова аб змяненні межаў паміж БССР і РСФСР Прэзідыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР. Сенненскі павет увайшоў у склад Беларусі. 17.7.1924 г. II сесія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР ліквідавала паветы і воласці і стварыла акругі і раёны. Сянно стала цэнтрам аднаго з 12 раёнаў Віцебскай акругі. На тэрыторыі раёна было створана 14 сельсаветаў, Багушэўскі раён увайшоў у склад Аршанскай акругі.

Актывісты Сенненскага райвыканкома. У цэнтры старшыня выканкома Навумчык.

Святкаванне 8-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў г. Сянно. 1925 г.

У выніку перабудовы была створана новая трохзвённая сістэма дзяржаўных органаў — акруга, раён, сельскі Савет. Вялікія правы атрымалі раённыя выканкомы, значна пашырыліся правы сельскіх Саветаў. Нізавы савецкі аппарат умацаваўся, наблізіўся да сялянства і ў большай меры стаў здольны выконваць задачы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Вясной 1925 г. пачалося будаўніцтва чыгункі Орша—Лепель, якая прайшла і па тэрыторыі Сенненскага раёна. З многіх куткоў краіны з'ехаліся сюды чыгуначныя воінскія часці, якія для зручнасці кіравання былі зведзены ў асобы корпус. Размясціліся яны ўздоўж усёй трасы. Пяты чыгуначны полк, які прыбыў з Віцебска і з'яўляўся галаўным на будоўлі, размясціўся са сваім штабам у вёсцы Машкова.

Чыгуначнікі за адзін сезон завяршылі асноўныя работы. 7.11.1925 г. па новай чыгунцы, пад гукі духавых аркестраў, з Оршы на Лепель прайшоў першы пробны цягнік. Жыхары бліжэйшых вёсак сустракалі яго хлебам-соллю.

Новая чыгунка мела вялікае значэнне для ўмацавання эканомікі раёна. Калі раней бліжэйшая чыгуначная станцыя Багушэўская знаходзілася ад Сянна на адлегласці ў 38 км, то цяпер з'явілася станцыя Бурбін за 15 км ад раённага цэнтра. Пазней гэтыя населеныя пункты звязала і шаша.

Да канца 1925 г. закончылася аднаўленне народнай гаспадаркі на новай, сацыялістычнай аснове. Савецкая дзяржава паступова накіроўвала саматужную прамысловасць у рэчышча кааператыўнай сістэмы. Адным з першых кааператыўных аб'яднанняў стала арцель "Гнутая мэбля", якую ў 1925 г. арганізавалі ў Багушэўску 8 майстроў-прыватнікаў. У 1928—1929 гг. у Сянне зарэгістраваны арцелі: рымараў — "Прагрэс", кавалёў — "Молат", шаўцоў — "Швейнік", шапачнікаў — "Яднанне", краўцоў — "Чырвоны кравец", а таксама "Перамога" ў вёсцы Папоўка — па выраб цэглы, арцель дрэваапрацоўшчыкаў "Чырвоная зара" ў вёсцы Розмыслава. На 1.10.1930 г. у Сянне мелася 7 саматужных аб'яднанняў, у якіх налічвалася 180 чалавек. Уся мясцовая прамысловасць аб'ядналася ў прамкамбінат, куды ўваходзілі газагенератарны, паравы і вадзяны млыны, лесапільня, сукнавальня, маслазавод, слясарна-рамонтная майстэрня, торфазавод, друкарня.

У 1930 г. у Сянне было 3170 жыхароў, у тым ліку 1117 беларусаў, 1654 яўрэі, 346 палякаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. З 710 сем'яў, што пражывалі ў горадзе, да рабочых адносіліся 126, да сялян — 111, да служачых — 189, да прыватнікаў — 206, да гандляроў 8 і 70 іншых сем'яў. Усё працаздольнае насельніцтва Сянна поўнасцю працавала ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і ў саматужна-прамысловай кааперацыі.

14 верасня 1929 г. Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі рэспублікі разгледзеў пытанне аб будаўніцтве ў горадзе электрастанцыі. Яна была ўведзена ў строй у канцы 1930 г. Вясной пачала працаваць майстэрня па рамонту сельскагаспадарчых машын і абсталявання мясцовай прамысловасці. Аднак за гады першых пяцігодак Сянно, карэнным чынам змяніўшы сваё сацыяльнае аблічча, не стала прамысловым цэнтрам. Прамысловае будаўніцтва тут было нязначным і не лічылася першачарговай народнагаспадарчай задачай. У горадзе, які знаходзіўся ў цэнтры сельскагаспадарчага раёна, пабудавалі прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны (ільнозавод, маслазавод), а таксама майстэрню па вытворчасці і рамонту гужавых транспартных сродкаў. У раёне працавалі спіртзаводы, смалакурні і невялікія дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы, розныя майстэрні і арцелі.

У красавіку 1929 г. адбылася XVI канферэнцыя ВКП(б), якая вызначыла задачы па далейшаму разгортванню калектывізацыі. Партыйныя рашэнні сталі кіраўніцтвам да дзеяння і на Сенненшчыне.

Адным з першых створаны калгас у вёсцы Ульянавічы. Перад пачаткам палявых работ тут адбыўся мітынг. Выступіўшыя старшыня калгаса Раман Ліцвінка, старшыня сельскага Савета Дзям'ян Буйневіч, сакратар партячэйкі Андрэй Квятоўскі, галоўны аграном раённага зямель-

нага аддзела Яфім Шэйнін гаварылі аб перавагах калектыўнай гаспадаркі, аб радасці земляроба ў сувязі з першым выездам у поле. Пасля мітынгу сфатаграфаваліся і пачалі работу. За плугам хадзілі ўсе: і старшыня калгаса, і актывісты сельскага Савета, і настаўнікі, і ўпаўнаважаныя з раёна.

У першы год калектыўнай работы сабралі ўраджай добры, працадзень быў багатым. На наступны год асушылі балота. Паступова калгас імя Ульянава (так яго назвалі сяляне) стаў займаць перадавыя пазіцыі не толькі ў сельсавеце, але і ў раёне. Некалькі год запар ён утрымліваў раённы Пераходны Чырвоны сцяг. У перадваенныя гады калгаснікі атрымлівалі на працадзень па 3—4 кг зерня, па 8—10 кг бульбы. У вёсцы з'явіліся новыя грамадскія будынкі, на палетках — трактары.

У студзені 1930 г. праходзіў Сенненскі раённы з'езд калгаснікаў. Размова на ім ішла аб насенні і ўгнаеннях, беражлівасці і ўмелым гаспадаранні, аб тэхніцы і кадрах. Першым пунктам свайго рашэння ўдзельнікі з'езда запісалі: "Ні на адну мінуту не аслабім тую лінію, якую наметіла партыя". У пачатку чэрвеня 1930 г. калгаснікі былой камуны "Мір" рапартавалі аб сваіх поспехах. Веснавая сяўба праведзена паспяхова. Калгаснікі пачалі будаўніцтва кароўніка на 500 галоў. Выкананы план нарыхтовак калгасам "Мір": 300 пудоў ільновалакна, 3500 пудоў бульбы, 1000 пудоў капусты, 4000 пудоў яблыкаў і 21 галава буйной рагатай жывёлы. Поспехі калгаснікаў мелі вялікі ўплыў на сялян. Яны аб'ядноўваліся ў калектыўныя гаспадаркі.

15.11.1930 г. на пасяджэнні прэзідыума Сенненскага райвыканкома адзначалася, што ўборка ўраджаю і сяўба азімых праведзены здавальняюча. Вялікую дапамогу калгаснікам аказалі рабочыя брыгады, накіраваныя ў вёску. За перыяд уборачнай кампаніі і сяўбы арганізавана 11 новых калгасаў. На 1.1.1932 г. калектывізацыя ў раёне ў асноўным была завершана. Пачалі стварацца машынна-трактарныя станцыі (МТС). Напярэдадні вайны іх у раёне было чатыры.

У ліпені 1934 г. адбыўся раённы злёт маладых калгасных брыгадзіраў. Яго ўдзельнікі абмеркавалі пісьмо маладых брыгадзіраў Паўночнага Каўказа і адзінадушна адобрылі прапанову аб арганізацыі спаборніцтва камсамольска-маладзёжных паляводчых і трактарных брыгад за лепшае і хутчэйшае правядзенне ўборкі ўраджаю і здачы хлеба дзяржаве.

З году ў год узрастала роля машынна-трактарных станцый. У 1937 г. Сенненская МТС абслугоўвала 87 калгасаў з агульнай плошчай ворнай зямлі 23461 га. Шырокае развіццё ў раёне атрымала ільнаводства.

У 1939 г. 24 работнікі сельскай гаспадаркі раёна з'явіліся ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Перадавікі і наватары вытворчасці былі адзначаны дыпломамі, прэміямі, медалямі.

Станоўчыя зрухі адбываліся ў культурным будаўніцтве. Галоўнай задачай, якая патрабавала хуткага рашэння, была ліквідацыя непісьменнасці.

Значныя сродкі накіроўваліся на будаўніцтва новых і рамонт старых школьных памяшканняў, на набыццё абсталявання, дапаможнікаў. 15.9.1930 г. прэзідыум Сенненскага райвыканкома прыняў рашэнне аб будаўніцтве ў 1931 г. сямі школ: у вёсках Асінаўка Беліцкага, Кляпчэва Пустынкаўскага, Багданава Раснянскага, Марозаўка Нямойтаўскага, Войлева Машчонскага сельсаветаў, а таксама ў Алексінічах і Ходцах. Пры школах са сродкаў дзяржавы, прафсаюзаў і ўзносаў насельніцтва ствараліся фонды ўсенавуча, дапамогі дзецям беднаты. За іх кошт школьнікам са слабазабяспечаных сем'яў бясплатна выдаваліся падручнікі, а таксама адзенне, абутак, харчаванне. У 1930—1931 гг. амаль усе дзеці школьнага ўзросту ў раёне вучыліся.

У Сянне ў той час працавалі 2 беларускія сямігодкі, яўрэйская і польская двухкамплектныя школы.

З году ў год паляпшалася работа культурна-асветных устаноў. У 1930 г. ў Сянне дзейнічалі Народны дом, гарадскі тэатр, 3 чырвоныя куткі, школа малаадукаваных. На вёсцы асноўнай палітыка-асвет-

най установай былі хаты-чытальні. У маі 1931 г. Народны дом рэарганізаваны ў раённы Дом сацыялістычнай культуры. Паўстала пытанне аб будаўніцтве ў Сянне новага будынка раённага Дома культуры. Ён быў адкрыты ў 1937 г.

Усё шырэй у жыццё працоўных уваходзілі друк, радыё, кіно, электрычнасць. Паміж сельскімі Саветамі яшчэ ў 1933 г. пачала ўстанаўлівацца тэлефонная сувязь.

За параўнальна кароткі час прыкметныя змены адбыліся ў жыцці рабочых, сялян, інтэлігенцыі, у іх побыце. Замест курных хат, якіх калісьці было нямала ў вёсцы, выраслі дабротныя дамы, зусім зніклі лапці, даматканую вопратку паступова замянілі крамныя вырабы. Хлопцы і дзяўчаты з сёл і гарадоў запаўнялі студэнцкія аўдыторыі, станавіліся дыпламаванымі настаўнікамі, урачамі, інжынерамі. Вельмі прэстыжна было стаць афіцэрам Чырвонай Арміі, і хлопцы ахвотна паступалі ў ваенныя вучылішчы.

Былі, канечне, і ценявыя бакі ў жыцці сацыялістычнага грамадства, аб чым мы зараз добра ведаем, але гэта асобная тэма.

Важнай падзеяй у жыцці працоўных стала прыняцце Канстытуцыі СССР 1936 г., якая надзяліла людзей нябачанымі дагэтуль правамі, аб чым марылі многія пакаленні працоўных горада і вёскі. Збывалася тое, пра што пісаў Янка Купала, — беларусы маглі "людзьмі звацца".

З 1938 г. Сянно стала раённым цэнтрам Віцебскай вобласці. Па дадзеных перапісу 1939 г. у ім пражывала 4305 чалавек.

Стваральная праца савецкіх людзей была парушана 22.6.1941 г. вераломным нападам фашысцкай Германіі на нашу краіну.

У. Р. Скапа.

Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

АЛЕКСІНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЕКСІНІЧЫ

ЖАГУЛОВІЧ Піліп Максімавіч.
ТУЛІН Іван Паўлавіч.

ВЁСКА ЗЯМКОВІЧЫ

ЦЫПЛЯКОЎ Сцяпан Яфрэмавіч.

ВЁСКА ЛЕСНІКОВА

ВЯЛІЧКА Васіль Тарасавіч.
ГАГОЛКА Лук'ян Яфімавіч.
ДЗЯТЛАЎ Юрый Сіланцьевіч.
ДЗЯТЛАЎ Мікалай Сіланцьевіч.
ЖУРАЎ Пётр Рыгоравіч.
НОВІКАЎ Рыгор Мінавіч.

ВЁСКА ЛУГ

ДЗЯТЛАЎ Рыгор Фёдаравіч.
ЛУГАЎЦОЎ Аляксандр Анісімавіч.
СЛІЖОЎ Ягор Паўлавіч.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК БАГУШЭЎСК

ЛАУТКІН Ігнат Георгіевіч.
ПЕЧКУРОЎ Сямён Пятровіч.
ПЕЧКУРОЎ Фёдар Нічыпаравіч.
ШУХТО Сцяпан Мікітавіч.

БАГУШЭЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЕКСАНДРЫЯ (ВУСЦЕ)

БІЗУНОЎ Рыгор Аўрамавіч.
ПАЖАРСКІ Сямён Сцяпанавіч.
ПЯТРАШЫН Павел Іванавіч.
ШМАН Іван Карпавіч.

ВЁСКА ПАСАД

ПЕЧКІН Мікалай Фаміч, матрос крэйсера "Аўрора".
СУХАДОЛАЎ Макар Васільевіч.

ВЁСКА ПАСТУШКІ

ШАРАЙ Фёдар Андрэевіч.

ВЁСКА ПЕСАЧАНКА

ЛАГУНОЎ Васіль Пракопавіч.
СУДНІЧЭНКА Пракоп Фёдаравіч.
ХАМЯНКОЎ Павел Васільевіч.

ВЁСКА ЯНОЎШЧЫНА

ВАКАР Аляксей Маркавіч.
ВАКАР Ягор Кліменцьевіч.

БЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МАНГОЛІЯ

ШЫБЕКА Мяфодзій Паўлавіч.

ВЁСКА МЯНЮЦЕВА

КУЛІК Канстанцін Аляксандравіч

ВЁСКА ПОЛЫМЯ

ГАЛУЗА Пётр Рыгоравіч.
КАВАЛЁЎ Іван Емяльянавіч.
ПАЎЛОЎСКІ Фёдар Барысавіч.
ТАРАСЕВІЧ Ілья Васільевіч.
ШАСТАКОЎ Уладзімір Арцёмавіч.

ВЁСКА ЧОРНАЕ СЯЛО

СУКОНКІН Міхаіл Сільвестравіч.

КАКОЎЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГЕРМАНАВА

БАТОЎСКІ Сцяпан Пятровіч.

ВЁСКА ГРУЗДЫ

ШАЛУХА Якаў Андрэевіч.

ВЁСКА ЗАБАРАЎЕ

ШАЛУХА Сямён Іванавіч.
ЯЦКО Канстанцін Іванавіч.

ВЁСКА КУЛІКІ

ЗУЕЎ Міхаіл Іванавіч.
КУЛІК Аляксандр Іванавіч.
САЛАЎЁЎ Цімафей Аляксеевіч, н. у 1904.
ШУШКЕВІЧ Аляксандр Захаравіч.

ВЁСКА КАЛАНТАЁВА

СІДАРОВІЧ Даніла Антонавіч.

ВЁСКА КРУПЯЖЫНА

МАРЦІНОВІЧ Аўрам Астапавіч.

ВЁСКА ЛЕДНЕВІЧЫ

РУСАКОЎ Антон Архіпавіч.
СОЙКА Маркіян Кузьміч.

ВЁСКА ЛІПЛЯНСК

БАРКОЎСКІ Апанас Герасімавіч.
БАРКОЎСКІ Сямён Фёдаравіч.
ЦЫВІНСКАЯ Вольга Раманаўна.

ВЁСКА ЛІТУСОВА

ФІЛІППОВІЧ Раман Сахонавіч.

МАШКАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МАСОРЫ

НАХАЕЎ Аляксандр Андрэевіч.
НАХАЕЎ Захар Андрэевіч.
ЧАЛАЎ Іван Сяргеевіч.
ГАРАВЕЦ Васіль Міхайлавіч, н. у 1900.

ВЁСКА МАШКАНЫ

БАБЫЛЁЎ Фёдар Сцяпанавіч.
ЛЯТАС Якаў Ермалаевіч, н. у. 1880, памёр ад ран у 1919 у Смаленску.
МАШКАНАЎ Іван Аверавіч.

ВЁСКА ОБАЛЬ

КАЗЛОЎ Сямён Мікітавіч, н. у. 1884.

ОБАЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ОБАЛЬ

ПРЫСТАЎКА Антон Кірылавіч.
ПРЫСТАЎКА Кірыла Сазонавіч.

ВЁСКА РАМАНАЎКА

ПРЫСТАЎКА Дзмітрый Максімавіч.

ВЁСКА РУДАКОЎШЧЫНА

БАБАХІН Даніла Яфімавіч.

РАСНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАГДАНАВА

МУДРАК Анісім Раманавіч.

ВЁСКА БУДНА

АНІКІЕВІЧ Кірыла Адамавіч.
ШЫБЕКА Іосіф Сямёнавіч.

ВЁСКА ВАСІЛЬКОВА

КАМЯКОЎ Гаўрыла Паўлавіч.
ШАРСНЁЎ Барыс Якаўлевіч.

ВЁСКА ВЕЙНА

МАХАНЬКОЎ Макар Іосіфавіч.
СМІРНОЎ Сямён Раманавіч.

ВЁСКА КАМАРОВА

АЎСЮКЕВІЧ Мікіта Пятровіч.

ВЁСКА МАЖУЛЕВА

БАЦВІНАЎ Аляксандр Андрэевіч.
ВІЗНЕР Іван Трафімавіч.
МІРАНОВІЧ Улас Анісімавіч.
МАКОЎСКІ Ягор Карпавіч.

ВЁСКА РАСНА

ТРЫБУЛЬ Пётр Кліменцьевіч.

ВЁСКА СЕРКУЦІ

ДРУЖЫНА Андрэй Захаравіч.

ВЁСКА ЧУЦЬКІ

АНІКІЕВІЧ Пётр Ягоравіч.

СТУДЗЁНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЕКСАНДРОВА

ПАРАХОНЬКА Андрэй Капітонавіч.
ПАРАХОНЬКА Пётр Капітонавіч.
ШАФРАНСКІ Фядос Антонавіч.

ВЁСКА ГРАДА

ГАРНАК Аляксандр Васільевіч.

ВЁСКА КАВАЛІ

КАЗЛОЎСКІ Сямён Анісімавіч.
ШУХТО Ягор Васільевіч.

ВЁСКА МАШКІ

ПРЫСТАЎКА Міхаіл Максімавіч.
ПРЫСТАЎКА Сямён Максімавіч.

ВЁСКА САВІНІЧЫ

ЛАТЫШАЎ Рыгор Марцінавіч.

ВЁСКА СІНЯГОРСКАЯ (ТРУБАНОСЫ)

ВЫСОЦКІ Кузьма Аляксеевіч.
ЯРОХА Рыгор Сямёнавіч.

УЛЬЯНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАМОШША

ГАРАЛЁЎ Андрэй Платонавіч.
РАДКЕВІЧ Мірон Пятровіч.
САЛТАНОВІЧ Сідар Лявонавіч.
ФЯДЗЮК Барыс Ігнатавіч.

ВЁСКА ЛАТЫГАЛЬ

РАЧКОЎСКІ Іван Мікалаевіч.
ШЫДЛОЎСКІ Іосіф Уладзіміравіч.
ЮРОЎСКІ Міхаіл Нічыпаравіч.

ВЁСКА ФЕДЭРАТЫЎНАЯ (ТОРБІНКА-2)

БАРОЎСКІ Яфім Іванавіч.
ДЗЯМЕШЧАНКА Ігнат Максімавіч.
ДЗЯМЕШЧАНКА Павел Ігнатавіч.
ЕРАФЕЕЎ Фёдар Іванавіч.

ХОДЦАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНДРЭЙЧЫК Іван Мікітавіч.
БЯЛЯЕЎ Васіль Фаміч.
ВАЛЮШКІН Дзяніс Ігнатавіч.
КАВАЛЕНКА Іосіф Аўдзеевіч.
КАВАЛЕНКА Сцяпан Аўдзеевіч.
КУЗНЕЧЫК Піліп Кандратавіч.
ЛАТЫШАЎ Антон Цімафеевіч.
ПАРАЖЫНСКІ Фадзей Нічыпаравіч.
ШАРЭНДА Васіль Данілавіч.

Матрос з "Аўроры"

З успамінаў В. Шарковіча, былога матроса крэйсера "Аўрора"

На крэйсер "Аўрора" я трапіў у першай палове лютага 1917 г. Экіпаж з 800 чалавек быў дружны, рэвалюцыйна настроены. На крэйсеры ішла падрыхтоўка да ўзброенага паўстання. Асабліва вялікую агітацыйную работу праводзіў першы камісар "Аўроры" Аляксандр Белышаў.

І вось настаў час узброенага паўстання. Рэвалюцыйныя матросы занялі тэлеграф, узялі пад кантроль усе масты, за выключэннем Мікалаеўскага. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт загадаў нашаму камісару захапіць гэты мост. Аляксандр Белышаў даў каманду падрыхтаваць крэйсер да выхаду.

Камандзір крэйсера адмовіўся весці баявы карабель, спасылаючыся на тое, што "Аўрора" не пройдзе па Няве, бо мелкі фарватар.

Старшына рулявых С. Захараў узяўся змерыць фарватар Нявы ручным лотам. Высветлілася, што на малой хуткасці карабель можа падысці да моста. Карабель павёў С. Захараў. Пасля гэтага камандзір крэйсера згадзіўся сам весці карабель. Заўважыўшы крэйсер, юнкеры, якія ахоўвалі разведзены мост, уцяклі. Мы звялі мост і ўстанавілі па ім рух. Гарматы крэйсера былі накіраваны на Зімні палац.

У другой палове дня плошча Зімнята была блакіравана рэвалюцыйнымі войскамі. На дапамогу Рэвалюцыйнаму камітэту прыбыў пяцітысячны атрад кранштацкіх маракоў.

Вечарэла. Сыпаў халодны дождж. Мы выйшлі на верхнюю палубу, сталі каля гарматных вежаў. Камісар загадаў зарадзіць гарматы. Мы дасталі некалькі халастых снарадаў. Матрос Аляксандраў (ён таксама з Віцебшчыны) зарадзіў гармату. Стаім, чакаем. Нарэшце вахценны матрос далажыў, што з Петрапаўлаўскай крэпасці падалі сігнал. Камісар падаў каманду, і камендор Еўдакім Агнёў даў залп з шасцідзюймоўкі.

Пачаўся штурм. Групу дэсанта высадзіла і наша "Аўрора". Я таксама трапіў у гэтую групу. Вячэрнюю цемрадзь рассякалі ўспышкі выстралаў. Беглі салдаты, матросы, рабочыя. Мора людзей. Тупат, выкрыкі. Юнкеры сустрэлі нас ружэйна-кулямётным агнём.

Ударылі шасцідзюймоўкі "Аўроры". Праўда, залпы былі халастыя, але нервы юнкераў не вытрымалі. Зноў атака. Лес штыкоў і шматгалосае "Ура!" Здаўся жаночы батальён, узнялі рукі юнкеры.

Новыя гаспадары жыцця — рабочыя, матросы, салдаты — пераможна ўвайшлі ў пакоі палаца.

Адыходзіла ноч, над Нявой займалася світанне.

Хадок да Леніна

З успамінаў В. Красноўскага, былога ўдзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі

Памятаю, было гэта вясной 1906 г. У вёску Сычэва прыехалі землякі, што працавалі на шахтах Данбаса. У кожнага былі цяжкія пакункі. Мы думалі, што шмат падарункаў прывезлі яны сваім родзічам, але потым высветлілася, што яны былі напакаваны палітычнай літаратурай, лістоўкамі. Мне тады было чатырнаццаць год. Землякі папрасілі мяне і некаторых іншых вясковых хлапчукоў разносіць гэту літаратуру па суседніх вёсках і маёнтках. З вялікім захапленнем мы выконвалі даручэнне шахцёраў.

Праз некаторы час сяляне забаставалі. Вымушаны быў пан пайсці на паклон да сялян. Тыя ж выставілі пану свае патрабаванні: павялічыць плату, скараціць рабочы дзень, дазволіць карыстацца лесам, пашай і іншымі ўгоддзямі. Пакуль вяліся перагаворы, мы з хлопцамі падкраліся да панскай брычкі і абклеілі яе лістоўкамі з заклікам паліць маёнткі, не ісці на работу. Як убачыў іх пан, дык пачырванеў ад злосці. "Бунтаўшчыкі!" — закрычаў ён і паімчаў за дапамогай да прыстава. Вярнуўся з ураднікам і са стражнікамі. Тыя пачалі дапытвацца, але нічога не дамагліся, сяляне нікога не выдалі.

...У 1917 г. я служыў у царскай арміі ў Петраградзе. Прымаў актыўны ўдзел у лютаўскіх падзеях. Запомнілася атака разам з рэвалюцыйнымі петраградцамі на Нова-Каменны мост на Абводным канале па вуліцы Лігаўскай. Наступалі з боку Мікалаеўскага вакзала. Калі быў забіты афіцэр, варта далучылася да паўстаўшых. Захапілі арсенал і раздалі зброю.

Разам з шматтысячным натоўпам 3 красавіка сустракаў Уладзіміра Ільіча Леніна на Фінляндскім вакзале, слухаў яго прамову.

У 1918 г. вярнуўся на радзіму. Сенненцы абралі мяне ў выканаўчы камітэт Савета рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Удзельнічаў у першым з'ездзе Саветаў Сенненскага павета. Затым мяне назначылі членам рэўкома, даручылі працаваць у павятовым прадуктовым камітэце.

Неўзабаве Сенненшчына стала прыфрантавой паласой. Мне давялося наладжваць сувязь з актывістамі, якія засталіся на акупіраванай немцамі тэрыторыі, каб з іхняй дапамогай перагнаць адтуль, абыходзячы варожыя пасты, некалькі тысяч кароў і коней.

Калі захопнікі пад ударамі Чырвонай Арміі сталі адкатвацца на захад, шмат прыйшлося папрацаваць, каб забяспечыць армію і беднату прадуктамі харчавання. Больш як 100 тыс. пудоў збожжа мы накіравалі рабочым Масквы, прамысловых цэнтраў і воінам Чырвонай Арміі.

На адным з пасяджэнняў рэўкома мяне вырашылі паслаць хадаком да Леніна.

У камендатуры Крамля, папярэдне праверыўшы дакументы, выпісалі пропуск. Сакратар Уладзіміра Ільіча Л. А. Фоціева, папрасіўшы крыху пачакаць, бо Ленін у гэты час вёў гутарку з іншымі людзьмі, праз некаторы час запрасіла зайсці.

Уладзімір Ільіч устаў з-за стала і, выйшаўшы насустрач, цёпла павітаўся. А пасля пасадзіў у крэсла і пачаў распытваць, які настрой у сялян, ці падзялілі памешчыцкую зямлю, колькі і каму дасталося кароў і коней, як працуюць камітэты беднаты.

У час гутаркі Уладзіміру Ільічу прынеслі шклянку чаю і невялікі кавалак хлеба. Мне адразу ўспомніліся сотні мяхоў збожжа, накіраванага з Сянна ў Маскву і Петраград. Магчыма, той кавалачак хлеба быў з жыта, што вырашчана на Сенненшчыне.

На франтах грамадзянскай

З успамінаў С. Шаўкуна, былога чырвонаармейца

1-ы Узорны Савецкі атрад асобага прызначэння ў красавіку 1918 г. быў сфарміраваны ў Маскве з чырвонагвардзейцаў-добраахвотнікаў, якія прыбылі па некалькі чалавек ад кожнага атрада з розных гарадоў Расіі. Ад Сенненскага атрада Чырвонай гвардыі ў Маскву прыслалі 12 чалавек, сярод іх быў і я. Атрад укамплектавалі падраздзяленнямі па зброі і саставу, ён налічваў 2 тысячы чалавек. Камандзірам яго выбралі унтэр-афіцэра старой арміі Чабыкіна.

Баявое хрышчэнне мы атрымалі пры падаўленні леваэсэраўскіх мецяжоў у Маскве і Яраслаўлі ў ліпені-жніўні 1918 г. Потым атрад перакінулі на Паўднёвы фронт, дзе напіралі белагвардзейцы пад камандаваннем царскага генерала Краснова. На перафарміроўцы ў Курску ўліліся ў 8-ю армію і сталі называцца 371-м стралковым палком. У канцы кастрычніка прыбылі на фронт. На станцыі Анна разгрузіліся з эшалонаў і з ходу кінуліся ў бой. Вызвалілі ад белых некалькі населеных пунктаў, горад Баброў і пачалі развіваць наступленне на г. Калач, на Данецкую вобласць.

Назаўсёды застаўся ў памяці бой за сяло Абрамаўка 25 снежня 1918 г. Наш трэці батальён напярэдадні выбіў з гэтага сяла белаказакаў. Была пахмурная, ціхая, крыху марозная раніца. Сяло абуджалася перазвонам царкоўных званоў, якія клікалі вернікаў на каляднае набажэнства. На досвітку паявілася варожая разведка. Мы занялі абарону. Неўзабаве паказаліся ланцугі пяхоты: адзін, другі, трэці. З тылу наступала конніца. Ішоў няроўны бой аднаго батальёна супраць двух палкоў ворага, якіх падтрымлівалі артылерыя і браняпоезд.

Пад вечар наша батарэя спыніла агонь: скончыліся снарады. У кулямётчыкаў не хапала патронаў. 7-я рота не вытрымала напору і адступіла. На вуліцах сяла завязалася рукапашная схватка, давялося здаваць адну пазіцыю за другой. Некалькі камандзіраў, былых афіцэраў, у крытычны момант здрадзілі. Толькі чацвёртая частка выратавалася.

На чацвёрты дзень, калі нам прыйшла падмога, мы ўзялі сяло і станцыю. Жудасны малюнак паўстаў перад намі. У рове, каля царквы, ледзь прысыпаныя снегам ляжалі 240 трупаў чырвонаармейцаў і камандзіраў, па-зверску закатаваных белымі.

Чырвонаармейцы рваліся ў бой, імкнучыся адпомсціць ворагам. Толькі пад Абрамаўкай мы ўзялі ў палон каля шасцісот салдат і афіцэраў. Назаўсёды ў памяці застаўся воб-

раз камандзіра 48-й дывізіі старога генерала Станкевіча. Ён без хістанняў перайшоў на бок рэвалюцыі, верна служыў ёй. Трапіўшы ў палон, не здрадзіў Радзіме, жыццё яго абарвала шыбеніца белабандытаў.

Слаўны шлях прайшлі чырвонагвардзейцы-сенненцы ў радах 8-й арміі. З цяжкімі баямі вызвалялі ад дзянікінцаў Луганск. Там загінуў наш зямляк Бачкароў. У Данбасе пасля бою пахавалі камандзіра палка Чабыкіна. Галодныя, паўраспранутыя, адстойвалі мы праслаўлены Кахоўскі плацдарм, штурмам фарсіравалі Сіваш, вызваляючы Крым ад врангелеўцаў.

Леваэсэраўскі мяцеж у Сянне

З успамінаў В. Даубе, былога камандзіра атрада чырвонагвардзейцаў

Хуткае і рашучае падаўленне мецяжу ў Маскве парушыла планы эсэраў аб адначасовым выступленні ў многіх рэгіёнах краіны.

Пацярпеўшы паразу ў цэнтры, яны спрабавалі перанесці сваю дзейнасць непасрэдна на савецка-германскую дэмаркацыйную лінію, дзе мелі моцны ўплыў на мясцовыя гарнізоны ў Оршы і Сянне, падняць вайскоўцаў супраць савецкай улады.

У руках эсэраў былі ўсе ўстановы ў Сянне, за выключэннем павятовага ваеннага камісарыята, на чале якога стаяў, здаецца, ледзьве ці не адзіны камуніст у Сянне Шыпіла. Старшынёй выканкома быў Закрэўскі, сакратаром — Будкевіч, камандзірам палка Прышчэпаў — усе левыя эсэры.

Само паўстанне пачалося 8.8.1918 г., калі часці палка, што стаялі на дэмаркацыйнай лініі, кінулі мяжу і пайшлі на Сянно, каб далей ісці на дапамогу і злучэнне з аршанскімі мяцежнікамі. Але да таго часу мяцеж у Оршы быў ужо ліквідаваны.

На разгром мяцежнікаў з Оршы быў пасланы атрад чырвонаармейцаў пад маёй камандай.

На палове шляху паміж станцыяй Багушэўскай і г. Сянно атрад быў сустрэты мяцежнікамі. Пачаліся перамовы, якія ні да чаго не прывялі. Мяцежны полк пад уплывам агітацыі левых эсэраў адмовіўся скласці зброю і вярнуцца ў казармы. Аднак ноччу мяцежнікі, напалохаўшыся чутак аб прыбыцці артылерыі і ўбачыўшы на шашы бранявік, адступілі да Сянна.

Імклівым налётам а 3-й гадзіне раніцы 9 жніўня наш атрад захапіў Сянно і разброіў частку палка, захапіўшы некалькі соцень вінтовак, кулямётаў і адзін грузавік. Чатыры роты і каманду конных разведчыкаў удалося раззброіць на працягу нейкіх 15—20 хвілін. Падышоўшы да казармаў 5-й роты, размешчанай на ўскраіне горада, атрад сустрэў супраціўленне. Закідаўшы казарму гранатамі, чырвонаармейцы ўварваліся ў памяшканне. Мяцежнікі адступілі і, заняўшы абарону на могілках, адкрылі кулямётны агонь. Падаспеў нам на дапамогу бранявік, выбіў іх з занятых пазіцый.

Але наша перамога была кароткачасовай. Мяцежнікі, ужо апоўдні, выявіўшы нашы сілы і прывёўшы сябе ў парадак, пачалі наступаць на горад. Становішча стала крытычным. 70 чалавек, да таго ж яшчэ больш за трое сутак не спаўшых, не маглі доўга супраціўляцца тысячнаму палку. Людзі літаральна валіліся з ног. Адзінай сілай, якой баяліся мяцежнікі, быў бранявік, але ён зваліўся ў канаву і выцягнуць яго было немагчыма.

Запрасілі аб дапамозе Віцебскі гарнізон. Адтуль адказалі, што толькі раніцой наступнага дня можна чакаць чырвонаармейскія часці.

Хутка горад быў акружаны мяцежнікамі з трох бакоў, перарвалася сувязь з Віцебскам і Оршай.

З цяжкасцю ўдалося выцягнуць бранявік. Але ў ім засталося толькі дзве стужкі патронаў на кожны кулямёт. Некалькі нашых байцоў было паранена.

Вырашылі прарывацца і адступаць да шашы ў напрамку станцыі Багушэўская, захапіўшы мост — адзіны выхад з горада. Мяцежнікі, прадбачачы гэта, занялі ўскраек лесу за два кіламетры ад горада. Шаша да лесу ішла па адкрытаму полю. Атрад трапіў пад перакрыжаваны абстрэл з боку горада і лесу.

Бранявік падыйшоў да лясnога ўскрайку. Каманда яго адкрыла кулямётны агонь па засеўшым там мяцежнікам. Расстралялі ўсе патроны і, каб не трапіць у рукі ворага, накіраваліся ў напрамку станцыі Багушэўская. У гэты момант мяцежнікі кінуліся ў атаку. Завязаўся рукапашны бой.

Пакінуўшы некалькі чалавек забітымі, атрад нарэшце прарваў кальцо мяцежнікаў і лесам адышоў да станцыі Багушэўская.

Бліжэй да ночы на дапамогу нашаму атраду прыйшоў 1-ы латышскі кавалерыйскі полк. Улада Саветаў у горадзе была адноўлена.

Пад вечар таго ж дня чырвонаармейцы захапілі ўвесь абоз паўстанцаў і арыштавалі каля 200 чалавек. Частка мяцежнікаў рассеялася па навакольных лясах і ў далейшым далучылася да эсэра-белагвардзейскіх банд на тэрыторыі Віцебскай губерні. У хуткім часе яны былі разгромлены.

За народную справу

З успамінаў В. З. Жыгунова, былога ўдзельніка рэвалюцыйных падзей

Бацька памёр, калі мне было 9 гадоў. У той час многія беднякі ў пошуках работы і сродкаў існавання выязджалі з Беларусі ў Пецярбург. Так зрабіла і мая сям'я, а бедная гаспадарка ў Паўлавічах была прададзена за запазычанасць і нядоімкі.

Мае старэйшыя браты Пётр і Захарый сталі рабочымі. Захарыя ў першую сусветную вайну мабілізавалі ў царскую армію і ў 1917 г. ён знаходзіўся на румынскім фронце. Там у 1918 г. уступіў у рады Камуністычнай партыі. Камуністам стаў і Пётр. Браты-камуністы аказвалі вялікі ўплыў на ўсю нашу сям'ю.

У канцы 1918 г. наша сям'я вярнулася ў родныя Паўлавічы. Тады з Піцера многія вярталіся ў сельскую мясцовасць, ратуючыся ад голаду. Я пачаў працаваць сакратаром Латыгаўскага сельсавета Сенненскага павета. Тут у студзені 1919 г. уступіў у Камуністычную партыю. У валасной ячэйцы налічвалася тады больш за два дзесяткі камуністаў.

Мне разам з іншымі таварышамі давялося ўдзельнічаць у правядзенні харчразвёрсткі. Хлеб накіроўвалі падводамі ў павятовы цэнтр Сянно. Калі беднякі і сераднякі адгукаліся на заклікі савецкай улады, то багацеі аказвалі жорсткае супраціўленне, забівалі актывістаў. Так, у вёсцы Савушы нашага сельсавета кулакі забілі актывіста Мікіту Шарэнду, які быў членам камітэта беднаты.

Латыгаўскі сельсавет не меў спецыяльнага памяшкання, і гэта ў пэўнай ступені перашкаджала нашай рабоце. Старшыня сельсавета жыў у вёсцы Асінаўка, за тры кіламетры ад Латыгава, а я — у Паўлавічах, за шэсць, члены сельсавета — у іншых вёсках.

Вялікая ўвага ўдзялялася надзяленню сялян будаўнічымі матэрыяламі з былых памешчыцкіх, а цяпер ужо дзяржаўных лясоў. Многія з іх разбіралі свае старыя хаціны і будавалі новыя прыгожыя дамы. Так, напрыклад, у вёсцы Соіна селянін Даніла Шарэнда пабудаваў чатыры дамы для сыноў. Паступова сяляне на практыцы пераконваліся ў перавагах жыцця пры савецкай уладзе.

1 жніўня 1919 г. мяне прызвалі ў Чырвоную Армію. У канцы лютага 1921 г. быў накіраваны на курсы чырвоных камандзіраў, якія знаходзіліся ў Смаленску.

У пачатку сакавіка 1921 г. у складзе камуністычнага атрада курсаў я выехаў у Петраград для ўдзелу ў падаўленні контррэвалюцыйнага кранштацкага мецяжу. У час штурму крэпасці быў цяжка паранены. Лячэнне ў шпіталях працягвалася з год. У Паўлавічы вярнуўся ў маі 1922 г.

Вясной 1922 г. мяне прызначылі ўпаўнаважаным валвыканкома па збору харчавання ў дапамогу галадаючым Паволжа. Адначасова я працаваў сакратаром уноў створанага Паўлавіцкага сельсавета, у хуткім часе стаў яго старшынёй.

У 1924 г. мяне абралі старшынёй спажывецкай кааперацыі. У тыя гады адбывалася масавае вяртанне моладзі з горада і Чырвонай Арміі ў вёску. Усе прыбыўшыя атрымлівалі зямлю і будавалі хаты. У сувязі з гэтым склаліся спрыяльныя ўмовы для разгортвання культурна-масавай работы ў вёсцы. З'явілася магчымасць стварыць драматычны гурток. Мы ставілі спектаклі, давалі канцэрты, праводзілі гутаркі, чыталі лекцыі.

У заключэнне хачу расказаць яшчэ аб адной важнай, на мой погляд, падзеі ў маім жыцці. У 1924 г. усесаюзныя газеты апублікавалі спіс асоб, узнагароджаных за баявыя заслугі ў барацьбе супраць інтэрвентаў і ўнутранай контррэвалюцыі ордэнам Чырвонага Сцяга, але да таго часу не атрымаўшых яго. У гэтым спісе было і маё прозвішча. Хутка ўзнагарода была мне ўручана ў Смаленску.

Успамін запісаў у 1974 г. А. І. Залескі.

Селянін, марак, рабочы



М. М. Шубка.

Трагічны лёс напаткаў рускую эскадру ў Цусімскім праліве у руска-японскую вайну 1904—1905 гг. Міхаіл Шубка таксама быў там, у гэтым пекле.

— На маіх вачах гарэлі і гінулі лепшыя караблі эскадры: "Суворaў", "Барадзіно" і іншыя — успамінаў Міхаіл Макаравіч. Крэйсер "Уладзімір Манамах", на якім я быў рулявым, мала пацярпеў у дзённым баі. А нашы камендоры (артылерысты) нанеслі сур'ёзныя пашкоджанні аднаму японскаму крэйсеру, які ўжо не змог удзельнічаць у баі і павярнуў на сваю базу. Але ноччу да нашага карабля падкраліся японскія мінаносцы, якія па недагляду начальства былі прыняты за сваіх. Толькі калі адзін з іх выпусціў тарпеду, зразумелі сваю памылку. Японскі мінаносец быў расстраляны ва ўпор, але і "Уладзімір Манамах" атрымаў сур'ёзнае пашкоджанне.

Рускі крэйсер, пратрымаўшыся да раніцы, затануў, а маракі з яго былі падабраны японскімі караблямі.

Далей былі сем месяцаў палону, вяртанне на радзіму, беднае сялянскае жыццё. Толькі абжыўся крыху былы матрос, сям'ёй абзавёўся, зноў пачалася вайна, 1-я сусветная... На гэты раз Міхаілу Шубку пашанцавала: працаваў на франка-рускім ваенным заводзе ў Петраградзе.

Тут ён упершыню даведаўся аб людзях, што не на словах, а на справе змагаліся за народную волю, упершыню пачуў імя Леніна, быў удзельнікам рабочых дэманстрацый. Усё гэта пакінула свой след у свядомасці чалавека, якому на сваім вяку давялося пабываць і селянінам, і мараком, і рабочым.

Таму, вярнуўшыся летам 1917 г. у родную вёску, ён узяў на сябе ролю арганізатара сялянскай беднаты. У першыя гады савецкай улады некаторыя яшчэ не маглі паверыць, што прыйшла сапраўдная свабода і што зямля, якую пані лічыла сваёй, стала ўласнасцю сапраўдных хлебаробаў. Тады Міхаіл Макаравіч Шубка прапанаваў сялянам пасяліцца на былой панскай зямлі.

Вось тады і з'явілася новая вёска, якую назвалі Свабоднай. Пяць сялянскіх гаспадарак аб'ядналіся ў таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Калектыў быў дружны, працавіты. Праз некалькі год беднякі сталі жыць лепш.

З году ў год расла новая вёска, павялічвалася колькасць жыхароў, у створаным калгасе прыбавілася рабочых рук. І справы пайшлі яшчэ больш паспяхова. Да вайны гэта была адна з лепшых сельгасарцелей у раёне.

А потым наступілі гады нямецкай акупацыі. Змагацца з фашыстамі ў рады народных мсціўцаў пайшоў сын Косцік. Адважны быў партызан, але варожая куля абарвала яго жыццё.

Сям'і таксама не было жыцця: немцы дапыталіся пра сына, пагражалі расстрэлам. Стары Шубка вырашыў ісці ў лес з дочкамі Ганнай і Лідай. Яны сталі партызанамі атрада імя Лазо, у якім змагаўся Косцік.

Пасля вайны бацьку была ўручана пасмяротная ўзнагарода сына — ордэн Айчыннай вайны другой ступені.

П. І. Ермашкевіч.

Здзейсненае жаданне

На гэтым здымку чырвонаармеец Ігнат Ягоравіч Лауткін сфатаграфаваны неўзабаве пасля заканчэння грамадзянскай вайны.

А пачынаць вайсковую службу яму прыйшлося салдатам царскай арміі на германскім фронце. У бурным 1917 годзе, калі рухнула царская ўлада, маладому сялянскаму хлопцу ўпершыню адкрыліся вочы на сапраўднае становішча працоўных мас. Вярнуўшыся дадому, ён стаў актыўным арганізатарам сялянскай беднаты, узначальваў камбед у Машканскай воласці. Ігнат Лауткін абараняў савецкую ўладу з вінтоўкай у руках, быў байцом адной з часцей Чырвонай Арміі. Ваяваў на розных франтах грамадзянскай вайны.

Калі сяляне роднай вёскі аб'ядналіся ў калгас, Лауткін быў у ліку першых калгаснікаў. Яму даручылі загадваць фермай. Пасля Вялікай Айчыннай вайны пераехаў у Багушэўск, працаваў на млыне, з гэтай работы і пайшоў на пенсію.

Думаючы аб сваім лёсе, заўсёды быў задаволены тым, што ў дні станаўлення савецкай улады аказаўся ў ліку першых яе абаронцаў. Шкадаваў толькі аб тым, што ў 1920 годзе не паехаў вучыцца ў чырвонаармейскі універсітэт у Петраградзе, куды яго хацеў накіраваць ваенны камісар часці. Хоць і было вялікае жаданне вучыцца, але цягнула дадому, да зямлі.

А прага да ведаў жыла і не згасла ў ім. Ужо на 75-м годзе жыцця пенсіянер Ігнат

І. Я. Лауткін

Ягоравіч Лауткін скончыў Багушэўскую вячэрнюю школу.

У. Сямёнаў.

Выказвалі волю народа

Пасля заключэння Брэст-Літоўскага мірнага дагавору Беларусь, за выключэннем усходніх паветаў Магілёўскай і Віцебскай губерняў, аказалася пад уладай акупантаў. Германскія войскі, нягледзячы на заключэнне міру, спрабавалі расшырыць зону акупацыі, наблізіцца да Віцебска.

Сходы, мітынгі, на якіх выказваўся пратэст супраць спробы далучэння Беларусі да Германіі, прайшлі ў Сенненскім павеце. Так, 8 чэрвеня 1918 г. адбылося надзвычайнае пасяджэнне Ульянавіцкага валаснога Савета, які заявіў пратэст і заклікаў усё насельніцтва павета далучыцца да гэтага пратэсту. Вось аб чым сведчаць архіўныя дакументы.

"Гэтым заяўляем пратэст руска-германскай камісіі ў г. Маскве па распрацоўцы пытанняў аб гвалтоўным далучэнні Беларусі да Германіі без згоды працоўнага народа, да чаго імкнуцца германцы, удзельнічаючыя ў г. Масква ў руска-германскай камісіі, распрацоўваючай і праводзячай у жыццё ўмовы Брэсцкага мірнага дагавору,— гаварылася ў пастанове.— Ні адзін грамадзянін вялікай Расійскай рэспублікі ні ў якім выпадку не пойдзе поруч з людзьмі, абагрыўшымі свае рукі ў крыві працоўнага народа. Усе грамадзяне Ульянавіцкай воласці заклікаюць германскіх імперыялістаў апамятацца ад п'янага кашмару, няхай яны не забываюць, што беларусы людзі, а не жывёла, што яны маюць права на чалавечае існаванне. Германскія імперыялісты могуць чакаць у свае крывавыя абдымкі толькі людзей старога мінулага, г. зн. тых, якія прывыклі жыць не сваім розумам, а царскай літасцю, але працоўны народ сваю волю, купленую дарагой цаной сваёй крыві, не прадасць крываваму кайзеру на ўцеху.

Звяртаемся з просьбай да ўсіх працоўных Сенненскага павета далучыцца да нашага гарачага пратэсту супраць германскіх прыгнятальнікаў".

Жыхары вёсак Сянец і Вікторыя Какоўчынскай воласці 10 чэрвеня 1919 г. на агульным сходзе пастанавілі:

"Пасяджэнне вясковага камітэта вёскі Вікторыя Какоўчынскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні пад старшынствам т. Кулікава і сакратара Кешмала вырашыла: "убачыўшы несправядлівыя ўчынкі германскіх імперыялістычных войск, усе меры будзем ужываць да таго, каб не трапіць пад нямецкае рабства і звяртаемся да вышэйшых органаў Савецкай улады і сацыялістычнай арміі, каб Савецкая ўлада ўтрымала за сабой вёскі Сянец і Вікторыю.

Старшыня камітэта Аўдакім Нікіфараў. Сакратар Кешмала".

Захавалася пастанова агульнага сходу грамадзян Латыгальскай воласці Сенненскага павета ад 11 чэрвеня 1918 г. аб падтрымцы і захаванні савецкай улады. У ёй гаворыцца:

"Мы, беларусы, якія ў мінулым ведалі толькі адно: рабства ад памешчыкаў, капіталістаў і іншых паразітаў, якія вякамі здзекваліся над нашымі дзядамі, бацькамі, горача пратэстуем супраць замаху гэтых вампіраў на нашу дарагую свабоду. Мы ўсе аднагалосна заяўляем, што ніхто не мае грамадзянскага права замахвацца на нашу свабоду і свяшчэнныя правы, на зямлю, якія здабыты потам і крывёю працоўнага народа. І на абарону сва-

боды і сваіх правоў мы ўсе, як адзін, дружнай сям'ёй пойдзем супраць гвалтаўнікоў, ідучых супраць Савецкай улады і дэмакратычнага ладу. Вам, гвалтаўнікам, грубой сілай часова ўдалося пазбавіць свабоды некаторых нашых братоў-беларусаў, але ведайце, у хуткім часе праб'е час, і пралетарыят усяго свету запаліць сцяг бунту супраць вас і тады смерць капіталу, смерць усякаму гвалту...

Няхай жыве Савецкая Федэратыўная Рэспубліка як маяк свабоды сярод сусветнага імперыялізму".

13 чэрвеня адбыўся агульны сход грамадзян Какоўчынскай воласці, на якім прысутнічала звыш паўтары тысячы чалавек. Аднагалосна была прынята рэзалюцыя аб падтрымцы савецкай улады і пратэсце супраць захопніцкіх дзеянняў германскіх імперыялістаў.

"Ад імя нашага — гаварылася ў ёй,— просім заявіць, што ўсе дамаганні іх безвыніковыя, бо яны будуць адбіты. Мы катэгарычна пратэстуем супраць дамаганняў тэўтонаў. Адзіная ўлада, якой мы верым,— Саветы, намі выбраныя, надзеленыя нашым даверам. Мы давяраем ім сябе, у іх распараджэнне аддаём усё... Толькі ў Саветах наша выратаванне, і мы іх адстаім са зброяй у руках".

У гэты ж дзень валасны сход грамадзян Пустынкаўскай воласці, на якім прысутнічала 5 тысяч чалавек, прыняў рэзалюцыю аб неаддзялёнасці Беларусі ад РСФСР, падтрымцы і абароне савецкай улады. У рэзалюцыі падкрэслівалася:

"Абмеркаваўшы пытанне аб бягучым моманце ў адпаведнасці з тэлеграмай губернскага выканкома ад 3 чэрвеня 1918 года № 287, у якой гаворыцца, што нямецкая буржуазія з рускімі памешчыкамі імкнецца здзейсніць сваё гнюснае злачынства, а іменна адарваць Беларусь ад Вялікарасіі па прыкладу Украіны падманна, мы, грамадзяне Пустынкаўскай воласці, сабраўшыся на валасны сход у колькасці 5 тысяч чалавек, горача пратэстуем супраць такога гвалту нашых вечных ворагаў, якія не маюць ніякага права на нашу волю, і мы, беларусы, ніколі не жадалі аддзяляцца ад Вялікарасіі і адзіна правільнай уладай лічым і прызнаём Саветы, якія складаюцца з прадстаўнікоў працоўнага насельніцтва; такую ўладу будзем падтрымліваць і абараняць ад усіх на яе замахаў драпежнікаў імперыялізму як звонку, так і ўнутры".

А. Савосіна.

Павятовая газета "Известия исполкома" пісала...

Першыя два нумары сенненскай павятовай газеты "Известия исполкома" (так яна называлася) не захаваліся. Няма іх і ў архівах. 9 мая 1918 г. выйшаў трэці нумар. Аб чым паведамляла газета ў той бурлівы час?

* * *

Всем, всем, всем! Передать всем Совдепам, Революционным Организациям, Войскам. Официальная телеграмма из Екатеринодара № 3453.

Германо-Украинские войска, взяв Ростов-на-Дону, двигаются на Кубань, думают захватить хлебородный край с тем, чтобы вывезти из него хлеб. Немедленно, товарищи, имеющие оружие и патроны, организуйтесь в отряды и будьте готовы к выступлению. Ежечасно о выступлении отрядов телеграфируйте в г. Екатеринодар в Главный штаб для получения назначения на боевые участки. Все патроны, ружья и пулемёты и т. д. возьмите под строгий учёт и сообщите об этом в Главный Оперативный Штаб. Вполне сформированные отряды отправляйте на ст. Кущевку в распоряжение командования фронтом тов. Кульнину.

За главного Комиссара военных революционных войск и Сев. Кав. Мецемуцкий...

* * *

Объявляется полученная из Комиссариата Внутрен. Дел на имя Совдепа Сенненского уезда следующая телеграмма: "Москва. 5/V. Вновь приходят сведения из многих мест, что крестьяне скрывают хлеб от Советской Власти, который употребляют на самогонку. Напоминаем, укрывательством хлеба занимаются украинские, минские, могилевские и другие крестьяне, у которых сейчас немцы насильственно отнимают хлеб: получилось то, что вместо помощи рабоче-крестьянской власти, крестьяне помогли самому свирепому врагу рабочих и крестьян — Правительству Германии.

Империализм нас окружает, стремится задушить Советскую Власть. Больше чем когда-либо необходимо единение крестьян и рабочих и спасти завоевания Революции.

* * *

Считая леса единственным природным богатством уезда, впредь до издания закона о лесах, последние необходимо сохранить для систематического их использования в будущем.

А потому Земельный Отдел предписывает для приведения лесов в порядок и их сохранения следующие меры:

... в каждую волость уезда назначить заведывающих лесами...

... разбить леса на участки и в каждый участок назначить лесного милиционера (сторожа).

... производить уборки сучьев, вершин и пр., как это было указано при отпуске...

... отпуск леса... с разрешения Волостных Земельных Отделов.

... по указанию заведывающего лесами волости... и только с клеймом.

Каждый гражданин, вырубивший лес без разрешения, будет предаваться суду Революционного Трибунала.

Комиссар Прищепов,
Секретарь Воронов.

Падрыхтаваў да друку С. В. Шайко.

Камбеды на вёсцы

Вельмі цяжкім было становішча Савецкай Расіі ўлетку 1918 г. Разам з усёй краінай палітычныя і эканамічныя цяжкасці перажываў і Сенненскі павет. 11 чэрвеня УЦВК і СНК РСФСР прынялі Дэкрэт "Аб арганізацыі сялянскай беднаты і забеспячэнні яе хлебам, прадметамі першай неабходнасці і сельскагаспадарчым інвентаром". Згодна Дэкрэта, мясцовыя Саветы сумесна з харчовымі органамі павінны былі паўсюдна арганізаваць валасныя і сельскія камітэты сялянскай беднаты.

Кулакі вялі барацьбу супраць арганізацыі камбедаў. Контррэвалюцыйныя выступленні кулакоў у Сенненскім павеце ў ліпені 1918 г. прайшлі пад лозунгам "Далоў камбеды!" Узброеныя банды забівалі камуністаў і камбедаўцаў, разганялі камбеды і Саветы, знішчалі іх маёмасць, выступалі супраць рэквізіцыі хлеба камбедамі і харчатрадамі.

15 верасня ў маёнтку Турава ў памяшканні Ульянавіцкага валаснога выканкома ў час агульнага сходу камітэтаў вясковай беднаты ўзарвалася падкладзеная пад будынак бомба. 9 чалавек былі паранены.

Кулацкі бандытызм быў адной з праяў антысавецкіх выступленняў улетку 1918 г., арганізатарамі якіх сталі левыя эсэры.

У жніўні 1918 г., згубіўшыя давер мас, левыя эсэры былі выведзены з Сенненскага павятовага выканкома.

І ўсё ж, нягледзячы ні на што, паўсюдна арганізоўваліся і дзейнічалі камітэты вясковай беднаты. Яны праводзілі ў жыццё палітыку партыі і ўрада.

Трэба сказаць, што падмурак для камбедаў быў закладзены раней, пры арганізацыі камун, арцеляў і таварыстваў. На павятовым з'ездзе Саветаў, які адбыўся ў чэрвені 1918 г., адзначалася, што ў павеце "арганізавана і зарэгістравана 10 камун, 4 арцелі і 3 таварыствы. Камуны займаюць плошчу зямлі да 17000 дзесяцін з 500 душамі, арцелі да 1500 дзесяцін з 450 душамі і таварыствы да 350 дзесяцін з 180 душамі".

Ствараемыя камбеды першараднай задачай лічылі рашэнне харчовага пытання. Яны кіраваліся пры гэтым "Абавязковай пастановай Сенненскага паветаддзела Магілёўскай губерні аб уборцы ўраджаю і размеркаванні зерня сярод беднякоў" ад 22.7.1918 г.

Былі складзены спісы грамадзян, якія не мелі ўласных пасеваў жыта. У гэтыя спісы ўключаліся і батракі ўсіх маёнткаў. З такіх людзей ствараліся арцелі для ўборкі жыта ў маёнтках. Аплата праводзілася натурай.

Была ўведзена хлебная манаполія. На фабрыкаты сельскага ўжытку ўстанаўліваліся цвёрдыя цэны. Насельніцтва павета большменш планамерна забяспечвалася мануфактурай і іншымі таварамі.

На чарговым павятовым з'ездзе Саветаў, які адбыўся ў жніўні 1918 г., на камітэты беднаты і харчовыя валасныя камітэты была ўскладзена задача сачыць "за барацьбой з вывазам хлебных прадуктаў за межы павета і выкарыстаннем іх на тайнае вінакурэнне".

На шляхах вывазу, асабліва на станцыі Багушэўская, у мястэчку Астроўна і ў маёнтку Лычкоўскага, быў арганізаваны пільны кантроль за спекулянтамі і мяшочнікамі. Асоб, падазроных у вывазе прадуктаў, арыштоўвалі. Затрыманыя прадукты канфіскоўваліся.

З асобамі, якія займаліся тайным вінакурэннем і продажам самагонкі, абыходзіліся такім жа чынам. З вінаватых у першы раз спаганялі 3000 рублёў штрафу, у другі — 5000 рублёў і высялялі за межы павета.

З'езд забараніў вываз за межы павета ўсіх без выключэння харчовых прадуктаў без дазволу павятовага харчкома.

У рэзалюцыі III з'езда Саветаў было запісана: "Усе якія б то ні было прадукты і тавары, што паступаюць у павет шляхам закупкі кааператывамі ці асабіста ўласніцкімі гандлёвымі фірмамі, павінны паступаць на ўлік у павятовы харчовы камітэт і размяркоўваюцца паміж насельніцтвам па санкцыі харчовага камітэта..."

Значную работу праводзілі камбеды па размеркаванню жывёлы. У павеце ўсім валасным камітэтам беднаты было прадпісана "прыступіць да рэквізіцыі жывёлы ў тых, у каго яна значыцца звыш указанай у інструкцыі нормы і перадаць маючым патрэбу сем'ям". Паветвыканком у сваёй справаздачы ад 25.1.1919 г. адзначаў: "Жывёла пераважна забіралася ў кулакоў і выдавалася беднякам па пасведчаннях камітэтаў беднаты. Так, за справаздачны час быў выдадзены дазвол беднякам на атрыманне 180 кароў і 35 коней".

Аб рабоце камбедаў і кааператываў у Магілёўскай губерні паведамляла газета "Известия Западной коммуны" за 2 лістапада 1918 г.:

"Па Сенненскаму павету.

Пры аддзеле народнай асветы зацверджана агенцтва па распаўсюджванню твораў друку.

Спажывецкія таварыствы і саюзы кааператываў абкладзены падаткам у памеры 25 працэнтаў чыстага прыбытку.

Для абкладання падаткам маёмасных класаў павета і горада створана камісія з 5 асоб: 2 — ад павятовага выканкома, якія дзейнічаюць на ўвесь павет, і па 3 — ад камітэтаў вясковай і гарадской беднаты, якія дзейнічаюць толькі ў раёне сваёй воласці, горада...

Мэбля, якая знаходзіцца ў маёнтках павета, прыгодная для канцылярыі, перадаецца валасным Саветам. Розныя рэчы, што не маюць асаблівай культурнай ці навуковай каштоўнасці, распрадаюцца насельніцтву".

Камбеды праводзілі вялікую культурна-асветніцкую работу. Яны адкрывалі школы, народныя дамы, хаты-чытальні, распаўсюджвалі сярод насельніцтва газеты, літаратуру, арганізоўвалі аказанне медыцынскай дапамогі, розныя масава-палітычныя кампаніі сярод насельніцтва па аднаўленні транспарту, пашырэнні пасяўных плошчаў, дапамозе Чырвонай Арміі і інш.

У. Скульбедаў.

Першыя суботнікі

13.9.1919 г. Сенненская павятовая газета "Факел" пісала: "...У нас адбыўся першы камуністычны суботнік. Сабраўшыся ў колькасці 24 чалавек у 5 гадзін дня ў памяшканні камітэта партыі, нашы таварышы дружна і бадзёра накіраваліся ў раён вёскі Каралевічы (за 4,5 вярсты ад горада) на будаўнічыя работы. Там, пад кіраўніцтвам ваенных будаўнікоў, папрацаваўшы да змяркання каля 3-х гадзін, канчаткова адрамантавалі прыкладна 40—45 сажняў апокаў. Працавалі дружна, весела. Асабліва вызначыліся нашы камуністкі".

Першы камуністычны суботнік быў праведзены ў цяжкіх умовах прыфрантавога горада.

Аб патрыятычным пачыне сенненскіх камуністаў пісала газета "Известия ВЦИК". Аб гэтым паведамляў 6.10.1919 г. у пісьме сваім землякам салдат-артылерыст Васіль Каткоў з Кранштата: "Стаю са зброяй у руках на абароне Чырвонага Петрограда. Мяне ўсё ж жыва цікавіць жыццё ў маім родным павеце. У адным з нумароў "Известия ВЦИК" я з радасцю прачытаў, што Сенненская арганізацыя камуністаў ледзь не першая з усіх паветаў адгукнулася на заклік цэнтра па арганізацыі камуністычных суботнікаў...

Спадзяюся, што ўвесь павет жыва адгукнецца на ваш вялікі пачын, які азначае несумненны крок да светлай будучыні — камунізму. Прывітанне Сенненскай арганізацыі камуністаў-бальшавікоў".

22.4.1920 г. уся Савецкая Рэспубліка адзначала знамянальную дату — 50-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна.

У гэты ж дзень у г. Сянно адбыўся з'езд прадстаўнікоў і сакратароў валасных камуністычных ячэек павета, на якім было абмеркавана пытанне аб правядзенні першамайскага суботніка. У пратаколе з'езда, які падпісаны старшынёй Г. С. Стэльмахам, запісана: "Па першым пытанні аб правядзенні суботніка 1 Мая ў павеце выступіў таварыш Чугуноў, які падрабязна акрэсліў значэнне свята 1 Мая і ўказаў, што ў гэты дзень неабходна прыцягнуць усё насельніцтва да грамадскіх работ. У выступленнях тт. Сідаровіча, Шаманоўскага, Нартыш-Блука звернута ўвага на неабходнасць рамонту дарог, мастоў, школьных і адміністрацыйных будынкаў, на нарыхтоўку для іх паліва, на добраўпарадкаванне населеных пунктаў".

У дзень 1 Мая ў г. Сянно і ў павеце ў камуністычным суботніку прынялі ўдзел сотні працоўных.

А. Савосіна.

Сустрэча з М. І. Калініным

З успамінаў Ф. С. Бабылёва, жыхара вёскі Машканы

...Быў ясны сонечны дзень. Усе вяскоўцы, у тым ліку і я, былі на сенакосе... Запамятаў, ці то ў чэрвені, ці то ў ліпені 1919 г. гэты было. Вясковыя хлапчукі склікаюць нас:

— На сходку, на сходку! Калінін прыехаў!..

Час быў ужо пад полудзень. Пакуль падышоў да валаснога выканкома (гэта якраз дзе зараз школа стаіць), там ужо было шмат людзей. На ганку чалавек у цывільным адзенні гаварыў, звяртаючыся да сабраўшыхся. Побач стаяла двое ў гімнасцёрках...

М. І. Калінін расказваў пра эканамічнае становішча ў краіне, прасіў аказаць Чырвонай Арміі ўсямерную дапамогу хлебам, умацоўваць савецкую ўладу на месцах, раіў, як правільна будаваць жыццё па-новаму.

Калі М. І. Калінін скончыў прамову, угару паляцелі шапкі і хусткі. Потым мужыкі падхапілі яго на рукі і доўга падымалі на "ура" — дужа ўжо ён закрануў сялянскія сэрцы, добра сказаў адносна запаветнай сялянскай мары — зямлі.

У грамадзянскую вайну М. І. Калінін часта выязджаў у прыфрантавыя зоны. Да Машкан ён пабываў у Оршы, дзе таксама выступіў з прамовай.

Прыфрантавы рэўком

Пасля захопу палякамі Мінска фронт хутка прасоўваўся да ракі Бярэзіны, на поўначы Беларусі — да Заходняй Дзвіны ў раёне Полацка.

6.10.1919 г. на пленарным пасяджэнні выканком Савета Віцебскай губерні, "улічваючы сур'ёзнае становішча ў губерні, якое стварылася ў сувязі з набліжэннем фронту і ўзмацненнем бандытызму і ў мэтах стварэння ў губерні гібкага цэнтралізаванага апарата ўлады, пастанавіў: губернскі выканаўчы камітэт, Віцебскі гарадскі Савет і ўсе павятовыя выканкомы губерні распусціць і "як вышэйшы губернскі цэнтр, арганізаваць Віцебскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт". У паветах утвараліся рэўкомы.

14 кастрычніка таго ж года газета "Факел" (орган Сенненскага павятовага выканкома і павятовага рэўкома) надрукавала загад Сенненскага павятовага рэўкома аб ліквідацыі калегіяльнасці ў кіраванні аддзеламі і пераходзе з 13 кастрычніка ўсёй улады ў павеце, як ваеннай, так і грамадзянскай, да рэўкома. Павятовы рэвалюцыйны камітэт падпарадкоўваўся непасрэдна Віцебскаму губрэўкому.

Загадам рэўваенсавета 16-й арміі ад 19.11.1919 г. Сенненскі павятовы і валасны рэўкомы, якія знаходзіліся на тэрыторыі, непасрэдна прымыкаўшай да баявой лініі фронту 16-й арміі, былі падпарадкаваны рэўваенсавету гэтай арміі.

У адпаведнасці з "Палажэннем аб рэўкомах" у задачу прыфрантавых павятовых рэўкомаў уваходзіла садзейнічанне ваенным уладам у правядзенні абарончых работ; мабілізацыя і раскватараванне воінскіх часцей; выкананне ваенна-нарыхтоўчых работ; пастаўка харчавання войскам; прыняцце мер па падтрымцы рэвалюцыйнага парадку ў павеце; узмацненне агітацыйна-палітычнай работы сярод чырвонаармейцаў і моладзі.

Рэўкомам прадастаўлялася права рэквізіцыі маёмасці і матэрыялаў, неабходных для Чырвонай Арміі. У абавязак рэўкомаў уваходзіў кантроль за работай усіх грамадскіх і воінскіх устаноў на падведамаснай ім тэрыторыі. Сенненскі павятовы рэўком праводзіў значную работу па аднаўленні народнай гаспадаркі і мабілізацыі рэсурсаў для аказання дапамогі Чырвонай Арміі.

Са справаздачы харчовага камітэта аб рабоце з 15 кастрычніка да 1 лістапада, напрыклад, бачна, што толькі за палову кастрычніка ў павеце было нарыхтавана 5570 пудоў збожжа, 500 пудоў сена, 88 галоў буйной рагатай жывёлы, 145 авечак, 1482 курыцы, 128 гусей, 4177 пудоў бульбы, 3500 пудоў капусты. Усё гэта ішло на патрэбы чырвонаармейскіх часцей.

А. Кутузаў.

Дакументы сведчаць

З ЗАКЛІКУ МАШКАНСКАГА ВАЛАСНОГА РЭЎКОМА СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА ДА СЯЛЯН ВОЛАСЦІ АБ ЗДАЧЫ ХЛЕБНЫХ ЛІШКАЎ

15 верасня 1920 г.

...Селянін! Спяшайся, абмалочвай свой хлеб і зараз жа вязі для Чырвонай Арміі, у гэтым залог нашай перамогі і блізкага канчатковага трыумфу сялян і рабочых над крыважэрнай зграяй, вякамі п'ючай кроў нашых дзядоў і прадзедаў.

Усякі селянін, не здаючы або затрымліваючы свае лішкі па трапіўшаму на яго нараду, ёсць той жа белагвардзеец, жадаючы працягваць забойствы сялян і рабочых і ліць сваю ж братнюю кроў.

У імя крыві сваіх дзядоў і прадзедаў, у імя крыві, якая льецца ў сусветнага пралетарыяту, пакінь гэту крывавую справу, спяшайся здаваць свае лішкі. Памятай, што ўсякі затрыманы пуд хлеба павялічвае і працягвае гора і няшчасце працоўных, да якіх належыш і ты...

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 1666. Воп. 1, Спр. 9. Л. 61.

З ПАСТАНОВЫ СЕННЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА АБ ПЕРАВОЗЦЫ НА СТАНЦЫЮ БАГУШЭЎСКАЯ НАРЫХТАВАНАЙ БУЛЬБЫ ДЛЯ ПЕТРАГРАДА

13 мая 1920 г.

Для адпраўкі ў Петраград нарыхтаванай бульбы на станцыю Багушэўская мабілізаваць у Пустынскай воласці 250 падвод, Какоўчынскай — 100, Машканскай — 100, Расненскай — 50 падвод. Бульбу даставіць на станцыю Багушэўская не пазней 16.5.1920 г.

Для кіраўніцтва работамі па выкананню гэтага баявога задання камандзіраваць у Пустынскую воласць тав. Багданава, у Машканскую — тав. Скабца, у Какоўчынскую — Лягкова, у Расненскую — тав. Малчанава.

Даручыць валрэўкомам міліцыі, валкамячэйкам і сельскім Саветам прыняць усе меры для таго, каб гэты баявы і вельмі важны загад быў выкананы ў дакладнасці і ў тэрмін...

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 1309. Воп. 1. Спр. 7. Л. 56.

Камсамольцы дваццатых

З успамінаў Л. Сувальскага, ветэрана камсамола Сенненшчыны

Камсамольская арганізацыя ў горадзе Сянно была створана ў другой палове 1919 г. На першым арганізацыйным сходзе нас сабралася нямнога. Ячэйка была аформлена з 12 чалавек. У першы час да нас нясмела ішлі маладыя хлопцы, а тым больш дзяўчаты. Для ўступлення ў камсамол патрабаваўся дазвол бацькоў. З другога боку, прыём у камсамольскую арганізацыю таго часу быў не такі ўжо і просты. Напрыклад, дзеці гандляроў і больш багатай часткі рамеснікаў да ўступлення ў члены РКСМ праходзілі выпрабавальны тэрмін, за час якога яны павінны былі праявіць сябе.

Мы разумелі, што для ўцягнення моладзі ў арганізацыю павінны перш за ўсё самі быць вартымі даверу таварышаў, культурнымі і высокадысцыплінаванымі.

Наступленне польскіх войск пагражала гораду. Камсамольская арганізацыя была мабілізавана, і нас тэрмінова пачалі вучыць ваеннай справе. Аднак інтэрвентаў разбілі і без нашага ўдзелу. Мы ўвайшлі ў атрад асобага прызначэння, задачай якога з'яўлялася барацьба з контррэвалюцыяй і бандытызмам. У горадзе і павеце ў гэты час было вельмі неспакойна. Дзейнічалі рэшткі эсэраўскіх банд. Кожны дзень мы былі напагатове.

Цікавае было жыццё камсамола 20-х гадоў. Выканком аддаў у наша распараджэнне добрае памяшканне з садам. Сваімі сіламі мы абсталявалі клуб і спартыўную пляцоўку. У клубе працавалі палітгурткі. Мы вывучалі гісторыю партыі, палітэканомію, гістарычны матэрыялізм. На занятках былі гарачыя спрэчкі, дыскусіі. Юнакі і дзяўчаты тут жа, у клубе, ладзілі канцэрты мастацкай самадзейнасці.

Камсамольская арганізацыя мела сваіх прадстаўнікоў у выканкоме, прафсаюзе. Да

канца 1921 г. яна налічвала больш за 120 чалавек.

Камсамольцы прымалі ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, праводзімых павятовым камітэтам Камуністычнай партыі. Мы ўдзельнічалі ў арганізацыі камбедаў, у зборы хлеба для галадаючых раёнаў краіны, былі актыўнымі кантралёрамі ў рабоча-сялянскай інспекцыі, назіралі за правільнасцю выкарыстання талонаў на працоўную і гужавую павіннасці і г. д. Актыўна працавала наша атэістычная група. У час рэлігійных свят выязджалі ў вёскі, чыталі лекцыі, праводзілі гутаркі.

Камунары з Баравікоў

У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваецца невялікая папка, на якой каліграфічным почыркам напісана: "Камуна "Мір" Сенненскага раёна".

У ёй дакументы — сведкі незабыўных дзён.

26 сакавіка 1920 г. Агульны сход грамадзян былой арцелі "Баравікі" і камуны "Отрадная". На ім прысутнічаў 31 чалавек з правам рашаючага голасу.

На парадку дня — арганізацыя камуны. Уступіць у яе выказалі жаданне Міхаіл Шарпіла, Пракоп Цапкоў, Навум Саўлевіч, Сцепаніда Ціхановіч і ўсе члены камуны "Отрадная". Член былой арцелі "Баравікі" Франц Бараноўскі ад уступлення ў камуну адмовіўся, а члены былой камуны "Отрадная" Бардашэвіч і Саўгень у новую камуну не прыняты, бо яны дрэнна сябе зарэкамендавалі раней.

Камуну аднадушна назвалі "Мір".

У яе савет былі выбраны Міхаіл Шарпіла, Іосіф Гаранскі, Мікалай Белянёў, у рэвізійную камісію — Пракоп Цапкоў, Уладзіслаў Хашкоўскі, Міхаіл Гаранскі, кандыдатам — Пётр Бараноўскі.

Так пачала дзейнічаць камуна, у статуце якой было запісана:

а) усё належыць усім, і ніхто ў камуне не можа нічога назваць сваім;

б) кожны ў камуне працуе па сваіх сілах і атрымлівае па сваіх патрэбах;

в) работа вядзецца калектыўна;

г) у камуне грашовага ўзнагароджання за сваю працу не атрымлівае ніхто;

д) грошы ўнутры камуны абарачэння мець не могуць;

е) лішкі прадуктаў, пасля пакрыцця ўсіх патрэб камуны, аддаюцца ў грамадскае карыстанне праз мясцовыя органы Савецкай улады;

ж) камуна не можа карыстацца наёмнай працай, і члены камуны не могуць працаваць па найму.

На дзень арганізацыі камуна мела 81 дзесяціну ворнай зямлі, 115 — лугоў, паўтары дзесяціны адводзіліся пад агародніну і чатыры дзесяціны займаў сад. У камуне было 12 коней, 17 кароў, 19 свіней з парасятамі, 10 авечак, 9 ягнят і 50 курэй. У вопісе інвентару значыліся: плугі, культыватары, бароны, косы, сярпы, вілы, хамуты, лейцы, пілы, сякеры і г. д.

З першых дзён жыцця па-новаму перад камунарамі ўзніклі і праблемы. Аб гэтым красамоўна сведчаць дакументы. У ведамасці запісана колькасць хлебных прадуктаў, якіх не хапала да новага ўраджаю: жыта — 112 пудоў і ячменю — 60 пудоў. Разлік быў зроблены па такому прынцыпу: жыта па 30 фунтаў на пасіўнага і па аднаму пуду на актыўнага работніка ў месяц, ячменю адпаведна па пяць і дзесяць фунтаў. Савет прасіў павятовы зямельны аддзел выдзеліць нехапаючую колькасць хлебных прадуктаў.

У даведцы ад 20 красавіка 1920 г. адзначаецца: "Камунальны савет дакладвае, што запасу сена ў камуне ўсяго на два дні і няма ніякай магчымасці ўтрымліваць 12 коней, 4 жарабят і 7 цялят. У сувязі з гэтым камунальны савет просіць прыняць тэрміновыя меры да забеспячэння камуны кармамі на любых асновах: за наяўны разлік грашыма, даць сена ў доўг з тым, што яно будзе вернута восенню. Сена патрэбна 100 пудоў".

Вось яшчэ адна бяда: сярод членаў камуны — эпідэмія тыфу, захварэлі восем чалавек, з іх шэсць рабочых. "Праўленне камуны просіць аддзел аховы здароўя адпусціць у тэрміновым парадку неабходныя лекі і дэзінфекцыйныя сродкі, а таксама выселіць "Дом маці і дзіцяці", каб выкарыстаць гэта памяшканне пад заразны барак".

Колькі надойвалі малака ў камуне? Захавалася і гэта даведка. За першае паўгоддзе 1920 г. было надоена ад 17 кароў трыста вёдзер. Размяркоўвалася яно штодзённа наступным чынам: у першую чаргу забяспечваліся хворыя дзеці і хворыя рабочыя, затым сем'і з малымі дзецьмі і, нарэшце, астатняе малако дзялілі пароўну паміж дарослымі членамі камуны.

Вернемся зноў да 1920 г.

24 красавіка. Павятовы зямельны аддзел просіць адпусціць за наяўны разлік старшыні камуны "Мір" І. М. Гаранскаму мануфактуры для пахавання камунара Ф. Бараноўскага.

25 красавіка. Камунальны савет просіць выдаць дзве вінтоўкі і патроны для аховы маёмасці камуны.

30 красавіка. Павятовы зямельны аддзел просіць "тэрмінова адпусціць без усялякіх нарадаў для камуны "Мір" тры з палавінай пуды цвікоў за наяўны разлік. Цвікі неабходны для насцілання падлогі ў кватэрах камунараў. Указаная колькасць з'яўляецца мінімальнай".

Наступныя запісы зроблены пазней.

12 верасня. Агульны сход даручыў камунальнаму савету хадайнічаць аб адкрыцці ў маёнтку "Баравікі" школы першай ступені і прасіць аддзел народнай асветы назначыць у гэту школу настаўніцай члена камуны Ганну Паўлаўну Белянёву, якая мае адпаведнае званне. Памяшканне для школы адвесці з двух пакояў у доме, дзе размяшчаўся "Дом маці і дзіцяці".

21 кастрычніка. Агульны сход камуны рашыў выбраць старшыню камунальнага савета Мікалая Паўлавіча Белянёва на губернскі з'езд Саветаў і забяспечыць яго прадуктамі харчавання.

З рашэнняў агульнага сходу камунараў:

1 студзеня 1921 г.

Прасіць Сенненскі павятовы зямельны аддзел хадайнічаць аб адкрыцці ў камуне хаты-чытальні і рэгулярным забеспячэнні яе літаратурай і газетамі, а таксама газай. Загадчыцай хаты-чытальні назначыць работніцу Баравікоўскай школы Г. П. Белянёву.

Абавязаць усіх членаў камуны рэгулярна наведваць школу па ліквідацыі непісьменнасці па вечарах тры разы на тыдзень у буднія дні і, акрамя таго, ва ўсе святы.

У сувязі з тым, што больш палавіны кватэр членаў камуны патрабуе капітальнага рамонту, даручыць камунальнаму савету скласці каштарыс на неабходную колькасць матэрыялаў і хадайнічаць перад павятовым зямельным аддзелам аб забеспячэнні імі.

31 студзеня. У сувязі з тым, што ў камуне няма лазні, а новую пабудаваць немагчыма з-за адсутнасці матэрыялаў, прыстасаваць старое жылое памяшканне пад лазню, наняўшы ў самы бліжэйшы час спецыяліста для кладкі печы.

Выдаць кожнаму члену камуны ва ўзросце старэй за 14 гадоў па два пуды аўса і кожнаму члену камуны маладзей за 14 гадоў па паўтара пуда аўса для абмену на абутак.

У сувязі з тым, што ў камуне няма сцяга, прасіць павятовы зямельны аддзел выдзеліць шэсць аршын чырвонай тканіны.

14 сакавіка. Камунальны савет паведамляе, што ў члена камуны Кузьмы Саўгянёва 4 лютага нарадзілася дачка Аня. Унесці яе ў агульны спіс членаў камуны.

18 кастрычніка. Першае пытанне: разгледзець заяву грамадзяніна вёскі Ладзікава Пустынскай воласці Макара Васільевіча Кузьміча: "Прашу прыняць мяне членам камуны. Камуністычны статут абавязуюся выконваць поўнасцю. Склад сям'і: жонка Марфа — 35 гадоў, сын Пётр — 13 гадоў. Маёмасць маю — аднаго каня, калёсы і вупраж". Пастанавілі: прыняць у камуну М. В. Кузьміча разам з сям'ёй і маёмасцю.

Другое пытанне — аб прадастаўленні настаўніцы Г. П. Кажарскай водпуску. Рашылі: даць двухтыднёвы водпуск. У сувязі з тым, што аддзел народнай асветы ад утрымання настаўніцы ў камуне адмовіўся, узяць утрыманне яе на свой кошт і выдаваць ёй штомесячны паёк наравні з іншымі актыўнымі членамі камуны.

Трэцяе пытанне: У камуне часта бываюць лаянкі з-за розных дробязей. Рашылі: член камуны, дапусціўшы лаянку першы раз, пазбаўляецца тыднёвага пайка, другі — двухтыднёвага, і трэці — месячнага.

20 лістапада. Агульны сход рашыў: плату за навучанне Яфіма Шарпілы шавецкай справе прыняць на кошт камуны. Камунальнаму савету даручыць выпрацаваць умовы і заключыць дагавор з майстрам Славіным.

5 красавіка 1922 г. разглядалася пытанне "Аб рэгістрацыі камуны як інтэнсіўнай гаспадаркі". У пратаколе адзначалася, што "за два гады ў былым разбураным маёнтку створана моцная гаспадарка. Уведзены правільны дзевяціпольны севазварот, наладжана вырошчванне траў на кармы. Добра вядзецца жывёлагадоўля. У камуне ёсць два быкі-вытворнікі швіцкай пароды, адзін вытворнік-баран мерынос, палепшылася вырошчванне свіней. Усе пустэчы і аблогі прыведзены ў культурны стан..."

Гэта апошні запіс, які захаваўся ў архіве. І, натуральна, жаданне даведацца, як складвалася жыццё камунараў далей, прывяло мяне ў 1970-я гады ў вёску Баравікі, якая ўваходзіла і цяпер уваходзіць у калгас "Кастрычнік" Сенненскага раёна.

Гутару з Дарафеем Лук'янавічам Каранеўскім, які ўступіў у камуну 12 красавіка 1923 г., працаваў старшынёй камунальнага савета, пасля — старшынёй калгаса. Яму ўжо каля васьмідзесяці, але стары яшчэ жвавы, гаваркі, і памяць добрая.

— Усякае бывала, — гаварыў ён, — справа новая, для сялян нязвычная. І працаваць калектывам, і есці з аднаго катла. Некалькі разоў разыходзіліся з камуны і зноў сыходзіліся. І ўсё ж трымаліся. Да ўтварэння калгаса жылі камунай.

Паказваю Дарафею Лук'янавічу адзін дакумент — рапарт камуны "Мір" XIII з'езду Кампартыі бальшавікоў Беларусі, апублікаваны ў газеце "Віцебскі пралетарый" 7 чэрвеня 1930 г.:

"У сучасны момант камуна пашырана да 235 гектараў, сем'яў налічваецца 23. Веснавую сяўбу камуна закончыла 23 мая. Сяўба прайшла па-бальшавіцку. Дзякуючы энтузіязму і магутнаму запалу камунараў, намечаны план веснавой сяўбы выканан поўнасцю... Камуна арганізавала агульнае харчаванне, дзіцячыя яслі. У сучасны момант камуна прыступае да пабудовы буйнога свінарніка на 500 галоў. Праводзячы нарыхтоўкі, камуна дала 300 пудоў сартавога жыта, 300 пудоў сартавога аўса, 80 пудоў ільнасемя, 60 пудоў ільновалакна, 3500 пудоў бульбы, 1 тысячу пудоў капусты, 4 тысячы пудоў яблык і 21 галаву буйной рагатай жывёлы".

Нялёгкім быў шлях былых камунараў да сённяшняй явы.

— Перад самай вайною жылі ўжо добра, — успамінаў Дарафей Лук'янавіч. — На працадзень багата атрымлівалі, дзяржаўныя планы выконвалі. Ды Гітлер праклятый не даў пажыць па-людску. Усё апусташылі акупанты, а колькі людзей загінула... У канторы калгаса ёсць спісы тых, хто не вярнуўся з вайны дадому. Больш ста чалавек там запісана. І людзі былі ўсе маладыя, у самай сіле...

Пасля вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх акупантаў ад калгаса засталася толькі яго даваенная назва — "Новы мір". Усё давялося пачынаць спачатку. Дарафей Лук'янавіч з горыччу ўспамінае, як пешшу хадзілі на станцыю Бурбін за насеннем, як рыдлёўкамі ўскапвалі зямлю. Добра, што хоць вёска ўцалела, былі стрэхі над галавой. І людзі радаваліся кожнай засеянай сотцы, не скардзіліся на цяжкі лёс. Яны перажылі самае страшнае — чорныя дні фашысцкай акупацыі.

У той нялёгкі час вельмі многае залежала ад энтузіязму і прадпрымальнасці такіх вось кіраўнікоў-самавукаў, як Каранеўскі.

Пасля вайны на пасадзе старшыні калгаса быў камуніст-трыццацітысячнік Іван Міхайлавіч Астроўскі. Калгас узбуйнілі яшчэ раз і назвалі "40 год Кастрычніка". Пасля ён стаў "Кастрычнікам".

Ул. Р. Скапа.

Дакументы сведчаць

ПАГАДНЕННЕ РУСКА-ГЕРМАНСКАЙ КАМІСІІ АБ ПАРАДКУ ВЫВАДУ ГЕРМАНСКІХ ВОЙСК З ТЭРЫТОРЫІ ЛЕПЕЛЬСКАГА І СЕННЕНСКАГА ПАВЕТАЎ

12 верасня 1918 г.

12 сентября 1918 г. в г. Орше русско-германская комиссия, созванная вследствие предложения германского командования в Минске о передаче оккупированных германскими войсками частей Лепельского и Сенненского у. в составе

с германской стороны:	с русской стороны:
генерального штаба майор Шредер, генерального штаба капитан Сервес, лейтенант Поллемс, лейтенант Кроль и при переводчике Иванове	представителя Комиссариата иностранных дел Пржевлоцкого, военного руководителя Смоленского района Каменева, представителей Областного исполнительно комитета Западной обл. Берсона и Марголина

Постановила:

Германские войска очищают Сенненский у., за исключением Овчугской и Бобрской вол., и Лепельский у., за исключением северо-западной части, а именно, западнее линии Дзвоны—Ореховно.

Новая демаркационная линия вполне совпадает с северной границей Оршанского у., от нынешней демаркационной линии у Сержца (русская) к Западу, с северной границей Овчугской и Бобрской вол. и с восточной границей Борисовского у. до местности Дзвоны (немецкая)—Ореховно (7 км северо-восточнее Ушачь) и с южной границей Полоцкого у.

Незначительные изменения демаркационной линии могут быть произведены по взаимному соглашению демаркационными комиссиями.

Новая германская демаркационная линия после очищения вышеуказанных частей Лепельского и Сенненского у. прежде всего намечается германским командованием. Она обследуется и окончательно фиксируется смешанными комиссиями обеих сторон после совершившегося отхода германских войск.

Время этого обследования и созыва этих комиссий будет установлено по соглашению между германским командованием в Полоцке и Борисове и Смоленским Военным Советом.

Отход войск производится по участкам в период времени с 20 сентября по 22 сентября сего года.

Немецкие войска очищают 20 сего сентября местности восточнее линии (русские пункты): Неклюдово — Барсуки — течение р. Ушвицы — течение р. Ушвия — Ольшанка — Чашники — Радунь — Столбцы — Красное.

21 сентября — местности восточнее линии (русские пункты): Волосово — северная оконечность Черейское оз. — Ротно (юго-восточнее Лукомля) — Заозерье — Людчицы — Камень — Белое — Паулье.

22 сентября — местности до новой демаркационной линии.

Ежедневно немецкие войска выступают со своих стоянок не позднее 8 час. утра по германскому времени; русские войска следуют за ними по истечении не менее 4 часов.

Передовые части русских войск достигают:

20 сентября следующих местностей: Рясна — Белица — Замочек — Чашники — Бочейково — Красное.

21-го — Высший Городок — Замочек — Дворец — Камень — Белое — Паулье.

22-го — Черея — Лисичино — Лукомль — Лепель — Пышно — Завичелье.

Со стороны русского командования могут быть посланы германским штабам за день до очищения отдельные малые команды для облегчения передачи, а именно к следующим пунктам:

19-го — г. дд. Пурилево — Овсище — Запрудье (2 1/2 вер. южнее Горивец), Иванск — Бочейково — г. дд. Ляхово (восточнее Красного).

20-го — Радомля — Высший Городок — Замочек — Трухановичи — Камень.

21-го — Черея — Лукомль — Воронь.

Численность этих команд не должна превышать 15 человек. В нынешних условиях установление нейтральной зоны на настоящей демаркационной линии в местностях, которые впоследствии будут очищены, является ненужным; демаркационная линия достаточно определена.

Комиссии для фиксирования демаркационной линии, предусмотренные выше, начинают свою деятельность только после окончательного очищения отдельных участков, т. е. после очищения соответствующих частей Лепельского и Сенненского у.

Эти соглашения входят в силу лишь постольку, поскольку окажется, что они не противоречат постановлениям пограничной комиссии в Вильно.

Настоящее соглашение составлено в 4 экз., из коих два — на немецком и два — на русском языках.

С. Каменев, Г. Марголин, Д. Пржевлоцкий,
Берсон, Шредер, Сервес, Поллемс, Кроль.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг. Т. I. Мн., 1968. С. 232—234.

ПАСТАНОВА СЕННЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА ВЫКАНКОМА АБ МЕРАХ ПА АХОВЕ МЛЫНОЎ

22 лютага 1919 г.

Ввиду того, что в уезде наблюдается систематическое организованное уничтожение промышленности со стороны контрреволюции с целью разрушить дело продовольствия, а именно: сожжены советские мельницы в имениях Гзовино и Скрыдлево и имея сведения о том, что в данном деле играет рука бывших владельцев мельниц совместно с контрреволюционным элементом, президиум уездного исполкома постановляет:

1. Предписать всем волостным исполкомам немедленно арестовать всех бывших владельцев мельниц, а равно и всех проживающих в уезде левых эсеров и доставить их в г. Сенно в арестный дом как заложников, причем объявляется, что в случае сожжения какой-либо мельницы в уезде заложники будут расстреляны.

2. Расследование данного дела поручить специально выделенной комиссии.

3. Арендаторы, пользующиеся в настоящее время мельницами, отвечают за целость мельниц и в случае истребления мельниц пожаром подвергаются расстрелам. Предлагаем арендаторам установить самую тщательную охрану мельниц из надежных лиц, которые в случае уничтожения мельниц пожаром так же отвечают, как и арендатор.

4. Указывая населению на то, что если будет в дальнейшем продолжаться такое уничтожение мельниц и вообще всякой промышленности, то население лишится всякой возможности

удовлетворять самые насущные нужды, так как Советская власть не имеет достаточных средств, чтобы заново отстроить в настоящее время уничтожаемые предприятия, а потому предлагается населению взять охрану промышленности, а в особенности мельниц, в свои руки и все темные личности задерживать и направлять в Сенно.

Председатель исполкома
Заведующий делопроизводством
За секретаря.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг. Т. 1. Мн., 1968. С. 529.

СПРАВАЗДАЧА СЕННЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА РКП(б) АБ РАБОЦЕ Ў ВЁСЦЫ ЗА САКАВІК 1920 г.

Не раней 1 красавіка 1920 г.

1. Уездный организатор по работе в деревне выделен.

2. Его имя и фамилия — Шевкун Герасим, по социальному положению — крестьянин.

В данное время тов. Шевкуну губвоенкомом отказано в отсрочке, и он выбывает в часть. Подходящего кандидата на его место не имеется. Призыв тов. Шевкуна губительно отразился на всей работе в деревне.

3. Районных организаторов по числу районов имеется 5 человек: Перстов, Барановский, Евпаков, Грандан, Коваленко. Все они крестьяне.

4. В уезде имеется 13 ячеек, каждая находится в волостном центре.

5. Точное число членов волячеек до сих пор не установлено, так как в уездкомитете не было их точного учета.

Деятельность каждой из ячеек до сих пор выражалась в устройстве, хотя не частых, бесед на политические темы с крестьянскими массами, распространении литературы по избам-читальням и оживлении деятельности в волости культурно-просветительных кружков.

За время после VII конференции создано две ячейки: одна — в артели Рыдомля (в Городецкой вол.) и одна — в артели Трухановичи (Замочской вол.).

Работа организаторов выражалась в ревизии и ознакомлении с деятельностью волкомячеек и работе по совхозам и коллективным хозяйствам, в организации крестьянских собраний и бесед с ними, в проведении конференций крестьянок, совхозниц и коммунарок.

За отчетный период проведено 20 литературных бесед, 40 конференций крестьянок, в 5 волостях по одной конференции молодежи и одна уездная.

Изб-читален в уезде числится 264, не функционирует около 30, главным образом за недостатком газет и брошюр.

В коммунах и совхозах организаторами устраивались собрания, на коих выяснялись недостатки хозяйства, и путем сношений с упарткомом делались указания соответственным учреждениям для устранения указанных недостатков.

Был проведен II уездный съезд делегатов от рабочих совхозов. Организован союз рабземa, правление составлено из 7 членов, из коих 4 коммуниста. Кроме того, велись беседы на политические темы, организованы избы-читальни и библиотеки.

В состав волревкомов в большинстве случаев входит больше беспартийных. Так как выборы в члены волревкомов не производились, то организаторы участия в таковых не принимали. Сбор жалоб производится, и они направляются непосредственно в соответствующие учреждения уезда.

Ревизии ревкомов производятся, и об обнаруженных недочетах и злоупотреблениях сообщается в упартком.

Собрание организаторов было в конце марта месяца 1920 г.

Каждым организатором доклады представляются.

Связь отделов по работе в деревне с укомолом имеется и выражается в ведении работы среди молодежи одновременно с ведением партийной работы вообще среди населения.

Число членов КСМ в уезде и в городе около 90, точно пока нельзя установить, так как еще не поставлен на должную высоту учет членов.

Председатель упарткома
Секретарь Мацкевич.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг. Т. 2. Мн., 1971. С. 290—291.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-ІНСТРУКТАРСКАГА ПАДАДДЗЕЛА ВІЦЕБСКАГА ГУБРЭЎКОМА АБ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ РАБОЦЕ Ў СУРАЖСКІМ, ДРЫСЕНСКІМ, СЕННЕНСКІМ, ЛЕПЕЛЬСКІМ, ГАРАДОЦКІМ І ВІЦЕБСКІМ ПАВЕТАХ

12 жніўня 1920 г.

...В Суражском уезде школьные занятия протекают довольно слабо.

В Дриссенском уезде школьная жизнь, нарушенная белополяками, начинает налаживаться. Открыты курсы для учащихся, желающих пополнить свои знания. В уезде функционируют 20 изб-читален.

В Сенненском уезде в имении "Белицы" открывается сельскохозяйственный институт, установлено электрическое освещение и произведен ремонт водопровода.

В Лепельском уезде в Гутовской вол. организовано 7 изб-читален. Чувствуется недостаток школьных работников, которых в волостях всего 2. Да и во всем уезде их мало вследствие мобилизации.

В Городокском уезде школьное дело поставлено довольно хорошо. Население заботится о школьных зданиях. Отсутствуют избы-читальни. Газеты доставляются крайне неаккуратно.

...В Витебском уезде приступлено к организации лекторского бюро. Школы по ликвидации безграмотности в деревне Анны закрыты на время полевых работ.

Революционные комитеты БССР (июль—декабрь 1920 г.). Мн., 1957. С. 381.

ПАСТАНОВА СЕННЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ АРГАНІЗАЦЫІ Ў г. СЯННО РАЁННЫХ САВЕТАЎ

1 верасня 1920 г.

Ввиду того, что гор. Сенно до сего времени не разбит на районы, чем создаются значительные затруднения в административном и хозяйственном отношениях, постановил:

В гор. Сенно образовать 4 районных сельских Совета с отнесением содержания их, как и сельских Советов, на государственный счет.

Революционные комитеты БССР (июль—декабрь 1920 г.). Мн., 1957. С. 101—102.

ПАСТАНОВА СЕННЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ АРГАНІЗАЦЫІ АТРАДА ПА БАРАЦЬБЕ З БАНДЫТЫЗМАМ

1 верасня 1920 г.

1. Создать отряд, в который влить половину всей милиции и всю местную караульную роту, за исключением необходимого числа красноармейцев для несения караульной службы, назначив начальником отряда помощника уездвоенкома, которому поручить борьбу с бандитизмом, начиная с Лисичинской вол.

2. Поручить политбюро немедленно, сегодня же, послать в Лисичинскую вол. тт. Трубецкого, Зенькевича и Стальмакова для выяснения места оперирования и нахождения бандитов, и добытые сведения дать начальнику отряда, помощнику уездвоенкома, который по получении этих сведений немедленно выбывает с отрядом для приступления к работам.

Революционные комитеты БССР (июль—декабрь 1920 г.). Мн., 1957. С. 102.

З ПАСТАНОВЫ СЕННЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ СКЛІКАННІ ПАВЯТОВАГА І ВАЛАСНЫХ З'ЕЗДАЎ САВЕТАЎ

1 лістапада 1920 г.

I. Волостные съезды Советов назначить во всех волостях на 23 сего ноября.

II. Норма представительства на волостной съезд Советов — 1 депутат на каждые 10 членов Совета.

III. Порядок дня волостных съездов Советов:

1. Текущий момент.
2. Доклад волревкома.
3. Гужевая и трудовая повинности.

4. Выборы волисполкома.

5. Текущие дела.

IV. Созвать на 20 сего ноября в помещении уревкома совещание из всех уполномоченных, руководивших перевыборами сельских Советов, на котором выслушать доклады их по перевыборам сельских Советов и избрать уполномоченных на волостные съезды Советов:

1. Во изменение постановления уревкома от 9 сего ноября за № 59, уездный съезд Советов назначить на 28 сего ноября.

2. Норма представительства на уездный съезд Советов:

а) от сельских Советов — 1 депутат на 1000 жителей, и так как такое же представительство сельских Советов на волостной съезд, то участники волостных съездов, если число их не превышает нормы (на каждую 1000 жителей волости — 1 депутат), посылаются на уездный съезд Советов, а если число их превышает эту норму, то избираются по норме на волостном съезде;

б) от города — 1 депутат на 200 человек, имеющих избирательное право;

в) от красноармейцев местной кар[аульной] роты — 1 депутат;

г) от красноармейцев 21-й дивизии, расположенной в Сенненском уезде, — 1 депутат на каждые 200 красноармейцев, но не более 50 депутатов от дивизии.

3. Порядок дня уездного съезда Советов:

1) Международное* и внутреннее положение (докладчик тов. Слоним).

2) Доклад уревкома и содоклад отдела управления (докладчик тов. Стельмах, содокладчик тов. Мицкевич).

3) Итоги и задачи народного хозяйства (докладчик тов. Слоним).

4) Гужевая и трудовая повинности.

5) Развитие сельскохозяйственного производства и помощь крестьянскому хозяйству (докладчик тов. Сидорович).

6) Доклад упродкома (докладчик тов. Белявский).

7) Народное образование (докладчик тов. Фума).

8) Социальное обеспечение (докладчик тов. Калитушка).

9) Борьба с бюрократизмом и опыты Рабоче-крестьянской инспекции (докладчик тов. Слоним, содокладчик тов. Граше).

10) Выборы уездисполкомов.

11) Выборы депутатов на губернский съезд Советов.

12) Текущие дела.

13) Утвердить организационную комиссию в следующем составе: тт. Мацкевич, Машера и Гладштейн.

14) Утвердить мандатную комиссию в следующем составе: тт. Малявцев, Луговцев и Машера.

15) Поручить тт. Слониму и Иваньковичу поместить до 23 ноября в газете "Факел" страничку по перевыборам волостных и уездного исполкомов.

Революционные комитеты БССР (июль—декабрь 1920 г.). Мн., 1957. С. 450.

---

*В тексте "междуведомственное".

РЭЗАЛЮЦЫЯ 8-га СЕННЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ АБ РАЗВІЦЦІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ І АКАЗАННІ ДАПАМОГІ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

28 лістапада 1920 г.

В период ожесточенной гражданской войны трудящимся приходилось отвлекать свои силы на борьбу с белогвардейцами. Значительная часть заводов и средств в Советской России была обращена для нужд красного фронта. Таким образом, работа Советской власти не могла развернуться во всей широте для восстановления сельского хозяйства и земледелия.

А поэтому съезд постановил:

Одобряя земельную политику Советской власти и те практические мероприятия, которые наметил Наркомзем, и работу у[езд]земотдела, выполняющего задания Наркомзема, использовать полученную передышку таким образом:

1. В области земельной политики:

а) развить самую широкую пропаганду среди крестьянского населения уезда о сущности земельной политики Советской власти;

б) подготовить опытных инструкторов для инструктирования общественного земледельческого хозяйства.

2. В области социалистического землеустройства:

а) приступить к волостному разверстанию земли* в ближайших к уездному центру волостях;

б) подготовить волземотделы и райсоветы к практической работе по землеустройству;

в) закончить ограничения* земель от советских коллективных и других общественных хозяйств.

3. В области сельского хозяйства:

а) организовать общественную агрономическую помощь крестьянским хозяйствам в смысле поднятия производительности хозяйства и [распространения] практического опыта перехода к многопольному севообороту;

б) организовать общественное садоводство, огородничество, разведение семенных и плодовых питомников в уезде;

в) организовать показательные общественные пасеки в уезде.

4. В области снабжения:

а) в целях расширения посевной площади и оказания помощи крестьянству необходимо организовать потребное число прокатных пунктов с удовлетворяющим количеством земледельческих машин и орудий, с ремонтными мастерскими при них;

б) организовать центральную ремонтную мастерскую 1-го разряда для капитального ремонта более сложных и крупных сельскохозяйственных машин и орудий и постройки новых;

в) создать семенной фонд согласно декрету Совнаркома, который мог бы удовлетворить нуждающиеся хозяйства семенами для расширения посевной площади;

г) озаботиться своевременным получением для сельского хозяйства потребного количества сельскохозяйственных орудий.

5. В области обобществления сельского хозяйства:

а) для скорейшего перехода к общественному земледелию необходимо провести перерегистрацию всех коллективных хозяйств и те, которые не стремятся к общественному земледелию, ликвидировать, т. к. лучшим методом в глазах крестьянина является правильная постановка коллективных хозяйств:

б) для правильной постановки и усиленного наблюдения за коллективами необходимо организовать гужевые управления с техническими руководителями — агрономами;

в) для переустройства нашей заводской промышленности в интересах трудящихся, которая была бы тесно связана с земледельческим хозяйством, необходимо организовать в коллективных хозяйствах кустарное производство;

г) советские хозяйства необходимо сделать в полном смысле слова культурно-показательными хозяйствами.

6. В области мельничного дела:

а) все национализированные мельницы, переданные частным арендаторам, взять от последних, поставив [на них] ответственных заведующих;

б) произвести технический осмотр всех мельниц и привести их в хорошее состояние.

7. В области помощи семьям красноармейцев:

а) помощь семьям красноармейцев должна быть оказана в первую очередь всем аппаратом уземотделов и его техническими предприятиями;

б) привлечь волкомтруды к тому, чтобы всякие хозяйственные работы семьям красноармейцев были оказаны путем трудовой повинности своевременно.*

*Так в тексте.

Революционные комитеты БССР (июль—декабрь 1920 г.). Мн., 1957. С. 290—291.

Пайшлі паязды

З успамінаў Ф. Тогулева, аднаго з будаўнікоў чыгункі Орша—Лепель

...Ішоў 1925 год. Я служыў у Чырвонай Арміі, у трэцім чыгуначным палку. Акрамя вайсковай вучобы, мы займаліся будаўніцтвам, эксплуатацыяй чыгуначных дарог. Адсвяткавалі 1 мая, а на наступны дзень пагрузіліся ў эшалоны, прыехалі на станцыю Орша. Адсюль паходным маршам пайшлі займаць пабатальённа ўчасткі на трасе, спраектаванай для будаўніцтва новай чыгункі Орша—Лепель. Вакол трасы з'явілася многа "брызентавых гарадкоў". Адразу закіпела работа пад лозунгам: "Да 1 кастрычніка пабудуем чыгунку Орша—Лепель!".

Некаторыя ўчасткі былі заняты лесам. Зазвінелі пілы, застукалі сякеры. Лес высеклі,

пні выкарчавалі, падрыхтавалі ўчастак для будаўніцтва чыгункі.

Прыходзілася карыстацца рыдлёўкай, шуфлем, кіркай, ломам ды тачкай. Уручную мы перамяшчалі грунт, а гаечны ключ ды кастыльны малаток былі прыладамі для будаўніцтва пуці.

Адначасова мы праводзілі вялікую палітмасавую і выхаваўчую работу сярод мясцовага насельніцтва. У нас быў добры кантакт з моладдзю і камсамольцамі. Наш батальён, у прыватнасці, падтрымліваў цесную сувязь з тэрытарыяльнай камсамольскай ячэйкай Раснянскага сельсавета. Спачатку ў сваім лагеры мы пабудавалі эстраду, лаўкі, падрыхтавалі добры канцэрт мастацкай самадзейнасці. Памятаецца, іграў духавы аркестр, гучалі песні. На вечар прыйшло многа народу. Потым з канцэртамі мы выступалі ў вёсках Раснянскага і Какоўчынскага сельсаветаў.

У Расне быў сельскі клуб, над якім мы з'яўляліся шэфамі. Раснянская камсамольская ячэйка таксама падрыхтавала добры канцэрт мастацкай самадзейнасці. Мне прыпамінаюцца актыўныя камсамольцы таго часу Вольга Ціханская, Надзя Ціханская, Рыгор Ціханскі і многія іншыя.

Нашы медыцынскія работнікі аказвалі пасільную дапамогу мясцоваму насельніцтву.

Сваёй работай мы заваявалі добры аўтарытэт сярод насельніцтва.

Заданне партыі, урада і Рэўваенсавета выканалі датэрмінова. У ноч на 1 кастрычніка 1925 г. быў забіты апошні кастыль у выхаднай стрэлцы станцыі Лепель. За пяць месяцаў чыгуначнікі пабудавалі 131 кіламетр дарогі і звязалі Оршу з Лепелем. Гэта быў вялікі ўклад таго часу ў справу ўздыму эканомікі маладой Рэспублікі.

Для абслугоўвання пуці была пакінута зводная рота, камандзірам якой быў прызначаны Г. Нікандраў, а старшыной быў я. Паязды пайшлі...

Першая канферэнцыя жанчын-калгасніц

18 лістапада 1929 г. 86 жанчын-калгасніц ад 26 калектыўных гаспадарак Сенненскага раёна сабраліся на сваю першую канферэнцыю, каб абмеркаваць пытанні ўдзелу жанчын у калгасным будаўнітве, культурна-бытавой рабоце ў калгасах.

Удзельніцы канферэнцыі прызналі лінію партыі і Савецкага ўрада па пытанню суцэльнай калектывізацыі правільнай і адзначылі, што "...задачы па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі могуць быць ажыццёўлены пры ўмове свядомага выканання ўсіх мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё сельскай гаспадаркі па сацыялістычнаму шляху". Для далейшага ўмацавання існуючых калектыўных гаспадарак дэлегаты прызналі неабходнымі такія меры, як узбуйненне дробных калгасаў, развіццё сацыялістычнага спаборніцтва паміж калгасамі, унутры калгасаў, прыцягненне ў кіруючыя органы гаспадарак не менш за 30 працэнтаў жанчын, увядзенне здзельнай аплаты працы, першачарговае забеспячэнне прамысловымі таварамі калгаснікаў, актыўны ўдзел сельскіх працаўніц ва ўсёй рабоце калгасаў.

Асноўная задача ў галіне культурна-бытавой работы на вёсцы, як аднадушна адзначылі ўдзельніцы канферэнцыі, гэта ліквідацыя непісьменнасці сярод калгаснікаў і асабліва сярод жанчын. Для гэтага вырашана было расшырыць сетку пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці.

У мэтах палягчэння працы жанчын-калгасніц канферэнцыя пастанавіла дабіцца будаўніцтва ясляў і пляцовак для дзяцей, гарадскіх сталовых. Былі прадугледжаны і меры па ахове працы жанчын, асабліва цяжарных, развіццю антырэлігійнай работы на вёсцы.

Канферэнцыя прайшла на высокім узроўні. Вярнуўшыся дадому, дэлегаткі сталі весці растлумачальную работу сярод жанчын аб значэнні гаспадаркі і ўдзеле сельскіх працаўніц у гэтым гістарычным працэсе.

Л. Ісачэнка.

Іскры "Факела"

З успамінаў П. Анучына, былога супрацоўніка Сенненскай павятовай газеты "Факел"

У 20-я гады я працаваў сакратаром Сенненскай павятовай газеты "Факел". Рэдагаваў яе Міхаіл Іваньковіч, камуніст з падпольным стажам, у мінулым рабочы. Гэта быў сціплы, абаяльны чалавек, поўны незгасальнай творчай энергіі. Рэдакцыя займала адзін пакой. Газета выходзіла два разы на тыдзень: у сераду і суботу. Мы ўдваіх і складалі ўвесь штат.

З першых нумароў газета звяртала ўвагу чытачоў на важнейшыя праблемы, фарміравала селькораўскі актыў. Значную дапамогу нам аказвалі камуністычныя ячэйкі. Мы выязджалі на месцы, гутарылі з людзьмі, стараліся абудзіць у іх цікавасць да ўсяго новага, перадавога, крытыкавалі тых, хто перашкаджаў нашаму руху наперад. Прыцягнуць беднату да супрацоўніцтва ў газеце было справай нялёгкай. На сяле ішла жорсткая класавая барацьба. Многія не шкадавалі жыцця за ўсталяванне савецкай улады. Актыўнымі селькорамі былі Пётр Вышынскі з Чарэі, Рувім Додзін з в. Замочак, пісалі сяляне з Прыветка, Ульянавіч і іншых вёсак. Пошту мы атрымлівалі праз дзень. Звычайна было 7—10 лістоў. Памятаю, з якой вялікай радасцю мы адкрывалі кожны канверт, з якой увагай чыталі кожную карэспандэнцыю. За ёй жа стаяў жывы чалавек з яго бедамі, планамі. Допісы людзей дапамагалі паўней уявіць становішча тагачаснай вёскі.

У газеце было некалькі пастаянных рубрык. Адна з іх: "Аказана дапамога бядняцкім гаспадаркам". Змяшчаліся матэрыялы аб батраках і бедняках, якіх дзяржава надзяліла зямлёй, сенакоснымі ўгоддзямі, жывёлай, інвентаром, насеннем. Пад рубрыкай "Справы савецкай вёскі" мы пісалі аб жыцці сельскагаспадарчых камун, мастацкай самадзейнасці, распаўсюджванні друку, аб рабоце школ, агульных сходах сялян. Была рубрыка "Хлеб — гарадам і Чырвонай Арміі". Артыкулы і карэспандэнцыі на гэтую тэму расказвалі аб тым, колькі з кожнага павета атрымана збожжа, хто ідзе наперадзе. Паказваліся перадавыя населеныя пункты. Адначасова мы гнеўна кляймілі факты сабатажу. Друкаваліся артыкулы журналіста "РОСТА" Марка Крывіцкага аб дапамозе галадаючым Паволжа. Тут жа паведамлялася аб дапамозе сялян насельніцтву Паволжа.

Спачатку селькоры стараліся не падпісваць матэрыялы сваімі прозвішчамі (хто не хацеў псаваць узаемаадносіны з аднавяскоўцамі, хто пабойваўся), праз некаторы час псеўданімы амаль зніклі. Гэта гаварыла аб росце палітычнай свядомасці людзей.

З вялікім стараннем мы рыхтавалі кожны нумар. Па два-тры разы перапісвалі артыкулы, думалі над кожным словам. З селькорамі трымалі самую цесную сувязь. Раз у два месяцы збіралі іх на нарады. На іх абмяркоўвалі задачы газеты. Селькоры атрымлівалі памятку, у якой гаварылася, аб чым трэба пісаць, якія тэмы найбольш актуальныя, надзённыя. Ужо тады мы разбіралі асобныя матэрыялы, вучылі і вучыліся самі майстэрству журналістыкі.

Адной з форм масава-палітычнай работы сярод насельніцтва была вусная газета. Яна складалася з выразак з цэнтральных газет на міжнародныя і ўнутраныя тэмы, з мясцовага матэрыялу. Усё гэта зачытвалася на сходах сялян, была і мастацкая частка. З такой газетай Іваньковіч і я часта выязджалі ў Пустынкі, Прыветак, Ульянавічы і іншыя месцы. Сакратар павятовага камітэта партыі Э. Хейфец і старшыня выканкома Звергздзін часта наведвалі рэдакцыю, цікавіліся нашымі справамі, знаёміліся з поштай. Іх дапамога была адчувальнай.

Аб чым пісаў часопіс "Работніца і калгасніца Беларусі", 1934 г. № 14.

УДАРНІЦЫ ЛЬНОЎБОРКІ

"...Сенненскі раён першы ў БССР скончыў сяўбу льну, першым прыступіў да масавай уборкі яго. У барацьбе за высокую якасць ільнопрадукцыі пераважная большасць калгасаў змагаецца, каб у гэтым годзе здаць дзяржаве льновалакно не ніжэй 14-га нумара.

У раёне ідзе сур'ёзная барацьба за высакаякасны лён. У перыяд уборкі рашаючым фактарам павышэння якасці льну з'яўляецца сартаванне на полі, гэта значыць, падвойнае і патройнае цярабленне льну.

У калгасе імя Карла Маркса Малахоўская Мар'я — ударніца гаўрылаўскай брыгады — першая паказала, як трэба сартаваць лён і пры цярабленні яна зрабіла не толькі 3, а нават 4 гатункі льну, і ў першы дзень пры гэтай рабоце выпрацавала норму 0,80 га.

Лепшыя калгасніцы — ударніцы калгаса "Янова" з брыгады № 1 Лавецкая Алеся, Бразгунова Праксіна, Хадасевіч Параска пры цярабленні льну на 3 гатункі ў першыя дні выпрацавалі не менш як 0,10 га за дзень.

У калгасе "Застадолле" Ясінская Мар'я выцярэблівала дабраякасным патройным цераблеиием-сартаваннем 0,12 га за дзень; Шашкова Палашка, Сіжанькова Алена і Таўстая Алена — 0,11 га кожная.

Улічваючы бальшавіцкія прыклады барацьбы за высакаякасную прадукцыю льну, за захоўванне калгаснага ўраджаю Наркамзем БССР прэміраваў лепшых калгасніц-ударніц:

— калгас імя Карла Маркса Сідорніцкага сельсавета — Малахоўскую Мар'ю і Сухадолаву Маню;

— калгас "Янова" Сідорніцкага сельсавета — Лавецкую Алесю, Бразгунову Праксіну і Хадасевіч Параску;

— калгас "Застадолле" Застадольскага сельсавета — Ясінскую Мар'ю, Шашкову Палашку, Сіжанькову Алену, Таўстую Алену — граматамі і значкамі ўдарніц і прамтаварамі на 50 рублёў кожную.

Выявіў і падрыхтаваў да друку В. Іпацьеў.

Аб чым пісала раённая газета "Камунар"

12 сакавіка 1936 г.

Узяўшы на сябе абавязацельствы, калгаснікі калгаса "Ленінскі шлях" разгарнулі сапраўды бальшавіцкую барацьбу за высокі ўраджай. Для павышэння ўраджайнасці было вывезена столькі ўгнаення, колькі яго патрабавалі палі, таму вынікі атрымаліся нядрэнныя. У сярэднім з гектара калгаснікі атрымалі 10 цэнтнераў зерневых і 173 цэнтнеры бульбы.

Значна ўзрасла і вага калгаснага працадня ў параўнанні з 1934 годам. На працадзень калгаснікі атрымалі 2 кг 316 грам зернавых, 8 кг бульбы.

Вялікія дасягненні атрымаў калгас і ў галіне жывёлагадоўлі. У 1936 годзе пагалоўе рагатай жывёлы ўзрасло да 61 галавы, у тым ліку маецца 20 дойных кароў. У калгасе ёсць аўцагадоўчая ферма, на якой налічваецца 67 авечак. План камплектавання па ўсіх відах жывёлы перавыкананы.

Праўленне калгаса на справе выконвае сталінскія ўказанні, што аб людзях патрэбна клапаціцца. Гэта бачна з таго, што на сённяшні дзень у калгасе поўнасцю ліквідавана бескароўнасць калгаснікаў, праўленне калгаса дапамагае калгаснікам вырошчваць дробную жывёлу. У 1935 годзе калгаснікам з фермы прададзена для гадоўлі 14 авечак.

Да падыходзячай веснавой сяўбы калгаснікі рыхтуюцца ўзмоцненымі тэмпамі з тым, каб у 1936 годзе дабіцца яшчэ больш высокага ўраджаю. Сяўбу ў гэтым годзе будуць праводзіць выключна па ўгноенай глебе, для гэтага завезена на поле 112 тон гною, сабрана значная колькасць попелу і курынага памёту. Ільнаводчае звяно Бараноўскай Мар'і ўжо сабрала 10 цэнтнераў попелу і 12 цэнтнераў курынага памёту.

І. М.

УЗРАСЛА ЦІКАВАСЦЬ ДА МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Камсамольскі арганізатар калгаса "Запаветы Ільіча" Алексініцкага сельсавета Сімановіч Ягор арганізаваў у калгасе калектыўную чытку мастацкай літаратуры. З калгаснікамі ўжо прачытана "Дрыгва" Якуба Коласа. Зараз чытаюць раман "Як гартавалася сталь" пісьменніка М. Астроўскага.

У сувязі з гэтым з боку калгаснікаў узрасла цікавасць да мастацкай літаратуры. Многія калгаснікі самастойна чытаюць творы савецкіх пісьменнікаў. Асаблівы інтарэс калгаснікі праяўляюць да кнігі "Чапаеў" Фурманава.

А. Алесін.

ШСЬМЫ СЕЛЬКОРАЎ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПАСЯЎНОЙ 1936 ГОДА

Рамотная брыгада першай і другой брыгад калгаса "Перамога" Сідорніцкага сельсавета ў складзе калгаснікаў Казырэўскага П., Красноўскага Ф., Гурына А., Дубавец А., працуючы

стаханаўскімі метадамі, закончыла рамонт калёс. Адрамантавана 10 калёс і зроблена новых 8. Каваль Новікаў усе калёсы добра акаваў.

Б. Казырэўскі.

* * *

Уся цяглавая сіла ў калгасе "3-і рашаючы" Немайцянскага сельсавета пераключана на вывазку гною і торфу. Калгаснікі добра разумеюць карысць угнаення, а таму па-ўдарнаму змагаюцца за быстрэйшае завяршэнне вывазкі гною і торфу.

П. Гардзюк.

* * *

Калгас "Ударнік" Немайцянскага сельсавета добра рыхтуецца да пасяўной. Інвентар адрамантаван, насенне добра ачышчана. Вучні школы актыўна дапамагаюць калгасу. Яны сабралі 2,5 тоны попелу.

В. Гардзюк.

Падрыхтаваў да друку С. В. Шайко.

ВЕРНУТЫЯ ІМЁНЫ

Палітычныя рэпрэсіі, якія пракаціліся на Беларусі, у тым ліку ў Сенненскім раёне, пасеялі ў грамадстве страх. Няпроста было разабрацца ў тым, што адбывалася. Большасць нявінных ахвяр рэабілітаваны, але застаецца нямала і такіх, чый лёс невядомы. Раённая камісія па стварэнню кнігі "Памяць" працягвае пошук несправядліва абвінавачаных людзей.

Жыхары раёна, якія былі рэпрэсіраваны ў 1930—1950-я гады

АБРАМАЎ Пётр Мікалаевіч, н. у 1880 у в. Бондары, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

АБУШКЕВІЧ Міхаіл Малахавіч, н. у 1899 у в. Старая Беліца, загадчык склада лестрансгаса, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1983.

АГЕЕНКА Максім Захаравіч, н. у 1870 у г. Сянно, без пэўных заняткаў, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

АДЫНЕЦ Архіп Дзям'янавіч, н. у 1890 у в. Малы Азярэцк, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

АДЫНЕЦ Любоў Андрэеўна, н. у 1897 у в. Прыветак, асуджана ў 1937, рэабілітавана ў 1989.

АДЫНЕЦ Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1898 у в. Прыветак, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

АДЫНЕЦ Раман Нічыпаравіч, н. у 1888 у в. Прыветак, калгасны брыгадзір, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

АДЫНЕЦ Рыгор Нічыпаравіч, н. у 1881 у в. Прыветак, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

АКСЁНАВА-ПАГАРЭЛЬСКАЯ Ганна Фёдараўна, н. у 1926 у г. Сянно, асуджана ў 1945, рэабілітавана ў 1992.

АКУЛЕВІЧ Уладзімір Казіміравіч, н. у 1896 у в. Канева, загадчык пункта плодагароднінай канторы, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

АКУЛЁНАК Андрэй Аляксандравіч, н. у 1883 у в. Вароніна, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

АЛЕЙНІКАЎ Мікалай Нічыпаравіч, н. у 1872 у в. Барок, калгаснік, асуджаны ў 1933 і 1937, рэабілітаваны ў 1989.

АНАНЕНКА Аляксандра Нічыпараўна н. у 1911 у в. Капец, без пэўных заняткаў, асуджана ў 1952, рэабілітавана ў 1989.

АНАНЕНКА Мікалай Макаравіч, н. у 1907 у в. Жабіна, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1960.

АНАНЕНКА Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1911 у в. Перакопава, селянін, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

АНАНЕНКА Павел Уласавіч, н. у 1914 у в. Жабіна, калгаснік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

АНАНЕНКА Сцяпан Вікенцьевіч, н. у 1902 у в. Жабіна, калгаснік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

АНАНЕНКА Фядос Захаравіч, н. у 1896 у в. Перакопава, селянін, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1990.

АНТОНАЎ Уладзімір Раманавіч, н. у 1880 у в. Зямковічы, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

АРЛКОЎСКІ Васіль Уладзіміравіч, н. у 1896 у в. Вялікае Сяло, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1989.

АРЦЁМЕНКА Карней Пятровіч, н. у 1898 у в. Юганава, столяр, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

АРЦЁМЕНКА Сцяпан Пятровіч, н. у 1897 у в. Юганава, чарнарабочы арцелі абцаснікаў, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

АСІПОВІЧ Іван Антонавіч, н. у 1888 у в. Вялікае Сяло, загадчык гаспадарчай часткі калгаса, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

АСТРАШАБ Лука Іванавіч, н. у 1898 у в. Нярэйша, рабочы аграпункта "Янова", асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

АСТРОЎСКІ Карл Францавіч, н. у 1896 у в. Залессе, аднаасобнік, асуджаны ў 1945, рэабілітаваны ў 1992.

АТРАШКЕВІЧ Вікенцій Яфімавіч, н. у 1869 у в. Кузьміно, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

АЎЛІН Авар'ям Крыш'янавіч, н. у 1908 у в. Грузды, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1961.

АЎСТРЫН Пётр Паўлавіч, н. у 1886 у в. Ермашкова, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

АЎСІЕВІЧ Фёдар Лявонавіч, н. у 1891 у в. Латыгаль, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1994.

АЎСІЕВІЧ Якаў Дзмітрыевіч, н. у 1887 на хутары Круча, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1991.

АЎСЮКЕВІЧ Сцяпан Лявонавіч, н. у 1874 у в. Камарова, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1962.

АЎФЯРОНКАЎ Іван Міронавіч, н. у 1898 у в. Новае Сяло, бухгалтар нарыхтоўчай канторы, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1963.

БАБКОЎ Рыгор Рыгоравіч, н. у 1878 у засценку Пятрова, аднаасобнік, асуджаны ў 1932 і ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БАБРОЎ Назарый Яфімавіч, н. у 1886 у г. п. Багушэўск, машыніст вадакачкі, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1989.

БАГДАНОВІЧ Аляксандра Уладзіміраўна, н. у 1894 у в. Каменны Бор, сялянка, асуджана ў 1929, рэабілітавана ў 1992.

БАЛАБОШКА Даніла Цімафеевіч, н. у 1872 у в. Пушча, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БАЛАБЕШКА Мікіта Фёдаравіч, н. у 1891 у в. Пушча, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БАЛТОВІЧ Станіслаў Адамавіч, н. у 1916 у в. Горкі, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БАНДАРЭВІЧ Фёдар Паўлавіч, н. у 1898 у в. Сінянка, рахункавод саўгаса, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БАРАДАЎКА Раман Давыдавіч, н. у 1889 у в. Васількова, калгаснік, арыштаваны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БАРАДАЎКА Яўген Давыдавіч, н. у 1894 у в. Васількова, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БАРАНОЎСКІ Вітольд Осіпавіч, н. у 1908 у в. Касавец, калгаснік, асуджаны ў 1933 і 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БАРАНОЎСКІ Рыгор Андрэевіч, н. у 1877 у в. Гарнова, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

БАРАНОЎСКІ Сцяпан Антонавіч, н. у 1897 у в. Саўчанкі, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1993.

БАРАНОЎСКІ Фёдар Андрэевіч, н. у 1874 у в. Гарнова, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БАРБАЧОЎ Міхаіл Арцёмавіч, н. у 1907 у в. Застадолле, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БАРБАЧОЎ Радзівон Сцяпанавіч, н. у 1897 у в. Застадолле, калгаснік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

БАРКОЎСКІ Аляксей Дзмітрыевіч, н. у 1898 у г. п. Багушэўск, загадчык млына, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БАРЫТКА Фёдар Міхайлавіч, н. у 1887 у в. Гарадзец, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1965.

БАРЫШАЎ Андрэй Іванавіч, н. у 1887 у в. Бортнікі, аднаасобнік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

БАРЫШАЎ Іван Сцяпанавіч, н. у 1870 у в. Бортнікі, аднаасобнік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

БАРЫШАЎ Пракоп Іванавіч, н. у 1905 у в. Бортнікі, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

БАРЫШАЎ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1857 у в. Бортнікі, без пэўных заняткаў, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БАРЭЙКА Іосіф Юльянавіч, н. у 1901 у в. Бабаедава, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БАРЭЙКА Пётр Феліксавіч, н. у 1888 на хутары Кузьмянкі, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1991.

БАРЭЙША Міхаіл Цітавіч, у 1905 у в. Лапатнікі, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БАТОЎСКІ Аляксандр Фаміч, н. у 1908 у в. Германава, пекар, асуджаны ў 1942, рэабілітаваны ў 1992.

БЕЛАБЖЭЦКІ (БЕЛАБРЖЭЦКІ) Пётр Аляксандравіч, н. у 1892 у в. Рулёўшчына, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1990.

БЕЛАНОЖКА Несцер Васільевіч, н. у 1878 у в. Машканы, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

БЕЛАШАПСКІ (БЕЛАШАБСКІ) Іван Клімавіч, н. у 1875 на хутары Астраўкі былога Багушэўскага раёна, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1992.

БЕЛІЗАЎ Кандрат Яфімавіч, н. у 1874 у в. Галошаўка, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БЕЛЯШОЎ Пракоп Ігнатавіч, н. у в. Зямковічы, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1953.

БЕРАШЭВІЧ Канстанцін Тарасавіч, н. у 1895 у в. Пустынкі, фельчар, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БЕРАШЭВІЧ-ПРАКАПОВІЧ Іосіф Васільевіч, н. у 1895 у в. Новае Сяло, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1965.

БЕРАШЭВІЧ Фёдар Венядзіктавіч, н. у 1886 у в. Раманаўка, аднаасобнік, асуджаны ў 1934, рэабілітаваны ў 1963.

БІРЫЧ Міхаіл Емяльянавіч, н. у 1870 у в. Углы, без пэўных заняткаў, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БЕСЦЯНКОЎ Аляксей Венядзіктавіч, н. у 1866 у в. Купіна, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БІТНАЯ-ШЛЯХТА Анэля Аляксандраўна, н. у 1906 у в. Дубнякі, сялянка, асуджана ў 1929, рэабілітавана ў 1992.

БІТНАЯ-ШЛЯХТА Палагея Вікенцьеўна, н. у 1864 у в. Дубнякі, аднаасобніца, асуджана ў 1929, рэабілітавана ў 1992.

БІТНЫ-ШЛЯХТА Аляксандр Антонавіч, н. у 1869 у в. Дубнякі, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1992.

БІТНЫ-ШЛЯХТА Браніслаў Аляксандравіч, н. у в. Дубнякі, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1992.

БІТНЫ-ШЛЯХТА Эдуард Аляксандравіч, н. у 1907 у в. Дубнякі, селянін, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1992.

БЛАЖЭВІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1894 у в. Вялікае Сяло, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БЛАЖЭВІЧ-БЛАЖЫЕВІЧ Валерыя Антонаўна, н. у 1880 у в. Лісёнкі, аднаасобніца, асуджана ў 1929, рэабілітавана ў 1992.

БЛАЖЭВІЧ-БЛАЖЫЕВІЧ Іван Казіміравіч, н. у 1871 у в. Лісёнкі, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1992.

БЛАШКЕВІЧ Андрэй Рыгоравіч, н. у 1880 у в. Ладзікава, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БЛУКІС Карл Міхайлавіч, н. у 1906 у в. Бондары, рабочы арцелі "Чырвоны абцасік", асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БОНДАРАЎ Іван Клімавіч, н. у 1868 у в. Буканава, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1991.

БОНДАРАЎ Навум Іванавіч, н. у 1887 у в. Буканава, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1991.

БОНДАРАЎ Фама Аляксандравіч, н. у 1881 у в. Мацкава, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БРАЎКОВІЧ Аляксандр Васільевіч, н. у 1878 у в. Далговічы, служыцель культа, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

БРОЎКА Дзямід Іларыёнавіч, н. у 1898 у в. Парнева, асуджаны ў 1935, рэабілітаваны ў 1963.

БУДРЫК Мечыслаў Вацлававіч, н. у 1899 у в. Кімейка, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БУРДО Канстанцін Кірылавіч, н. у 1901 у в. Лапатнікі, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1961.

БУЙНЕВІЧ Цімафей Савельевіч, н. у 1877 у в. Савінічы, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

БУХАЎЦОЎ Мікалай Парфёнавіч, н. у 1908 у в. Саўчонкі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1961.

БЫЧКОЎСКІ Антон Савельевіч, н. у 1880 у в. Горкі, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

БЯЗРУЧАНКА Ягор Фёдаравіч, н. у 1895 у в. Задарожжа, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

БЯЛКОЎСКІ Ігнат Раманавіч, н. у 1882 у в. Канашэва, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БЯЛЯЕЎ Венядзікт Авакумавіч, н. у 1878 у в. Булаўкі, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

БЯЛЯЕЎ Прохар Мікітавіч, н. у 1894 у в. Груздзы, селянін, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

БЯЛЯЙ Якаў Пракопавіч, н. у 1881 у в. Навасёлкі, калгаснік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

БЯЛЯНКІН Апанас Ільіч, н. у 1915 у в. Барок, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БЯЛЯНКІН Ілья Андрэевіч, н. у 1888 у в. Барок, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1953.

БЯЛЯЦКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1909 у в. Пальчыкі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

БЯРГОВІН Андрэй Іванавіч, н. у 1882 у в. Пацкава, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

БЯРГОВІН Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1887 у в. Багданава, аднаасобнік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

БЯРОЗКА Адам Пятровіч, н. у 1915 у пас. Чырвоны Кастрычнік, кладаўшчык райбальніцы, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1962.

БЯРОЗКА Георгій Іванавіч, н. у 1903 у в. Вітунь, рахункавод, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1962.

БЯРОЗКА Мікалай Мікалаевіч, н. у 1889 у в. Прыветак, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

ВАЙСЯТ Браніслаў Леанідавіч, н. у 1862 на хут. Лапцева, непрацаздольны, асуджаны ў 1927, рэабілітаваны ў 1993.

ВАКАР Гаўрыла Апанасавіч, г. п. Багушэўск, цясляр Багушэўскага леспрамгаса, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1988.

ВАКУНОЎ Сідар Давыдавіч, н. у 1881 у в. Чаранкі, селянін, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1990.

ВАЛАДЗЬКО Ягор Фёдаравіч, н. у 1875 у в. Харэўшчына, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1959.

ВАЛАДКЕВІЧ Фёдар Логінавіч, н. у 1888 у в. Глебаўск, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1961.

ВАЛАТКЕВІЧ Анісім Сцяпанавіч, н. у 1886 у в. Трубаносы, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ВАЛАТКЕВІЧ Кузьма Сцяпанавіч, н. у 1883 у в. Трубаносы, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Кірыла Іванавіч, н. у 1880 у в. Мігуліна, аднаасобнік, асуджаны ў 1932 і ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Міхаіл Іванавіч, в. Каралі, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1961.

ВАСІЛЕЎСКІ Павел Іванавіч, н. у 1883 у в. Новая Беліца, рахункавод сельпо, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Раман Сцяпанавіч, н. у 1900 у в. Пустынкі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Фёдар Венядзіктавіч, н. у 1962 у в. Пальчыкі, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ВІЗНЕР Сямён Цімафеевіч, н. у 1890 у в. Кажамякі, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1962.

ВІЦКОП Аляксандр Іванавіч, н. у 1879 у в. Забалацце, інструктар па пчалярству, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ВШНЕЎСКАЯ Ірына Нічыпараўна, н. у 1887 у в. Навіны, асуджана ў 1937, рэабілітавана ў 1989.

ВШНЕЎСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1900 у в. Ганчарова, чорнарабочы арцелі "Працаўнік" г. Орша, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1960.

ВОЛЧЫК Адольф Іосіфавіч, н. у 1888 у в. Гарбуны, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1961.

ВОЛЧЫК Вікенцій Іосіфавіч, н. у 1901 у в. Гарбуны, калгасны брыгадзір, асуджаны ў 1935, рэабілітаваны ў 1989.

ВОРАНАЎ Ілья Іванавіч, н. у 1903 у в. Каменка, рабочы чыгункі, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ВОРАНАЎ Максім Кандратавіч, н. у 1879 у в. Мар'янова, селянін, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ВОРАНАЎ Міхаіл Піліпавіч, н. у 1900 у в. Мар'янова, селянін, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ВЫРВІЧ Сазон Осіпавіч, н. у 1892 у в. Утрылава, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1958.

ВЫСОЦКІ Антон Марцінавіч, н. у 1873 у в. Казлоўка, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1961.

ВЫШЫНСКІ Казімір Станіслававіч, н. у 1872 у в. Гарнакі, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

ВЫШЫНСКІ Міхаіл Станіслававіч, н. у 1894 у в. Гарбуны, калгаснік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

ВЯРБІЦКІ Цярэнцій Пахомавіч, н. у 1894 у г. Сянно, вартаўнік, асуджаны ў 1947, рэабілітаваны ў 1993.

ГАБРУСЕЎ Ігнат Еўдакімавіч, н. у 1875 у в. Пушкары, загадчык гаспадарчай часткі калгаса, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Аляксандр Фёдаравіч, н. у в. Гарадзец, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1991.

ГАЛАВАЧ Вера Мікалаеўна, н. у в. Гарадзец, асуджана ў 1931, рэабілітавана ў 1991.

ГАЛАВАЧ Ганна Іванаўна, н. у в. Гарадзец, асуджана ў 1931, рэабілітавана ў 1991.

ГАЛАВАЧ Еўдакія Мікалаеўна, н. у в. Гарадзец, асуджана ў 1931, рэабілітавана ў 1991.

ГАЛАВАЧ Захар Фёдаравіч, н. у 1893 у в. Гарадзец, аднаасобнік, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Ісак Якімавіч, н. у 1909 у в. Канец, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Людміла Фёдараўна, н. у в. Гарадзец, асуджана ў 1931, рэабілітавана ў 1991.

ГАЛАВАЧ Мікалай Яфімавіч, н. у 1876 у в. Гарадзец, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1991.

ГАЛАВАЧ Павел Якімавіч, н. у 1895 у в. Канец, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Пётр Фёдаравіч, н. у 1906 у в. Гарадзец, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Уладзімір Мікалаевіч, н. у в. Гарадзец, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1991.

ГАЛАВАЧ Фама Фёдаравіч, н. у 1891 у в. Гарадзец, аднаасобнік, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Фёдар Мікалаевіч, н. у в. Гарадзец, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1991.

ГАЛАЙ Патап Антонавіч, н. у 1883 у в. Куроўшчына, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛУЗА Ганна Рыгораўна, н. у 1869 у в. Даргейкі, аднаасобніца, асуджана ў 1937, рэабілітавана ў 1989.

ГАЛУЗА Наталля Мікалаеўна, н. у 1887 у в. Даргейкі, непрацуючая, асуджана ў 1937, рэабілітавана.

ГАЛУЗА Макар Фёдаравіч, н. у 1866 у в. Даргейкі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛУЗА Юлія Андрэеўна, н. у 1870 у в. Даргейкі, калгасніца, асуджана ў 1937, рэабілітавана ў 1989.

ГАЛУЗА Яўген Рыгоравіч, н. у 1913 у в. Даргейкі, трактарыст МТС, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛУБЦОЎ Захар Аляксеевіч, н. у 1916 у в. Зелянькі, возчык Замастоцкага лесаўчастка, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛЫНЧЫК Емяльян Ларыёнавіч, н. у 1893 у в. Машчоны, старшыня калгаса, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

ГАЛЫНЧЫК Фядос Іванавіч, н. у 1887 у в. Рубежніца, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

ГАЛЫНЧЫК Ягор Іванавіч, н. у 1906 у в. Рубежніца, селянін, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛЬКЕВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1880 у в. Лутчына, земляроб, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

ГАНЧАРОЎ Іван Спірыдонавіч, н. у 1899 у в. Утрылава, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1992.

ГАНЧАРОЎ Кірыла Лаўрэнцьевіч, н. у 1906 у в. Бузякі, асуджаны ў 1942, рэабілітаваны ў 1998.

ГАНЧАРОЎ Сяргей Савельевіч, н. у 1908 у в. Утрылава, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРАВЫ Даніла Максімавіч, н. у 1898 у в. Пальчыкі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРАВЫ Фёдар Максімавіч, н. у 1882 у в. Пальчыкі, аднаасобнік, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРБАТОЎСКІ Станіслаў Фаміч, н. у 1883, на хут. Узгор'е, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРБАЧОВА Вера Сцяпанаўна, н. у 1905 у в. Малішы, калгасніца, асуджана ў 1938, рэабілітавана ў 1989.

ГАРБАЧОЎ Васіль Дзмітрыевіч, н. у 1881 у в. Багданава, загадчык гаспадаркі Сенненскага РКШ, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРБАЧОЎ Іван Анісімавіч, н. у 1875 у в. Запруддзе, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1965.

ГАРБАЧОЎ Карп Іванавіч, н. у 1861 у в. Галоўск, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРБАЧОЎ Кузьма Лукіч, н. у 1893 у в. Лука, селянін, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1991.

ГАРБАЧОЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1911 у в. Запруддзе, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1965.

ГАРНАК Лявон Рыгоравіч, н. у 1911 у в. Буйнічкава, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРНАК Рыгор Паўлавіч, н. у 1873 у в. Буйнічкава, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРНАК Фёдар Майсеевіч, н. у 1864 у в. Шубкі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГАРУЧКА Платон Фёдаравіч, н. у 1890 у в. Машканы, калгаснік, асуджаны ў 1945, рэабілітаваны ў 1991.

ГАШАК Сямён Лявонавіч, н. у 1889 у в. Абідаўка, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1993.

ГЕРАСІМАВА Вольга Піліпаўна, н. у 1916 у г. п. Багушэўск, рабочая чыгуначнай станцыі, асуджана ў 1945, рэабілітавана ў 1993.

ГЕТМАН Ананій Іванавіч, н. у 1878 у в. Войлева, рабочы саўгаса, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГЕТМАНАЎ Малах Іванавіч, н. у 1888 у в. Розмыслава, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1961.

ГІЛЕЎСКІ Міхаіл Антонавіч, н. у 1878 у в. Нова-Забеліна, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1991.

ГЛЯКАЎ Рыгор Аляксеевіч, н. у 1916, ваеннаслужачы, асуджаны ў 1943, рэабілітаваны ў 1998.

ГРАМУЗАЎ Максім Рыгоравіч, н. у 1910 у в. Латышаўка, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ГРАМУЗАЎ Фёдар Арцёмавіч, н. у 1881 у в. Мялешкі, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

ГРАЧЫХА Палікарп Мікітавіч, н. у 1872 у в. Казлы, вартаўнік лесасплаўканторы, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГРАЧЫХА Уладзімір Ягоравіч, н. у 1892 у в. Грузды, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1961.

ГРАЧЫХА Ягор Мікітавіч, н. у 1871 у в. Грузды, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1993.

ГРУНТОЎ Трафім Мартынавіч, н. у 1903 у в. Дубраўка, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ГРУНТОЎ Трафім Піліпавіч, н. у 1865 у в. Рамшына, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1962.

ГРУШЭЎСКАЯ Паўліна Мацвееўна, н. у 1870 у в. Кулікоўка, калгасніца, асуджана ў 1937, рэабілітавана ў 1989.

ГРЫБОЎСКІ Рыгор Архіпавіч, н. у 1894 у в. Цеплякі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1961.

ГРЭБНЕЎ Васіль Паўлавіч, н. у 1883 у в. Машканы, калгаснік, асуджаны ў 1944, рэабілітаваны ў 1992.

ГРЭБНЕЎ Захар Фядосавіч, н. у 1885 у в. Застадолле, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ГУКАЛЁНАК Марцін Іванавіч, н. у 1884 у в. Добрына, лесаруб, асуджаны ў 1935, рэабілітаваны ў 1989.

ГУЛІНСКІ Пётр Антонавіч, н. у 1905 у в. Жохава, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1991.

ГУРЫН Пётр Іванавіч, н. у 1858 у в. Папінка, без пэўных заняткаў, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ДАБРАВОЛЬСКІ Антон Іванавіч, н. у 1887 у в. Тур'ева, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

ДАБРАНІЦКІ Іосіф Францавіч, н. у 1889, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1944.

ДАВЫДАЎ Ігнат Ларыёнавіч, н. у 1875 у в. Бубалы, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1991.

ДАВЫДЗЕНКА Вікенцій Ігнатавіч, н. у 1878 у в. Папоўка, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ДАВЫДЗЬКА Пётр Сцяпанавіч, н. у 1898 у в. Папоўка, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1975.

ДАВЫДЗЬКА Сямён Лявонавіч, н. у 1882, у в. Папоўка, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ДАМАРАЦКІ Лявон Іосіфавіч, н. у 1910 на хут. Скрабіна, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1992.

ДАНЧАНКА Іван Мікалаевіч, н. у 1875 у в. Рабцава, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1992.

ДЗЯМЕШЧАНКА Вікенцій Антонавіч, н. у 1882 у в. Тур'ева, кладаўшчык Днепра-Дзвінскага параходства, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯГЕЛЕЎ Якаў Кузьміч, н. у 1900 у в. Кругляны, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯГІЛЕВІЧ Антон Ігнатавіч, н. у 1911 у в. Обаль, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯГІЛЕВІЧ Ігнат Ягоравіч, н. у 1877 у в. Засценак, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯНІСАЎ Марк Іванавіч, н. у 1885 у в. Шэбіна, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯТЛАЎ Максім Герасімавіч, н. у 1903 у в. Луг, цясляр, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯТЛАЎ Рыгор Антонавіч, н. у 1888 у в. Леснікова, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯТЛАЎ Якаў Герасімавіч, н. у 1906 у в. Прамень, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

ДОКТАРАВА Ірына Аляксандраўна, н. у 1907 у в. Бесцвіна, калгасніца, асуджана ў 1938, рэабілітавана ў 1989.

ДОКТАРАЎ Савелій Рыгоравіч, н. у 1883 у в. Бесцвіна, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

ДОКТАРАЎ Ягор Рыгоравіч, н. у 1890 у в. Бесцвіна, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ДРАБУШЭЎСКІ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1898 у в. Рулёўшчына, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1991.

ДРАЗДОВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. у 1897 у в. Загладава, калгаснік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

ДРАЗДОВІЧ Ігнат Мікалаевіч, н. у 1888 у в. Рулёўшчына, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1995.

ДРАЗДОЎ Ігнат Карнеевіч, н. у 1888 у в. Мар'янова, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

ДУБРОЎСКІ Рыгор Мацвеевіч, н. у 1889 у в. Падгузкава, селянін, асуджаны ў 1936, рэабілітаваны ў 1991.

ДУДАРАЎ Ціт Васільевіч, н. у 1873 у в. Курэйшына, рабочы саўгаса, асуджаны ў 1935, рэабілітаваны ў 1989.

ДЫШЛЕВІЧ Раман Клімавіч, н. у 1883 у г. Сянно, асуджаны ў 1928, рэабілітаваны ў 1998.

ЖАБІЦКІ Сцяпан Антонавіч, н. у 1887 у в. Барок, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЖАБІЦКІ Сцяпан Антонавіч, н. у 1899 у в. Барок, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ЖАБІЦКІ Іван Антонавіч, н. у 1899 у в. Барок, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЖАБІЦКІ Мікалай Антонавіч, н. у 1907 у в. Барок, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЖАРДЗЕЦКІ Сцяпан Нічыпаравіч, н. у 1895 у в. Машканы, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ЖАРНАСЕК Васіль Васільевіч, н. у 1874 у в. Слабада, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЖАРЫНАВА Паўліна Ягораўна, н. у 1899 у в. Забор'е, асуджана ў 1932, рэабілітавана ў 1991.

ЖУКАЎ Фёдар Сідаравіч, н. у 1889 у в. Мялешкі, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

ЖУРАЎ Апанас Фёдаравіч, н. у 1911 у в. Каміншчына, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ЖУРАЎ Пётр Якаўлевіч, н. у 1877 у в. Леснікова, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ЖУРАЎСКІ Емяльян Пятровіч, н. у 1882 у в. Казадоі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ЖУРАЎСКІ Мікалай Сяргеевіч, н. у 1886 у в. Казадоі, селянін, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЖЫДЗЕЛЬ КузьмаАнуфрыевіч, н. у 1886 у в. Глебаўск, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЖЫЛІНСКІ Іван Сямёнавіч, н. у 1908 у в. Стаселькі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ЖЭМІС Іван Міхайлавіч, н. у 1836 у в. Ладзікава, селянін, асуджаны ў 1935, рэабілітаваны ў 1991.

ЗАЛЕСКАЯ Эмілія Адамаўна, н. у 1873 у в. Кімейка, сялянка, асуджана ў 1932, рэабілітавана ў 1989.

ЗАХАРЭВІЧ Лаўрэн Герасімавіч, н. у 1872 у в. Канева, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1962.

ЗЕЛЯПУГА Таццяна Пятроўна, н. у 1918 у в. Бачарова, сялянка, асуджана ў 1946, рэабілітавана ў 1993.

ЗЕЛЯНЦОЎ Васіль Антонавіч, н. у 1884 у в. Ліпна, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЗЕЛЯНЬКОЎ Сцяпан Іванавіч, н. у 1888 у в. Узрэчча, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ЗЕЛЯНЯ Васіль Астапавіч, н. у 1910 у в. Вялікае Сяло, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1960.

ЗІБЕЛЬТ Фрыц Юльянавіч, н. у 1897 у в. Янова, загадчык гаспадаркі, асуджаны ў 1942, рэабілітаваны ў 1989.

ЗІНКЕВІЧ Іосіф Паўлавіч, н. у 1899 у в. Смалоўка, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1983.

ЗІНКЕВІЧ Кузьма Паўлавіч, н. у 1875 у в. Смалоўка, калгаснік, асуджаны ў 1933 і 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ЗІНКЕВІЧ Сямён Паўлавіч, н. у 1891 у в. Смалоўка, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЗУЕЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1864 у в. Літусава, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

ІВАНОЎ Захар Мацвеевіч, н. у 1907 у в. Аксінічы, селянін, асуджаны ў 1939, рэабілітаваны ў 1990.

ІГНАТАЎАнуфрый Ігнатавіч, н. у 1876 у в. Трубаносы, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1983.

ІЛЬЮШЧАНКА Сямён Мітрафанавіч, н. у 1906 у г. п. Багушэўск, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1964.

ІЛЬЮШЭНКА Міхаіл Прохаравіч, н. у 1913 у в. Лут, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ІЛЬЮШЭНКА Прохар Мяфодзьевіч, н. у 1892 у в. Лут, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ІОТКА Уладзімір Вікенцьевіч, н. у 1876 у в. Грабенікі, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КАВАЛЕЎСКІ Васіль Рыгоравіч, н. у 1876 у в. Міцюкова, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАВАЛЕЎСКІ Захар Іванавіч, н. у 1872 у в. Карнілавічы, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1958.

КАВАЛЕЎСКІ Казімір Купрыянавіч, н. у 1902 у в. Калгунова, селянін, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1982.

КАВАЛЕЎСКІ Купрыян Антонавіч, н. у 1865 у в. Калгунова, аднаасобнік, асуджаны, рэабілітаваны ў 1992.

КАВАЛЕЎСКАЯ Канстанцыя Купрыянаўна, н. у 1908 у в. Калгунова, сялянка, асуджана ў 1929, рэабілітавана ў 1992.

КАВАЛЕЎСКАЯ Петрунеля Бернардаўна, н. у 1869 у в. Калгунова, аднаасобніца, асуджана ў 1929, рэабілітавана ў 1992.

КАВАЛЕЎСКАЯ Францішка Купрыянаўна, н. у в. Калгунова, сялянка, асуджана ў 1929, рэабілітавана ў 1992.

КАВАЛЁВА Ефрасіння Купрыянаўна, н. у 1881 у в. Трубаносы, асуджана ў 1937, рэабілітавана ў 1989.

КАВАЛЁЎ Аляксей Ануфрыевіч, н. у 1876 у в. Узрэчча, селянін, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАВАЛЁЎ Іосіф Аляксеевіч, н. у 1891 у в. Ліпна, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1961.

КАВАЛЁЎ Гурый Венядзіктавіч, н. у 1875 у в. Ліпна, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАВАЛЁЎ Мікалай Венядзіктавіч, н. у 1873 у в. Трубаносы, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАВАЛЁЎ Павел Анісімавіч, н. у 1894 у в. Ліпна, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАВАЛЁЎ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1872 у в. Ліпна, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАВАЛКІН Цімафей Макаравіч, н. у 1888 у в. Застадолле, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎ Нічыпар Ігнатавіч, н. у 1890 у в. Янова, рабочы спіртзавода, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1906 у в. Звягі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎ Фама Мікалаевіч, н. у 1883 у в. Перакопава, рабочы чыгуначнай станцыі Багушэўская, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎСКІ Андрэй Міхайлавіч, н. у 1883 у в. Пушкары, старшыня калгаса, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎСКІ Іосіф Рыгоравіч, н. у 1902 у в. Пушкары, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎСКІ Павел Васільевіч, н. у 1873 у г. Сянно, святар, асуджаны ў 1935, рэабілітаваны ў 1990.

КАЗЛОЎСКІ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1875 у в. Пушкары, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЫРЭЎСКІ Сямён Гаўрылавіч, н. у 1884 у в. Міцюкова, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЫРЭЎСКІ Сяргей Паўлавіч, н. у 1883 у в. Міцюкова, калгаснік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КАЛІНАЎ Пімен Данілавіч, н. у 1882 у в. Купаваць, селянін, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КАМАНДЫШКА Сцяпан Андрэевіч, н. у 1883 на хут. Броды, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

КАМАНДЫШКА Фёдар Андрэевіч, н. у 1876 на хут. Броды, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1960.

КАМІНСКІ Леанід Архіпавіч, н. у 1882 у в. Сапегі, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

КАМУШЭНКА Міхаіл Іванавіч, н. у 1886 у в. Маргойцы, калгаснік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1958.

КАНАПЕЛЬКА Фёдар Ігнатавіч, н. у 1922 у в. Добрына, ваеннаслужачы, асуджаны ў 1942, рэабілітаваны ў 1998.

КАНАРСКІ Іван Мінавіч, н. у 1897 у в. Марцінаўка, селянін, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1990.

КАНАРСКІ Рыгор Іосіфавіч, н. у 1898 у в. Буева Застадольскага сельсавета, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КАНДРАЦЬЕЎ Андрэй Васільевіч, н. у 1898 у в. Нямейкава, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАНДРАЦЬЕЎ Васіль Васільевіч, н. у 1892 у в. Аўсеева, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КАНКЕЛЬ Іван Карлавіч, н. у 1908 у в. Мазуркі, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КАНКЕЛЬ Пётр Карлавіч, н. у 1902 у в. Мазуркі, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КАРЖАНЕЎСКІ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1908 у в. Гарывец, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1962.

КАРМАЗІН Цімафей Рыгоравіч, н. у 1893 у в. Гарадзец, аднаасобнік, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1989.

КАРАМАЗІН Цярэнцій Іванавіч, н. у 1895 у в. Гарадзец, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КАРОЎКІН Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1888, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1993.

КАРПОВІЧ Алена Васільеўна, н. у 1885 на хут. Сякірына, асуджана ў 1928, рэабілітавана ў 1992.

КАРПОВІЧ Васіль Іванавіч, н. у 1885 у в. Кадукова, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КАРПОВІЧ Платон Георгіевіч, н. у 1879 у в. Сякірына, асуджаны, рэабілітаваны ў 1992.

КАТКОЎСКІ Станіслаў Валяр'янавіч, н. у 1898 у в. Лукаўцы, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КАТЛЯРОЎ Піліп Іванавіч, н. у 1904 у в. Пушкары, ваеннаслужачы, асуджаны ў 1945, рэабілітаваны ў 1998.

КАЦАР Андрэй Якаўлевіч, н. у 1890 у в. Лука, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1992.

КАЦАР Васіль Іванавіч, н. у 1891 у в. Мігуліна, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КАЦАР Ганна Францаўна, н. у 1896 у в. Роспаш, калгасніца, асуджана ў 1938, рэабілітавана ў 1989.

КАЦАР Пракоп Захаравіч, н. у 1882 у в. Тур'ева, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

КАЦАР Фёдар Лявонавіч, н. у 1874 у в. Роспаш, аднаасобнік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КІБІС Валянціна Дзмітрыеўна, н. у 1939 у в. Каўрыжкі, асуджана ў 1945, рэабілітавана ў 1993.

КІБІС Ганна Дзмітрыеўна, н. у 1936 у в. Каўрыжкі, асуджана ў 1945, рэабілітавана ў 1993.

КІБІС Зоя Дзмітрыеўна, н. у 1944 у в. Каўрыжкі, асуджана ў 1945, рэабілітавана ў 1993.

КІБІС Ірына Дзмітрыеўна, н. у 1940 у в. Каўрыжкі, асуджана ў 1945, рэабілітавана ў 1993.

КІБІС Праскоўя Кузьмінічна, н. у 1914 у в. Каўрыжкі, калгасніца, асуджана ў 1945, рэабілітавана ў 1993.

КІСЛЯКОЎ Аўрам Пракопавіч, н. у в. Сяброўка, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1960.

КІСЛЯКОЎ Гаўрыла Сцяпанавіч, н. у 1897 у г. Сянно, бухгалтар прамкамбіната, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1955.

КІСЯЛЁЎ Васіль Фёдаравіч, н. у 1898 у в. Прыхабы, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

КІШКОВІЧ Аляксей Цітавіч, н. у 1882 у в. Дадзікава, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КІШКОВІЧ Арцём Пракопавіч, н. у 1878 у в. Сапегі, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

КІШКОВІЧ Іван Арцёмавіч, н. у 1903 у в. Сапегі, селянін, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

КІШКОВІЧ Сямён Пракопавіч, н. у 1872 у в. Сапегі, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1993.

КЛІМОВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1880 у в. Шумкі, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КЛІМОВІЧ Мікалай Піліпавіч, н. на хут. Клімовічы, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1992.

КЛІМОВІЧ Пётр Іосіфавіч, н. у 1875 у в. Новая Беліца, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КЛІМОВІЧ Сцяпан Іванавіч, н. у 1882 у в. Новая Беліца, земляроб, асуджаны ў 1928, рэабілітаваны ў 1992.

КОЖУСЬ Ігнат Платонавіч, н. у 1876 у в. Кругляны, селянін, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КОМЛЕЎ Нічыпар Аляксандравіч, н. у 1885 у в. Іўчанкі, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КОШАЛЕЎ Андрэй Іванавіч, н. у 1892 у в. Нярэйша, святар, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КРАСНОЎСКАЯ Аляксандра Мікітаўна, н. у 1904 у в. Кажамякі, асуджана ў 1929, рэабілітавана ў 1992.

КРАСНОЎСКАЯ Ядвіга Іванаўна, н. у 1900 у г. Сянно, настаўніца, асуджана, рэабілітавана ў 1992.

КРАСНОЎСКІ Георгій Васільевіч, н. у 1894 у в. Рай, аднаасобнік, асуджаны ў 1929, рэабілітаваны ў 1992.

КРАСНОЎСКІ Ігнат Андрэевіч, н. у 1884 у в. Рай, без пэўных заняткаў, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КРАСНОЎСКІ Ігнат Іванавіч, н. у 1867 у в. Нямейкава, аднаасобнік, асуджаны ў 1938, рэабілітаваны ў 1989.

КРАСНОЎСКІ Фядот Дзмітрыевіч, н. у 1902 у в. Кажамякі, асуджаны, рэабілітаваны ў 1992.

КРАПОШЫН Сцяпан Селівестравіч, н. у 1889 у в. Кавалькі, аднаасобнік, асуджаны ў 1930, рэабілітаваны ў 1989.

КРАПОШЫНА Агаф'я Парамонаўна, н. у 1910 у в. Мяккія, сялянка, асуджана ў 1937, рэабілітавана ў 1959.

КРАСОЎСКІ Канстанцін Аляксандравіч, н. у 1897 у в. Машчоны, калгаснік, асуджаны ў 1932 і ў 1933, рэабілітаваны ў 1962 і ў 1989.

КРАСОЎСКІ Якаў Аляксандравіч, н. у 1901 у в. Машчоны, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

КРАЎЧАНКА Ягор Андрэевіч, н. у 1897 у в. Марцінаўка, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КРЫШТОПЕНКА Лізавета Аляксандраўна, н. у 1885 у в. Поўзікі, аднаасобніца, асуджана ў 1937, рэабілітавана ў 1989.

КРЭМЕНЬ Іван Іванавіч, н. у 1886 у в. Калодніца, селянін, асуджаны ў 1936, рэабілітаваны ў 1991.

КУЗНЕЧЫК Васіль Ігнатавіч, н. у 1911 у в. Берашова, селянін, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

КУЗНЕЧЫК Іван Ігнатавіч, н. у 1915 у в. Берашова, селянін, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

КУЗНЕЧЫК Міхаіл Платонавіч, н. у 1910 у в. Берашова, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

КУЗНЕЧЫК Парфен Ягоравіч, н. у 1906 у в. Берашова, селянін, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1962.

КУЗЬМЯНКОЎ Якаў Платонавіч, н. у 1888 у в. Бутоны, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1965.

КУЗНЯЦОЎ Павел Піліпавіч, н. у 1902 у в. Буканава, сувязіст станцыі Віцебск, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1990.

КУЗЬМІНІЧ Іван Міхеевіч, н. у 1884 у в. Ладзікава, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КУЗЬМІНІЧ Пётр Міхеевіч, н. у 1896 у в. Ладзікава, калгаснік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КУКСЁНАК Ануфрый Андрэевіч, н. у 1899 у в. Забараўе, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1964.

КУКСЁНАК Якаў Нічыпаравіч, н. у 1870 у в. Казлы, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КУЛІК Мікалай Андрэевіч, н. у 1901 у в. Малая Пярэспа, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1993.

КУЛЯШОЎ Антон Вікенцьевіч, н. у 1894 у в. Оўсішча, аднаасобнік, асуджаны ў 1935, рэабілітаваны ў 1999.

КУПРЫШЧАНКА Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1905 у в. Карпавічы, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КУПРЭЕНКА Амбросій Кліменцьевіч, н. у 1862 у в. Чартоўшчына, аднаасобнік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КУРАНЦОЎ Фама Аўрамавіч, н. у 1903 у в. Смалоўка, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КУРАШЭВІЧ Улас Еўдакімавіч, н. у 1880 у в. Расна, калгаснік, асуджаны ў 1937, рэабілітаваны ў 1989.

КУРС Піліп Рыгоравіч, н. у 1892 у в. Гарадзец, аднаасобнік, асуджаны ў 1931, рэабілітаваны ў 1989.

КУХАРЭНКА Антон Мяфодзьевіч, н. у 1885 у в. Машчоны, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КУХТО Ілья Аляксандравіч, н. у 1883 у в. Бесцвіна, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

КУХТО Кузьма Несцеравіч, н. у 1892 у в. Броўкі, аднаасобнік, асуджаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1989.

КУЧКО Якаў Аляксандравіч, н. у 1882 у в. Бесцвіна, калгаснік, асуджаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1989.

ЦЫПЛЯКОЎ Максім Давыдавіч, н. у 1901, рад., загінуў у 1939.

ЯЦКЕВІЧ Лука Фёдаравіч, н. у 1914, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА ЛЕСНІКОВА

ЖУРАЎ Фёдар Якаўлевіч, н. у 1910, рад., загінуў у 1939.

ТАРАСЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1914, рад., прапаў без вестак.

ШАМАТУЛЬСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1914, рад., прапаў без вестак.

ВЁСКА ЛУТ

ЛУТАЎЦОЎ Рыгор Кірылавіч, н. у 1908, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ТУР'ЕВА

ЦЯЦЮЕЎ Іосіф Іванавіч, н. у 1906, прапаў без вестак.

БАГДАНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАГДАНАВА

БАРАВІК Фёдар Данілавіч, н. у 1909, рад., загінуў 17.2.1940.

ВЁСКА ЗАПРУДДЗЕ

ВАСІЛЁНАК Уладзімір Раманавіч, н. у 1918, рад., загінуў у 1939.

ВАСІЛЁНАК Ісак Якаўлевіч, н. у 1892, рад., загінуў у 1939.

ВАСІЛЁНАК Максім Ігнатавіч, н. у 1910, рад. загінуў у 1939.

ВАСІЛЁНАК Уладзімір Раманавіч, н. у 1918, рад., загінуў у 1939.

ГАРБАЧОЎ Ігнат Аляксеевіч, н. у 1908, рад., загінуў у 1939.

ГАРБАЧОЎ Ісак Антонавіч, н. у 1893, рад., загінуў у 1939.

ГАРБАЧОЎ Сяргей Пятровіч, н. у 1895, рад., загінуў у 1939.

ЗЯЗЮЛІН Віктар Цярэнцьевіч, н. у 1904, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА КАНЕВА

БАРАНОЎСКІ Архіп Аляксеевіч, н. у 1923, рад., загінуў у 1940.

ЗАХАРЭВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1921, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ЛУКА

ГАРБАЧОЎ Іван Еўдакімавіч, н. у 1908, рад., 13.2.1940 прапаў без вестак.

ВЁСКА СВАБОДНАЯ

СТРЫЖНЁЎ Якаў Герасімавіч, н. у 1909, рад., загінуў 13.2.1940.

ВЁСКА ТУРАВА

ЖУКАЎ Іван Антонавіч, н. у 1911, 1.2.1940 прапаў без вестак.

ВЁСКА ФОЛЬВАРАК

СУХВАЛ Фёдар Іванавіч, н. у 1912, рад., памёр у палоне.

г. п. БАГУШЭЎСК

БЫКАЎ Ілля Цярэнцьевіч, н. у 1908, рад., загінуў у 1939.

ХАЛІМОНЕНКА Пракоп Іванавіч, рад., загінуў у 1940.

БАГУШЭЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЕКСАНДРОВА

ЛАУТКІН Аляксандр Уладзіміравіч, рад., загінуў.

СЕМЯНКОЎ Сямён Пятровіч, рад., загінуў.

ШУМАРОЎ Кузьма Дзянісавіч, н. у 1907, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА АСТАПЕНКІ

РАБЦАЎ Яфім Фёдаравіч, н. у 1909, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ВАРАШЫЛЫ

КОЗЫРАЎ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1912, рад., загінуў 17.2.1940.

МАНДРЫК Іван Нестаравіч, н. у 1908, рад., загінуў 2.2.1940.

ВЁСКА ЗАСЦЕНАК

МАНДРЫК Антон Ігнатавіч, рад., у снежні 1939 прапаў без вестак.

ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

РЫПІНСКІ Уладзімір Савельевіч, н. у 1918, мал. камандзір, загінуў 6.3.1940.

ЯРОШКА Васіль Антонавіч, рад., 13.2.1940 прапаў без вестак.

ВЁСКА РОДНАЕ СЯЛО (ДЗЯРГІ)

ХАДЗЮКОЎ Рыгор Пятровіч, рад., загінуў у 1939.

ШАШАЛАЎ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1900, рад., загінуў у 1940.

ШУГАЛЬСКІ Максім Якубавіч, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА СКОГ

РУМКІН Васіль Васільевіч, н. у. 1900, загінуў 12.3.1940.

ВЁСКА ШЫЛЫ

ПРЫХОЖЫ Тарас Васільевіч, н. у 1915, рад. 24.12.1939 памёр ад ран.

ВЁСКА ШЫРКІ

ШЛЫК Рыгор Міхайлавіч, н. у 1916, рад., у 1939 прапаў без вестак.

ЯНЧЫЛЕНКА Рыгор Піліпавіч, н. у 1912, рад., загінуў у 1939.

БЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАПОЛЛЕ

БАКАНОЎСКІ Спірыдон Барысавіч, рад., загінуў у 1939.
ЦАРАЎ Леанід Цярэнцьевіч, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА КАРАЛІ

МІРГАЛОЎСКІ Баляслаў Іосіфавіч, н. у 1909, мал. камандзір, загінуў 11.3.1940.

ВЁСКА МАРГОЙЦЫ

КАМУШЭНКА Васіль Ягоравіч, н. у 1915, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА МЯНЮЦЕВА

КУЛІК Ягор Пракопавіч, рад., загінуў у 1940.
МАЦЮШАЎ Васіль Нічыпаравіч, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА НОВАЯ БЕЛІЦА

ПРАКАПОВІЧ Дзмітрый Іовіч, рад., загінуў.
ЯНУШКЕВІЧ Фёдар Мікітавіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ПОЛЫМЯ

РАЧОНАК Фёдар Дзмітрыевіч, н. у 1910, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА РУЛЁЎШЧЫНА

ЕЎПАК Сцяпан Яфімавіч, н. у 1902, рад., загінуў.
ШЛЫК Пракоп Карнеевіч, н. у 1908, рад., загінуў.

КАКОЎЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БОРТНІКІ

ВАКАР Іван Парфёнавіч, н. у 1914, лейт., загінуў у 1939.

ВЁСКА БЯЛЕНЕВА

ШАЛАПУХА Пётр Герасімавіч, н. у 1906, рад., загінуў 4.1.1940.

ВЁСКА ГРУЗДЫ

САПРОНЕНКА Аляксандр Герасімавіч, н. у 1922, рад., загінуў у 1939.
ЯРОШКА Васіль Антонавіч, н. у 1907, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА ЗАБАРАЎЕ

БОНДАРАЎ Еўдакім Сцяпанавіч, н. у 1905, рад., загінуў у 1939.
КАЗЛОЎ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1906, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА ЗАВАЖАННЕ

КАЗЛОЎ Раман Фёдаравіч, н. у 1914, рад., загінуў 2.3.1940.

ВЁСКА ІВАШКАВА

МЯРГУР'ЕЎ Антон Мітрафанавіч, н. у 1903, рад., прапаў без вестак у 1940.

ВЁСКА КАКОЎЧЫНА

МІТАКОВІЧ Павел Сцяпанавіч, рад., загінуў.
РУМО Пракоп Трафімавіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак.

ВЁСКА ЛЕДНЕВІЧЫ

ЗАДОРА Іван Аляксеевіч, н. у 1904, рад., загінуў.
РУСАКОЎ Антон Архіпавіч, н. у 1909, рад., загінуў 18.9.1939.
МІРОНАЎ Пётр Васільевіч, н. у 1900, рад., у сакавіку 1940, прапаў без вестак.

ВЁСКА ЛІПЛЯНСК

ШЧЫТНІКАЎ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1910, рад., загінуў у 1939.
БАРАВІК Цярэнцій Мінавіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ЛІТУСАВА

ЖЫХАР Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1912, рад., загінуў у студзені 1940.
ШАРАЙ Уладзімір Іванавіч, н. у 1918, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА МІХНАВА

ПАНІМАШЧАНКА Ягор Ануфрыевіч, н. у 1913, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА МІЦЮКОВА

КАЗЫРЭЎСКІ Васіль Давыдавіч, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ПАШКОВА

ГАРБАЦЭВІЧ Сямён, рад., загінуў.
МАРШАЛОВІЧ Іван, рад. загінуў.

ВЁСКА ПІЛЬКАВІЧЫ

БАРАВІК Нупрэй Пятровіч, н. у 1908, рад., загінуў у 1939.

БЯГАЛЬСКІ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1912, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА РЫНДЗЕВА

РАВЯКА Пётр, н. у 1908, рад., загінуў 2.2.1940.

ВЁСКА СТУДЗЯНЕЦ

ДАНІКОВІЧ Павел Якімавіч, н. у 1905, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА ШУПЛЯКІ

СІМАШ Сямён, рад., загінуў у 1939.

ТРАШЧОНАК Даніла Пятровіч, н. у 1913, рад., загінуў 13.1.1940.

ВЁСКА ШЧЫТНІКІ

МАШЭЎСКІ Свірыд Пятровіч, рад., загінуў у 1939.

МАШЭЎСКІ Спірыдон Міхайлавіч, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА ШЭМЕТАЎКА

БУРАКОЎ Міхаіл Цімафеевіч, рад., загінуў у 1939.

РУСАКОЎ Павел, рад., загінуў у 1939.

МАШКАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БІКАВА

БОЧКІН Мікалай Іванавіч, н. у 1910, рад., загінуў.

ГРУНТОЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1910, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА БЯЛЬКІ

СЕМЯНКОЎ Канстанцін Сямёнавіч, н. у 1915, рад., загінуў.

ВЁСКА ГАСМІРАВА

ВОЛКАЎ Васіль Фаміч, рад., загінуў.

ВОЛКАЎ Васіль Якубавіч, рад., загінуў у лютым 1940.

ЛАБАЦКІ Нестар Сямёнавіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ЗАСТАДОЛЛЕ

КАВАЛКІН Васіль Рыгоравіч, н. у 1901, рад., загінуў 11.2.1940.

РЫНКЕВІЧ Лук'ян Пракопавіч, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА ЗАДАРОЖЖА

ЦІТОЎ Дзяніс Раманавіч, н. у 1905, рад., загінуў 14.2.1940 на Карэльскім перашыйку.

ВЁСКА ІВАНАЎКА

АНУФРЫЕЎ Міхаіл Антонавіч, рад., загінуў 12.2.1940.

ВЁСКА МАСОРЫ

КІРПІЧЭНКА Мірон Захаравіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак у 1940.

ЛЯХОЎСКІ Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1911, рад., загінуў.

МАШКЕЙ Захар Аляксеевіч, рад., загінуў.

СІНКЕВІЧ Антон Паўлавіч, н. у 1909, рад., загінуў у студзені 1940.

ВЁСКА МАШКАНЫ

МАШКАНАЎ Навум Паўлавіч, н. у 1907, рад., загінуў.

ПРЫХОЖЫ Фёдар Іванавіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ОБАЛЬ

КАЗЛОЎ Міхаіл Іванавіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ПАРНЕВА

ШАЛУХА Іван Пракопавіч, н. у 1910, рад., загінуў.

ВЁСКА РАМШЫНА

ПЛЮШКОЎ Рыгор Максімавіч, н. у 1908, рад., загінуў.

НЯМОЙТАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАБОР'Е

ГАРАДЗЕЦКІ Іван Сяргеевіч, н. у 1917, рад., у лютым 1940 прапаў без вестак.

ВЁСКА НЯМОЙТА

ЗАРКОЎСКІ Ціхан Фаміч, н. у 1906, мал. камандзір, загінуў 11.2.1940.

БУТАРОВІЧ Мікіта Сцяпанавіч, н. у 1906, рад., загінуў 12.2.1940.

ВЁСКА РАКАЎ ЗАСЦЕНАК

ЕРМАШКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1911, рад., загінуў 12.2.1940.

САЎЛЕВІЧ Марк Сцяпанавіч, лейт., загінуў 21.1.1940.

ВЁСКА ЦІМІРАЗЕВА

ЗАХАРЭВІЧ Канстанцін Карпавіч, рад. загінуў 9.3.1940.

ОБАЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАЗЛЫ

КАЗЛОЎ Піліп Філімонавіч, н. у 1913, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ОБАЛЬ

ДУБАВЕЦ Мікалай Мінавіч, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ПУЦІШЧА

ЛАГУНОЎ Дзмітрый Якаўлевіч, н. у 1903, рад., загінуў у 1940.

ПРЫСТАЎКА Рыгор Аляксандравіч, н. у 1901, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА СЛАБАДА

МІСЦЮК Якаў Анісімавіч, н. у 1903, рад., загінуў 13.2.1940.

ФІЛІПОВІЧ Канстанцін Піліпавіч, н. у 1909, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА СТАНЬКІ

АЎФЯРОНАК Рыгор Раманавіч, н. у 1909, рад., загінуў у 1940.

ВОЛКАЎ Васіль Фаміч, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ЦЕПЛЯКІ

КАВАЛЁЎ Іван Пятровіч, н. у 1912, рад., у лютым 1940 прапаў без вестак.

ЧУДАКОЎ Рыгор Захаравіч, рад., 8.2.1940 загінуў на Карэльскім перашыйку.

ВЁСКА ЯРОШКІ

ГАПЕЕЎ Іван Фёдаравіч, н. у 1907, рад., загінуў.

РАСНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАРОНІНА

АКУЛЁНАК Васіль Арцёмавіч, н. у 1915, рад., загінуў у 1940.

АКУЛЁНАК Сямён Іванавіч, н. у 1910, рад., загінуў у 1940.

ШУПЕНЯ Сяргей Архіпавіч, н. у 1910, рад., у 1940 прапаў без вестак.

ВЁСКА ВЕЙНА

КАВАЛЕЎСКІ Павел Парфір'евіч, н. у 1912, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА КАЖАМЯКІ

ПАДОЛЬСКІ Павел Іванавіч, н. у 1911, рад., загінуў 3.2.1940.

ВЁСКА КУЗЬМІНО

ЖЫГУЛА Мікалай Іванавіч, н. у 1911, рад., у снежні 1939 прапаў без вестак.

ВЁСКА РАСНА

МАІСЕЕЎ Мікалай Навумавіч, н. у 1910, рад. загінуў у 1940.

ВЁСКА СЕРКУЦІ

БАГУШЭЎСКІ Іларыён Васільевіч, н. у 1905, прапаў без вестак у лютым 1940.

ДРУЖЫНА Сцяпан Яфімавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЁСКА ЦЯСІШЧА

НОВІКАЎ Васіль Якаўлевіч, н. у 1906, рад., у лютым 1940 прапаў без вестак.

СТУДЗЁНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАЛОДЗЬКІ

ГАРНАК Арцём Захаравіч, н. у 1907, рад., загінуў 3.2.1940.

КАЗЛОЎ Мікалай Раманавіч, н. у 1910, рад., загінуў 15.2.1940.

ВЁСКА ВІТУНЬ

ГАРНАК Кузьма Аляксеевіч, н. у 1913, рад., загінуў.

ГАРНАК Павел Мацвеевіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ГРАДА

КАРПОВІЧ Андрэй Аляксандравіч, н. у 1902, рад., прапаў без вестак.

ВЁСКА ЗААЗЕР'Е

ПРЫСТАЎКА Мікалай Міхайлавіч, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА ПУСТЫНКІ

КАРПОВІЧ Андрэй Аляксандравіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЁСКА ХАМЁНКІ

ГРАЧЫХА Сяргей Раманавіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ЯХІМОЎШЧЫНА

БАКУНОЎ Дзмітрый Якаўлевіч, н. у 1912, рад., загінуў у 1939.

УЛЬЯНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАРНАКІ

ШТАНЦОЎ Марк Антонавіч, н. у 1910, рад., загінуў.

ВЁСКА ДОЛЬДЗЕВА

ПАПОК Кузьма Карнеевіч, н. у 1901, рад., загінуў у лютым 1940.

ФЯДЗЮК Сяргей Якаўлевіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ЗААЗЕР'Е

ШМАТКОЎ Павел Цімафеевіч, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА ЗАМОШША

РАДКЕВІЧ Павел Сямёнавіч, н. у 1906, рад., загінуў.

РАДКЕВІЧ Павел Ігнатавіч, рад., загінуў.

ВЁСКА ЛЕСНІКІ

БАРАНОЎСКІ Валерый Сцяпанавіч, лейт., загінуў у 1940.

ШЫДЛОЎСКІ Яфім Іванавіч, ваеннаслужачы, загінуў.

ВЁСКА МАР'ЯНОВА

ВОРАНАЎ Сцяпан Піліпавіч, н. у 1904, рад., загінуў у 1940.

ХОДЦАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕЛЯІ

МЯЦЕЛІЦА Дзмітрый Пятровіч, н. у 1910, рад., загінуў 13.2.1940.

ВЁСКА БЕСЦВІНА

АБІЛІЕВІЧ Іван Пятровіч, рад., загінуў у сакавіку 1940.

ПРЫСТАЎКА Мікалай Міхайлавіч, н. у 1903, рад., у лютым 1940 прапаў без вестак.

ВЁСКА ЖАРЦЫ

ШЛЯШЫНСКІ Міхаіл Антонавіч, н. у 1908, рад., у лютым 1940 прапаў без вестак.

ВЁСКА ЛІПНА

ПІШЧЫКАЎ Іван Ігнатавіч, н. у 1907, рад., загінуў 12.2.1940.

ВЁСКА РАБЦЫ

ТАМАШЭВІЧ Дзмітрый Ларывонавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак.

ВЁСКА САВУШЫ

ДАДЗЕРКІН Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1911, рад., загінуў 14.2.1940.

ВЁСКА СОІНА

КРАСІЛЬНІКАЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1913, рад., у сакавіку 1940 прапаў без вестак.

ВЁСКА СЫЧЫКІ

ДУНЕЦ Міхаіл Конанавіч, н. у 1912, рад., загінуў 12.2.1940.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

22 чэрвеня 1941 г. жыццё ўсяго савецкага народа перайшло на іншыя, ваенныя рэйкі. Фашысцкая Германія, вераломна парушыўшы дагавор аб ненападзе, пачала вайну супраць СССР. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне байцоў Чырвонай Арміі, войскі Заходняга фронту не маглі стрымаць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія імкліва рваліся на ўсход. Вогненны вал вайны дакаціўся і да Сенненшчыны. Ужо ў ліпені 1941 г. яна стала арэнай жорсткіх баёў.

Танкавыя злучэнні генерала Гота прарваліся ў раёне Лепеля, Улы і дзейнічалі на левым беразе Заходняй Дзвіны. Гэта стварала сур'ёзную пагрозу злучэнням правага крыла Заходняга фронту. Вораг збіраўся фарсіраваць Заходнюю Дзвіну, захапіць Полацк і Віцебск, а затым абыйсці з поўначы войскі Заходняга фронту і знішчыць іх. У адпаведнасці з указаннем Стаўкі Галоўнага Камандавання войскам Заходняга фронту быў аддадзены загад стойка абараняць лінію Полацкага ўмацаванага раёна, а таксама рубеж Заходняя Дзвіна — Сянно, не дапусціць прарыву праціўніка на паўночным і ўсходнім напрамках.

6 ліпеня, зламаўшы супраціўленне нашых часцей, перадавыя падраздзяленні 17-й танкавай дывізіі з групы Гудэрыяна занялі Сянно і пачалі рухацца ў бок Віцебска. У гэты дзень па ўказанню камандуючага Заходнім фронтам войскі 20-й арміі, якой камандаваў генерал-лейтэнант П. А. Курачкін, правялі контрудар з паўночнага і заходняга боку Оршы ў фланг войскам 3-й танкавай групы праціўніка. У контрудары ўдзельнічалі прыбыўшыя з Сібіры 7-ы і 5-ы механізаваныя корпусы, якія мелі каля тысячы танкаў старых тыпаў. У жорсткіх баях праціўніку былі нанесены вялікія страты і да поўдня 8 ліпеня яго адкінулі на 30—40 км у напрамку Лепеля.

Найбольш упартыя і цяжкія баі з 6 па 9 ліпеня разгарэліся на поўдзень ад Сянна. У раёне Сянна наступаўшыя войскі 20-й арміі натыкнуліся на моцнае супраціўленне злучэнняў 47-га матарызаванага нямецкага корпуса і выкінутага буйнога паветранага дэсанта. 7-ы механізаваны корпус быў спынены на паўночна-ўсходніх подступах да горада, а 5-ы вёў цяжкія абарончыя баі амаль у поўным акружэнні. 10 ліпеня па загаду камандуючага 20-й арміяй войскі корпуса выйшлі з акружэння ў раён Оршы.

У гэтых баях узоры стойкасці і масавага гераізму паказалі воіны часцей 153-й дывізіі. Два батальёны фашысцкіх аўтаматчыкаў 7 ліпеня атакавалі пазіцыі, якія займала рота старшага лейтэнанта М. Ф. Герасімчука. На акопы абрынуўся шквал артылерыйскага і мінамётнага агню, пайшло 20 танкаў. Іх сустрэла аддзяленне знішчальнікаў танкаў, якімі камандаваў сяржант І. Ф. Шостак. Калі першыя машыны з крыжамі на вежах наблізіліся да акопаў, знішчальнікі пачалі закідваць іх звязкамі гранат і бутэлькамі з гаручай сумессю. Атакі працягваліся адна за другой.

Але байцы трымаліся стойка. Варожую пяхоту спынілі кулямётным агнём, а ў бой з танкамі зноў уступілі знішчальнікі. Сяржант Шостак запаліў галаўную машыну. Хутка яшчэ тры танкі ахапіла полымя. Аднак пяць танкаў прарваліся ў размяшчэнне роты. Два з іх наблізіліся да акопа, дзе знаходзіўся камандзір роты. Ён узняўся ва ўвесь рост са звязкай гранат і ўдалым кідком спыніў машыну. У другі танк паляцела бутэлька з гаручай сумессю. Прыкладу камандзіра паследавалі байцы. Страціўшы некалькі машын, фашысты і на гэты раз вымушаны былі адыйсці.

У той дзень сяржант І. Ф. Шостак падбіў і запаліў чатыры танкі, па дзве машыны падбілі радавы Уладзімір Зубко, камандзір роты М. Ф. Герасімчук, камандзір батальёна капітан Е. Е. Лабкоў.

У баях пад Сянном у цяжкія ліпеньскія дні 1941 г. вызначыўся механік-вадзіцель 18-га асобнага разведвальнага батальёна сяржант І. Д. Безбародаў, які смела ўступіў у бой з 16-ю танкамі праціўніка. Умела манеўруючы машынай, ён даў магчымасць камандзіру гарматы знішчыць тры нямецкія танкі. Механік-вадзіцель быў паранены, але працягваў кіраваць танкам. Ён пакінуў палаючую машыну толькі тады, калі былі выкарыстаны ўсе боепрыпасы.

Гераічна змагаліся з ворагам воіны 17-га мотастралковага палка на чале з камандзірам маёрам Д. Ф. Міхайлоўскім і палкавым камісарам Л. Ю. Эйхманам.

Радзіма высока ацаніла мужнасць удзельнікаў баёў пад Сянном. Сотні воінаў былі ўдастоены ордэнаў Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалёў «За адвагу» і «За баявыя заслугі». Сярод прадстаўленых камандаваннем да ўзнагароджання быў і камандзір батарэі старшы лейтэнант Якаў Джугашвілі — сын І. В. Сталіна.

Нямецкі генерал Гудэрыян пасля вайны ў сваёй кнізе «Воспоминания солдата» (М., 1954) пісаў: «Нас моцна білі пад Сянном».

Пасля вымушанага адступлення нашых войск у Сенненскай раённай бальніцы засталося звыш 300 цяжка параненых воінаў. У надзвычай цяжкіх умовах гітлераўскай акупацыі іх ратавалі ад смерці ўрач А. Я. Ушацкая, медсёстры Вольга Хадыка, Ганна Серабро-Хадыка, санітаркі. Яны рабілі ўсё магчымае, каб нашы параненыя не былі адпраўлены ў лагеры ваеннапалонных.

З лета і восені 1941 г. у раёне пачалі арганізоўвацца і дзейнічаць партызанскія групы В. С. Лявонава, П. І. Кірылава, А. Дз. Клячына, А. Ф. Бардадына, Л. І. Сяліцкага. З іх вясной 1942 г. было створана некалькі партызанскіх атрадаў. Група Л. І. Сяліцкага ў сакавіку злучылася з атрадам К. С. Заслонава. У маі групы П. І. Кірылава і А. Ф. Бардадына злучыліся ў атрад, які ўвайшоў затым у склад Багушэўскай брыгады В. У. Бойкі («Баці»), што дзейнічала на тэрыторыі Багушэўскага, Аршанскага і Гарадоцкага раёнаў. У кастрычніку была створана Сенненская партызанская брыгада (камандзір В. С. Лявонаў, камісар П. В. Сырцоў).

У былым Багушэўскім раёне пад кіраўніцтвам сакратара райкома КП(б)Б А. К. Стэльмаха і Я. М. Прахарэнкі ў ліпені—жніўні 1941 г. было створана пяць партызанскіх груп, аб'яднаных затым у атрад, які ў пачатку верасня пачаў праводзіць баявыя аперацыі.

З кожным днём узмацнялася барацьба ў тыле ворага супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Асабліва актыўнымі дзеяннямі ў гэты час на Сенненшчыне вызначаліся заслонаўцы. Толькі ў ліпені 1942 г. партызаны-заслонаўцы знішчылі чатыры валасныя ўправы.

Па меры таго, як расла баявая слава партызан-заслонаўцаў, у іх рады ўліваліся ўсё новыя і новыя сілы. Днём нараджэння брыгады Заслонава лічыцца 15.7.1942 г., калі на базе пяці атрадаў, ядром якіх з'яўляўся атрад «дзядзькі Косці», было створана гэтае партызанскае фарміраванне. Усяго налічвалася 252 чалавекі. На ўзбраенні яны мелі станковы і 40 ручных кулямётаў, 8 аўтаматаў і 173 вінтоўкі.

Памнажаліся баявыя справы брыгады. Заслонаўцы пускалі пад адхон варожыя эшалоны, падрывалі рэйкі, масты,

станцыйныя збудаванні, знішчалі аўтатранспарт, варожую тэхніку, грамілі фашысцкія гарнізоны. Воля да перамогі была велізарнай. Але не хапала боепрыпасаў.

У адным з баявых данясенняў у ЦК КП(б)Б, датаваным 7 кастрычніка, К. С. Заслонаў пісаў: «...прашу больш, як мага больш толу і падрыўнога матэрыялу. Людзі дзейнічаюць. Сёння знішчылі Раснянскую валасную ўправу. Частку захопленых дакументаў накіроўваю Вам, магчыма скарыстаеце...».

У кастрычніку заслонаўцы ажыццявілі смелы рэйд па тылах праціўніка. Якраз у гэты час на К. С. Заслонава было ўскладзена камандаванне ўсімі партызанскімі сіламі Аршанскай зоны. 5 лістапада, здаўшы брыгаду камісару Л. І. Сяліцкаму, Канстанцін Сяргеевіч прыступіў да выканання новых абавязкаў.

У гэты час брыгада знаходзілася ў лясах пад Алексінічамі, а яе штаб з невялікім атрадам размясціўся ў вёсцы Купаваць. Па задуме Заслонава, паблізу гэтай глухой вёскі меркавалася стварыць зімовы партызанскі лагер. Але пра месца размяшчэння заслонаўцаў даведаліся фашысты і наладзілі буйную карную экспедыцыю. 14 лістапада ў 10 гадзін раніцы карнікі пачалі наступленне. Партызаны чатыры гадзіны адбівалі атакі карнікаў. К. С. Заслонаў змагаўся на пярэднім краі абароны. У гэтым баі легендарны камбрыг загінуў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 7.3.1943 г. Канстанціну Сяргеевічу Заслонаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. На месцы гібелі камбрыга ў Купаваці і на чыгуначнай станцыі Орша ўзведзены помнікі легендарнаму «дзядзьку Косцю».

Па ўказанню Беларускага штаба партызанскага руху 23.9.1943 г. з шасці атрадаў, выдзеленых з 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава, была створана 2-я партызанская брыгада, якой таксама было прысвоена яго імя. Гэтыя буйныя фарміраванні народных мсціўцаў унеслі вялікі ўклад у агульную перамогу над ворагам. Нямала баявых аперацый правялі яны на тэрыторыі Сенненскага раёна.

Хутка пашыраўся партызанскі рух. Ужо не асобныя патрыёты, а сотні і тысячы людзей улівaліся ў рады народных мсціўцаў. Бесперапынна папаўняліся новымі байцамі 1-я і 2-я брыгады імя К. С. Заслонава, Сенненская брыгада. Павышалася баявое майстэрства партызанскіх камандзіраў і арганізатараў падпольных груп.

У маі 1943 г. быў створаны Сенненскі падпольны райком партыі. Узначаліў яго ўдзельнік грамадзянскай вайны, член партыі з 1928 г. М. Ц. Любімцаў, другім сакратаром быў М. І. Мізоўцаў. Адначасова М. Ц. Любімцаў быў прызначаны камісарам Сенненскай партызанскай брыгады.

З сярэдзіны 1943 г. актывізаваў сваю работу Сенненскі падпольны райком камсамола (сакратары П. І. Нікіцін, Л. С. Кацар). 28 ліпеня выйшаў у падполлі першы нумар раённай газеты «Бальшавіцкая трыбуна». З лістапада 1943 г. пачала выходзіць і газета «Сталінскі шлях» — орган Багушэўскага падпольнага райкома партыі. Падпольны друк адыграў важную ролю ў разгортванні масава-палітычнай работы сярод насельніцтва, у актывізацыі баявых дзеянняў партызан. Актыўна дзейнічалі прапагандысцкія групы, створаныя пры райкоме, і агіткалектывы пры партызанскіх атрадах. Былі выдзелены спецыяльныя групы партызан, якія распаўсюджвалі літаратуру ў вёсках, кантралюемых гітлераўцамі, а таксама пашталёны, у абавязкі якіх уваходзіла рэгулярная дастаўка ў атрады газет, лістовак, расклейванне іх у людных месцах, а таксама распаўсюджванне ў гарнізонах праціўніка.

З дня арганізацыі Сенненскай брыгады і да поўнага выгнання акупантаў яна не пакідала раён і толькі выходзіла за яго межы на разгром варожых гарнізонаў і для правядзення дыверсій. Партызаны кантралявалі чыгункі Орша—Мінск, Орша—Віцебск, Орша—Лепель, праводзілі дыверсіі на шасейных дарогах Віцебск—Сянно, Лепель—Віцебск, Сянно—Багушэўск.

У снежні 1943 г., лютым і сакавіку 1944 г. Сенненская брыгада вяла абарончыя баі каля в. Новая Беліца Сенненскага раёна, дзе працiўнік спрабаваў захапіць партызанскі аэрадром.

У баях за партызанскі аэрадром асабліва вызначыліся камандзіры атрадаў Ю. К. Каракетаў, А. М. Захараў, А. Дз. Клячын, М. Дз. Кашчэеў.

Беліцкі партызанскі аэрадром меў вялікае стратэгічнае значэнне. Праз яго народныя мсціўцы атрымлівалі з «Вялікай зямлі» зброю, боепрыпасы, медыкаменты, газеты, зводкі Саўінфармбюро, лісты ад родных і блізкіх, адпраўлялі ў савецкі тыл цяжка параненых, хворых.

У студзені 1944 г. з мэтай правядзення буйных баявых аперацый і арганізацыі адпору карным экспедыцыям фашыстаў супраць партызан і мірнага насельніцтва была актывізавана дзейнасць 13-і брыгад Сенненска—Аршанскай партызанскай зоны, у тым ліку Сенненскай, Багушэўскай, 1-й і 2-й імя К. С. Заслонава, а таксама брыгад, якімі камандавалі Ф. Ф. Дубровскі, С. М. Нарчук, Н. П. Гудкоў. У зоне налічвалася звыш 8 тыс. партызан, яна ахоплівала каля 300 населеных пунктаў, у якіх пражывала 35 тыс. чалавек. Каардынацыя дзеянняў партызанскіх брыгад была даручана В. С. Лявонаву.

У партызанскіх атрадах змагаліся з ворагам прадстаўнікі многіх народаў Савецкага Саюза. У пакоі баявой славы, створаным вучнямі Ульянавіцкай сярэдняй школы, захоўваюцца дакументы, што расказваюць аб тым, як бясстрашна і мужна змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі намеснік камандзіра Сенненскай партызанскай брыгады карачаевец Кічы-Батыр Алімуразаевіч Хаіркізаў. Свой апошні бой ён прыняў каля вёскі Латыгаль. Тут Лёнька-карачаевец, як называлі яго сябры, загінуў смерцю храбрых. Яго імем быў названы адзін з атрадаў Сенненскай партызанскай брыгады.

На тэрыторыі Сенненскага раёна ажыццяўлялі баявыя аперацыі таксама партызанскія брыгады 1-я Беларуская, 16-я Смаленская, «Аляксея», Смаленскі полк і іншыя. Асабліва актыўна яны дзейнічалі вясной і летам 1943 г. Брыгада «Аляксея», якой камандаваў А. Ф. Данукалаў, за пяць дзён жніўня разграміла фашысцкія гарнізоны ў вёсках Обаль, Рубежніца, Паршні. Партызаны 16-й Смаленскай брыгады зрабілі ўдалы налёт на гарнізон у вёсцы Тухінка. Смаленскі полк І. Ф. Садчыкава расправіўся з гітлераўскімі гарнізонамі ў Чарэі, вёсках Гарывец і Латыгаль.

З восені 1943 г. партызаны амаль бесперапынна вялі баі з акупантамі. Акупацыйныя ўлады і гітлераўскае камандаванне наладжвалі карныя экспедыцыі супраць партызан. У такіх выпадках народныя мсціўцы, адбіўшы атакі фашыстаў, альбо адыходзілі ў глыб лясоў, альбо пасля абыходнага манеўра наносілі нечаканыя ўдары па тылах і флангах карнікаў.

Нямецкае камандаванне кінула ўсе сілы, каб ліквідаваць партызан брыгады, якія дзейнічалі ў Мінскай і Віцебскай абласцях. Партызаны атрада В. С. Лявонава па ўказанню Беларускага штаба партызанскага руху выступілі ў напрамку Ушачаў, каб дапамагчы злучэнням Полацка—Лепельскай зоны, якія вялі кровапралітныя баі з карнікамі. Выкананне гэтага загада было ўскладзена на В. І. Ванцеева. Народныя мсціўцы разграмілі варожыя гарнізоны ў вёсках Залессе, Матырына.

Партызаны Сенненшчыны актыўна ўдзельнічалі ў аперацыі «рэйкавая вайна». На чыгунках Орша—Віцебск і Орша—Лепель яны падарвалі і пашкодзілі больш за тысячу рэек. На рахунку Сенненскай партызанскай брыгады 85 пушчаных пад адхон варожых эшалонаў, 84 знішчаных паравозы, тысячы забітых і параненых фашысцкіх салдат і афіцэраў, разбураныя масты, падарваныя танкі, бронемашыны, склад з боепрыпасамі.

Важкі ўклад у агульную перамогу над ворагам унеслі падпольныя патрыятычныя групы, якія актыўна дзейнічалі ў Сянне, Багушэўску, Беліцы, Ульянавічах, Латыгалі, Нямойце, Баяршчыне, Оўсішчы, Кажамяках і іншых населеных пунктах. Падпольшчыкі знішчылі нямецкага каменданта г. Сянно, узарвалі электрастанцыю, склад са зброяй і іншыя аб'екты. Работай падпольных груп кіраваў падпольны райком партыі.

Ранкам 23.6.1944 г. пачалася наступальная аперацыя Чырвонай Арміі па вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якая атрымала кодавую назву «Баграціён». Характэрнай асаблівасцю гэтай аперацыі з'явілася цеснае ўзаемадзеянне з партызанамі ў ходзе наступлення.

Каб выканаць пастаўленую задачу, камандуючы 3-м Беларускім фронтам генерал-палкоўнік І. Д. Чарняхоўскі рашыў стварыць дзве ўдарныя групы: паўночную — у саставе 39-й і 5-й армій і конна-механізаванай групы для наступлення на багушэўскім напрамку, паўднёвую — у саставе 11-й гвардзейскай і 31-й армій для дзеянняў на аршанскім напрамку.

Падтрымліваючы наступленне рэгулярных армейскіх часцей, з 20 па 23 чэрвеня партызанскія брыгады правялі масавыя акцыі на чыгункі, каб перашкодзіць перавозцы жывой сілы і тэхнікі праціўніка.

Напярэдадні агульнага наступлення на франтах была праведзена разведка боем сіламі перадавых батальёнаў, каб удакладніць дадзеныя аб стане абароны праціўніка. Ранкам 23 чэрвеня, пасля моцнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі, войскі 3-га Беларускага фронту перайшлі ў наступленне. Найбольшага поспеху дасягнулі 39-я і 5-я арміі, якія ў першы ж дзень прарвалі абарону праціўніка на глыбіню 10—11 кіламетраў і да 50 кіламетраў па фронту. 25 ліпеня ў ходзе наступлення 5-й арміі нашы войскі штурмам авалодамі Багушэўскам.

Прадстаўнік Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі пісаў аб гэтым дні: «Пад Віцебскам, як і прадугледжвалася планам, наспяваў «кацёл», у якім павінна была аказацца буйная варожая групоўка. На паўднёвы захад знаходзіліся нямецкія рэзервы. Не дапусціць іх да Віцебска можна было пры ўмове хутчэйшага руху нашых войскаў у раён... Сянно. Мы вырашылі паскорыць наступленне 5-й арміі, каб не пазней вечара 24 чэрвеня ўвесці ля Багушэўска ў прарыў конна-механізаваную групу генерал-лейтэнанта М. С. Аслікоўскага». Перад гэтай групай была пастаўлена задача адбіць у ворага Сянно, Халопенічы, выйсці да ракі Бярэзіна, заняць плацдарм на яе заходнім беразе.

З прычыны таго, што на багушэўскім напрамку войскі 5-й арміі і конна-механізаванай групы хутка выйшлі на аператыўны прастор, а на аршанскім напрамку наступленне развівалася больш марудна, па ўказанню А. М. Васілеўскага 5-ю гвардзейскую танкавую армію П. А. Ротмістрава было вырашана ўвесці ў бой таксама на багушэўскім напрамку. Ранкам 25 чэрвеня яна сканцэнтравалася на захад ад Лёзна. Падтрымліваць яе павінны былі галоўныя сілы 1-й паветранай арміі генерала Ц. Ц. Хрукіна*.

Пазней А. М. Васілеўскі ўспамінаў: «Штурмавікі ўдала суправаджалі пяхоту і танкі, паражаючы агнявыя сродкі і жывую сілу фашыстаў. А калі 5-я армія сустрэла сур'ёзнае супраціўленне каля Багушэўска і я патрабаваў ад камандавання паветранай арміі (праз камандуючага фронтам) дапамагчы ёй, ні дождж, ні нізкія воблакі, што слаліся над намі на вышыні 100 м, не перашкодзілі масіраванаму бомбаваму ўдару па апорнаму пункту праціўніка. У час маёй тэлефоннай размовы з Ц. Ц. Хрукіным самалёты знаходзіліся ўжо ў паветры, накіроўваючыся да Оршы. Камандуючы арміяй тэрмінова перанацэліў іх. 90 ПЕ-2 і 180 ІЛ-2, змяніўшы маршрут, павярнулі на Багушэўск і выдатна выканалі заданне, аблегчыўшы наземным войскам авалоданне раёнам».

На другі дзень конна-механізаваная група М. С. Аслікоўскага, абагнаўшы стралковыя злучэнні, выйшла ў раён на захад ад Багушэўска і працягвала імкліва рухацца ў бок Сянна. Вораг паступова адводзіў свае войскі за рэчку Абалянка. Коннагвардзейцы нанеслі моцны ўдар па праціўніку, прарвалі яго абарону і рушылі ў напрамку Алексінічы—Вейна. Тым часам выйшлі на аператыўную прастору

*Хрукін Ц. Ц. — на час апісваемых падзей Герой Савецкага Саюза, генерал-палкоўнік авіяцыі, удзельнік вызвалення Беларусі.

часці 3-га механізаванага корпуса. Змятаючы асобныя ачагі супраціўлення ворага, яны 25 чэрвеня авалодалі горадам Сянно, 5-я гвардзейская танкавая армія ў той дзень выйшла на аўтамагістраль Масква — Мінск ля Талачына. Поўнасцю развалілася варожая абарона паміж Заходняй Дзвіной і Дняпром.

У баях за вызваленне Сенненшчыны многія воіны паказалі ўзоры мужнасці і гераізму. Пасмяротна звання Героя Савецкага Саюза ўдастоены разлік баявой устаноўкі «кацюша» ў складзе гвардыі радавога С. А. Барадуліна, гвардыі сяржанта Ц. І. Святлічнага, гвардыі старшага сяржанта П. І. Назаранкі, якія выканалі заданне, аднак згарэлі разам з «кацюшай», каб не трапіць у рукі ворага. Гэтага ж звання пасмяротна ўдастоены камандзір танкавага разведузвода гвардыі лейтэнант М. А. Аніскін.

У лагеры, які выявілі разведчыкі лейтэнанта М. Ф. Маскаева з 97-й стралковай дывізіі, у лесе недалёка ад Багушэўска знаходзілася 8 тысяч мірных жыхароў. З усіх бакоў лагер абкружаў глыбокі роў, аплятаў калючы дрот, а подступы да ўзлесся былі замініраваны. Рашэнне ў разведчыкаў знайшлося імгненна: знішчыць патруль ворага, пранікнуць на тэрыторыю лагера і вывесці вязняў. Нечаканым налётам разведчыкі знішчылі ахову. Усе вязні былі выведзены на волю. Калі гітлераўцы апамяталіся і адкрылі артылерыйскі агонь па тэрыторыі лагера, там ужо не было нікога.

На ўскраіне Багушэўска ў чэрвені 1944 г. загінуў экіпаж нашага штурмавіка. У той дзень савецкія самалёты «апрацоўвалі» пярэдні край праціўніка. Калі загарэлася машына, камандзір В. М. Гарбуноў павёў самалёт прама на ўмацаванні ворага. Разам з адважным камандзірам загінуў борт-стралок І. Е. Чырвоў. Праз 26 гадоў чырвоныя следапыты з дапамогай мясцовых жыхароў адшукалі месца гібелі адважных лётчыкаў. Ім былі аддадзены апошнія ўшанаванні, а ў Багушэўску з'явіліся вуліцы Гарбунова і Чырвова.

Пры вызваленні Сенненшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Чырвонай Арміі актыўна дапамагалі партызаны. Каб адрэзаць шляхі адступлення праціўніка, брыгада пад камандаваннем В. С. Лявонава рабіла завалы на дарогах. Шосты атрад, якім камандаваў А. І. Красавін, у паўднёвай частцы раёна разбіў з засады варожую калону. Камандзір атрада «За Радзіму» В. Дз. Кацар правёў савецкую танкавую часць ад Чарэі да Бярэзіны. Партызаны вылоўлівалі і знішчалі ў лясах разрозненыя групы гітлераўцаў.

Партызаны Багушэўскай брыгады, сустрэўшыся 23 чэрвеня з перадавымі мейскімі часцямі, павялі савецкіх танкістаў у абыход абароны гітлераўцаў. Нечакана з'явіўшыся на беразе возера Дзевінскае, танкі з чырвонымі зоркамі на вежах выклікалі перапалох у стане ворага. Больш за тысячу фашысцкіх ваяк здаліся ў палон.

Гераічна змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны многія ўраджэнцы Сенненшчыны. Усёй краіне вядома імя лётчыка Героя Савецкага Саюза А. К. Гараўца, які ў небе над Курскай дугой у адным паветраным баі збіў дзевяць варожых самалётаў. Адважны лётчык загінуў, але імя яго жыве ў назвах вуліц у Мінску, Віцебску, Сянне, Багушэўску, у сэрцах яго землякоў.

Подзвіг Аляксандра Матросава паўтарыў у 1945 г. ураджэнец вёскі Ульянавічы С. А. Каваленка, якому пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Гэта званне прысвоена пасмяротна і начальніку штаба стралковага палка А. Дз. Мацюшову, а таксама лётчыкам І. І. Камінскаму і І. Г. Тамашэўскаму, камандзіру танкавай роты А. Ф. Пятаковічу. Званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена П. М. Машэраву.

Помнікі і абеліскі каля дарог, брацкія магілы яшчэ і яшчэ раз напамінаюць пра тое, што Сенненшчына была арэнай жорсткіх баёў з фашыстамі, што тут было здзейснена нямала подзвігаў у імя нашай Бацькаўшчыны, у імя шчаслівай будучыні.

У. Р. Скапа.

153-я стралковая дывізія ў баях на Сенненшчыне

З успамінаў гвардыі палкоўніка Сцебунова, былога намесніка начальніка штаба дывізіі

18 верасня 1941 г. — дзень нараджэння савецкай гвардыі. У гэты дзень па рашэнню Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання за масавы гераізм, мужнасць асабовага саставу, высокае воінскае майстэрства загадам № 308 Народнага камісара абароны СССР І. В. Сталіна чатыры дывізіі былі перайменаваны: 100-я ў 1-ю гвардзейскую, 127-я ў 2-ю, 153-я ў 3-ю, 161-я ў 4-ю гвардзейскія.

«У шматлікіх баях за нашу Савецкую Радзіму супраць гітлераўскіх орд фашысцкай Германіі, — указвалася ў загадзе, — 100-я, 127, 153 і 161-я стралковыя дывізіі паказалі ўзоры мужнасці, адвагі, дысцыпліны і арганізаванасці. У цяжкіх умовах барацьбы гэтыя дывізіі неаднаразова наносілі жорсткія паражэнні нямецка-фашысцкім войскам, прымушаючы іх да ўцёкаў, наводзячы на іх жах. Гэтым нашым стралковым дывізіям удавалася біць ворага і гнаць перад сабою хвалёныя нямецкія войскі».

Загад Народнага камісара абароны СССР гвардзейцам чыталі ў верасні 1941 года. Але гэта было потым. А спачатку падзеі развіваліся так.

У чэрвені 1941 г. 153-я стралковая дывізія перадыслацыравалася ў Заходнюю асобую ваенную акругу і ўвайшла ў склад 62-га стралковага корпуса 22-й арміі.

На світанні 22 чэрвеня першыя эшалоны дывізіі прыбылі ў Віцебск. Часці размясціліся ў Мазурынскіх лагерах на беразе Заходняй Дзвіны. У гэты дзень фашысцкая Германія напала на Савецкі Саюз.

Вайна! Гэтае суровае слова пранеслася па дывізіі. Прайшлі мітынгі. Словы заявы ўрада: «Наша справа справядлівая. Вораг будзе разбіты. Перамога будзе за намі!», — сталі баявым дэвізам асабовага саставу. Часці дывізіі спешна займаліся баявой падрыхтоўкай і папаўняліся асабовым саставам, узбраеннем, баявой тэхнікай.

У канцы чэрвеня 153-я стралковая дывізія атрымала задачу падрыхтаваць абарону на рубяжы 35 км на паўднёвы захад ад Віцебска.

Па рашэнню камандзіра дывізіі палкоўніка Н. А. Гагена часці абсталявалі ў інжынерных адносінах паласу абароны з пярэднім краем Гнядзілава, усходні бераг возера Саро, Ходцы, Парнева, Машканы, Александрова даўжынёй па фронту ў 42 км. Пярэдні край паласы перадполля праходзіў уздоўж чыгункі Лепель — Орша на ўчастку Жасцянка — Камарова, другі рубеж — на лініі Паташня — Углы — Канева — возера Багданаўскае — Сянно — Каменка. Сюды былі накіраваны стралковыя батальёны: у Вярхоўе — 1-ы стралковы батальён 666-га палка, у Сянно — 1-ы стралковы батальён 505-га палка.

Батальён, які знаходзіўся ў Сянне, знішчыў разведку праціўніка, якая спрабавала пранікнуць у прамежкі паміж апорнымі пунктамі абароны перадполля.

6 ліпеня ў перадполлі працягваліся баі з разведкай і перадавымі падраздзяленнямі ворага. Перадавыя атрады папаўняліся пераходзячымі праз лінію фронту падраздзяленнямі розных часцей, у тым ліку 50-й стралковай дывізіі. Сумесна з батальёнам 505-га палка ў Сянне дзейнічалі нешматлікія падраздзяленні 18-й танкавай дывізіі.

Перад фронтам 435-га і 505-га палкоў дзейнічала наша разведка. Чатыры варожыя самалёты былі збіты на працягу дня. У гэты ж дзень дывізія панесла першыя страты. Загінулі дзесяткі маладых людзей. Параненыя поля бою не пакідалі. Перадавы атрад у Сянне вёў бой з праціўнікам, які спрабаваў акружыць горад. Танкі і пяхота вымушаны былі адступіць.

У напрамку Сянна быў высунуты 3-і стралковы батальён 435-га палка, які сумесна з 3-м батальёнам 36-га танкавага палка 18-й дывізіі разграміў калону мотапяхоты праціўніка і завязаў бой з іншымі ягонымі мотачасцямі. Батальён замацаваўся ў вёсцы Войлева, скоўваючы дзеянні танкаў і мотапяхоты гітлераўцаў.

9 ліпеня ў 14 гадзін праціўнік, наносячы ўдар на ўчастку Сянно—Ходцы, атакаваў абарончыя пазіцыі 666-га і 435-га стралковых палкоў, адначасова падвяргаючы ўдарам з паветра пазіцыі 505-га стралковага палка ў раёне Станькі—Платоны. Групоўкі праціўніка развівалі наступленне на ўсходнім напрамку, атакавалі нашы войскі на паўднёвым захадзе ад Віцебска.

153-я стралковая дывізія, скаваная агнём ворага з фронту, аказалася пад пагрозай акружэння. У 21 гадзіну штаб дывізіі атрымаў загад камандуючага 20-й арміяй генерал-маёра П. А. Курачкіна аб адыходзе дывізіі ў ноч з 10 на 11 ліпеня на ўсходні бераг ракі Лучоса.

435-ы і 505-ы палкі пакінулі па аднаму батальёну для сумесных дзеянняў з часцямі 7-га механізаванага корпуса ў раёнах Астроўна і саўгаса "Ходцы". Асноўныя сілы дывізіі да раніцы 11 ліпеня выйшлі на ўсходні бераг Лучосы, маючы задачу прыкрыць віцебска-смаленскі напрамак.

Затым дывізія ваявала пад Лёзнам, трапіла ў акружэнне. Нямецкае радыё 14 ліпеня нават паспяшалася перадаць паведамленне аб разгроме 153-й савецкай дывізіі. Але мы з баямі вырваліся з акружэння, вялі баі на Дняпры.

За арганізаванасць, мужнасць, адвагу, праяўленыя ў баях, Ваенны Савет Заходняга фронту аб'явіў асабоваму саставу дывізіі падзяку. Дзесяткі байцоў, камандзіраў і палітработнікаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Ганаровае найменне "гвардзейскай" дывізія заваявала ў цяжкіх умовах барацьбы з захопнікамі.

Імя яго невядома

Гэта адбылося летам 1941 г., калі нямецка-фашысцкія захопнікі напалі на нашу Радзіму. Прыкладна ў першай палавіне ліпеня ў нашым раёне, недалёка ад вёскі Ходцы, быў падбіты савецкі самалёт, які ўпаў на беразе возера Сосна, каля вёскі Соіна. Адзін з лётчыкаў загінуў разам з самалётам, двое ж паспелі выкінуцца на парашутах. Адзін з іх прызямліўся ў вёсцы Рубежніца, якая была захоплена немцамі. Убачыўшы гэта, наш лётчык забег у адзін з дамоў, які аказаўся пустым, і, зачыніўшыся ў ім, пачаў адстрэльвацца. Гітлераўцы хацелі захапіць яго жывым, але на ўсе іх спробы лётчык адказваў трапнымі выстраламі, якія каштавалі жыцця некалькім фашыстам. Тады гітлераўцы рашылі падпаліць дом.

Але адважны лётчык не разгубіўся. Ён закідаў нямецкіх ваяк паленнямі дроў, якія былі складзены ў сенцах, і, скарыстаўшы іх часовае замяшанне, кінуўся з палаючай хаты ў бок лесу.

Цяжка змагацца аднаму патрыёту, у якога застаўся толькі адзін патрон, супраць некалькіх дзесяткаў узброеных салдат, якія на матацыклах кінуліся яму наперарэз. Калі, здавалася, фашысты вось-вось схопяць героя, ён апошнім патронам выстраліў сабе ў грудзі і ўпаў мёртвым...

Мужнага савецкага лётчыка потым пахавалі жыхары вёскі Рубежніца, а пасля вайны ён быў перазахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Ходцы. Імя гэтага лётчыка так і засталося невядомым. Другі лётчык спусціўся на парашуце на нейтральную паласу каля вёскі Мелехава.

А. Бабкоў.

Мой першы бой — ён цяжкі самы

З успамінаў генерал-маёра А. М. Быкава

Калі я слухаю песню М. Ножкіна са словамі ў прыпеве «Последний бой — он трудный самый», у маёй свядомасці паўстаюць эпізоды апошніх баёў нашай танкавай гвардыі ва Усходняй Памераніі. Пакінуў глыбокі след у памяці і мой першы бой у ваколіцах беларускага горада Сянно. Менавіта ён, гэты самы першы бой, быў для мяне і самым цяжкім.

А было гэта так. Пасля цяжкіх бітваў першых дзён вайны войскі Заходняга фронту ў пачатку ліпеня 1941 года аказалі праціўніку рашучае супраціўленне на рубяжы Дзісна—

Віцебск — Орша. Характэрнай асаблівасцю разгарнуўшыхся тут баёў з'явілася нанясенне па войсках праціўніка магутных контрударaў з боку стратэгічных рэзерваў савецкага Галоўнага камандавання.

У адным з гэтых контрударaў, ажыццёўленых войскамі 20-й арміі генерал-лейтэнанта П. А. Курачкіна, удзельнічаў і наш 34-ы танкавы полк. Ён знаходзіўся ў першым эшалоне баявых парадкаў 17-й танкавай дывізіі, якая ўваходзіла ў склад 5-га механізаванага корпуса, прыбыўшага на Заходні фронт у апошнія дні чэрвеня з Забайкальскай ваеннай акругі.

Я быў тады камандзірам танка Т-26. Складанай была абстаноўка на нашым участку фронту. Вораг працягваў прасоўвацца ўперад, авалодаў Лепелем. Тут перад нашымі войскамі была пастаўлена задача: знішчыць групоўку ворага, якая прарвалася, авалодаць Лепелем, аднавіць зыходнае становішча. Рыхтуючы нас да першых у нашым жыцці баявых дзеянняў, камандзіры і палітработнікі гаварылі, што галоўныя сілы Чырвонай Арміі яшчэ не ўступілі ў бой, што яны толькі падыходзяць да фронту і таму нашым войскам трэба спыніць і адкінуць ворага, даць камандаванню магчымасць выйграць час для разгортвання і ўводу ў бой свежых сіл.

Наш 34-ы танкавы полк, якім камандаваў маёр Е. А. Юрэвіч, выгрузіўшыся на поўнач ад Оршы і зрабіўшы марш, да вечара 5 ліпеня сканцэнтраваўся ў вызначаным раёне. Вялікі сасновы бор, здавалася, надзейна схаваў нас і нашу тэхніку.

У той памятны для нас вечар, напярэдадні бою, нашы начальнікі — камандзір роты старшы лейтэнант Грыневіч, яго намеснік па палітчасткі лейтэнант Стаўбун, камандзір узвода лейтэнант Дземчанка знаходзіліся з намі. Зноў і зноў тлумачылі нам баявую задачу, нагадвалі, як дзейнічаць пры сустрэчы з танкамі, што рабіць для падаўлення процітанкавых гармат, як паступаць у выпадку, калі танк загарэўся або атрымаў прабоіну ад варожага снарада... Словам, рыхтавалі нас да бою і практычна, і маральна-псіхалагічна.

Упэўненыя ў поспеху, раніцай 6 ліпеня мы зняліся з зыходных пазіцый і пайшлі ўперад. Шырокае калгаснае поле з няўбраным жытам стала месцам нашага баявога хрышчэння. Спачатку нас сустрэлі нямецкія мотастралковыя падраздзяленні. Мы збілі іх і прайшлі на 3—5 км уперад. Аднак радавацца было рана. Хутка немцы кінулі супраць нас танкі. Іх было многа, вельмі многа... Браніраваныя машыны з чорнымі крыжамі на бартах грозна рухаліся на нас. Цяжка перадаць той душэўны стан, які ахапіў у той момант нас, маладых, неабстраляных яшчэ байцоў, з кожнай хвілінай бой узмацняўся. Сталі гарэць адзін за другім і варожыя і нашы танкі. Аб дзеяннях нашага экіпажа магу сказаць так: стараліся, як патрабуе прысяга, не шкадуючы самога жыцця. Не памятаю, колькі мы зрабілі па танках выстралаў, пакуль яны былі ад нас на значнай адлегласці...

Але вось чую голас механіка-вадзіцеля Сашы Хітрова: «Глядзі, камандзір, прэ гад прама на нас!..» Не паспеў я даць каманду, а вежавы стралок Коля Жукаў ужо выцягваў з боеўкладкі бранябойныя і пасылаў іх у казённік. Бяру нямецкі танк у прорэзь прыцэла. Націскаю на спуск. Гулка аддаўся ў вежы выстрал, здрыганулася, адкацілася ў нішу гармата... А танк ідзе. Промах! Зноў зараджаем. Зноў націскаю на спуск. І... голас Хітрова: «Парадак! Закруціўся на адной гусеніцы. Палі яшчэ!» Адразу пасылаем чарговы снарад ужо па ахопленым полымем танку. Думаю, хтосьці дапамог нам. Магчыма, памочнік камандзіра ўзвода старшы сяржант Міхаіл Малашонак, які знаходзіўся ў баявых парадках справа ад нас.

Сярод асабовага саставу нашай роты старшы сяржант Малашонак яшчэ да вайны, у час нашай службы ў Забайкаллі, вылучаўся сваім майстэрствам і смеласцю. А ў тым першым для нас баі з нямецкімі танкістамі ён пацвердзіў свае якасці ўмелага і мужнага воіна. У тым баі ён падбіў нямецкі танк. Але і яго машына загарэлася. Мужны камандзір захаваў вытрымку і здолеў, здавалася б, у бязвыхадным становішчы эвакуіраваць з загарэўшагася танка праз люк увесь састаў экіпажа жывым.

Страты ў тым баі ў нас былі вялікія. Аднак і немцам дасталося. Да ночы напружанне бою спала. Карыстаючыся зацішшам, нашы камандзіры (ды і мы пад іх кіраўніцтвам) прымалі меры па аднаўленні баяздольнасці падраздзяленняў. Камандзір роты, старшы лейтэнант Грыневіч і палітрук лейтэнант Стаўбун сабралі камандзіраў узводаў і экіпажаў танкаў. Былі падведзены вынікі нашага першага бою, адзначаны лепшыя байцы. У іх ліку, акрамя М. Малашонка, А. Хітрова, Н. Жукава, былі названы таксама механік-вадзіцель Пётр Мельнікаў, камандзір танка Віктар Бокаў, вежавы стралок Васіль Глазаў.

У памяці ад першага бою ў мяне засталіся не толькі мужныя паводзіны маіх баявых сяброў, але і след першага ранення, якое, на шчасце, аказалася не цяжкім. Павязку на галаве я насіў як сведчанне пройдзенага намі першага выпрабавання агнём.

Наш першы бой, натуральна, стаў значнай падзеяй у франтавой біяграфіі кожнага байца і камандзіра нашай роты. Аднак у маштабе і на фоне буйнейшай танкавай бітвы ён быў усяго толькі эпізодам. Мы тады яшчэ не ведалі, што з'яўляемся ўдзельнікамі адной з першых сустрэчных танкавых бітваў пачатковага перыяду вайны. І толькі пазней ужо, у час вучобы ў ваеннай акадэміі, я даведаўся аб тым, што гітлераўскае камандаванне кінула тады на нашым напрамку праз гарады Лепель і Сянно магутную браніраваную армаду, якая па сіле намнога пераўзыходзіла два нашых корпусы, узброеныя лёгкімі танкамі.

І ўсё ж у ходзе контрудару нашы войскі нанеслі праціўніку значныя страты і прасунуліся на 30—40 км у бок Лепеля. Аднак каля Віцебска наша наступленне сустрэла моцнае супраціўленне праціўніка. Наш 5-ы механізаваны корпус, аказаўшыся амаль у поўным акружэнні, на працягу двух сутак вёў цяжкія абарончыя баі. Праціўнік прадпрыняў 15 атак у дзень, але разграміць акружаныя войскі яму не ўдалося. Я добра памятаю гэтыя гарачыя, у прамым і пераносным сэнсе, ліпеньскія дні 1941-га.

І тым не менш, тыя першыя баі і нашы першыя, хоць і нязначныя эпізадычныя перамогі ў іх, былі для нас вялікай справай. Яны ўсялялі ўпэўненасць і надзею на перамогу ў той страшнай вайне.

Да апошняга снарада

З успамінаў А. Асяльедкі

З узлеску Казюцінскай пушчы, які ляжыць на пагорках, віднеецца Сянно, занятае ўчора фашыстамі. Наша група з семнаццаці лёгкіх танкаў 35-га палка 6 ліпеня 1941 года прайшла за вёскамі Казлоўка і Папоўка да Нямойтаўскай шашы і, падавіўшы варожую артылерыю каля Рахальскага лесу, выбіла гітлераўцаў з горада. Адначасова з танкамі ў Сянно ўвайшла наша пяхота.

Тут, у горадзе, мы захапілі першых палонных фашыстаў. Паўсюль віднеліся сляды іх рабункаў і марадзёрства. Валяліся раскіданыя кніжкі каля магазінаў, біты посуд, дзіцячыя цацкі.

Адступіўшыя варожыя падраздзяленні акапаліся на вышынях каля вёскі Горкі. Наша пяхота замацоўвалася на заходняй ускраіне горада. Раніцай наступнага дня фашысты спрабавалі атакаваць нас. Згубіўшы некалькі танкаў, адыйшлі.

У сінім ліпеньскім небе няспынна кружаць варожыя самалёты. Каб ратаваць свае машыны ад бомбавых удараў з паветра, мы часта мяняем баявыя пазіцыі. Нейкі час стаім пад сосамі могільніка, потым хаваемся ў засені ліпавай алеі гарадскога парку. Кароткае зацішша сведчыць, што хутка бой загрыміць з новай сілай.

І ён загрымеў, гэты бой, на досвітку 8-га ліпеня. Сканцэнтраваўшы пад Сянном буйныя сілы, гітлераўцы абыйшлі горад з поўдня, з трох напрамкаў разгарнулі наступленне. Падтрымліваючы пяхоту, якая мужна абараняла занятыя рубяжы, пайшлі ў контратаку танкі.

У складзе экіпажа агнямётнага танка я быў механікам-вадзіцелем. Акрамя ўстаноўкі для выкідвання вогненнага струменю, на ўзбраенні баявой машыны меліся два кулямёты. Узначальваў экіпаж былы трактарыст з-пад Барысава Іван Бокій, радыстам быў яго зямляк Ілля Дзялендзік.

Нашаму экіпажу было загадана тэрмінова заняць раскрыжаванне дарог, што выходзяць з горада на Віцебск і Багушэўск, да падыходу машын, узброеных гарматамі, утрымліваць яго.

Аб'ехаўшы каля возера круты спуск з Касцельнай гары, мы перасяклі ручай, калі камандзір заўважыў на яўрэйскім могільніку тры фашысцкія танкі, якія прарваліся сюды. Але гітлераўцы першымі ўбачылі нас і адкрылі агонь. Бранябойны снарад трапіў у бак з вогнесумессю, забіты наш радыст Ілля Дзялендзік. З камандзірам выскокваем з машыны і скочваемся ў ручай. Чорны дым з языкамі барвовага полымя ўзвіўся над нашым танкам.

Бяжым да камандзіра роты, які назіраў за боем з пагорка Чырвонай Слабады.

— Садзіцеся ў мой танк,— загадвае ротны.— Контратакуйце фашыстаў!

Аднак у камандзірскай машыны перабіта гусеніца. Рамантаваць часу няма. Уладкаваўшыся ля гарматы, лаўлю ў прыцэл фашысцкі танк. Вось між сосен паказваецца бартавая браня танка з намаляваным на ёй чорным крыжам. Не памятаю ўжо, колькі зрабіў стрэлаў, але хутка слуп агню ўзвіўся над фашыстам.

Па алешніку, што падступаў да могільніка ад поля, прабіраецца яшчэ адна варожая ма-

шына. Першым жа стрэлам па ёй удалося перабіць гусеніцу. Гітлераўцы імкнуцца выправіць пашкоджанне, аднак чарговыя снарады нашай гарматы падпалілі і гэты танк.

Фашысты насядаюць з усіх бакоў. Ад возера з-за павароту, на раскрыжаванне абараняемых намі дарог, выскоквае матацыкліст. Чарга вежавага кулямёта — і матацыкл з седаком звальваецца ў канаву.

Некалькі хвілін перадышкі. Вежавы стралок мяняе перагарэлы ствол кулямёта. У мяне — апошні снарад з танкавага боекамплекта.

На дарозе зноў варожая машына. Гэта бронетранспарцёр з мотапяхотай. Заўважыўшы наш танк, гітлераўцы гарохам пасыпаліся на зямлю. Задняй хадой бронетранспарцёр спрабаваў адыйсці, аднак не паспеў. Апошні наш снарад дагнаў яго.

У гарачцы бою мы не заўважылі гітлераўцаў, якія з буйнакаліберным кулямётам падпаўзлі да нашага танка. Град куль забарабаніў па брані. Пабялелі разбітыя трыплексы глядзельных шчылін. Пад машынай узарвалася звязка гранат. Танк ахутаны едкім дымам, няма чым дыхаць. Механік Руснак выскоквае з люка і хаваецца за бліжэйшымі дамамі.

Выкаціўшыся з танка, я некалькімі скокамі дасягнуў сцяны дома, што стаяў справа. За мной кінуўся і вежавы стралок. Не дабегшы да дома, ён быццам бы спатыкнуўся і ўпаў тварам у дарожны пыл. Калі я падцягнуў башнёра да сцяны, ён быў мёртвы.

Спадзеючыся ўбачыць Руснака, выглядваю з-за дома. На вуліцы зялёныя мундзіры фашыстаў. Рашыў перабегчы ў горад. Там віднеліся шчыліны акопаў. І ў гэты момант рэзкі боль апёк цела. Павярнуўшыся інстынктыўна, заўважыў стрэліўшага ў мяне гітлераўца.

Над верхняй часткай жывата кроў афарбавала гімнасцёрку. Толькі цяпер зразумеў, што паранены. Зрабіўшы некалькі крокаў, упаў на высыпаную ў нейкім двары бульбу.

Выцягнуў мяне адтуль чырвонаармеец. А назаўтра разам з іншымі параненымі абаронцамі горада я ўжо ляжаў у мясцовай бальніцы, дзе сенненскія медыкі-патрыёты вярталі нас да жыцця, для новых баёў з акупантамі.

У баях за Сянно

З першага дня вайны Таіса Міхайлаўна Леанцюк атрымлівала ад мужа пісьмы, поўныя веры ў перамогу. «...Еду на фронт,— пісаў старшы лейтэнант Аляксандр Цярэнцьевіч Леанцюк,— Ты не бядуй, у цябе на руках сын. Выхавай яго мужчынам. А мая мэта — нанесці жорсткі ўдар па ворагу... Маё жыццё патрэбна Радзіме...»

ПАРАЖЫНСКІ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1924, партызан брыгады «За Савецкую Беларусь», 11.5.1944 прапаў без вестак.

ПАРАЖЫНСКІ Фядот Сяргеевіч.

ПІШЧАКОВА Марыя Мінаўна.

ПІШЧАКОВА Сільвестра Міхайлаўна.

ФАНАБЕР Герасім Апанасавіч.

ХІЖАНКОВА Фядора Васільеўна.

ХІЖАНКОЎ Дзяніс Рыгоравіч.

ХІЖАНКОЎ Уладзімір Дзянісавіч.

ЧАРКОЎСКІ Мікалай Восіпавіч, н. у 1920, партызан, загінуў 2.5.1944, пахаваны ў в. Кублічы Ушацкага р-на.

ВЁСКА МАШЧОНЫ

БАРСУКОЎ Аляксандр Емяльянавіч, н. у 1924, партызан, загінуў 20.5.1944, пахаваны ў в. Селішча былога Пліскага р-на Віцебскай вобл.

ПАЛЯШЧУК Рыгор Цімафеевіч, н. у 1923, партызан, 3.5.1944 прапаў без вестак.

ВЁСКА МЕЛЕХАВА

БАРДЗЮКОЎ Канстанцін Апанасавіч, н. у 1922, партызан, 2.5.1944 прапаў без вестак.

БАРДЗЮКОЎ Уладзімір Барысавіч, н. у 1926, партызан брыгады «Аляксея», 4.5.1944 прапаў без вестак.

СОЧНЕЎ Мікалай Лаўрэнавіч, н. у 1922, партызан брыгады «Аляксея», прапаў без вестак.

ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

ДАДЗЕРКІН Міхаіл Апанасавіч, партызан, прапаў без вестак.

КАВАЛЕЎСКІ Пётр Пятровіч, н. у 1916, партызан, прапаў без вестак.

КУЗНЯЦОЎ Уладзімір Рыгоравіч, партызан брыгады «Аляксея», 3.5.1944 прапаў без вестак.

ЛЕБЕДЗЕЎ Іван Еўдакімавіч, партызан, 3.5.1944 прапаў без вестак.

ПАРАЖЫНСКІ Максім Савельевіч, партызан, прапаў без вестак.

ПЛЮШЧЫКАЎ Васіль Цітавіч, партызан, 21.6.1944 прапаў без вестак ля возера Палік.

ВЁСКА ПАРШНІ

САЛАЎЁЎ Ілля Ісакавіч, н. у 1924, партызан, загінуў 5.2.1944, пахаваны ў в. Пуханаўка былога Ветрынскага р-на.

ВЁСКА ПЕРАКОПАВА

ЦВЯТКОЎ Міхаіл Ціханавіч, партызан, загінуў 23.1.1944.

ВЁСКА САВУШЫ

ШАРЭНДА Андрэй Мікітавіч, у 1941 забіты за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА СЫЧЫКІ

БАРАШКАЎ Іван Пятровіч, н. у 1924, партызан, 8.6.1944 прапаў без вестак.

ШАЛЯНОК Нічыпар Арцёмавіч, н. у 1900, партызан, загінуў 13.6.1944.

ЮРЭВІЧ Васіль Герасімавіч, н. у 1902, партызан, 4.5.1944 прапаў без вестак.

ВЁСКА ХОДЦЫ

БЕРАШЭВІЧ Марыя Іосіфаўна, партызанка, прапала без вестак.

КОХАН Аляксандр Ігнатавіч, партызан брыгады «За Савецкую Беларусь», 11.5.1944 прапаў без вестак.

МАРГАЎЦОЎ Анатоль Нічыпаравіч, н. у 1925, партызан, загінуў 2.5.1944, пахаваны ў в. Слабада Ушацкага р-на.

МАСКАЛЬКОВА Галіна Дзмітрыеўна, партызанка 2-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінула ў жніўні 1943.

ПАГУЛЯЙ Іван Міхайлавіч, расстраляны за сувязь з партызанамі.

СТУКАНАЎ Іван Нічыпаравіч, н. у 1912, партызан брыгады «За Савецкую Беларусь», 16.5.1944 прапаў без вестак.

ВЁСКА ШАЦЯНІ

МАКОЎСКІ Уладзімір Дзянісавіч, н. у 1916, партызан, 2.5.1944 прапаў без вестак.

Загінуўшыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. воіны і партызаны — ураджэнцы Сенненшчыны, месца нараджэння якіх дакладна не ўстаноўлена

АЛЕКСІНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРЭЙКА Аляксандр Аляксандравіч, рад., 612-ы сп, прапаў без вестак.

БАТУРА Ягор Еўдакімавіч, партызан 2-й брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

БАТУРА Якаў Пятровіч, партызан 2-й брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

ВОЛКАВА Фаіна Пятроўна, партызанка, прапала без вестак.

ДВАРАК Мікалай Дзмітрыевіч, рад., 716-ы сп, загінуў 25.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ЖУРАЎ Сцяпан Прохаравіч, партызан, прапаў без вестак.

ЗАЛЕЦКІ Віктар Іванавіч, рад., 613-ы сп, загінуў 29.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

КУЧАРАЎ Мікалай Сцяпанавіч, партызан брыгады Кірылава, 22.6.1944 прапаў без вестак ля возера Палік.

МАХАНЬКОЎ Апанас Васільевіч, рад., 9.11.1944 загінуў у фашысцкім палоне.

МАХАНЬКОЎ Васіль Піліпавіч, партызан 2-й брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

МАХАНЬКОЎ Мікалай Фёдаравіч, партызан брыгады Кірылава, 22.6.1944 прапаў без вестак ля возера Палік.

МУРАШКА Захар Ігнатавіч, рад., 716-ы сп, загінуў 26.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ПАДАБЕД Мікалай Емяльянавіч, партызан, прапаў без вестак.

СІНЯКОЎ Іван Дзянісавіч, рад., 711-ы сп, загінуў 27.7.1944.

ХАДАНОВІЧ Васіль Андрэевіч, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у в. Расходнае.

ХАЦЯШОЎ Іван Фёдаравіч, рад., 711-ы сп, прапаў без вестак.

ШУЛЬГІН Аркадзь Цімафеевіч, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

БАГДАНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАНАЎ Вячаслаў Пятровіч, партызан Багушэўскай брыгады, загінуў 25.6.1944.

БАРАНОК Ягор Ціханавіч, н. у 1926, 1119-ы сп, загінуў 8.3.1945, пахаваны на хутары Марты (Латвія).

БЕЛЬСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1926, рад., 875-ы сп, 14.9.1944 прапаў без вестак.

БРОЎКА Іван Міхайлавіч, рад., у верасні 1944 прапаў без вестак.

БРОЎКА Лаўрэн Трафімавіч, н. у 1918, рад., у снежні 1944 прапаў без вестак.

ВАСІЛЕЎСКІ Вячаслаў Пятровіч, н. у 1918, сярж., загінуў 30.3.1943, пахаваны ў в. Петраслаўская Ленінградскай вобл.

ВОРАНАЎ Іван Пятровіч, н. у 1916, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

ГАРБАЧОЎ Міхаіл Мікітавіч, рад., у студзені 1944 прапаў без вестак.

ЖУКАЎ Пётр Пятровіч, партызан, загінуў у 1943 у Чашніцкім р-не.

ЗЕЛЯНЯ Палікарп Мікітавіч, н. у 1902, рад., у верасні 1944 прапаў без вестак.

КУРС Піліп Пахомавіч, рад., у верасні 1944 прапаў без вестак.

КУРС Ягор Аляксеевіч, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

МАКАРСКІ Георгій Францавіч, н. у 1919, лейт., у кастрычніку 1941 прапаў без вестак.

МУРАШКЕВІЧ Даніла Парфенавіч, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

СІНКЕВІЧ Мікалай Васільевіч, н. у 1923, рад., 2.9.1943 памёр ад ран, пахаваны ў г. Ровенькі Луганскай вобл. (Украіна).

СІНЯКОЎ Васіль Данілавіч, н. у 1910, рад., у чэрвені 1944 прапаў без вестак.

ТЫЛЕЦ Васіль Іванавіч, рад., 700-ы сп, прапаў без вестак.

УНУКЕВІЧ Васіль Васільевіч, партызан Сенненскай брыгады, загінуў 8.6.1944.

ХАДЫКА Лявон Пятровіч, партызан, прапаў без вестак.

ХАДЫКА Міхаіл Максімавіч, партызан Сенненскай брыгады, загінуў 5.5.1944.

ЦЕЛЕПНЕЎ Міхаіл Мікалаевіч, партызан, расстраляны ў Літве.

ЮРЭВІЧ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1902, рад., прапаў без вестак.

ЯРОМЕНКА Дзмітрый Андрэевіч, рад., 226-ы сп, загінуў, пахаваны ў с. Раманішкі (Літва).

КАКОЎЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАГДАНАВА Ніна Іванаўна, н. у 1926, партызанка, 5.6.1944 прапала без вестак.

БАРЫШОЎ Каліграт Андрэевіч, н. у 1910, рад., у кастрычніку 1944 прапаў без вестак.

БАТОЎСКІ Рыгор Фаміч, н. у 1912, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

БУРАКОЎ Іван Паўлавіч, н. у 1919, рад., загінуў 7.10.1944.

ВАСІЛЕЎСКІ Станіслаў Антонавіч, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, расстраляны ў лістападзе 1942.

ГРУЗДЗІНСКІ Андрэй Дзям'янавіч, н. у 1900, рад., 5.9.1943 прапаў без вестак.

ЖЫЛКО Міхаіл Міхайлавіч, рад., у маі 1944 прапаў без вестак.

ЖЭЖАР Аляксей Яфімавіч, н. у 1921, лейт., прапаў без вестак.

ЗАЦЮПА Іван Сцяпанавіч, н. у 1921, партызан, загінуў 20.4.1943, пахаваны ў в. Барок.

КАТКОЎСКІ Уладзімір Антонавіч, рад., загінуў 17.3.1944.

КУЛІК Павел Ігнатавіч, н. у 1922, мал. лейт., 304-ы знішчальны Чаркасаўскі дывізіён, 12.6.1944 прапаў без вестак.

КУШЛЕВІЧ Сямён Аляксандравіч, н. у 1918, рад., у снежні 1941 прапаў без вестак.

МЕРНІЦА Васіль Іванавіч, н. у 1919, рад., 437-ы ап, загінуў 22.7.1941.

МІРАНОВІЧ Ягор Фёдаравіч, гв. рад., 169-ы гв сп, 19.9.1944 памёр ад ран, пахаваны ў в. Будвеце (Літва).

МУРАШКЕВІЧ Якаў Цімафеевіч, партызан Багушэўскай брыгады, загінуў.

ПАРОЎ Ілля Панцялеевіч, н. у 1925, рад., у ліпені 1944 прапаў без вестак.

ПАСКАННЫ Кузьма Міхайлавіч, н. у 1914, сярж., 237-ы гаўбічны ап, загінуў 6.10.1941.

ПАШЧАНКА Ахрэм Архіпавіч, н. у 1918, старш., загінуў 24.12.1942, пахаваны ў с. Папоў Валгаградскай вобл.

ПЯТРОЎ Панцялей Андрэевіч, н. у 1899, рад., загінуў 24.4.1942.

РУСАКОЎ Герман Агеевіч, н. у 1896, рад., 25.8.1942 прапаў без вестак.

РЫПІНСКІ Міхаіл Макаравіч, рад., у маі 1943 памёр ад хваробы.

САДОЎНІЧ Кандрат Сцяпанавіч, н. у 1914, рад., загінуў 1.10.1942.

СОКАЛАЎ Іван Мікітавіч, н. у 1918, рад., 20.9.1944 памёр ад ран, пахаваны ў с. Нейманшас Іонішкскага р-на (Літва).

СУДЗІЛОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1905, мал. лейт., 345-ы сп, у 1943 прапаў без вестак.

ХОДАС Васіль Іванавіч, мал. сярж., 61-ы сапёрны батальён 44-й сд, загінуў 14.9.1941.

ЦЫВА Лявон Аксёнавіч, н. у 1897, рад., 21.10.1942 прапаў без вестак.

ЦЯРЭНЯ Аляксей Іванавіч, н. у 1917, партызан 2-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 20.6.1944.

ШАНДРЫК Аляксандр Анісімавіч, ст. сярж., 1.4.1944 прапаў без вестак.

ШАРАЙ Міхаіл Аўдзеевіч, рад., 233-і сп, загінуў 22.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

ШАРАЙ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1923, рад., 7.12.1944 прапаў без вестак.

ШАРАЙ Цярэнцій Дзмітрыевіч, н. у 1898, рад., 23.2.1942 прапаў без вестак.

ШАСТАКОЎ Мікалай Андрэевіч, рад., 25.10.1944 памёр ад ран.

НЯМОЙТАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЬХОЎСКІ Аляксей Міхайлавіч, партызан, прапаў без вестак.

БАКУНОЎ Максім Якаўлевіч, н. у 1915, рад., у снежні 1944 прапаў без вестак.

БАРАНОЎСКІ Віктар Сцяпанавіч, партызан, 22.6.1944 прапаў без вестак.

БЯРОЗКА Леанід Міхайлавіч, партызан брыгады Кірылава, 22.6.1944 прапаў без вестак.

ВОРАНАЎ Яфрэм Пятровіч, партызан Сенненскай брыгады, прапаў без вестак.

ДУБАВЕЦ Андрэй Раманавіч, кап., 87-ы ап, загінуў 20.4.1945.

КАРЖЭЎСКІ Дзям'ян Лук'янавіч, н. у 1902, рад., 13.8.1945 памёр ад ран, пахаваны ў г. Катовіцэ (Польшча).

КРАСОЎСКІ Адам Вячаслававіч, н. у 1917, рад., 785-ы сп 144-й Віленскай сд, 4.11.1944 памёр ад ран ва Усходняй Прусіі.

МАХАНЬКОЎ Віктар Данілавіч, рад., 716-ы сп, загінуў 18.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

МЯЛЕШКА Павел Макаравіч, партызан, прапаў без вестак.

НЯФЁДАЎ Іван Мікітавіч, н. у 1893, гв. рад., 49-ы гв. сп 16-й гв. сд, загінуў 29.6.1944, пахаваны ў в. Мяцеліца Алітускага р-на (Літва).

ПАД'ЕЛЕЦ Андрэй Федасеевіч, н. у 1902, рад., 294-ы сп 184-й Духаўшчынскай сд, загінуў 6.8.1944, пахаваны ў в. Блюбы (Літва).

РАДКЕВІЧ Рыгор Іосіфавіч, н. у 1914, партызан, загінуў 21.6.1944.

РАКАЎ Міхаіл Лявонавіч, рад., 79-ы сп, загінуў 4.3.1945, пахаваны ля н. п. Вельбрандава (Польшча).

СЦЕШЫН Аляксей Васільевіч, н. у 1902, партызан, 21.6.1944 прапаў без вестак.

ХРАМЧАНКА Дзмітрый Іванавіч, н. у 1926, партызан, 21.6.1944 прапаў без вестак.

ЦІХАНАЎ Кузьма Пятровіч, н. у 1916, рад., 1229-ы сп 371-й сд, загінуў 13.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ЮРАНАЎ Васіль Кірылавіч, н. у 1915, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

ЮРАНАЎ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1910, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

РАСНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНІКЕВІЧ Аляксей Патапавіч, н. у 1922, партызан, загінуў 5.5.1944, пахаваны ў в. Кублічы Ушацкага р-на.

АНІКЕВІЧ Канстанцін Рыгоравіч, партызан брыгады Кірылава, 26.6.1944 прапаў без вестак.

ВІЗНЕР Аляксей Генадзьевіч, рад., прапаў без вестак.

ЕРМАШКЕВІЧ Міхаіл Ілліч, партызан, прапаў без вестак.

ЗЯЛЮДКІН Антон Ягоравіч, рад., 16.4.1945 памёр ад ран ва Усходняй Прусіі.

КАЗЛОЎ Сцяпан Іванавіч, рад., загінуў 9.9.1943, пахаваны на хутары Бугальна Славянска-га р-на Данецкай вобл. (Украіна).

КАВАЛЕЎСКІ Марк Трафімавіч, мал. паліт-рук, загінуў у ліпені 1941.

КАРАЛЁЎ Пётр Венядзіктавіч, партызан, пра-паў без вестак.

МАСАЛОВІЧ Казімір Фёдаравіч, яфр., загі-нуў 1.10.1944, пахаваны ў г. Добеле (Латвія).

СТУПАНЕВІЧ Пётр Аляксеевіч, рад., 184-я сд, прапаў без вестак.

СЦЕФАНОВІЧ Сцяпан Аляксандравіч, парты-зан, прапаў без вестак.

ХАДЫКА Дзмітрый Сідаравіч, партызан, пра-паў без вестак.

СТУДЗЁНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАЛАБЕШКА Фёдар Дарафеевіч, рад., 326-ы сп, загінуў 30.1.1945, пахаваны на хутары Фельшэн-цёбёржон (Венгрыя).

БЯРОЗКА Ігнат Апанасавіч, партызан брыга-ды Кірылава, 22.6.1944 прапаў без вестак ля возера Палік.

БЯРОЗКА Пётр Апанасавіч, партызан брыга-ды Кірылава, 22.6.1944 прапаў без вестак ля возера Палік.

ВЫСОЦКІ Канстанцін Нічыпаравіч, рад., 854-ы сп, загінуў 10.8.1944, пахаваны ў в. Кароля (Літва).

ГАРНАК Міхаіл Іванавіч, партызан, прапаў без вестак.

ГРАЧЫХА Фёдар Усцінавіч, ст. сярж., 10.2.1945 памёр ад ран, пахаваны на мысе Дзіжгранз-да (Латвія).

ІВАНОЎ Васіль Андрэевіч, рад., загінуў 25.6.1941.

КАМЛЮК Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1912, мал. лейт., у кастрычніку 1941 прапаў без вестак.

КАНАШЭНКА Кірыла Паўлавіч, партызан, за-гінуў.

КАПТУР Уладзімір Рыгоравіч, рад., 238-ы сп, загінуў 21.8.1944, пахаваны ў г. Бауска (Латвія).

КРУПСКІ Фёдар Міхайлавіч, сярж., 1217-ы сп, загінуў 20.10.1944, пахаваны ў г. Нікель Мур-манскай вобл. (Расія).

ЛАНІН Мікалай Аляксандравіч, н. у 1925, рад., загінуў 11.7.1944.

ЛЯЎКО Аляксандр Верамеевіч, рад., загінуў.

ЛЯЎКО Дзмітрый Макаравіч, партызан, загі-нуў 23.4.1944 ля в. Леснікова.

МУРАШКА Рыгор Андрэевіч, рад., у верасні 1944 прапаў без вестак.

МЯЦЕЛІЦА Максім Фаміч, рад., 491-ы сп, за-гінуў 3.9.1944, пахаваны ў в. Шарвінікішкі (Літва).

ПАГАРЭЛЬСКІ Андрэй Сцяпанавіч, партызан, загінуў.

ПАГУЛЯЙ Васіль Якаўлевіч, партызан, загі-нуў 9.4.1944 пры абароне в. Пурплева.

ПРЫСТАЎКА Іван Ягоравіч, рад., 357-ы сп, загінуў 24.1.1945, пахаваны ў г. Прыекуле (Латвія).

РАБУШКА Захар Пракопавіч, н. у 1908, рад., 18.10.1944 памёр ад ран, пахаваны ў Літве.

РАБУШКА Іван Майсеевіч, 785-ы сп, 27.10.1944 прапаў без вестак.

САЛАЎЁЎ Мікалай Сцяпанавіч, рад., 716-ы сп, загінуў 18.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

САПЯЖЫНСКІ Канстанцін Фёдаравіч, рад., 291-ы сп, загінуў.

СКАКУН Пётр Антонавіч, н. у 1916, рад., 20.7.1941 прапаў без вестак.

ФЯДОРЧАНКА Аляксей Васільевіч, парты-зан 2-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 8.6.1944.

ШАСТОЎСКІ Андрэй Ермалаевіч, гв. рад., 143-ы гв. сп, загінуў 13.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

ШАФРАНСКІ Піліп Сямёнавіч, н. у 1922, партызан брыгады Кірылава, 14.3.1944 забіты ў в. Ракіты.

ШЫТОЎСКІ Андрэй Ермалаевіч, гв. рад., 143-і гв. сп, загінуў.

УЛЬЯНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУДНІК Аляксей Рыгоравіч, н. у 1913, гв. яфр., 30.4.1944 прапаў без вестак.

ЗЕЛЯНЯ Васіль Фёдаравіч, н. у 1925, рад., 144-я армейская штрафная рота 159-й сд, загінуў 1.9.1944, пахаваны ў в. Валі (Літва).

ЖЫЦЕЛЬЗЕЙФ Товель Вульфавіч, н. у 1909, кап., загінуў 23.9.1944.

КОРСАК Яўген Кірылавіч, н. у 1922, сярж., 1229-ы сп 371-й сд, загінуў 5.12.1941.

КУХТА Іван Гаўрылавіч, н. у 1902, рад., 4-я артдывізія прарыву рэзерва Галоўнага камандаван-ня, загінуў 24.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

МІЗАЎЦОЎ Сямён Аркадзьевіч, партызан, за-гінуў.

МЫШЛЯНКОЎ Іван Мікітавіч, н. у 1913, партызан, у маі 1944 прапаў без вестак.

НОВІКАВА Вольга Іванаўна, н. у 1927, парты-занка, 13.7.1944 памерла ад ран, пахавана ў Оршы.

ПАНУШКІН Міхаіл Якаўлевіч, партызан бры-гады Кірылава, 22.6.1944 прапаў без вестак.

СКАКУН Яфім Андрэевіч, н. у 1908, сярж., 18-ы асобны матарызаваны агнямётны батальён, за-гінуў 22.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

ФІТКЕВІЧ Аляксандр Захаравіч, н. у 1909, гв. ст. лейт., 88-я гв. сд 28-га гв. ск, загінуў 13.5.1944, пахаваны ў с. Пугачэнь Цірaспальскага р-на (Мал-дова).

РАЙДУДЗІН Цімафей Арцёмавіч, памочнік камандзіра партызанскага атрада па разведцы Сен-ненскай брыгады, 16.6.1944 прапаў без вестак.

ШАРПІЛА Ягор Міхайлавіч, н. у 1913, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

ХОДЦАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АБЛЯЦОЎ Іван Васільевіч, ст. лейт., загінуў у 1941.

АНІКІЕВІЧ Уладзімір Антонавіч, партызан 2-й брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак.

АНЦІПЕНКА Павел Антонавіч, н. у 1906, рад., 6.8.1944 прапаў без вестак.

АСТРОЎСКІ Сямён Мікітавіч, партызан Сенненскай брыгады, прапаў без вестак.

БАРАНОК Андрэй Мікітавіч, рад., 711-ы сп, прапаў без вестак.

БЫКАЎ Якаў Цімафеевіч, н. у 1905, рад., загінуў 28.12.1942, пахаваны ў г. Шчыгры Смаленскай вобл. (Расія).

ВАЛЮШКІН Фёдар Андрэевіч, партызан Сенненскай брыгады, у чэрвені 1944 прапаў без вестак.

ВЯРБІЦКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1925, рад., 732-і сп 235-й сд, 15.9.1944 памёр ад ран, пахаваны ў н. п. Губены Баўскага р-на (Латвія).

ГАНЧАРОЎ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1926, рад., 42-я сд, загінуў 19.3.1945.

ДАДЗЕРКІН Фёдар Сямёнавіч, гв. сярж., прапаў без вестак.

КАВАЛЕЎСКІ Аляксей Андрэевіч, мал. сярж., 1.3.1945 памёр ад ран ва Усходняй Прусіі.

КАВАЛЕЎСКІ Ціхан Карнеевіч, рад., 13.9.1944 памёр ад ран, пахаваны ў в. Ліплаты (Літва).

КАЗЛОЎ Пётр Ерамеевіч, н. у 1897, 29.8.1943 прапаў без вестак.

КІШКОВІЧ Мікалай Міхайлавіч, рад., 233-і сп, загінуў 9.10.1944, пахаваны ў в. Бэдзе (Літва).

КОРАНЕЎ Леанід Аляксандравіч, рад., прапаў без вестак.

КУЗНЯЦОЎ Пётр Яўсеевіч, н. у 1925, партызан брыгады «Аляксея», 2.5.1943 прапаў без вестак.

ЛАТЫШАЎ Георгій Іваиавіч, н. у 1921, рад., 104-ы ап, загінуў 6.8.1941.

МАРГАЎЦОЎ Іван Васільевіч, н. у 1919, 96-ы ап 90-й сд, 26.6.1941 прапаў без вестак ля н. п. Іаніш-кі-Елгава (Латвія).

МАСКАЛЬКОЎ Канстанцін Мікітавіч, рад., у жніўні 1941 прапаў без вестак.

ПЯТРОЎСКІ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1922, партызан, загінуў 27.10.1943, пахаваны ў в. Шахаўшчына Бешанковіцкага р-на.

СІДОРСКІ Якаў Самсонавіч, н. у 1911, ст. лейт., 167-ы знішчальны процітанкавы дывізіён 65-й сд, загінуў 15.2.1942, пахаваны ў саўгасе «Чырвоны ўдарнік» Наўгародскага р-на Наўгародскай вобл. (Расія).

СІМАНОВІЧ Іван Піліпавіч, рад., 11.10.1941 памёр ад ран, пахаваны на Піскароўскіх могілках у Санкт-Пецярбургу.

СІМАНОВІЧ Марк Якаўлевіч, н. у 1900, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

СМІРНОЎ Лазар Зіноўевіч, н. у 1919, рад., у чэрвені 1941 прапаў без вестак.

СМІРНОЎ Філат Зіноўевіч, н. у 1915, у чэрвені 1941 прапаў без вестак.

СОКАЛАЎ Мацвей Сідаравіч, н. у 1920, яфр., загінуў 4.8.1943, пахаваны ў в. Арбузава Ленінградскай вобл.

СОЧНЕЎ Іван Андрэевіч, рад., загінуў 18.10.1944.

СОЧНЕЎ Якаў Цімафеевіч, н. у 1913, рад., загінуў 28.1.1942, пахаваны ў Санкт-Пецярбургу (Расія).

ХАЦЕЦКІ Міхаіл Анісімавіч, н. у 1924, партызан, 6.5.1944 прапаў без вестак.

ЦІХАНАЎ Сяргей Данілавіч, н. у 1920, рад., 3-і паветрана-дэсантны корпус, загінуў 8.8.1941, пахаваны ў в. Чырвоны Тракцір Кіеўскага р-на (Украіна).

ШАРАПАВІЧ Іван Гаўрылавіч, н. у 1915, кап., батарэя 120-мм мінамётаў 173-га сп 90-й сд, загінуў 4.8.1943, пахаваны на левым беразе р. Нява, за 2 км на захад ад 8-й ГЭС Ленінградскай вобл. (Расія).

ШАРЭНДА Анатоль Ягоравіч, н. у 1919, лейт., 262-гі сп 87-й сд, загінуў 27.11.1943, пахаваны ў с. Падкалінаўка Нікалаеўскай вобл. (Украіна).

ШАРЭНДА Міхаіл Маркіянавіч, н. у 1921, рад., у жніўні 1944 прапаў без вестак.

ШАФРАНСКІ Цімафей Васільевіч, рад., у кастрычніку 1944 прапаў без вестак.

Спісы склаў І. Е. Лазука.

Мірныя жыхары яўрэйскай нацыянальнасці — ураджэнцы Сенненшчыны, расстраляныя фашыстамі 30 і 31 снежня 1941 г. і пахаваныя каля вёскі Казлоўка

Нямецка-фашысцкія акупанты, захапіўшы Сянно, адразу выдзелілі яўрэйскае насельніцтва, пазначыўшы яго жоўтымі адзнакамі на адзенні. Гета было створана ў хуткім часе на тагачаснай вуліцы Варашылава (Галынка). Яўрэяў ахоўвалі паліцаі, ганялі іх на работу. Па сведчанні відавочцаў, над яўрэямі жорстка здзекваліся, марылі голадам, збівалі. 16.10.1941 г. фашысты расстралялі 12 чалавек, імёны якіх невядомы, 27 лістапада — яшчэ 7 чалавек. 31.12.1941 г. усіх яўрэяў з гета пагналі ў напрамку в. Казлоўка, дзе, недалёка ад Сянно, былі загадзя выкапаны ямы. Вязняў гета жывымі заганялі ў гэтыя ямы, прымушалі класціся і стралялі. Расстрэл працягваўся з 8 да 14 гадзін. Забівалі ўсіх: і дарослых, і дзяцей, мужчын, жанчын, старых. Потым фашысты разгарнулі паляванне на дзяцей ад змешаных шлюбаў. Іх таксама забівалі. У акце Надзвычайнай камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў адзначана, што там, ля вёскі Казлоўка, было знішчана 965 яўрэяў.

У Багушэўску, як сцвярджаюць факты, выкладзеныя ў акце Надзвычайнай камісіі, гета не было. 5.9.1941 г. немцы па-зверску забілі 70 яўрэяў і рускіх. Сярод расстраляных было 10 немаўлят.

Вечная памяць бязвінным ахвярам!

АГАРОДНІК (Вульф, Белта).

АЎСІШЧАР (Вульф, Ента, іх сын Абрам, яго жонка і 2-е дзяцей).

АЎСІШЧАР (Гірша, Фрыма, Арон).

БАМШІТЭЙН (Залман, Мерка, 5 дзяцей).

БАМШТЭЙН (Хана, Ніна, 3-е дзяцей).

БАРБІН (Ісак, яго жонка Сара, 2 сыны, 2-е дачкі).

БЕЛЕНЬКІЯ (Абрам Ісакавіч, яго жонка Марыя, дзеці Сіва, Ацка, Элі).

БЕРШЫК (Арон, Ада, Ерухім).

БРАЎДО (Міхаіл, 2-е дзяцей).

БРАЎДО (сям'я з 6-і чалавек).

БУЛІСКІЯ (Золман, Бася).

БУЯНСКІЯ (Абель Абрамавіч, Буня, Люся, Роха, Хірмет).

БЯЛЯНСКІЯ (Ерухім, Бэля, Талька, Роха, Люся, Міша).

ВІГДЭРГАУЗ (Вульф, Файна і яшчэ 1 чалавек).

ВІКМАН (Залман, яго жонка і дачка).

ВІРБУТ Тамара.

ВЯРЦІНСКІ Мікалай.

ГАКМАШ (Абрам Хаймавіч, Фіра Залманаўна).

ГАКМАШ (Вульф, Бася, Берта, Лейзер).

ГАКМАШ (Зіська, Іпаліт).

ГАЛКІН (Давід, Сіма).

ГАЛКІН (Давід, Рыва).

ГАЛКІН Дзмітрый.

ГАМАНЬКОЎ Антон.

ГАРАДЗЕЦКІ Анісім.

ГОЛДЗЕНАЎ (Рыва і яшчэ 4 чалавекі).

ГРЫМСАН (Барыс, Ева і 3-е іх дзяцей).

ГУАСІШАР (Мясока, Мая).

ГУРВІЧ (бацька, маці, сын, дачка).

ГУРЭВІЧ (Нука, Фаня, Іда).

ГУРЭВІЧ (Мэндэль, Сіві).

ГУРЭВІЧ (Люба, Іза, Эля, Оля).

ГУРЭВІЧ Пейцік.

ГУТЭРМАН (Зяма, Роза).

ГУТЭРМАН (Залман, яго жонка, дачка, 2 жанчыны, дзіця).

ДАПІНЫ (Самуіл, Ніна, іх сын і дачка, Эль, Сара).

ДВОРКІНЫ (Нохан, Рыва, Мендаль, Роза).

ДОБКІНЫ (муж, жонка, іх сын).

ДРАБІНЫ (Гірша, Ася).

ДРАБКІНЫ (Казімір, яго жонка).

ДРАБКІНЫ (Хаім, Рыва, Ісак, Кізір).

ЗАБРОЎСКІЯ (муж, жонка, дачка).

ЗАЙЦАВЫ (Іосіф, жонка).

ЗАХАРАВЫ (Янка, Ніна).

ЗАЙЧЫК (Соня і яшчэ 3 чалавекі).

ЗЕЙФ (бацька, маці і 3-е дзяцей).

ЗІНГЕР (маці і дачка).

ЗІНГЕР (Якаў, яго жонка і 3 сыны).

КАГАН (Мера, Фейга-Брайна).

КАМІНСКІЯ (Ізраіль, Роза).

КАМІНСКІЯ (Лейвік, Дзіна, Саламон, Лея-Гінза).

КАМІНСКІЯ (Самуіл, Дора).

КАПУТКІНЫ (Нэма, яго жонка, дочка і сын).

КАПУТКІНЫ (Лейба, Лея, Хоця, Шлёма).

КАРКЛІНЫ (4 чалавекі).

КІСІНЫ (муж і жонка).

КЛАЗ (Куся, Міхаіл, Бася Міхайлаўна, Бася Рыхораўна).

КЛАЗ (Сендзер, яго жонка і 2-е ўнукаў).

КЛЕПЕР (муж і жонка).

КОКІНЫ (Рахіль, Валера, Рая, Мая).

КОРКІНА Хая.

КРЭНДЗЕЛЕВЫ (муж, жонка, 2 сыны).

КРЭНДЗЕЛЕВЫ (Ерухта, Сара).

КУРСОН (Віктар, яго сын Элік, дачка Аля).

ЛАЗІНСКІЯ (Вета, Ноя).

ЛЕВІНЫ (Хален, Зіся, Зося).

ЛЕВІНЫ (Іцка, Проха).

ЛЕВІНЫ (Сіма, Мендзель).

ЛЕВІНЫ (Ірухман, Берта).

ЛЕВІТ (Ізраіль, Соф'я, Міша, Маня).

ЛЕЙТМАН (Анкермер, Герыя, Эстра, Мейлік, Лёва).

ЛЕЙТМАН (Элька, Зіся).

ЛЕПНЕР (Лія-Раша і 3-е дзяцей).

ЛЕЎНІ (Вайха, Броха).

ЛІЎШЫЦ (Шэпа, Зера, Ніна, Залман, Шэра і яшчэ 3 чалавекі).

ЛІЎШЫЦ (Эстэр, Гірша).

ЛІЎШЫЦ (Залман, Рахіль).

ЛІЎШЫЦ (Хацкель, Марголя-Эстэр).

ЛОЗІНСОМ (Арон, Хая, Берта, Барыс).

ЛУКОМСКІ (Евель, Сара).

МАРЦІНОЎСКАЯ Фрыда.

МАТЛІНЫ (Броха, Халман, Залман).

МЕЛЬЦЫНЫ (Давід Заўлеевіч, Сцера, Міша, Айзік, Марыя і яшчэ 10 чалавек).

МЕЛЬЦЫНЫ (Давід Майсеевіч, Шэра, Нана).

МЕЛЬЦЫНЫ (Майсей, жонка, дачка).

МЕЛЬЦЫНЫ (Мейлах, жонка, Айзік, сын, дачка).

МЕРСАН (Сімон, Клара, Давід, Іван, дзіця).

МЕРКІЛЫ (Лідзія і яшчэ 2 чалавекі).

МШУРА (Цыва, Фрыда, Ліза, Грыша, Іда, Броня, Міша).

НІДЭРГАЎХ (бацька, маці, сын).

НІСХІЗАЎ Залман.

НІШЫМБАЎМ (Вульф, Сара, Мэндэль, Хая, Сіма).

НОВІКАВА Рахіль.

ПАЙКІН Хірмат.

ПАТАШОВЫ (Вульф, Ніся, дзеці — Цыпа, Геня, Бася, Гіта, Сора).

ПАТАШОВЫ (Ной, Поля).

ПРАКАПОВІЧ (Залман, Роза, Моўша).

ПУСТЫНСКІЯ (Ітка, Рыва).

ШШЫГОЦКІЯ (маці і сын).
РАЗБУШ (Зэлік Хаймавіч, Ханя).
РАКАЎ Савелій Пятровіч.
РУДЗЕР (Навум з жонкай і дачкой Соняй).
РЫЖЫК Рыгор.
РЫШЫК (Зема, Сара, Бася, Люба).
РЫШЫК (Соя, Бася, Факіль, Жэня, Міша).
СВЕЧКІНЫ (Хаім, Бася).
СВОЙСКІЯ (Самуіл, яго жонка Люба, дочкі Вера і Надзя, сын Барыс).
СЕНЕНЫ (Міхаіл, Роза, дачка).
СІРОТКІНЫ (Хаім, Роза, іх сын).
СКАПА Уладзімір.
СКОБЛА Роза.
СОН (бацька, маці, 3-е дзяцей, Роза).
СТОПАК (Хаім, Рыва, Люба).
ТАШЫГЕР (Ізраіль, Іда).
ТРАЙПІНЫ (Залман, яго жонка і 2-е дзяцей).
ТАСШІЧАРЫ (Янкель, Голда).
ФАЛЬЦЕНСОН (Ізраіль, Рухіма).
ФРАНСШГЕНЬ (Еранім, Роза, Бэла).
ФРЫДМАН (Іярол, Бася).
ФРЫДМАН (Лейба, Лея, Цыпа).
ФРЫДМАН (Леў, яго жонка і дачка).
ФРЭЙЗЕНГЕР Поля.
ХАЙХА (Хая, Залман).
ХАЎКІНЫ (Ева, яе дзеці Барыс, Ася).
ХАЦКІНЫ (Барыс, Ева, Фіра).
ХЕЙФЕЦ (Давыд, яго жонка і 2 дачкі).
ХЕЙФЕЦ (Файтл, Вульф, Арон, Віхна).
ХЕЙФЕЦ (Цодзік, яго жонка, 2-е дзяцей, Роза).
ХЕЙФЕЦ (Самсон, Гінда, Муся, Лейба, Мата, Рыва, Гена, Эйра).
ХЕЙФЕЦ (Леся, Айзерон Лазаравіч, Сіма Айзераўна, Екта, Вільсон).
ХЕЙФЕЦ (Іва, Фаля, Броня, Дзіма, Абрам).
ХЕЙФЕЦ (Саламон, Гінда, Моця).
ХРАНУНАВЫ (Залман, Гінда).
ХРАПУНОВЫ (Ісак, Рахіль).
ХРЫДМАШ (Залман, Хея, Соня).
ЧАРНЯК (Арон і яго 2 дачкі).
ШМІТ (Берл, яго жонка і 4 дзяцей).
ШМІТ (Пінхас, яго жонка і 2-е дзяцей).
ШМІТ (Ханкель і яго жонка).
ШМІТ (Рыма, Сара, Іда).
ШМІТ (Пілька, Зэльда).
ШМІТ Нотэ.
ШУБКА Максім Аляксандравіч.
ШУЛЬМАН (Кіра, Дзіма, яе сын і 2 дачкі).
ШУЛЬМАН (Іярон, Сіма).
ЭСКІНЫ (Хайка, Іцка).
ЭЦІНЫ (3 чалавекі).
ЯЗГУР (Шама, Фата).
Імёны астатніх невядомы.

Жыхары яўрэйскай нацыянальнасці, загінуўшыя ў Багушэўску

Па ўспамінах Р. Б. Сарочкінай

БЛЯХМАН (жанчына).
ШКОЛЬНІК (мужчына).
СЯМ'Я ГЛЕЗІНЫХ (Гіта, яе сястра, брат, муж).

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ГАДЫ АДНАЎЛЕННЯ І СТВАРЭННЯ

На працягу многіх вякоў Сенненшчына не ведала такога спусташэння, як у гады Вялікай Айчыннай вайны. Нямецка-фашысцкія акупанты разрабавалі калгасы, саўгасы, МТС, спалілі больш за 3 тыс. дамоў. У былым Сенненскім раёне яны знішчылі або вывезлі ў Германію 114 трактароў, 9 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, 6 тыс. коней. У былым Багушэўскім раёне кошт маёмасці, адабранай або знішчанай нямецка-фашысцкімі акупантамі, складаў у цэнах 1944 г. 580 447 620 рублёў. Было за вайну знішчана 1707 жылых будынкаў, 2549 падворных пабудоў, страчана шмат хатняй жывёлы, у тым ліку 576 коней, 3428 цялят, 1694 свінні, 6579 авечак, 43993 галавы хатняй птушкі, 1102 пчоласям'і. Агульныя страты, прычыненыя народнай гаспадарцы цяперашняга раёна, склалі больш за 918,1 млн рублёў. Амаль кожная сям'я панесла людскія страты.

Здавалася, пройдуць многія дзесяцігоддзі, перш чым на гэтай, знявечанай фашысцкімі варварамі, зямлі адродзіцца жыццё. Але людзі вярталіся ў родныя мясціны, каб аднавіць спаленыя дамы, вытворчыя памяшканні, школы.

Вялікую дапамогу пацярпеламу раёну аказала дзяржава. З многіх куткоў Савецкага Саюза на чыгуначныя станцыі Багушэўская і Бурбін пачалі прыбываць вагоны з харчаваннем, будаўнічымі матэрыяламі, абсталяваннем, сельскагаспадарчай тэхнікай, насеннем. Толькі ў Падворыцкі сельсавет з далёкай Башкірыі паступіла 30 коней і 12 кароў. А ўсяго за 1945—1946 гг. у калгасы раёна паступіла 1089 коней, 2117 галоў буйной рагатай жывёлы, больш за 4 тыс. цэнтнераў насення, 20 трактароў, 13 аўтамашын.

Паступова на Сенненшчыне пачало адраджацца жыццё. У грудах металу, абломках баявых машын механізатары знаходзілі дэталі і збіралі першыя трактары. У прыстасаваных памяшканнях адкрываліся школы, клубы і магазіны. Узорвалася і засявалася ператвораная ў залежы за час вайны зямля.

У 1946 г. пасяўныя плошчы збожжавых культур у раёне складалі 76 працэнтаў даваеннага ўзроўню, а 15 калгасаў асвоілі амаль 16 тыс. гектараў мяккага ворыва, а таксама адноўлены 161 ферма буйной рагатай жывёлы, 160 авечкагадоўчых і 9 конегадоўчых ферм. За два гады ў раёне пабудавана 1080 жылых дамоў.

Гэта былі першыя перамогі, і людзі радаваліся ім, бо даваліся яны нялёгка.

Вось лаканічныя паведамленні, надрукаваныя ў раённай газеце "Бальшавіцкая трыбуна". "Да 30-й гадавіны Вялікага Кастрычніка рабочыя цагельнага завода абавязаліся выканаць гадавы вытворчы план. Звыш задання яны рашылі выпусціць 50 тысяч штук цаглін."

"Пачаліся падрыхтоўчыя работы па будаўніцтву электрастанцыі, якая будзе даваць электраэнергію радыёвузлу і пошце. Магутнасць радыёвузла павялічыцца, што дасць магчымасць дадаткова радыёфікаваць тры калгасы."

"У дзве змены 160 дзяцей горада Сянно і раёна будуць адпачываць на аздараў-

ленчай пляцоўцы, з 20 чэрвеня яна пачне работу. Забеспячэнне дзяцей — за кошт дзяржавы. У першую чаргу будуць адпачываць дзеці-сіроты."

Кожны поспех, няхай па сённяшніх мерках нязначны, закладваўся ў падмурак той перамогі, якую атрымалі працоўныя раёна ў першыя пасляваенныя гады.

На Сенненшчыне былі адноўлены 2 льнозаводы, 2 спіртзаводы, дрэваапрацоўчы камбінат, маслазавод, лесапункт, прамкамбінат, усе калгасы і саўгасы.

У тыя гады ў раёне славіўся прыгарадны калгас "Шлях сацыялізму", які ўзначальваў вопытны камандзір сельскагаспадарчай вытворчасці Б. Грынявецкі. Калі ў 1947 г. хлебаробы сабралі з гектара 9,5 цэнтнера збожжа, то ў 1948 г. ужо 11,5, а ў 1949 — 12,5 цэнтнера. Майстрамі высокіх ураджаяў зарэкамендавалі сябе аграном Я. Шэйнін, брыгадзіры М. Лазарэвіч і А. Занько. Калгас дасягнуў значных поспехаў і ў развіцці жывёлагадоўлі.

Буйной па тым часе гаспадаркай быў калгас "Чырвоны пуцілавец". У 1949 г. ён прадаў дзяржаве 147 т зерня. Гэта было вялікім поспехам.

Пераадольвалі пасляваенныя цяжкасці і рабочыя саўгаса "Полымя". Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых у 1948 г. склала 13,6 цэнтнера з гектара. У параўнанні з 1946 г. валавы збор зерня павялічыўся на 850 цэнтнераў. Надой малака ад адной каровы склаў 2578 кг, амаль удвая больш, чым у 1946 годзе. Больш чым па тры тысячы кілаграмаў малака надойвалі ў год перадавыя даяркі Алена Нізаўцова, Ульяна Падалінская, Матруна Зайцава. У 1948 г. саўгас паставіў дзяржаве 1710 цэнтнераў малака і 208 цэнтнераў мяса. Давалі прадукцыю цагельны і вапняковы заводы, працавалі лесапільня, млын. Рабочыя за кароткі тэрмін пабудавалі электрастанцыю, радыёвузел на 350 кропак, клуб са стацыянарнай кінаўстаноўкай, дзіцячыя яслі, лазню. Да 1948 г. было адноўлена больш за 1 тыс. кв. м жылля.

Самаддана працавалі на палях калгасаў і саўгасаў механізатары. Трактарыст Сенненскай МТС Рыгор Маркевіч 31.7.1949 г. рапартаваў аб выкананні гадавога плана. Праз некалькі дзён такога ж поспеху дабіліся трактарысты Першамайскай МТС Леанід Краўчанка, Андрэй Міклушоў, Мікалаї Пакатовіч, Ягор Няфёдаў.

За дасягнутыя поспехі ў аднаўленні і развіцці народнай гаспадаркі і ў сувязі з 30-й гадавінай БССР былі ўзнагароджаны: ордэнам Леніна — першы сакратар райкома партыі К. П. Бажанок, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — старшыня райвыканкома М. В. Гавядка, ордэнам "Знак Пашаны" сакратар райкома партыі А. Е. Кірыленкаў, загадчык раённага аддзела сельскай гаспадаркі Д. І. Гаўрылаў, урач Сенненскай бальніцы А. С. Мікульскі, намеснік старшыні райвыканкома П. Р. Мікалаенка. Медалём "За працоўную доблесць" былі адзначаны аграном раённага аддзела сельскай гаспадаркі М. І. Берашэвіч, старшыня калгаса "Індустрыя" А. П. Вярбіцкі, медалём "За працоўную адзнаку" — конюх калгаса "Ударнік" П. В. Жыткоў і майстар швейнай арцелі "Перамога" Л. І. Трапава.

Пасля вераснёўскага (1953 г.) Пленума ЦК КПСС у калгасы і саўгасы раёна былі накіраваны дзесяткі спецыялістаў, многія з іх сталі кіраўнікамі гаспадарак. Значны ўклад ва ўмацаванне эканомікі калгасаў унеслі старшыні-трыццаціцысячнікі камуністы І. М. Астроўскі, М. І. Берашэвіч, Я. Я. Зіньковіч, А. П. Карась, В. Н. Маліноўскі, П. А. Раманенка, Я. Ц. Шэйнін і іншыя.

У сувязі з павелічэннем вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі больш інтэнсіўна пачалі развівацца прамысловыя перапрацоўчыя прадпрыемствы: маслазавод, ільнозаводы. Нарошчваліся вытворчыя магутнасці іншых прамысловых прадпрыемстваў, на іх устанаўлівалася новае абсталяванне. Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў і саўгасаў, школ, культурна-асветных, медыцынскіх устаноў.

Пасля ліквідацыі 20 студзеня 1960 г. Багушэўскага раёна значна павялічылася тэрыторыя Сенненскага раёна —

Група кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў раёна пасля адной з нарад у г. Сянно.

Група кіраўнікоў раёна, прадпрыемстваў, калгасаў на раённай сельскагаспадарчай выстаўцы. 1962 г.

Цэнтр г. Сянно ў сярэдзіне 60-х гадоў.

Святкаванне 1 Мая ў г. Сянно. 1962 г.

з 1,2 да 2 тыс. кв. км. Колькасць населеных пунктаў вырасла з 256 да 368. Адной з важнейшых праблем, якія патрабавалі вырашэння, было ўзбуйненне калгасаў і цесна звязанае з ім узбуйненне сельсаветаў, колькасць якіх у выніку значна скарацілася. Пры ўзбуйненні раёна ўлічваліся, несумненна, эканамічныя, геаграфічныя, гістарычныя і іншыя фактары. У склад раёна ўвайшоў буйны населены пункт Багушэўск з шэрагам прамысловых прадпрыемстваў, культурна-асветных і медыцынскіх устаноў, звязаны чыгункай і шашой з Віцебскам і Оршай.

Далейшае развіццё атрымала прамысловасць раёна ў восьмай і дзевятай пяцігодках (1966—1975). У Сянно пабудава-

ны біяхімічны завод — прадпрыемства па вытворчасці лізіну, які прымяняецца для ўзбагачэння кармоў. Здадзены ў эксплуатацыю цагельны завод ў в. Папоўка. З году ў год нарошчвала магутнасці Багушэўская мэблевая фабрыка. За кошт тэхнічнага пераўзбраення вытворчасці, зніжэння сабекошту прадукцыі з прыбыткам працавалі Сенненскі і Багушэўскі льнозаводы, камбінат будматэрыялаў, лясгас, лесапункт Аршанскага леспрамгаса і іншыя. У 1965 г. прамысловыя прадпрыемствы далі прыбытку амаль 150 тыс. рублёў.

У 1971—1975 гг. у райцэнтры былі пабудаваны Дом быту, раённая бальніца, вузел сувязі, аўтобусная станцыя, рэдакцыя і друкарня, школа № 1 на 940 вучнёўскіх месц, інтэрнат міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі. Толькі ў Сянне ўзведзены 94 жылыя дамы. У выніку 486 сем'яў справілі наваселле і 240 сем'яў палепшылі жыллёвыя ўмовы. На карце горада, які займаў 46 кв. км, з'явіліся новыя вуліцы: Юбілейная, Піянерская, Камсамольская, Зялёная.

На большасці прадпрыемстваў нарошчваліся вытворчыя магутнасці, на іх устанаўлівалася высокапрадукцыйнае абсталяванне.

Больш за палову агульнага аб'ёму вытворчасці даў калектыў новага завода масла і сухога абястлушчанага малака. У 1975 г. на заводзе выраблена 1280 т жывёльнага масла, 1445 т цэльнамалочнай прадукцыі, 1278 т сухога перагону і маслёнкі.

Калектыў Сенненскага льнозавода ў 1975 г. выпрацаваў амаль 1500 т ільнавалакна. Тут склаўся стабільны працоўны калектыў. За высокія вытворчыя паказчыкі брыгадзір мяльна-трапальнага агрэгата Я. Ф. Вышынская і сартавальніца доўгага валакна В. А. Акуловіч удастоены ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Карэнныя зрухі адбыліся ў галіне сельскай гаспадаркі. За дзесяць гадоў, да 1975 г., ураджайнасць збожжавых узрасла з 7,2 да 22,4 цэнтнера з гектара, а яго валавая вытворчасць павялічылася амаль утрая. Гэта было дасягнута дзякуючы ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў і саўгасаў, пераводу вытворчасці на рэйкі інтэнсіфікацыі шляхам хімізацыі, комплекснай механізацыі земляробства і жывёлагадоўлі, меліярацыі зямель.

Умовы для сельскагаспадарчай вытворчасці на Сенненшчыне складаныя. Зямельныя ўгоддзі большасці калгасаў і саўгасаў характарызуюцца рэзкай перасечанасцю рэльефу, захмызнячанасцю, пераўвільгатненнем глеб і дробнай контурнасцю палёў. Правядзенне меліяратыўных работ патрабавалася на плошчы ў 67,3 тыс. гектараў.

Сенненскія меліяратары павялі наступ на балоты. Там, дзе зусім нядаўна было камарынае царства, праляглі блакітныя стужкі магістральных каналаў. На былых балотах, парослых хмызняком землях, працаўнікі сяла вырошчваюць збожжа, бульбу, травы і іншыя культуры.

Пытаннямі паляпшэння зямель у раёне займалася Сенненская ПМК-33. У дзевятай пяцігодцы ў раёне асушана больш за 5 тыс. га пераўвільготненых зямель. У ПМК-33 было добра арганізавана спаборніцтва паміж участкамі, брыгадамі, экіпажамі і асобнымі рабочымі. Лепшых паказчыкаў з году ў год дабіваўся ўчастак, які ўзначальвала С. А. Волкава. За самаадданую працу яна была ўдастоена ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. У калектыве выраслі сапраўдныя майстры сваёй справы. Адзін з іх — старшы машыніст экскаватара П. Л. Бабак. За час работы машыністам экскаватара на пракладцы магістральных каналаў ён выняў больш за 2 млн кубаметраў грунту. Працоўныя раёна аказалі П. Л. Бабаку высокае даверʼе, выбраўшы дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Ён удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Вядомы былі ў раёне імёны старшага машыніста экскаватара, кавалера ордэна Леніна і "Знак Пашаны" Р. Я. Лукашэвіча, экскаватаршчыка А. А. Карчэўскага. Машыністы экскаватара В. І. Козічкін і І. І. Юковіч узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

66. Зак. 2999.

Значнае месца ў раёне займалі пасевы бульбы і лёну. Штогод калгасы і саўгасы пастаўлялі дзяржаве 17—18 тыс. т бульбы. Найбольшага збору клубняў дабіліся ў 1974 г. рабочыя племзавода "Полымя". Яны сабралі з кожнага гектара 214 цэнтнераў бульбы, а звяно Ф. С. Зарубіцкага яшчэ больш — 238 цэнтнераў з гектара.

Сенненшчына славілася багатымі ўраджаямі лёну. У лепшыя гады калгасы і саўгасы прадавалі дзяржаве больш за 1 тыс. т ільнасемя і 2400—2800 т ільноваланна. Асабліва плённа працавалі льнаводы калгаса "Сцяг Перамогі". Грашовы даход з гектара пасеваў тут дасягаў 1400—1500 рублёў. Нямала ўмелых майстроў вырошчвання лёну працавала ў калгасах "Праўда", "Перамога сацыялізму".

Павялічваўся выхад прадукцыі ў жывёлагадоўлі. Калі ў 1964 г. валавая вытворчасць мяса складала 3350 т, то ў 1974 г. — 7341 т. Вытворчасць малака ўзрасла адпаведна з 19236 т да 32687 т.

Па вытворчасці малака лепшых паказчыкаў дабіваліся штогод жывёлаводы калгасаў "Сцяг Перамогі", імя Карла Маркса, імя Гастэлы, "Чырвоны пуцілавец". Сапраўдныя фабрыкі мяса дзейнічалі ў калгасах "Кастрычнік", "Бальшавік", "Ледневічы", саўгасах імя Гараўца, "Багушэўскі", "Янова".

У тыя гады расла тэхнічная аснашчанасць калгасаў і саўгасаў. У 1974 г.у раёне налічвалася больш за 1 тыс. трактароў, каля 500 аўтамашын, амаль 300 збожжаўборачных камбайнаў. Толькі ў 1974 г. калгасы і саўгасы атрымалі 133 трактары розных марак, 14 камбайнаў "Ніва" і "Колас", 46 грузавых і спецыяльных машын.

У сувязі з умацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі змяніліся аблічча вёсак, характар сялянскай працы. У вёсцы з'явіліся такія спецыялісты, як інжынер-электрык, прараб, у калгасах і саўгасах працавалі дыпламаваныя спецыялісты сельскай гаспадаркі. Па стану на 1.1.1976 г. ў сельскай гаспадарцы раёна працавала 570 спецыялістаў, з іх 139 чалавек з вышэйшай і 137 — з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй: 163 аграномы, 98 заатэхнікаў, 97 інжынераў-механікаў, 59 эканамістаў.

На Сенненшчыне выраслі сотні перадавікоў і наватараў вытворчасці. За дасягнутыя поспехі ў выкананні планаў восьмай і дзевятай пяцігодак больш за 400 чалавек узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР. Высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы ў 1966 г. было прысвоена даярцы племзавода "Полымя" Е. Д. Сарокінай. Ордэна Леніна ўдастоены трактарыст калгаса імя Ціміразева Д. Ф. Бірулін, даярка племзавода "Полымя" М. В. Печнікава, цялятніца саўгаса імя Гараўца М. П. Сапранкова, свінарка племсаўгаса "Багушэўскі" Е. Е. Казлова, рабочая саўгаса "Янова" Л. Н. Бяляцкая.

Высокіх надояў малака дабіваліся жывёлаводы племзавода "Полымя". Даяркі Л. Д. Плавінская, О. Г. Нікіціна, М. В. Печнікава, Н. І. Дзівас надойвалі штогод па 4200—4300 кг малака ад каровы. Сапраўднымі майстрамі жывёлагадоўлі зарэкамендавалі сябе свінаркі В. Д. Мандрык, Л. Д. Мыслівец з племсаўгаса "Багушэўскі", В. Ф. Ермашкевіч і Г. В. Стук з калгаса "Кастрычнік".

Усяму раёну былі вядомы імёны трактарыста калгаса "Першае мая" В. В. Барышава, камбайнераў саўгаса імя Гараўца І. П. Казлоўскага, калгасаў "Запаветы Ільіча", "Ясная зара" і "Ленінскі шлях" А. П. Шыбекі, В. Г. Курашэвіча, В. Ф. Хлусевіча.

Дзякуючы самаадданай працы людзей з году ў год расла грамадская вытворчасць, якая стварала добрыя ўмовы для ажыццяўлення буйных сацыяльных мерапрыемстваў. Значнае развіццё атрымалі жыллёвае будаўніцтва і добраўпарадкаванне, газіфікацыя, сетка прадпрыемстваў гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва. У дзевятай пяцігодцы насельніцтву раёна прададзена 350 аўтамашын, у тым ліку жыхарам Сянна — 95, больш за 900 матацыклаў і матаролераў, 3544 тэлевізары.

Ад Сенненскага камбіната бытавога абслугоўвання працавала ў вёсках 16 комплексных прыёмных пунктаў. Бытавыя паслугі пастаянна пашыраліся.

Паступальна развіваліся сувязь і радыёвяшчанне. Поўнасцю завершана аўтаматызацыя гарадской і сельскай тэлефоннай сувязі. У раёне працавалі АТС, разлічаныя на 1724 нумары. Усе абаненты горада мелі магчымасць аўтаматычна выйсці на прамую сувязь з Віцебскам і Лепелем. Работнікі міжгародняй тэлефоннай станцыі прама выходзілі на сувязь з гарадамі Савецкага Саюза. Будаваліся новыя і рэканструяваліся старыя радыёлініі. У карыстанні насельніцтва ў той час было каля 12,5 тыс. радыёпрыёмнікаў.

Папаўняўся аўтобусны парк, удасканальваліся дарогі. Транспартныя лініі ад Сянна пралеглі да Віцебска, Оршы і іншых гарадоў. Раённы цэнтр меў паветраныя зносіны з Мінскам, Віцебскам, Чашнікамі.

Да паслуг працоўных раёна была развітая сетка культурна-асветных устаноў: раённы, Багушэўскі гарпасялковы і 9 сельскіх дамоў культуры, 59 клубаў, 94 чырвоныя куткі. Працавалі дзіцячая музычная школа, народны тэатр, 61 бібліятэка. У 1975 г. у харавых, драматычных, танцавальных і музычных гуртках мастацкай самадзейнасці ўдзельнічала больш за 5 тыс. чалавек.

Вялікай папулярнасцю карыстаўся Багушэўскі народны тэатр, якім амаль трыццаць гадоў кіравала вялікі энтузіяст сцэнічнага мастацтва Р. Е. Сарочкіна. Калектыў паставіў дзесяткі спектакляў, у тым ліку "Паўлінку", "Прымакоў" Я. Купалы, "Трыбунал" А. Макаёнка, "А зоры тут ціхія" Б. Васільева.

Далейшае развіццё атрымала народная адукацыя, пашыралася сетка дзіцячых дашкольных устаноў. Рознымі відамі навучання ў раёне было ахоплена больш за 10 тыс. чалавек. Авалодаць асновамі навук, атрымаць сярэднюю адукацыю ім дапамагала армія кваліфікаваных педагогаў. За поспехі ў выхаванні падрастаючага пакалення 11 майстрам педагагічнай справы было прысвоена ганаровае званне заслужанага настаўніка рэспублікі, у тым ліку М. І. Аўраменку, Ф. А. Вярцінскаму, В. І. Пуцееву, З. А. Шмурадка, З. І. Усовіч, А. А. Куліковай, А. Ф. Яроменка і іншым.

З году ў год умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база школ, эфектыўна выкарыстоўваліся на ўроках тэхнічныя сродкі навучання. Шырокае распаўсюджванне атрымала доследная работа на прышкольных участках і ў вучнёўскіх вытворчых брыгадах.

Вялікую дапамогу школам ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы аказвалі прамысловыя прадпрыемствы, калгасы і саўгасы. Дзякуючы гэтаму, многія выпускнікі разам з атэстатамі аб сярэдняй адукацыі атрымлівалі дакумент аб прафесійнай кваліфікацыі. Асабліва папулярнымі сярод вучняў былі прафесіі механізатара і шафёра.

З году ў год паляпшалася медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. У раёне былі пабудаваны абласная туберкулёзная бальніца ў Багушэўску на 650 ложкаў, Сенненская цэнтральная раённая бальніца на 260 месц, Багушэўская лясная аздараўленчая школа, дзе дзеці праходзяць адначасова з навучаннем і курс лячэння. У лячэбных установах раёна працавала больш за 1 тыс. чалавек, 34 з іх узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.

Заслужаны ўрач рэспублікі Ніна Васільеўна Клікунец свой працоўны шлях пачынала наборшчыцай друкарні імя Камінтэрна ў Віцебску. У 1932 г. паступіла ў Мінскі медыцынскі інстытут. У Вялікую Айчынную вайну Ніна Васільеўна была ўрачом партызанскага шпіталя. Яна выратавала ад смерці дзесяткі хворых і раненых. З 1944 г. працавала ў Сянне. Жыхары горада і раёна ведалі Н. В. Клікунец як вопытнага ўрача, чулага, спагадлівага чалавека. Яна неаднаразова выбіралася дэпутатам у мясцовыя органы дзяржаўнай улады.

За гады савецкай улады на Сенненшчыне выраслі дзесяткі камандзіраў прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, дзеячоў навукі і культуры. Шырока вядома ў свеце імя акадэміка-матэматыка У. П. Платонава, які скончыў сярэднюю школу ў Багушэўску. Землякі ўшаноўваюць памяць доктара мастацтвазнаўства прафесара М. С. Кацара і доктара гістарычных навук прафесара А. І. Залескага.

Ураджэнцамі раёна з'яўляюцца знакаміты беларускі паэт А. Вялюгін, вядомы перакладчык М. Гарбачоў. Ім прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларускай ССР.

Сенненшчына здаўна славіцца сваімі багатымі спартыўнымі традыцыямі. Яшчэ на пачатку 1950-х гадоў у склад зборнай каманды рэспублікі ўваходзіў легкаатлет М. Юшчанка. Ён быў чэмпіёнам Беларусі ў бегу на 800 м. Шырока вядома ў Савецкім Саюзе і за яго межамі імя ўраджэнца в. Тухінка алімпійскага чэмпіёна В. Куранцова. На Сенненшчыне пачыналі свой спартыўны шлях майстар спорту міжнароднага класа кідальнік кап'я М. Гаралёў, майстар спорту па класічнай барацьбе П. Кавалеўскі, вядомыя велагоншчыкі М. Царыкава і А. Трыбуль.

На змену ветэранам прыходзіла здольная моладзь. У яе выхаванне многа сіл і старання ўкладваў дырэктар дзіцячаюнацкай спартыўнай школы майстар спорту СССР А. С. Хаменка. На працягу шэрага гадоў каманда сенненскіх лыжнікаў займала першае месца ў абласных спаборніцтвах і паказвала высокія вынікі на спартакіядах рэспублікі.

Працоўныя раёна актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Лепшых з лепшых пасылалі працоўныя сваімі прадстаўнікамі ў органы дзяржаўнай улады. Дэпутатамі Вярхоўнага Савета БССР выбіраліся былы першы сакратар райкома партыі А. М. Жураўкоў і ветэрынарны ўрач, актыўны ўдзельнік партызанскага руху ў раёне М. Ф. Папкоў, станочніца Багушэўскай мэблевай фабрыкі Р. Я. Семянькова і даярка калгаса імя Гастэлы Н. В. Правілава.

Ул. Р. Скапа.

Дакументы сведчаць

ПАСЛЯВАЕННАЯ СЕННЕНШЧЫНА Ў ЛІЧБАХ

Напярэдадні вайны на тэрыторыі раёна было 363 населеныя пункты, 12821 двор, 56 660 жыхароў.

Па стану на 1.1.1946 г. насельніцтва Сенненскага раёна складала 34 343 чалавекі, у тым ліку сельскае насельніцтва — 32 647 (з іх калгаснікаў — 29 433, аднаасобнікаў — 9).

Бюджэт раёна на 1946 г. па расходах — 13 619,2 тыс. рублёў; па ўласных даходах 1563,6 тыс., датацыя з абласнога фонду — 12 055,6 тыс. рублёў, у тым ліку на ахову здароўя — 1547,5 тыс. рублёў, на адукацыю — 4901,3 тыс., упраўленне — 856,4 тыс., укладанні ў народную гаспадарку — 675,8 тыс., новае будаўніцтва — 5392,8 тыс. рублёў. На аднаўленне жылля ў 1946 г. у райцэнтры выдзялялася 100 тыс. рублёў, было асвоена 33 тыс., на капітальны рамонт — 45 тыс., асвоена 6 тыс. рублёў.

Па стану на 1.1.1947 г. у гаспадарках раёна налічвалася: коней — 2487 галоў; буйной рагатай жывёлы — 4400, свіней — 1660 галоў, птушак — 800 штук. Надой малака на адну фуражную карову склаў у 1946 г. 1100 літраў.

Востра стаяла праблема забеспячэння насельніцтва раёна жыллём. У Алексініцкім сельсавеце, напрыклад, да вайны было 648 дамоў, засталося пасля вызвалення 54, пражывала ў зямлянках на 1.5.1947 г. 349 сем'яў.

У Беліцкім сельсавеце да вайны было 434 дамы, застаўся пасля вызвалення 181, пражывала ў зямлянках на 1.5.1947 г. 76 сем'яў.

Па стану на 1.1.1947 г. у раёне 998 сем'яў не мелі ўласнага жылля, 155 жылі ў зямлянках, 509 — у часовым жыллі, 334 сям'і — на падсяленні. За 9 месяцаў 1947 г. з зямлянак у пабудаваныя дамы было пераведзена 67 сем'яў і 8 сем'яў, якія былі на падсяленні. У кожным калгасе былі створаны будаўнічыя брыгады з 6—8 чалавек для будаўніцтва жылля і вытворчых памяшканняў.

Гандлёвая сетка была поўнасцю знішчана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Існуючыя гандлёвыя кропкі знаходзіліся ў прыстасаваных памяшканнях. У г. Сянно ўжо да канца 1944 г. працавала 2 магазіны. Аднавіў работу мучны склад. На станцыі Бурбін узводзіліся гандлёвы, саляны і сыравінны склады. У г. Сянно пашыраўся завод безалкагольных напіткаў.

Харчовымі таварамі ў першую чаргу забяспечваліся дзеці-сіроты, сем'і загінуўшых ваеннаслужачых і дэмабілізаваныя воіны.

Па матэрыялах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

ДАПАМАГЛА АГРАНАМІЧНАЯ НАВУКА

М. І. Берашэвіч.

— Ты, сынок, зямлі трымайся, — наказвала маці, выпраўляючы Міколу ў Лужаснянскі сельскагаспадарчы тэхнікум. — Зямля для вясковага чалавека — карміцелька.

Малады студэнт з усёй энергіяй акунуўся ў вучобу. Непрыкметна прайшлі тры гады. І вось ён, ужо малады аграном з дыпломам, накіроўваецца на працу ў Сенненскі раённы зямельны аддзел. І году не паспеў пабыць на пасадзе агранома, як пачалася Вялікая Айчынная вайна. Мікалай Іванавіч Берашэвіч у гэты цяжкі для краіны час ваяваў у партызанскай брыгадзе Канстанціна Заслонава.

...Незабыўны чэрвень 1944 года. Вызвалена Сенненшчына ад фашысцкіх захопнікаў. З радасцю сустрэлі людзі сваіх вызваліцеляў — воінаў і партызан. Адны з іх пайшлі з фронтам далей, дабіваць ворага, другіх пакінулі аднаўляць разбураную гаспадарку. У ліку апошніх быў і Мікалай Іванавіч.

У 1952 г. Мікалая Іванавіча перавялі на пасаду галоўнага агранома Ходцаўскай МТС, а неўзабаве выбралі старшынёй праўлення калгаса імя Суворава. Новаму кіраўніку трэба было знайсці асноўнае звяно, ухапіўшыся за якое, можна было б пераадолець адставанне, вывесці гаспадарку ў лік лепшых. М. І. Берашэвіч выбраў лён. Плошчы пад ільном былі расшыраны, высявалі яго па лепшых папярэдніках, асаблівая ўвага была звернута на якасць прадукцыі. Ад продажу яе папаўнялася калгасная скарбонка. Калгас стаў набіраць сілу. Расла ўраджайнасць збожжа і бульбы, фермы папаўняліся жывёлай. І вось першая працоўная перамога. За высокія паказчыкі ў вырошчванні льну ВДНГ СССР узнагародзіў калгас Дыпломам другой ступені, а старшыню — сярэбраным медалём і грашовай прэміяй. Медаля ВДНГ удастоены таксама калгаснiцы О. С. Гаравая, К. І. Кішковіч, Л. Ф. Салаўёва.

Штогод калгас збіраў добрыя ўраджаі збожжа, бульбы, ільну, славіўся жывёлагадоўляй. На палях безадказна працавала тэхніка. Узводзіліся новыя грамадскія пабудовы, цэнтральную сядзібу ўпрыгожыў Дом культуры.

За поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі у 1966 годзе старшыня калгаса Мікалай Іванавіч Берашэвіч узнагароджаны ордэнам Леніна. Дапамагла яму агранамічная навука і колішні мацярынскі наказ.

В. Верас.

Ільнавод Настасся САЛАЎЁВА

А. І. Салаўёва.

Адразу ж пасля вайны Настассю Салаўёву прызначылі брыгадзірам у калгасе. Потым даверылі ёй кіраўніцтва звяном па вырошчванні льну.

Старшыня калгаса “Бальшавік” Пётр Мацвеевіч Духовіч гаварыў тады Настассі Ісакаўне, што лён ў гаспадарцы павінен стаць залатым дном.

Больш за 20 год узначальвала яна звяно. Высокія ўраджаі льну забяспечвалі добры прыбытак гаспадарцы.

Н. І. Салаўёва памятае той дзень, калі ў раённым Доме культуры ёй уручалі ордэн Леніна. Атрымала яго за сумленную працу, шчырасць і любоў да зямлі.

І. Лешанюк.

РАЁННАЯ ГАЗЕТА ПАВЕДАМЛЯЛА

21 студзеня 1961 г.

У Сянне на базе арцелі “Новае жыццё” створаны камбінат бытавога абслугоўвання, пры якім працуюць кравецкія і шавецкія майстэрні, фатаграфія, цырульня і майстэрня па рамонту гадзіннікаў.

28 студзеня 1961 г.

Да новых вышынь у працы

25 студзеня ў раённым Доме культуры адбылася нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі раёна, у якой прынялі ўдзел лепшыя даяркі, свінаркі, механізатары, майстры высокіх ураджаяў кукурузы, льну, бульбы, кіраўнікі калгасаў і саўгасаў. На нараду прыбыла дэлегацыя з суседняга Талачынскага раёна.

З дакладам "Аб выніках работы працаўнікоў сельскай гаспадаркі раёна ў 1960 годзе і задачах на трэці год сямігодкі" выступіў старшыня выканкома райсавета дэпутатаў працоўных т. Молахаў І. Ф.

Удзельнікі нарады прынялі зварот да ўсіх калгаснікаў і калгасніц, работніц і работнікаў саўгасаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі раёна.

18 лютага 1961 г.

Іх паважаюць гледачы

Хоць калектыў мастацкай самадзейнасці саўгаса "Ходцы" яшчэ малады, але ён набыў сабе славу. Аб ім ведаюць не толькі ў межах свайго саўгаса. Ходцаўскія спевакі, танцоры, дэкламатары выступалі перад рабочымі саўгасаў "Полымя", "Багушэўскі" і многіх калгасаў.

Самадзейныя артысты наладзілі вечар адпачынку для рабочых брыгады Бесцвіна.

Л. Стальмакоў, рабкор.

1 сакавіка 1961 г.

Электрыфікацыя калгаса

Электрычнасць усё больш уваходзіць у быт калгаснай вёскі. Загарэліся лямпачкі Ільіча ў дамах калгаснікаў сельгасарцелі "Шлях да камунізму" (у вёсках Турава, Міхалполле і Тухінка). Аблягчаецца і праца калгаснікаў: электрыфікаваны жывёлагадоўчыя памяшканні, а ў хуткім часе электрычны ток будзе прыводзіць у рух матор кормадрабілкі. Такарныя станкі ў калгасных майстэрнях, цыркулярка і піларама таксама будуць працаваць на электраэнергіі.

Мяркуецца далейшая электрыфікацыя населеных пунктаў калгаса.

П. Мурашэвіч, селькор.

8 сакавіка 1961 г.

Н. Ц. Кулік — маці-гераіня

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета ад 2 сакавіка 1961 г. работніцы саўгаса "Полымя" Ніне Ціханаўне Кулік, якая нарадзіла і выхавала дзесяць дзяцей, прысвоена ганаровае званне "Маці-гераіня" з уручэннем ордэна "Маці-гераіня" і граматы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

К. Нікалаеў.

26 жніўня 1961 г.

Новы райунівермаг

Жыхары раёна атрымалі выдатны падарунак. Адкрыты новы райунівермаг. У ім ёсць шэсць аддзелаў: гатовага адзення, парфумы, трыкатажу і галантарэі, тканін, дзіцячы, абутку і культтавараў.

27 красавіка 1963 г.

Новая вуліца

Вуліца Садовая ў горадзе Сянно яшчэ новая. Толькі нядаўна тут узведзены індывідуальныя жылыя дамы. Па ёй было раней не толькі праехаць — прайсці месцамі цяжка. Але хутка

яна стала лепшай у горадзе. Палатно яс засыпалі гравіем. Для перавозкі яго выкарыстоўвалі аўтатранспарт "Сельгастэхнікі".

М. Паўлава.

13 чэрвеня 1963 г.

Клуб фотааматараў

Па жаданню фотааматараў раёна ў г. Сянно пры раённым Доме культуры створаны фотаклуб. На арганізацыйным пасяджэнні выбраны савет гэтага клуба.

На занятках будуць абмяркоўвацца фотаздымкі аматараў, лепшыя з іх — прадстаўляцца на раённую фотавыстаўку.

М. Аляксееў.

23 ліпеня 1963 г.

У другой брыгадзе калгаса "Перамога сацыялізма" адкрылі дзіцячыя яслі. Загадвае імі Лукер'я Маркаўна Панкратава. Яшчэ да вайны яна працавала ў дзіцячых установах. Дзіцячыя яслі вызвалілі для грамадскай працы больш двух дзесяткаў калгасніц. Маці вельмі ўдзячныя праўленню сельгасарцелі.

В. Паўлава.

3 жніўня 1963 г.

І зноў сустрэнуцца баявыя сябры

У гады Вялікай Айчыннай вайны Сенненшчына праславілася шырокім размахам партызанскага руху. У бой з акупантамі тут вадзіў атрады народных мсціўцаў легендарны Канстанцін Заслонаў. На тэрыторыі раёна дзейнічалі таксама Смаленскі партызанскі полк, брыгада т. Лявонава і іншыя атрады і злучэнні.

Даўно адгрымелі баі... Стала ўжо традыцыяй у памятных партызанскіх мясцінах штогод праводзіць сустрэчы былых партызан, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны Сенненшчыны — у в. Купаваць Алексініцкага сельсавета — там, дзе загінуў К. С. Заслонаў.

А. Клячын.

29 жніўня 1963 г.

Калгасная радыёгазета

У калгасе імя Дзяржынскага пачала выходзіць радыёгазета. Яна асвятляе жыццё калгаса. Газета расказвае аб перадавіках сельскагаспадарчай вытворчасці, крытыкуе бракаробаў і прагульшчыкаў.

Калгаснікі з задавальненнем слухаюць мясцовыя радыёперадачы.

А. Вялюгін.

Новая школа

Першае верасня заўсёды прыносіць радасны настрой не толькі школьнікам, але і іх бацькам. Для вучняў Азярэцкай васьмігадовай школы гэты дзень сёлета будзе асаблівым. Яны ўпершыню пераступяць парог новага цаглянага будынка школы, які ўзведзены метадам народнай будоўлі.

Актыўны ўдзел у будаўніцтве прымалі таксама вучні разам з настаўнікамі. Яны выконвалі розныя дапаможныя работы.

У прасторных светлых класах заняткі будуць ісці ў адну змену.

Так члены сельгасарцелі праяўляюць клопаты аб сваіх дзецях.

А. Шыбека.

17 верасня 1963 г.

Напярэдадні кастрычніцкіх свят рабочыя саўгаса "Полымя" атрымаюць выдатны падарунак — пачне працаваць сталовая на 50 месц і сельмаг. Пяць прадаўцоў будуць абслугоўваць сельскіх пакупнікоў.

Будуюцца гандлёвыя кропкі і ў іншых месцах раёна. У калгасах імя Будзённага, імя Калініна, у саўгасе "Янова" калгаснікі набудуць у новых магазінах неабходныя ім рэчы, прадукты харчавання.

І. Ярома.

11 лютага 1969 г.

Па выніках работы льнаводаў за 1967 год Сенненскі раён быў удзельнікам Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР.

Камітэт ВДНГ адзначыў юбілейнымі дыпломамі рад гаспадарак раёна.

Дзіцячая здраўніца

У глыбіні гаю раскінуліся будынкі Багушэўскага дзіцячага санаторыя. Супрацьтуберкулёзныя прафілактычныя і лячэбныя мерапрыемствы ажыццяўляюцца за кошт дзяржаўнага бюджету, бясплатна для насельніцтва.

У новым санаторыі дзеці не толькі лечацца, але і вучацца па асобай праграме. Гэта школьнікі 3—7 класаў з усіх раёнаў вобласці. Вялікая ўвага надаецца культурнаму адпачынку. Добра наладжана і мастацкая самадзейнасць. Створаны тэатр лялек.

7 кастрычніка 1965 г.

Новая бальніца

25 верасня на торфапрадпрыемстве "Замашанскі мох" здадзена ў эксплуатацыю новае памяшканне Ульянавіцкай участковай бальніцы, разлічанай на 25 ложкаў. Тут будуць папраўляць здароўе працаўнікі торфапрадпрыемства і ўсіх вёсак сельсавета.

М. Краўчанка.

Падрыхтавала да друку Г. С. Хадасевіч.

СУСТРЭЛАСЯ МАЦІ З СЫНАМ

Лукер'я Ягораўна, здаецца, баялася выпусціць з абдымкаў Леаніда. Быццам магла зноў страціць яго, як у страшэнныя гады фашысцкага нашэсця...

Матчына сэрца не ведала спакою. Колькі слёз праліта, колькі дум перадумана. І ўсё ж цеплілася надзея на сустрэчу. Але пошукі спачатку не былі абнадзейваючымі. Раз за разам прыходзілі несуцяшальныя адказы. І калгасніца сельгасарцелі "Перамога сацыялізма" згубіла ўсякую надзею адшукаць сына. І раптам заметка ў "Віцебскім рабочым"! Лукер'я Ягораўна Шугальская атрымала кароткія звесткі аб сыне. Слёзы засцілалі вочы,. стукала сэрца, калі пісала ліст па ўказанаму адрасу. І вось прыйшло пісьмо, а крыху пазней юнак сам пераступіў парог роднай хаты. Ён, можна сказаць, упершыню бачыў маці, родных, бо двухгадовым хлапчуком вайна разлучыла яго з сям'ёй.

Падзяліць радасць Шугальскіх сабраліся ўсе жыхары вёскі Лучазарнае. Цёпла віталі Леаніда дырэктар мясцовай васьмігодкі Ігнат Арсенавіч Цястоў, калгаснікі Іван Трафімавіч Капранаў, Мікіта Андрэевіч Клыкоўскі і многія іншыя.

І вось усе позіркі скіраваны на Леаніда. Усім цікава было даведацца, як склаўся жыццёвы шлях іх земляка, цяпер воіна Савецкай Арміі.

І. Нікіцін.

УРУЧЭННЕ ПЕРАХОДНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

25 чэрвеня 1977 г.

За дасягненне лепшых вынікаў у вытворчасці і продажы дзяржаве льнопрадукцыі ў 1976 г. Калегія Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР і Прэзідыум ЦК прафсаюза работнікаў сель-

скай гаспадаркі СССР прызналі пераможцам ва Усесаюзным спаборніцтве Сенненскі раён і прысудзілі пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў СССР і ВЦСПС з уручэннем грашовай прэміі 1 тысяча рублёў.

На адбыўшымся пленуме райкома КП Беларусі пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў СССР і ВЦСПС уручыў член бюро абкома КПБ, старшыня абласнога камітэта народнага кантролю Я. В. Касарэўскі. Са словамі глыбокай удзячнасці ЦК КПСС, Савецкаму ўраду выступіў начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкома Г. В. Стук. Ён адзначыў, што наш раён з 1976 г. спецыялізуецца на вырошчванні льну. Толькі за год яго пасевы былі расшыраны на 1500 гектараў. На плошчы 5980 гектараў была атрымана ўраджайнасць па 7,4 цэнтнера льновалакна і па 5 цэнтнераў ільнасемя з кожнага гектара. Валавы збор валакна склаў 4434 тоны, грашовы даход з кожнага гектара атрыманы ў 1403 рублі, выручка ад рэалізацыі льнопрадукцыі склала 8,4 мільёна рублёў.

25 чэрвеня 1977 г.

Калегія Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР і Прэзідыум ЦК прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі СССР за дасягненне лепшых вынікаў у вытворчасці і продажу дзяржаве льнопрадукцыі па выніках Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва ў ільнаводстве за 1976 год прызналі пераможцам калгас "Ясная зара" і прысудзілі пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі СССР. Калгасу таксама ўручана грашовая прэмія ў суме 3 тысячы рублёў і аўтамашына "Волга".

Падрыхтаваў да друку С. В. Шайко.

Цуран — прозвішча слаўнае

"Гартаючы жыцця каляндар", — так называўся ўрачысты вечар 14 кастрычніка 1998 года, прысвечаны дырэктару саўгаса імя П. М. Машэрава М. Л. Цурану з нагоды яго 60-гадовага юбілею. Зала Машканскага сельскага клуба была перапоўнена. Павіншаваць Мікалая Лявонавіча прыйшлі рабочыя саўгаса, школьнікі, выхаванцы дзіцячага садка, спецыялісты, госці з вобласці і раёна, сябры, родныя і блізкія яму людзі.

Юбіляр не мог схаваць слёз радасці і ўдзячнасці людзям за ўсё тое добрае, што яны пакінулі ў яго жыцці, за той жыццёвы шлях, які прайшоў Мікалай Лявонавіч. Ад сваіх сяброў і паплечнікаў Мікалай Лявонавіч Цуран прыняў каравай сімвалічнай вагой у 80 тысяч тон — столькі збожжа вырасціў ён за 28 гадоў, нязменна кіруючы саўгасам імя П. М. Машэрава.

М. Л. Цуран.

Дзіця вайны... Так коратка можна сказаць пра Мікалая Лявонавіча, які нарадзіўся 14 кастрычніка 1938 года. Бацька яго, Лявон Фёдаравіч, быў старшынёй Будскага сельсавета, а ў час вайны — другім сакратаром Багушэўскага падпольнага райкома партыі, арганізоўваў партызанскі рух у тыле ворага.

Фашысты не шкадавалі ні старых, ні малых, каго падазравалі ў сувязях з партызанамі. На вачах Колі і яго маці чужынцы спрабавалі арыштаваць бацьку Лявона Фёдаравіча. Потым, калі бацька і маці ўжо былі ў партызанах, на вачах Мікалая гітлераўцы расстралялі яго малодшую сястрычку Валю.

Толькі чалавек, які з маленства пазнаў горыч і цяжар уласнай і чужой бяды, перажыў тое, чаго і на дваіх — траіх хапіла б, можа мець столькі душэўнай цеплыні і спагады да людзей, стрыманасці і прынцыповасці, радавацца чужым поспехам, бяду іншага чалавека ўспрымаць як сваю ўласную.

Бязбацькаўшчына рана прымусіла стаць на працоўны шлях. Спачатку рабіў грузчыкам на спіртзаводзе. Затым служыў тэрміновую службу ў Савецкай Арміі, якая стала сапраўднай школай жыцця. Ад сваіх камандзіраў, прайшоўшых пекла Вялікай Айчыннай вайны, вучыўся сэнсу жыцця, а галоўнае, — чалавечнасці і справядлівасці.

Дэмабілізаваўшыся, юнак паступіў у сельскагаспадарчую школу. Пасля вучобы праца-

ваў заатэхнікам па пчалярству, брыгадзірам, сакратаром парткома, старшынёй калгаса. Потым узначаліў створаны саўгас імя П. М. Машэрава (спачатку ён меў назву "Машканы"). Менавіта на гэтай зямлі ярка раскрыўся яго кіраўніцкі талент, здольнасць згуртаваць і павесці за сабой калектыў.

Была ў Цурана магчымасць узняцца вышэй, заняць больш спакойную пасаду, аднак Мікалай Лявонавіч не здрадзіў аднойчы выбранаму шляху. Ён бачыў, што людзі вераць яму і чакаюць ад яго большага. Кіраваць — значыць, прадбачыць, не баяцца праблем, а рашаць іх дзеля стварэння дабрабыту для вяскоўцаў. У гэтым Мікалай Лявонавіч бачыў сваё простае шчасце, якое, як пісаў вядомы беларускі паэт Максім Танк, складаецца з хлеба і солі, дарожнага пылу і роднага небасхілу, а каб з чаго іншага скласці, дык ці было б яно шчасце.

На вялікі жаль,10 студзеня 2000 года Мікалая Лявонавіча не стала. У памяці ўдзячных землякоў засталіся яго добрыя справы.

М. Бялоў.

Ганаровы чыгуначнік

Сямён Пятровіч Печкуроў нарадзіўся 15 лютага 1899 года. А ў красавіку наступнага памерла маці, яшчэ праз год — бацька. Гадавалі Сямёна і яго сястру старэйшыя браты. А ў 1912 годзе аднаго за другім братоў забіралі на службу ў царскую армію. За гаспадара ў хаце застаўся трынаццацігадовы Сямён.

Але жыццё ўмяшалася зноў. Адбіліся на лёсе Сямёна рэвалюцыі, другая сусветная вайна.

— Нацярпеўся я ад самалётаў за гады Вялікай Айчыннай,— усміхаецца нявесела Сямён Пятровіч.— Бясконцыя бамбёжкі, іншы раз па некалькі ў дзень. Пад Мажайскам вагончык наш, дзе чыгуначнікі адпачывалі пасля дзяжурства, разбілі. Я на верхняй паліцы ляжаў. Пад галавою чамаданчык. Асколкамі пасекла яго, а мяне толькі стукнула. Наогул, шанцавала. На другой станцыі, дзе начальнікам працаваў, бомба трапіла ў дом, з якога я толькі выйшаў.

На фронце Сямён Пятровіч не быў. Ён, як і да вайны, працаваў на чыгунцы ў прыфрантавой паласе. Спачатку адступаў да Масквы, потым праз тыя ж самыя чыгуначныя станцыі, якія ў 1941-м годзе пакідалі, адступаючы, ішоў услед за нашымі войскамі на захад. Ён працаваў. Як мог, набліжаў перамогу.

Што азначае быць дзяжурным на станцыі ў ваенны час? Гэта бяссонныя ночы, велізарнае напружанне. Дзень і ноч бясконца ідуць воінскія эшалоны — на фронт і з фронту. Чыгунка часта пашкоджвалася авіяцыяй ворага. А трэба было без затрымак прапускаць цягнікі. І яны ішлі. Праз станцыю, праз лёс Печкурова...

На чыгунку Сямён Пятровіч упершыню прыйшоў у 1928 годзе, пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі. Тут асвоіў нязвыклую для хлебароба прафесію. За кароткі час прайшоў шлях ад стрэлачніка да начальніка станцыі.

За бездакорную працу на чыгунцы ў мірны і ваенны час Сямён Пятровіч узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём "За абарону Сталінграда", удастоены звання ганаровага чыгуначніка.

Л. С. Крыштопенка.

Праз гады і войны

Нялёгкі шлях сялянскага хлопца Федзі Вакара да ўсімі паважанага дырэктара льнозавода Фёдара Мікітавіча. Нямала прыйшлося перажыць і зведаць за доўгае жыццё. У адзінаццаць год пакінуў родную вёску Храмейкава, што ля Багушэўска. Зямлі ў бацькі было мала. Нават хлеба не хапала для сям'і. Вось і прыйшлося ехаць на заробкі ў Рыгу, на Руска-Балтыйскі завод, на якім будавалі і раманавалі чыгуначныя вагоны.

Рабочыя палюбілі кемлівага хлопца. І калі ў 1911 годзе рыхтаваліся да забастоўкі, часта выкарыстоўвалі яго для сувязі з рабочымі завода "Фелікс", які выпускаў сельгасінвентар. І ў наступныя гады юнак не быў у баку ад калектыву, прымаў удзел у барацьбе.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 года застала Фёдара ў царскай арміі. Разам з ім у авіяцыйным падраздзяленні служыў салдат Цялятнікаў. Ён быў звязаны з рэвалюцыянерамі і вёў агітацыю сярод салдат. Калі Мікалай II адрокся ад трона, Цялятнікаў сабраў салдат і заклікаў абяззброіць афіцэраў. Так Вакар з сябрамі і зрабіў.

Часовы ўрад Керанскага працягваў вайну і гнаў салдат на фронт. Трапіў туды і Фёдар. Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў у шпіталі ў Маскве.

Праз тры месяцы рана загаілася, і Фёдар Мікітавіч прыехаў на пабыўку ў родную вёску. Ён прыняў самы актыўны ўдзел у станаўленні савецкай улады. Зусім недалёка, ля Смалян, знаходзіліся германскія інтэрвенты. Для барацьбы з імі ствараліся партызанскія атрады. Разам з Настассяй Макараўнай Вакар Фёдар Мікітавіч прывозіў з Віцебска зброю і раздаваў яе пад распіску аднавяскоўцам.

Хутка яго адклікалі ў армію, і ў 1919 годзе ў складзе маторна-пантоннага батальёна ён трапіў пад Кахоўку, дзе чырвоныя палкі змагаліся з врангелеўцамі. З баямі салдат прайшоў Мелітопаль, Нікапаль, ваяваў на Дняпры, браў Перакоп.

Затым зноў вярнуўся ў вёску. Калі пачалася калектывізацыя, Фёдар Мікітавіч — адзін з актыўных арганізатараў калгаса. З першых дзён будаўніцтва Багушэўскага льнозавода рашэннем райвыканкома пераведзены туды працаваць.

Мірная праца людзей была парушана вераломным нападам нямецкіх захопнікаў. Вакар пайшоў абараняць Радзіму. Першае баявое хрышчэнне атрымаў пад Масквой. Затым быў на Ленінградскім фронце, а закончыў баявы шлях у Германіі. Тройчы паранены, за мужнасць і адвагу ўзнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, некалькімі медалямі.

Пасля дэмабілізацыі Фёдара Мікітавіча прызначылі дырэктарам Багушэўскага льнозавода. Завода, праўда, не было. Яго спалілі захопнікі. Таму прыйшлося будаваць новы. Дырэктар асабіста ўдзельнічаў у мантажы абсталявання.

У 1958 годзе Фёдар Мікітавіч Вакар пайшоў на пенсію, але яго на заводзе яшчэ доўга лічылі самым аўтарытэтным чалавекам, звярталіся за парадай, дапамогай.

А. Мужаў.

Нялёгкі і слаўны лёс

Вячаслаў Антонавіч Злотка нарадзіўся ў 1923 годзе ў мястэчку Асвея (цяпер Верхнядзвінскі раён). Закончыў сярэднюю школу. Працаваў у рэдакцыі асвейскай раённай газеты. Меў магчымасць стаць журналістам, быў нават залічаны ў Камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску, але падаў заяву ў Серпухаўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча. Лёс так склаўся — памяняў пяро на зброю.

Вайну Злотка сустрэў у Асвеі. У партызаны пайшоў 9 верасня 1942 года. Быў снайперам. У хуткім часе хлопца прызначылі спачатку палітруком разведкі атрада імя Фрунзе, а затым — брыгаднай разведкі.

І вось — вызваленне роднай зямлі. З воінскай часцю дайшоў ад Дрысы (Верхнядзвінск) да Даўгаўпілса. Некаторы час Вячаслаў Антонавіч папрацаваў у рэдакцыі асвейскай раённай газеты "Ленінскі шлях", а 1 студзеня 1945 года быў мабілізаваны ў армію. І былі на яго шляху Данцыг і Кёнігсберг. У арміі праслужыў да 9 мая 1947 года. Затым працаваў сакратаром, першым сакратаром Асвейскага райкома камсамола.

Праз нейкі час В. А. Злотку накіравалі на работу ў Сенненскі райком партыі, а потым ён узначаліў калгас імя Калініна. У яго службовай характарыстыцы, датаванай 30 мая 1960 года, напісана: "Тав. Злотка В. А. шмат удзяляе ўвагі арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгаса, паляпшэнню працоўнай дысцыпліны і ўдасканальванню арганізацыі працы калгаснікаў. За перыяд работы старшынёй калгас з адстаючага выйшаў у лік перадавых". Скупыя, афіцыйныя радкі, а за імі — нялёгкі і слаўны лёс.

В. А. Злотка.

Цяпер Вячаслаў Антонавіч на заслужаным адпачынку. Але ён працягвае працаваць — абраны старшынёй Сенненскага раённага Савета ветэранаў вайны і працы.

І. Е. Лазука.



Актыў ветэранскай арганізацыі раёна на святкаванні 50-годдзя Перамогі.

Ад бровара — да сучаснага прадпрыемства

У 1898 годзе ў маёнтку Зарэчча памешчык Славінскі пабудаваў бровар. Ён пазней і стаў той базай, на якой вырас Багушэўскі спіртзавод — значнае, сучасна абсталяванае прадпрыемства.

А на пачатку бровар забяспечылі паравой машынай магутнасцю ўсяго толькі ў 20 конскіх сіл. У год выпускалася шэсць тысяч вёдзер спірту-сырцу.

У гады першай сусветнай вайны вытворчасць спынілі. Завод аднавілі ў 1927 годзе. Яго магутнасць складала ўжо 220 дэкалітраў у суткі. Прадпрыемства насіла назву "Яноўскі спіртзавод імя 10-годдзя Кастрычніка". У 1936 г. яго перайменавалі ў Багушэўскі спіртзавод, ажыццявілі рэканструкцыю.

За стагоддзе змянілася сем дырэктараў завода, калі першым кіраўніком лічыць самога Славінскага. У 1927—1936 гг. дырэктарам быў Галубіцкі. Пад яго кіраўніцтвам было зманціравана новае па тым часе абсталяванне, а таксама пабудавана вузкакалейка для дастаўкі торфу.

У гады Вялікай Айчыннай вайны спіртзавод быў разбураны. На франтах Вялікай Айчыннай вайны ваявала 25 работнікаў завода. У 1944 годзе прадпрыемства аднавілі. Дырэктарам яго да 1948 года працаваў М. З. Клімцоў.

З 1948 па 1962 год заводам кіраваў С. М. Свярдлоў. Працаваў на прадпрыемстве 171 чалавек. Укараняліся новыя тэхналогіі. Ужо ў 1953 годзе вытворчыя магутнасці дасягнулі 800 дэкалітраў спірту-сырцу ў суткі. Яшчэ праз пяць гадоў увялі ў строй новую кацельню. У тым жа 1960 годзе пачалі выпускаць вуглекіслату.

У 1962 годзе дырэктарам спіртзавода быў прызначаны І. К. Валадкевіч. Кіраўніцтва, інжынеры і тэхнолагі імкнуліся набываць абсталяванне, якое адпавядала б патрабаванням сучаснасці. Быў пабудаваны клуб на 200 месцаў. У 1970 годзе спіртзаводу было прысвоена званне "Прадпрыемства высокай культуры вытворчасці".

З 1972 па 1989 спіртзаводам кіравала Н. І. Казлова. За гэты час спіртзавод значна мадэрнізавалі. Была ўстаноўлена рэктыфікацыйная калона на 2000 дэкалітраў спірту ў суткі. Завод займеў значны жыллёвы фонд.

З 1989 года прадпрыемства ўзначальвае А. П. Шышкін. Чалавек вялікіх арганізацыйных здольнасцей, ён згуртаваў калектыў, вывеў яго ў лік фінансава стабільных. За кароткі тэрмін праведзена замена соладу на фермент, упершыню ў рэспубліцы ажыццёўлена рэктыфікацыя спірту-сырцу, пабудаваны 21 жылы дом. На заводзе працуюць 120 чалавек.

Галоўнае багацце прадпрыемства, вядома ж, людзі. На спіртзаводзе нямала працоўных дынастый. Іх пачынальнікі прыйшлі сюды яшчэ ў даваенны час, затым прывялі сваіх дзяцей, цяпер унукі і праўнукі працягваюць іх справу. Напрыклад, з заводам звязаў свой лёс некалі П. Р. Вакар, на прадпрыемстве працавалі і цяпер працуюць яго сын Уладзімір, свацця З. В. Фамінова, 4 унукі, 3 унучкі. Вядомы тут працоўныя дынастыі Кржэсінскіх, Беразнёвых, Шарцаў, Рыпінскіх, Зыгмантаў, Апельтаў, Балалайкаў, Казловых, Пракапенкаў, Івашкевічаў і іншых. Гэтымі людзьмі і многімі іншымі працаўнікамі ганарыцца па праву старэйшы калектыў раёна. Завод развіваецца дзякуючы творчаму пошуку калектыву, упэўнена глядзіць у будучыню.

І. Е. Лазука.

Багушэўская мэбля

Вясной 1927 г. на ўскрайку пасёлка Багушэўск А. С. Шарац, Т. І. Комлева, І. М. Казак, А. С. Казырыцкая, Р. Р. Пучкоў, В. К. Гаравец, А. А. Козырава з групай пайшчыкаў пачалі будаваць арцель гнутай мэблі пад назвай "Праца".

Арцель пачала выпускаць гнутае венскае крэсла. У 1934 г., акрамя крэсла, пачаўся выраб бялізнавай фанернай шафы і іншых сталярных вырабаў, наладжана распілоўка лесаматэрыялаў. Механічнага абсталявання было мала, пераважала ручная праца. Да Вялікай Айчыннай вайны арцель штогод выпускала 1400—1500 шафаў і 3500—4000 адзінак сталярных вырабаў.

У Вялікую Айчынную вайну прадпрыемства было поўнасцю разбурана акупантамі. У 1944 г. пачалося аднаўленне арцелі. З уводам у строй яна пачала выпускаць канцылярскія і кухонныя сталы, табурэткі. У 1956 г. арцель "Праца" была аб'яднана з Багушэўскім райпрамкамбінатам. У 1960 г. Багушэўскі райпрамкамбінат атрымаў новую назву — Багушэўскі дрэваапрацоўчы камбінат, да яго была далучана Багушэўская фабрыка.

Цяпер прадпрыемства называецца адкрытым акцыянерным таварыствам "Багушэўскмэбля".

Старэйшая школа раёна

Багатую і слаўную гісторыю мае Машканская сярэдняя школа імя А. К. Гараўца. Заснавана яна была яшчэ ў 1869 годзе як народнае вучылішча. Тады тут можна было набыць пачатковую адукацыю. У "Памятной книге Могилевской губернии" за 1909 год у ліку народных вучылішчаў упамінаецца і Машканскае. У той час у ім займалася 50 дзяцей і працавала адна настаўніца. Гэта была Ганна Васільеўна Матыська.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 года садзейнічала развіццю ўсіх бакоў сялянскага жыцця і ў тым ліку і адукацыі сялянскіх дзяцей. У 1920—1927 гадах у Машканскай школе пачалі працаваць 5—6-я класы, а з 1928 года яна стала сямігодкай.

Сярод сарака трох выпускнікоў 1929 года быў і Аляксандр Гаравец — будучы Герой Савецкага Саюза.

У 1929—1931 гадах у гэтай школе вучыўся будучы партыйны і дзяржаўны дзеяч, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы П. М. Машэраў. У розны час школу скончылі заслужаны дзеяч культуры Беларусі лаўрэат літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы і Дзяржаўнай прэміі БССР паэт і кінадраматург Анатоль Вялюгін, Герой Савецкага Саюза І. І. Камінскі.

З 1936—1937 навучальнага года школа ў Машканах стала першай у Віцебскай вобласці сельскай сярэдняй школай. У 1939 годзе адбыўся першы выпуск навучэнцаў з сярэдняй адукацыяй. Да 1941 года на дзённым і вячэрнім аддзяленнях школы займаліся каля дзвюх тысяч дзяцей, падлеткаў, юнакоў і дзяўчат.

Выпускнікі 1941 года А. А. Нахаеў і А. Н. Ляхоўская ў ліпені арганізавалі ў Машканскім сельсавеце падпольную камсамольскую арганізацыю, якая змагалася з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і папаўняла байцамі партызанскія атрады, а таксама здабывала для народных мсціўцаў медыкаменты і зброю.

Бюст Героя Савецкага Саюза А. К. Гараўца каля Машканскай сярэдняй школы.

1 ліпеня 1944 года школа аднавіла сваю работу. Першы пасляваенны выпуск адбыўся ў 1947 годзе. Усяго тады было 5 выпускнікоў. А ў 1952 годзе тут атрымала сярэднюю адукацыю будучы Герой Сацыялістычнай Працы Л. Е. Сіроткіна. Пачынаючы з 1962 года, адначасова з атэстатам аб сярэдняй адукацыі выпускнікі пачалі атрымліваць пасведчанне трактарыста-машыніста. У 1964 годзе школе было прысвоена імя А. К. Гараўца.

Новы будынак школы быў узведзены і здадзены ў эксплуатацыю ў 1976 годзе. А 23 лютага 1978 года ў школе адкрыўся музей баявой і працоўнай славы. У наступныя гады і дзесяцігоддзі матэрыяльная база школы пастаянна ўмацоўвалася, ажыццяўляліся ідэі школьнай рэформы, адкрыліся класы з паглыбленым вывучэннем прадметаў і з экалагічным ухілам. Школа супрацоўнічае з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі вобласці для падрыхтоўкі спецыялістаў сельскай гаспадаркі і адукацыі. Дзякуючы глыбокай прафесійнай арыентацыі амаль палова выпускнікоў штогод паступае ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

Старэйшая ў раёне школа з аптымізмам глядзіць у будучыню.

Х. А. Куліеў.

Мацярынскае сэрца

Сонечны вясновы ранак займаецца над вёскай. Цішыня яшчэ гаспадарыць на вуліцы. Эх, і соладка ж спіцца на світанні! Аднак вось то ў адной, то ў другой хаце запальваецца святло. Кіне позірк гаспадыня на гадзіннік: рана вата яшчэ. Іншая па звычцы прынікне да шыбы — калі Кузняцовы не ўсталі, то можна не турбавацца.

Антаніна Фядосаўна, як правіла, прачынаецца першай у Карпавічах. Раней у гэтым была патрэба. Цяпер, праўда, можна не спяшацца. Чацвёра памочнікаў у хаце, сама на здароўе не скардзіцца. Аднак, па-ранейшаму, на досвітку не спіцца...

На стале знайшла запалкі. Шэсць гадзін раніцы. Новы дзень, новыя турботы. Дзятву накарміць, адправіць у школу. І самой трэба наведацца да настаўніцы, якая вучыць Славіка. Самы маленькі ён у іх вялікай сям'і. Гарэзлівы хлопчык, жывы надта, іншы раз і насваволіць можа. Ды і вучобай астатніх трэба пацікавіцца. Часты госць Антаніна Фядосаўна ў Ходцаўскай сярэдняй школе, аднак ідзе сюды маці заўсёды з чыстай душой і добрым настроем — ні за аднаго з трынаццаці дзяцей не даводзіцца чырванець. Наадварот, яе ў прыклад ставяць.

* * *

Першыя пасляваенныя гады... Можна сказаць, не жылі, а перабіваліся з хлеба на ваду вяскоўцы. Хіба ж у тыя гады, калі Антаніна хадзіла на вечарынкі, яна паверыла б, што такі Палац культуры землякі адбудуюць? Вось дзе б на кадрылю можна было выстраіцца. Інакш раней было. Наймуць хату, павесяляцца...

Да Антаніны пачаў прыглядацца сусед Васіль. Заікнулася дома пра замужжа, але бацькі і слухаць не хацелі. Супраць волі бацькоў не пайшла. Васіль хутка абзавёўся сям'ёй.

Вайна разбурыла планы, усё перайначыла ў жыцці. Нічога добрага не прынесла ў іх дом, акрамя гора і слёз. Не дачакалася светлага дня

і жонка Васіля, памерла. Той, вярнуўшыся дадому, зайшоў да суседкі:

— Ведаеш, Тоня, выходзь за мяне замуж. Бацька ж я сваім дзецям. Не магу без іх. А яны без маці, без пяшчоты вырастуць нелюдзімымі.

Незважаючы на размовы, перайшла ў дом Кузняцова. Сваімі сталі для Антаніны Фядосаўны маленькія Рая і Міша. Аднымі радасцямі і засмучэннямі зажылі з Васілём.

І бацькам клапатлівым, і мужам уважлівым стаў Кузняцоў. Яшчэ і яшчэ нараджаліся дзеці.

— За ордэнамі, Фядосаўна, гонішся,— жартавалі суседкі,— або маці-гераіні тытул цябе прываблівае?

Яна толькі ўсміхалася, слухаючы такія наіўныя пытанні. А недзе ў сэрцы, пад якім выношвала іх — сваю ўцеху і радасць, частымі ўдарамі адзывалася хваляванне. У такія хвіліны супакойвала сябе думкай: сама не бачыла ў дзяцінстве асаблівага шчасця — няхай дзеці пажывуць, а разам з імі я зведаю прыгажосць жыцця.

За руплівасць, справядлівасць, уменне быць добрай гаспадыняй і працаўніцай паважаюць у саўгасе "Ходцы" Антаніну Фядосаўну. Людзі заўсёды гарнуліся да іх вялікай сям'і, у якой старэйшыя дапамагаюць ставіць на ногі малодшых, у якой на шчырасць людскую адказваюць тым жа. Аднойчы прапанавалі ўладкаваць школьнікаў у інтэрнат — Фядосаўна адразу запратэставала:

— Не лішнія яны ў мяне. Родныя, блізкія. Як аднолькава баліць на руцэ кожны паранены палец, так і ў сэрцы па кожным боль аднолькавы. Дзяржава і так дапамагае, так што дзякуй за ўвагу.

Здаралася раней (у той час яшчэ ў саўгасе не было ясляў), што ў гарачую пару ўборкі або сенакосу цэлы дзень на полі праводзіла Фядосаўна. Жанкі адпраўлялі дадому, маўляў, дзеці без нагляду.

— Не хвалюйцеся. У мяне самаабслугоўванне дзейнічае ў хаце. У кожнага — свае абавязкі. І нянькі ёсць, і повар. Усё на грамадскіх пачатках,— жартавала жанчына.

Спакойная, стрыманая, Фядосаўна шчыра расказвае пра кожнага з трынаццаці. Пра ўсіх з аднолькавай пяшчотай і любоўю:

— Рая на гадзіннікавым заводзе працуе. Яна ў сям'і нашай самая старэйшая. Ужо сама выхоўвае дзяцей. І Міша таксама з роднага дому даўно пайшоў. З дзяцінства марыў аб ваеннай службе. Я іх выхавала. Мяне мамай называюць.

Галіна закончыла Магілёўскі педагагічны інстытут. Выйшла замуж. Настаўнічае ў роднай школе. Мікалай працуе шафёрам, сем'янін прыкладны. А Гена на адным з пецярбургскіх заводаў слесарам працуе. Тамара начыталася кніг пра будоўлі. Закончыла школу і на Лукомскую ДРЭС паехала, спецыяльнасць набыла, маляром працуе. А Валя ў нас дарэмна не хлопцам нарадзілася. Гарачая такая, смелая, у Віцебску на заводзе заточных станкоў шліфавальшчыцай. Паважаюць яе ў калектыве. Зіна і Вася — двайняты ў мяне. Абодва вучацца. Дачка будзе культасветработнікам. А сын, акрамя мора, нічога не прызнае.

Астатнія чацвёра ў школе вучацца. Для кожнай маці свае дзеці — самыя харошыя. Але і сярод людзей толькі прыемнае слова пра іх пачуеш. Працуюць, вучацца, мне дапамагаюць гадаваць астатніх.

Раней, шчыра кажучы, цяжкавата было. Час бярэ сваё. Дзевяць вылецела з роднага гнязда. Як цудоўна, калі збіраюцца ўсе разам. Мінулым летам з'ехаліся — нарадавацца не магла. Якраз лён церабілі ў брыгадзе. Мы сваёй сям'ёй як выйшлі, дык за дзень больш гектара зрабілі.

* * *

Дзе толькі ні працавала Антаніна Фядосаўна! Выдатна працавала. Любая справа кіпіць у яе руках. Мне ж хочацца выдзеліць асобна яе асноўнае прызванне, якое, як жанчына, яна выканала з гонарам. Яна — маці. Маці-Гераіня.

Прыгадваю прасторны пакой, вялікія, па вясковай традыцыі ўзбітыя падушкі на ложку, дывановыя дарожкі, выбітыя і акуратна пасцеленыя Сашам (ён ў той дзень быў дзяжурным), і міжволі думаю, што сёння шумна ў доме Кузняцовых. Усе, хто можа, абавязкова прыедуць павіншаваць сваю маму са святам.

А. Панкратава.

"Ленінская іскра" 1974

Пасляслоўе рэдакцыі газеты: усе дзеці Антаніны Фядосаўны знайшлі сваё месца ў жыцці. Галіна доўгі час працавала дырэктарам Ходцаўскай сярэдняй школы. Мікалай — шафёр Віцебскага аўтакамбіната № 1. Генадзь — механік камбіната "Галоўленспецбуд" у Санкт-Пецярбургу, Тамара — будаўнік у Санкт-Пецярбургу, Валянціна — загадчыца канцылярыі ў Віцебскай ветакадэміі, Васіль адпраца-

ваў 20 гадоў у міліцыі, цяпер на пенсіі, але працуе загадчыкам гаспадаркі ў будтрэстаўскай бальніцы ў Віцебску, Зінаіда — бібліятэкар у Обалі, Аляксандр — шафёр на заводзе "Белвест", Віктар — шафёр мэблевай фабрыкі ў Віцебску, Аліна працуе на Обальскім заводзе кармавых дабавак, Вячаслаў — кравец абутку на заводзе "Белвест". Яе прыёмная дачка Раіса выйшла на пенсію, працавала на Віцебскім заводзе гадзіннікавых дэталей, а Міхаіл быў ваенным. Колькі ж карысці сваёй зямлі прынеслі гэтыя людзі! Усіх іх праславіла на шчаслівае і плённае жыццё шчодрае сэрца маці.

Вызначыліся працай

Зямля славіцца людзьмі. Працавітымі, дбайнымі, гаспадарлівымі, шчырымі. Іх шмат у раёне. Знаёмства з імі пачынаецца з людзей, удастоеных самых высокіх узнагарод былога СССР — звання Героя Сацыялістычнай Працы.

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

П. Л. Бабак.

І. Р. Паўлоўскі.

БАБАК Пётр Лук'янавіч. Нарадзіўся 8.4.1926 г. у в. Беразнякі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Заслужаны будаўнік БССР (1962). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1951 г. трактарыст, з 1956 г. машыніст экскаватара ў Сенненскім будаўніча-мантажным управленні меліярацыі, з 1975 г. у перасоўнай механізаванай калоне № 33 трэста Віцебскводбуд. Званне Героя прысвоена за паспяховае выкананне заданняў 8-й пяцігодкі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1963—1967 гг. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, ордэнамі Леніна, Дружбы народаў, медалямі.

БАРКОЎСКІ Захар Іванавіч. Нарадзіўся 3.9.1911 г. у в. Ліплянск. Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Заслужаны аграном БССР (1966). Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1972). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1957). У 1934—1939 гг. аграном, дырэктар саўгаса "Побалава" Рагачоўскага раёна. З 1944 г. дырэктар эксперыментальнай базы "Вусце" Аршанскага раёна. Званне Героя прысвоена за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Памёр 4.10.1995 г.

ЛІСЕЦКІ Міхаіл Антонавіч. Нарадзіўся ў 1936 г. у в. Латыгаль. Герой Сацыялістычнай Працы (1982). Пасля Латыгальскай школы (1952) скончыў адно з ленінградскіх прафтэхвучылішчаў. Працоўную дзейнасць пачаў на Кіраўскім заводзе, потым працаваў на Котласкім цэлюлозна-папяровым камбінаце. З 1958 г. на Поўначы ў горадзе Певек. Працаваў у горнай прамысловасці брыгадзірам комплекснай брыгады, якая здабывала золата. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна. Жыве ў Магадане.

ПАЎЛОЎСКІ Іван Рыгоравіч. Нарадзіўся 5 ліпеня 1922 г. у в. Латыгаль. Герой Сацыялістычнай Працы (1972). Кандыдат эканамічных навук (1969). Пасля заканчэння Аршанскага тэхнікума чыгуначнага транспарту (1941) працаваў на Свярдлоўскай чыгунцы, дзе прайшоў шлях ад дзяжурнага па станцыі да начальніка буйнога чыгуначнага вузла. У 1972—1977 гг. — намеснік міністра — начальнік галоўнага ўпраўлення руху Міністэрства шляхоў зносін СССР. У 1977—1982 гг. — Міністр шляхоў зносін СССР. Памёр у Маскве.

САРОКІНА Алена Дзям'янаўна. Нарадзілася 25.5.1913 г. у в. Рудніца. Герой сацыялістычнай Працы (1966). У 1937—1944 гг. даярка саўгаса "Полымя", у 1944—1968 гг. — племзавода "Полымя". Званне Героя прысвоена за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі.

СІРОТКІНА Лідзія Емяльянаўна. Нарадзілася 19.5.1932 г. у в. Замошша ў сялянскай сям'і. Герой Сацыялістычнай Працы (1973). Скончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1957). З 1957 г. галоўны аграном калгаса "Першамайск" Брагінскага раёна, з 1961 г. загадчык аддзялення саўгаса "Старасельскі" Віцебскага раёна. З 1961 г. галоўны аграном, намеснік старшыні калгаса "Перамога". З 1978 г. намеснік старшыні калгаса імя Леніна Талачынскага раёна. З 1982 г. па 1995 г. старшыня калгаса імя Дзімітрава Талачынскага раёна. Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве сельскагаспадарчых прадуктаў. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1974—1979) і Вярхоўнага Савета БССР (1985—1990). Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, "Знак Пашаны", медалямі.

А. Дз. Сарокіна.

Калгас "Перамога", у якім Л. Е. Сіроткіна працавала галоўным аграномам, у 1973 г. сабраў па 35 ц збожжа з гектара, 240 цэнтнераў бульбы, 7,7 ц ільнасемя і 6 ц ільновалакна.

Атрымалі высокія ўрадавыя ўзнагароды

ОРДЭН ЛЕНІНА

АНДРЭЕЎ Валянцін Пятровіч — трактарыст калгаса "Ясная зара".

БАБАК Пётр Лук'янавіч — старшы машыніст экскаватара Сенненскай ПМК-33.

БАЖАНОК Кірыла Пятровіч — першы сакратар райкома КПБ.

БЕРАШЭВІЧ Мікалай Іванавіч — старшыня калгаса імя Суворава.

БІРУЛІН Дзям'ян Фёдаравіч — трактарыст калгаса імя Ціміразева.

ВОРАНАВА Марыя Ільінічна — даярка племсаўгаса "Полымя".

ГАРНАК Надзея Канстанцінаўна — звеннявая калгаса "Праўда".

КАЗЛОВА Яўгенія Яўсееўна — свінарка саўгаса "Багушэўскі".

ЛАСЯНКОВА Вольга Іванаўна — звеннявая калгаса "Перамога сацыялізму".

ЛУКАШЭВІЧ Рыгор Ягоравіч — старшы машыніст экскаватара Сенненскай ПМК-33.

МАНДРЫК Вольга Дзмітрыеўна — свінарка саўгаса "Багушэўскі".

МЯЦЕЛІЦА Кацярына Піліпаўна — звеннявая калгаса "Праўда".

ПАРЭПКА Мікалай Пятровіч — трактарыст племзавода "Полымя".

ПЕЧНІКАВА Марыя Уладзіміраўна — даярка племзавода "Полымя".

САЛАЎЁВА Настасся Ісакаўна — звеннявая калгаса "Бальшавік".

САПРОНЕНКА Марыя Пятроўна — даглядчыца жывёлы саўгаса імя Гараўца.

САРОКІНА Алена Дзям'янаўна — даярка племзавода "Полымя".

СВЯРДЛОЎ Міхаіл Евельевіч — дырэктар саўгаса імя Гараўца.

СЕМЕРЫКОЎ Канстанцін Ануфрыевіч — старшыня калгаса "Сцяг Перамогі".

СТАРАВОЙТАЎ Мікалай Кузьміч — свінар саўгаса імя Гараўца.

ШЫБЕКА Аркадзь Пятровіч — камбайнер калгаса "Запаветы Ільіча".

ОРДЭН КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

БЯЛЯЦКІ Іван Іосіфавіч — брыгадзір племзавода "Полымя".

ЛАГУНОВА Яўгенія Ягораўна — звеннявая калгаса "Сцяг Перамогі".

ПЯДАЧКІН Сцяпан Васільевіч — загадчык склада райспажыўсаюза.

РУМО Уладзімір Сідаравіч — трактарыст калгаса "Ясная зара".

СТАРАВОЙТАЎ Мікалай Кузьміч — свінар саўгаса імя Гараўца.

ЦЮЦЮНОЎ Віктар Дзмітрыевіч — старшыня калгаса "Ясная зара".

Узнагароджаны таксама ордэнам "Знак Пашаны".

ШЫБЕКА Аркадзь Пятровіч — трактарыст калгаса "Запаветы Ільіча".

ОРДЭН ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

АКУЛОВІЧ Вольга Андрэеўна — сартавальніца Сенненскага льнозавода.

АНДРЭЕЎ Валянцін Пятровіч — трактарыст калгаса "Ясная зара".

АСТАПАВА Ніна Парфенаўна — настаўніца СШ № 2 г. Сянно.

АЎСЮКЕВІЧ Аляксандра Дзмітрыеўна — звеннявая калгаса "Чырвоны пуцілавец".

АЎСЮКЕВІЧ Пётр Мікітавіч — камбайнер калгаса "Чырвоны пуцілавец".

АЎФЯРОНАК Вольга Сцяпанаўна — звеннявая калгаса "Сцяг Перамогі".

БАРАВІК Уладзімір Купрыянавіч — брыгадзір калгаса "Ясная зара".

БАТУРА Аляксей Кузьміч — прараб Сенненскай ПМК-33.

БУЕВІЧ Анатоль Вацлававіч — брыгадзір племзавода "Полымя".

БЯРГОВІНА Лідзія Якаўлеўна — звеннявая калгаса "Чырвоны пуцілавец".

ВАСІЛЁЎСКАЯ Зінаіда Карнееўна — звеннявая калгаса імя Ціміразева.

ВОЛКАВА Святлана Андрэеўна — прараб Сенненскай ПМК-33.

ВЫШЫНСКАЯ Яніна Францаўна — брыгадзір Сенненскага льнозавода.

ГАВЯДКА Максім Васільевіч — старшыня райвыканкома.

ГРАЧЫХА Ганна Іванаўна — звеннявая калгаса "Сцяг Перамогі".

ГРЫШЧАНКОЎ Віктар Міхайлавіч — звеннявы саўгаса імя Гараўца.

ЕРМАШКЕВІЧ Мікалай Лявонавіч — машыніст зернятока калгаса "Бярозкі".

ЖУДРО Анатоль Яфімавіч — брыгадзір калгаса "Ударнік".

ЖУДРО Яфім Яфімавіч — брыгадзір калгаса "Шлях да камунізму".

ЖУРАЎКОЎ Аляксандр Мацвеевіч — першы сакратар райкома КПБ.

ЗАЙЦАВА Матруна Кірылаўна — даярка саўгаса "Полымя".

ЗАРУБІЦКІ Васіль Тарасавіч — трактарыст племзавода "Полымя".

ЗАРУБІЦКІ Фама Сямёнавіч — звеннявы племзавода "Полымя".

ЗІНЬКОВІЧ Яфім Ягоравіч — старшыня калгаса "Праўда".

КАВАЛЁВА Ефрасіння Паўлаўна — звеннявая калгаса "Сцяг Перамогі".

КАЗАКОВА Настасся Мікітаўна — даярка саўгаса "Полымя".

КАЗЛОЎ Аляксей Міхайлавіч — дырэктар саўгаса "Янова".

КАЗЛОЎ Максім Цімафеевіч — трактарыст калгаса "Сцяг Перамогі".

КАРАНЕЎСКІ Фёдар Сямёнавіч — брыгадзір калгаса "Праўда".

КАРАСЬ Аркадзь Паўлавіч — старшыня калгаса "Сцяг Перамогі".

КАРПЕНКА Віктар Аляксандравіч — трактарыст калгаса "Застадолле".

КАРПОВІЧ Васіль Аляксандравіч — камбайнер калгаса "Сцяг Перамогі" (узнагароджаны двойчы).

КАРПОВІЧ Марыя Якаўлеўна — даярка калгаса "Сцяг Перамогі".

КІТАЁВА Тамара Іванаўна — жывёлавод саўгаса "Янова".

КІШКОВІЧ Ала Сцяпанаўна — звеннявая калгаса "Сцяг Перамогі".

КІШКОВІЧ Ганна Сцяпанаўна — звеннявая калгаса "Сцяг Перамогі".

КОМЛЕВА Наталля Аляксандраўна — свінарка саўгаса "Багушэўскі".

КОМЛЕЎ Вячаслаў Піліпавіч — звеннявы калгаса імя Жданава.

КУЛІК Марыя Рыгораўна — даярка калгаса "Сцяг Перамогі".

КУРАШЭВІЧ Уладзімір Аляксандравіч — трактарыст калгаса "Чырвоны пуцілавец".

КУРЫЛЁНАК Леанід Якаўлевіч — трактарыст калгаса імя Карла Маркса.

КУЧКО Канстанцін Макаравіч — калгаснік калгаса "Праўда".

ЛАГУНОЎ Віктар Пятровіч — старшыня калгаса імя Карла Маркса.

ЛАТЫШАЎ Пётр Ціханавіч — вадзіцель райвыканкома.

ЛЕЙЧАНКА Васіль Рыгоравіч — начальнік раённага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі.

ЛІМАНОВІЧ Васіль Піліпавіч — механізатар саўгаса імя Данукалава.

МАРЧАНКА Рыгор Мікітавіч — звеннявы саўгаса "Багушэўскі".

МАТЫГІН Васіль Іванавіч — брыгадзір калгаса "Сцяг Перамогі".

МАЦЮШАВА Любоў Уладзіміраўна — даярка саўгаса "Полымя".

МІРАНОВІЧ Канстанцін Васільевіч — заатэхнік калгаса імя Карла Маркса.

МУРАШКА Лідзія Васільеўна — звеннявая калгаса "Кастрычнік".

ПАГАРЭЛЬСКІ Пётр Піліпавіч — вадзіцель аўтамабіля калгаса імя Кірава.

ПАЛТЫКА Ефрасіння Рыгораўна — даярка племзавода "Полымя".

ПАЛЯКОЎ Леанід Паўлавіч — брыгадзір саўгаса імя Данукалава.

ПАНКРАТАВА Іна Міхайлаўна — заатэхнік саўгаса "Багушэўскі".

ПАРАХОНЬКА Таццяна Еўсцігнееўна — звеннявая саўгаса "Ходцы".

ПАРЭПКА Ефрасіння Міхайлаўна — заатэхнік калгаса імя Дзяржынскага.

ПАРЭПКА Мікалай Пятровіч — трактарыст саўгаса "Полымя".

ПАЎЛОЎСКІ Віктар Вікенцьевіч — брыгадзір калгаса "Ульянавічы".

ПАЎЛЮЧЭНКА Барыс Дзмітрыевіч — дырэктар саўгаса "Багушэўскі".

ПІСКУНОЎ Уладзімір Ларыёнавіч — брыгадзір калгаса імя Суворава.

ПРАВІЛАВА Ніна Васільеўна — даярка калгаса імя Гастэлы.

ПРОНЬКА Міхаіл Іванавіч — камбайнер калгаса імя Цімірязева.

ПУЧКОВА Лідзія Дзмітрыеўна — звеннявая саўгаса "Багушэўскі".

ПУЧКОЎ Іван Якаўлевіч — трактарыст калгаса імя Будзённага.

РАДКЕВІЧ Мікалай Міронавіч — даглядчык жывёлы калгаса "Ульянавічы".

САЛТАНОВІЧ Андрэй Аляксеевіч — слесар-наладчык саўгаса імя Данукалава.

САЎЛЕВІЧ Анатоль Сцяпанавіч — звеннявы калгаса "Кастрычнік".

СВІНАЛУПАВА Алена Тарасаўна — цялятніца калгаса "Сцяг Перамогі".

СЕЛЯЗНЁВА Ганна Архіпаўна — звеннявая калгаса "Сцяг Перамогі".

СЕМЕРЫКОЎ Іван Мінавіч — брыгадзір калгаса "Сцяг Перамогі".

СІДУНОЎ Мікалай Данілавіч — дырэктар саўгаса імя Данукалава.

СТРЫЖНЕЎ Канстанцін Іванавіч — трактарыст калгаса "Шлях камунізму".

СТРЫЖНЕЎ Міхаіл Іванавіч — брыгадзір Віцебскай эксперыментальнай гаспадаркі.

ТРЫБУЛЬ Анатоль Раманавіч — камбайнер калгаса "Чырвоны пуцілавец".

ТЫЛЕЦ Анатоль Фёдаравіч — трактарыст калгаса імя Суворава.

ТЫЛЕЦ Іван Навумавіч — трактарыст калгаса імя Гастэлы.

ХЛУСЕВІЧ Валянцін Максімавіч — шафёр райаб'яднання "Сельгастэхніка".

ХРАМЦОЎ Леанід Андрэевіч — галоўны аграном саўгаса імя Гараўца.

ЦІТОВА Надзея Пятроўна — даярка саўгаса "Ходцы".

ЦУРАН Мікалай Лявонавіч — дырэктар саўгаса імя П. М. Машэрава.

ЦЫВІНСКІ Леанід Пятровіч — брыгадзір калгаса "Ледневічы".

ЦЫРКУНОЎ Пётр Арцёмавіч — брыгадзір саўгаса імя Гараўца.

ШАРАЙ Ганна Макараўна — звеннявая калгаса "1-е Мая".

ШАЎКУН Ганна Васільеўна — даярка саўгаса "Полымя".

ШАФРАНСКАЯ Соф'я Іванаўна — даярка калгаса імя Будзённага.

ШАФРАНСКІ Васіль Фёдаравіч — трактарыст калгаса "Кастрычнік".

ШУБКА Павел Андрэевіч — трактарыст калгаса "Шлях да камунізму".

ЮРОЎСКІ Мікалай Андрэевіч — трактарыст калгаса "Ленінскі шлях".

ЯЦКО Нэля Прохараўна — даярка калгаса "Ледневічы".

ОРДЭН ДРУЖБЫ НАРОДАЎ

АНУЧКІН Віктар Архіпавіч — ляснічы Сенненскага лясніцтва.

БАБАК Пётр Лук'янавіч — машыніст экскаватара ПМК-33.

ЕРМАШКЕВІЧ Барыс Мікалаевіч — механізатар калгаса імя Ціміразева.

МАГАЗІНШЧЫКАВА Вера Васільеўна — сакратар парткома племзавода "Полымя".

САПРАНЕЦКІ Эдуард Яфімавіч — начальнік участка калгаса "Ледневічы".

СТЭЛЬМАХ Іван Захаравіч — трактарыст калгаса імя Жданава.

ЦУРАН Мікалай Лявонавіч — дырэктар саўгаса імя П. М. Машэрава.

ЦЫВІНСКІ Юрый Іванавіч — старшыня выканаўчага камітэта Какоўчынскага сельскага Савета народных дэпутатаў.

ОРДЭН "ЗНАК ПАШАНЫ"

БАБКОВА Еўдакія Іванаўна — даярка саўгаса імя Гараўца.

БАРКАВЕЦ Сцяпан Іванавіч — механізатар калгаса імя Кірава.

БАРМІНСКІ Васіль Васільевіч — старшыня выканкома Сенненскага раённага Савета дэпутатаў працоўных.

БАРЫШАЎ Валерый Васільевіч — трактарыст калгаса "1-е Мая".

БЕРАШЭВІЧ Мікалай Іванавіч — старшыня калгаса імя Суворава.

БЛЫКІНА Роза Ігнатаўна — інспектар-тэхнолаг Сенненскага завода сухога абястлушчанага малака.

БУРБО Іосіф Адамавіч — урач Сенненскай райбальніцы.

БЯЛЯЦКІ Уладзімір Іванавіч — майстар МПМК-75.

ВАСІЛЁНАК Васіль Іосіфавіч — старшыня калгаса імя Ціміразева.

ВАСІЛЁНАК Марыя Дзмітрыеўна — калгасніца калгаса "Верны шлях"

ВАСІЛЁНАК Раіса Конанаўна — даярка Віцебскай эксперыментальнай гаспадаркі.

ВІННІК Мікалай Якаўлевіч — старшыня калгаса "Праўда".

ВІННІКАЎ Павел Пятровіч — трактарыст калгаса "Ясная зара".

ВОЛКАВА Валянціна Якаўлеўна — рабочая саўгаса "Янова".

ВОРАНАВА Антаніна Васільеўна — даярка саўгаса імя П. М. Машэрава.

ВЯРЦІНСКІ Фама Адамавіч — настаўнік сярэдняй школы № 2 г. Сянно.

ГАЛУБЦОВА Антаніна Андрэеўна — звеннявая саўгаса "Багушэўскі".

ГАРАЛЁЎ Даніла Іванавіч — загадчык аддзела сельскай гаспадаркі райвыканкома.

ГАРАНАЎ Анатоль Цярэнцьевіч — брыгадзір ПМК-64.

ГАРНАК Мікалай Васільевіч — калгаснік калгаса імя Будзённага.

ГАРНАК Уладзімір Лявонавіч — брыгадзір калгаса імя Будзённага.

ДАРГЕЙКА Раіса Фёдараўна — даярка племзавода "Полымя".

ДАРОНІНА Аляксандра Пятроўна — брыгадзір племзавода "Полымя".

ДЗЕГАЛЕВІЧ Таццяна Кандратаўна — цялятніца калгаса імя Дзяржынскага.

ДЗІВАС Марыя Ягораўна — звеннявая племзавода "Полымя".

ДЗЯМЕШЧАНКА Ніна Селівестраўна — настаўніца Ульянавіцкай СШ.

ДУХОВІЧ Пётр Мацвеевіч — дырэктар саўгаса імя Данукалава.

ЕЎДАКІМАЎ Анатоль Міхайлавіч — дырэктар племзавода "Полымя".

ЖАГУЛОЎСКАЯ Марыя Цімафееўна — даярка калгаса "Полымя".

ЖАЛАНКОВА Хрысціна Васільеўна — звеннявая калгаса "Машканы".

ЖУДРО Матрона Васільеўна — калгасніца калгаса "Ударнік".

ЗАЙКО Любоў Пятроўна — настаўніца Сенненскай школы- інтэрната.

ЗАНЬКО Пётр Трафімавіч — брыгадзір калгаса "Праўда".

ЗЫГМАНТ Міхаіл Міхайлавіч — механік Багушэўскага спіртзавода.

ІЛЬЮШЭНКА Марыя Сямёнаўна — свінарка саўгаса "Багушэўскі".

КАЗЛОВА Ада Фёдараўна — рабочая саўгаса "Янова".

КАЗЛОВА Ганна Міхайлаўна — палявод калгаса імя Гастэлы.

КАЗЛОЎ Аляксей Міхайлавіч — дырэктар саўгаса "Янова".

КАЗЛОЎСКІ Сямён Ігнатавіч — вадзіцель саўгаса імя Данукалава.

КАЛАЧЫНСКАЯ Валянціна Пятроўна — даярка калгаса імя Суворава.

КАНАПЕЛЬКА Максім Піліпавіч — калгаснік калгаса "Сцяг Перамогі".

КАРАСЬ Аркадзь Паўлавіч — старшыня калгаса "Сцяг Перамогі".

КАЦАР Мікалай Сцяпанавіч — старшыня калгаса імя Кірава.

КАЧУК Алена Уладзіміраўна — брыгадзір саўгаса "Янова".

КІРЫЛЕНКАЎ А. — сакратар райкома КПБ.

КРАЎЧАНКА Леанід Мікалаевіч — трактарыст племзавода "Полымя".

КУЛЬБІЦКАЯ Марыя Савічна — апаратчыца Сенненскага малочнага завода.

КУЦЬКО Іван Сідаравіч — машыніст бульдозера Сенненскай міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі.

ЛАГУНОЎ Сяргей Аляксандравіч — вадзіцель аўтамабіля Обальскага біяхімзавода.

ЛАЗАРЭВІЧ Ефрасіння Пятроўна — звеннявая калгаса "Шлях да камунізму".

ЛІШАЁЎ Уладзімір Сяргеевіч — звеннявы калгаса імя Карла Маркса.

ЛУКАШЭВІЧ Рыгор Ягоравіч — старшы машыніст экскаватара Сенненскай ПМК-33.

ЛЫСКОЎ Васіль Яфімавіч — кладаўшчык райсельгастэхнікі.

ЛЮБАШОЎ Мікалай Яфімавіч — аператар фермы па вырошчванні маладняку буйной рагатай жывёлы калгаса імя Будзённага.

МАЕЎСКАЯ Соф'я Яўгенаўна — звеннявая калгаса імя Карла Маркса.

МАРЦІНОВІЧ Генадзь Іванавіч — трактарыст калгаса "Какоўчына".

МАРЧАНКА Яўгенія Дзянісаўна — брыгадзір племсаўгаса "Багушэўскі".

МАХАНЬКОЎ Фёдар Мікалаевіч — дырэктар Какоўчынскай СШ.

МАЧУЛЬСКАЯ Галіна Васільеўна — брыгадзір бетоншчыкаў МПМК-35.

МІКУЛЬСКІ Аляксандр Сямёнавіч — урач Сенненскай райбальніцы.

МІТАКОВІЧ Мікалай Герасімавіч — трактарыст калгаса "Какоўчына".

МЯЛЕШКА Зінаіда Палікарпаўна — звеннявая саўгаса імя Гараўца.

НІКАЛАЕВА П. — намеснік старшыні райвыканкома.

ПАГАРЭЛЬСКІ Рыгор Ануфрыевіч — брыгадзір калгаса "Кастрычнік".

ПАЗНЯКОЎ Міхаіл Мікалаевіч — жывёлавод калгаса "Ульянавічы".

ПАЛОНСКАЯ Ганна Кліменцеўна — звеннявая саўгаса "Полымя".

ПАШКЕВІЧ Васіль Трафімавіч — трактарыст калгаса "Ульянавічы".

ПЕТРЫЧЭНКА Віктар Нічыпаравіч — дырэктар саўгаса "Ходцы".

ПЕТУХОЎ Віктар Уладзіміравіч — шафёр Багушэўскага аддзялення "Сельгастэхніка".

ПІСКУНОВА Таццяна Аляксандраўна — калгасніца калгаса імя Суворава.

ПРУДНІКАЎ Сцяпан Аляксандравіч — аператар свінагадоўчага комплексу саўгаса імя Гараўца.

ПУСЦЕЛЬНІКАЎ Міхаіл Максімавіч — муляр Сенненскай ПМК-48.

РУСІН Анатоль Іванавіч — трактарыст калгаса "Запаветы Ільіча".

РУСІН Віктар Захаравіч — дырэктар Алексініцкай СШ.

РУМО Леанід Уладзіміравіч — брыгадзір калгаса імя Будзённага.

РЫБЧАНКА Мікалай Макаравіч — трактарыст калгаса "Праўда".

СЕРАДЗЕНКА Леанід Іванавіч — камбайнер калгаса імя Цімірязева.

СІМАНОВІЧ Аляксей Фёдаравіч — камбайнер калгаса "Ясная зара".

СКАКУН Алег Міхайлавіч — старшыня калгаса "Ленінскі шлях".

СКАКУН Віктар Аляксеевіч — дырэктар Сінягорскай НСШ.

СМЕЛЯКОЎ Васіль Гаўрылавіч — дырэктар вочна-завочнай школы.

СОКАЛАВА Марыя Прохараўна — звеннявая калгаса "Ясная зара".

СТАНКЕВІЧ Надзея Іванаўна — звеннявая калгаса "Ленінскі шлях".

СТАСЕЛЬКА Генадзь Барысавіч — трактарыст саўгаса імя Гараўца.

СУКОНКІН Іван Дзям'янавіч — брыгадзір калгаса імя Дзяржынскага.

СУКОНКІН Леанід Уладзіміравіч — камбайнер калгаса "Ударнік".

ТРАШЧОНАК Сяргей Лукіч — прадавец магазіна Яноўскага сельпо.

ФАНДО Генадзь Пятровіч — вадзіцель аўтамабіля Сенненскага ДРБУ-146.

ФЕДЗЮКОЎ Міхаіл Аляксеевіч — звеннявы калгаса імя Чапаева.

ХІЖАНКОВА Вольга Дзмітрыеўна — цялятніца калгаса "Застадолле".

ХЛЬШЧАНКА Лізавета Ільінічна — звеннявая калгаса "Верны шлях".

ЦЫВА Валянціна Іванаўна — даярка калгаса імя Карла Маркса.

ЦЫВІНСКІ Юрый Іванавіч — старшыня калгаса "1-е Мая".

ЦЮЦЮНОЎ Віктар Дзмітрыевіч — старшыня калгаса "Ясная зара".

ШАЛУХА Клаўдзія Аляксандраўна — калгасніца калгаса "Машканы".

ШУБКА Аляксей Міхайлавіч — старшыня калгаса "Шлях да камунізму".

ШУБКА Павел Андрэевіч — трактарыст Віцебскай эксперыментальнай гаспадаркі.

ШЫБЕКА Антон Фёдаравіч — трактарыст калгаса імя Леніна.

ШЫХАВА Вольга Іванаўна — звеннявая калгаса "Заветы Ільіча".

ШЭЙНІН Яфім Цодзікавіч — старшыня калгаса імя Будзённага.

ЮРЭВІЧ Уладзімір Мікалаевіч — вадзіцель аўтамабіля калгаса імя Суворава.

ЯСІНСКІ Сяргей Рыгоравіч — загадчык фермы калгаса імя Калініна.

ОРДЭН ПРАЦОЎНАЙ СЛАВЫ II СТУПЕНІ

БАБАХІН Сяргей Данілавіч — трактарыст саўгаса "Янова".

МАРЦІНОВІЧ Віктар Мікітавіч — трактарыст калгаса "Ясная зара".

ПАРАДЗЕНКА Павел Малахавіч — трактарыст саўгаса "Ходцы".

РАБЦАЎ Міхаіл Аляксеевіч — вадзіцель аўтамабіля саўгаса імя Гараўца.

ЮРОЎСКІ Мікалай Андрэевіч — трактарыст калгаса "Ленінскі шлях".

ОРДЭН ПРАЦОЎНАЙ СЛАВЫ III СТУПЕНІ

АДНАРОГІ Аляксандр Сяргеевіч — трактарыст калгаса "Верны шлях".

АЗАРОНАК Віктар Марцінавіч — трактарыст калгаса "Ледневічы".

АНШЧАНКА Валянціна Ягораўна — звеннявая калгаса імя Заслонава.

АСТАПОВІЧ Кацярына Пятроўна — сартавальніца валакна Сенненскага льнозавода.

БАЛАЦІНСКІ Уладзімір Рыгоравіч — вадзіцель аўтамабіля калгаса "Ударнік".

БАРКАВЕЦ Ніна Іосіфаўна — даярка калгаса "Праўда".

БАРЭЙКА Станіслаў Іосіфавіч — вадзіцель аўтамабіля калгаса "Чырвоны пуцілавец".

БЕЛЬЧЫКАЎ Цімафей Іванавіч — трактарыст саўгаса імя Гараўца.

БІРУКОЎ Віктар Міхайлавіч — токар райсельгастэхнікі.

БОНДАРАВА Ніна Фёдараўна — закройшчыца Багушэўскага камбіната бытавога абслугоўвання.

БУРДО Антон Нічыпаравіч — электразваршчык райсельгастэхнікі.

ВАКАР Іван Васільевіч — трактарыст племсаўгаса "Багушэўскі".

ГАРБАЧОЎ Міхаіл Паўлавіч — пастух калгаса "Верны шлях".

ГАРБАЧОЎ Сяргей Якаўлевіч — трактарыст калгаса імя Жданава.

ГАРНАК Аляксандр Аляксандравіч — трактарыст калгаса "Бярозкі".

ГАРНАК Купрэй Сямёнавіч — даглядчык жывёлы калгаса імя Будзённага.

ГРЭБНЕВА Лілія Рыгораўна — даярка саўгаса імя П. М. Машэрава.

ГРЫНЯВЕЦКІ Міхаіл Баляслававіч — брыгадзір калгаса "Шлях да камунізму".

ГУСОЎСКАЯ Антаніна Якаўлеўна — жывёлавод саўгаса "Янова".

ДРУЖЫНА Марыя Нічыпараўна — звеннявая калгаса імя Леніна.

ДУБІН Віктар Мікалаевіч — трактарыст калгаса "Запаветы Ільіча".

ЕРМАШКЕВІЧ Міхаіл Васільевіч — вадзіцель аўтамабіля калгаса імя Цімірязева.

ЖЫХАР Ганна Фёдараўна — даярка калгаса "Ледневічы".

ЗАРУБІЦКІ Васіль Васільевіч — механізатар племсаўгаса "Полымя".

ЗЯЗЮЛІНА Ніна К. — рабочая будаўнічага ўчастка райспажыўсаюза.

ЗЯМЦОЎ Міхаіл Фёдаравіч — трактарыст саўгаса імя Данукалава.

ІНАЯТАВА Антаніна Іванаўна — цялятніца калгаса "Ленінскі шлях".

КАВАЛЕНКА Уладзімір Іосіфавіч — трактарыст саўгаса "Ходцы".

КАЗЛОВА Еўдакія Іванаўна — цялятніца калгаса імя Кірава.

КАНАПЕЛЬКА Любоў Канстанцінаўна — чабан калгаса "Сцяг Леніна".

КАРПОВІЧ Надзея Дзмітрыеўна — даярка калгаса "Сцяг Перамогі".

КАЦУРА Ціхан Сцяпанавіч — трактарыст калгаса "Шлях да камунізму".

КОЗІЧКІН Віктар Іванавіч — машыніст экскаватара Сенненскай ПМК-44.

КУРС Валянціна Еўдакімаўна — настаўніца сярэдняй школы № 1 г. Сянно.

КУСР Пётр Аляксандравіч — механізатар калгаса "Ульянавічы".

КУЧЫНСКАЯ Галіна Ягораўна — даярка калгаса "Кастрычнік".

МАЛАХАЎ Фёдар Уладзіміравіч — трактарыст племзавода "Полымя".

МАРГАЎЦОЎ Цімафей Іванавіч — трактарыст саўгаса "Ходцы".

МАХАНЬКОЎ Мікалай Рамановіч — трактарыст калгаса імя Дзяржынскага.

МУРАШКА Уладзімір Максімавіч — вадзіцель аўтамабіля калгаса імя Гастэлы.

МЯЖНІН Аляксандр Лаўрэнавіч — вадзіцель аўтамабіля племсаўгаса "Багушэўскі".

МЯЛЕШКА Мікалай Сяргеевіч — трактарыст калгаса "Кастрычнік".

ПАЗНЯКОЎ Уладзімір Мікалаевіч — трактарыст калгаса "Ульянавічы".

ПАШКЕВІЧ Васіль Трафімавіч — трактарыст калгаса "Ульянавічы".

ПАШКЕВІЧ Лілія Міхайлаўна — даярка саўгаса "Ходцы".

ПЛАВІНСКАЯ Любоў Дзмітрыеўна — даярка племзавода "Полымя".

ПРАКАПОВІЧ Аркадзь Мікалаевіч — брыгадзір калгаса "Праўда".

ПРЫСТАЎКА Анатоль Ягоравіч — брыгадзір калгаса "Бярозкі".

РАБУШКА Анатоль Сцяпанавіч — вадзіцель аўтамабіля калгаса "Запаветы Ільіча".

РАБЦОЎ Міхаіл Аляксеевіч — трактарыст саўгаса імя Гараўца.

РЫБАКОВА Раіса Іванаўна — масларob Сенненскага завода сухога абястлушчанага малака.

СІНІЦА Алег Іванавіч — вадзіцель аўтамабіля племсаўгаса "Багушэўскі".

СІНІЧЭНКА Анатоль Сцяпанавіч — трактарыст калгаса імя Ціміразева.

СМЕЛЯКОВА Дзіна Фёдараўна — майстар Сенненскага хлебакамбіната.

СОЧНЕЎ Пётр Кузьміч — трактарыст калгаса імя Суворава.

ХМЯЛЬКОЎ Аркадзь Азаравіч — трактарыст калгаса імя Заслонава.

ХРАПАВІЦКІ Ян Іосіфавіч — столяр Багушэўскай мэблевай фабрыкі.

ЦІЦЯНКОЎ Цімафей Парфенавіч — трактарыст калгаса "Ударнік".

ШАПКОЎСКІ Сямён Цімафеевіч — даглядчык жывёлы калгаса "Кастрычнік".

ШАЎКУН Ягор Васільевіч — брыгадзір племзавода "Полымя".

ШЛЫК Ядзвіга Андрэеўна — трактарыстка племсаўгаса "Багушэўскі".

ЮКОВІЧ Іван Іванавіч — машыніст экскаватара Сенненскай ПМК-33.

ЯНКОЎ Іван Іванавіч — трактарыст саўгаса імя Гараўца.

Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

ГРУНТОЎ Пётр Сцяпанавіч. Гл. у раздзеле "Вучоныя".

ЗАСЛУЖАНЫ АГРАНОМ

БАРКОЎСКІ Захар Іванавіч. Гл. у раздзеле "Героі Сацыялістычнай Працы".

ЗАСЛУЖАНЫ БУДАЎНІК

БАБАК Пётр Лук'янавіч. Гл. у раздзеле "Героі Сацыялістычнай Працы".

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ТРАНСПАРТА

ВАЛАДЗЬКО Яўген Іванавіч. Гл. у раздзеле "Дзяржаўныя дзеячы".

Заслужаныя работнікі культуры

П. В. Бельскі.

Дз. М. Марчанка.

БЕЛЬСКІ Пётр Васільевіч, нарадзіўся 22.3.1919 г. у в. Ніўё Расонскага раёна. Заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь. Скончыў Полацкае педагагічнае вучылішча, Сухумскае пяхотнае вучылішча. У 1959 г. завочна скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам, дырэктарам сямігодкі, рэдактарам Расонскай раённай газеты "Сацыялістычная праца", Сенненскай раённай газеты "Шлях да камунізму", аб'яднанай газеты Талачынскага і Сенненскага раёнаў "Сцяг Ільіча". З 1963 г. да выхаду на пенсію быў рэдактарам Сенненскай раённай газеты "Ленінская іскра". Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі "За адвагу", "За абарону Кіева", "Партызану Айчыннай вайны" I і II ступені, "За працоўную адзнаку". Двойчы быў узнагароджаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 16.9.1997 г.

П. І. Ермашкевіч.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ДЗЕЯЧЫ КУЛЬТУРЫ

ВЯЛЮГІН Анатоль Сцяпанавіч. Гл. у раздзеле "Творцы".

ГАРБАЧОЎ Міхаіл Васільевіч. Гл. у раздзеле "Творцы".

ЛІ Соф'я Дзмітрыеўна. Гл. у раздзеле "Творцы".

МАРЧАНКА Дзмітрый Мікалаевіч. Нарадзіўся 10.4.1926 г. у в. Заполле. Заслужаны работнік культуры БССР (1975), член Беларускага Саюза журналістаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў на камсамольскай рабоце і ў рэдакцыі раённай газеты.

Пасля заканчэння Беларускага Дзяржаўнага універсітэта (1958), працаваў на розных пасадах у Дзяржтэлерадыё БССР — рэдактарам, старшым рэдактарам, галоўным рэдактарам, галоўным дырэктарам Галоўнай дырэкцыі праграм Беларускага радыё. Аўтар шматлікіх нарысаў пра партызан і воінаў Чырвонай арміі ў гады вайны: "Героі безыменнай вышыні", "Подзвіг танкіста", "Так ёй сэрца падказала", "Гісторыя аднаго пашпарта", якія перадаваліся па Беларускаму радыё і друкаваліся ў рэспубліканскіх газетах. У хроніцы "Памяць" змешчаны нарыс "Мы гэтай памяці верныя". Сааўтар кнігі "Гаворыць і паказвае Беларусь" (1975).

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі "За баявыя заслугі", "За працоўную доблесць" і інш., Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1965, 1985).

СТУК Анатоль Іванавіч. Нарадзіўся 16.7.1922 г. у в. Савінічы. Заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь (1976), член Беларускага Саюза журналістаў (1958).

Скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1958). Працаваў у раённай газеце, у абласной газеце "Віцебскі рабочы", у рэспубліканскай — "Звязда". У 1963—1972 — галоўны рэ-

дактар Галоўнай рэдакцыі замежнага вяшчання Дзяржтэлерадыё БССР. Загадчык Беларускага аддзялення агенцтва друку навіны (1972—1991).

Аўтар кніг — "Дзесяць дзён у Аўстрыі" (1961), "Дарогай няўрымслівых" (1963), "Перадачы вядзе ЦРУ" (1974), нарысаў у часопісе "Беларуская думка", "Старонкі апаленыя вайной" (№ 5, 1966), "Вермахт: працаздольных лічыць палоннымі" (№ 5, 1997), "Батальён смерці, які спаліў Хатынь і яе жыхароў" (№ 7, 1998).

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ст., медалямі "Партызану Вялікай Айчыннай вайны", "За працоўную доблесць", Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 21.1.2002 г.

ШЫЛЬКО Іван Іванавіч. Нарадзіўся 22.11.1930 г. у в. Вялікая Пярэспа ў сялянскай сям'і. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1982). Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1957). Працаваў дырэктарам школы ў Маладзечанскай вобласці (з 1952), Машчонскай сярэдняй школы (з 1959), Багушэўскай СШ № 2 (з 1963). Выбіраўся членам Сенненскага райкома КПБ. Узнагароджаны значкамі "Выдатнік народнай асветы" (1965) і "Выдатнік асветы СССР" (1984). Памёр 4.1.1993 г.

А. І. Стук.

І. І. Шылько.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ

ГОМАНАЎ Уладзімір Кірылавіч. Гл. у раздзеле "Творцы".

НАРОДНАЯ АРТЫСТКА

КАНАПЕЛЬКА Зінаіда Ігнатаўна. Гл. у раздзеле "Творцы".

ЗАСЛУЖАНЫЯ АРТЫСТЫ

ДАВЫДЗЬКА Генадзь Браніслававіч. Гл. у раздзеле "Творцы".

РЫЖКОВА Ганна Паўлаўна. Гл. у раздзеле "Творцы".

Заслужаныя настаўнікі

АЎРАМЕНКА Мяфодзій Іванавіч. Нарадзіўся 6.6.1916 г. у в. Пабеднае Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны настаўнік Беларусі (1965). Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1939). Віцебскі педагагічны інстытут (1956). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам СШ № 2 г. Сянно, дырэктарам СШ № 1 г. Сянно, загадчыкам раённага аддзела народнай адукацыі, дырэктарам СШ № 2 г. Сянно. Узнагароджаны значком "Выдатнік народнай асветы" (1963). Памёр у 1988 г.

М. І. Аўраменка.

Ф. А. Вярцінскі.

ВЯРЦІНСКІ Фама Адамавіч. Нарадзіўся 30.12.1915 г. у в. Тухінка. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967). Скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут (1939), Віцебскі педагагічны інстытут (1953). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пра-

І. І. Еўпак.

Ю. І. Касабуцкая.

Н. І. Кучынская.

П. Я. Набераж нёва.

Г. А. Платонава.

У. І. Пуцееў.

цаваў настаўнікам Навасельскай сямігадовай, Какоўчынскай сярэдняй школ, з 1946 г. — у Сенненскай СШ № 2. Узнагароджаны ордэнамі "Знак Пашаны", Айчыннай вайны II ступені, баявымі медалямі, значком "Выдатнік народнай адукацыі" (1958).

ЕЎПАК Ніна Нічыпараўна. Нарадзілася 15.3.1934 г. у в. Новае Прыбужжа Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаная настаўніца Беларусі (1976). Скончыла Полацкі педагагічны інстытут (1957). Працавала настаўніцай фізікі, дырэктарам Беліцкай сярэдняй школы. Узнагароджана ордэнам "Знак Пашаны" (1971).

КАСАБУЦКАЯ Юзэфа Іванаўна. Нарадзілася ў 1918 г. у г. Сянно. Заслужаная настаўніца Беларусі (1967). Скончыла Лепельскае педвучылішча (1938). Працавала настаўніцай пачатковых класаў у школах былога Багушэўскага раёна, з 1946 г. у Сенненскай СШ № 2.

КУЧЫНСКАЯ Ніна Іванаўна. Нарадзілася 25.1.1926 г. у в. Крыльцова. Заслужаная настаўніца Беларусі (1971). Скончыла Лідскае педвучылішча (1948). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Працавала настаўніцай пачатковых класаў Сукрэменскай і Нерайшанскай пачатковых школ.

НАБЕРАЖНЁВА Наталля Якаўлеўна. Нарадзілася 18.10.1926 г. у Тамбоўскай вобласці. Заслужаная настаўніца Беларусі (1963). Скончыла Расказаўскае педвучылішча. З 1947 г. працавала настаўніцай у Багушэўскай сярэдняй школе № 2. Узнагароджана значком "Выдатнік народнай асветы" (1961).

ПЛАТОНАВА Ганна Антонаўна. Нарадзілася 24.1.1914 г. у в. Новая Зямля Дубровенскага раёна. Заслужаная настаўніца Беларусі (1964). Скончыла Аршанскае педвучылішча (1933). Працавала настаўніцай пачатковых класаў у Аршанскім раёне, з 1939 г. — у Багушэўскай СШ, Каролінскай аздараўленчай школе (з 1951), Багушэўскай СШ № 1 (з 1960). Памерла 12.12.1996 г. у Віцебску.

ПУЦЕЕЎ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967). Скончыў Віцебскі пединстытут (1955). Працаваў настаўнікам у Аршанскім раёне, з 1961 г. настаўнікам, завучам у Багушэўскай СШ № 2.

САПРОНЕНКА Фёдар Пілінавіч, нарадзіўся 6.9.1923 г. у в. Грузды. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967). Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1961). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Ф. П. Сапроненка.

З. І. Усовіч.

Н. Дз. Царава.

З. А. Шмурадка.

З 1948 г. працаваў у школах Сенненскага раёна, з 1955 г. — дырэктар Малыкаўскай сярэдняй школы Браслаўскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, многімі медалямі. Зараз пражывае ў в. Зямковічы на Сенненшчыне.

УСОВІЧ Зінаіда Іванаўна. Нарадзілася 25.10.1930 г. у г. п. Ушачы ў сям'і рабочага. Заслужаная настаўніца Беларусі (1968). Скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут (1958). Працавала настаўніцай у школах Ушацкага раёна. З 1959 г. настаўніца, завуч Багушэўскай СШ № 1.

ЦАРАВА Надзея Дзянісаўна. Нарадзілася 20.5.1922 г. у в. Заполле. Заслужаная настаўніца Беларусі (1967). Скончыла Аршанскае педвучылішча (1948). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Працавала старшай піянерважатай у Расненскай СШ (з 1939), настаўніцай пачатковых класаў Краснасельскай (з 1948) і загадчыцай Вейнянскай (з 1953) пачатковых школ.

ШМУРАДКА Зінаіда Антонаўна. Нарадзілася 11.10.1923 г. у в. Высачаны Лёзненскага раёна. Заслужаная настаўніца Беларусі (1968). Скончыла Віцебскі педагагічны інстытут (1948). Працавала настаўніцай матэматыкі ў Лёзненскім, Аршанскім раёнах, г. Барысаве. З 1952 г. настаўніца, завуч Багушэўскай СШ № 1, з 1973 г. настаўніца Багушэўскай СШ № 2. Узнагароджана значком "Выдатнік народнай асветы" (1967).

ЯКАЎЛЕЎ Сцяпан Сямёнавіч. Нарадзіўся 8.8.1912 г. у в. Забор'е Гарадоцкага раёна. Заслужаны настаўнік Беларусі (1965). Скончыў Магілёўскі педінстытут (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1930 г. працаваў настаўнікам, дырэктарам Навасельскай школы, загадчыкам Багушэўскага раённага аддзела адукацыі (з 1945), намеснікам старшыні Багушэўскага райвыканкома (з 1948), завучам, дырэктарам Багушэўскай СШ № 1. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай ваны I ступені, медалямі "За адвагу", "За баявыя заслугі", значком "Выдатнік народнай асветы" (1955). Памёр 30.6.1997 г.


С. С. Якаўлеў.

А. П. Яроменка.

ЯРОМЕНКА Аліна Піліпаўна. Нарадзілася 21.6.1928 г. у в. Тухінка. Заслужаная настаўніца Беларусі (1971). Скончыла Аршанскае педвучылішча (1949). Працавала настаўніцай пачатковых класаў у былой Маладзечанскай вобласці. З 1952 г. у Сенненскай СШ № 1. Узнагароджана значком "Выдатнік народнай асветы" (1965).

А. А. Яскевіч.

Л. А. Дружына.

М. С. Мурашкевіч.

Я. М. Усціновіч.

ЯСКЕВІЧ Аляксандра Андрэеўна. Нарадзілася 1.6.1920 г. у в. Малая Пярэспа. Заслужаная настаўніца Беларусі (1968). Скончыла Лепельскае педвучылішча (1938). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Працавала настаўніцай пачатковых класаў у школах Аршанскага раёна, у Беліцкай сярэдняй школе (з 1953). Узнагароджана медалём "За баявыя заслугі".

Заслужаныя ўрачы

БЯРГОВІНА Настасся Данілаўна. Нарадзілася ў 1907 г. у в. Пацкава. Заслужаны ўрач Беларусі (1960). Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут (1937). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. З 1941 г. працавала ў Сенненскай раённай бальніцы. Памерла ў 1995 г.

КЛІКУНЕЦ Ніна Васільеўна. Нарадзілася ў 1913 г. у в. Старая Беліца. Заслужаны ўрач Беларусі (1959). Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут (1937). Працаваць пачала ў 1937 г. ў Скідзельскім раёне Гродзенскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну — начальнік інфекцыйнага шпіталя Сенненскай партызанскай брыгады. З 1944 г. — урач Сенненскай раённай бальніцы. Памерла ў 1986 г.

МІКУЛЬСКІ Аляксандр Сямёнавіч. Нарадзіўся ў 1895 г. Заслужаны ўрач Беларусі (1949). Працаваў галоўным урачом Сенненскай раённай бальніцы. Памёр у 1950 г.

Заслужаны лесавод

ДРУЖЫНА Леанід Андрэевіч. Нарадзіўся 25.8.1939 г. у в. Серкуці. Заслужаны лесавод Беларусі (1977). Скончыў Полацкі лясны тэхнікум (1960). Працаваў тэхнікам-лесаводам, ляснічым Багушэўскага лясніцтва. Памёр 13.4.2002 г.

РУБЛЕЎСКІ Сяргей Аляксеевіч. Нарадзіўся 15.11.1924 г. у в. Какоўчына. Заслужаны лесавод БССР (1979) і Польскай Народнай Рэспублікі. З 1966 года намеснік Міністра лясной гаспадаркі БССР. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалямі. Памёр 17.4.2001 г.

Заслужаныя трэнеры

МУРАШКЕВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч. Нарадзіўся 7.4.1952 г. у в. Баравікі. Заслужаны трэнер Беларусі (1991). Скончыў Смаленскі інстытут фізічнай культуры (1979). Працаваў трэнерам у спартыўных школах г. Сянно і г. Віцебска. З 1979 г. выкладчык Лужаснянскай гімназіі.

УСЦІНОВІЧ Яўген Мікітавіч. Нарадзіўся 30.1.1940 г. у г. Сянно. Заслужаны трэнер Беларусі (1995). Скончыў цэнтральную школу трэнераў г. Смаленска (1964). Працаваў намеснікам дырэктара, дырэктарам Сенненскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы.

Заслужаныя майстры спорту

ІВАШКА Пётр Анатольевіч, біятланіст. Гл. у раздзеле «Сенненшчына спартыўная».

КУРАНЦОЎ Віктар Рыгоравіч, штангіст. Гл. у раздзеле «Сенненшчына спартыўная».

Яны нарадзіліся на Сенненшчыне

Вайскоўцы

ВАКАР Віктар Канстанцінавіч. Нарадзіўся ў 1942 г. у г. п. Багушэўск. Генерал-маёр (1992). Скончыў Адэскае вышэйшае ваеннае вучылішча (1964). Прайшоў шлях ад камандзіра ўзвода да памочніка глаўкома Сухапутных войск. У 1994 г. прызначаны начальнікам Ваеннай акадэміі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны трыма ордэнамі і медалямі. Памёр 15.3.1998 г.

ГЕРАСІМАЎ Дзмітрый Міхайлавіч. Нарадзіўся 14.6.1946 г. у в. Варашылы. Генерал-лейтэнант. Скончыў Ташкенцкае ваеннае вучылішча (1967), акадэміі імя Фрунзе (1978), Генштаба (1990). З 1968 г. службу праходзіў у войсках спецыяльнага прызначэння, дзе прайшоў шлях ад камандзіра групы да камандзіра брыгады. З 1992 г. служыў у органах дзяржбяспекі, узначальваў групу "Вымпел", быў намеснікам начальніка акадэміі ФСБ РФ, начальнікам штаба Дэпартамента ФСБ РФ. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Баявога Чырвонага Сцяга, "За ваенныя заслугі", многімі медалямі. З 1999 г. у запасе. Жыве ў Маскве.

КАВАЛЕНКА Уладзімір Міхайлавіч. Нарадзіўся 18.6.1936 г. у вёсцы Малы Азярэцк. Генерал-маёр (1988). Скончыў Томскае ваеннае вучылішча (1957) і Кіеўскае вышэйшае ваеннае вучылішча (1971). Служыў у войсках супрацьпаветранай абароны на пасадах ад камандзіра ўзвода да начальніка войск супрацьпаветранай абароны Прыволжска-Уральскай ваеннай акругі. Узнагароджаны ордэнамі "За службу Радзіме" II і III ступеняў, медалямі. Памёр 1.6.1994 г.

КАСАБУЦКІ Іван Сцяпанавіч. Нарадзіўся 19.3.1895 г. у г. Сянно. Генерал-лейтэнант (1944). Скончыў ваенныя акадэміі імя Фрунзе (1930), Генштаба (1940). У арміі з 1915 г., у Чырвонай Арміі з 1918 г. У грамадзянскую вайну ўдзельнік баёў супраць польскіх інтэрвентаў, бандаў Булак-Балаховіча: камандзір палка, брыгады. У 1921—1938 гг. камандзір брыгады, корпуса, намеснік начальніка штаба ваеннай акругі. З 1939 г. выкладчык Ваеннай акадэміі Генштаба. У Вялікую Айчынную вайну на Паўночна-Заходнім, Паўднёва-Заходнім і 3-м Украінскім франтах: камандзір корпуса, памочнік камандуючага войскамі фронту. Удзельнік вызвалення Днепрапятроўска, Крывога Рога, фарсіравання Паўднёвага Буга, Днястра, Яска-Кішынёўскай аперацыі. У 1946—1953 гг. на выкладчыцкай рабоце ў Ваеннай акадэміі Генштаба. Узнагароджаны ордэнам Леніна, шасцю іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 15.11.1974 г.

І. С. Касабуцкі.

КУЗНЯЦОЎ Аляксей Харытонавіч. Нарадзіўся 26.5.1901 г. у в. Леснікі. Генерал-маёр юстыцыі (1943). Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў Маскоўскі універсітэт (1926). У Чырвонай Арміі з мая 1919 г. З 1919 г. на Петраградскім фронце. У 1926—1941 гг. у пракуратуры корпуса ваеннай акругі групы войск, пракурор пагранічнай і ўнутранай аховы Далёкаўсходняга краю, памочнік Галоўнага ваеннага пракурора. У Вялікую Айчынную вайну ваенны пракурор Маскоўскай зоны абароны і Заходняга фронту, Маскоўскай ваеннай акругі. З ліпеня 1944 г. у апараце Міністэрства абароны СССР. Узнагароджаны ордэнам Леніна, чатырма іншымі ордэнамі, медалямі.

ЛАЗАРЭВІЧ Фёдар Захаравіч. Нарадзіўся 28.2.1896 г. у в. Балюга. Генерал-маёр (1942). Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў Ваенную акадэмію РСЧА (1922). У арміі з 1914 г., у Чырвонай гвардыі ў Сянне з снежня 1917 г., потым у Чырвонай Арміі. У 1917—1919 гг. удзельнічаў у баях пад Ковелем, на р. Стаход, у раззбраенні "ударных батальёнаў" Керанскага, у баях супраць польскіх інтэрвентаў: камандзір атрада, роты. У 1935—1941 гг. — выкладчык, начальнік факультэта Ваеннай акадэміі імя Фрунзе. У Вялікую Айчынную вайну на Бранскім, Заходнім, Карэльскім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Удзельнік вызвалення Беларусі. З 1946 г. у штабе тылу Узброеных сіл. Узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр у 1959 г.

СУПРАН Барыс Давыдавіч. Нарадзіўся 10.7.1904 г. у г. п. Багушэўск. Генерал-маёр. Скончыў ваенна-хімічную школу (1932). З 1920 г. працаваў станочнікам на заводзе ў Петраградзе, вучыўся ў вячэрнім інстытуце. У Чырвонай Арміі з 1926 г. Камандаваў хімічнымі падраздзяленнямі, быў начальнікам хімічнай службы танкавага батальёна, танкавай брыгады (1935—1938). У Вялікую Айчынную вайну начальнік штаба, камандзір танкавай брыгады. Узнагароджаны сямю ордэнамі і медалямі. Памёр у 1967 г.

СУРЫН Сяргей Іванавіч. Нарадзіўся ў 1903 г. у в. Рудня. Генерал-маёр. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. (1939). У Чырвонай Арміі з 1922 г. У Вялікую Айчынную вайну начальнік аддзела, намеснік начальніка штаба арміі на Паўночна-Каўказскім, Варонежскім і Паўднёва-Заходнім франтах. З мая 1943 г. па красавік 1952 г. на адказных пасадах у цэнтральным апараце Міністэрства Абароны СССР. Узнагароджаны сямю ордэнамі і медалямі. Памёр у 1952 г.

ЮРОЎСКІ Барыс Лявонавіч. Нарадзіўся 13.2.1898 г. у в. Латыгаль. Генерал-маёр (1943). Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў курсы ўдасканалення нач. саставу РСЧА (1935). З 1915 г. тэлеграфіст на чыгуначнай станцыі Рудня. З 1919 г. у Чырвонай Арміі на Заходнім і Туркестанскім франтах. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Варонежскім, 1-м Украінскім франтах, начальнік штаба і памочнік камандзіра дывізіі, інспектар кавалерыі. З 1946 г. ваенком Астраханскай, Растоўскай абласцей. Узнагароджаны ордэнам Леніна, сямю іншымі ордэнамі, медалямі.

Падрыхтаваў Б. Дз. Даўгатовіч.

Вучоныя

БУЦЬЯНАЎ Даніла Дзяменцьевіч. Нарадзіўся 9.12.1918 г. у в. Хамёнкі. Беларускі вучоны ў галіне эпізааталогіі. Доктар ветэрынарных навук (1974). Прафесар (1975). Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут (1939). Працаваў у Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. (1947—1954, 1964—1992). У 1973—1988 гг. загадчык кафедры эпізааталогіі акадэміі. Навуковыя працы па патагенезе і імунітэце пры рожы і іншых хваробах свіней, мерах барацьбы з лептаспірозам і пастэрэлёзам сельскагаспадарчых жывёл, адначасовай вакцынацыі жывёл супраць некалькіх інфекцый.

ВАСІЛЁНАК Сяргей Іванавіч. Нарадзіўся 23.2.1902 г. у в. Гарывец у сялянскай сям'і. Літаратуразнавец, гісторык літаратуры, фальклярыст. Працаваў у Віцебскім і Магілёўскім пединстытутах. Складальнік зборніка "Беларускі эпас" (разам з М. Грынблатам і К. Кабашнікавым), хрэстаматыі для ВНУ "Вусна-паэтычная творчасць беларускага народа" (з І. Гутаравым). Пасля Вялікай Айчыннай вайны працаваў у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Памёр 15.4.1982 г.

ВОЛКАЎ Мікалай Фёдаравіч. Нарадзіўся 26.1.1931 г. у в. Нярэйша. Доктар медыцынскіх навук (1976). Прафесар (1976). Скончыў Віцебскі медыцынскі

інстытут (1956). Працаваў у Талачынскім раёне (1956). З 1963 г. у Гродзенскім мед-інстытуце, дзе прайшоў працоўны шлях ад асістэнта да прарэктара (1976—1997). Навуковыя працы "Гемодинамика малого круга кровообращения" (1990). "Мерцательная аритмия. Старые проблемы — новые решения" (1997) і іншыя па праблемах шпітальнай тэрапіі ўнутраных хвароб. Узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны", значком "Выдатнік аховы здароўя".

ГАЛУЗА Іларыён Рыгоравіч. Нарадзіўся 7.4.1899 г. у в. Даргейкі. Заолаг і паразітолаг. Акадэмік Акадэміі навук Казахстана (1946). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951). Доктар біялагічных навук, прафесар (1943). Скончыў Ленінградскі ветэрынарны інстытут (1925). З 1927 г. у Інстытуце заалогіі Казахстана. У 1951—1967 — дырэктар, у 1946—1951 гг. акадэмік-сакратар аддзялення біялагічных навук Акадэміі навук Казахстана. Навуковыя працы па вывучэнню фауны і экалогіі кляшчоў-пераносчыкаў узбуджальнікаў кровапаразітарных хвароб жывёл і чалавека, распрацоўцы біялагічнага метаду барацьбы з імі. Выявіў прыродныя асяродкі лентаспірозаў і бруцэлёзу, прыродную ачаговасць таксаплазмозу, даказаў магчымасць перадачы ўзбуджальніка бруцэлёзу праз іксодавых кляшчоў. Памёр 10.10.1977 г.

ГРУНТОЎ Пётр Сцяпанавіч. Нарадзіўся 10.8.1933 г. у в. Гарнова. Беларускі вучоны ў галіне транспартных сістэм. Доктар тэхнічных навук (1978), прафесар (1977). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі (1978). Лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР (1989), член Нью-Йоркскай Акадэміі навук (1966). Скончыў Беларускі інстытут чыгуначнага транспарту (1958). З 1960 г. у Беларускім універсітэце транспарту (1986—1996 — рэктар). Аўтар навуковых прац па аўтаматызаваных сістэмах кіравання чыгуначнага транспарту, тэорыі экстрэмальных станаў і іх імавернасна-аналітычным апісанні, стварэнні методык разліку надзейнасці і бяспечнасці пропуску транспартных патокаў. Узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны".

А. І. Залескі.

ЗАЛЕСКІ Адам Іосіфавіч. Нарадзіўся 4.4.1912 г. у в. Кімейка ў сялянскай сям'і. Беларускі гісторык, этнограф. Доктар гістарычных навук (1963). Прафесар (1964). Акадэмік Міжнароднай Славянскай Акадэміі (2000). У 1940 г. скончыў Мінскі педагагічны інстытут. У 1937—1940 гг. намеснік дырэктара Мінскага педагагічнага вучылішча. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945—1953 гг. выкладчык, дэкан Курскага педінстытута. З 1953 г. загадчык сектара этнаграфіі Інстытута гісторыі, з 1957 г. намеснік дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. У 1970—1981 гг. у Інстытуце гісторыі АН БССР.

Дзесяць гадоў працаваў старшынёй Мінскай абласной арганізацыі "Веды". З 1994 г. старшыня Беларускага рэспубліканскага аб'яднання "Гістарычныя веды".

Аўтар прац па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, нацыянальных адносін, намеснік галоўнага рэдактара і адзін з аўтараў 4-га тома 5-томнай "Гісторыі Беларускай ССР" (1975), рэдактар і адзін з аўтараў "Нарысаў ваеннай гісторыі Беларусі" (ч. 1—5, 1995). Сааўтар 6-томнага выдання "История Великой Отечественной войны Советского Союза" і 12-томнага "История второй мировой войны", "Очерков военной истории Белоруссии". Аўтар манаграфій "Быт беларускіх сялян у партызанскім краі" (Мн., 1960), "В партизанских краях и зонах" (М., 1962), "В тылу врага" (Мн., 1974).

Апублікаваў 8 манаграфій, 8 брашур, каля 300 навуковых прац. Узнагароджа-

ны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалямі. Памёр 4.8.2002 г.

ЗАЛЕСКАЯ Галіна Адамаўна. Нарадзілася 20.2.1937 г. у в. Кімейка. Беларускі вучоны ў галіне атамнай і малекулярнай фізікі. Доктар фізіка-матэматычных навук (1987). Прафесар (1993). Член Нью-Йоркскай Акадэміі навук (1995). Скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1959). У 1962—1965 гг. працавала ў БДУ, у 1966—1992 гг. у Інстытуце фізікі, з 1992 г. у Інстытуце атамнай і малекулярнай фізікі НАН Беларусі. Аўтар больш чым 100 навуковых прац, у тым ліку: "Энергетические зависимости характеристик столкновительного обмена колебательной энергией в парах многоатомных молекул" (разам з Дз. Л. Якаўлевым), "Оптика и спектроскопия", 1995, т. 78 № 2, "Инфракрасное многофотонное возбуждение многоатомных молекул" (Журнал прикладной спектроскопии", 1998, т. 65 № 5).

КАЖАРСКАЯ Ларыса Рыгораўна. Нарадзілася 7.4.1938 г. у г. Сянно. Доктар медыцынскіх навук (1975). Прафесар (1979). У 1960 г. скончыла Ленінградскі педыятрычны медыцынскі інстытут. З 1963 г. у Беларускім інстытуце ўдасканалення ўрачоў, з 1980 г. — загадчык кафедры. Сааўтар "Справочника участкового педиатра" (1991), "Справочника семейного врача" (1997). Навуковая дзейнасць па праблемах дзіцячай кардыярэўматалогіі, вегетатыўнай дысфункцыі, дыягностыкі, лячэння, рэабілітацыі сістэмных захворванняў злучальнай тканкі, сардэчнай недастатковасці ў дзяцей рознага ўзросту.

КАЦАР Міхаіл Сяргеевіч. Нарадзіўся 25.10.1906 г. у в. Клімавічы ў сялянскай сям'і. Беларускі гісторык мастацтва. Доктар мастацтвазнаўства (1952), прафесар (1956). У 1939 г. скончыў Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1943 г. займаўся ў аспірантуры пры дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі пад кіраўніцтвам вядомага савецкага гісторыка мастацтва І. Э. Грабара. З 1946 г. у АН Беларусі: інстытутах мовы, літаратуры і мастацтва; мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Адначасова ў 1953—1956 гг. выкладаў у Беларускім тэатральным інстытуце. Аўтар кніг "Белорусская советская скульптура" (Мн., 1954); "Белорусская архитектура: Исторический очерк" (Мн., 1956), "Скульптура Савецкай Беларусі" (Мн., 1957), "Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода" (Мн., 1969), "Народно-прикладное искусство Белоруссии (от первобытного общества до 1917 г.)" (Мн., 1972), "Беларускі арнамент: Ткацтва, вышыўка" (Мн., 1996). Памёр у 1995 г. у Мінску.

КІСЯЛЁЎ Пётр Андрэевіч. Нарадзіўся 2.1.1948 г. у в. Латыгава. Беларускі вучоны ў галіне біяарганічнай хіміі. Доктар хімічных навук (1990). Скончыў універсітэт імя М. Лютэра (г. Гале, Германія, 1972). З 1972 у Інстытуце біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, адначасова з 1994 г. у Міжнародным інстытуце радыеэкалогіі імя А. Дз. Сахарава. Аўтар навуковых прац па вывучэнні прынцыпаў рэгуляцыі функцыянальнай актыўнасці мембраназвязаных бялкоў і ферментаў. Даследаваў новую разнавіднасць фосфаліпідаў з высокай стымулюючай актыўнасцю ў адносінах да монаоксігеназных ферментных сістэм уласцівасці ізаэнізмаў цытахрому Р-450 чалавека.

МАКАВЕЦКІ Пётр Васільевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. у в. Мянюцева. Кандыдат тэхнічных навук. Скончыў Сенненскую беларускую школу. У 1939 г. паступіў у Ленінградскі горны інстытут. Праз год яго прызвалі на вайсковую службу. Абараняў Ленінград. У 1946 г. П. В. Макавецкі паступіў на радыётэхнічны факультэт Ленінградскага інстытута авіяцыйнага прыборабудавання, пасля сканчэння якога застаўся тут працаваць. Ім напісана каля 80 навуковых работ. Аўтар кнігі "Глядзі ў корань". Яна пяць разоў перавыдавалася ў СССР, перакладзена на многія замежныя мовы. Памёр у 1980 г.

П. І. Ермашкевіч.

МАРЦІНОВІЧ Ізабела Іванаўна, нарадзілася 27.10.1927 г. у г. п. Багушэўск. Беларускі юрыст. Доктар юрыдычных навук (1969), прафесар (1971). Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1982). Заслужаны юрыст Беларусі (1995). Скончыла Мінскі юрыдычны інстытут (1949). З 1956 г. у БДУ. Навуковыя працы па пытаннях судовага ладу, пракурорскага нагляду, крымінальнага працэсу, гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

НАВУМАВА Софія Фадзееўна. Нарадзілася 23.5.1924 г. у в. Заазер'е. Беларускі вучоны у галіне хіміі высокамалекулярных злучэнняў. Доктар хімічных навук (1974). Скончыла БДУ (1949). У 1949—1989 гг. працавала ў інстытуце фізіка-арганічнай хіміі АН БССР (у 1952—1967 і 1975—1986 загадчык лабараторыі). Навуковыя працы па сінтэзу і даследаванні ўласцівасцей палімерных святлоадчувальных матэрыялаў, антыстатыкаў і антыстатычных лакаў, распрацоўцы новых поліфункцыянальных манамерных і алігамерных стабілізатараў. Памерла 12.3.2000 г.

ПІЯТУХОВІЧ Міхаіл Мікалаевіч. Нарадзіўся 23.2.1891 г. у в. Алексінічы. Беларускі крытык і літаратуразнавец. Правадзейны член Інбелкульта (1925), прафесар (1926). Скончыў Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут (1917). З 1921 г. у Мінску. Член навукова-тэрміналагічнай камісіі, выкладчык і сакратар Белпедтэхнікума. З 1922 г. выкладчык заходнееўрапейскай і беларускай літаратур у БДУ. Працаваў у Інбелкульце, АН БССР (кафедра гісторыі беларускай літаратуры, інстытут літаратуры і мастацтва). У сувязі з абвінавачваннямі ў "контррэвалюцыйным нацыяналдэмакратызме" ў 1934 г. (паводле іншых звестак, у 1936) пакінуў Беларусь. Выкладаў у педагагічных інстытутах Паўночнага Каўказа. У 1937 г. рэпрэсіраваны. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.12.1957 г. Універсітэцкі курс Піятуховіча лёг у аснову яго кнігі "Нарысы гісторыі беларускае літаратуры. Ч. 1 /Агляд літаратурна-ідэалагічных плыняў XIX і пачатку XX ст." (1928), якія мелі станоўчае значэнне ў тагачасных



Я. Р. Радкевіч.

метадалагічных пошуках, хоць ён і не пазбег сацыялагічнага схематызму. Аўтар артыкулаў пра фальклор, Ф. Скарыну, Ф. Багушэвіча, Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча, Ц. Гартнага, Ядвігіна Ш., М. Чарота, К. Чорнага і інш. Рэдактар-укладальнік гісторыка-літаратурнай хрэстаматыі "Выпісы з беларускае літаратуры: Новы і найноўшы кругабегі" (1923). Рэдактар, аўтар уступнага артыкула да твораў П. Труса (1934, 1935).

Творы: "Францішак Скарына і яго літаратурная дзейнасць" (Мн., 1926); "Ля вытокаў лірыкі Янкі Купалы" (Мн., 1927); "Паэтычнае светаадчуванне ў творчасці Якуба Коласа" (Мн., 1927); "Звычаі і песні беларускага селяніна ў іх гаспадарчай аснове" (Мн., 1928). У кн.: Матэрыялы да гісторыі беларускай літаратуры. Т. 1. Мн., 1936.

РАДКЕВІЧ Яўтен Рыгоравіч. Нарадзіўся 3.10.1937 г. у г. Сянно ў сям'і настаўнікаў. Доктар філалагічных навук. Беларускі пісьменнік (1975).

У 1955 г. паехаў у Казахстан. Скончыў Усць-Каменагорскае вучылішча сельскай гаспадаркі (1956). Працаваў трактарыстам, камбайнерам у саўгасах імя Жданава і "Пагранічнік" Паўладарскай вобласці. У 1958 г. — піянервожаты дзіцячага дома № 2 у п. Парэчча Гродзенскай вобласці. У 1963 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1960 г. адначасова працаваў рэдактарам, загадчыкам маладзёжнай рэдакцыі Беларускага радыё. З 1974 г. — выкладчык, загадчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання БДУ.

Друкуецца з 1966 г. Аўтар кніг апавяданняў і аповесцей “Плытагоны” (1972), “Месяц Межань. Зіма на выратавальнай” (1976), “Горны мёд” (1982), аповесцей “Антаніна” (1979), “Пешшу праз Галактыку” (1984), раманаў “Сутокі дзён” (1984), “Закон прыцягнення” (1990). Напісаў кнігу публіцыстыкі “Камсамольская дынастыя” (1968), даследаванне “Маладзёжная радыёпраграма: станаўленне, функцыі, форма” (1979), манаграфію “Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця” (1983). Памёр у 1999 г.

ШЫБЕКА Захар Васільевіч. Нарадзіўся 30.7.1948 г. у в. Асінаўка. Беларускі гісторык. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1972), кандыдат гістарычных навук (1977), доктар гістарычных навук (1989). У 1966 г. пасля заканчэння Беліцкай сярэдняй школы працаваў сакратаром камсамольскай арганізацыі саўгаса “Полымя”. Настаўнік гісторыі (1972—1974), навуковы супрацоўнік у Інстытуце гісторыі АН БССР (1974—1991). З 1991 па 1998 гг. працаваў загадчыкам аддзела Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны (1991—1998). Дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (1998—2000), з 2000 г. — прафесар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта, вучоны сакратар Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, навуковы кансультант Беларускай энцыклапедыі імя Пятруся Броўкі. Даследуе гісторыю Мінска 1890—1914 гг., гарадоў Беларусі 1861—1904 гг., беларускі нацыянальны рух XIX—XX ст. Аўтар кніг “Минск в конце XIX — начале XX в. Очерк социально-экономического развития” (Мн., 1985), “Минск. Страницы жизни дореволюционного города” (Мн., 1990, у сааўтарстве), “Мінск. Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада” (Мн., 1994, у сааўтарстве), “Гарады Беларусі (60-я гады XIX—пачатак XX стагоддзяў)” (Мн., 1997) і больш 100 навуковых артыкулаў і рэцэнзій у беларускіх і замежных зборніках, часопісах, газетах.

Э. Савіцкі.

Партыйныя і дзяржаўныя дзеячы

П. А. Абрасімаў (злева).

АБРАСІМАЎ Пётр Андрэевіч. Нарадзіўся 16.5.1912 г. у Багушэўску. Савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, дыпламат. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1951). З 1929 г. на прафсаюзнай і адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. У 1941—1942 гг. у Чырвонай Арміі. З 1942 г. у ЦК КП(б)Б і СНК БССР. У Айчынную вайну са спецыяльнымі заданнямі ЦК КП(б)Б і БШПР няраз быў у тыле ворага. У 1946—1948 гг. пастаянны прадстаўнік СМ БССР пры СМ СССР. З снежня 1948 г. намеснік старшыні СМ БССР, з чэрвеня 1950 г. сакратар ЦК КП(б)Б, з лістапада 1952 г. першы намеснік старшыні СМ БССР. З 1956 г. на дыпламатычнай рабоце: пасол СССР у ПНР (1957—1961), Францыі і Малагасійскай рэспублікі (1971—1973), ГДР (1962—1971 і з 1975). У 1961—1962 г. першы сакратар Смаленскага абкома КПСС, у 1973—1975 гг. загадчык аддзела ЦК КПСС. Член ЦК КПСС з 1961 г. Член ЦК КПБ у 1946—1957 г., кандыдат у

члены Бюро ЦК у 1949—1950 г. і член Бюро ЦК КПБ у 1950—1957 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1950—1958, 1962—1966, 1974—1979 і Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1959 г. Герой працы ГДР. Ганаровы грамадзянін г. Берліна. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, іншымі ордэнамі і медалямі.

Из письма П. А. Абрасимова ученикам средней школы № 2 г. п. Богушевск

Дорогие ребята, красные следопыты!
Что я мог бы ответить на ваши вопросы?
Во-первых, это было давно, в 1924 году, когда мне было 12 лет (а для "солидности" по внешнему виду мне три года прибавили). Я был вожатым железнодорожного отряда пионеров. Это были интересные годы детства.

...Самым интересным эпизодом тех лет мне кажется следующий. В 1926 году мне пришла идея, о которой я ни с кем не посоветовался, а написал письмо тогдашнему наркому железнодорожного транспорта А. А. Андрееву с просьбой прислать бесплатный литер на 50 ребят для поездки в Москву. И вот, когда я стал уже забывать об этом, меня вызвал к себе секретарь партийной ячейки тов. Онищенко и строгим голосом стал допрашивать, как я смел беспокоить наркома. Оказывается, А. А. Андреев внимательно отнёсся к моей просьбе и выслал литер на 50 ребят для поездки в Москву и обратно.

Родители собрали нас, и мы приехали в Москву безо всякого заранее составленного плана, вдохновлённые энтузиазмом посмотреть столицу. Я выстроил отряд на перроне и мы с барабанным боем направились прямо к постовому милиционеру. Тот остановил движение, спросил, кто мы и откуда. Мы ответили, что являемся представителями Белоруссии, и спросили, как пройти к ближайшему райкому комсомола. В этом я видел наше спасение. Милиционер указал ближайшую улицу, это была Краснопресненская, где находился райком комсомола...

За пять дней мы побывали во многих музеях столицы, увидели многое. Как раз во время нашего нахождения в Москве умер Ф. Э. Дзержинский. Нам удалось пройти мимо его гроба...

О своей дипломатической работе могу сказать только одно: это сложная и, вместе с тем, интересная работа.

Моей первой учительницей, о которой я до сих пор с теплотой вспоминаю, была Александра Афанасьевна Еремеева, второй, которую я позже встречал в Минске, Полина Антоновна Шидловская.

Большой привет вам всем из далёкого Парижа!

Посол СССР по Франции П. А. Абрасимов
21.8.1972 г. Париж, Франция.

ВАЛАДЗЬКО Яўген Іванавіч. Нарадзіўся 3.1.1941 г. у в. Харэўшчына. Заслужаны работнік транспарту Беларусі (1996). Ганаровы чыгуначнік. Скончыў Аршанскі тэхнікум чыгуначнага транспарту (1959), Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (1980), інстытут кіравання Акадэміі народнай гаспадаркі СССР. Працоўную дзейнасць пачаў у 1959 г. на Паўночнай чыгунцы. З 1964 г. — на Беларускай чыгунцы, дзе прайшоў працоўны шлях ад манеўровага дыспетчара да начальніка Беларускай чыгункі. Памёр у кастрычніку 1998 г.

ЖАБІЦКІ Генадзь Мікалаевіч. Нарадзіўся 22.5.1933 г. у в. Барок. Дзяржаўны дзеяч Беларусі. У 1955 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. У 1955—1959 г. на камсамольскай рабоце ў Магілёўскай вобласці. З 1959 г. сакратар, другі сакратар, першы сакратар ЦК ЛКСМБ. У 1970—1976 г. у апараце ЦК КПБ. З 1976 г. першы намеснік міністра, у 1978—1984 г. міністр унутраных спраў Беларусі. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1966—1970 г., Вярхоўнага Савета БССР некалькіх склікананняў. Член ЦК КПБ у 1966—1984 г. Памёр 21.4.2001 г.

ЛАВІЦКІ Генадзь Міхайлавіч. Нарадзіўся 28.8.1942 г. у в. Новая Беліца. Дзяржаўны дзеяч, дыпламат. Генерал-лейтэнант. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут (1970), Вышэйшыя курсы КДБ СССР. З 1970 г. у органах КДБ БССР. З 1984 г. у цэнтральным апараце КДБ СССР. У 1986—1994 г. намеснік старшыні, у 1994 г. старшыня КДБ Рэспублікі Беларусь. З 1995 г. Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Ізраілі. Узнагароджаны 8-ю медалямі.

МАШЭРАЎ Пётр Міронавіч. Нарадзіўся ў вёсцы Шыркі. Партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1944), Герой Сацыялістычнай Працы (1978). Скончыў Віцебскі пе-

П. М. Машэраў.

дагагічны інстытут (1939). У 1939—1941 г. выкладчык фізікі і матэматыкі ў Расонскай СШ Віцебскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ў жніўні 1941 г. стварыў і ўзначаліў Расонскае патрыятычнае падполле. З красавіка 1942 г. камандзір партызанскага атрада імя Шчорса, які дзейнічаў у Расонскім, Дрысенскім, Асвейскім раёнах БССР, у суседніх раёнах РСФСР і Латвійскай ССР. З сакавіка 1943 г. камісар партызанскай брыгады імя К. К. Ракасоўскага Віцебскай вобласці. З верасня 1943 г. першы сакратар Вілейскага падпольнага абкома ЛКСМБ. З ліпеня 1944 г. першы сакратар Маладзечанскага абкома ЛКСМБ, з ліпеня 1946 г. сакратар, з кастрычніка 1947 г. першы сакратар ЦК ЛКСМБ. З ліпеня 1954 г. другі сакратар Мінскага, са жніўня 1955 г. першы сакратар Брэсцкага абкомаў КПБ. З красавіка 1959 г. сакратар, са снежня 1962 г. другі сакратар, з сакавіка 1965 г. першы сакратар ЦК КПБ. Член ЦК КПБ з 1949 г.; кандыдат ў члены Бюро ЦК з лютага 1949 г. да студзеня 1956 г., член Бюро ЦК КПБ з красавіка 1959 да снежня 1962 г. і з чэрвеня 1966 г., член Прэзідыума ЦК КПБ са снежня 1962 г. да чэрвеня 1966 г. Кандыдат у члены ЦК КПСС з 1961 г., член ЦК КПСС з 1964 г. Кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС з красавіка 1966 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1955 г. і з 1959 г., член Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1951—

П. М. Машэраў на святкаванні Дня Перамогі ў Мінску. 1975 г.

1955 г. і з 1966 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета у 1950—1961 г. і з 1966 г., член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР з 1966 г. У перыяд яго дзейнасці Беларусь дасягнула значных поспехаў у стварэнні індустрыяльнага патэнцыялу, стала адной з высокаразвітых рэспублік былога СССР. Загінуў у аўтакатастрофе 4.10.1980 г. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску. У Віцебску ўстаноўлены помнік Машэраву. Яго імем названы праспект у Мінску, вуліцы ў Глыбокім, Давыд-Гарадку, Жыткавічах, Маладзечне, Лідзе, Дзятлаве, Краснаполлі і іншых населеных пунктах Беларусі.

Ганарымся сваім земляком

З успамінаў Мікалая Лявонавіча Цурана, былога дырэктара саўгаса імя П. М. Машэрава

У 1971 годзе, калі я працаваў дырэктарам саўгаса "Машканы" (цяпер імя П. М. Машэрава), я ўпершыню сустрэўся з Пятром Міронавічам. Просты ў абыходжанні, сціплы, выдатны кіраўнік, ён дасканала разбіраўся ў сельскагаспадарчай вытворчасці. І памяццю валодаў выдатнай. Адразу пачаў цікавіцца маёй адукацыяй, потым кажа:

— Сядай у машыну, паглядзім, ці навучыўся ты вызначаць біялагічную спеласць збажыны.

Праязджаючы вёску Масоры, Пётр Міронавіч залюбаваўся адным з дамоў вяскоўцаў. А калі даведаўся, што ў ім жыве галоўны бухгалтар саўгаса, пахваліў яго і гаворыць:

— Пашанцавала табе з бухгалтарам. Адразу бачна, сапраўдны гаспадар.

Наведалі ферму ў Обалі, нарэшце прыбылі да канторы. Я, па праўдзе кажучы, крыху хваляваўся. Гэта ўбачыў і Машэраў і, здаецца, стараўся неяк зняць маё напружанне.

— Раскажы, — кажа мне, — аб плане работы на 9-ю пяцігодку.

Калі пачаў гаварыць, расказваць аб усім, пакрысе супакойваўся.

Пётр Міронавіч цікавіўся ўсім: колькі ў гаспадарцы працаздольных, ці існуе праблема з кадрамі. І тут жа ставіў пытанне:

— Як збіраешся яе рашаць?

— Будзем будаваць жыллё, — адказваю.

За перыяд з 1970 па 1985 г. у нас было пабудавана больш за 300 кватэр, з іх 110 — гаспадарчым спосабам. Пётр Міронавіч пастаянна трымаў будаўніцтва на кантролі, пры сустрэчах заўсёды цікавіўся. І адрэзак асфальтаванай дарогі з боку Віцебска да нас праклалі дзякуючы яму.

Увогуле, Машэраў не любіў, калі хто-небудзь з кіраўніцтва прасіў яго аб дапамозе. Затое вельмі прыслухоўваўся да просьбаў простых людзей, імкнуўся ім дапамагчы. У час аднаго з наведванняў Машэравым гаспадаркі яго абступілі жанчыны. Падышла да Пятра Міронавіча і адна мнагадзетная маці, а да яе падбеглі дзеці, аж пяцёра. Убачыў іх Машэраў і пытае:

— Усе твае?

— Мае, — адказвае жанчына, — бяда вось, садзіка няма.

Паківаў Машэраў галавой. А неўзабаве ў саўгасе пачалося будаўніцтва садка-ясляў. Амаль такая ж гісторыя здарылася і з будаўніцтвам участковай бальніцы.

З усіх сустрэч з Пятром Міронавічам мне назаўсёды запамяталася яго простасць, сціпласць. Асабліва ўражвала вытрыманасць у размовах з людзьмі. Робячы заўвагі кіраўнікам раёнаў, ён гаварыў з людзьмі вельмі тактоўна. А самае галоўнае, нікога не "зняў" з пасады, нікога не абразіў. Стрыманая, спакойная манера рабіць грунтоўны аналіз работы, аб'ектыўная ацэнка становішча спраў вельмі моцна ўздзейнічалі на падначаленых.

Аднойчы захацелася яму пабываць у тых мясцінах, дзе нарадзіўся. Міронавым хутарам завуць у нас гэтае месца. Даўно няма хаты. Толькі кусты акацый, бэзу напамінаюць аб тым, што жылі тут людзі. Ціхім і задуменным хадзіў Пётр Міронавіч па знаёмых з дзяцінства мясцінах непадалёку ад Кічынскага возера, доўга сядзеў на беразе ракі Абалянкі, і можна толькі здагадвацца, якія пачуцці, якія думкі абуджаліся ў ім.

ШЫБЕКА Іван Арцёмавіч. Нарадзіўся 29.9.1930 г. у в. Стэцава. Дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі. Скончыў Смалянскі саўгас-тэхнікум (1950), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1963). У 1953—1962 г. першы сакратар Багушэўскага райкома, сакратар Віцебскага абкома ЛКСМБ, першы сакратар Талачынскага райкома КПБ. У 1962—1965 г. начальнік Полацкага калгасна-саўгаснага ўпраўлення. У 1965—1967 г. першы сакратар Дубровенскага райкома, інспектар, другі сакратар Віцебскага абкома КПБ. У 1977—1984 г. стар-

шыня Віцебскага аблвыканкома. Член ЦК КПБ (1976—1984), член Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (1979—1984), дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1967—1971, 1975—1984). Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, медалямі.

Творцы

АЗГУР Заір Ісакавіч. Нарадзіўся 2.1.1908 г. у в. Маўчаны. Беларускі скульптар. Герой Сацыялістычнай Працы (1978). Народны мастак СССР (1973). Народны мастак Беларусі (1944). Правадзейны член Акадэміі Мастацтва СССР (1958). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946, 1948). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1967 гг. і з 1971 гг. Вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме (1922—1925), Ленінградскім вышэйшым мастацкім інстытуце (1925—1928), Кіеўскім мастацкім інстытуце (1928—1929). Асноўныя педагогі: М. Керзін, М. Манізер, Р. Бах, У. Лішаў. Працаваў у станковай і манументальнай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1923 г. Сярод твораў: партрэты герояў Вялікай Айчыннай вайны В. Талаліхіна, А. Радзімцава, А. Малодчага, М. Сільніцкага, Ф. Смалячкова, В. Талаша, М. Шмырова, К. Ракасоўскага, П. Батава, прадстаўнікоў айчыннай і сусветнай культуры Ф. Скарыны, А. Бразера, З. Бядулі, Л. Александроўскай, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гусоўскага, К. Чорнага, Р. Тагора, Лу Сіня, У. Уітмена, кіраўнікоў камуністычнай і рабочай партый, нацыянальна-вызваленчага руху, палкаводцаў, герояў працы, вучоных; некалькі кампазіцый. Па яго праектах створаны помнікі У. Леніну ў Беларусі, Расіі і Казахстане, П. Машэраву ў Віцебску, Я. Коласу і С. Грыцаўцу ў Мінску, Я. Купалу ў Вязынцы, В. Талашу ў Петрыкаве, А. Бутлераву і Я. Вучэцічу ў Маскве. Аўтар барэльефа "Слава загінуўшым героям" для помніка-абеліска Перамогі ў Мінску. У 1960-я гады стварыў шэраг партрэтаў беларускіх вучоных (М. Яругін, 1963; Б. Сцяпанаў, 1964), артыстаў (І. Балоцін, 1966, У. Крыловіч, 1967). Напісаў мемуары "Незабыўнае", "Тое, што помніцца...", шмат публіцыстычных артыкулаў па мастацтву. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Беларускім музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, фондах БСМ, Траццякоўскай галерэі ў Маскве, фондах Міністэрства культуры Расіі, Дзяржаўным мастацкім музеі Малдовы, Астраханскай карціннай галерэі, Алтайскім музеі выяўленчага мастацтва. Памёр 18.2.1995 г.

ВЯЛЮГІН Анатоль Сцяпанавіч. Нарадзіўся 27.12.1923 г. у в. Машканы. Беларускі паэт, кінадраматург, перакладчык. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1969). Лаўрэат прэміі імя Я. Купалы (1964), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1948 г. скончыў Мінскі педагагічны інстытут. Працаваў у 1946—1984 г. у часопісе "Полымя". Друкаваўся з 1934 г. Аўтар зборнікаў "Салют у Мінску" (1947), "Негарэльская арка" (1949), "На зоры займае" (1958), "Насцеж" (1960), "Песня зялёнага дуба" (1989), "З белага каменння — сіняе пламенне" (1993) і іншых паэтычных зборнікаў для дзяцей; перакладаў на беларускую мову твораў М. Лермантава, У. Маякоўскага, А. Міцкевіча, М. Рыльскага, Л. Украінкі і іншых. Памёр 24.10.1994 г.

СЛОВА Ў ВЯСЁЛКАВЫМ ЗЗЯННІ

З чаго пачынаецца паэзія? Вядома ж, з матчынай песні, ад бацькоўскага парога, з маленства. І, зразумела, трэба гаварыць пра чалавечы характар — перш за ўсё пра яго вытокі...

Вачыма сваёй непаўторнай вясны, вачыма маладосці глядзіць на свет лірычны герой Анатоля Вялюгіна. А яна пачыналася на роднай Сенненшчыне, дзе паэт нарадзіўся і вырас, дзе выспелі ў сэрцы першыя паэтычныя радкі, куды ён часта наведваўся і дзе мы не раз сустракаліся і вялі шчырыя гутаркі. "Машканы, Івоні, Ракіты, хутар Кляпчэва — авеяныя лесавым шумам мацеркі майго маленства, —

пісаў Анатоль Вялюгін у аўтабіяграфіі "Старонкі жыцця". — У Івонях і Машканах жыла наша сям'я — бацьку, вясковаму фельчару, даводзілася пераязджаць з месца на месца".

Дзяцінства і юнацтва паэта авеяны дыханнем гісторыі.

"Бацькаўшчына. Недалёка адгэтуль, за рэчкай Абалянкай, у лесе, горбіцца курган Камандышкі. У кургане спяць напалеонаўскія грэнадзёры. Зімою дванаццатага года яны паляглі тут пад угневанай рукой беларускага мужыка, майго прадзеда з мянушкай Камандышка".

У дзіцячае сэрца глыбока заплывае паэзія гісторыі, паэзія памяці і патрыятызму. Заплывае і застаецца там назаўсёды. "Яно такое, магутнае і рэзкае, святло маленства, — пісаў паэт у аўтабіяграфіі. Пры гэтым святле і адбываецца стык сучаснасці і гісторыі:

Былое пазнаўшы ад лірніка-дзеда,
Да слёз там палюбіш бярозавы шлях.
Пачуеш: ля дужых дубоў Белавежы
Рыпіць Скарыны і Купалы калыска...

Да сказанага варта дадаць: паэзія Анатоля Вялюгіна мае выразныя каардынаты ў прасторы і часе. Прыгадаем хоць бы верш "Нараджэнне", у якім дакладна перададзены прыкметы той мужнай пары, калі "кавалерыйскія падковы будзілі гарадок Сянно":

Навокал у лясным павеце
Зямлю дзялілі мужыкі.
І з пушчы панскай ля павеці
Ляжалі ў бацькі круглякі.

Ён думаў пра маю калыску
І ставіў пяцісценны дом.
Даносіўся з Масквы і Мінска
Дэкрэтаў Ільічовых гром.

Асаблівасці творчай манеры паэта праявіліся ў вершах перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У іх пераплялося сваё, асабіста перажытае, з тым, што хвалявала кожнага чалавека. У першым паэтычным зборніку "Салют у Мінску", які выйшаў у свет у 1947 годзе, чытачоў не маглі не ўразіць такія радкі:

Жыцця майго і смерці пераправы,
І Сталінград дагэтуль сніцца мне...
Зваліўся я, падкошаны жалезам,
Абняў рукамі родную зямлю.
Яна прапахла дымам і палынкай
Слязою нашых матак і дзяцей.
Калі я моцна сціснуў яе ў жменьцы —
Праз пальцы пырснула жывая кроў!..

Так, вогненныя сталінградскія плацдармы багата паліты крывёю нашых байцоў. Удзельнікам вялікай бітвы быў і Анатоль Вялюгін. Гэта ён зваліўся на зямлю, "падкошаны жалезам", гэта яго падабралі санітары на полі бою.

Пасляваенная творчасць Анатоля Вялюгіна скрозь прасякнута пафасам мірнага будаўніцтва. Шчырыя, прачулыя радкі прысвячае ён будаўнікам трактарнага і аўтамабільнага заводаў, сельскім працаўнікам, якія на спустошанай вайною зямлі вырошчваюць збожжа, будуюць хаты, наладжваюць жыццё.

У паэтычных зборніках "Негарэльская арка", "На зоры займае", "Насцеж", "Адрас любві", "Вершы і балады", кнізе "З белага каменя — сіняе пламенне" і іншых паэт услаўляў чалавека-творцу, руплівага гаспадара зямлі, які ўпрыгожвае яе сваімі справамі.

З усіх сабораў ёсць сабор,
Дзе згодзен я маліцца:
У спелым леце, спелы бор,
Звіняць твае званіцы...

Вось твой свет, чалавек, — нібыта гаворыць паэт. Будзь жа варты яго, будзь добрым, справядлівым — вось у чым сэнс яго "прыродаапісальных" вершаў.

Да апошніх сваіх дзён паэт-зямляк знаходзіўся ў творчым пошуку. Яго апошнія вершы засведчылі далейшае паглыбленне і ўдакладненне разумення тых духоўных каштоўнасцей, якія адкрыліся яму з самага пачатку жыццёвага шляху і на якіх ён выхоўваўся і рос.

Ул. Р. Скапа.

ГАРБАЧОЎ Міхаіл Васільевіч. Нарадзіўся 24.3.1921 г. у в. Бесцвіна. Рускі перакладчык. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1971). Скончыў Маскоўскі паліграфічны інстытут (1951). Удзельнік Айчыннай вайны. Працаваў у часопісе "Славяне", на Усесаюзным радыё, з 1957 г. у апараце Саюза пісьменнікаў СССР.

Пераклаў на рускую мову раманы І. Мележа "Людзі на балоце", І. Навуменкі "Вецер у соснах" і "Сорак трэці", І. Чыгрынава "Плач перапёлкі", В. Адамчыка "Чужая бацькаўшчына", аповесці В. Быкава "Альпійская балада", "Трэцяя ракета", "Мёртвым не баліць", асобныя творы П. Галавача, У. Карпава, А. Кулакоўскага, М. Лупсякова, І. Пташнікава, А. Савіцкага, Т. Хадкевіча, І. Шамякіна. Памёр 7.3.1981.

Г. Б. Давыдзька.

ГОМАНАЎ Уладзімір Кірылавіч. Нарадзіўся 2.2.1929 г. у г. Сянно. Беларускі мастак-жывапісец. Член Беларускага саюза мастакоў (1967). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1990). Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1956), Беларускі тэатральна-мастацкі істытут (1962). З 1962 г. выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Памёр у лістападзе 1998 г.

Амаль усю сваю творчасць ён прысвяціў адлюстраванню жыцця і працы энтузіястаў калгасных палёў. Вельмі часта выязджаў у роднае Сянно. Вынікам гэтых вандровак з'явіліся палотны: "Ветэраны", "Мы даяркі", "Свята ў полі", "Камбайнеры", "Жыцень", "Бітва з татарамі: на сценах старажытнага Слуцка". Ён аўтар пейзажаў "Прыпяцкія плёсы", "Восеньскі матыў", "Траецкае прадмесце", шэрага нацюрмортаў.

З асаблівым захапленнем адлюстраваў вобразы перадавікоў сельскай гаспадаркі — В. А. Данільчык, С. К. Жука, І. М. Букіша і інш., а таксама прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі — скульптара А. Дзям'янава, Героя Сацыялістычнай працы С. Ф. Паніна і інш. На стварэнне мастацкіх твораў яго натхняла паэзія Янкі Купалы. Купалаўскія вобразы знайшлі сваё адлюстраванне ў манументальным палатне Ул. Гоманава "А хто там ідзе?".

Няўрымслівы ў сваіх падарожжах-пошуках мастак часта наведваў Палессе, дзе ў садружнасці з сябрамі-жывапісцамі арганізаваў мастацкую галерэю. Апошнія гады жыцця прысвяціў прапагандзе выяўленчага мастацтва. Па яго ініцыятыве ў г. Лідзе была арганізавана мастацкая галерэя, якой Ул. Гоманаў падараваў шэраг уласных твораў. А ўсяго такіх галерэй было створана больш дзесяці. Як патрыёт сваёй Радзімы, ён марыў аб стварэнні мастацкага музея і ў горадзе Сянно, але заўчасная смерць перашкодзіла ажыццяўленню ягонай задумы.

Творы жывапісца знаходзяцца ў музеях Беларусі, а таксама і за яе межамі, у тым ліку ў Расіі, Германіі, Вялікабрытаніі, Іспаніі.

Л. Н. Дробаў.

Ад рэдакцыі: І ўсё-такі задума мастака ажыццявілася, 4.12.1999 г. у г. Сянно адкрылася мастацкая галерэя Ул. К. Гоманава. Гэта стала магчымым пры актыўным садзейнічанні сына мастака Леаніда Уладзіміравіча, які падараваў роднаму гораду шэраг твораў бацькі.

ДАВЫДЗЬКА Генадзь Браніслававіч. Нарадзіўся 29.9.1955 г. у г. Сянно. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь (1999). Скончыў Далёкаўсходні інстытут мастацтваў (1977, г. Уладзівасток), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1991). У 1980—1982 г. працаваў у Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча, з 1982 — у Нацыянальным тэатры імя Я. Купалы. Створаныя ім вобразы каларытныя, адметныя дакладным асэнсаваннем драматургічнага матэрыялу. Сярод лепшых роляў: Усходні Вучоны ("Тутэйшыя" Я. Купалы), Драгун ("Парог" А. Дударава), Малюцін ("Апошні журавель" А. Дударава і А. Жука), Мужык ("Страсці па Аўдзею" У. Бутрамеева), Флар'яна ("Валенсіянскія вар'яты" Лопэ дэ Вэгі), Тарцюф ("Тарцюф" Мальера). Ажыццявіў пастаноўкі: "Смех лангусты" Дж. Марэла (1991), "Звон — не малітва" І. Чыгрынава (1992), "Гульня ў джын" Д. Кобурна (1993), "Смак яблыка" А. Дзялендзіка (1999).

Асабліва яскрава акцёрскі талент Г. Б. Давыдзькі праявіўся ў спектаклі "Князь Вітаўт" А. Дударава, дзе ён, як выканаўца галоўнай ролі князя Вітаўта, стварыў вобраз хрысціянства, які не прымае здрадніцтва, жорсткасці і намагаецца правіць сваім народам па справядлівасці. Гэты спектакль прызнаны лепшым на конкурсе драматычных тэатраў Беларусі ў 1997 годзе.

Цэлы шэраг роляў акцёр стварыў у кіно і на тэлебачанні. Вялікую папуляр-

насць атрымаў ён у якасці тэлевядучага і аўтара тэлепраграм. На працягу шэрага гадоў Г. Б. Давыдзька выкладаў акцёрскае майстэрства і рэжысуру ў Беларускай акадэміі мастацтваў, шмат выступае ў сродках масавай інфармацыі па праблемах тэатральнага мастацтва.

У кастрычніку 1997 г. Г. Б. Давыдзька прызначаны на пасаду дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

С. В. Шайко.

ДРАНЕНКА Мікалай Аляксеевіч. Нарадзіўся 3.8.1946 г. у в. Маргойцы. Член Беларускага Саюза мастакоў (1989). Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута (1969). Вучыўся ў І. Сталярова, Я. Красоўскага. Працуе пераважна ў акварэлі, у жанры лірычнага пейзажу. Асноўныя творы: акварэльныя цыклы "Лукомская ДРЭС", "Помнікі дойлідства Віцебшчыны", "Гарадскія рытмы", "Здраўнёва", "Азёрны край", "Маё Прыдзвінне", "Беліцкі маёнтак", "Белае возера", "Над Дзвіной", "Там, дзе Лучоса ўпадае ў Дзвіну", а таксама лісты "Квітнеюць сады", "Блакітная вада", "Бярозавы сок", "Касцёл у Камаях", "Партрэт Г. Ляцкалава". Творы знаходзяцца ў фондах БСМ, Віцебскім краязнаўчым музеі, галерэі "Маладое мастацтва" (г. Шчэцін, Польшча).

ЖАЎРУК Алесь (сапр. Сінічкін Аляксандр Дзмітрыевіч). Нарадзіўся 19.8.1910 г. у Сянне ў сям'і бухгалтара. Беларускі паэт. Скончыў Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры (1938). Загінуў у баях пад Сталінградам 23.8.1942. Друкаваўся з 1926 г. у зборніках "Ручаіны" (1936), "Дняпро выходзіць з берагоў" (1938), апяваў героіку грамадзянскай вайны, рэвалюцыйны подзвіг. Напісаў паэмы "Крывёю сэрца" (1938), лібрэта оперы "Зарэчны барок" і іншыя.

На яго вачах адбываліся грандыёзныя змены ў горадзе і вёсцы, у псіхалогіі працоўнага чалавека, і ўсё гэта не магло не адбіцца на яго творчасці.

Як справядліва адзначыў беларускі паэт і аднакласнік Жаўрука Аляксей Зарыцкі, "вельмі характэрнай рысай творчасці Жаўрука з'яўляецца арганічная аптымістычнасць яго твораў. Здаровая маладая ўсмешка асвятляе іх. І пра што б ні пісаў Жаўрук — ці пра тое, як "над Рэчанскім сельсаветам поўнач зорная ідзе", альбо пра сваіх сяброў-студэнтаў, гэта маладая ўсмешка, гэта моцная вера ў нашу вялікую будучыню заўсёды асвятляе яго вершы.

У 1937 г. Алесь Жаўрук напісаў паэму "Крывёю сэрца" пра грамадзянскую вайну ў Іспаніі. Гэта адзін з лепшых твораў паэта, прыхільна сустрэты чытачамі і крытыкай. У ім апавядаецца, як мадрыдская мадыстка Франсіска і яе каханы матрос Хазэ ідуць на фронт змагацца з фашыстамі, адстойваць маладую рэспубліку.

І з таго часу скрозь нязменна
Па кручах згойсаных дарог
У сініх вопратках ваенных
Плячо ў плячо прайшлі ўдвох:
Басконскіх гонар футбалістаў,
Матрос з "Хаіме", весяльчак,
І з ім маленькая мадыстка
З дзіцячым сумам у вачах.
У батальёне ўсе іх зналі:
Далі ж яны панам турбот —
Штодня фашысты пракліналі
Са страхам іхні кулямёт.

Неўзабаве і самому Алесю Жаўруку давялося сустрэцца з фашыстамі. У 1941 г., калі ішлі кровапралітныя баі пад Масквой, на старонках газеты "Комсомольская правда" было апублікавана некалькі ягоных вершаў на рускай мове, падпісаных: "Палітрук Аляксандр Сінічкін". Напісаныя ў салдацкіх акопах, у перапынках паміж баямі, творы паэта той пары прасякнуты нязгаснай любоўю да роднай зямлі, свайго народа, верай у перамогу над фашысцкімі захопнікамі. Нагадаем яго верш "Ружа", пад якім зроблена паметка: "Мажайск, 1942 год":

А ці міг, ці век — не знаў ніхто там,
Колькі моўчкі праляжалі мы
На краі сыпучага сумёта,
Пасярод марознае зімы.

Толькі раптам лютаўская сцюжа
Адступіла быццам, адлягла.
Чую і не веру сам я — "Ружа",
"Ой, расцвіла ружа, расцвіла..."
Азірнуўся: ціха ў задуменні
Сам сабе спявае зампаліт.
Слухаем. І нікне поўнач ценем,
Іншыя ўстаюць хлапцам палі.

Случчына каму, каму ў песні
Амсціслаўшчына яго ўстае,
Мне ж — рачэнскі край, маё Палессе,
Вербы, вочы ясныя твае.

І узбек, сусед мой, вочы мружыць
(Што ён прыгадаў у той цішы?).
Слухаў, слухаў і ўсміхнуўся: "Ружа".
Ружа, — зноў ён паўтарыў, — якшы".

І да самае атакі потым
Больш не думалі аб сцюжы мы
На краі сыпучага сумёта,
Пасярод марознае зімы.

Так заўжды хвілінамі цяжкімі
Саграваеш ты, Радзіма, нас.
Зор сваіх святлом, вялікім імем,
Шчыраю парадай у добры час!

Вестачкай паштоўкі нечаканай,
Пачкам папярос, здалёк прысланым,
Песняю сярдэчнаю сваёй,
Проста думкай аб табе адной.

Пазней Алесю Жаўруку давялося працаваць у рэдакцыі газеты 62-й арміі, якая абараняла Сталінград. Там, пад Сталінградам, 23.8.1942 г. ён і загінуў у росквіце жыццёвых і творчых сіл. Яго шчырыя і задушэўныя творы заўсёды будуць з намі, як назаўсёды застанецца ў памяці светлы вобраз самога паэта-патрыёта.

М. Базарэвіч.

КАНАПЕЛЬКА Зінаіда Ігнатаўна. Нарадзілася 25.12.1918 г. у Багушэўску. Народная артыстка Беларусі (1972). Скончыла студыю пры Другім дзяржаўным тэатры (1938). З 1934 г. у БДТ-2 (потым — Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа). Памерла 27.5.1997 г.

ЯЕ ВЯЛІКАСЦЬ АКТРЫСА

12 красавіка 1934 г. Зінаіда Канапелька стала студыйкай. Адначасова закончыла і сярэднюю школу. Студыйцаў пастаянна займалі ў масавых сцэнах. Упершыню Канапелька на прафесійнай сцэне выступіла ў тым жа 1934 г., калі ў спектаклі "Цудоўны сплаў" У. Кіршона іграла ў масоўцы, а потым атрымала ролю.

У 1936 г. БДТ-2 распачаў адразу ж работу над спектаклямі "Паўлінка" і "Прымакі" Янкі Купалы, а таксама "Пінская шляхта" В. Дуніна-Марцінкевіча. У масоўках былі заняты ўсе студыйцы. А ў вольны час рэжысёр Малчанаў рыхтаваў з Зінаідай Канапелькай ролю Паўлінкі.

Пад час гастроляў у Мінску Павел Сцяпанавіч Малчанаў прапанаваў зайсці да Янкі Купалы.

— Я вельмі хвалявалася, ідучы да Янкі Купалы, — успамінала Зінаіда Ігнатаўна. — Сустрэлі мяне на дзіва проста і гасцінна. Малчанаў расказваў, што працуе са мною над роляй Паўлінкі. Цётка Уладзя глядзела на мяне вельмі ласкава, а Янка Купала сказаў: "Цудоўная дзяўчына, жадаю табе сыграць гэтую ролю на сцэне". Сустрэча з такім чалавекам, такім знакамітым паэтам стала для мяне сапраўднай падзеяй.

Мара сыграць Паўлінку неўзабаве здзейснілася. Захварэла неяк выканаўца ролі Паўлінкі. Вечарам да Канапелькі падышоў Малчанаў:

— Заўтра іграеш ты.

Словы рэжысёра і ўзрадавалі, і напалохалі. Гэта была вялікая адказнасць. Маладой артыстцы 25 снежня споўнілася семнаццаць, а 31 снежня адбыўся дэбют. І ён прайшоў удала.

Потым было шмат спектакляў, было шмат добрых роляў, у тым ліку і Насці ў спектаклі "Несцерка" В. Вольскага, дзе яна была першай выканаўцай.

У гады вайны, у эвакуацыі ва Уральску, у Арэхава-Зуеве, у Маскве, усюды ігралі віцебскія артысты "Несцерку" на беларускай мове. І ўсюды гледачы добра разумелі іх.

Пасля вяртання ў Віцебск — новыя спектаклі, новыя ролі і новыя знаёмствы. Зінаіду Ігнатаўну лёс звязаў з такімі вядомымі драматургамі і пісьменнікамі, як Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Віталь Вольскі, Кандрат Крапіва, Андрэй Макаёнак, Кастусь Губарэвіч, Іван Шамякін. Пасля вайны ў тэатр прыязджаў Якуб Колас. Зінаіда Канапелька іграла і ў спектаклях, пастаўленых па яго творах.

Яна вельмі любіла сваю прафесію і вельмі абуралася, калі хто-небудзь зняважліва адгукаўся аб тэатры, заяўляў, што гэты від мастацтва адмірае. Страшная тэатральная хвароба — чорная зайздрасць ніколі не была для яе характэрнай. Наадварот, яна радавалася поспехам сваіх сяброў па сцэне, шчыра перажывала за няўдачы іншых.

Колькі ў яе было прэм'ер? Больш за 250. Гэта вельмі вялікая лічба для артыста. Зінаіда Ігнатаўна выканала шмат галоўных роляў. І кожная з іх з'яўлялася падзеяй. Але ніколі не

цуралася і другараднай, калі трэба, выходзіла ў масоўках, бо ўсё лічыла важным для поспеху спектакля. А яшчэ сваім багатым вопытам шчодра дзялілася з акцёрскай моладдзю.

І. А. Лазука.

КРОЗ Дора Захараўна. Нарадзілася 12.11.1909 г. у г. Сянно. Беларуская спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана). Скончыла Беларускую студыю оперы і балета, Беларускую кансерваторыю. У 1933—1949 г. салістка Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Валодала голасам прыгожага серабрыстага тэмбру, тонкім музычным густам. Сярод лепшых партый: Марфачка ("Алеся" Я. Цікоцкага), Марфа ("Царская нявеста" М. Рымскага-Корсакава), Мікаэла ("Кармэн" Ж. Бізе), Джыльда, Віялета ("Рыгалета", "Травіята" Дж. Вердзі). З іншых партый: Караліна ("У пушчах Палесся" А. Багатырова), Руслана ("Кветка шчасця" А. Туранкова), Разіна ("Сявільскі цырульнік" Дж. Расіні), Алімпія ("Казкі Гофмана" Ж. Афенбаха). Памерла 8.12.1997 г.

ЛАЗУКА Іван Емяльянавіч. Нарадзіўся 10.9.1948 г. у в. Балбечча Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Член Беларускага Саюза журналістаў. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і Мінскую вышэйшую партыйную школу. Быў рэдактарам Сенненскай і Докшыцкай раённых газет. З 1992 г. па 2000 г. працаваў у Сенненскім райвыканкоме. Аўтар шэрага матэрыялаў у кнізе "Памяць. Сенненскі раён". Ім напісана шмат вершаў аб родным краі.

ЛІ Соф'я Дзмітрыеўна. Нарадзілася 12.4.1904 г. у в. Обаль. Член Беларускага Саюза мастакоў (1946). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1975). У 1931 г. скончыла Віцебскі мастацкі тэхнікум. У мастацкіх выстаўках пачала ўдзельнічаць з 1929 г. Працавала пераважна ў жанрах пейзажа, нацюрморта і сюжэтна-тэматычнай карціны. У гады Вялікай Айчыннай вайны прыняла актыўны ўдзел у партызанскім руху. Большасць палотнаў на партызанскую тэматыку напісана пад непасрэдным уражаннем ад перажытага ў час вайны, у тым ліку "Партызанскі лагер", "Ой, бярозы ды сосны, партызанскія сёстры" і інш.

З асаблівым натхненнем малявала С. Лі беларускую прыроду: творы "Нарач", "Дубкі", "На Лепельшчыне", "Бэз", "Півоні", "Чэрвень", "Макі" і іншыя.

Творы С. Лі знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Беларускім музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, Гомельскім і Столінскім краязнаўчым музеях.

Памерла 4.9.1980 г.

Л. Н. Дробаў.

МАРКЕВІЧ Матруна Сяргееўна. Нарадзілася ў 1886 г. у в. Клімавічы ў сялянскай сям'і. Майстар народнага мастацкага ткацтва. Памерла ў 1957 г.

На Сенненшчыне, як і ў многіх іншых рэгіёнах Беларусі, высокага ўзроўню дасягнула майстэрства па вырабу мастацкіх тканін. Абрусы, рушнікі, кашулі, андаракі аздабляліся тканым або вышываным арнаментам. Тканы арнамент дасягаўся на кроснах у адпаведнасці з колькасцю нітоў і шляхам так званага перабірання. Майстэрства мастацкага ткацтва перадавалася і ўзбагачвалася вопытам ад былых да новых пакаленняў.

Свой адметны рушнік, які ўвайшоў у гісторыю, Матруна Маркевіч выткала ў 1917 г., калі пражывала ў вёсцы Касцялішча, куды пераехала пасля замужжа. Знакаміты рушнік трапіў у якасці ўзора ў сістэму прамысловай кааперацыі і захоўваўся ў Мінску ў фондах Белпрамсавета. Адтуль яго скарысталі спецыялісты па мастацтвазнаўству пры падрыхтоўцы Дзяржаўнага флага БССР, а затым і Рэспублікі Беларусь.[1])

Мастацкія тканыя вырабы Матруны Маркевіч карысталіся попытам на рынку ў г. Сянно. На жаль, у час нямецка-фашысцкай акупацыі карнікі абрабавалі маёмасць Маркевічаў, у тым ліку тканыя мастацкія вырабы, а вёску

[1]Кацар М. Герб і флаг БССР.— Политический собеседник, 1989, № 5, с. 43—47; Государственный герб и государственный флаг Республики Беларусь. Мн., 1997, с. 13.

Касцялішча спалілі. Тое, што не трапіла ў рукі рабаўнікоў, згарэла.

Страціўшы ў 1937 г. мужа, Матрона Сяргееўна выхавала 4 дзяцей. Старэйшы сын Міхаіл загінуў на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

А. І. Залескі, С. В. Шайко.

МАРЦІНКОЎСКІ (Марцін Коўзі) Міхаіл Барысавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. у г. Сянно. Беларускі пісьменнік-гумарыст і сатырык. Скончыў Краснаярскі педагагічны інстытут (1951). Літаратурную працу пачаў у 1959 г. Прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі ў 1996 г. Аўтар кніг "Крыштальная душа" (1983), "Кубік Рубіка" (1987), "Доля праўды" (1995), падборкі сатырычных твораў у калектыўным зборніку "І ў хвост і ў грыву" (1976), шматлікіх публікацый у перыядычным друку.

РЫЖКОВА Ганна Паўлаўна. Нарадзілася 29.8.1925 г. у в. Войлева. Заслужаная артыстка Беларусі (1970). Займалася ў Рэспубліканскім тэатральным вучылішчы (1938—1941). У 1945—1948 г. працавала ў Віцебскім абласным драматычным тэатры. У 1948—1961 г. метадыст Віцебскага абласнога Дома народнай творчасці. У 1961—1993 г. артыстка Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Памерла 21.4.1993 г.

ПАРАЎНОЎВАЛІ З РАЙКІНЫМ

Ганна Рыжкова вельмі любіла ездзіць па Беларусі, выступаць на сцэнах сельскіх і раённых дамоў культуры, дзе яе прымалі, як самага дарагога госця, як свайго чалавека.

На канцэрце, а было гэта ў Докшыцах у 1990 г., дзе я працаваў у той час, на сцэну выйшла сталага ўжо ўзросту жанчына і загаварыла на чысцюткай беларускай мове. Яна чытала байкі, гумарыстычныя вершы, гумарэскі так цудоўна, з такім захапленнем і ўздымам, што апладысменты не змаўкалі ні на хвіліну. Нямала нумароў яна выканала і ўсе яны былі ўспрыняты з вялікім задавальненнем.

Рыжкова нарадзілася сярод цудоўных краявідаў, у азёрнай і лясной мясцовасці прайшло яе маленства. Можа адсюль ідуць карані яе любові да роднай Беларусі, яе людзей, а ад землякоў назаўсёды засталося пачуццё жыццярадаснага, мяккага, някрыўднага гумару. Адкуль у яе, вясковай дзяўчынкі, з'явілася цяга да сцэны? Мабыць, ад кніг, ад мастацкай самадзейнасці, якую вельмі любіла.

Шмат год папрацавала метадыстам абласнога Дома народнай творчасці. Вось тады шмат паездзіла па Віцебшчыне, пазнаёмілася са шматлікімі самадзейнымі калектывамі, дапамагала іх станаўленню, развіццю, і сама запамінала іскрынкі народнага гумару, трапныя слоўцы, каб потым, пазней, скарыстаць іх у сваіх канцэртных нумарах.

Яна актыўна прапагандавала са сцэны даступнымі ёй сродкамі беларускую паэзію, выконвала фельетоны і гумарэскі нацыянальных аўтараў. У яе рэпертуары былі эстрадна-паэтычныя спектаклі "Як жывеш, чалавек?", "Калі ласка", праграма "Край паэтаў", прысвечаная Янку Купалу і Якубу Коласу, творы гэтых магутных песняроў беларускага народа, а таксама Максіма Танка, Кандрата Крапівы, Пімена Панчанкі, Эдзі Агняцвет, Ніла Гілевіча, Сяргея Грахоўскага і іншых пісьменнікаў і паэтаў.

У 1960—70-я гады ярка гарэла зорка гумарыста Аркадзя Райкіна. Вельмі ўжо быў ён папулярны. Дык вось, пра Ганну Паўлаўну Рыжкову гаварылі: "Выступае як Райкін".

І. Е. Лазука.

СКАПА Уладзімір Рыгоравіч. Нарадзіўся 5.1.1935 г. у в. Сукрэмна ў сялянскай сям'і. Беларускі журналіст. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1959). У 1959—1965 г. працаваў у сенненскай і талачынскай раённых газетах. З 1965 г. у абласной газеце "Віцебскі рабочы", дзе прайшоў шлях ад карэспандэнта да галоўнага рэдактара. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

АДНОЙЧЫ І НАЗАЎСЁДЫ

5 снежня 1935 года і 19 студзеня 1999 года... Дзве даты... А паміж імі жыццё. Жыццё Уладзіміра Рыгоравіча Скапы — самаадданага журналіста, чалавека вялікай душы. Лёс яго быў тыповым для вясковага хлопчыка, чыё дзяцінства апаліла Вялікая Айчынная вайна. Бачыў ён слёзы, бачыў кроў, і гэта назаўсёды зрабіла яго спагадлівым да чужога гора і чалавечай бяды.

Уладзімір Рыгоравіч быў прафесіяналам у сваёй справе. Газетная работа стала яго выбарам аднойчы і назаўсёды. Яго пяру належаць сотні артыкулаў, нарысаў, фельетонаў.

Усё, напісанае Уладзімірам Рыгоравічам — своеасаблівы летапіс Віцебшчыны за трэць стагоддзя.

Асабліва вялікі ўклад У. Р. Скапа зрабіў у распрацоўку тэматыкі нацыянальнага адраджэння, гісторыка-культурнай спадчыны Прыдзвіння. Ён з'яўляецца аўтарам і сааўтарам кніг па гісторыі Віцебшчыны, аб яе слаўных людзях.

Многа пісаў ён аб роднай Сенненшчыне, аб сваіх земляках, аб вядомых людзях, якімі ганарыцца Беларусь, аб людзях простых, звычайных, якія жывуць з намі побач, і ў справах і лёсах якіх журналіст здолеў знайсці нешта сваё, адметнае, што робіць яго герояў цікавымі для чытачоў. Яго гісторыка-эканамічны нарыс "Сянно", выдадзены асобнай кніжкай у 1978 г. у Мінску.

Уладзімір Рыгоравіч шмат зрабіў для хронікі "Памяць. Сенненскі раён". Ён напісаў шэраг артыкулаў, якія ахопліваюць гістарычныя перыяды — ад Кастрычніцкай рэвалюцыі і да нашых дзён. У гэтым яму, канечне ж, дапамагло тое, што ён усё сваё жыццё збіраў дакументы і публікацыі, якія тычыліся гісторыі родных мясцін.

І. Е. Лазука.

Ул. Р. Скапа (першы справа) падчас працы рэдактарам Сенненскай газеты з супрацоўнікамі П. Ермашкевічам і В. Пілюцінай.

Звязаны лёсам

ДАМАШКЕВІЧ Мікалай Фёдаравіч. Нарадзіўся 4.9.1949 г. у г. Жыткавічы Гомельскай вобласці. Дзяржаўны дзеяч. Скончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут (1973), Вышэйшую партыйную школу (1986). Працоўны шлях пачаў у Жыткавіцкім раёне. У 1970—1973 г. першы сакратар Жыткавіцкага райкома ЛКСМБ. Пасля вайсковай службы працаваў у меліярацыйных арганізацыях, дзе

М. Ф. Дамашкевіч.

прайшоў шлях ад намесніка начальніка ПМК да першага сакратара Сенненскага райкома КПБ. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1990—1996). Зараз працуе старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

ПУНКТ АПОРЫ МІКАЛАЯ ДАМАШКЕВІЧА

Ёсць нейкая, амаль што няўлоўная, западаючая ў самае сэрца нябачная, прыцягальная сіла ў гэтага горада. Непатрабавальнага сваім абліччам, але непаўторнага ў шматкаляровасці фарбаў у любы час года. Пабыўшы тут адзін раз — вясной ці летам, восенню або зімой, — пры першым зручным выпадку хочаца вярнуцца зноў.

Вось і Мікалай Фёдаравіч Дамашкевіч, цяперашні старшыня Мінскага аблвыканкома, пацвердзіць гэта. Надарыцца аказія — абавязкова заездзе ў Сянно. Палюбуецца возерам і горадам, раскінуўшымся мудрагелістымі яругамі на берагах, цудоўным садам ля дома, які некалі насадзіў сам.

Лёс распарадзіўся так, што гэтаму гораду, людзям раёна аддаў Мікалай Фёдаравіч амаль што дваццаць гадоў жыцця. Засталіся карэнні, глыбока, трывала. Маючы прыроджаныя задаткі лідэра, тут ён сфарміраваўся ў сур'ёзнага, удумлівага кіраўніка, думаючага маштабна і неардынарна, стаў членам урада, пазнаў цану сапраўднай дружбы.

Мікалай Фёдаравіч з сям'ёй прыехаў у Сянно, у мясцовую ПМК-33 на пасаду намесніка начальніка па механізацыі і ўласнаму будаўніцтву. Малады, надцягнуты. У райкоме партыі, райвыканкоме, у працоўным калектыве хутка заўважылі: справу ведае, працуе напорыста, самааддана, з раніцы да вечара — у рабоце, у яго шмат планаў і задумак.

Што б ні гаварылі сёння, савецкая сістэма падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў заўсёды "заўважала" людзей таленавітых. Мікалай Фёдаравіч Дамашкевіч прыйшоў у Сенненскі раён нікому не вядомым маладым чалавекам і за дзевяць гадоў стаў прызнаным лідэрам. Яго выбіраюць дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі.

Гэты былі гады непаўторныя. Горад і вёска забудоўваліся і развіваліся маштабна і ўпушальна. У Сянне стварасцца новая будаўнічая ПМК. На сяле шырока ўкараняюцца інтэнсіўныя тэхналогіі вырошчвання сельскагаспадарчых культур, будуюцца дарогі, данаможныя цэхі па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі. Тут вырошчвалі тады лён на плошчы звыш пяці тысяч гектараў. І ўраджай атрымлівалі па 9—10 цэнтнераў валакна з гектара. Актыўна павялічвалі пагалоўе жывёлы і свіней. Прыкметна ўзнялі прадукцыйнасць дойнага статка.

Дамашкевіч часта казаў тады: пункт апоры ў вырашэнні любой праблемы — людзі. Ён ведаў, што называецца, у твар многіх механізатараў і даярак, меліяратараў, рабочых будаўнічых падраздзяленняў, не кажучы аб спецыялістах. І сярод мясцовай інтэлігенцыі яго слова было важкім і значным. У прыёмнай першага сакратара рэдка збіралася чарга на прыём — часцей за ўсё Мікалай Фёдаравіч сам выязджаў у той ці іншы калектыў і вырашаў мноства пытанняў.

У снежні 1998 года Мікалай Фёдаравіч узначаліў Мінскі абласны выканаўчы камітэт. Ён зноў на перадавой.

М. Крыжаноўскі.

ЛАБАНОК Уладзімір Елісеевіч. Нарадзіўся 3.7.1907 г. у в. Востраў Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Дзяржаўны і партыйны дзеяч. Арганізатар і кіраўнік падпольнага і партызанскага руху на Віцебшчыне. Герой Савецкага Саюза (1943).

Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1931), ВПШ пры ЦК КПСС (1956). З 1934 па 1940 г. працаваў дырэктарам Беліцкага сельскагаспадарчага тэхнікума на Сенненшчыне.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны працаваў старшынёй Полацкага і Гомельскага аблвыканкомаў, першым сакратаром Палескага і Віцебскага абкомаў КПБ, першым намеснікам старшыні Савета Міністраў БССР. Неаднойчы выбіраўся дэпутатам Вярхоўных Саветаў СССР і БССР. Узнагароджаны 3 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, ордэнам Суворава I ступені, 4 іншымі ордэнамі, медалямі. Аўтар кніг і артыкулаў пра партызанскую барацьбу. Памёр у 1984 г.

ПРЫШЧЭПАЎ Дзмітрый Філімонавіч. Нарадзіўся 21.11.1896 г. у вёсцы Калодніца Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Крупскі раён Мінскай вобласці). Працоўную дзейнасць пачынаў пастухом, батраком. Экстэрнам здаў экзамен на званне народнага настаўніка.

У 1915 г. прызваны ў армію. Скончыў паскораныя курсы ваеннага вучылішча. У дні Кастрычніцкай рэвалюцыі быў абраны камандзірам палка і старшынёй палкавога ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. У снежні 1917 г. Сенненскі павятовы Савет прызначыў Дз. Ф. Прышчэпава камандзірам атрада Чырвонай гвардыі. Пазней ён стаў камандзірам 2-га Смаленскага палка. У 1918 г. старшыня Сенненскага павятовага выканкома, потым старшыня павятовага камітэта партыі бальшавікоў. Узначальваў Веліжскі рэўком і Аршанскі павятовы выканком. З 1923 г. намеснік старшыні Віцебскага губернскага выканкома і загадчык зямельнага ўпраўлення. У 1924—1929 г. народны камісар земляробства Беларусі. У 1925 г. па яго ініцыятыве адкрыты Віцебскі ветэрынарны інстытут. У 1929 г. Прышчэпаў прызначаны намеснікам старшыні Дзяржплана БССР. У тым жа годзе — начальнік Палескай вопытнай станцыі. У ліпені 1930 г. арыштаваны. У лагерах да 24.6.1937 г. 13.8.1937 г. зноў арыштаваны. Памёр 31.1.1940 г. у турэмнай бальніцы г. Мінска. Рэабілітаваны ў 1958 г. і 1988 г. Дз. Ф. Прышчэпаў лічыў, што "...самой лучшей формой землепользования является коллективная". У той жа час выступаў за свабодны выбар сялянамі форм гаспадарання на сваёй зямлі. За 4 гады, калі ён быў наркомам земляробства, было створана 54 тысячы хутароў. За гэта быў абвінавачаны ў "прышчэпаўшчыне" і рэпрэсіраваны.

Яны ўзначальвалі раён

СТАРШЫНІ СЕННЕНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

Зыкаў Ануфрый Мікітавіч — 1924 г.
Навумчык Іосіф Мікалаевіч — 1924—1926 г.
Брыкаў Сямён Агсевіч — 1926—1927 г.
Шляхтуноў Фёдар Сідаравіч — 1927—1929 г.
Крышкіян Уладзімір — 1929 г.
Гнеўка Нічыпар Сяргеевіч — 1929—1930 г.
Грынкевіч Павел Купрыянавіч — 1930 г.
Себясевіч — 1931 г.
Брэль Мікіта Сямёнавіч — 1933 г.
Бялуга Рыгор Р. — 1933 г.
Квіліс Рудольф Пятровіч — 1933—1934 г.
Качук Алесь Мацвесвіч — 1934 г.
Вераб'ёў (Ілля Якубаў) — 1936—1937 г.
Міклушоў Міхаіл Якаўлевіч — 1937 г.
Грыгор'сў Іван Сямёнавіч — 1937 г.
Шлёмін Фёдар Пракопавіч — 1938—1941 г.
Міклушоў Міхаіл Якаўлсвіч — 1944 г.
Гавядка Максім Васільевіч — 1945—1952 г.
Фіткевіч Пётр Сідаравіч — 1952 г.
Клімаў Аркадзь Фролавіч — 1952—1957 г.
Новікаў Кірыла Цімафеевіч — 1958—1960 г.
Молахаў Іван Фёдеравіч — 1960—1962 г.
Пацей Пётр Купрыянавіч — 1962 г.
Бармінскі Васіль Васільевіч — 1962—1970 г.
Бураўцава Яўгенія Захараўна — 1970—1977 г.
Маханькоў Яўген Мікалаевіч — 1977—1978 г.
Стук Георгій Віктаравіч — 1978—1984 г.
Дамашкевіч Мікалай Фёдаравіч — 1984—1985 г.
Вайцяховіч Станіслаў Трафімавіч — 1985—1996 г.
Дзегалевіч Валерый Аляксандравіч — 1996—2000 г.
Зэльман Віктар Іванавіч — працуе з 2000 г.

ПЕРШЫЯ САКРАТАРЫ СЕННЕНСКАГА РАЙКОМА ПАРТЫІ

Сударыкаў Ананій Сяргеевіч — 1924 г.
Мурзіч Нікадзім Віктаравіч — 1924—1927 г.

Івры Барыс Мацвеевіч — 1927—1928 г.

Арашчук Архіп Герасімавіч — 1928—1929 г.

Патапенка Павел Цярэнцьевіч —

Алай Іван Міхайлавіч — 1931—1932 г.

Дашукевіч Алесь Ціханавіч — 1933 г.

Ланцнэр Навум Міхайлавіч — 1933—1934 г.

Кац Мэер Ісакавіч — 1934—1938 г.

Левін Саул Мендэлевіч — 1938—1941 г.

Любімцаў Міхаіл Ціханавіч — 1944—1945 г.

Бажанок Кірыла Пятровіч — 1945—1950 г.

Шапавалаў Іван Яфімавіч — 1950—1951 г.

Зенін Дзмітрый Міхайлавіч — 1951—1953 г.

Турко Мікалай Пятровіч — 1953—1957 г.

Клімаў Аркадзь Фролавіч — 1957—1962 г.

Жураўкоў Аляксандр Мацвеевіч — 1962—1967 г.

Радзецкі Яўген Іванавіч — 1967—1976 г.

Храмчанка Рыгор Міхайлавіч — 1976—1985 г.

Дамашкевіч Мікалай Фёдаравіч — 1985—1991 г.

СТАРШЫНІ БАГУШЭЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

Савельеў Васіль — 1924—1925 г.

Грабенчык Якаў Ісакавіч — 1925 г.

Радкевіч Гаўрыла Іванавіч — 1925—1926 г.

Зялюткін Іван Лукіч — 1926—1928 г.

Максімаў Рыгор — 1929 г.

Іваноў Уладзімір Аляксеевіч — 1929 г.

Шашкін Паўлюк Самуілавіч — 1930 г.

Бажанаў Зіновій Ф. — 1930—1931 г.

Яўдасьеў Яфім Сцяпанавіч — 1935—1938 г.

Варанцоў М. Ф. — 1939 г.

Яроменка Ануфрый Палікарпавіч — 1939—1941 г.

Сямашка Сямён Еўдакімавіч — 1943—1946 г.

Сцяпанаў Аляксандр Захаравіч — 1946—1950 г.

Кузьмін Аляксей Фёдаравіч — 1950—1951 г.

Галай Якаў Карэевіч — 1951—1953 г.

Паўлючэнка Барыс Дзмітрыевіч — 1953—1959 г.

Іваноўскі Уладзімір Эдуардавіч — 1959—1960 г.

ПЕРШЫЯ САКРАТАРЫ БАГУШЭЎСКАГА РАЙКОМА ПАРТЫІ

Дубавік (Іван Аляксеевіч) — 1924—1925 г.

Валуеў Уладзімір Ульянавіч — 1925—1926 г.

Кавальчук Сямён Антонавіч — 1926—1928 г.

Крывіцкі Мікалай (Нічыпаравіч) — 1928—1929 г.

Іваноў Уладзімір Аляксеевіч — 1929—1930 г.

Отахель Сцяпан (Іванавіч) — 1930—1931 г.

Мажуеў Ніл Якаўлевіч — 1932—1938 г.

Рабцаў Ілля Мікалаевіч — 1938—1939 г.

Стэльмах Адам Канстанцінавіч — 1939—1941 г.

Прахарэнка Яфім Мікалаевіч — 1944—1950 г.

Грыгаровіч Нікадзім Гаўрылавіч — 1950—1952 г.

Бабкевіч Уладзімір Ануфрыевіч — 1952—1957 г.

Кароткі Аляксей Ніканоравіч — 1957—1960 г.

Яны былі на Сенненшчыне

ЯНКА КУПАЛА

У канцы 1903 г. і ў пачатку 1904 г. жыў і працаваў у вёсцы Беліца народны паэт Беларусі Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч). Ён служыў у канторы маёнтка памешчыка К. Свяцкага, потым быў прызначаны малодшым прыказчыкам. Вясной 1904 г. у сувязі з хваробай маці пакінуў службу. Старажыл вёскі Карп Харытонавіч Абушкевіч успамінаў: "Я добра ведаў Івана Дамінікавіча, будучага народнага паэта Беларусі. У 1902—1904 гадах мне давялося працаваць у маёнтку памешчыка паштальёнам. Часта сустракаўся з Янкам Купалам. Мы неаднаразова вялі гаворку аб нашым жыцці-быцці. Гэта быў надзвычай сціплы і душэўны чалавек".

З. Бараноўская.

МАКСІМ ГАРЭЦКІ

Вядомы беларускі пісьменнік і фальклярыст Максім Іванавіч Гарэцкі (1893—1938) прыязджаў у вёску Нямойта. Сустракаўся з сялянамі, школьнікамі. Выступаў перад рабочымі, якія будавалі чыгунку Орша—Лепель. Бываў і ў іншых навакольных вёсках, запісваў народныя песні, абрады.

На Сенненшчыне таксама былі ў розны час, сустракаліся з чытачамі, выступалі на літаратурных вечарах у працоўных калектывах, у школах беларускія пісьменнікі і паэты Алесь Адамовіч, Міхась Башлакоў, Антон Бялевіч, Ніл Гілевіч, Міхась Калачынскі, Іван Калеснік, Леанід Прокша, Міхась Стральцоў і іншыя.

ЛЮДМІЛА ЗЫКІНА

6 ліпеня 1989 г. наведала Сянно народная артыстка СССР, Лаўрэат Ленінскай прэміі Людміла Георгіеўна Зыкіна. Яна выступіла на імправізаванай сцэне ў Сянне ў дзень святкавання народнага свята "Купалле".

ЯДВІГА ПАПЛАЎСКАЯ І АЛЯКСАНДР ЦІХАНОВІЧ

У ліпені 1999 г. Сенненшчына адзначыла 70-годдзе ўтварэння раёна. На свята былі запрошаны заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч.

У вёсцы Баравікі нарадзіўся ў 1911 г. бацька вядомага артыста Рыгор Міхайлавіч Ціхановіч.

— Недзе ў пяцігадовым узросце бацька прывозіў мяне з Мінска ў Сянно, — успамінае Аляксандр Ціхановіч. Не ўсё засталося ў памяці. Але возера, Дом культуры помню добра. Не ведаю як цяпер, а тады ў возеры было шмат ракаў. А яшчэ у час таго праезду да бацькі падыходзіла шмат людзей, мабыць даўнія знаёмыя, землякі, віталіся з ім, распытвалі пра жыццё-быццё...

І. Е. Лазука.

Верныя воінскаму абавязку

Салдацкая служба нялёгкая. Воін заўсёды гатовы па першаму загаду Радзімы выступіць на яе абарону і, калі спатрэбіцца, аддаць за яе сваё жыццё. На тое ён і салдат, на тое ён і прымаў ваенную прысягу на вернасць Айчыне, свайму народу. Не толькі гінуць салдаты на вайне, у час лакальных канфліктаў, але і ў мірны час, абараняючы стваральную працу, спакой, свяшчэнныя рубяжы, грамадскі правапарадак, пры размініраванні арсеналаў зброі, якія засталіся пасля Вялікай Айчыннай вайны. Сенненцы шануюць памяць тых, хто загінуў у мірны час, выконваючы свой воінскі абавязак.

Ваеннаслужачыя — ураджэнцы Сенненскага раёна, якія загінулі ў час праходжання службы ў Савецкай Арміі ў пасляваенны перыяд

БАБКОЎ Аляксандр Максімавіч. Нарадзіўся ў 1951 г. у вёсцы Янова. Мал. сяржант. Загінуў 12.11.1970 г. Пахаваны ў вёсцы Янова.

ГАРНАК Уладзімір Сямёнавіч. Нарадзіўся ў 1939 г. у вёсцы Копцы. Мал. сяржант. Загінуў 14.7.1961 г.

КАЛЫМАГА Уладзімір Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1956 г. у вёсцы Сінягорскае. Радавы. Загінуў 1.12.1975 г.

ЛЯЎКО Мікалай Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1962 г. у вёсцы Лука. Мал. сяржант. Памёр 11.4.1984 г.

МІЦКЕВІЧ Аляксандр Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1961 г. у вёсцы Латыгаль. Радавы. Загінуў 29.5.1981 г. Пахаваны ў вёсцы Латыгаль.

МЯРКУЛАЎ Леанід Барысавіч. Нарадзіўся ў 1952 г. у вёсцы Прыхабы. Радавы. Загінуў 17.10.1972 г.

САЛАМАХА Генадзь Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1940 г. у в. Канстантова. Радавы. Загінуў 6.7.1961 г. Пахаваны ў г. Патсдам, Германія.

ЦІХАНЕНКА Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся ў 1952 г. у вёсцы Янова. Радавы. Загінуў 11.7.1972 г.

ЧОРНЫ Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў 1949 г. у вёсцы Навасёлкі. Яфрэйтар. Загінуў 16.2.1969 г.

Яны выконвалі інтэрнацыянальны абавязак

КІТАЙ, КАРЭЯ

КІБІС Аляксандр Ягоравіч. Нарадзіўся ў 1929 г. у вёсцы Цыпкі.У Кітаі і Карэі з кастрычніка 1946 па 25.1.1952 гг.

ПАДГОРЫН Аркадзь Іванавіч. Нарадзіўся ў 1927 г. у г. Сянно, служыў з 17.4.1952 г. па 12.12.1952 г.

РЫПІНСКІ Аляксандр Аўрамавіч. Нарадзіўся ў 1929 г. у вёсцы Навасёлкі, служыў з лістапада 1950 г. па верасень 1952 г.

ТРАФІМАЎ Сцяпан Васільевіч. Нарадзіўся ў 1929 г. у г. п. Багушэўск, служыў з верасня 1952 г. па май 1953 г.

ФРАЛОЎ Дзмітрый Яфрэмавіч. Нарадзіўся ў 1929 г. у г. п. Багушэўск, служыў з 12.6.1951 г. да 7.2.1953 г.

В'ЕТНАМ

МАШЭДА Аркадзь Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1944 г. у г. п. Багушэўск, служыў з 1.1.1964 г. да 1.10.1966 г.

АФГАНІСТАН

З канца 1970-х і да канца 1980-х, амаль дзесяць гадоў працягвалася вайна ў Афганістане. 75 сенненцаў прайшлі дарогамі гэтай вайны, тры воіны загінулі, адзін прапаў без вестак. Мужнасць і вернасць салдата прысязе не сатрэцца ў памяці народнай.

АБУШКЕВІЧ Міхаіл Анатольевіч. Нарадзіўся ў 1968 г. у вёсцы Маргойцы, служыў з 7.8.1987г. па 9.6.1988 г., радавы.

АКУЛЁНАК Сяргей Пятровіч. Нарадзіўся ў 1968 г. у г. Сянно, служыў з 7.8.1986 г. па 3.5.1988 г., радавы.

АСАТУЛЬЯН Юрый Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1969 г. у г. Сянно, служыў з 11.7.1986 г. па 25.1.1989 г., радавы.

БАЦВІНАЎ Юрый Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1965 г. у г. Сянно, служыў з 24.12.1983 г. па 16.12.1985 г., мал. сяржант.

БЕРАСТАЎ Міхаіл Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1964 г. у вёсцы Расна, служыў з 21.6.1982 г. па 10.8.1984 г., мал. сяржант.

БОБРЫК Аляксандр Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1968 г. у вёсцы Будзішча, служыў з 2.11.1986 г. па 16.5.1988 г., ст. сяржант.

БУЛЫНЯ Леанід Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Сянно, служыў з 6.7.1981 г. па 12.5.1983 г., радавы.

ВАКАР Мікалай Васільевіч. Нарадзіўся ў 1963 г. у вёсцы Ледневічы, служыў з 5.7.1981 г. па 12.5.1983 г., сяржант.

ВАЛАДКЕВІЧ Анатоль Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1965 г. у вёсцы Аўчынкава, служыў з 1.12.1983 г. па 7.2.1986 г., радавы. Узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі".

ВАСІЛЁНАК Аляксандр Анатольевіч. Нарадзіўся ў 1957 г. у вёсцы Гарывец: служыў з 15.9.1984 г. па 26.8.1986 г., старшына I стацці, служачы.

ГАЛКІН Дзмітрый Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1960 г. у вёсцы Сінягорскае, служыў

з 25.3.1981 г. па 15.3.1982 г., ст. сяржант. Узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі".

ГАНЧАРЭНКА Пётр Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у вёсцы Малы Азярэцк, служыў з 14.11.1986 г. па 12.1.1989 г., сяржант.

ГАРБАЦЭВІЧ Генадзь Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1962 г. у вёсцы Машканы, служыў з 5.12.1980 г. да 19.5.1984 г., сяржант.

ГАРБАЧОЎ Аляксандр Васільевіч. Нарадзіўся ў 1958 г. у г. Сянно, служыў з 6.4.1981 г. па 14.7.1982 г., ст. прапаршчык.

ГАРДЗЮК Юрый Сяргеевіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у г. Сянно, служыў з 1.4.1985 г. па 30.4.1986 г., сяржант.

ГАРНАК Васіль Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1962 г. у вёсцы Пожанькі, служыў з 5.6.1981 г. па 5.6.1983 г., радавы.

ГАРНАК Уладзімір Сямёнавіч. Нарадзіўся ў 1961 г. у г. Сянно, з 26.12.1979 г. па 20.11.1980 г., радавы.

ГРАЧОЎ Уладзімір Васільевіч. Нарадзіўся ў 1948 г., служыў з 25.9.1985 г. па 1.8.1987 г., падпалкоўнік.

ГУБАРЭВІЧ Аляксандр Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Сянно, служыў з 18.5.1983 г. па 17.11.1984 г., радавы.

ДЗЕРАНОК Уладзімір Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1964 г. у вёсцы Алексінічы, служыў з 2.8.1983 г. па 2.7.1984 г., радавы.

ДЗІВАС Ягор Алегавіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у вёсцы Полымя, служыў з 12.1.1987 г. па 19.1.1988 г., радавы.

ДЗЯБОЛЬСКІ Сяргей Іванавіч. Нарадзіўся ў 1957 г., служыў з 2.11.1985 г. па 17.5.1986 г., падпалкоўнік. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі.

ДУНЕЦ Уладзімір Валер'евіч. Нарадзіўся ў 1969 г. у г. Сянно, служыў з 14.2.1988 г. па 9.2.1989 г., радавы.

ЕРАШЭНКА Аляксандр Васільевіч. Нарадзіўся ў 1962 г. у вёсцы Ульянавічы, служыў з 16.8.1981 г. па 26.6.1983 г., радавы.

ЕРМАЛОВІЧ Віктар Леанідавіч. Нарадзіўся ў 1964 г. у г. Сянно, служыў з 1.1.1984 г. па 31.10.1985 г., сяржант.

ЖУРАЎ Анатоль Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у вёсцы Алексінічы, служыў з 12.8.1985 г. па 12.8.1987 г., радавы.

ЖЫГАЛАЎ Аляксандр Рыгоравіч. Нарадзіўся ў 1961 г. у вёсцы Цясы, служыў з 10.2.1980 г. па 14.12.1981 г., ст. сяржант.

ЗАЙЦАЎ Дзмітрый Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1968 г. у вёсцы Маргойцы, служыў з 7.8.1987 г. па 14.6.1988 г., радавы.

КАЗЛОЎ Уладзімір Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1961 г. у вёсцы Клімавічы, служыў з 12.11.1988 г. па 15.11.1989 г., радавы. Узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі".

КАМІНСКІ Мікалай Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1962 г. у г. Сянно, служыў з 23.12.1980 г. па 19.5.1981 г., мал. сяржант.

КАМОВІЧ Анатоль Васільевіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у вёсцы Багданава, служыў з 3.8.1985 г. па 12.3.1986 г., мал. сяржант.

КАЦАР Уладзімір Генадзьевіч. Нарадзіўся ў 1965 г. у г. Сянно, служыў з 1.6.1985 г. па 30.10.1985 г., сяржант. Узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі".

КЕНІХ Вячаслаў Канстанцінавіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у г. Сянно, служыў з 2.10.1985 г. па 10.12.1987 г., радавы.

КОСЫЙ Валерый Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1961 г. у г. п. Багушэўск, служыў з 25.12.1980 г. па 16.6.1982 г., радавы.

КРЫШТОПЕНКА Уладзімір Уладзіміравіч. Нарадзіўся з 1968 г. у г. Сянно, служыў з 7.5.1987 г. па 21.3.1988 г., радавы.

КУЧЫНСКІ Аляксандр Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1968 г. у г. Сянно, служыў з 25.2.1987 г. па 15.2.1989 г., радавы.

ЛАДЗІК Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1969 г. у г. Сянно, служыў з 3.6.1988 г. па 26.1.1989 г., мал. сяржант.

ЛАТЫШАЎ Андрэй Анатольевіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у вёсцы Янова, служыў з 12.12.1984 г. па 23.4.1986 г., радавы. Узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі".

ЛАТЫШАЎ Сяргей Леанідавіч. Нарадзіўся ў 1959 г., у г. Сянно, служыў з 14.2.1980 г. па 25.6.1981 г., радавы.

ЛІШАЁЎ Аляксандр Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1962 г. у вёсцы Бяленева, служыў з 22.11.1980 г. па 30.11.1982 г., мал. сяржант.

ЛУЗГІН Алег Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1969 г. у вёсцы Оўсішча, служыў з 6.11.1988 г. па 8.2.1989 г., радавы.

ЛУЦАЙКОВІЧ Анатоль Мяфодзьевіч. Нарадзіўся ў 1969 г. у г. Сянно, служыў з 9.11.1987 г. па 10.12.1989 г. Узнагароджаны медалём "За адвагу" і знакам "За мужнасць і воінскую доблесць".

МАНДРЫК Міхаіл Іванавіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у г. п. Багушэўск, служыў з 6.5.1986 г. па 10.11.1987 г., радавы.

МАХАНЬКОЎ Уладзімір Пятровіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у вёсцы Шынкава, служыў з 4.2.1985 г. па 10.11.1986 г., радавы.

МЕЗАЎЦОЎ Юрый Леанідавіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у г. Сянно, служыў з 6.8.1985 г. па 6.5.1989 г., радавы.

НЯФЁДАЎ Аляксандр Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1965 г. у вёсцы Келісы, служыў з 3.11.1983 г. па 26.4.1985 г., мал. сяржант.

ПАНКРАТАЎ Анатоль Анатольевіч. Нарадзіўся ў 1964 г. у вёсцы Ледневічы, служыў з 28.6.1982 г. па 26.5.1984 г., мал. сяржант.

ПАЛЯШКЕВІЧ Міхаіл Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1959 г. у вёсцы Ходцы, служыў з 20.12.1979 г. па 29.5.1980 г., мал. сяржант.

ПАШКЕВІЧ Васіль Сямёнавіч. Нарадзіўся ў 1969 г. у вёсцы Рулёўшчына, служыў з 8.8.1987 г. па 2.2.1989 г., радавы.

ПІСАРЭНКА Аляксандр Антонавіч. Нарадзіўся ў 1964 г. у вёсцы Полымя, служыў з 21.6.1982 г. па 10.8.1984 г., сяржант.

ПІЦКАЛЁЎ Уладзімір Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1968 г. у вёсцы Латыгава, служыў з 11.2.1987 г. па 1.2.1989 г., радавы.

РАСПОРСКІ Аляксандр Аркадзьевіч. Нарадзіўся ў 1970 г. у вёсцы Сычыкі, служыў з 5.7.1988 г. па 25.5.1990 г., радавы.

РАЧКОЎСКІ Сяргей Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1963 г. у вёсцы Рассвет, служыў з 2.10.1987 г. па 15.2.1989 г., радавы.

САВЕЛЬЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у г. Сянно, служыў з 31.7.1985 г. па 13.8.1987 г., радавы.

САМСОНАЎ Алег Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у вёсцы Капланы, служыў з 14.11.1986 г. па 4.5.1988 г., сяржант.

СІНЯКОЎ Андрэй Анатольевіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у вёсцы Галавачы, служыў з 6.1.1985 г. па 11.8.1987 г., радавы.

СКУМС Віктар Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у вёсцы Баравікі, служыў з 25.10.1985 г. па 7.5.1987 г., радавы.

СТАНКЕВІЧ Леанід Пятровіч. Нарадзіўся ў 1947 г. у в. Заазер'е, служыў — снежань 1979 і з 11.7.1988 г. па 12.1.1989 г., маёр, ваенны пенсіянер. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

СУДНІЧЭНКА Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў 1969 г. у г. п. Багушэўск, служыў з 4.6.1988 г. па 2.2.1989 г., мал. сяржант. Узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі".

СУХАДОЛАЎ Віктар Іванавіч. Нарадзіўся ў 1963 г. у вёсцы Янова, служыў з 1.7.1981 г. па 26.5.1983 г., сяржант. Узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі".

СЯМЁНАЎ Сяргей Пятровіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у вёсцы Обаль, служыў з 23.1.1986 г. па 10.8.1988 г., мал. сяржант.

ТАРАПАЎ Валерый Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у вёсцы Каралі, служыў з 2.9.1987 г. па 8.2.1989 г., прапаршчык.

ТКАЧЭНКА Аляксандр Пятровіч. Нарадзіўся ў 1965 г. у вёсцы Леднікова, служыў з 28.6.1983 г. па 4.6.1985 г., радавы.

ТРУБЧАНКА Сяргей Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1966 г. у г. Сянно, служыў з 2.8.1985 г. па 21.6.1986 г., радавы.

ТХОРАЎ Сяргей Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у г. п. Багушэўск, служыў з 17.4.1986 г. па 11.11.1987 г., яфрэйтар.

ХЛЫШЧАНКА Сяргей Іванавіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у вёсцы Рулёўшчына, служыў з 26.10.1985 г. па 5.5.1987 г. Узнагароджаны медалём "За адвагу".

ЦЮЦЮЕЎ Уладзімір Анатольевіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у вёсцы Леснікова, служыў з 6.8.1987 г. па 27.2.1989 г., ст. сяржант.

ЦЯРЭНЯ Сяргей Віталъевіч. Нарадзіўся ў 1962 г. у г. Сянно, служыў з 23.12.1981 г. па 17.11.1982 г., радавы.

ШАЛУХА Ігар Леанідавіч. Нарадзіўся ў 1967 г. у вёсцы Алексінічы, служыў з 11.11.1985 г. па 26.12.1987 г., радавы.

ШУГАЛЬСКІ Сяргей Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1968 г. у вёсцы Цыпкі, служыў з 5.11.1986 г. па 15.6.1988 г., мал. сяржант.

ШЧАМЯЛЁЎ Аляксандр Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1959 г. у г. п. Багушэўск, служыў з 20.1.1980 г. па 22.11.1980 г., сяржант. Узнагароджаны медалём "За адвагу".

Ніколі не згладзіцца ў памяці

Афіцыйна сродкі масавай інфармацыі паведамлялі, што абмежаваны кантынгент савецкіх войск у Афганістане быў уведзены 27 снежня 1979 года. Але гвардыі капітан Леанід Станкевіч трапіў туды на два дні раней. І не толькі ён адзін, а ўся Віцебская паветрана-дэсантная дывізія.

Па сігналу "Шторм-333" 27 снежня батальён пры падтрымцы спецназаўцаў пайшоў на штурм Генштаба ў Кабуле.

Капітан разам з адной з рот браў кабінеты. Адчыніў дзверы аднаго з іх, і тут жа перад вачыма бліснула белае полымя...

Асколкі ад гранаты трапілі ў твар Станкевічу. 31 снежня яго адправілі ў Саюз. У шпіталі лячыўся тры месяцы.

За штурм Генштаба Леанід Станкевіч, беларускі хлопец з Сенненшчыны, атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Ён стаў адным з першых узнагароджаных у той вайне.

Л. П. Станкевіч.

У красавіку 1980 года Леанід Станкевіч вярнуўся ў Афганістан, у родны полк, у свой 3-і батальён. Праваяваў два гады.

З 1981 года па 1989 год служыў у Пскове. Час ішоў, і прыходзілася задумвацца аб звальненні ў запас. А ён падаў рапарт камандаванню з просьбай зноў накіраваць яго ў Афганістан.

Яго рапарт, хоць з цяжкасцю, але задаволілі. Праслужыў да вываду савецкіх войск.

— Праваяваў,— гаворыць Леанід Пятровіч,— так будзе правільней.

Шынданд — асноўная база палка, адкуль дэсантнікі накіроўваліся на баявыя аперацыі. Герат, Фарах, Чахчаран, Кандагар, Гурыян — вось тыя правінцыі, дзе даводзілася Станкевічу ўдзельнічаць у баях з душманамі.

Неяк разведка данесла, што праз мяжу з суседняй краіны збіраецца прайсці калона "духаў". Леанід Станкевіч з ротай дэсантнікаў на верталётах вылецеў туды, дзе намячаўся праход варожай калоны. Дзікія горы, скалы, сярод якіх вузкая дарога. Наладзілі засаду. І вось паказаліся аўтамашыны з душманамі. Грымнулі стрэлы гранатамётаў, раздаліся кулямётныя і аўтаматныя чэргі. Не чакалі душманы засады і не змаглі арганізаваць агонь у адказ. Калона была разгромлена. Рота знішчыла дзесяць аўтамашын з жывой сілай. Дэсантнікі страт не мелі.

Колькі іх было, такіх баёў! Шмат, і не ўсе абыходзіліся без страт. Гінулі салдаты і афіцэры. А Леаніда ні куля, ні аскалак больш не зачапілі. Мусіць, хапіла таго першага ранення.

Л. П. Станкевіч дэмабілізаваўся ў званні маёра.

— Часта па начах сніцца Афганістан,— успамінае Леанід Пятровіч.

І. Е. Лазука.

Загінулі ў Афганістане

ГАЛЬКЕВІЧ Аляксандр Уладзіміравіч. Нарадзіўся 20.6.1965 г. у вёсцы Бяленева. У 1983 г. закончыў школу рабочай моладзі, курсы трактарыстаў. 29.9.1983 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. З 5.12.1983 г. праходзіў службу ў Афганістане. Быў кулямётчыкам. Радавы А. В. Галькевіч загінуў 2.4.1984 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў вёсцы Магілёўка. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

РУСАЧЭНКА Віктар Віктаравіч. Нарадзіўся 22.7.1965 г. у вёсцы Івашкава.

У 1980 г. закончыў 8 класаў Какоўчынскай сярэдняй школы, у 1983 г. — Аршанскае ПТВ № 110. Працаваў цесляром на будоўлі Новалукомля. 22.4.1983 г. Полацкім райваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. У 1984 г. накіраваны ў Афганістан. 28.1.1985 г. радавы В. В. Русачэнка памёр ад кулявога ранення, атрыманага пры выкананні воінскага абавязку. Пахаваны ў вёсцы Івашкава.

За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

СТАСЕЛЬКА Васіль Іванавіч. Нарадзіўся 25.6.1963 г. у вёсцы Замошша. У 1978 г. закончыў 8 класаў Машканскай сярэдняй школы, у 1981 г. — Гродзенскі фізкультурны тэхнікум. Працаваў выкладчыкам фізкультуры ў Талачынскім раёне. У сакавіку 1982 г. Талачынскім райваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл і накіраваны ў Афганістан. Радавы. Выканаў шэраг баявых заданняў камандавання. 19.7.1983 г. памёр ад хваробы. Пахаваны ў вёсцы Стрыгі.

За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Прапаў без вестак

ЗВЯРКОВІЧ Аляксандр Анатольевіч. Нарадзіўся ў 1964 г. у вёсцы Маргойцы. Прапаў без вестак 7.3.1984 г.

Фізкультурны і спартыўны рух

У першыя пасляваенныя гады ў раёне поўнасцю адсутнічала спартыўная база, не было спецыялістаў па фізкультуры і спорту. Толькі ў 1952 годзе адкрылася спартыўная зала ў сярэдняй школе № 1 г. Сянно. Па цяперашнім часе, залай яна магла называцца чыста ўмоўна. Але тады яна адразу стала цэнтрам фізкультуры і спорту для горада і ўсяго раёна. Пачынаючы з 1953 года, у раён сталі накіроўвацца выпускнікі тэхнікумаў і інстытутаў фізкультуры. У 1954 годзе ў СШ № 1 прыбылі маладыя спецыялісты Таццяна Васільеўна Карашкова і Раіса Паўлаўна Шабуніна (Вялюгіна). На базе СШ № 1 была адкрыта дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па гульнявых відах спорту. Першым яе дырэктарам была прызначана Т. В. Карашкова, а Р. П. Шабуніна сумяшчала работу выкладчыка фізкультуры з трэнерскай дзейнасцю ў ДзЮСШ.

Пазней дырэктарам ДзЮСШ стаў выпускнік Беларускага інстытута фізкультуры Аляксандр Сямёнавіч Хаменка. Пры ім школа набыла іншы профіль — лыжныя гонкі. Выхаванцы школы неаднаразова займалі прызавыя месцы па лыжах у вобласці. Анатоль Мурашка быў уключаны ў састаў зборнай каманды рэспублікі. Яму, першаму з сенненскіх лыжнікаў, было прысвоена званне майстра спорту.

У пачатку 1960-х гадоў адбывалася станаўленне фізкультурна-масавай і спартыўнай работы. Акрамя лыжнага, развіваліся іншыя віды спорту. Жаночая валейбольная каманда стала чэмпіёнам аблсавета ДСТ "Ураджай". У састаў каманды ўваходзілі Т. Кубароўская, Л. Казловіч, Л. Чыгір, тры Валі — Жагула, Воранава, Грачыха. Аднымі з мацнейшых у вобласці былі і нашы гарадошнікі А. Паўлоўскі, Л. Пагарэльскі, І. Мяшалкін, А. Высоцкі, В. Бярозка.

У 1964 годзе па ініцыятыве А. Я. Пасканава была створана футбольная каманда, якая дастойна прадстаўляла раён на абласных спаборніцтвах, удзельнічала ў фінале розыгрышу кубка вобласці. Футбол стаў сапраўды масавым спортам, у першынстве раёна прымалі ўдзел больш за 20 каманд.

Правядзенне такіх масавых спаборніцтваў мела пэўны вынік. Пачалося будаўніцтва прасцейшых спартыўных збудаванняў у вёсках. З'явіліся стадыёны ў калгасах "Чырвоны пуцілавец", імя Жданава, "Сцяг Перамогі", імя Ціміразева, "Верны шлях", імя Дзяржынскага, "Кастрычнік" і іншых.

Тады сельскае спартыўнае таварыства культывіравала многія віды спорту: валейбол, баскетбол, веласпорт, лыжныя гонкі,

біятлон, цяжкую атлетыку, стралковы спорт і іншыя. Працавалі розныя спартыўныя секцыі. Была створана пэўная матэрыяльная база, набыта неабходная колькасць інвентару і спартыўнай формы.

Нашы спартсмены рэгулярна ўдзельнічалі ў абласных спаборніцтвах па цяжкай атлетыцы. У розныя гады за каманду выступалі А. Стальмакоў, П. Сілін, В. Грачыха, В. Кароль, В. Сліжоў, В. Суздалеў, Ф. Дубавец, Я. Усціновіч.

Каманда веласіпедыстаў была адной з мацнейшых у вобласці сярод сельскіх спартсменаў, а яе лідэр В. Станкевіч удзельнічаў у першынстве Савецкага Саюза сярод сельскіх веласіпедыстаў.

9 мая 1969 года стартаваў велапрабег, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна па маршруту Сянно—Брэст—Сянно. У ім прынялі ўдзел 10 гоншчыкаў.

У другой палове 1960-х і пачатку 1970-х гадоў асаблівая ўвага ўдзялялася развіццю лыжнага спорту. На абласной спартакіядзе па праграме зімовай спартакіяды народаў СССР, якая праходзіла ў Віцебску ў 1967 годзе, каманда раёна ў неафіцыйным заліку намнога апярэдзіла ўсіх саперникаў, у тым ліку і зборную вобласці.

Потым каманда Віцебскай вобласці на 70% была ўкамплектавана сенненскімі лыжнікамі. У розныя гады за яе выступалі А. Хаменка, В. Станкевіч, В. Мяцеліца, Л. Шафранаў, С. Шыдлоўская, Л. Шаціневская, выхаванцы ДзЮСШ З. Грыгор'ева, Т. Шыдлоўская, В. Памагаева, Э. Бараноўская, Г. Станкевіч, Г. Куляшова, П. Літвінаў, А. Гарчонак і іншыя.

За высокія паказчыкі два нашы лыжнікі сталі майстрамі спорту міжнароднага класа, 6 — майстрамі спорту. Тры былыя выхаванцы мясцовай ДзЮСШ В. Гарбачоў, В. Плаксуноў, Л. Урбановіч уваходзілі ў састаў нацыянальнай зборнай каманды Беларусі, якая прымала ўдзел у Зімовых Алімпійскіх Гульнях. Галіна Куляшова была чэмпіёнкай спартакіяды народаў СССР.

На базе багушэўскіх школ у 1974 годзе было адкрыта аддзяленне лёгкай атлетыкі.

Каманда лыжнікаў Сенненскага раёна, выйграўшая першынство ў Віцебскай вобласці. 1972 г.

Заняткі вёў Г. А. Марозаў, які за кароткі час стварыў каманду, удзельнікі якой перамагалі на абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах. Асабліва паспяхова выступалі Н. Грыцкевіч, якая стала майстрам спорту, Л. Аунапу, Г. Осіпаў, А. Тхораў. Потым Генадзь Аляксеевіч перайшоў працаваць трэнерам ДзЮСШ па лёгкай атлетыцы. Юныя спартсменкі С. Давыдзька, Д. Карась, А. Сапежка былі пераможцамі і прызёрамі рэспубліканскай спартакіяды школьнікаў, І. Камароўская, А. Гнатоўскі сталі майстрамі спорту. У цяперашні час добрых вынікаў дабіваюцца Д. Бараноўскі, Н. Падалінская. У рэзерв зборнай каманды рэспублікі ўключаны А. Мацко.

Доўгі час пры райсавеце ДСТ "Ураджай" працавала секцыя класічнай барацьбы пад кіраўніцтвам А. Кучынскага. Былі створаны неабходныя ўмовы для яе работы. Выхаванцы секцыі, затым аддзялення ДзЮСШ, паспяхова выступалі і выступаюць на спаборніцтвах. Найбольшых поспехаў дабіліся А. Цітоў, Б. Ермакоў.

Пры райсавеце працуе аддзяленне па падрыхтоўцы біятланістаў. Каля вёскі Горы пабудавана стрэльбішча, створаны добрыя ўмовы для трэніровак. Заняткі спачатку вёў К. Каралькевіч, спецыяліст таленавіты, потым працаваў з нацыянальнай камандай Славеніі, у далейшым трэніравалі юных спартсменаў А. Агарак, Я. Усціновіч. З ліку нашых выхаванцаў найбольшага поспеху дабіліся майстры спорту Э. Блыкін, В. Глазуноў, П. Шчарбакоў, Ю. Хадорык.

У 1972 годзе быў уведзены ў дзеянне Усесаюзны комплекс ГПА. Адразу пачалі праводзіцца спаборніцтвы па зімоваму і летняму шматбор'ях комплексу. На Сенненшчыне гэты від спорту быў таксама паспяхова асвоены, і на першынстве аблсавета зборная каманда раёна ніжэй трэцяга месца ніколі не апускалася.

З пачатку 1960-х гадоў і да канца 1980-х у раёне паспяхова развіваўся спартыўны рух. У сувязі з перабудовай, у тым ліку і спартыўнай работы, увага да яго аслабла. Цяпер зноў прымаюцца захады, каб па-сапраўднаму наладзіць фізкультуру і спорт.

Я. М. Усціновіч.

Удзельнікі абласнога кроса. Сянно. Вясна 1974 г.

Асілак з Сенненшчыны

У зале тэатра "Інсурхентэс" раздаўся гром апладысментаў, калі ў фінале захапляльнай "жалезнай гульні" русавалосы атлет падняўся на вышэйшую ступеньку п'едэстала. Праз імгненне ўвысь ўзняўся чырвоны шоўк савецкага сцяга і загучаў гімн Савецкага Саюза. Загучаў у гонар штангіста паўсярэдняй вагі 27-гадовага Віктара Куранцова.

...Віктар з'явіўся на свет у цяжкі і страшны год — 1941-ы. Яму было некалькі месяцаў, калі яго родную вёску Тухінку разрабавалі фашысты. Вайна зрабіла яго сіратой. І жыць Куранцоў застаўся толькі дзякуючы дабраце людской.

Яму шчасціла на добрых людзей. У Нямойтаўскім дзіцячым доме яго кумірам быў стары пячнік, страціўшы ў дні вайны дзяцей і ўнукаў. Стары прыносіў Віктару штосьці з прадуктаў харчавання, а ён дапамагаў яму і запэўніваў, што калі вырасце, будзе класці печы. Але стаць печніком хлопцу не давялося. І ніхто тады нават не мог падумаць, што хлопец з Тухінкі стане славутым спартсменам. Не думаў пра гэта і Куранцоў, калі ў 1956 годзе ад'язджаў з Нямойты ў рамеснае вучылішча пасля заканчэння сямігодкі.

Віктару ішоў толькі пятнаццаты год, калі ён стаў слесарам Кузнецкага металургічнага камбіната. Працаваў там каля двух год. А вясной 1959 года пазнаёміўся з яшчэ адным добрым чалавекам — інструктарам фізкультуры камбіната Я. С. Ялі, вялікім знаўцам цяжкай атлетыкі, які зусім выпадкова заўважыў, як хлопец трымае на выцягнутай руцэ вялікі цяжкі молат. З гэтага ўсё і пачалося...

На першых трэніроўках падняў 50 кілаграмаў, хутка 60, затым 80, 90, 100... А ў наступным годзе, калі яго прызывалі ў армію, марыў ужо аб званні майстра спорту.

Прызыўная камісія не магла не заўважыць фізічную моц навабранца і вызначыла яго ў дэсантнікі. Для Віктара былі створаны ўсе ўмовы для заняткаў цяжкай атлетыкай. Пазней яго трэніраваў чэмпіён свету Уладзімір Каплуноў.

У 1964 годзе Віктар стаў чэмпіёнам Еўропы з новым сусветным рэкордам. У Токіо заваяваў сярэбраны алімпійскі медаль. І вось Мехіка, Алімпіяда—68. Спаборніцтвы склаліся драматычна. Віктар даволі пераканаўча даказаў сваю перавагу ў жыме. Але ў рыўку 135 кілаграмаў не хацелі паддавацца. Два падыходы — і кожны раз штанга падала на памост. Трэці рывок... Перамога. У яго спартыўнай біяграфіі дзесяткі перамог. На працягу 15-ці год Куранцоў лідзіраваў у сваёй вагавай катэгорыі. Дзесяць год запар яго рэкордаў ніхто не мог пабіць. 150 разоў у гонар Віктара Куранцова гучаў Савецкі гімн.

І. Ларын.

"Шчаслівы талісман" беларускай каманды

У невялікім фінскім гарадку Кантыялахці ў лютым 1999 года прайшоў чарговы чэмпіянат свету па біятлону. У складзе беларускай каманды быў наш зямляк Пётр Івашка, які ўжо двойчы атрымліваў залатыя медалі чэмпіёна свету за перамогі ў камандной гонцы. Сенненцы верылі і спадзяваліся, што Пётр абавязкова прывязе яшчэ адну спартыўную ўзнагароду.

На першым этапе стартаваў Аляксей Айдараў, другі этап трэнеры даверылі Пятру. Прайшоў дыстанцыю добра, і на агнявых рубяжах не падвёў. Вадзім Сашурын і Алег Рыжанкоў замацавалі поспех. Пётр стаў трохразовым чэмпіёнам свету.

У тым жа 1999 годзе яму споўнілася 28 гадоў. Нарадзіўся Пётр у г. Сянно. Скончыў сем класаў сенненскай сярэдняй школы № 1. Адначасова займаўся ў дзіцячай юнацкай спартыўнай школе. Адзін з яго першых трэнераў Валерый Лектараў успамінаў:

— Спартыўны лёс Пятра даволі складаны. Але чалавек ён настойлівы, з моцным характарам і ўсе цяжкасці пераадолеў. Нездарма яго ў камандзе беларускіх біятланістаў называлі "шчаслівым талісманам".

Пасля сямі класаў ён вучыўся ў Віцебскай школе-інтэрнаце спартыўнага профілю, дзе займаўся лыжнымі гонкамі. Там яго трэніраваў Міхаіл Собалеў, які і зараз прадаўжае працаваць у гэтай школе.

Так пачынаўся шлях Пятра Івашкі ў вялікі спорт. Служба ў арміі, упартыя трэніроўкі, удзел у шматлікіх спаборніцтвах, у тым ліку і ў сусветных, якія прынеслі яму залатыя медалі, зімовая Алімпіяда ў японскім Нагана...

Ён часта наведвае Сянно, бывае ў роднай школе, сустракаецца з вучнямі, настаўнікамі.

І. Е. Лазука.

П. Івашка (са сцягам) сярод «залатой» каманды біятланістаў.

Раённая газета паведамляла

Архітэктурны гурток

6 студзеня 1990 г.

У пачатку новага навучальнага года на базе Сенненскага Дома піянераў пачаў працаваць гурток архітэктуры. Узначальвае яго М. П. Ермашкевіч, выпускнік мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута. Зараз ён працуе загадчыкам мастацкага аддзялення Дома піянераў.

Удзельнікі гурткоў разам з настаўнікам рыхтуюць макет горада Сянно, якім ён быў шмат дзесяцігоддзяў назад. Прафесійна зроблены з гіпсу макет Мікалаеўскай царквы, што знаходзілася раней у цэнтры горада (зараз СШ № 2). Царкву пабудавалі ў 1860-х гг. ў псеўдарускім стылі з элементамі барока. Разбурана ў 30-я г. XX стагоддзя.

Уражвае мініяцюрны макет Пакроўскай царквы. Царква была драўлянай.

А вось макет францысканскага касцёла, які пабудавалі ў XIX стагоддзі майстры з Італіі. Гэта была гордасць нашага горада. У Беларусі касцёл быў адзіным па сваёй непаўторнай прыгажосці. Калісьці тут іграў арган. Але гэты помнік разбурылі ў сярэдзіне 1960-х гг.

Побач — макет старога будынка райвыканкома. Яго пабудавалі ў XIX стагоддзі ў класічным стылі, разбурылі ў 1970-я гады.

Глядзіш на мініяцюрныя шэдэўры архітэктуры і думаеш аб тым, як не хапае іх сёння. Наш горад быў бы намнога прыгажэйшым і багацейшым, каб іх удалося захаваць.

Н. Сквариова.

Аперацыю зрабіў... архіепіскап

13 кастрычніка 1990 г.

Мяне зацікавіла паведамленне аднаго з пацыентаў, што аперацыю яму зрабіў... архіепіскап Лука! Гэта было ў час Вялікай Айчыннай вайны. Нельга сказаць, што прозвішча Войны-Ясянецкага, аўтара "Гнойнай хірургіі", прафесара (лаўрэата Сталінскай прэміі) было мне незнаёма, але што прафесар і архіепіскап Лука — адна і тая ж асоба...

Аднак спробы падрабязней даведацца аб жыцці Валянціна Феліксавіча ў "застойныя" часы аказаліся малапаспяховымі. І вось у часопісе "Октябрь" № 2—4 за 1990 г. апублікавана кніга Марка Папоўскага "Жизнь и житие Войны-Ясенецкого, архиепископа и хирурга".

Продкі Войны-Ясянецкага былі з рускіх князёў, у XIX ст. жылі ў Сенненскім павеце Магілёўскай губерні.

Гэты чалавек, у выглядзе пратэсту супраць неабгрунтаваных ганенняў на царкву, прыняў сан, ведаючы, што раздзеліць лёс высяляемых у Сібір.

С. Шмурадка.

І прыгожа, і рыбка будзе

27 ліпеня 1991 г.

Здаўна жыхары нашага горада памятаюць роў, што пралягаў непадалёку ад тэрыторыі Сенненскага завода абястлушчанага малака. Месца гэта было непрывабна.

Але зараз яго не пазнаць. Там, дзе быў роў, плёскаюць хвалі штучнай сажалкі. Плошча — 0,6 га, ёмістасць — 10 тыс. метраў кубічных. Ініцыятары гэтага мерапрыемства — прадпрыемствы, што знаходзяцца недалёка. Грошы на будаўніцтва атрыманы з мясцовага бюджэту (каля 30 тыс. руб.). Але яны патрачаны недарэмна. Па-першае, добраўпарадкавана тэрыторыя, маляўнічыя берагі стануць з цягам часу месцам адпачынку. Па-другое, сажалка стане акумулятарам вады вясенніх паводак. Вада будзе выкарыстоўвацца для прамысловых і бытавых патрэб.

У будучым плануецца стварыць на базе вадаёма нешта накшталт рыбнага кааператыву, а пакуль што мясцовая дзятва запускае ў сажалку першых карасёў.

Т. Буракова.

Дружына дзейнічае

21 снежня 1991 г.

Дапамогу ў ахове грамадскага парадку ў Машканскім с/с аказваюць члены добраахвотнай народнай дружыны, якая налічвае 30 членаў.

Узначальвае дружыну В. Л. Шарэнда. Дружыннікі складаюць графік дзяжурстваў, у святочныя і выхадныя дні ахоўваюць парадак. Сярод найбольш актыўных членаў — А. І. Шалуха, Н. І. Шалуха, В. А. Кубарскі і інш. Кожнаму члену ДНД прадастаўляецца па 3 дні да чарговага водпуску.

М. Аляксеева.

Новай лічбаў

11 красавіка 1992 г.

Цяпер у раёне функцыяніруюць 6 бальніц на 515 ложкаў, 42 школы, у якіх вучацца 5250 дзяцей, 41 клуб і Дом культуры, 34 кінаўстаноўкі, 50 бібліятэк, 135 магазінаў, 63 сталовых і буфетаў, 34 комплексныя прыёмныя пункты, 24 ФАПЫ, 9 аптэк.

Да паслуг жыхароў 6 стадыёнаў, 32 спартпляцоўкі, 13 спартзалаў, 5 музычных школ.

Толькі летась на патрэбы народнай гаспадаркі выкарыстана 11 мільёнаў 39 тыс. руб.,

на ахову здароўя — 5,73 мільёна, культуру — 1,6 мільёна. Зроблена прыбудова да школы № 2 г. Сянно. Закончаны рамонт цэнтральнай раённай бальніцы, адкрыта паліклініка ў г. п. Багушэўск, завяршаецца будаўніцтва Беліцкай участковай бальніцы.

Сёлета школы і бальніцы працуюць у вельмі складаных умовах. У асноўным гэта цяжкасці фінансавага плана. Амаль трэцяя частка школ патрабуе капітальнага рамонту. Складаная праблема — задавальненне аптэк і бальніц лекамі.

М. Васільеў.

"Вясёлыя музыкі" пасябравалі з "Весялухай"

4 жніўня 1992 г.

На святкаванне першай гадавіны дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь у Сянно быў запрошаны калектыў народнай песні Бешанковіцкага Дома культуры "Весялуха".

Не засталіся ў даўгу і сенненскія "Вясёлыя музыкі". Калектыў выступіў з цікавай праграмай у Бешанковіцкім раённым Доме культуры.

Жыхары Бешанковічаў цёпла сустрэлі аматараў сцэны Сяргея Пагарэльскага, В. Дарожкіну, А. і В. Кавалёвых, Р. Усціновіч і інш.

Пасля канцэрта "Весялуха" і "Вясёлыя музыкі" абмяняліся вопытам, выказалі свае меркаванні аб далейшай прапагандзе беларускай песні.

Л. Сяргеева.

Прайшоў конкурс настаўнікаў

16 лютага 1993 г.

У канцы студзеня педагогі нашага раёна правялі конкурс "Настаўнік года — 93". У ім прынялі удзел 10 прадстаўнікоў гарадскіх і сельскіх школ. Вынікі падводзіла журы на чале з загадчыкам раённага аддзела адукацыі А. К. Агаркам.

Пераможцы атрымалі каштоўныя падарункі. "Настаўнікам года—93" прызнана Святлана Аляксееўна Пачатоўская, настаўніца рускай мовы і літаратуры Багушэўскай СШ № 1.

Гэты конкурс садзейнічаў падняццю прэстыжу працы настаўнікаў, выявіў найбольш таленавітых, прынёс карысць у плане абмену перадавым вопытам. У выніку ў выйгрышы аказаліся і самі настаўнікі і вучні.

Т. Віктарава.

Вучням спадабалася

19 снежня 1995 г.

Нядаўна вучні 11 класаў школы № 2 г. Сянно мелі магчымасць сустрэцца з прадстаўнікамі розных прафесій — культработнікам, урачом, работнікам міліцыі, ашчаднага банка. В. С. Дарожкіна, В. Ф. Дулінец, М. Р. Палоніна, В. М. Дзергачоў вельмі цікава расказалі кожны аб сваім занятку. У ходзе гутаркі ў рабят узнік шэраг пытанняў, на якія з задавальненнем адказалі госці.

Мерапрыемства "Найсмачнейшы хлеб ад працы сваёй" вельмі спадабалася выпускнікам.

В. Тарасава.

Падрыхтавала да друку Г. С. Хадасевіч.

Сенненшчына сёння

ШАЙКО Сяргей Васільевіч. Нарадзіўся 29.4.1959 г. на Украіне. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў настаўнікам гісторыі, дырэктарам Сенненскай СШ № 1 імя З. І. Азгура. З кастрычніка 1996 г. намеснік старшыні Сенненскага райвыканкома.

С. В. Шайко.

Сенненскі раён з'яўляецца тыповым сельскагаспадарчым. У складзе аграпрамысловага комплексу 14 сельгаскааператываў і 6 сельгаспрадпрыемстваў, райаграпрамтэхніка, прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці.

Усяго ў сельскай гаспадарцы раёна занята 5,4 тысячы чалавек, у тым ліку 700 спецыялістаў. За калгасамі і саўгасамі замацавана 118,4 тысячы гектараў зямлі, у тым ліку 76,9 тысячы гектараў сельгасугоддзяў. Гаспадаркі раёна спецыялізуюцца на вытворчасці мясамалочнай прадукцыі і вырошчванні збожжавых, ільну, бульбы. Паказчыкі вытворчасці сельгаспрадукцыі за апошнія 5 год былі розныя. Так, зерня раён атрымліваў ад 25,3 да 48,3 тысячы т, вытворчасць малака складала ад 21,7 да 25,8 тысячы т, а мяса — ад 3,3 да 4,5 тысячы т. Год на год не прыходзіцца, але ёсць падставы спадзявацца, што тэмпы росту вытворчасці прадукцыі палёў і ферм паступова стабілізуюцца.

Лепшых вынікаў у вытворча-фінансавай дзейнасці пастаянна дабіваецца кааператыў "Літусава". Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых у гэтай гаспадарцы за некалькі апошніх гадоў перавышае 30 цэнтнераў зерня з гектара. Надоі малака на карову складаюць больш за 3000 кілаграмаў.

Сельгаскааператыў "Літусава" узяты ў якасці прыкладу таго, што, нягледзячы на эканамічныя катаклізмы, на землях Сенненшчыны можна дабівацца добрых вынікаў. Ёсць і іншыя гаспадаркі, дзе эканамічныя паказчыкі неблагія. Сярод іх сельгаскааператывы "Белая Ліпа", "Бяленева", "Ясная зара", сельгаспрадпрыемствы імя П. М. Машэрава, імя Данукалава.

У пачатку 2003 года налічвалася 26 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. У іх карыстанні мелася звыш 1200 гектараў сельгасугоддзяў. У асабістых падсобных гаспадарках грамадзян знаходзяцца 9,7 тысячы гектараў зямлі.

Прамысловых прадпрыемстваў у раёне восем. Тры з іх, а менавіта Багушэўскі лясгас, Багушэўскі спіртзавод і Обальскі завод кармавых дабавак з'яўляюцца прадпрыемствамі з дзяржаўнай формай уласнасці. Астатнія пяць — адкрытыя акцыянерныя таварыствы "Сенненскі льнозавод", "Багушэўскі льнозавод", "Сенненскі завод сухога абястлушчанага малака", "Багушэўскмэбля" і камбінат кааператыўнай прамысловасці.

Дзейнічаюць таксама структурныя падраздзяленні абласных прадпрыемстваў — Багушэўскі леспрамгас, "Сяннорайгаз" і іншыя.

Некаторыя прамысловыя прадпрыемствы Сенненшчыны маюць цікавую і багатую гісторыю. Багушэўскаму спіртзаводу, напрыклад, у 1998 годзе споўнілася сто гадоў.

У канцы XX ст. парушыліся эканамічныя сувязі паміж былымі саюзнымі рэспублікамі, што адбілася на эканамічным становішчы прамысловых прадпрыемстваў раёна. Але яны здолелі перабудавацца, выбрацца з крызіснага становішча і, хаця і марудна, пачалі набіраць тэмпы росту вытворчасці. У першую чаргу гэта адносіцца да харчовых прадпрыемстваў якія даюць больш за тры чвэрці агульнага аб'ёму тавараў народнага спажывання.

Будаўнічую праграму ў раёне выконваюць ДП ПМК-64, Сенненскае ПМС (былая ПМК-33), Сенненскае будаўнічае прадпрыемства "Будмеліяводгас" (былая ПМК-10), ДРБУП-146. Кожны год будаўнікі ўводзяць у эксплуатацыю сотні кватэр, прамысловых і непрамысловых аб'ектаў.

Праз Сенненскі раён праходзяць чыгункі Орша — Віцебск і Орша — Лепель. На першай з іх буйнейшая станцыя — Багушэўская, на другой — Бурбін.

Аўтамабільныя дарогі звязваюць Сянно з Віцебскам, Оршай, Бешанковічамі, Талачыном, Чашнікамі, Багушэўскам. Буйныя аўтатрасы Орша — Віцебск, Орша — Лепель таксама праходзяць цераз раён. Аўтобусамі можна дабрацца да цэнтра кожнага сельсавета і цэнтральнай сядзібы кожнай гаспадаркі. Абслугоўвае пасажыраў адкрытае акцыянернае таварыства "Аўтатранспартнае прадпрыемства № 20".

Гандлёвае абслугоўванне насельніцтва ажыццяўляе раённае спажывецкае таварыства. Да паслуг жыхароў больш 120 рознічных гандлёвых прадпрыемстваў. Дзейнічаюць 11 прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Аўтамагазіны абслугоўваюць 140 маланаселеных вёсак, у якіх пражывае каля чатырох тысяч чалавек.

73 Зак 2999

Значнае месца ў гандлі займаюць уласныя таварныя рэсурсы. Гэта хлебабулачныя, кандытарскія і каўбасныя вырабы, безалкагольныя напіткі, мясныя паўфабрыкаты, крупы ячныя.

Працуюць у раёне яшчэ і ведамасныя магазіны. Два з іх належаць адкрытаму акцыянернаму таварыству "Сенненскі завод сухога абястлушчанага малака", адзін — віцебскай фабрыцы "Чырвоны Кастрычнік".

Дзейнічаюць два камбінаты бытавога абслугоўвання насельніцтва: Сенненскі (які ўваходзіць у склад райспажыўтаварыства) і Багушэўскі. Першы з іх мае ў сельскай мясцовасці сем комплексных прыёмных пунктаў, другі — адзінаццаць. Абслугоўваюць насельніцтва два раённыя вузлы сувязі, адзін — паштовай, другі — электрычнай.

Органамі заканадаўчай і выканаўчай улады ў раёне з'яўляюцца раённы Савет дэпутатаў і раённы выканаўчы камітэт, а таксама Багушэўскі пасялковы і 12 сельскіх Саветаў дэпутатаў і адпаведныя пасялковы і сельскія выканаўчыя камітэты.

У раёне дзейнічае раённы камітэт прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу, у структуру якога ўваходзіць 37 прафсаюзных арганізацый калгасаў, саўгасаў, сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый. Яшчэ працуюць 4 прафсаюзныя арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў мясцовай прамысловасці і камунальна-бытавых прадпрыемстваў. Дзейнічаюць пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі некаторых прамысловых прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў. Раённы камітэт прафсаюза дзяржустаноў каардынуе работу 22 прафкомаў; райком прафсаюза работнікаў адукацыі — 36 пярвічных прафарганізацый школ, дзіцячых садоў іншых арганізацый і ўстаноў. Свае прафарганізацыі маюць медыцынскія, транспартныя, будаўнічыя арганізацыі.

У раёне функцыяніруе 37 школ, у тым ліку 2 школы-інтэрнаты. Працуе 15 дашкольных устаноў. Вялікая ўвага надаецца ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі. У 1998 годзе ўзведзены новы будынак Алексініцкай сярэдняй школы. За школамі замацавана больш за 70 гектараў зямлі — гэта дае магчымасць зрабіць школьнае харчаванне больш танным.

Пашыраецца сетка ліцэйскіх, гімназічных і профільных класаў. Дыферэнцыраванае і профільнае навучанне прыносіць добрыя вынікі: нашы школьнікі адзначаюцца на абласных і рэспубліканскіх алімпіядах, штогод 50—60% выпускнікоў паступаюць у ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

На Сенненшчыне дзейнічае 38 клубных устаноў. Гэта Сенненскі раённы, Багушэўскі гарадскі, 36 сельскіх дамоў культуры і клубаў, а таксама 40 бібліятэк. Ёсць 2 дзіцячыя школы мастацтваў, дзіцячая музычная школа, дом рамёстваў, раённы музей. Творчыя калектывы раёна, такія як народныя ансамблі "Вясёлыя музыкі" і "Вечарынка", хор ветэранаў вайны і працы пастаянна ўдзельнічаюць у культурных мерапрыемствах абласнога і рэспубліканскага ўзроўню. Больш пяцідзесяці гадоў радуюць гледачоў артысты народнага тэатра Багушэўска.

Развіваецца фізкультурна-масавы і спартыўны рух. Рэгулярна праводзяцца зімовыя і летнія раённыя спартакіяды, спаборніцтвы дапрызыўной і прызыўной моладзі. Традыцыйным стаў марафон, прысвечаны памяці Пятра Міронавіча Машэрава, які праводзіцца штогод у першай дэкадзе кастрычніка, а старт у ім прымаюць кожны раз каля тысячы бегуноў. Праходзяць пастаянна шматлікія масавыя спаборніцтвы па многіх зімовых і летніх відах спорту. Плённа працуе Сенненская ДзЮСШ. У раёне маецца стадыён з трыбунамі для гледачоў, прасторны фізкультурна-аздараўленчы комплекс, 17 спартыўных залаў, 7 стралковых ціраў, лыжная траса з асвятленнем. Спартыўныя пляцоўкі і збудаванні ёсць ва ўсіх школах.

З 1918 года ў Сянно выходзіць газета "Голас Сенненшчыны", вядзе перадачы раённае радыё.

Пражываюць на Сенненшчыне людзі розных веравызнанняў. Асноўная рэлігія — хрысціянства. Зарэгістравана пяць рэлігійных аб'яднанняў і культавых устаноў. Гэта Свята-Мікалаеўскі храм у Сянне, храм Святых апосталаў Пятра і Паўла ў Багушэўску, абшчыны евангельскіх хрысціян-баптыстаў у Багушэўску і Сянне, рэлігійная абшчына хрысціян веры евангельскай.

Аб здароўі жыхароў Сенненшчыны клапоцяцца работнікі раённага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання. У яго структуру ўваходзяць Сенненская цэнтральная і Багушэўская раённыя бальніцы, 2 паліклінікі, тры участковыя бальніцы: у Беліцы, Машканах, Янове, урачэбныя амбулаторыі ў Расне, Ульянавічах, Ходцах, а таксама 23 фельчарска-акушэрскія пункты. У бальніцах выдзелены 59 медыка-сацыяльных коек. Прыём хворых вядуць больш за 60 урачоў. Працуюць цэнтральная раённая аптэка, гарпасялковая, 26 сельскіх аптэк і аптэчных пунктаў. Пастаянна праводзіцца работа па ўмацаванню матэрыяльнай базы ўстаноў аховы здароўя. У 2000 годзе завершана рэканструкцыя Яноўскай участковай бальніцы.

Колькасць насельніцтва раёна, згодна перапісу насельніцтва ў лютым 1999 года, склала 34,4 тысячы чалавек. У тым ліку гарадскога — 12700 чалавек (37%), сельскага 21 700 чалавек (63%). У Сянно пражывае 9 тысяч чалавек, а ў Багушэўску — 3,7 тысячы чалавек. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва складае 17,5 чалавек

на 1 кв. км. Па колькасці насельніцтва раён займае 11-е месца сярод раёнаў вобласці.

У 1972—2002 гадах колькасць насельніцтва раёна скарацілася на 15,9 тысячы чалавек (32%), пры гэтым сельскае насельніцтва скарацілася амаль што ўдвая, а гарадское павялічылася на 2,8 тысячы чалавек. Але і колькасць гарадскога насельніцтва у апошнія гады пачала скарачацца. Асноўнымі прычынымі скарачэння агульнай колькасці насельніцтва з'яўляюцца: памяншэнне нараджальнасці, рост смяротнасці (асабліва сярод вяскоўцаў) і міграцыйныя адтокі ў гарады. Сацыяльная палітыка мінулых гадоў адмоўна адбілася на дэмаграфічнай сітуацыі.

Пастаянна скарачаецца колькасць насельніцтва ў працаздольным узросце: у 1979—21836 чалавек, у 1989—18963, у 1999—16573. Разам з тым расце колькасць асоб старэй працаздольнага ўзросту — 10332 чалавек, альбо 30,0%. А ўсяго пенсіянераў 11800 чалавек (34,5%).

У агульнай колькасці насельніцтва раёна мужчын 15,9 тыс. чалавек (46,3%), жанчын — 18,5 (53,7%). Але колькасць мужчын да 50 гадоў перавышае колькасць жанчын адпаведнага ўзросту. Перавага жанчын старэйшага ўзросту абумоўлена вынікамі вайны.

За апошнія дзесяцігоддзі значна павысіўся ўзровень адукацыі сенненцаў. Калі ў 1979 годзе 39,7% усяго насельніцтва ва ўзросце 15 гадоў і старэй мела вышэйшую і сярэднюю (спецыяльную, агульную, альбо няпоўную) адукацыю, у 1989 годзе — 67%, то ў 1999 годзе — 78%. Пры гэтым значна павысіўся якасна-адукацыйны ўзровень.

Нацыянальны састаў насельніцтва раёна выглядае так: беларусы 32 050 (93,1%), рускія — 1783 (5,2%), украінцы — 339 (1%), іншых нацыянальнасцей — 248 (0,7%). Усяго пражываюць прадстаўнікі 32 нацыянальнасцей.

Дзесяцігоддзі, прайшоўшыя пасля Вялікай Айчыннай вайны, здаецца, не такі ўжо вялікі час у параўнанні з сівымі стагоддзямі. Але ж і паслявае нымі пакаленнямі зроблена вельмі многа карыснага, неабходнага і добрага. Далейшы рух наперад немагчымы без выкарыстання станоўчага вопыту нашых далёкіх і блізкіх продкаў. Захаванне гістарычнай памяці — аснова асноў.

Амаль дзесяцігадовая пошукавая работа клуба "Памяць" зараз падмацавана тым, што ў раёне працуе сапёрная рота Асобнага пошукавага батальёна Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Іх сумеснымі намаганнямі ў 1998, 1999 і 2002 гадах былі знойдзены астанкі 433 байцоў, партызан, расстраляных фашыстамі патрыётаў, якія з усімі ўшанаваннямі былі перазахаваны на воінскіх могілках.

Нашымі славутымі землякамі ганарыцца не толькі Сенненшчына, але і ўся Беларусь. Веданне гісторыі свайго краю, сваёй духоўнай спадчыны заўсёды вяртаюць нас да памяці аб тых, хто ўславіў родную зямлю сваімі справамі, хто аддаў сваё жыццё за свабоду і незалежнасць Бацькаўшчыны.

С. В. Шайко.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Народныя традыцыі і звычаі

Ва ўсе часы традыцыйная культура захоўвалася ў народзе як найдаражэйшы скарб спадчыны, што складваўся вякамі. На Сенненшчыне да нашага часу захавалася шмат элементаў беларускай традыцыйнай абраднасці. Гэта святы земляробчага календара, сямейных абрадаў, якія паранейшаму займаюць сваё месца ў побыце, а таксама з'яўляюцца фальклорным жанрам для мастацкіх аматарскіх калектываў.

У гонар Каляды ў сем'ях наладжваюцца святыя вячэры — тры куцці: посная, багатая і вадзяная. Абавязковымі стравамі куцці з'яўляюцца крупяная каша, бліны. Лічылася: калі на багатую куццю на стале разнастайныя стравы, то летам будзе багаты ўраджай. Перад тым, як сесці за стол, гаспадыня выходзіць на ганак з міскай кашы і раскідвае яе па крупінцы на двары, кліча мароз есці кашу: "Мароз, мароз, хадзі кашу есці, каб ты добрым быў, вясной да мяне не хадзіў, не марозіў агуркоў, буракоў, гарбузоў". Калядоўшчыкі са шчадраваннем ходзяць па вёсцы з музыкай, песнямі. Яны пераапранаюцца ў ражаных: цыганоў, бабу, дзеда. Водзяць з сабой "казу", "мядзведзя", нясуць Віфліемскую зорку. Песнямі, пажаданнямі ўслаўляюць гаспадара дома. Заходзячы ў дом, рассыпаюць зерне з прыгаворкай: "Сею, вею, рассяваю, з калядою паздраўляю. На новае лета хай родзіцца жыта, пшаніца, усякая пашніца. Слаўны гаспадар, піва табе

варыці, ды сыноў жаніці, пасаг збіраці, дачок выдаваці". Гаспадыня павінна пачаставаць калядоўшчыкаў блінамі і каўбасой. На Сенненшчыне бытуе такая калядная песня:

Пайшла каляда ў канец сяла,
Шчодры вечар добрым людзям.
А зайшла яна к Міколу на двор,
Шчодры вечар добрым людзям.
А ці дома ты, пане гаспадар,
Шчодры вечар добрым людзям.
Калі ты не спіш, выйдзі пакланісь,
Шчодры вечар добрым люзям.

Дзяўчаты ў калядную ноч варожаць, загадваюць на суджанага. Апоўначы выходзяць на вуліцу, абдымаюць плот. Калі калочкі ў пару, то дзяўчына выйдзе замуж. Кладучыся спаць, з трэсачак робяць калодзеж, ставяць шклянку вады каля ложка і прыгаворваюць: "Суджаны, ражаны, прыйдзі да майго калодзежа вады на-піцца". Заканчваюцца каляды вадзяной куццёй і асвячэннем вады на Хрышчэнне.

* * *

Праводзяць Масленіцу і сустракаюць вясну як у вёсках, так і ў райцэнтры. Наладжваюць народныя гулянні з катаннем на конях, запрэжаных у санкі, гушканне на арэлях, катанне з ледзяных горак, спальванне чучала Зімы. На свяце шмат народных гулянняў, забаў, песень. Вось адна з масленічных песень Сенненшчыны:

А ў нас сёння Масленіца,
Прыляцела ластавіца.
Села яна на калу,
Прынесла масла па каму.
А дзевачкі схапілі,
У кубачкі стапілі.

Да нашых дзён захавалася традыцыйнае цяганне калодкі на Масленіцу. Хлопцы ўздоўж вуліцы цягнуць калодку, заходзяць з ёй у хату да гаспадыні, прывязваюць ёй калодку да ног, прыгаворваючы: "Цягалі мы калодку, цягалі. Да цябе, гаспадынька, зайшлі. Як наша вуліца доўгая, няхай у цябе доўгі лён расце. Як гэта калода тоўстая, няхай будзе ўраджай вялікі. Каб калоду адвязаць, трэба выкуп добры даць". Затым гаспадыня павінна даць выкуп — частаванне.

У апошні дзень масленічнага тыдня гукаюць вясну, дзяўчаты водзяць карагоды, спяваюць:

А зіма нам надакучыла,
Па вясеначцы мы саскучылісь.
Прыйдзі, вясна, ды вясна-красна,
Прыйдзі, вясна, ды вясенейка.

* * *

Вялікдзень на Сенненшчыне сустракаюць асабліва ўрачыста. Напярэдадні, у чысты чацвер, старанна прыбіраюць у хаце, фарбуюць яйкі. Яйка сімвалізуе сабой кругаварот і бясконцасць усякага адраджэння. Гаспадыня старанна рыхтуе святочныя стравы: каўбасы, вяндліну, пасхальны куліч. Па вёсках ходзяць валачобнікі. Яны песнямі, пажаданнямі ўслаўляюць прыход вясны, абуджэнне прыроды. Вось што спяваецца ў валачобнай песні:

Валачобныя, людзі добрыя,
Вясна-красна на ўвесь свет,
Валачыліся, памачыліся,
Вясна-красна на ўвесь свет.
Зайшлі к бабцы, пасушыліся.
Ой ты, бабка, паварачвайся,
Прынясі яец, каўбасы канец,

Вясна-красна на ўвесь свет.

Свята захоўваюць на Сенненшчыне памяць аб памерлых продках. Асноўныя памінальныя Дзяды: Масленічныя, Траецкія, Восеньскія. На дзевяты дзень ад Вялікадня адбываецца ўшанаванне памерлых — Радуніца. Людзі старанна прыбіраюць могілкі, прыходзяць сем'ямі, запальваюць свечкі, у ціхай бяседзе ўспамінаюць адышоўшых у нябыт. На пяцідзесяты дзень ад Вялікадня — ушанаванне Святой Тройцы. Раней на Тройцу дзяўчаты збіраліся на лясной паляне, упрыгожвалі вяночкамі і стужкамі бярозкі, звязвалі іх макушкі парамі, вадзілі карагоды, загадвалі далейшы дзявочы лёс:

Дзеўкі на Тройцу вянкі вілі,
Вілі, звівалі, пра долю гадалі.

Калі ж ты, доля, шчаслівая,
Цвіці, вяночак, як васілёчак,
А калі ж ты, доля, няшчасная,
Сохні вяночак, як сухарочак.

Да нашага часу з траецкага абраду дайшла традыцыя ўпрыгожваць зелянінай, галінкамі дрэў сваё жыллё. Гэта называецца "вешаць май".

* * *

Старадаўняе язычніцкае свята Купалле прымеркавана да летняга сонцастаяння. Звычайна купальскую ноч святкуюць на беразе вадаёмаў. Дзяўчаты водзяць карагоды, спяваюць песні, пускаюць вяночкі па вадзе. Абавязковым рытуалам купалля з'яўляецца запальванне агню, праз які пераскокваюць хлопцы, дзяўчаты. Гэта дзея мае магічны сэнс, як ачышчэнне душы ад грахоў. Яшчэ на агні спальвалі ляльку Мару. Лічылася, што гэтым збаўлялі зямлю ад злых духаў.

* * *

Галоўнай падзеяй у жыцці селяніна заўсёды была ўборка ураджаю. Жніво пачыналася ўрачыста, з абраду зажынак. Жанчыны, па-святочнаму апранутыя, выходзілі з сярпамі ў поле, зажынаючы першы сноп, звязвалі яго чырвонай стужкай і ставілі ў хаце пад абразамі. Гэты сноп захоўваўся да наступнага жніва. Пачынаючы жніво, прасілі Бога: "Дапамажы, Божа, жыщейка жаці, зерне малаціці, каравай спякаці, добрай долі ждаці".

Бытавалася такая песня:

Я жну, пажынаю,
На бачок паглядаю,
Ці высока сонейка,
Ці густа снапоўека,
Сонейка нізюсенька,
Снапоўе гусцюсенька.

Працавалі дружнай талакою, спраўлялі дажынкі, ушаноўвалі жней. Гаспадару жніва надзявалі вянок з каласоў. Спявалі песні, весяліліся. Выпякалі каравай са свежага хлеба, накрывалі па-святочнаму сталы. Спявалі такую песню:

А ў нас учора вайна была,
Усё поле зваявалі,
Як на нашай ніўцы сягоння дажынкі,
Відзіць маё вочка краёк недалёчка,
Да краю дажнёмся, мёду мы нап'ёмся.

Пасля таго, як закончацца ўсе сельскагаспадарчыя работы, спраўляліся пакроўскія кірмашы, дзе селянін мог прадаць або абмяняць свой тавар. На кірмашах наладжваліся гульні, забавы, батлейкавыя прадстаўленні. Асноўныя элементы пакроўскіх кірмашоў дайшлі да нашага часу — гэта таргі і народныя гулянні.

* * *

Адметнае месца ў жыцці чалавека займаюць сямейныя абрады: радзіны, вяселле, улазіны, пахаванне.

Каб жаніць маладую пару, бацькі маладога засылалі сватоў да бацькоў дзяўчыны. Сваты дамаўляліся з бацькамі маладой. Звычайна заходзілі ў хату з такімі словамі: "Мы купцы з далёкага краю, па полі хадзілі, па каменейку, па лесе, па карэннейку. Хадзілі, з дарогі зблудзілі. Прыбіліся к сялу, ды к вашаму двару. Ці можна ў вас адпачыць, ды вось аб чым пагаварыць. Кажуць, наш бык да вашай цялушкі прывык. Дай Бог даждаці — вашу цялушку нашаму быку прадаці". Калі бацькі дзяўчыны згодны, яны частуюць сватоў і бласлаўляюць маладых на шлюб. Гэты фрагмент вясельнага абраду называюць заручынамі. Другая сустрэча сватоў называецца запоінамі. Самыя блізкія збіраюцца за сталом, дамаўляюцца аб дні жаніцьбы. Спявалася такая песня:

А ў нас сёння запоіны,
Мы дзевачку прапілі.
А яшчэ прапіваць будзем,
Як вяселейка мы гуляць будзем.

У дзень вяселля маладых ставілі на рушнік, сустракалі на парозе дома бацькі хлебам-соллю. Усе родныя і блізкія адорвалі падарункамі, часцей з прыгаворкамі: "Дару хлебам-соллю, добрай доляй", "дару золатам, серабром — усялякім дабром", "дару грошай кашэль, каб не біў мужык у каршэнь", "дару грошай кашалёк, каб

нарадзіўся сынок", "дару хустку, каб нарадзіла дачушку". Маладой бацькі рыхтавалі пасаг, за які сват павінны быў даць выкуп. Трэці дзень вяселля на Сенненшчыне называецца "ганяць сучку". Жанчына надзявае маску сабакі, на ўсіх гаўкае, хоча разлучыць маладых. Усе госці дружна выганяюць яе з хаты. Гэты рытуал мае асцерагальны сэнс: не павінна быць дрэнных адносін паміж мужам і жонкай.

Традыцыйная народная творчасць вывучаецца і распаўсюджваецца работнікамі культуры раёна. Ёсць відэазапіс правядзення некаторых свят і абрадаў.

Каштоўны ўклад у адраджэнне нацыянальнай спадчыны ўносяць Матрона Нікіфараўна Крупская (вёска Рудкоўшчына), Надзея Іванаўна Пракаповіч (вёска Нямойта), Надзея Цімафееўна Шыдлоўская, Зінаіда Захараўна Кекіш (в. Латыгаль), Таццяна Несцераўна Латышава (вёска Лазова), Лізавета Прохараўна Калбянок, Ніна Фёдараўна Шляхто, Марыя Паўлаўна Бандарэвіч (вёска Рулёўшчына), Ніна Сцяпанаўна Залецкая, Ганна Ягораўна Дабраўляніна, Валянціна Аляксееўна Шаматульская (вёска Леснікова).

Прапаганда нацыянальнага здабытку, народных традыцый і звычаяў з'яўляецца адным з важных кірункаў дзейнасці народнага ансамбля "Вясёлыя музыкі" (кіраўнік С. Пагарэльскі), народнага ансамбля "Вечарынка" (кіраўнік В. Дарожкіна), гуртоў "Ходцаўская кадрыля" (кіраўнік І. Чэпікава), "Абалянка" (кіраўнік В. Берашэвіч) і іншых.

В. С. Дарожкіна.

Ярыла-Юрай

У славянскіх плямёнаў часоў язычніцтва Ярыла лічыўся Богам урадлівасці і жыццёвых сіл прыроды. З прыняццем хрысціянства яго месца заняў хрысціянскі святы Юрый-Пераможац — Юрай, Юр'я, Ягорый. Ярыла стаў забывацца і захаваўся хіба што ў фальклоры з яго старажытнымі каранямі.

Па ўспамінах М. Васілеўскай (1848 г.н., Мігуліна Сенненскага р-на), вясной на Юр'я выганялі статак на маладую свежую веснавую траўку, запальвалі грамнічную свечку, абыходзілі з ёю жывёлу, клалі асвячонае яйка і праганялі па ім кароў і авечак. Сталая пажаная жанчына запявала, а ўсе хорам падхопліваліпесню-просьбу да Ярылы-Юр'я даць добры ўраджай, абараніць жывёлу ад хвароб, забяспечыць яе плоднасць:

Ярыла, устань рана,
Ярыла, умыйся бела,
Ярыла, прычашыся гладка,
Ярыла, глянь у ваконца,
Ярыла, паглядзі на сонца,
Ярыла, вазьмі ключы ў сонца,
Ярыла, адамкні маці-зямліцу,
Ярыла, прагані злую зіміцу,
Ярыла, напаі зямлю вадзіцай,
Ярыла, пусці расіцу
на зялёную травіцу,
Ярыла, выгані з хлява жывёлу,
хай жывёла-гавяда пасецца,
хай курачка нясецца,
хай свіння сыцее,
хай кароўкі тлусцеюць,
хай даюць малачка дзеткам.
Ярыла, садзіся на каня варанога,
Ярыла, едзь на нівы-постаці,
Ярыла, расці жыта ўрадлівае:
коранем караністае,
сцяблом сцяблістае,
коласам каласістае.
На ніве капамі,
у полі снапамі,
на таку ўмалотам,
у дзяжы падходам,
у печы прыпёкам,
у хаце спорам,
на стале сыццю.

Вобраз Ярылы ў народным уяўленні ўвасабляў абуджэнне прыроды пасля зімовага сну, змену холаду на веснавую квецень. Ярыла — сімвал адвечнага росквіту вытворчых, жыццёвых сіл прыроды. Ярыла — відаць, ад слова яр, ярына, яравы, г. зн. веснавы, як яравыя пшаніца ці жыта.

Вобраз Ярылы шматаблічны, як шматаблічная вясна — то халодная, то цёплая, то дажджалівая, то сухая. Таму і ў народным ткацтве вобраз Ярылы ўвасоблены многімі ўзорамі. Адзін з іх паказвае Ярылу на кані. "Успаміны пра Ярылу, — пісаў рускі фальклярыст А. Афанасьеў, — добра захаваліся на Беларусі, дзе яго ўяўляюць маладым, прыгожым... на белым кані, у белай мантыі. На галаве ў яго вянок з веснавых палявых кветак. У левай руцэ

трымае ён жменю жытніх каласоў" (Афанасьев А. Поэтические воззрения славян на природу. М., 1865. Т. 1. С. 4).

З прыняццем хрысціянства многія язычніцкія багі былі хрысціянізаваны. Ярыла стаў Юрыем-Пераможцам, Юр'ем на кані, тым больш, што і назвы іх падобныя: Яр-Юры, Ярыла-Юрыла, Яры-Юрай. Так у народнай свядомасці хрысціянскі святы Юрый-Пераможац стаў сялянскім заступнікам, апекуном поля, нівы, ураджаю.

Хрысціянскі Юрый-Пераможац, які працінае кап'ём змея і выратоўвае царскую дачку ад пагібелі, увогуле імпануе сваім геройствам, але селяніну-беларусу ўсё ж бліжэй вобраз Ярылы. Беларус-працаўнік, які любіць зямлю, прыроду, воіна на кані свядома ці несвядома ператворыць у аратага. Так і зліліся два вобразы ў адзін — абаронца сям'і і абаронца ўраджаю. Дзеці Ярылы Жыцень, Спарыш і Багач, таксама клапоцяцца пра ўраджай на ніве. Таму селянін заўсёды вітаў іх, клікаў у госці, добра частаваў. Так ён спадзяваўся на добры ўраджай. Як бачым, узоры народнага ткацтва адлюстроўваюць мірны характар беларуса, нясуць антыванную ідэю.

Стары кульгавы жабрак-музыка Харытон (Сенненскі р-н) казаў: "Разам са мною (хоць яго і не відаць) ходзіць добры святы Ярыла-Юрша. Ён любіць, калі мяне добра кормяць, прымаюць, даюць міласціну".

Ярыла на кані вышыты на ручніку У. Галубковай (Клімавічы Сенненскага р-на, іл.). Яна верыла: калі Ярылу задобрыць, то ён дасць багаты ўраджай. "Ярыла любіць, калі яго вышываюць на ручніку і вешаюць у царкве на абраз". На ручніку У. Галубковай Ярыла трымае ў руках жытнія каласы, на яго галаве — вянок з каласоў, імі прарасла фігура каня, вялікія каласы раскіданы і па ўсім ручніку.

Падобны на зорку і матыў з шасці-васьмі ліній, якія перасякаюцца пад прамым вуглом. Нагадвае ён узор Нівы (Маці-Карміцелькі). Тут, відаць, адлюстравана сувязь з народнымі павер'ямі, паводле якіх Ярыла — гаспадар нівы, ён клапоціцца пра ўраджай. На свята Ярылы-Юр'я сяляне просяць: "Каб колас на ніве быў тоўстым і гнуўся да зямлі, каб уся ніва была ўкрыта густа снапамі". Каб забяспечыць такі ўраджай, на ніве закопвалі асвячонае на Вялікдзень курынае яйка (крашанку, пісанку), вышывалі ручнік адпаведным узорам.



Узор Ярылы на кані.

Друкуецца па кн: Кацар М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва, вышыўка. Мн., 1996, с. 17—19.

Падрыхтаваў Б. В. Ульянка.

Пра што расказваюць узоры

Народнае мастацкае ткацтва — адзін з найбольш папулярных і пашыраных відаў народнага мастацтва. Між тым яно яшчэ слаба вывучана. Мы звыкла ацэньваем тканыя рэчы з пазіцыі прыгажосці, адмысловасці арнаментыкі, гармоніі каларыту. Але народнае ткацтва — яшчэ і бяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак. Што ні ўзор — то сімвал. Сімвалы ўраджаю: Спарыш, Рай, Багач. Яны вучаць любіць Маці-Зямлю, працу, дабівацца добрага ўраджаю. Сімвалы святаў: Купала, Каляда, Масленіца, Вялікдзень. Тут — радасць, весялосць, гонар за вынікі сялянскай працы. Сімвалы памяці: Дзяды, Радаўніца, любоў і павага да продкаў. Усё, што захавана ў народным ткацтве, не пералічыць, але кожны ўзор сімвалізуе дабро, праўду, прыгажосць, любоў, гонар за чалавека і яго працу, кожны ўзор мае сваё прызначэнне і сваю назву.



Узор Сонца. Узор зямлі. Узор абуджэння.

Вельмі вобразна сказала пра гэта сялянка А. Міклушова з Сянна:

Трэба многа знаць,
каб узор прачытаць.
Ці светлым сонцам,

ці хатнім аконцам,
ці вешчай кукушкай,
ці мяккай падушкай,
ці яркаю зоркай,
ці ўдавою горкай,
ці спорым святам,
ці родным братам,
ці роднай сястрыцай,
ці светлай крыніцай,
ці зарой-зараніцай,
ці добрай маладзіцай,
ці краснай дзявіцай,
ці свежай вадзіцай.

Узоры тканых і вышываных вырабаў — зашыфраваны аповяд пра жыццё народа, прыроду, людзей.

Друкуецца па кн: Кацар М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва, вышыўка. Мн., 1996, с. 9.

Падрыхтаваў Б. В. Ульянка.

Сенненскі строй

Сенненскі строй.

Сенненскі строй — традыцыйны комплекс беларускага народнага адзення Падзвіння. Бытаваў у XIX—пачатку XX ст. пераважна ў Сенненскім, Талачынскім і часткова Чашніцкім раёнах.

Асноўнай сыравінай для вырабу адзення былі валокны льну, скура, воўна. Адзін з традыцыйных і найбольш пашыраных комплексаў жаночага адзення складаўся з кашулі, спадніцы, фартуха, пояса, намітку або хусткі. Штодзённым абуткам служылі лапці, на свята насілі скураныя чаравікі.

Аснову летняга строю жанчын складалі спадніца і фартух. Кашуля шылася з тонкіх адбеленых палотнаў. Кашулю краілі з прамымі плечавымі ўстаўкамі. Яна аздаблялася чырвоным, чырвона-сінім ромба-геаметрычным арнаментам. Упрыгожваўся каўнер, манжэты, плечавыя ўстаўкі, але асноўны дэкор выпадаў на рукавы.

Кашуля запраўлялася ў андарак — доўгую спадніцу з ваўнянай ці напаўваўнянай саматканкі ў жоўта-блакітную клетку, з дробнымі складкамі, з 4 полак.

Адной з важнейшых частак жаночага строю быў фартух, які завязваўся на таліі. Арнаментальна-кампазіцыйнае і каларыстычнае вырашэнне фартуха падпарадкоўвалася і гарманіравала з дэкорам кашулі, аздабляўся фартух карункамі.

Галаўны ўбор — намітка, хустка.

Традыцыйны комплекс мужчынскага адзення складаўся з ільняной кашулі, нагавіц (штаноў), пояса, саламянага капелюша ці картуза. Дэкаратыўны акцэнт прыпадаў на манішку, а кашулю падпярэзвалі яркім поясам ці дзягай.

Верхняе мужчынскае і жаночае адзенне — армяк, сярмяга, кажух.

В. Пракаповіч.

Народныя мастацкія калектывы Сенненшчыны

Самадзейны народны тэатр Багушэўскага ГДК. Гісторыя самадзейнага тэатра пачалася ў далёкім 1929 г. Пры гарпасялковым Доме культуры самадзейны тэатр узнік у 1946 г. Ініцыятарам яго стварэння была Раіса Сарочкіна, якая кіравала калектывам шмат гадоў. Асновай рэпертуару тэатра з'яўлялася беларуская нацыянальная драматургія. Гэта творы Янкі Купалы "Паўлінка" і "Прымакі", "Пінская шляхта" В. Дуніна-Марцінкевіча, "Трыбунал" А. Макаёнка, "Не верце цішыні"

І. Шамякіна. За гады свайго існавання тэатр паставіў больш за 150 спектакляў. Праз сцэнічную пляцоўку тэатра прайшло шмат пакаленняў самадзейных артыстаў. Ля яго вытокаў стаялі Генадзь Цвяткоў, Зінаіда Купрыянава, Валянціна Пянаева, Пётр Жагула і многія іншыя.

За высокае прафесійнае майстэрства тэатру ў 1959 г. прысвоена званне народнага.

Народны ансамбль "Вясёлыя музыкі". У 1988 г. па ініцыятыве Вольгі Дарожкінай і Сяргея Пагарэльскага пры раённым Доме культуры створаны фальклорны ансамбль "Вясёлыя музыкі". Галоўнай мэтай гэтага калектыву стала вывучанне і распаўсюджванне рэгіянальных фальклорных здабыткаў. У яго рэпертуар уключаны народныя сямейныя абрады і святы нацыянальнага календара "Сенненскае вяселле", "Заручыны", "Каляды", "Купалле", а таксама песенны фальклор Сенненшчыны. Калектыў з'яўляецца неаднаразовым пераможцам на абласных конкурсах і фестывалях. Яго музычны кіраўнік Сяргей Пагарэльскі — лаўрэат рэспубліканскага конкурсу гарманістаў.

У 1993 г. ансамбль атрымаў званне народнага.

Народны ансамбль "Вечарынка". У 1995 г. пры арганізацыйна-метадычным цэнтры аддзела культуры пад кіраўніцтвам дырэктара цэнтра Вольгі Дарожкінай створаны фальклорны калектыў "Вечарынка". У яго рэпертуары шырока выкарыстоўваюцца матэрыялы фальклорнай спадчыны Сенненшчыны. За аснову бяруцца нацыянальныя святы і абрады, песні, музыка, бытавая харэаграфія, народны гумар. Калектыў ажыццявіў пастаноўку ў сцэнічным варыянце народных свят "Масленка", "Гуканне Вясны", "Дажынкі", "Пакровы". У 1997 г. ансамблю прысвоена званне народнага — за высокае майстэрства і захаванне нацыянальнай спадчыны.

"Вечарынка" неаднаразова ўдзельнічала і з'яўлялася дыпламантам абласных і рэспубліканскіх конкурсаў і свят, а таксама тэлевізійных фестываляў. Мастацкі кіраўнік калектыву Вольга Дарожкіна стала лаўрэатам рэспубліканскага фестывалю гумару ў Аўцюках.

Народны хор ветэранаў вайны і працы. Створаны ў кастрычніку 1987 г. па ініцыятыве аддзела культуры Сенненскага райвыканкома і савета ветэранаў. Мастацкі кіраўнік Віктар Сіпараў. Асноўным напрамкам дзейнасці хора з'яўляецца прапаганда патрыятычнай песні і самадзейнай народнай творчасці. За час свайго існавання калектыў хору выступіў амаль ва ўсіх цэнтральных населеных пунктах калгасаў і саўгасаў раёна. У практыку работы хору ўвайшлі абменныя канцэрты з іншымі харавымі калектывамі ветэранаў. Калектыў

Сенненскі народны хор ветэранаў вайны і працы.

прымае ўдзел ва ўрачыстых провадах прызыўнікоў у рады Узброенных Сіл Рэспублікі Беларусь, сустракаецца з навучэнцамі школ раёна і школы-інтэрната. Неаднаразова прымаў удзел у абласных і рэспубліканскіх аглядах-конкурсах ветэранскіх калектываў, дзе адзначаўся ганаровымі граматамі, дыпломамі. У 2000 г. калектыў хору атрымаў званне народны.

Хор работнікаў культуры. Харавы калектыў Сенненскага раённага Дома культуры быў створаны ў кастрычніку 1991 г. З 2001 г. мае званне народны. Кіраўнік хору — Вольга Іванаўна Кавалёва, выкладчык Сенненскай школы мастацтваў. Сама добра спявае, сачыняе музыку, робіць музычную апрацоўку твораў, у т. л. і для хору. За час свайго існавання хор прымаў удзел у абласным конкурсе харавых калектываў (1995), дзе быў узнагароджаны дыпломам 2-й ступені, у абласным і занальным конкурсах у межах 1-га Рэспубліканскага фестывалю "Беларусь — мая песня" (1998), у абласных фестывалях духоўнай музыкі (1998, 2000).

Ні адно значнае мерапрыемства горада не абыходзіцца без выступлення хору. Каб задаволіць рознабаковыя густы слухачоў, хор уключае у свой рэпертуар і беларускія народныя песні, і лірычныя песні, і творы духоўнага накірунку.

У складзе хору работнікі раённага Дома культуры, бібліятэкары, выкладчыкі дзіцячай школы мастацтваў.

Узорны дзіцячы аркестр народных інструментаў. Створаны ў Сенненскай дзіцячай школе мастацтваў у 1996 г. З 2001 г. мае званне народнага. Кіраўнік Л. А. Курс. Аркестр актыўны ўдзельнік усіх школьных і раённых канцэртаў. Шмат разоў калектыў прадстаўляў раён у абласных конкурсах і фестывалях, неаднойчы атрымліваў званне лаўрэата. Разнастайны рэпертуар дазваляе яму знайсці свайго слухача ў любой аўдыторыі.

Душа Багушэўскага народнага

"За шматгадовую і плённую работу па кіраўніцтву народным тэатрам і ў сувязі з 75-годдзем з дня нараджэння ўзнагародзіць рэжысёра народнага тэатра Багушэўскага гарадскога Дома культуры Раісу Барысаўну Сарочкіну Ганаровай Граматай..."

(З Ганаровай граматы ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкома).

...Колькі памятае сябе, столькі любіла гэтае мастацтва. Бацька быў заўзятым тэатралам, сам удзельнічаў у спектаклях. Самадзейных, вядома.

Яшчэ калі жылі ў Віцебску, ставілі сцэнкі, у якіх і яна, маленькая Рая, старалася ўдзельнічаць. З усяго двара збіраліся дарослыя і дзеці, непасрэднымі гарачымі апладысментамі віталі "артыстаў".

А потым лёс закінуў сям'ю Сарочкіных у Варонеж. І там давялося сустрэцца з людзьмі, якія любілі тэатр.

У 1929 г. пераехалі ў Багушэўск. Бацька, брат і сама Раіса Барысаўна сталі працаваць на мэблевай фабрыцы. Бацька быў ініцыятарам стварэння драматычнага калектыву. Розныя спектаклі ставілі, ездзілі і ў Оршу выступаць. Нават па п'есе Барыса Лаўранёва "Разлом" спектакль паставілі.

А потым была вайна, эвакуацыя. І зноў сустрэча з цікавым чалавекам. У пасёлак, дзе жыла Сарочкіна, прыехала з Масквы жанчына — прафесіянальны рэжысёр. Яна арганізавала драматычную студыю. Вось тут Раіса Барысаўна пабачыла, як працуюць прафесіяналы. Іншыя сцэны па трыццаць-сорак разоў рэпетыравалі.

Пачалося вызваленне Беларусі, Раіса Барысаўна пераехала ў толькі што вызвалены ад акупантаў гарадок і... пайшла на фронт. Ваявала на 1-м Прыбалтыйскім, у 3-й паветранай арміі. Самадзейнасць і там была, удзельнічала ў ёй Сарочкіна. Нямала ў Раісы Барысаўны Сарочкінай баявых узнагарод — ордэнаў і медалёў.

У Багушэўск вярнулася ў 1946 г. Зноў драмкалектыў, спектаклі, выступленні, паездкі. А ў 1959 г. калектыву прысвоена званне народнага тэатра. Рэжысёрам была Раіса Барысаўна Сарочкіна.

— Я па прафесіі бухгалтар, — гаворыць жанчына. — Вопыт удзелу ў спектаклях, іх пастаноўкі мела. Але ж патрабаваліся спецыяльныя веды. Таму закончыла Усесаюзны універсітэт культуры імя Крупскай.

Багушэўскі народны тэатр славіўся сваімі выступленнямі. Аж да 1974 г. узначальвала яго Раіса Барысаўна. Толькі тады пайшла на адпачынак. Але без яе справы тэатра не пайшлі. Не было, як гаворыцца, душы калектыву. І Раісу Барысаўну зноў запрасілі ўзначаліць тэатр.

І. Е. Лазука.

Квартэт Кавалёвых

Спявае сям'я Кавалёвых.

Квартэт сям'і Кавалёвых даўно ведаюць не толькі ў раёне. Самадзейным артыстам апладзіравалі ў гарадах Віцебшчыны і Гомельшчыны, Міншчыны і Смаленшчыны, і, вядома ж, у Хойніках, дзе пачынаўся іх творчы шлях.

Вольга Іванаўна, Аляксандр Васільевіч, Аксана і Уладзік валодаюць цудоўнымі выканаўчымі якасцямі.

Майстэрства выканання — вось што захапляе людзей, якія слухаюць Вольгу Іванаўну, Аляксандра Восіпавіча, Аксану і Уладзіка.

У Сянно сям'я Кавалёвых пераехала на пастаяннае жыхарства не па ўласным жаданні. З родных мясцін, з Хойнікаў, іх выгнала вялікая бяда, якая зачапіла сваім чорным крылом многія беларускія сем'і, — аварыя на Чарнобыльскай АЭС. У Сянне Аляксандр Васільевіч пачаў працаваць дырэктарам раённага Дома культуры, Вольга Іванаўна — выкладчыцай у школе мастацтваў. Дзеці вучыліся ў сярэдняй школе і, адначасова, у школе мастацтваў. Затым Аксана закончыла Віцебскае вучылішча і паступіла на вучобу ў Мінск, а Уладзік таксама, следам за сястрой, падаўся ў Віцебскае музычнае вучылішча. Але па-ранейшаму сям'я ўдзельнічае ў конкурсах і фестывалях, у рэспубліканскіх фестывалях сямейнай творчасці.

І. Е. Лазука.

Захапленне музыкай

Зімовым вечарам жыццё нашага горада як бы заціхае. Але ідучы міма двухпавярховага будынка, што на вуліцы імя Карла Маркса, з вокан якога і ў гэты час льецца святло, людзі, запавольваючы крокі, абавязкова паглядзяць уверх, туды, адкуль разносяцца па прыціша-ным горадзе гукі музыкі і спеваў.

Тут, у дзіцячай школе мастацтваў, працавала Маргарыта Лазараўна Каралёва, выкладчыца тэорыі музыкі, чалавек, па-сапраўднаму адданы музыцы. Маргарыта Лазараўна вельмі любіла сваіх вучняў, аддавала ім нямала сіл і асабістага часу.

Маргарыта Лазараўна нарадзілася ў 1942 г. ў Гарадоцкім раёне. Яе бацькі жылі і працавалі ў сельскай школе.

З маленства ў дзяўчынкі было шмат захапленняў. Яна займалася спортам, жывапісам, музыкай і ўвесь час марыла стаць геолагам. Была актывісткай грамадскага жыцця школы. Удзельнічала ў розных спаборніцтвах, без яе не праходзіў ні адзін канцэрт школьнай мастацкай самадзейнасці.

Атрымаўшы атэстат аб сярэдняй адукацыі, Маргарыта задумалася над далейшым жыццём. Вырашыла прысвяціць сябе музыцы, яшчэ не падазраючы, што менавіта гэта справа стане яе сапраўдным прызваннем.

Потым была вучоба ў Віцебскім музычным вучылішчы, на аддзяленні харавога ды-

Першыя выпускнікі Сенненскай музычнай школы са сваімі выкладчыкамі. У першым радзе другая справа М. Л. Каралёва.

рыжыравання, работа ў сярэдняй школе № 2 г. Сянно. А калі ў горадзе адкрылася дзіцячая музычная школа, накіравалі туды.

Адначасова кіравала хорам хлопчыкаў пры Сенненскім Доме піянераў. Шмат асабістага часу аддавала М. Л. Каралёва тым хлопчыкам і дзяўчынкам, у якіх заўважыла талент сапраўднага захаплення музыкай. Многія педагогі Сенненскай музычнай школы, — яе былыя выхаванцы.

М. Астапчык.

Музеі раёна

У раёне працуюць раённы гісторыка-краязнаўчы і 16 школьных музеяў.

Сенненскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей. Рашэнне аб стварэнні музея было прынята ў жніўні 1995 г. Пад музей адведзены другі паверх двухпавярховага цаглянага будынка, пабудаванага ў 1913 г. для земскай управы. Пасля рэвалюцыі 1917 г. тут размяшчаліся райвыканком, гарсавет, бібліятэка, музычная школа, Дом піянераў.

У музеі праводзяцца выставы твораў самадзейных і прафесійных мастакоў, народных умельцаў нашага краю, дзіцячай творчасці. Маецца каля 2000 экспанатаў асноўнага фонду. Сярод іх творы нашых землякоў мастака У. К. Гоманава, скульптара З. І. Азгура. Сабраны дакументы пра паэтаў — нашых землякоў: Тадэвуша Ладу-Заблоцкага, Тамаша Зана, Андрэя Зязюлю, Алеся Жаўрука, Анатоля Вялюгіна. На пастаяннай аснове працуюць малыя экспазіцыі па археалогіі, гісторыі краю, "Мы ідзём дарогамі вайны".

У 2000 г. навуковы супрацоўнік музея В. В. Бандарэвіч выдаў кніжку "Экскурсія да вытокаў" — краязнаўчы маршрут па раённым цэнтры — Сянно. Гэта праца з'явілася вынікам шматгадовых краязнаўчых пошукаў аўтара і візітнай карткай г. Сянно і Сенненскага раёна.

Народны музей баявой і працоўнай славы Машканскай сярэдняй школы. Уся праца па зборы і абагульненні матэрыялаў музея вялася пад кіраўніцтвам былых дырэктараў школы Ф. А. Маскалёва, М. Т. Лукашэвіча, настаўнікаў Л. А. Лятас, В. Я. Русанава, В. Л. Шарэнда, Л. І. Шубка.

Музей распачаў сваю дзейнасць 23 лютага 1978 г. Экспазіцыя складаецца з 11-і раздзелаў, большасць якіх прысвечана Вялікай Айчыннай вайне. Тут экспануюцца фотакопіі дакументаў аб пачатку вайны, пра абаронцаў Брэсцкай крэпасці,

бітвы пад Масквой, Сталінградам, Курскам, аб партызанскім руху, вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Найбольш каштоўнымі экспанатамі музея з'яўляюцца асабістыя рэчы Герояў Савецкага Саюза, удзельнікаў вайны, салдацкія паштоўкі, фотакарткі і ўспаміны землякоў пра падзеі 1941—1945 гг.

У экспазіцыі шырока прадстаўлены матэрыялы аб Героях Савецкага Саюза, П. М. Машэраве, А. К. Гараўцу і І. У. Камінскім. На відным месцы бронзавы бюст П. М. Машэрава (праца З. І. Азгура), партрэты, фотаздымкі герояў, копіі дакументаў аб прысваенні ім высокіх званняў. У фондах музея захоўваецца 32 аўдыёзапісы ўспамінаў паплечнікаў П. М. Машэрава па партызанскай барацьбе.

Пры музеі працуе клуб "Пошук", гурткі "Юны краязнавец" і "Спадчына". З 1980 г. працай музея кіруе дырэктар школы Х. А. Куліеў. У 1984 г. за дасягненні ў патрыятычным выхаванні моладзі рашэннем калегіі Міністэрства культуры БССР музею было прысвоена званне "Народны музей баявой і працоўнай славы".

Музей СШ № 1 г. Сянно імя З. І. Азгура. Згодна ўказу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 1996 г. школе было прысвоена імя народнага мастака СССР, Героя Сацыялістычнай Працы, скульптара З. І. Азгура. У 1998 г. на базе класаў з мастацкім ухілам і школьных майстэрань створаны музей. Уся праца па арганізацыі экспазіцыі, зборы і абагульненні матэрыялаў вялася пад кіраўніцтвам дырэктара школы А. Я. Шайко, намесніка дырэктара М. С. Паўлоўскай, настаўнікаў І. М. Кучко, Ю. М. Кучко, А. М. Польскай, І. Л. Сапроненка.

Экспазіцыя музея складаецца з трох залаў. У першай прадстаўлены скульптурныя работы, выкананыя славутым землякам З. І. Азгурам, фотаздымкі шматлікіх яго скульптур, матэрыялы аб жыцці і творчасці мастака. Другая зала выкарыстоўваецца для зменных выстаў прац знакамітых мастакоў-землякоў, студэнтаў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педуніверсітэта, з якім школай заключаны дагавор аб супрацоўніцтве. У трэцяй зале сабраны лепшыя работы навучэнцаў класаў па жывапісу, графіцы. Тут жа вырабы з гліны, лазы, саломы і інш.

У музеі часта праводзяцца экскурсіі для навучэнцаў і настаўнікаў раёна, шматлікіх дэлегацый.

Музей баявой славы сярэдняй школы № 1 г. п. Багушэўск. Мэтанакіраваную і плённую працу вучняў па зборы матэрыялаў і экспанатаў музея ўзначаліла ў пачатку 1980-х гадоў настаўніца гісторыі Зінаіда Іванаўна Усовіч. Краязнаўцы сабралі ў ходзе шматлікіх экскурсій, паходаў, сустрэч з ветэранамі дакументы і матэрыялы аб вызваленні Сенненскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Першы раздзел экспазіцыі прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. У экспазіцыі маюцца стэнды, якія адлюстроўваюць падзеі кожнага года вайны. Стэнд, прысвечаны 1941 г., паведамляе аб контрудары 5-га і 7-га механізаваных карпусоў у напрамку на Лепель праз Сянно, а таксама аб дывізіі Гагена, якая трымала абарону Віцебска і вяла цяжкія баі пад Сянном.

На стэндах, прысвечаных вызваленню г. Сянно і г. п. Багушэўск, размяшчаюцца шматлікія матэрыялы аб 371-й, 215-й, 144-й стралковых дывізіях, якія ўваходзілі ў склад 5-й танкавай арміі Ротмістрава, аб палках Марозава, Сітко, аб Героях Савецкага Саюза Маскалёве, Багамолаве, Мусланаве.

Шмат дакументаў, успамінаў, фотаздымкаў воінаў-землякоў, удзельнікаў абароны Ленінграда і Масквы, баёў пад Сталінградам і на Курскай дузе, арганізатараў і ўдзельнікаў падпольнага руху і партызанскіх брыгад.

Другі раздзел экспазіцыі прысвечаны гісторыі г. п. Багушэўск і яго знакамітым землякам. Дагістарычны перыяд, геалагічныя змены на тэрыторыі Беларусі і раёна, археалагічныя знаходкі, паведамленні аб тым, як і калі ўзнік г. п. Багушэўск — гэтыя і іншыя звесткі, матэрыялы і дакументы знаёмяць наведвальнікаў музея з далёкім мінулым, гісторыяй роднага краю.

Пры музеі працуе краязнаўчы гурток, сіламі якога збіраюцца матэрыялы, арганізуюцца выставы, мерапрыемствы, экскурсіі.

З 1993 г. музеем кіруе настаўнік гісторыі М. Т. Лукашэвіч.

Гісторыка-краязнаўчы музей сярэдняй школы № 2 г. п. Багушэўск. Гісторыка-краязнаўчы музей пачаў працаваць у Багушэўскай СШ № 2 з 1996 г. У яго фондах больш за 150 экспанатаў. Матэрыялы для музея збіралі настаўнікі школы І. І. Шылько, Л. А. Сімановіч, Л. М. Мяцеліца, С. І. Казлова і інш., а таксама вучні школы.

Экспазіцыя музея складаецца з некалькіх раздзелаў: "Знакамітыя людзі Сенненшчыны" (сабраны матэрыялы аб жыцці і творчай дзейнасці Канапелькі, Абрасімава, Платонава, Машэрава і інш.; "Гісторыя Сенненшчыны"; "Вялікая Айчынная вайна" (фотаздымкі, успаміны партызан Багушэўска, Сянно); "Волаты беларускай зямлі" (матэрыялы аб Героях Савецкага Саюза — ураджэнцах Сенненшчыны); "Гісторыя Багушэўска" (матэрыялы з перыядычнага друку, копіі дакументаў, фатаграфіі), "Сцяжынкі ў даўніну"; "Гісторыя школы".

У музеі нярэдка праводзяцца ўрокі па гісторыі, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, аглядавыя і тэматычныя экскурсіі.

Музей баявой славы Ульянавіцкай сярэдняй школы. Створаны ў 1985 г. Заснавальнікам яго з'яўляецца дырэктар Ульянавіцкай СШ М. Т. Лукашэвіч. Зараз работай музея кіруе настаўнік гісторыі У. А. Грашавік.

Большасць экспанатаў прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.: аб цяжкіх гадах акупацыі, мужнасці і храбрасці аднавяскоўцаў, якія змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на франтах, аб партызанскім і падпольным руху. Цікавыя матэрыялы аб баявым шляху партызанскай брыгады Лявонава, аб Героях Савецкага Саюза С. А. Каваленку і І. Г. Тамашэўскім.

Сярод экспанатаў музея копіі архіўных дакументаў, узнагароды, граматы, лісты з франтоў, асабістыя рэчы воінаўземлякоў.

Пра розныя людскія лёсы расказвае стэнд "Ніхто не забыты, нішто не забыта". Баец-камсамолец Уладзімір Іосіфавіч Літвінаў усю вайну насіў свой камсамольскі білет каля сэрца, гэта і ўратавала яго жыццё. Куля затрымалася ў дакументце. Камсамольскі білет У. І. Літвінава — экспанат музея.

На базе музея працуе краязнаўчы гурток, праходзяць "лінейкі Памяці", сустрэчы з ветэранамі вайны. На адкрыццё музея прыязджалі родныя Герояў Савецкага Саюза С. А. Каваленкі і І. Г. Тамашэўскага. Іх расказы, успаміны — гэта добрыя ўрокі мужнасці, сувязь часоў, перадача эстафеты ад пакалення да пакалення.

Гістарычны музей Студзёнкаўскай сярэдняй школы. Створаны ў 1996 г. Кіраўнік яго — дырэктар школы А. П. Стрыжнёў. У выніку сумесных пошукаў настаўнікамі, вучнямі, жыхарамі была створана экспазіцыя, дзе даволі грунтоўна прадстаўлены ўзоры беларускіх народных рамёстваў: ткацтва, ганчарства, бандарства, пляцення. У музеі шмат дакументаў, якія расказваюць аб Вялікай Айчыннай вайне. Ёсць матэрыялы па археалогіі, пераважна бронзавага, жалезнага вякоў.

Ствараецца экспазіцыя старадаўняй кнігі. Яна прадстаўлена арыгінальнай літаратурай XVII—пачатку XX ст., рускамоўнымі і польскамоўнымі дакументамі XIX ст., указамі і маніфестамі Аляксандра I, Мікалая I, Аляксандра II. Асабліва цікавяць вучняў падручнікі і метадычныя дапаможнікі XIX—пачатку XX ст.

Не меншую цікавасць выклікаюць у наведвальнікаў прадметы культавага прызначэння: наперсныя крыжы, шытыя срэбрам тканіны, а крыж, падараваны прыхаджанамі г. Мазыра свайму пратаіерэю у 1985 г., мае не толькі гістарычную, але і мастацкую каштоўнасць.

Пры музеі працуе гурток "Краязнаўства і этнаграфія". Гурткоўцы праводзяць народныя святы і абрады. Атрыманыя веды дапамагаюць ім на ўроках гісторыі, літаратуры, класных гадзінах, урачыста адзначаюцца памятныя даты. Дзейнасць

музея накіравана на вывучэнне, прапаганду і ахову гістарычнай і культурнай спадчыны.

Музей прыроды Алексініцкай сярэдняй школы. Адкрыты 24 мая 2001 г. Створаны па ініцыятыве дырэктара школы, настаўніка біялогіі А. Л. Бараноўскага і начальніка раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Э. І. Зелентава.

Галоўнай мэтай дзейнасці музея з'яўляецца павышэнне агульнаадукацыйнага, культурнага ўзроўню вучняў, іх экалагічных ведаў, фарміраванне сістэмы ведаў аб узаемадзеянні прыроды і грамадства, норм паводзін і гаспадарчай дзейнасці, накіраваных на рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў.

Музей прыроды складаецца з наступных раздзелаў: 1 — клімат, 2 — феналогія, 3 — ландшафты, 4 — зямля і нетры, 5 — водныя рэсурсы, 6 — раслінны свет, 7 — жывёльны свет, 8 — прыродакарыстанне, 9 — ахова прыроды. Створаны дзве дыярамы "Змешаны лес" і "Возера".

Тут рэгулярна праводзяцца розныя выставы, як напрыклад, "Лішайнікі нашай мясцовасці", "Птушкі роднага краю", "Лекавыя расліны і іх прымяненне" і інш.

Сенненскі дом рамёстваў. Створаны ў снежні 1993 г. Аснова яго дзейнасці — прапаганда традыцыйных рамёстваў Сенненшчыны, прывіццё моладзі любві і павагі да роднай спадчыны і культуры. Гэта робіцца праз сетку гурткоў. Гурткамі кіруюць спецыялісты, якія дасканала валодаюць рамёствамі. Кіраўнікі гурткоў вывучаюць і збіраюць матэрыялы аб традыцыйнай культуры Сенненшчыны, набываюць вырабы народнай творчасці з мэтай стварэння музейнага і навуковага фонду, арганізацыі выстаў. Сабрана багатая калекцыя тканін, ручнікоў, абрусоў, посцілак, у тым ліку традыцыйнага строю.

Вызначаны чатыры напрамкі, па якіх збіраецца матэрыял — гэта ганчарства, узорнае ткацтва, вышыўка, апрацоўка дрэва. Супрацоўнікі Дома рамёстваў праводзяць значную работу па адраджэнню традыцый, наладжваюць сувязі з умельцамі раёна.

Лепшыя вырабы супрацоўнікаў Дома рамёстваў і навучэнцаў дэманструюцца на раённых, абласных і рэспубліканскіх выставах, святах, фестывалях.

Нястомны краязнаўца

БАНДАРЭВІЧ Васіль Віктаравіч. Нарадзіўся 24.6.1955 г. у в. Новая Беліца ў сям'і служачага. Краязнаўца. У 1978 г. скончыў мастацка-гістарычны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. З 1978 г. працуе выкладчыкам выяўленчага мастацтва СШ № 2 г. Сянно. Аўтар факультатыўнага вучэбнага курса "Спадчына роднага краю". Удзельнік рэспубліканскіх і абласных выстаў народнай творчасці.

Расказваць пра Сянно лепей за Васіля Віктаравіча Бандарэвіча проста немагчыма. Таленавітага краязнаўцу, мастака, настаўніка ведае, здаецца, кожны жыхар нашага горада. Менавіта дзякуючы яму, нястомнаму даследчыку мінуўшчыны роднага краю, нам сталі вядомыя многія старонкі гістарычнай і культурнай спадчыны Сенненшчыны, былі знойдзены ўнікальныя дакументы: карты, малюнкі, фотаздымкі, успаміны.

Васіль Віктаравіч распрацаваў і ўжо некалькі год выкладае ў роднай школе аўтарскі курс "Спадчына". З вялікай цікавасцю хлопчыкі і дзяўчынкі даведваюцца, што азёрным наш край стаў у выніку праходжання праз яго некалькіх ледавікоў, што ў Чырвоную кнігу Беларусі занесена мноства жывёл, птушак і дрэў, якія ёсць у лясах Сенненшчыны. Стварэннем гэтага курса Васіль Віктаравіч дасягнуў галоўнай мэты: эфектыўна спалучаць выкладчыцкую дзейнасць у школе з краязнаўствам.

Аснову курса "Спадчына" складае экскурсійны маршрут па Сянне. Дакладней кажучы, з экскурсій усё і пачалося. Маршрут уключае 28 краязнаўчых аб'ектаў, знаёмства з якімі дазваляе стварыць поўную карціну развіцця Сянна і бліжэйшага навакольля, пачынаючы з глыбокай старажытнасці. Пад час экскурсіі закранаецца шырокае кола пытанняў па розных напрамках краязнаўства: геаграфіі, тапаніміцы, геральдыцы, гісторыі, архітэктуры, этнаграфіі, эканомікі; наведваюцца памятныя мясціны, звязаныя з імёнамі вядомых асоб і славутых землякоў.

Пачынаецца экскурсія на ўзвышшы, адкуль адкрываецца цудоўная панарама горада. Менавіта тут 31 ліпеня 1877 г. пабываў вядомы мастак і музыкант Напалеон Орда, пэндзлю якога належыць акварэль "Сянно". На беразе чароўнага Сенненскага возера спускаемся да каплічкі. Вядома, што ў 1780 г. па дарозе ў Магілёў Сянно наведала імператрыца Кацярына II, якая частавалася мінеральнай вадой з крынічкі, што выцякае з гэтай каплічкі...

Завяршаецца экскурсія каля краязнаўчага музея, у якім Васіль Віктаравіч таксама працуе з першых дзён утварэння.

В. В. Бандарэвіч — не толькі вядомы краязнаўца, але і цудоўны мастак. Збіраючы па крупінках краязнаўчыя звесткі, Васіль Віктаравіч стварыў шмат мастацкіх твораў на тэмы культурнай і архітэктурнай спадчыны Сенненшчыны. Акрамя гэтага, В. В. Бандарэвіч часта выступае з цікавымі артыкуламі на старонках раённай газеты "Голас Сенненшчыны".

С. В. Шайко.

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ

Сенненшчына праз прызму адміністрацыйна-тэрытарыяльных падзелаў

Час заснавання старажытных населеных пунктаў можна ўдакладніць толькі па матэрыялах археалагічных раскопак. Многія з паселішчаў існавалі яшчэ да ўзнікнення пісьменнасці. У пісьмовых крыніцах яны ўпамінаюцца пазней, у сувязі са значнымі падзеямі (войнамі, судовымі справамі, характарыстыкай гаспадарчай дзейнасці і г. д.). І юбілеі населеных пунктаў адзначаюцца па іх першым упамінанні ў пісьмовых крыніцах.

Гісторыя фарміравання тэрыторыі сучаснага Сенненскага раёна звязана са складанай гісторыяй адміністрацыйна-тэрытарыяльных падзелаў, што адбываліся ў тых дзяржавах, у якія ўваходзілі населеныя пункты, існаваўшыя з даўніх часоў.

Выяўленыя археолагамі на тэрыторыі цяперашняга Сенненскага раёна паселішчы часоў Кіеўскай Русі адносіліся да магутнай Полацкай дзяржавы. У выніку феадальнай раздробленасці, калі Полацкае княства распалася на больш дробныя ўдзелы, тэрыторыя Сенненшчыны ўвайшла ў Лукомскае княства ў складзе Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ).

На пачатку XVI ст. у ВКЛ былі амаль канчаткова ліквідаваны ўдзельныя княствы, на іх тэрыторыях утвараліся ваяводствы. Амаль усе яны дзяліліся на паветы, якія складаліся з драбнейшай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі — воласці.

У 1504 г. было ўтворана Полацкае ваяводства, а ў 1506 г. — Віцебскае. Маёнтак Сянно і большая частка сучаснай Сенненшчыны ўваходзілі ў Аболецкі павет Віцебскага ваяводства, а самая заходняя частка Сенненшчыны — у Лукомскі павет Полацкага ваяводства. Пасля адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы, праведзенай у 1565—1566 г. адна частка Сенненшчыны адышла да Віцебскага, другая — да Аршанскага паветаў Віцебскага ваяводства. У выніку новай адміністрацыйнай рэформы у сярэдзіне XVIII ст. Сенненшчына (з Сянном) ўвайшла ў склад Полацкага і Віцебскага ваяводстваў.

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Сянно ў складзе Расійскай імперыі, цэнтр павета Магілёўскай губерні. У 1796—1802 г. Сенненскі павет (цэнтр г. Віцебск) уваходзіў у склад Беларускай губерні. З 1802 г. Сенненшчына зноў у складзе Магілёўскай губерні.

Пад час рэформы 1830—1850 г. воласці на тэрыторыі Беларусі былі скасаваны, а пасля адмены прыгоннага права (1861) зноў адноўлены і ўваходзілі ў склад паветаў.

Да кастрычніка 1917 г. населеныя пункты ў межах сучаснай Сенненшчыны ўваходзілі ў восем валасцей. У паўночнай частцы існавалі Латыгальская і Машканская воласці, амаль у цэнтры — Пустынская, на захадзе — Ульянавіцкая, на ўсходзе Серакаратнянская (часткова супадае

з цяперашнім Багушэўскім сельсаветам, уваходзіла ў Аршанскі павет), на паўднёвым усходзе — Какоўчынская (частка тэрыторыі), на поўдні — Раснянская (частка тэрыторыі) і Высока-Гарадзецкая (толькі вёска Відокі) воласці.

Пасля 1917 г. тэрыторыя цяперашняга Сенненскага раёна спачатку ўваходзіла ў Сенненскі павет (Серакаратнянская воласць з Багушэўскам — у Аршанскім павеце) Магілёўскай губерні. Тым часам з лютага да восені 1918 г. значная частка сучаснай Сенненшчыны знаходзілася пад акупацыяй германска-кайзераўскіх войск. Лінія фронту пралягала ад паўночна-заходняй да паўднёва-ўсходняй часткі прыблізна за 15 км на паўднёвы захад ад Сянна.

У далейшым на лёс Сенненшчыны паўплывала польская інтэрвенцыя 1919—1920 гг.

Пасля ўтварэння БССР (1.1.1919) Сенненскі павет у складзе РСФСР. У красавіку 1919 г. скасавана Магілёўская губерня і ўтворана Гомельская (існавала да 8.12.1926), у якую ўвайшоў Аршанскі павет з Серакаратнянскай воласцю і Багушэўскам. Сенненскі павет быў уключаны ў Віцебскую губерню. 15.2.1923 г. Сенненскі павет скасаваны, а яго воласці ўвайшлі ў Аршанскі, Віцебскі і ў зноў утвораны Бачэйкаўскі (Ульянавіцкая воласць) паветы. Горад Сянно стаў цэнтрам воласці, а мястэчка Бачэйкава (цяпер цэнтр сельсавета Бешанковіцкага раёна — павятовым цэнтрам.

З 1924 г. Сенненшчына ў складзе БССР. У гэтым жа годзе скасаваны Бачэйкаўскі павет. У рэспубліцы створаны акругі і раёны. Сенненскі раён увайшоў у Віцебскую акругу, а ў Аршанскай акрузе быў створаны Багушэўскі раён.

Пасля ліквідацыі акруг (1930) Сенненскі раён непасрэдна падпарадкаваны цэнтру, а з 15.1.1938 г., у сувязі з утварэннем абласцей, уключаны ў Віцебскую вобласць.

Больш складанай аказалася гісторыя Багушэўскага раёна. Яго двойчы ствараліі двойчы ліквідавалі. Існаваў з 17.7.1924 г. да 8.7.1931 г. і з 12.2.1935 г. да 20.1.1960 г. Да ліпеня 1930 г. быў у Аршанскай акрузе. З 15.1.1938 г. у Віцебскай вобласці. Пры скасаванні раёна 7 сельсаветаў: Астапенскі, Забараўскі, Застадольскі, Какоўчынскі, Ледневіцкі, Машканскі, Навасельскі і гарадскі пасёлак Багушэўск перададзены ў склад Сенненскага раёна.

Населеныя пункты Сенненшчыны маюць багатую гісторыю: яны ўваходзілі ў склад розных губерняў, паветаў, акруг, абласцей.

А. І. Залескі.

СЯННО — горад, цэнтр раёна. Знаходзіцца за 54 км на паўднёвы захад ад Віцебска, 15 км ад чыгуначнай станцыі Бурбін, што на лініі Лепель—Орша, на беразе воз. Сянно (Сенненскае). Размешчаны на 2 марэнных узвышшах, падзеленых з поўначы на поўдзень воз. Сянно. На 1.1.2000 г. 9 тыс. жыхароў. У пісьмовых крыніцах упамінаецца ў 1-й палове XVI ст. У час вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ 1534—1537 гг. Сянно было занята войскамі князя Барыса Гарбатага і спалена (1535). У 1543—1545 гг. упамінаецца маёнтак Сянно ў судовых цяжбах паміж уладальнікамі яго праваслаўнымі князямі Дз. Відніцкім-Любецкім, пасынкам яго Р. І. Сенненскім-Грыбоўскім і плябанам Аболецкага касцёла. Як сяло, загадваецца ў 1566 г. у апісанні межаў Віцебскага ваяводства.

У купчай, дадзенай у 1595 г. Фелінскім старостам Марцінам Курчам сыну Яўстафію, ідзе гаворка пра маёнтак, замак і мястэчка Сянно "з царквамі і іх фундушамі". Гаспадарку маёнтка вёў упраўляючы, якому ад імя уладальніка было дадзена права суда над яго сялянамі. Замак (палац уладальніка) знаходзіўся на ўзвышшы, на месцы старажытнага капішча, каля двух серных крыніц, і быў абведзены ровам, праз які да брамы вёў пад'ёмны мост. Побач была капліца (не захавалася). У 1780 г. у замку спынялася імператрыца Кацярына II на шляху з Полацка ў Магілёў.

З першай паловы XVII ст. Сянно належала магнатам Сапегам, з 2-й паловы XVIII ст. — Агінскім. У 1609 г. пабудаваны каменны францысканскі касцёл, які ў 1772 г. перабудаваны князямі Агінскімі. Пры касцёле быў кляштар.

У 1658 г., пад час вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай, у наваколлі Сянна маскоўскія стральцы пад камандаваннем Васіля Пушачнікава разграмілі атрады мясцовай шлях-

74 Зак. 2999.

ты, якія на чале з Янко Юндзілам вялі партызанскую вайну супраць рускіх войск. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай Сенненшчына ў складзе Расійскай імперыі. У 1781 г. Сянно атрымала герб: "В золотом поле две золотые косы, в знак изобилия сеном, от которого сей город название своё получил".

У 1-й палове XIX ст. горад належаў графу Серакоўскаму. Працавалі 2 гарбарныя і паташны заводы. У 1805 г. каля 600 дамоў, пераважна драўляных. У 1847 г. 373 дамы, 1730 жыхароў. У 1848 г. горад пацярпеў ад эпідэміі халеры, памерла 118 жыхароў. У 1860 г. пажар знішчыў амаль усе драўляныя будынкі. У 1865 г. 2706 жыхароў. У 1867 г. на месцы былой драўлянай царквы пабудавана з каменю Мікалаеўская саборная царква (не захавалася). У 1881 г. у Сянно працавала 7 прадпрыемстваў з 7 рабочымі. У 1889 г. побач з саборам узведзена каменная капліца. Паводле перапісу 1897 г. у горадзе 4,1 тыс. жыхароў (з іх 39,9% пісьменных), павятовае і прыходскае вучылішчы, 6 дробных прамысловых прадпрыемстваў (12 рабочых).

У 1904 г. — 4367 жыхароў, 534 жылыя дамы. У цэнтры горада размяшчаўся мураваны адміністрацыйны будынак, налічвалася 14 вуліц і завулкаў. Вуліцы ўначы асвятляліся 72 газавымі ліхтарамі. Паміж Тракцірнай, Бешанковіцкай і Віцебскай вуліцамі мясцілася гандлёвая плошча з крамамі з аднаго боку і касцёлам з другога. У 1907 г. — 450 дамоў (з іх 4 мураваныя), 4245 жыхароў, праваслаўных — 660, католікаў — 150, стараабрадніка ў — 35, іудзеяў — 3400 чалавек, 2 царквы, 1 касцёл, 6 малітоўных дамоў. Змяншэнне колькасці дамоў тлумачыцца пажарамі (13), што адбыліся ў 1900—1905 гг. Дзейнічалі 54 рамесныя прадпрыемствы, 1 паравы, 3 вадзяныя млыны. Больш распаўсюджанымі відамі рамёстваў былі: шавецкае (94 чалавекі), кравецкае, слясарна-кавальскае (31), сталярнае (15), малярнае (14), пекарскае (12 чалавек). Штогод адбывалася 5 кірмашоў. На гандлёвай плошчы Сянна мелася 82 лаўкі. У горадзе мелася 6 школ, у тым ліку гарадское вучылішча, чатырохкласная жаночая прагімназія, а таксама 3 бібліятэкі, 2 бальніцы, аптэка, 6 гасцініц. Дзейнічалі паштовая кантора (з 1788), тэлеграф (з 1883), друкарня, фатаграфія. Горад упрыгожвалі 2 вялікія сады.

Паводле перапісу 1917 г. у горадзе — 4540 жыхароў, 691 гаспадарка.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У жніўні 1918 г. адбыўся леваэсэраўскі мяцеж, ліквідаваны часцямі Чырвонай Арміі. З 1919 г. Сянно ў складзе Віцебскай губерні РСФСР. Да пачатку 1919 г. створаны Сенненскі павятовы саўнаргас, які кіраваў эканомікай горада і павета. З 15.10.1919 да 1.11.1919 г. на Сенненшчыне было нарыхтавана для патрэб Чырвонай Арміі 5570 пудоў збожжа, 4177 пудоў бульбы і інш. З 1924 г. г. Сянно у складзе БССР, цэнтр Сенненскага раёна Віцебскай акругі (1924—1930). У 1926 г. у горадзе 5509 жыхароў (з іх 59,6% пісьменных), 978 гаспадарак . У 1927 г. дзве сямігодкі (658 вучняў), няпоўная сямігодка (130 вучняў), школа 1-й ступені (63 вучні), яўрэйская школа (130 вучняў), школа ліквідацыі непісьменнасці, 4 бібліятэкі, 3 клубы, народны дом. Прамысловыя прадпрыемствы (1928): электрастанцыя, торфараспрацоўчае, рамонтныя майстэрні, вінзавод, маслабойня, 3 газагенератарныя млыны, 9 кузняў, 4 сталярныя майстэрні, 14 пякарняў.

З 1938 г. Сянно ў Віцебскай вобласці. Паводле перапісу 1939 г. — 4,3 тыс. жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну 5.7.1941 г. Сянно занята часцямі 17-й танкавай дывізіі з групы Г. Гудэрыяна. Іх далейшы рух на ўсход за 10—12 км ад горада спынілі воіны 153-й стралковай дывізіі. 6—10.7.1941 г. каля горада адбылася адна з буйнейшых на пачатку вайны танкавых бітваў, у якой з абодвух бакоў удзельнічала больш за 1500 танкаў. 18-ы мотастралковы і 35-ы танкавы палкі ўварваліся ў Сянно. Вораг спешна пакінуў горад, на вуліцах якога засталіся разбітыя танкі, гарматы, аўтамашыны. У выніку контрудару савецкіх войск нямецкія войскі 8 ліпеня былі адкінуты ад Сянна на 30—40 км у бок Лепеля. 25.6.1944 г. у ходзе Віцебска-Аршанскай наступальнай аперацыі войск 3-га Беларускага фронту горад вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў воінамі 9-й брыгады конна-механізаванай групы войск пад камандаваннем генерал-лейтэнанта М. С. Аслікоўскага. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 970 жыхароў Сянна, з іх 104 на фронце.

У пасляваенны час горад адбудаваны, створаны новыя прамысловыя прадпрыемствы, жылыя раёны. Праект сучаснай планіроўкі Сянна распрацаваны ў 1968 г. у Віцебскіх абласных праектных майстэрнях. На месцы старога адміністрацыйнага цэнтра сфарміраваны новы. Гандлёвы цэнтр размешчаны на вул. Кастрычніцкай. Асноўныя жыллёвыя забудовы сканцэнтраваны ў раёнах вуліц Назарэнкі, Кастрычніцкай і інш. Прамысловая зона — у заходняй частцы горада. Прадпрыемствы: ільнозавод, маслазавод, камбінат кааператыўнай прамысловасці, філіял Віцебскага вытворчага аб'яднання "Будаўнік". Працуюць райкамбінат бытабслугоўвання, райбальніца, рай-

аптэка, 2 сярэднія школы, школа-інтэрнат, дзіцячая школа мастацтваў, спартыўная школа, цэнтр пазакласнай і пазашкольнай работы, 3 садкі-яслі, раённыя Дом культуры і бібліятэка, дзіцячая бібліятэка, Дом рамёстваў, музей, 16 магазінаў, рэстаран, гасцініца, цэх паўфабрыкатаў, кандытарскі цэх, бар, кавярня, раённы вузел сувязі, АТС, 2 аддзяленні сувязі. Помнікі: на брацкай магіле савецкіх воінаў (у парку імя 40-годдзя ВЛКСМ), на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан (на вул. К. Маркса, сквер). Радзіма Героя Савецкага Саюза А. Ф. Пятаковіча, паэта Алеся Жаўрука, пісьменніка М. Б. Марцінкоўскага, скульптара Яна Астроўскага, мастака-жывапісца У. К. Гоманава, вучоных Л. Р. Кажарскай, Я. Р. Радкевіча, генерал-лейтэнанта І. С. Касабуцкага.

АДАМАВА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце, на левым беразе ракі Абалянка. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 27 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Азер'е, Леванова, Міхайлава, Обалъ, Шчамілаўка, Юзэфова, Старыя Брады. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы было 43 двары, 172 жыхары. У чэрвені 1944 г. фашысты знішчылі вёску, загубілі 18 жыхароў. Пасля вайны вёска адноўлена. Ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы. Помнікі: курганны могільнік. Мясцовая назва Французскія магілы.

АЛЕКСАНДРОВА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 11 жыхароў. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

АЛЕКСАНДРОВА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 32 жыхары.

АЛЕКСАНДРЫЯ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 21 жыхар. У 1926 г. былі вёскі Верхняя Александрыя і Ніжняя Александрыя. У 1939 г. у вёску сселены іх жыхары.

АЛЕКСІНІЧЫ — вёска, цэнтр Алексініцкага сельсавета і сельгаскааператыва. Знаходзіцца за 32 км на паўднёвы ўсход ад Сянна, 28 км ад чыгуначнай станцыі Багушэўская. На 1.1.2003 г. 150 двароў, 353 жыхары. У гістарычных крыніцах упершыню ўпамінаецца пад 1522 г. Належала да маёнтка Палонна ў Віцебскай зямлі, якім валодала Ф. І. Гагацінская, з 1516 г. — князь Астрожскі і Слуцкі Хадкевіч. З пачатку 30-х г. XVI ст. уласнасць Сапегаў, у канцы XVI—першай палове XVII ст. маёнтак шляхціцаў П. і А. Стаброўскіх. У 80-я гады XIX ст. сяло ў Пустынскай воласці. На пачатку XX ст. адно з буйнейшых паселішчаў у Сенненскім павеце: 137 двароў, 836 жыхароў, 1-класная школа. З 20.8.1924 г. вёска, цэнтр сельсавета Сенненскага раёна Віцебскай акругі. У вайну загінулі больш за 300 жыхароў сельсавета, 178 з іх не вярнуліся з фронту. Пасля вайны адноўлена. У складзе сельсавета 20 населеных пунктаў, 542 двары, 1198 жыхароў.

Працуюць жывёлагадоўчы комплекс, машынны двор, сярэдняя школа, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, аддзяленне сувязі, АТС, Дом культуры, бібліятэка.

Помнік на брацкай магіле 138 савецкіх воінаў і 73 партызан, якія загінулі ў канцы чэрвеня 1944 г. пры разгроме групоўкі нямецка-фашысцкіх войск у раёне Багушэўска. Радзіма вучонага М. М. Піятуховіча.

АЛЁХНАВА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце, на левым беразе р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 35 двароў, 95 жыхароў.

АЛЯКСАНДРАЎСКАЯ — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 27 жыхароў.

АНДРЭЙЧЫКІ — вёска ў Расненскім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва, на шашы Сянно—Орша. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 51 жыхар. Гаспадарка мае малочна-мясны напрамак вытворчасці з развітым ільнаводствам, 1815 га сельгасугоддзяў, 1533 га ворыва. Машынны двор з майстэрняй, малочнатаварная ферма, клуб, бібліятэка.

АНДРЭЕЎШЧЫНА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

АПЕЧКІ — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 24 жыхары. У 1933 г. існаваў калгас "Апечкі".

АРЛЯНЫ — вёска (да 1964 г. в Канец) у Ходцаўскім сельсавеце, на р. Бярозка, на дарозе Машчоны—Арляны. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 27 жыхароў. Малочнатаварная ферма.

АСІНАЎКА — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 32 двары, 56 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары паселішчаў Зара, Чысцік. Працуюць фермы малочнатаварная і па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. Магазін. Радзіма вучонага-гісторыка З. В. Шыбекі.

АСІНАЎКА — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на дарозе Латыгаль—Асінаўка. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 55 жыхароў. Малочнатаварная ферма.

АСІНАЎКА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 8 жыхароў.

АСТАПЕНКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 18 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Серакароцінскай воласці, з 20.8.1924 г. цэнтр Астапенска-

га сельсавета Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. Малочнатаварная ферма.

АСТРОЎШЧЫНА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 9 жыхароў.

АТРАДНАЯ — вёска (да 1964 г. в. Абідаўка) ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 22 жыхары.

АЎСЕЕВА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце, на дарозе Леснікова—Рындзева. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 34 жыхары. У 1939 г. у вёску сселены хутары Лапцева, Новае Круцькава, Скрабіна. Фермы малочнатаварная, па вырошчванні і адкорму буйной рагатай жывёлы. Магазін.

АЎЧЫНКАВА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 41 жыхар. У 1939 г. у вёску сселены жыхары г. п. Бондарава, Пішчуры. Малочнатаварная ферма.

БАБАЕДАВА — вёска ў Расненскім сельсавеце, на дарозе Бабаедава—Багданава. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 29 жыхароў. На пачатку XX ст. недалёка быў аднайменны фальварак, уласнасць памешчыка Расткоўскага, 272 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены хутары Багданава, Бакунова, Сываратка.

БАГДАНАВА — вёска, цэнтр Багданаўскага сельсавета і Віцебскай эксперыментальнай гаспадаркі. Знаходзіцца на паўночным захадзе ад Сянна, на беразе возера Багданаўскае. На 1.1.2003 г. 168 двароў, 459 жыхароў. На пачатку XIX ст. вёска Ульянавіцкай воласці. З 20.8.1924 г. у Гарывецкім сельсавеце Сненскага раёна. У 1939 г. у вёску сселены жыхары пасёлкаў Камер-Бор, Кордава. У вайну загінулі 450 жыхароў сельсавета, 304 з іх не вярнуліся з фронту.

Віцебская эксперыментальная гаспадарка спецыялізуецца на вытворчасці мяса і малака. Мае 3332 га сельгасугоддзяў, 2198 га ворыва. Машынна-трактарны парк налічвае 61 трактар, 35 аўтамашын, 9 зернеўборачных камбайнаў, іншую тэхніку. Машынны двор з майстэрняй, комплекс па адкорму і ферма па вырошчванню буйной рагатай жывёлы, сярэдняя школа, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт бытпаслуг, клуб, бібліятэка, магазін.

БАГДАНАВА — вёска ў Расненскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 35 двароў, 83 жыхары. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі побач быў фальварак, які належаў двараніну фон Вітэ, 700 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Гарадок. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана, электрыфікавана і радыёфікавана. Малочнатаварная ферма, пачатковая школа, магазін.

БАГУШЭЎСК — гарадскі пасёлак, цэнтр сельсавета і сельгаспрадпрыемства "Багушэўскае". Знаходзіцца за 38 км на ўсход ад Сянна, чыгуначная станцыя. Аўтадарогамі злучаны з Сянном, Віцебскам, Оршай. На 1.1.2003 г. 3660 жыхароў.

Першыя жыхары тут пачалі сяліцца дзякуючы "каплічцы Макавея". Каля гэтай каплічкі праходзіла дарога Сянно—Віцебск. У час царкоўных свят з Серакаротні (цяпер в. Лучазарнае) да каплічкі прыязджаў святар і на набажэнствы збіралася многа сялян з навакольных вёсак. Зыходзячы з гэтага, некалькі прадпрыймальных людзей вырашылі ў 1879 г. тут пасяліцца, каб весці гандаль. Забароўскі адкрыў карчму, Гозін — заезны дом (гасцініца разам з бакалейным магазінам), Рэут — магазін. Іх можна лічыць заснавальнікамі Багушэўска. Затым пасяліліся Ландзёнак, Кулік, Кац, Крывашэеў. У XIX ст. Багушэўск вядомы як фальварак.

У 1854—1884 гг. працаваў бровар. Галоўным піваварам быў латыш Рэут.

У 1901 г. пачалося будаўніцтва чыгункі Віцебск—Жлобін. Адну са станцый вельмі зручна было пабудаваць менавіта ў гэтых мясцінах, таму што Віцебск, Орша і Сянно знаходзіліся на адлегласці 40 км кожны. Зямля належала Дз. В. Багушэўскаму (па некаторых звестках палкоўніку, які пражываў у Санкт-Пецярбургу. Ён згадзіўся перадаць частку зямлі пад станцыю, але пры ўмове, што станцыя атрымае назву у гонар яго жонкі — Багушэўская. У сваю чаргу населены пункт каля станцыі атрымаў назву Багушэўск. Сам Дз. В. Багушэўскі памёр у 1903 г. і пахаваны ў в. Худалеі (цяпер — в. Рыбнае) пад Багушэўскам.

Пазней у Багушэўску пабудавалі магазін, склады для газет і бензіну. Пасёлак пачаў хутка расці ў выніку перасялення сюды яўрэяў з навакольных вёсак. Былі сярод іх гандляры, шаўцы, рамізнікі, кавалі.

У 1915 г. у Багушэўску пабудавалі лесапілку.

Напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі ў пасёлку пачала дзейнічаць сінагога. Працавалі 2 фельчары.

З 1924 г. цэнтр сельсавета. У 1933 г. тут дзейнічалі прадпрыемствы: ільнозавод, кузня прамарцелі, шавецкая майстэрня, мэблевая фабрыка, смоларцель "1-е Мая", вінзавод (створаны да рэвалюцыі). З ліпеня 1941 г. да 25.6.1944 г. акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. У 1924—1931 гг. і ў 1935—1960 гг. цэнтр раёна, з 27.9.1938 г. гарадскі пасёлак. Мэблевая фабрыка, лясгас, леспрам-

гас, ільнозавод, акцыянернае таварыства "Багушэўскмэбля", пашывачны і кандытарскі цэхі, камбінат бытавога абслугоўвання, раённая бальніца, абласная туббальніца, аптэка, 2 сярэднія і базавая санаторна-амбулаторныя школы, музычная школа, народны тэатр, дзіцячы садок, Дом піянераў і школьнікаў, Дом культуры, 2 бібліятэкі, кавярня, аддзяленне сувязі, АТС, 7 магазінаў, працуе рынак.

Сельгаспрадпрыемства спецыялізуецца на вытворчасці малочна-мясной прадукцыі і насенняводства траў. Мае 3633 га сельгасугоддзяў, з іх 2591 га ворыва. Машынны двор і майстэрня па рамонту тэхнікі. Помнікі: У. І. Леніну, у гонар войск 20-й арміі, якія гераічна змагаліся з ворагам у ліпені 1941 г., на 4-х брацкіх магілах савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Радзіма савецкага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча, дыпламата П. А. Абрасімава, народнай артысткі Беларусі З. І. Канапелька, генерал-маёра Б. Д. Супрына.

БАЛБАСАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 65 жыхароў.

БАРАВІКІ — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 24 жыхары. На пачатку XX ст. маёнтак ва Ульянавіцкай воласці, належаў двараніну А. В. Варанкевічу, 245 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Васількова, Гатоўшчына.

БАРОК — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 30 жыхароў. У 1880-х гадах маёнтак У. М. Каралько, былі вінзавод, вадзяны млын, 27.11.1905 г. у маёнтку адбываліся сялянскія хваляванні, у якіх удзельнічалі 300 жыхароў навакольных вёсак. Малочнатаварная ферма.

БАЯРШЧЫНА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 19 жыхароў. Упамінаецца ў інвентары маёнтка Палонна (1665 г., як сяло СБоярские") ў Віцебскім ваяводстве. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Пруднікі, Круча. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана. Магазін.

БЕЛАЯ ЛІПА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва. На 1.1.2003 г. 109 двароў, 268 жыхароў. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, машынны двор з майстэрняй, ёсць аддзяленне сувязі, Дом культуры, бібліятэка, магазін, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання.

БЕЛЯІ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Лазова—Жарцы. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 9 жыхароў. На пачатку XX ст. фальварак на возеры Беляі, належаў шляхціцу Драздоўскаму.

БЕРАШОВА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 35 двароў, 54 жыхары. Упамінаецца ў 1533 г. як вёска ў складзе маёнтка Палонна ў Віцебскай зямлі. У тым годзе воляю караля Жыгімонта I разам з маёнткам перайшла ва ўласнасць Сапегаў. На пачатку XX ст. паблізу, на возеры Саро, быў фальварак Берашова, што належаў мяшчанцы Лявонавай, 666 дзес. зямлі, сядзіба. У 1939 г. у вёску сселены жыхары п. Берашова. Пасля вайны адбудавана, ёсць магазін. Помнік — курган (вядомы з канца XIX ст.).

БЕСЦВІНА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Карпавічы—Пушкары. На 1.1.2003 г. 39 двароў, 72 жыхары. Упамінаецца ў 1591 г. у акце падзелу маёнткаў І. І. Сапегі паміж яго сынамі (адносілася да маёнтка Палонна ў Віцебскім ваяводстве). На пачатку XX ст. фальварак належаў шляхціцу Ганіпроўскаму. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Бялужанкі, Бароўка, Коцікава, Цішкавічы. Малочнатаварная ферма па вырошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы. Магазін. Радзіма перакладчыка М. В. Гарбачова.

БІКАВА — вёска ў Машканскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 34 жыхары. Упамінаецца як сяло ў Віцебскім ваяводстве ў сувязі з падзеямі вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. 11.2.1658 г. у сяле атрад маскоўскіх стральцоў на чале з Васілём Пушачнікавым разграміў атрад Хаванскага. На пачатку XX ст. маёнтак належаў Ф. Ф. Бражнікавай і А. Е. Лазінскай. З 24.8.1924 г. у Застадольскім сельсавеце Сенненскага раёна. У 1933 г. існаваў калгас "Бікава". Была кузня. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Дуброўка. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана. Малочнатаварная ферма.

БОР — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, на дарозе Града—Пальчыкі. На 1.1.2003 г. 9 двароў, 19 жыхароў. 2 малочнатаварныя фермы, ферма па вырошчванні і адкорму буйной рагатай жывёлы.

БОРТНІКІ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 45 жыхароў. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы было 26 двароў. У сакавіку 1944 г. карнікі спалілі 23 двары. Пасля вызвалення ад акупантаў узноўлены калгас імя С. М. Кірава. На пачатку 1967 г. у калгасе "1-е Мая".

БРОЎКІ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 27 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Куклы. 2 фермы па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

БУГАІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 6 жыхароў.

БУДА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 48 двароў, 66 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Какоўчынскай воласці. З 20.8.1924 г. цэнтр Будскага сельсавета Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Ануфрэнкі, Барэйшына, Дубкі, Заазер'е, Зуі, Карпавічы, Ступенькі, Сітцы, Шаўлі. Ёсць малочнатаварная ферма, магазін.

БУДЗІШЧА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце, на дарозе Сянно—Нямойта. На 1.1.2003 г. 23 двары, 62 жыхары. На пачатку XX ст. засценак, належаў дваранцы Т. О. Жукоўскай, меў 120 дзес. зямлі. Калгас "Каст-рычнік" створаны 17.7.1959 г. Было 1627 га сельгасугоддзяў, 1369 га ворыва. Працуюць клуб, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання.

БУДНА — вёска ў Расненскім сельсавеце, на шашы Сянно—Орша. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 28 жыхароў. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

БУЙ — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 28 жыхароў. Упамінаецца ў інвентары маёнтка Палонна за 1665 г., мястэчка ў складзе гэтага маёнтка; праваслаўная царква Спаса, з канца XVII ст. уніяцкая. У 1880-х гадах сяло ва Ульянавіцкай воласці, праваслаўная царква, вадзяны млын. Побач быў фальварак, які належаў памешчыкам Бітным-Шляхтам, 1010 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. у Сукрэменскім, з 29.10.1924 г. у Латыгальскім сельсаветах. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Кублішчанка, Чартова. Пасля вайны адбудавана. Фермы па вырошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы. Магазін. Помнікі: курганны могільнік, 2 курганы.

БУЙНІЧКАВА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 7 жыхароў.

БУРБІН — вёска ў Беліцкім сельсавеце, каля станцыі Бурбін, што на чыгуначнай лініі Орша—Лепель. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 10 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Бурбін.

БЯЛЕНЕВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва, на аўтамабільнай дарозе Багушэўск—Какоўчына. На 1.1.2003 г. 86 двароў, 214 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Какоўчынскай воласці. Было народнае вучылішча. З 20.8.1924 г. у Сідорніцкім сельсавеце Багушэўскага раёна. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Гаўрылкава, Сідорнічы, Стаселькі. На пачатак 1967 г. у Какоўчынскім сельсавеце. У калгасе малочна-мясны напрамак вытворчасці, развіта льнаводства, 1194 га сельгасугоддзяў, 990 га ворыва. Машынны двор, майстэрня, жывёлагадоўчая ферма, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, клуб, бібліятэка, магазін.

БЯЛЬКІ — вёска ў Машканскім сельсавеце, на р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 31 двор, 56 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Берасні, Благія, Віхры, Гаёк, Гарадзішча, Гарэлая Выгарка, Грыбы, Заднія, Ляхаўшчына, Масцішча, Апіянаўка, Піліпцы, Плентаўка, Пабойня, Падалешыны, Пад'яблыняй, Старыкоўшчына, Студзёнка, Талоўка, Таросы, Сітаўка, Чырвоная Гара, Крывыя Часткі, Кручэўе, Крутаніца. Малочнатаварная ферма.

БЯРОЗКІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, на беразе возера Бярозаўскае. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 36 жыхароў. 2 фермы па вырошчванні і ферма па адкорме буйной рагатай жывёлы.

ВАКАРЫ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 45 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Заазер'е, в. Капелішча, Храмейкава. Ёсць малочнатаварная ферма.

ВАЛОДЗЬКІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 33 жыхары. Упамінаецца сяло ў 1665 г. у інвентары маёнтка Нямойта. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Замошша. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

ВАРАШЫЛЫ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 28 двароў, 43 жыхары. У 1939 г. у вёску сселены жыхары вёсак і хутароў Апорчанкі, Барсукі, Вускоўе, Выгар, Гайдукі, Гута, Піскавацік, Рабыя. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ВАРОНІНА — вёска ў Расненскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 9 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары пасёлка Дземяхі. Працуе ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. Помнік на магіле 11 партызан, якія загінулі ў 1942—1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1942—1944 гг.

ВАСІЛЬКОВА — вёска ў Расненскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 27 жыхароў.

ВЕЙНА — вёска ў Расненскім сельсавеце, каля шашы Сянно—Орша. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 21 жыхар. На пачатку XX ст. побач быў фальварак, які належаў І. Б. Вейсенгофу, 945 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Вейна. У сакавіку 1942 г. карнікі

спалілі 53 двары. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

ВІДОКІ — вёска ў Беліцкім сельсавеце, на р. Усвейка. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 28 жыхароў. На пачатку XX ст. маёнтак у Высока-Гарадзецкай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. Належаў двараніну З. Каралько. З 20.8.1924 г. у Беліцкім сельсавеце. У 1939 г. у вёску сселены жыхары паселішчаў Загарода, Зарэчкі. Малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ВІТУНЬ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 10 жыхароў. Упамінаецца ў 1665 г. у інвентары маёткa Нямойта як сяло. З 20.8.1924 г. у Машчонскім сельсавеце. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

ВОЙЛЕВА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Карпавічы—Бесцвіна. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 28 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Войлева. Ёсць малочнатаварная ферма, магазін. Радзіма артысткі Г. П. Рыжковай.

ВЫГАДА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 5 жыхароў.

ВЯЛІКАЕ СЯЛО — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 37 двароў, 71 жыхар. Пасля вайны адбудавана.

ВЯЛІКАЕ СЯЛО — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 26 жыхароў. Вядома з XVI ст. як сяло ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства ВКЛ. Упамінаецца ў 1634 г. у даравальным запісе. На звоне мясцовай царквы захавалася дата 1678 г. У 1712 г. упамінаецца ў сувязі з падзеямі Паўночнай вайны на Беларусі. У 80-х гг. XIX ст. сяло ў Расненскай воласці. Праваслаўная Успенская царква, 1-класная школа. З 15.2.1923 г. цэнтр Вялікасельскай воласці з 20.8.1924 г. у Какоўчынскім сельсавеце Багушэўскага раёна. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

ВЯЛІКАЯ ПЯРЭСПА — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 25 жыхароў.

ВЯЛІКІ АЗЯРЭЦК — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на шашы Сянно—Чашнікі. На 1.1.2003 г. 67 двароў, 138 жыхароў. У 1634 г. у акце межавання маёнткаў Вядцы і Сянно ўпамінаецца паселішча Азярэцк. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Чырвоная Гара. У 1928 г. тут быў паравы млын, існаваў калгас. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана. Пачатковая школа, малочнатаварная ферма, 3 фермы па адкорму буйной рагатай жывёлы. Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, курганны могільнік.

ГАЛАВАЧЫ — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце, на р. Немайцянка. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 46 жыхароў. Упамінаецца ў 1665 г. як сяло ў складзе маёнтка Нямойта. На пачатку XX ст. вёска ў Пустынскай воласці. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

ГАЛАШЧАКІНА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на шашы Сянно—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 19 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Іўчанкі, Косарава, Лісы, Мастакі. Перад вайной у вёсцы было 16 двароў, 7 жыхароў. Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў аднавіў дзейнасць калгас "Пражэктар".

ГАЛОЎСК — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 20 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары пасёлка Крывіна. Паблізу вёскі археалагічны помнік — тры старажытныя паселішчы, вядомыя пад назвай Крывіна.

ГАРАДЗЕЦ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 49 двароў, 97 жыхароў. Упамінаецца ў сувязі з падзеямі вайны 1654—1667 гг. Расіі з Рэччу Паспалітай. У 1658 г. тут адбываліся баі рускіх войскаў з атрадамі шляхты. На пачатку XVIII ст. у складзе маёнтка Савіна І. Скапы, згадваецца ў сувязі з падзеямі Паўночнай вайны (1700—1721 гг.) Расіі са Швецыяй. На пачатку XX ст. быў млын, які належаў сялянам Галовічам. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Гарадзец. Пачатковая школа, малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні жывёлы.

ГАРНАКІ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 10 жыхароў. На пачатку XX ст. маёнтак, належаў памешчыку Бржастоўскаму, 418 дзес. зямлі. Яму ж належаў і аднайменны засценак. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Гарнакі і вёскі Навасёлкі. Помнік на брацкай магіле 4 савецкіх воінаў, якія загінулі ў канцы чэрвеня 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ГАРНОВА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Лазова—Жарцы, каля возера Ліпна. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 12 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Гарнова-2. Радзіма беларускага вучонага П. С. Грунтова.

ГАРЫВЕЦ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 13 жыхароў. Вядома з XVI ст. у Віцебскім павеце Віцебскага ваяводства ВКЛ. Паводле інвентара ма-

ёнтка Вядцы, што належаў Аболецкаму касцёлу, вёска ўваходзіла ў склад гэтага маёнтка (1790 г.). З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета. У 1939 г. у вёску пераселены жыхары пасёлка Крыўнікі. Помнік на брацкай магіле 49 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Радзіма літаратуразнаўца С. І. Васілёнка.

ГЕРМАНАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

ГЛЕБАЎСК — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 27 двароў, 36 жыхароў. Упамінаецца ў інвентары маёнтка Палонна (1665), як сяло Глебаўскія ў Віцебскім ваяводстве. У 1939 г. у вёску сселены жыхары паселішчаў Відокі, Гарбуны. Пасля вайны адбудавана. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ГОРНЫЯ ХОДЦЫ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на возеры Сосна. На 1.1.2003 г. 40 двароў, 98 жыхароў. Свінаферма.

ГОРЫ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на шашы Сянно — Полымя. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 18 жыхароў.

ГОСМІРАВА — вёска ў Машканскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 41 двор, 99 жыхароў. Упамінаецца ў пісьме віцебскага намесніка каралю Жыгімонту I (4.5.1538) з нагоды просьбы групы жыхароў сяла іх "в тягловую службу вернуть". На пачатку XVI ст. належала князю А. К. Прыхабскаму, а пасля яго смерці — зяцю, князю Ф. Д. Горскаму. У 1880-я г. у сядзібе Госмір былі вінакурны завод, ветраны і вадзяны млыны. На пачатку XX ст. маёнтак належаў І. А. Дэрлінгу, меў 1152 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Бутоны, Дворня, Кірэева, Шашкі. Дзве жывёлагадоўчыя фермы.

ГРАДА — вёска Багушэўскага сельсавета, на р. Зелянуха. На 1.1.2003 г. 4 двары, 4 жыхары.

ГРАДА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 21 жыхар.

ГРАДА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 16 жыхароў.

ГРУЗДЫ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў. На пачатку XX ст. побач быў яшчэ аднайменны засценак. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Бугаі, засценак Грузы. Цяпер у саўгасе "Янова".

ГУЛІНА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, на возеры Гуліна. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 20 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Лушча, Рыпанава.

ДАБРАПОЛЛЕ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце (да 1964 г. в. Жабіна). На 1.1.2003 г. 3 двары, 5 жыхароў.

ДАГАНАЎКА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Багушэўск — Какоўчына. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 37 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска Дагананаўка ў Какоўчынскай воласці. З 20.8.1924 г. у Какоўчынскім сельсавеце Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. Малочнатаварная ферма.

ДАМАШЭВА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 76 жыхароў. Упамінаецца ў інвентары маёнтка Нямойта за 1665 г. як сяло ў Віцебскім ваяводстве. Пасля вайны адбудавана. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ДВАРЭЦ — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

ДОЛЬДЗЕВА — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на дарозе Ульянавічы — Дольдзева. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 51 жыхар. Малочнатаварная і па адкорму буйной рагатай жывёлы фермы. Магазін.

ДОБРЫНА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на р. Добрынка. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 34 жыхары. Упамінаецца ў 1591 г. у акце падзелу маёнткаў І. І. Сапегі. Уваходзіла ў склад маёнтка Палонна. На пачатку XX ст. вёска ў Серакаратнянскай воласці, размяшчалася казарма. З 15.2.1924 г. у Высачанскай воласці, з 20.8.1924 г. у Дзевінскім сельсавеце Багушэўскага раёна Аршанскай акругі, з 20.9.1929 г. у Клюкаўскім сельсавеце.

ДУБАЎЦЫ — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 5 жыхароў.

ДУБАЎЦЫ — вёска ў Обальскім сельсавеце, на р. Чудзінка, на аўтамабільнай дарозе Канстантова — Машканы. На 1.1.2003 г. 25 двароў, 45 жыхароў. Яе жыхары ўдзельнічалі ў канцы лістапада 1905 г. у сялянскіх хваляваннях у суседнім маёнтку Шыркаўка памешчыка Валчанскага. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Ульянава.

ДУБКІ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Дубкі — Латыгава. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ДУБНЯКІ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на дарозе Латыгаль — Асінаўка. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ЖАРЦЫ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Лазова — Жарцы. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 12 жыхароў.

ЖОХАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на шашы Сянно — Некрашэва. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 6 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Сідорніцкім сельсавеце Багушэўскага раё-

на. На пачатак 1967 г. у Расненскім сельсавеце.

ЗААЗЕР'Е — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на возеры Серакаротня. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 27 жыхароў.

ЗААЗЕР'Е — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, на возеры Бярозаўскае. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 20 жыхароў. Упамінаецца ў інвентары маёнтка Нямойта за 1665 г. як сяло Заазер'е. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

ЗААЗЕР'Е — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 18 жыхароў. Упамінаецца ў 1591 г. у акце падзелу маёнткаў І. І. Сапегі паміж яго сынамі пад назвай Засор'е. Уваходзіла ў склад маёнтка Палонна. У 1600—1633 гг. уласнасць А. Сапегі, старосты Аршанскага, а пасля яго смерці — дачкі Ганны і мужа яе С. Нарушэвіча. З 1772 г. у Сенненскім павеце Магілёўскай губерні. У 1939 г. у вёску сселены жыхары пас. Папоўка. Помнік: курганны могільнік.

ЗААЗЕР'Е — вёска у Ходцаўскім сельсавеце, на возеры Белае. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ЗАБАРАЎЕ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на дарозе Багушэўск — Янова. На 1.1.2003 г. 73 двары, 144 жыхары. Паводле перапісу 1897 г. вёска ў Какоўчынскай воласці, адно з буйнейшых паселішчаў Сенненскага павета Магілёўскай губерні, налічвала 529 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары пас. Чырвонае Забараўе. 2 фермы па адкорму буйной рагатай жывёлы. Помнік на брацкай магіле 39 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні вёскі і раёна ад нямецка-фашыскіх захопнікаў.

ЗАБОР'Е — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце, на аўтамабільнае дарозе Сянно—Нямойта. На 1.1.2003 г. 39 двароў, 84 жыхары. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Будзішча, Забор'і. Машынны двор з майстэрняй, 2 малочнатаварныя фермы па вырошчванню буйной рагатай жывёлы, магазін.

ЗАВАЖАННЕ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 25 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Заважанне-2, Заважанне-3, Ліпна, Лунішча, Лясная Старожка. Малочнатаварная ферма, магазін.

ЗАВЕТНАЕ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце (да 1964 г. в. Гапоны) на воз. Серакаротня, на аўтамабільнай дарозе, што злучае Багушэўск з шашой Віцебск—Орша. На 1.1.2003 г. 32 двары, 74 жыхары. У 70-х гг. XX ст. працавала санаторна-аздараўленчая школа. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 132 воіны і партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗАДАРОЖЖА — вёска ў Машканскім сельсавеце, на дарозе Віцебск—Ходцы. На 1.1.2003 г. 38 двароў, 87 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Бабовішча, Бабінцы, Забор'е, Загацце, Саўкін Узмежак. Малочнатаварная ферма. Помнік на брацкай магіле 4-х савецкіх воінаў, якія загінулі ў канцы чэрвеня 1944 г. у баях супраць нямецка-фашыскіх захопнікаў.

ЗАКРАТУННЕ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Паўлавічы—Латыгава. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 15 жыхароў. Малочнатаварная ферма.

ЗАМАШАНСКАЯ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 24 двары, 42 жыхары.

ЗАМОШША — вёска ў Обальскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 13 жыхароў. Жыхары яе ў канцы лістапада 1905 г. удзельнічалі ў сялянскіх хваляваннях у маёнтку Шыркаўка памешчыка Валчанскага. Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Л. Е. Сіроткінай.

ЗАМОШША — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на дарозе Ульянавічы—Пожанькі. На 1.1.2003 г. 24 двары, 45 жыхароў. Малочнатаварная ферма.

ЗАПОЛЛЕ — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 18 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. былі вёскі Старое Заполле і Новае Заполле. У 1939 г. у Новае Заполле сселены жыхары в. Старога Заполля. У красавіку 1944 г. фашысцкія карнікі спалілі 47 двароў, загубілі 2 жыхароў. На пачатку снежня 1944 г. аднавіў работу калгас "Камінтэрн". Помнік на брацкай магіле 36 савецкіх воінаў і партызан. Радзіма журналіста-публіцыста Дз. М. Марчанкі.

ЗАПРУДДЗЕ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце, паблізу ад возера Багданаўскае. На 1.1.2003 г. 36 двароў, 61 жыхар. Малочнатаварная ферма, магазін, аддзяленне сувязі.

ЗАСЛОНАВА — вёска у Алексініцкім сельсавеце (да 1945 г. в. Казадоі). На 1.1.2003 г. 12 двароў, 14 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Нямейкава. У Вялікую Айчынную вайну была спалена фашысцкімі карнікамі, загінулі 5 жыхароў. Пасля вайны адрадзілася.

ЗАСТАДОЛЛЕ — вёска ў Алексініцкім сельсавеце, на р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 22 жыхары.

ЗАСТАДОЛЛЕ — вёска ў Машканскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 58 жыха-

роў. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Маўчаны. Цяпер у вёсцы малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні жывёлы, базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, клуб, бібліятэка. Помнік на брацкай магіле 46 воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні вёскі і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ЗАСЦЕНАК — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 63 двары, 158 жыхароў.

ЗУБАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 11 жыхароў. Упамінаецца ў даравальнай грамаце на маёнтак Кеміна, як сяло. На пачатку XX ст. побач быў фальварак, які належаў памешчыку Гусакоўскаму. У вёсцы працуе ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ЗЯМКОВІЧЫ — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 23 двары, 52 жыхары. Вядома з XVIII ст. як сяло Зямкоўцы ў Аршанскім павеце. У верасні 1942 г. карнікі спалілі вёску, загубілі 29 жыхароў. У снежні 1944 г. аднавіўся калгас "Зямковічы". Ёсць малочнатаварная ферма.

ІВАШКАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на р. Адроўка, на дарозе Крупяжына-Рошчына. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 23 жыхары. Працуе малочнатаварная ферма.

ІВОНІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 25 жыхароў. Упамінаецца ў 1665 г. як сяло Івоніна ў складзе маёнтка Нямойта. У 1880-х гг. тут пасяліліся літоўцы. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Бычок, Лугаўцы, Лядзіна, Янкаў. У вёсцы 2 фермы па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

КАВАЛІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, на шашы Сянно—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 27 жыхароў. У 1665 г. упамінаецца як сяло Кавалёва ў складзе маёнтка Нямойта. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Забеліна, Сашанова. Пасля вайны адбудавана. Ёсць малочнатаварная ферма.

КАВАЛЬКІ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 45 жыхароў. Ёсць малочнатаварная ферма.

КАДУКОВА — вёска ў Обальскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 27 жыхароў. 25.11.1905 г. жыхары вёскі ўдзельнічалі ў аграрных хваляваннях супраць памешчыка Абядзерскага, які валодаў маёнткам Канстантова. Напярэдадні вайны налічвалася 15 двароў, 68 жыхароў. У ліпені 1941 года фашысты спалілі 12 двароў, забілі 2 жыхароў. Ёсць малочнатаварная ферма.

КАЖАМЯКІ — вёска ў Расненскім сельсавеце, на р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 6 жыхароў. Помнік савецкім воінам на месцы гібелі Герояў Савецкага Саюза С. Дз. Барадуліна, П. І. Назарэнкі, Ц. І. Святлічнага.

КАЗАКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 6 жыхароў.

КАЗЛОЎКА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Сянно—Дварэц. На 1.1.2003 г. 42 двары, 92 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Навасельскім сельсавеце. Ёсць малочнатаварная ферма, пачатковая школа, фельчарска-акушэрскі пункт. Помнік на магіле ахвяр фашызму — мірных грамадзян.

КАЗЛЫ — вёска ў Обальскім сельсавеце на аўтамабільнай дарозе Казлы—Машканы. На 1.1.2003 г. 3 двары, 5 жыхароў. 25.11.1905 г. жыхары вёскі ўдзельнічалі ў сялянскіх хваляваннях супраць памешчыка Абядзерскага, які валодаў маёнткам Канстантова. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Падборыца і Рукалі.

КАКОЎЧЫНА — вёска, цэнтр Какоўчынскага сельсавета і сельгаскааператыва "Ясная зара", на паўднёвы ўсход ад Сянна, на дарозе Какоўчына — Янова. На 1.1.2003 г. 139 двароў, 342 жыхары. У 1880-я гады сяло, цэнтр воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. Былі валаснае праўленне, Ільінская праваслаўная царква. Непадалёку знаходзіўся аднаймены фальварак, які адносіўся да Смальянскай каталіцкай парафіі, меў 621 дзес. зямлі. У сяле былі народнае вучылішча, урачэбны ўчастак. У канцы лістапада 1905 г. у воласці адбыліся значныя выступленні сялян супраць уласнікаў маёнткаў. З 20.8.1924 г. Какоўчына — цэнтр сельсавета Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Какоўчына, Падмошша, Сіманаўшчына.

На пачатак 1967 г. цэнтр калгаса "Какоўчына", зараз сельгаскааператыў "Ясная зара". Гаспадарка мае малочна-мясны напрамак вытворчасці, з насенным зерняводствам, 4050 га сельгасугоддзяў, 3231 га ворыва. У вёсцы машынны двор з майстэрняй, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазіны. Помнік на брацкай магіле 8 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (абеліск, 1948).

КАЛАНТАЁВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на р. Пясочанка, на дарозе Калантаёва—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 23 двары, 39 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Гаручкі, Добрынка, Ляды, Ярошкі. Цяпер у саўгасе "Янова". Тут магазін, малочнатаварная ферма.

КАЛЯНЬКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, каля воз. Серакотня. На 1.1.2003 г. 34 двары, 57 жыхароў. У 1939 г. тут быў калгас "Іскра", ваўначоска. Ёсць малочнатаварная ферма і ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

КАМАРОВА — вёска ў Расненскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 27 двароў, 64 жыхары. Малочнатаварная ферма, ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы.

КАМЕНКА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На1.1.2003 г. 1 двор, 3 жыхары. На пачатку XX ст. вёска Расненскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У верасні 1942 г. спалена фашысцкімі карнікамі, загублена 24 жыхары. Адноўлена.

КАМІНШЧЫНА — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце.

КАНАШЭВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 3 двары, 5 жыхароў.

КАНЕВА — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 32 двары, 54 жыхары. Упамінаецца ў 1545 г. у матэрыялах разбору скаргі ўласніка маёнтка Сянно, куды ўваходзіла сяло, каралеўскім судом у Вільні, згадваецца ў апісанні межаў Лукомскага павета Полацкага ваяводства ў 1566 г. На пачатку XX ст. былі 1-класная школа, Траецкая прыходская царква, ветраны млын. Побач мясціўся фальварак, які належаў памешчыку С. Н. Спасоўскаму. У 1939 г. у вёску сселены жыхары паселішчаў Бараны, Канева, Клявец, Курэнь, Новая Ніва, Петухоўшчына. Ёсць малочнатаварная ферма, ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы, магазін.

КАНСТАНТОВА — вёска ў Обальскім сельсавеце, на дарозе Канстантова—Машканы. На 1.1.2003 г. 103 двары, 238 жыхароў. На пачатку XIX ст. маёнтак, да 1840 г. належаў Сангушкам. У тым жа годзе распрададзены фальваркамі паміж шляхтай з-пад Маладзечна і Новай Вілейкі. Вёску набыў Мечыслаў Светаржыцкі, пасля смерці якога напярэдадні 1863 г. маёнтак перайшоў да яго жонкі Алімпіі з роду Аскеркаў. За ўдзел у паўстанні 1863 г. Міхаіла Аскеркі маёнтак секвестраваны, а пасля амністыі вернуты. Быў ва ўласнасці Светаржыцкай да 1917 г. Пад гэты час маёнтак меў каля 1 тысячы га зямлі. Драўляны сядзібны дом меў каля 20 пакояў, абстаўленых багатай мэбляй у стылі ампір, якую зрабілі мясцовыя майстры-сталяры. Пад час рэвалюцыйных падзей сяляне навакольных вёсак 29.11.1905 г. зрабілі спробу выгнаць уласніка маёнтка, разагналі рабочых, якія ў ім працавалі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі маёнтак быў нацыялізаваны. У вёсцы малочнатаварная ферма, сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, Дом культуры, бібліятэка, магазін, аддзяленне сувязі. Помнік на брацкай магіле 28 савецкіх воінаў і партызан, 288 землякам, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

КАПЛАНЫ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце, на шашы Сянно—Бешанковічы. На 1.1.2003 г. 23 двары, 37 жыхароў. Малочнатаварная ферма. Помнік-курган, выяўлены ў канцы XIX ст. Е. Р. Раманавым.

КАРАЛЕВІЧЫ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце, каля возера Сянно. На 1.1.2003 г., 36 двароў, 59 жыхароў. Малочнатаварная ферма.

КАРПАВІЧЫ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Карпавічы—Войлева. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 28 жыхароў.

КАРЧЭЎШЧЫНА — вёска ў Обальскім сельсавеце, на р. Абалянка, на аўтамабільнай дарозе Канстантова—Машканы. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 9 жыхароў.

КЕЛІСЫ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, 32 двары, 58 жыхароў. Упамінаецца як сяло ў складзе маёнтка Нямойта ў інвентары за 1665 г. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Дзіхманава, Лазараўшчына, Цароўшчына. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска адноўлена.

КІМЕЙКА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце, на р. Кімейчанка. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 38 жыхароў. На пачатку XX ст. у населеным пункце было тры фальваркі і адзін хутар. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Обаль, Шумкі.Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было 42 двары, 168 жыхароў. У верасні 1942 г. спалена карнікамі, загінулі 11 жыхароў. Да снежня 1944 г. аднавіў дзейнасць калгас імя Ф. Э. Дзяржынскага. Малочнатаварная ферма і ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. Помнікі: курганны могільнік. Радзіма вучоных — гісторыка А. І. Залескага і доктара фізіка-матэматычных навук Г. А. Залескай.

КІЧЫНА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на беразе возера Кічына. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 32 жыхары. У XVI ст. сяло Кічын у Віцебскім ваяводстве. У першай чвэрці XVI ст. у маёнтку, які належаў жонцы Чалінскага, была праваслаўная царква, з канца XVII ст. уніяцкая. У 1712 г. упамінаецца маёнтак Кічына кн. Сангушкі ў загадзе Віцебскага ваяводы Пацея аб размяшчэнні тут на пастой Расійскага Пяцігорскага палка, што дзейнічаў на Беларусі ў Паўночную вайну. На пачатку XX ст.

шляхецкая ўласнасць Лукашэвічаў, 1008 дзес. зямлі. Былі праваслаўная Успенская царква, 1-класная школа. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска адбудавана. Ёсць малочнатаварная ферма.

КІШУРОЎШЧЫНА — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

КЛІМАВІЧЫ — вёска ў Расненскім сельсавеце, на р. Палонка (прыток Немайцянкі). На 1.1.2003 г. 11 двароў, 20 жыхароў. Упамінаецца ў 1665 г. у інвентары маёнткаў Нямойта і Палонна. У складзе апошняга сяло Клімавічы. Населена казакамі Клімовічамі (верагодна ўзятымі ў палон пад час дзеянняў войска Багдана Хмяльніцкага на Беларусі). У XIX ст. ён перасяліў жыхароў у іншыя месцы і пабудаваў тут сваю сядзібу. У 1830-х гадах маёнтак быў распрададзены сялянам, якія зноў засялілі вёску. У 1880-х гг. у маёнтку была вінакурня. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска адбудавана. Тут 3 фермы па вырошчванню буйной рагатай жывёлы.

Радзіма беларускага гісторыка мастацтва, вучонага М. С. Кацара.

КЛЯПЧЭВА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 27 двароў, 62 жыхары. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Андрэева, Багаі, Васількова, Гараватка, Новы Двор. У 1939 г. быў калгас "Кляпчэва", працавала кузня.

КОЛПІНА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на р. Серакаротня. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 22 жыхары.

КОПЦЫ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 30 жыхароў. Помнік — курган, вядомы з 1873 г.

КРУГЛЯНЫ — вёска ў Обальскім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва. На 1.1.2003 г. 61 двор, 118 жыхароў. У 1935 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Жукаўшчына, Капнішча, Касавец, Хадзюшынкі. Машынны двор, 2 фермы, бібліятэка, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі.

КРУПЯЖЫНА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на дарозе Какоўчына — Ледневічы. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 8 жыхароў. З 20.8.24 г. у Какоўчынскім сельсавеце Багушэўскага раёна.

КРЫЛЬЦОВА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце, на возеры Крыльцова. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 15 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Крыльцова.

КУЗЬМІНО — вёска ў Расненскім сельсавеце, на прытоку р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар. У 1880-х гг. маёнтак Кузьмін, вінакурня, вадзяны млын. На пачатку XX ст. фальварак, належаў памешчыку Е. Гаеўскаму, 614 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Кузьміно. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска адбудавана.

КУЛІКІ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на дарозе Стэцава — Германава. На 1.1.2003 г. 3 двары, 4 жыхары. Малочнатаварная ферма.

КУЛЯШЫ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце,на р. Серакаротня. На 1.1.2003 г. 4 двары, 5 жыхароў. Пасля вызвалення ў 1944 г. аднавіў работу калгас імя С. М. Будзённага.

КУРЭЙШЫНА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 23 двары, 25 жыхароў. На пачатку XX ст. ў Какоўчынскай воласці, з 20.8.24 г. у Алексініцкім сельсавеце. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, магазін.

ЛАДЗІКАВА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

ЛАДЫНЕЦ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 47 жыхароў. На пачатку 1967 г. электрыфікавана. Малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ЛАЗОВА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на возеры Лазова. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 28 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Горнава.

ЛАЗОЎКА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 10 жыхароў.

ЛАПАТНІКІ — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 19 жыхароў.

ЛАТЫГАВА (ЛАТЫГАЛЬ) — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Сянно — Латыгава. На 1.1.2003 г. 24 двары, 48 жыхароў. На пачатку XX ст. тут быў урачэбны ўчастак. У 1939 г. сюды сселены жыхары хутара Разумаўка. 3 фермы па вырошчванню буйной рагатай жывёлы, магазін. Радзіма беларускага вучонага П. А. Кісялёва.

ЛАТЫГАЛЬ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 80 двароў, 206 жыхароў. З 29.10.1924 г. цэнтр сельсавецта. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Азярышча, Арцюшэўшчына, Барок, Біраціна, Барысаў, Іванечкаў, Казінец, Каменікі, Каменка-1, Каменка-2, Міклева, Масальскага, Новае Біраціна, Рачкоўскага, Рэутаў, Рэчышча, Старое Біраціна, Уруцкага, Піліпіхін, Хмельнік, Кароткія, Кароткі, Чарназём, Лісецкага.

У калгасе 1445 га сельгасугоддзяў, з іх 1123 га ворнай зямлі. Малочна-мясны напрамак

вытворчасці з развітым ільнаводствам, машынны двор, рамонтная майстэрня, 2 малочнатаварныя фермы, фермы па вырошчванні і адкорму буйной рагатай жывёлы, базавая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі. Помнік на брацкай магіле 21 савецкага воіна і партызана (абеліск, 1957). Радзіма Герояў Сацыялістычнай Працы М. А. Лісецкага і І. Р. Паўлоўскага, генерал-маёра Б. Л. Юркоўскага.

ЛЕДНЕВІЧЫ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 89 двароў, 181 жыхар. Вядома з XVI ст., у Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства ВКЛ. У 1634 г. згадваецца як маёнтак Ледневічы. У канцы XIX ст. — пачатку XX ст. адзіная ў Сенненскім павеце вёска з развітым саматужным промыслам. Тут усе займаліся ганчарнай вытворчасцю. Вырабы збывалі на кірмашах, развозілі па сёлах і вёсках павета. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Багушэўскага, з 20.1.1960 г. — Сенненскага раёнаў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Глінішча, Ледневічы, Падгусава. Ёсць базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, бібліятэка, магазін, аддзяленне сувязі, АТС, фермы па вырошчванні і адкорму буйной рагатай жывёлы. Помнік на брацкай магіле 26 воінаў і партызан (1954).

ЛЕСНІКІ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на шашы Сянно—Чашнікі. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 11 жыхароў. Радзіма генерал-маёра юстыцыі А. Х. Кузняцова.

ЛЕСНІКОВА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 52 двары, 125 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Алексініцкім сельсавеце. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Ферма, Трыполе, Паддуб'е. У верасні 1942 г. спалена карнікамі, загінулі 6 жыхароў. У 1944 г. адноўлены калгас. Спецыялізуецца на вытворчасці малака і мяса, развіта льнаводства. Малочнатаварная ферма, бібліятэка, сельскі клуб, магазін, аддзяленне сувязі, АТС.

ЛІПЛЯНСК — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на дарозе Какоўчына—Ледневіча. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 14 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Какоўчынскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Трухаўшчына, хутароў Селіханаўшчына, Юлькава, пасёлка Селіханаўшчына. Ёсць малочнатаварная ферма. Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы З. І. Баркоўскага.

ЛІПНА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце на заходнім беразе возера Ліпна. На 1.1.2003 г. 30 двароў, 46 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Падданы. Ёсць малочнатаварная ферма. За 2 км на поўнач ад вёскі, на месцы былой в. Марозаўка, у магіле ахвяр фашызму пахаваны 28 мясцовых жыхароў, якіх 22.8.1942 г. жывымі спалілі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1975 г. на магіле пастаўлена стэла. Помнік на ўшанаванне памяці 146 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанах.

ЛІТУСАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва. На 1.1.2003 г. 102 двары, 274 жыхары. На пачатку XX ст. вёска ў Какоўчынскай воласці. З 20.8.1924 г. у Ледневіцкім сельсавеце Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. На пачатак 1967 г. у Какоўчынскім сельсавеце. Ёсць базавая школа, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання, клуб, бібліятэка, магазін, малочнатаварная ферма, фермы па адкорму і вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ЛУГ — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў. 27.11.1905 г. сяляне вёскі прымалі ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях супраць памешчыка У. М. Каралько, уладальніка маёнтка Барок. З 20.8.1924 г. у Сідорніцкім сельсавеце Багушэўскага раёна, з 8.7.1931 г. — Сенненскага раёна. У 1939 г. у вёску сселены хутары Луг, Пясок. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ЛУГ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 25 жыхароў.

ЛУГІНАВІЧЫ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце, на шашы Сянно—Бешанковічы. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 19 жыхароў. Вядома з XVI ст., як сяло ў Полацкім ваяводстве, упамінаецца пры апісанні межаў Віцебскага ваяводства (1566) як сяло Лугіноўскае (Лугиновская). У 1678 г. была праваслаўная царква. На пачатку XVIII ст. вёска ў маёнтку Савіна, што належаў Івану Скапе. Упамінаецца ў сувязі з вызваленнем маёнтка ад пастою Пяцігорскага палка пад час дзеянняў расійскага войска ў Паўночную вайну на Беларусі. На пачатку XX ст. былі: пагост Лугінавічы, што належаў Праабражэнскай праваслаўнай царкве, засценак Лугінавічы, фальварак Лугінавіч, 1048 дзес. зямлі. Радзіма паэта і рэвалюцыянера Т. Г. Лады-Заблоцкага.

ЛУКТЫ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 40 жыхароў. Малочнатаарная ферма, магазін.

ЛУК'ЯНАВА — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 34 жыхары. На пачатку XX ст. маёнтак ва Ульянавіц-

кай воласці, уласнасць двараніна П. Багушэўскага.

ЛУЧАЗАРНАЕ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце (да 1964 г. в. Серакаротня), на воз. Серакаротня. На 1.1.2003 г. 42 двары, 105 жыхароў. Вядома з першай паловы XVI ст. як маёнтак Серакаротня ў Віцебскім ваяводстве, які належаў жонцы віцебскага гараднічага і харужага Р. Герасімовіча. На пачатку XX ст. было сяло Серакаротня, належала двараніну П. П. Суліме-Самуйле, 3700 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Сабалі. Ёсць ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання, сельскі клуб, бібліятэка, магазін. Помнік на брацкай магіле 16 савецкіх воінаў на могілках.

ЛЯСНАЯ ПАЛЯНА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 4 жыхары. На пачатку XX ст. фальварак Ліпна, належаў шляхціцу Ваньковічу. У 1933 г. вёска, цэнтр калгаса "Лясная Паляна". Была кузня.

МАГІЛЁЎКА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 6 жыхароў.

МАЖУЛЕВА — вёска ў Расненскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў. Ферма па дарошчванні буйной рагатай жывёлы.

МАЙСКАЯ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце (да 1964 г. — Лізуны), на дарозе Бяленева—Тур'ева. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

МАЛІШЫ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 28 жыхароў. Малочнатаварная ферма.

МАЛЫ АЗЯРЭЦК — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 23 двары, 35 жыхароў. У матэрыялах межавання маёнткаў Вядцы і Сянно ўпамінаецца ў 1634 г. як паселішча Азярэцк. У 1939 г. у вёску сселены жыхары пас. Юркаўшчына. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. Помнік: курганны могільнік. Мясцовыя назвы Балваны, Французскія магілы. Могільнік адносіцца да 10—13 ст. Радзіма генерал-маёра У. М. Каваленкі.

МАЛАЯ БЕЛІЦА — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 23 жыхары.

МАЛАЯ ПЯРЭСПА — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 15 жыхароў.

МАЛЫЯ УЛЬЯНАВІЧЫ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 6 жыхароў.

МАНГОЛІЯ — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 8 жыхароў.

МАРГОЙЦЫ — вёска ў Беліцкім сельсавеце, каля шашы Орша—Лепель. На 1.1.2003 г. 44 двары, 75 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары паселішчаў Новы Трудавік, Прудзіны, Старожка, Леснічоўка. Існаваў калгас "Маргойцы". Помнік: курганны могільнік (мясцовая назва Французскія магілы). Радзіма беларускага мастака М. А. Драненкі.

МАРОЗАЎКА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 25 двароў, 49 жыхароў. Упамінаецца ў 1665 г. у інвентары маёнтка Нямойта як сяло. У 1939 г. у вёску сселены жыхары Беразухі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана, ёсць магазін, 2 фермы па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

МАРЦІНАЎКА — вёска ў Обальскім сельсавеце, на р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 12 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Узрэчча. Радзіма заслужанага настаўніка Беларусі Ул. І. Пуцеева.

МАР'ЯНОВА — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 5 жыхароў.

МАСОРЫ — вёска ў Машканскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 46 двароў, 105 жыхароў. Малочнатаварная ферма, магазін. Радзіма Героя Савецкага Саюза І. І. Камінскага.

МАСЯЙКІ — вёска ў Обальскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Сянно—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 23 двары, 39 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары Добрынкі і Узрэчча-1. Малочнатаварная ферма.

МАЦКАВА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 6 жыхароў.

МАШКАНЫ — вёска, цэнтр Машканскага сельсавета і саўгаса імя П. М. Машэрава. Знаходзіцца на паўночным усходзе ад Сянна, на левым беразе р. Абалянка, на шашы Сянно—Віцебск. На 1.1.2003 г. 292 двары, 837 жыхароў. У 1880-х гадах XIX ст. вёска, цэнтр воласці Сеннснскага павета, бальніца, у 1869 г. адкрылася школа. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Абісінія, Абрамаўшчына, Гаручкі, Забалоцце, Мінуўшчына, Сангрэтаўшчына, Цагельня. У вайну загінулі 320 жыхароў сельсавета, 293 не вярнуліся з фронту.

Саўгас імя П. М. Машэрава спецыялізуецца на вытворчасці мяса-малочнай прадукцыі. Мае 4324 га сельгасугоддзяў, з іх 3197 га ворнай зямлі. У вёсцы машынны двор з мехмайстэрняй, сярэдняя школа, дзіцячы садок, участковая бальніца, музычная школа, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслу-

гоўвання, магазіны, аддзяленне сувязі, АТС. Помнікі на брацкай магіле 115 савецкіх воінаў і партызан, Герою Савецкага Саюза І. І. Камінскаму, які вучыўся ў мясцовай школе, мемарыяльная дошка Герою Савецкага Саюза А. К. Гараўцу, які тут нарадзіўся і вучыўся ў Машканскай школе. У Машканах нарадзіўся беларускі паэт, кінасцэнарыст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі А. С. Вялюгін.

МАШКІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 6 жыхароў. У 1665 г. упамінаецца як сяло Мошкі ў складзе маёнтка Нямойта. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

МАШЧОНЫ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на р. Бярозка, каля шашы Сянно—Віцебск. На 1.1.2003 г. 39 двароў, 85 жыхароў. Упамінаецца ў 1591 г. у акце падзелу маёнткаў І. І. Сапегі паміж яго сынамі. Вёска была ў складзе маёнтка Палонна ў Аршанскім павеце. У 1600—1633 гг. уласнасць Аляксандра Сапегі, старосты Аршанскага, затым яго дачкі Ганны і яе мужа Нарушэвіча. На пачатку XX ст. пасад Машчоны, уласнасць сапраўднага стацкага саветніка Сандрыгайлы. З 20.8.1924 г. цэнтр Машчонскага сельсавета. Помнікі на брацкай магіле 15 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Недалёка ад вёскі знаходзіцца археалагічны помнік — гарадзішча ранняга жалезнага веку. Сярэдняя школа.

МЕЛЕХАВА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на беразе возера Абразы. На 1.1.2003 г. 22 двары, 47 жыхароў. Упамінаецца ў 1556 г. у апісанні межаў Лукомскага павета, што ўваходзіў у склад Полацкага ваяводства. У 1890 г. пры касьбе сяляне знайшлі на лузе звон з надпісам "Сей звонь роблемь Уворьши року 1648". Звон быў перададзены Раманавым у Віцебскі царкоўны музей. На пачатку XX ст. фальварак у Латыгаўскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, належаў памешчыку Ю. Скіргайлу-Яцэвічу, 198 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Галькава, Гарнова-3, Горы, Пні. Малочнатаварная ферма, магазін.

МІХАЛПОЛЛЕ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 17 жыхароў. У 1880-я г. сядзіба ва Ульянавіцкай воласці, былі вінакурны і піваварацы заводы, вадзяны млын.

МІХНАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 22 двары, 37 жыхароў. Упамінаецца ў 1634 г. у даравальнай грамаце на маёнтак Кеміно як сяло. На пачатку XX ст. непадалёку быў фальварак Міхнава, які належаў памешчыку Гаеўскаму, меў 94 дзес. зямлі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

МІЦЮКОВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, у калгасе "Ясная зара" каля шашы Сянно—Някрашава. На 1.1.2003 г. 24 двары, 30 жыхароў. Малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

МІШУКОВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 13 жыхароў.

МЯНЮЦЕВА — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 49 двароў, 90 жыхароў. Ёсць малочнатаварная ферма, магазін.

МЯШКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

МЯШЧЭНЦЫ — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 7 жыхароў. Былое паселішча цыганоў. Цыганскія сем'і займаліся гандлем, шавецкім і кавальскім рамяством. З вясны пачыналі вандраваць. На пачатак 1967 г. у племзаводзе "Полымя".

НАВАСЁЛКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 21 двор, 36 жыхароў. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары вёсак Туркаўка, Яромы. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана. Працуюць магазін, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі. Помнік на брацкай магіле 117 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Недалёка ад вёскі 3 курганныя могільнікі.

НАВАСЁЛКІ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на дарозе Берашова—Ходцы. На 1.1.2003 г. 47 двароў, 72 жыхары. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Ясная Паляна. Малочнатаварная ферма, 2 фермы па вырошчванню і адкорму буйной рагатай жывёлы.

НАВЯЗКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 26 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Машканскай воласці, з 20.8.1924 г. у Навасельскім сельсавеце Багушэўскага раёна. У 1939 г. з ёй злілася в. Кедзіна (Астапенскі сельсавет), сюды сселены жыхары паселішчаў Каралёўшчына, Косы, Кузьмы, Радчаны.

НОВАЕ СЯЛО — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, на шашы Сянно—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 22 двары, 49 жыхароў. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Яромы. Працуе магазін. Помнік на брацкай магіле 40 савецкіх воінаў і партызан, што загінулі ў чэрвені 1944 г.

НОВАЕ СЯЛО — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 13 жыхароў. Упамінаецца ў інвентары маёнтка Вядцы, складзеным аршанскім гарадскім суддзёю Кор-

сакам у 1790 г. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хут. Карбоўшчына. Ёсць аддзяленне сувязі. Археалагічны помнік — гарадзішча.

НОВАЯ БЕЛІЦА — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 46 жыхароў. Ёсць малочнатаварная ферма. Радзіма дзяржаўнага дзеяча, дыпламата Г. М. Лавіцкага.

НЯКРАШАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 38 двароў, 88 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары пасёлка Некрашэва. Ёсць малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні і адкорму буйной рагатай жывёлы, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб. Помнік на брацкай магіле 8 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

НЯМОЙТА — вёска, цэнтр Нямойтаўскага сельсавета і сельгаскааператыва. Знаходзіцца на паўднёвым усходзе ад Сянна, на р. Немайцянка. На 1.1.2003 г. 119 двароў, 282 жыхары. У гістарычных крыніцах упамінаецца ў XVI ст. у складзе Аршанскага павета Віцебскага ваяводства ВКЛ. У другой палове XVII ст. згадваецца сяло Нямойта і царква ў ім. У закладной 1642 г. на фальварак Гарбунова ўпамінаецца маёнтак Нямойта (з яго быў вылучаны ўказаны фальварак). Інвентар за 1665 г. сведчыць, што маёнтак уключаў у сябе яшчэ і маёнтак Палонна. У XIX ст. сяло належала Сангушкам, якія ў 1824 г. пабудавалі тут царкву. У 1880-я гг. сяло Пустынскай воласці, праваслаўная царква, вінакурны завод, вадзяны млын. На пачатку XX ст. маёнтак належаў шляхцянцы Жукоўскай, налічваў 5766 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. вёска, цэнтр сельсавета. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 300 жыхароў, 192 не вярнуліся з фронту.

Сельгаскааператыў спецыялізуецца на вытворчасці малака і мяса, вырошчванні льну. Мае сад. Усяго мае 2248 га сельгасугоддзяў, 1729 га ворыва. Ёсць малочнатаварная ферма, жывёлагадоўчы комплекс, машынны двор з майстэрняй па рамонту тэхнікі, сярэдняя школа, яслі-сад, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазін, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, паштовае аддзяленне, АТС. Помнік на брацкай магіле 26 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

НЯРЭЙША — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 28 двароў, 43 жыхары. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хут. Нярэйша. У красавіку 1943 г. фашысты спалілі 36 двароў, загубілі 4 жыхары. Да снежня 1944 г. аднавіўся калгас "Чырвоная Армія". Цяпер у саўгасе "Полымя". Ёсць магазін.

НЯРЭЙША — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на р. Нерайшанка. На 1.1.2003 г. 21 двор, 26 жыхароў. Паселішча вядома з XVII ст. Упамінаецца ў 1658 г. у сувязі з падзеямі вайны Расіі з Рэччу Паспалітай. На пачатку XVIII ст. была Пакроўская праваслаўная царква. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Гаручкі, Заазер'е. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны былі 41 двор, 218 жыхароў. Фашысты знішчылі 36 двароў, 4 жыхароў. Пасля вайны адбудавана, працуюць АТС, аддзяленне сувязі, магазін.

ОБАЛЬ — вёска ў Машканскім сельсавеце, на р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 36 жыхароў. На пачатку XX ст. пагост Обаль, належаў праваслаўнай Успенскай царкве, 59 дзес. зямлі. Побач былі фальваркі Обаль-1 (618 дзес.), Обаль-2 (295 дзес.). Фальваркі належалі памешчыку Бураму. Працавалі вадзяны млын з крупадзёркай, сукнавальня. Пры царкве была школа. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Гараўцы, Чырвоны, Шафраншчына.

ОБАЛЬ — вёска, цэнтр Обальскага сельсавета, на р. Абалянка, на шашы Сянно—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 210 двароў, 413 жыхароў. На пачатку XX ст. маёнтак С. М. Дамбраво, 160 дзес. зямлі, паблізу ад яго былі фальварак (60 дзес.) і засценак (19 дзес.). У ходзе рэвалюцыйных падзей сяляне навакольных вёсак 4.12.1905 г. напалі на маёнтак з мэтай выгнаць памешчыка, а маёмасць забраць у сваё карыстанне. Працаваў вінакурны завод, які быў пабудаваны ў 1905 г. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Баган. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 300 жыхароў сельсавета. Працуюць завод кармавых дабавак, пачатковая школа-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавых паслуг, аддзяленне сувязі.

Помнік на брацкай магіле савецкага воіна і партызана.

ОЎСІШЧА — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 38 двароў, 72 жыхары. Фашысцкія акупанты спалілі 37 двароў, загубілі 11 жыхароў. Да верасня 1944 г. аднавіў работу калгас. На пачатку 1967 г. вёска ў саўгасе імя А. Ф. Данукалава. Ёсць малочнатаварная ферма, 2 фермы па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, магазін. Радзіма Героя Савецкага Саюза А. Дз. Мацюшава.

ПАГРАБЁНКА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на шашы Орша—Віцебск. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 12 жыхароў. На пачатку

XX ст. маёнтак Старая Пагрэбёнка, у Серакаратнянскай воласці, належала двараніну Кухарскаму, мела 1982 дзес. зямлі; Новая Пагрэбёнка належала двараніну Ф. Тураеву. Была яшчэ станцыя Пагрэбёнка, належала міністэрству шляхоў зносін, 2 дзес. зямлі. Помнікі архітэктуры: паштовая станцыя, пабудавана ў канцы 1840-х гг.

ПАДВОРЫЦА — вёска ў Багданаўскім сельсавеце, каля шашы Сянно — Бешанковічы. На 1.1.2003 г. 87 двароў, 189 жыхароў. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Віцебскай акругі, з 12.10.1925 г. у Машканскім сельсавеце, 20.8.1933 г. зноў цэнтр сельсавета Сенненскага раёна. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Сябрынка. Працуюць малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, дзве фермы па адкорму буйной рагатай жывёлы, базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, клуб, магазін, аддзяленне сувязі, АТС.

ПАДГРАДДЗЕ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 10 жыхароў.

ПАЛЬЧЫКІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце на дарозе Пальчыкі — Студзёнка. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 12 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены паселішчы Латышоўка, Лісічына, Соіна.

ПАПІНА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 15 жыхароў. У канцы XVII — пачатку XVIII ст. былі сёлы Папіна Слабада і Папіна Выселак. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Старое Круцькава.

ПАПІНКА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 9 двароў, 11 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Какоўчынскай воласці, з 20.8.1924 г. у Сідорніцкім сельсавеце Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. З 1954 г. ў Алексініцкім сельсавеце.

ПАПОЎКА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва, на аўтадарозе Сянно — Дварэц. На 1.1.2003 г. 54 двары, 147 жыхароў. Мае 1359 га сельгасугоддзяў. Малочна-мясны напрамак вытворчасці з развітым ільнаводствам. Машынны двор з майстэрняй, малочнатаварная ферма, ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы, ёсць фельчарска-акушэрскі пункт. Помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ПАРНЕВА — вёска ў Машканскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 23 жыхары. З 20.8.1924 г. ў Застадольскім сельсавеце Сенненскага раёна. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Буева, Абрэзкава, Калюціна. Ёсць малочнатаварная ферма.

ПАРТЫЗАНЫ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 13 жыхароў. Да 1964 г. мела назву Торбінка. Упамінаецца ў сувязі з падзеямі Айчыннай вайны 1812 г. на Беларусі. Ёсць ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ПАРЭЧЧА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 31 жыхар. На пачатку XX ст. вёска ва Ульянавіцкай воласці. Перад Вялікай Айчыннай вайной існаваў калгас імя. К. Я. Варашылава.

ПАЦКАВА — вёска ў Расненскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 22 жыхары. У 1939 г. сюды сселены жыхары хут. Цярнюкі.

ПАРШНІ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на шашы Сянно — Віцебск. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 39 жыхароў. Упамінаецца ў інвентары маёнтка Нямойта як сяло. На пачатку XX ст. фальварак Паршні належаў нашчадкам сапраўднага стацкага саветніка І. Сандрыгайлы. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Загацце. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана, працуе магазін.

ПАСАД — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 91 двор, 154 жыхары. Помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну на франтах і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ПАСТУШКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на воз. Серакаротня. На 1.1.2003 г. 45 двароў, 110 жыхароў. Працуе свінаферма.

ПАЎЛАВІЧЫ — вёска у Ходцаўскім сельсавеце, на возеры Саро. На 1.1.2003 г. 2 двары, 1 жыхар. На пачатку XX ст. засценак Паўлавічы належаў мешчаніну К. Свістуну, 50 дзес. зямлі; фальварак мешчаніна Есьмана, 25 дзес. зямлі; 2 аднайменныя фальваркі, што належалі шляхціцам Ганіпроўскім і мелі 114 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Галашоўка, Курмялёва, Логвінава, Торбіна, Хабаціна, Ляды, Марозаўка. Радзіма В. З. Жыгунова (Жыгуна) (1900—1976 гг.), кавалера ордэна Чырвонага Сцяга.

ПАШКАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 22 двары, 52 жыхары.

ПЕРАКОПАВА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на возеры Сосна. На 1.1.2003 г. 25 двароў, 48 жыхароў.

ПЕРШАМАЙСКАЯ — вёска ў Расненскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары. Узнікла ў 30-я гады як сядзіба машынна-трактарнай станцыі "Першамайская".

ПЕСАЧАНКА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 34 двары, 69 жыха-

роў. На пачатку XX ст. побач быў аднайменны маёнтак, належаў двараніну Е. Янчанку. Ёсць малочнатаварная ферма, пачатковая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі.

ПІЛЬКАВІЧЫ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на р. Адроўка. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 10 жыхароў. На пачатку XX ст. былі вёскі Пількавічы Вялікія, Пількавічы Малыя. Працавала народнае вучылішча. Да 1939 г. утварылася адна вёска Пількавічы. Сюды былі сселены жыхары вёсак Браніслававa і Паўлышкава. У кастрычніку 1943 г. карнікі спалілі 10 двароў, загубілі 2 жыхароў. Пасля вызвалення адноўлены калгас імя С. М. Кірава, працавала пачатковая школа. Ёсць малочнатаварная ферма.

ПЛАТОНЫ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 3 двары, 4 жыхары. У 1939 г. у вёску сселены жыхары Задарожжа.

ПЛЯЦЫ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 12 жыхароў.

ПОЖАНЬКІ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 58 двароў, 116 жыхароў. Упамінаецца ў XVI ст. як сяло маёнтка Сянно. У 1545 г. каралеўскі суд у Вільні разбіраў скаргу ўладальніка маёнтка Сянно кн. Дз. Відніцкага — Грыбоўскага з нагоды "наездаў" і рабункаў служкаў Аболецкага касцёла на землі маёнтка. У 1566 г. згадваецца пры апісанні межаў Лукомскага павета Полацкага ваяводства. 20.8.1924 г. у Гарывецкім сельсавеце Сенненскага раёна, у 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Абалонне, Пожанькі, Пожанькі (Гарывецкі сельсавет). У жніўні 1942 г. у час карнай экспедыцыі фашыстамі знішчана 9 двароў і 23 жыхары. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска адбудавана, электрыфікавана і радыёфікавана. Спецыялізуецца на вытворчасці мяса і малака, развіта льнаводства. Мае 1680 га сельгасугоддзяў, 1217 га ворыва. Ёсць машынны двор з рамонтнай майстэрняй, малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні жывёлы, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, бібліятэка, клуб. Помнікі на ўшанаванне памяці 143 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ПОЖАНЬКІ — пасёлак у Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 30 жыхароў. На пачатку XX ст. маёнтак ва Ульянавіцкай воласці, уласнасць двараніна П. Багушэўскага.

ПОЛЫМЯ — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 234 двары, 555 жыхароў. У XVI — пачатку XX ст. маёнтак Беліца, які вядомы з 1551 г. як спадчына жонкі Яна Юр'евіча Глябовіча Ганны. Пры падзеле спадчыны Беліца адышла да дачкі Ганны Соф'і Глябовіч, жонкі Юрыя Мікалаевіча Зяновіча. У складзе маёнтка было каля 80 сялянскіх службаў, вялікая воласць і мястэчка. На пачатку маёнтак уваходзіў у склад Аболецкага, затым, у 1566 г. — Аршанскага паветаў Віцебскага ваяводства. Пасля 1583 г. маёнткам валодаў Ян Юр'евіч Зяновіч, потым Мікалай Багуслаў, з канца 30-х гадоў XVII ст. Павел Ян Сапега. Ён заснаваў тут дамініканскі кляштар. У 1718 г. М. І. Сапега прадаў Беліцу за 6 тысяч талераў шляхціцу І. Навацкаму. У 1768 г. ад Міхаіла Навацкага перайшла да Анзельма Курча. З 1772 г. у Сенненскім павеце Магілёўскай губерні. Апошнімі ўладальнікамі Беліцы ў XIX — пачатку XX ст. былі памешчыкі Свяцкія. У другой палове XX ст. у Беліцы створаны сядзібны комплекс, які ўключаў мураваны сядзібны дом у стылі позняга класіцызму, пейзажны парк з сажалкай і гаспадарчыя пабудовы. Маёнтак стаў адметным цэнтрам мясцовай прамысловасці, працавалі бровар (паравы рухавік у 80 к.с.), 2 вадзяныя, 1 ветраны млыны. На пачатку XX ст. у маёнтку вялася інтэнсіўная гаспадарка, было 6088 дзес. зямлі, 8—9-польны севазварот, займаліся племянной жывёлагадоўляй.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі маёнтак нацыяналізаваны. На базе маёнтка быў створаны саўгас "Беліца" (пазней племсаўгас "Полымя"). З 20.8.1924 г. у Беліцкім сельсавеце Сенненскага раёна Віцебскай акругі, у 1939—1954 гг., цэнтр Беліцкага сельсавета. Працавала сельскагаспадарчая школа, дзейнічалі вінзавод, цагельны завод, маслазавод, паравы млын. У 1939 г. сюды сселены жыхары паселішчаў Філатава, Юркевічы. У Вялікую Айчынную вайну ў былым панскім доме размяшчаўся варожы гарнізон, які ў 1943 г. быў знішчаны партызанамі. Наделёка ад вёскі дзейнічаў партызанскі аэрадром. Пасля вайны вёска адбудавана.

Сельгаспрадпрыемства "Полымя" спецыялізуецца на вытворчасці малочна-мясной прадукцыі і насенняводстве збожжавых культур. Гаспадарка мае 4962 га сельгасугоддзяў; з іх 3825 га ворыва. Ёсць машынны двор з майстэрняй, 2 малочнатаварныя фермы, 2 фермы па вырошчванні і 3 фермы па адкорму буйной рагатай жывёлы, спіртзавод, сярэдняя школа, дзіцячы сад, бібліятэка, аптэка, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання, сталоўка, аддзяленне сувязі, АТС.

ПОЎЗІКІ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

ПРЫВЕТАК — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на дарозе Грыбіна—Партызаны. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 10 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары паселішчаў Лейчанок і Шыпулёўшчына. Напярэдадні вайны тут было 70 двароў, 263 жыхары. У чэрвені 1944 г. фашысты знішчылі 79 двароў, загубілі 53 жыхароў. Ёсць ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. Помнік на магіле ахвяр фашызму на ўсходняй ускраіне вёскі.

ПРЫХАБЫ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 24 жыхары. Вядома з XVI ст. як сяло ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства. Упамінаецца ў запісах аб землях, раздадзеных каралём Жыгімонтам. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

ПУРПЛЕВА — вёска ў Расненскім сельсавеце, на р. Абалянка, цэнтр сельгаскааператыва, на аўтамабільнай дарозе Сянно—Някрашава. На 1.1.2003 г. 52 двары, 142 жыхары. На пачатку XX ст. фальварак, належаў памешчыку О. Машчынскаму, 320 дзес. зямлі. У 1933 г. існаваў калгас імя У. І. Леніна. Цяпер калгас мае 1823 га сельгасугоддзяў, 1304 га ворыва. Ёсць сад. Малочна-мясны напрамак вытворчасці з развітым ільнаводствам. У вёсцы машынны двор, малочнатаварная ферма, ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы, базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб, бібліятэка, магазін, аддзяленне сувязі, АТС. Помнік на брацкай магіле 35 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943—1944 гг.

ПУСТЫНКІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва. На 1.1.2003 г. 56 двароў, 131 жыхар. У інвентары 1665 г. згадваецца мястэчка Пустынкі ў складзе маёнтка Нямойта. Тут адбываліся значныя па тым часе кірмашы, на якія прывозілі свае тавары купцы з Віцебска, Магілёва, Шклова і іншых гарадоў і мястэчак. У 1673 г. упамінаецца праваслаўная царква св. Параскевы. На пачатку XVIII ст. згадваецца маёнтак Пустынкі ў сувязі з падзеямі, што адбываліся на Беларусі ў Паўночную вайну (1700—1721 гг.). Паводле загада віцебскага ваяводы К. А. Пацея маёнтак вызваляўся на 1712 г. ад пастою расійскага Пяцігорскага палка. Маёнтак належаў князю Сангушку. У 1780 г. ён пабудаваў тут Крыжаўзвіжанскую царкву. У 1880-я гг. сяло, цэнтр воласці, з 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета. 6.9.1963 г. цэнтр сельсавета перанесены ў в. Студзёнка 2.8.1966 г. перайменаваны ў Студзёнкаўскі сельсавет. У 1939 г. у вёску перасе-лены жыхары населеных пунктаў Ананьева, Аксёнаўшчына, Копцы, Носікава, Сахны, Ямачкі.

Сельгаскааператыў мае 5132 га сельгасугоддзяў, у тым ліку 1279 га ворыва. Спецыялізуецца на вытворчасці мяса, малака і вырошчванні льну. Ёсць малочнатаварная ферма, пачатковая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб, бібліятэка. Помнік на брацкай магіле 51 воіна і партызана, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў абарончых баях 1941 г., а таксама пры вызваленні раёна ў чэрвені 1944 г. Сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза М. А. Аніскін.

ПУШКАРЫ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 8 жыхароў.

РАБЦАВА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 318 жыхароў, у тым ліку 233 дзіцяці — выхаванцы дзіцячага дома-інтэрната. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хут. Рабцова.

РАБЦЫ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце на дарозе Войлева—Рабцы. На 1.1.2003 г. 9 двароў, 15 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары пас. ільнозавода. Ёсць малочнатаварная ферма.

РАЙ — вёска ў Расненскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Алексінічы—Пурплева. На 1.1.2003 г. 24 двары, 49 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Кузьмінка, Ляўкова. У лістападзе 1943 г. карнікі спалілі вёску. У 1944 г. аднавіў работу калгас "Калектыўная праца". Ёсць малочнатаварная ферма, 2 фермы па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

РАКАЎ ЗАСЦЕНАК — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце, на дарозе Сянно—Нямойта. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 28 жыхароў. На пачатку XX ст. хутар Засценак, належаў князю Е. В. Шылейкісу, 58 дзес. зямлі. У 1939 г. сюды сселены жыхары пасёлішчаў Чырвоны Араты, Ракі. У 1944 г. аднавіў работу калгас "Чырвоны Араты".

РАМАНАЎКА — вёска ў Обальскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 40 жыхароў. У 1939 г. у яе сселены жыхары населеных пунктаў Дубрава, Заручэўе, Палядкі, Ціханаўка. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана, ёсць магазін.

РАМШЫНА — вёска ў Машканскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 21 двор, 51 жыхар. У XIX ст. маёнтак Насекін (Рамшына), быў вінакурны завод. На пачатку XX ст. у маёнтку 1295 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары населеных пунктаў Балоння, Вялікае Рамшына, Дубрава, Зарэшчына, Студзянец. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

РАСНА — вёска, цэнтр Расненскага сельсавета, знаходзіцца на паўднёвым усходзе ад Сянна. На 1.1.2003 г. 75 двароў, 166 жыхароў.

У 80-х гадах XIX ст. цэнтр воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. Сафійская праваслаўная царква, сельскі ўрачэбны ўчастак, народнае вучылішча (1862 г.). Паблізу быў аднайменны фальварак, уласнасць шляхціца Плавінскага, які меў 530 дзес. зямлі, прадпрыемства па вытворчасці цэглы. Фальварак адносіўся да Аболецкай рымска-каталіцкай парафіі. У 1939 г. у Расна пераселены жыхары населеных пунктаў Загаранькі, Лісіныя Норы. У Вялікую Айчынную вайну толькі з тэрыторыі тагачаснага сельсавета акупанты вывезлі ў Германію 165 жыхароў, загінула 320 землякоў, з іх 286 не вярнуліся з фронту. Мае 1626 га сельгасугоддзяў, 1246 га ворыва. У вёсцы малочнатаварная ферма, 2 фермы па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, машынны двор. Працуюць базавая школа, клуб, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, аддзяленне сувязі, АТС.

Помнікі: абеліск на брацкай магіле 137 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943—1944 гг. (1957 г.), курганны могільнік.

РАССВЕТ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, на шашы Сянно—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 35 жыхароў. Да 1964 г. мела назву Чартоўшчына. Упамінаецца ў 1665 г. у інвентары маёнтка Нямойта як сяло Чартова. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

РАСХОДНА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 5 жыхароў. Паводле інвентара маёнтка Палонна, з 1665 г. сяло ў складзе гэтага маёнтка, у Віцебскім ваяводстве. На пачатку XX ст. вёска ва Ульянавіцкай воласці. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана.

РОДНАЕ СЯЛО — вёска ў Багушэўскім сельсавеце (да 1964 г. в. Дзяругі). На 1.1.2003 г. 17 двароў, 34 жыхары.

РОЗМЫСЛАВА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце на дарозе Сянно—Какоўчына. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 34 жыхары. На пачатку XX ст. вёска у Расненскай воласці. У 1939 г. у вёску сселены жыхары паселішчаў Петраград, Размыслова, Стукалава. Ёсць малочнатаварная ферма.

РОШЧЫНА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце (да 1964 г. в. Звягі), на дарозе Рошчына—Ледневічы. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 37 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Звягі і пасёлка Руколева.

РУБЕЖНІЦА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на аўтадарозе Паўловічы—Сянно.

РУДНІЦА — вёска ва Ульянаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 25 жыхароў. На пачатку верасня 1899 г. сяляне выступалі супраць памешчыка А. Багушэўскага, уладальніка маёнтка Ванькава. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Архіпаў, Вусава, Ільюшоў, Наталлін, Рудніца, Стафаніхін, Фёдараў, Ціханаў. Ёсць 2 фермы па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, магазін. Радзіма Героя Савецкага Саюза І. Г. Тамашэўскага і Героя Сацыялістычнай Працы А. Дз. Сарокінай.

РУЛЁЎШЧЫНА — вёска ў Беліцкім сельсавеце, цэнтр саўгаса імя Данукалава, на аўтамабільнай дарозе Сянно—Полымя. На 1.1.2003 г. 103 двары, 282 жыхары. На пачатку XX ст. засценак ва Ульянавіцкай воласці, належаў двараніну А. Бялаброжэнцкаму, да 1914 г. дзейнічаў цагельны завод. З 20.8.1924 г. у Латыгальскім сельсавеце. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Дубкі, Дубняк, Пашчынкі, Пустаселле. З пачатку 1964 г. цэнтр саўгаса імя Данукалава. Саўгас мае 2598 га сельгасугоддзяў, з іх 1809 га ворыва. Працуюць пачатковая школа-сад, магазін, бібліятэка, сельскі клуб, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання: малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. Помнік на ўшанаванне памяці 58 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

РУДКОЎШЧЫНА — вёска ў Обальскім сельсавеце на дарозе Пустынкі—Раманаўка. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 17 жыхароў. У 1939 г. у яе сселены жыхары хутароў Казачы Ручай, Пятрова, Мікалаева, Навіны.

РЫБНАЕ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце (да 1964 г. в. Худалеі) на воз. Серакаротня, на аўтамабільнай дарозе Багушэўск—Заветнае. На 1.1.2003 г. 62 двары, 167 жыхароў. Працуюць дзіцячы санаторый, Дом культуры, бібліятэка.

РЫНДЗЕВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 13 жыхароў. У 1939 г. у яе сселены жыхары населеных пунктаў Антаколле, Ніжняе Рындзева, Падсаддзе.

РЭЧКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на р. Зелянуха. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 27 жыхароў.

РЭЧКІ — вёска ў Беліцкім сельсавеце.

САВЕЦКАЯ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце (да 1964 г. в. Юдзенічы). На 1.1.2003 г. 5 двароў, 9 жыхароў. На пачатку XX ст. фальварак Юдзенічы ў Какоўчынскай воласці, належаў шляхціцу Ваньковічу, 1014 дзес. зямлі. Радзіма журналіста-публіцыста А. І. Стука.

САВІНІЧЫ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 28 двароў, 64 жыхары. У сакавіку 1943 г. акупанты знішчылі 37 двароў, загубілі 3 жыхароў. Ёсць малочнатаварная ферма, магазін. Помнік: на могілках курган, вядомы з канца XIX ст.

САДОВАЯ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 10 жыхароў.

САМСОНЫ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 31 жыхар. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Дубініна.

САПЕП — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Белая Ліпа—Падворыцца. На 1.1.2003 г. 25 двароў, 46 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Арэхвіна. Ёсць малочнатаварная ферма.

СВАБОДНАЯ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 41 двор, 1258 жыхароў (з улікам школы-інтэрната).

СВЕЧЫ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 22 двары, 29 жыхароў. Ёсць малочнатаварная ферма.

СЕРКУЦІ — вёска ў Расненскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 34 двары, 50 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары Мачулішчаў, Тупічына. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы было 80 двароў, 375 жыхароў. У кастрычніку 1943 г. карнікі спалілі 75 двароў. У 1944 г. вёска адрадзілася, адноўлены калгас імя Ф. Энгельса. Ёсць малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

СІМАНАЎКА — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце (да 1964 г. в. Канстанцінава), на шашы Сянно—Чашнікі. На 1.1.2003 г. 9 двароў, 13 жыхароў.

СІНЯГОРСКАЯ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце (да 1964 г. в. Трубаносы), цэнтр сельгаскааператыва, на дарозе Капцы—Новае Сяло. На 1.1.2003 г. 107 двароў, 294 жыхары. На пачатку XX ст. фальварак В. А. Расткоўскага, 256 дзес. зямлі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Зайкі, Заполле, Прудок, Чырвоны Бычок. У 1995 г. у калгасе было 2219 га сельгасугоддзяў, 1468 га ворыва. Спецыялізуецца на вытворчасці малака і мяса. Машынны двор з майстэрняй, малочнатаварная ферма, комплекс па вырошчванні і ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы; базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання, клуб, бібліятэка, магазін.

СКОГ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, цэнтр сельгаспрадпрыемства імя Гараўца. На 1.1.2003 г. 112 двароў, 282 жыхары. На пачатку XX ст. вёска ў Серакаратнянскай воласці, з 20.8.1924 г. у Багушэўскім сельсавеце Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. Мяса-малочны напрамак вытворчасці, 3911 га сельгасугоддзяў, 3051 — ворыва, ёсць сад, малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, свінаферма, магазін. Помнік Герою Савецкага Саюза А. К. Гараўцу і землякам, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

СЛАБАДА — вёска ў Обальскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 22 жыхары. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Гаравыя. Ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы. За 3 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Гірына, курганны могільнік.

СЛАБОДКА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Сянно—Віцебск. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

СМАЛОЎКА — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 6 жыхароў.

СОІНА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце, на возеры Сосна. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 18 жыхароў. Ёсць малочнатаварная ферма.

СТАНЬКІ — вёска ў Обальскім савеце, на аўтамабільнай дарозе Канстантова—Машканы. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 39 жыхароў. Ёсць ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, магазін.

СТАНЮКІ — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 33 жыхары. У 1939 г. сюды сселены жыхары паселішчаў Станькава, Старынка. У жніўні 1941 г. карнікі спалілі 20 двароў, загінулі 22 жыхары. У снежні 1944 г. аднавіў работу калгас імя С. М. Будзённага. З пачатку 1967 г. вёска ў саўгасе імя Данукалава. Ёсць ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы.

СТАРАЯ БЕЛІЦА — вёска, цэнтр Беліцкага сельсавета, знаходзіцца на поўдзень ад Сянна. На 1.1.2003 г. 109 двароў, 230 жыхароў. Упамінаецца ў 1566 г., у апісанні межаў Віцебскага ваяводства, як сяло ў Аршанскім павеце. Пад час падзей вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. упамінаецца воласць Беліцкая, дзе атрад маскоўскіх стральцоў Васіля Пушачнікава вёў баі з атрадамі шляхты на чале з Янкам Юндзілам (1658). У 1669 г. пабудаваны дамініканскі касцёл і пры ім кляштар. У XVII ст. існавала і праваслаўная царква, якая пад канец XVII ст. ператворана ва ўніяцкую. У 1832 г. кляштар пры Беліцкім дамініканскім касцёле зачынены. У 1871 г. створана народнае вучылішча. З 15.2.1923 г. у Бачэйкаўскім павеце, з 20.6.1924 г. у Віцебскім павеце, з 20.8.1924 г. у Беліцкім сельсавеце Сенненскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 450 жыхароў сельсавета, 350 з іх не вярнуліся з фронту. Ёсць сярэдняя школа, участковая

бальніца, магазін, бібліятэка, клуб. Помнік на брацкай магіле 39 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Побач з вёскай выяўлена гарадзішча. У цэнтры вёскі сядзібны комплекс 2-й паловы XIX ст., месца працы Янкі Купалы (1903—1904).

СТРЫГІ — вёска ў Обальскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Канстантова—Машканы. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 27 жыхароў. Сяляне ў лістападзе 1905 г. удзельнічалі ў хваляваннях у суседнім маёнтку Шыркаўка памешчыка Валчанскага. Ёсць ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

СТУДЗЁНКА — вёска, цэнтр Студзёнкаўскага сельсавета і сельгаскааператыва, на аўтадарозе Сянно—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 44 двары, 166 жыхароў. У 1939 г. у яе сселены жыхары хутара Жардукова. Працаваў калгас "Парыжская камуна". У Вялікую Айчынную вайну загінула 280 ураджэнцаў сельсавета, з іх 183 не вярнуліся з фронту. Мае малочна-мясны напрамак вытворчасці, займаецца льнаводствам, 1531 га сельгасугоддзяў, 1045 га ворыва. Ёсць малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні і адкорму буйной рагатай жывёлы, сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб, бібліятэка. Помнік на ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза М. А. Аніскіна, які загінуў 25.6.1944 г. пры разгроме калоны нямецка-фашысцкіх войск каля в. Студзёнка. Недалёка, на паўночны ўсход ад вёскі, знаходзіцца курганны могільнік.

СТУДЗЯНЕЦ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 3 двары, 4 жыхары.

СТЭЦАВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 45 жыхароў. На пачатку XX ст. побач быў фальварак Стэцава, належаў двараніну Гаеўскаму, 75 дзес. зямлі. На пачатак 1967 г. у калгасе "Ясная зара". Радзіма дзяржаўнага і партыйнага дзеяча БССР І. А. Шыбекі.

СУКРЭМНА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 61 жыхар. У вёску ў 1939 г. сселены жыхары Масцішчаў, Сасноўкі. Ёсць малочнатаварная ферма, 2 фермы па вырошчванні і ферма па адкорму буйной рагатай жывёлы. Помнікі: 3 курганы, выяўлены ў канцы XIX ст. Е. Р. Раманавым. Радзіма журналіста і краязнаўцы У. Р. Скапы.

СЫЧЫКІ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 27 двароў, 48 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Падворыцкім сельсавеце. Ёсць магазін.

СЫЧЭВА — вёска ў Расненскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Сянно—Някрашава. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 16 жыхароў.

СЯКІРЫНА — вёска ў Расненскім сельсавеце, на р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 3 двары, 3 жыхары. На пачатку XX ст. побач былі аднайменныя прыватныя сядзібы Б. Плавінскага і А. Мітэ. У 1939 г. сюды сселены жыхары хутароў Сякірына і Красноўшчына.

СЯРГЕЙКІ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на дарозе Вялікі Азярэцк—Уздорнікі. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 22 жыхары. У 1939 г. сюды сселены жыхары хутароў Лазовічы, Ліпкі, Яноўшчына. Ёсць малочнатаварная ферма.

ТУРАВА — вёска ў Багданаўскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Запруддзе—Сянно. На 1.1.2003 г. 50 двароў, 95 жыхароў. На пачатку XX ст. маёнтак, належаў двараніну З. Клачкоўскаму. Ёсць малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ТУР'ЕВА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 23 двары, 43 жыхары. На пачатку XX ст. у Какоўчынскай воласці, з 20.8.1924 г. у Сідорніцкім сельсавеце Багушэўскага раёна, з 8.7.1931 г. у Сенненскім раёне. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутароў Брунькі, Дзярожычына, Тур'ева, Узгор'е, Юзэфполле, Анеліна. Фермы: па адкорму буйной рагатай жывёлы і малочнатаварная.

ТУХІНКА — вёска ў Багданаўскім сельсавеце, на возеры Тухінскае. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 43 жыхары. У 1536 г. пад час вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ (1534—1537) войскі князя Барыса Гарбатага захапілі Сянно і наваколле. На пачатку XX ст. побач была сядзіба Тухінка, належала двараніну М. В. Бржастоўскаму. У 1933 г. працаваў калгас "Тухінка".

ТЫЛЬЦЫ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 5 жыхароў. У 1967 г. электрыфікавана.

УГЛЫ — вёска ў Обальскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 9 жыхароў. 29.11.1905 г. жыхары вёскі ўдзельнічалі ў рэвалюцыйнай акцыі супраць памешчыка Абядзерскага, уладальніка маёнтка Канстантова. У 1939 г. сюды сселены жыхары в. Углы-1.

УДАРНАЯ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце (да 1964 г. в. Карнілавічы). На 1.1.2003 г. 8 двароў, 11 жыхароў.

УЗДОРНІКІ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце. На 1.1.2000 г. 4 двары, 6 жыхароў. 7.9.1899 г. сяляне прынялі ўдзел у выступленнях супраць уладальніка маёнтка Ванькава Альгерда Багушэўскага. У тэлеграме міністру ўнутраных спраў гаварылася, што сяляне паляць лес, спустошылі поле і луг, свіран, самавольна засеялі палеткі. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хут. Садкі.

УЛЬЯНАВІЧЫ — вёска, цэнтр Ульянавіцкага сельсавета і сельгаскааператыва. Знаходзіцца на захадзе ад Сянна, на шашы Сянно—Чашнікі. На 1.1.2003 г. 154 двары, 400 жыхароў. Вядома з 1545 г. як мястэчка ў складзе маёнтка Беліца. З канца XVI ст. у Аршанскім павеце. Паводле інвентара 1685 г. фальварак у складзе маёнтка Беліца, уласнасць М. І. Сапегі. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. тут базіраваўся атрад шляхты, што дзейнічаў у тыле рускіх войскаў. Разгромлены атрадам маскоўскіх стральцоў пад камандай Васіля Пушачнікава (1658). З 1772 г. у Сенненскім павеце Магілёўскай губерні, з 1796 г. у Беларускай, з 1892 г. зноў у Магілёўскай губерняў, цэнтр воласці. У 1880-я гг. валасное праўленне, праваслаўная царква, школа.

17.9.1918 г. у час сходу членаў камітэтаў вясковай беднаты ворагі Савецкай улады ўзарвалі бомбу пад будынкам валвыканкома, былі параненыя 9 чалавек. З 15.2.1923 г. у Бачэйкаўскім павеце. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Сенненскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 330 жыхароў сельсавета, з іх 249 не вярнуліся з фронту.

Кааператыў спецыялізуецца на вытворчасці малочна-мясной прадукцыі, развіта льнаводства. Мае 2284 га сельгасугоддзяў, 1599 га ворыва. Ёсць рамонтная майстэрня, машынны двор, малочнатаварная ферма, 2 фермы па адкорму буйной рагатай жывёлы, участковая бальніца, аддзяленне сувязі, АТС, сярэдняя школа, магазін, Дом культуры, бібліятэка. Помнік на брацкай магіле 57 савецкіх воінаў і партызан. Каля ўсходняй ускраіны вёскі — курганны могільнік. Радзіма Героя Савецкага Саюза С. А. Каваленкі.

УТРЫЛАВА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце, на р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 9 двароў, 11 жыхароў. На пачатку XX ст. маёнтак належаў памешчыку Е. М. Каралько. У 1933 г. тут існаваў калгас "Утрылава", быў вадзяны млын (дарэвалюцыйны), кузня. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хут. Касцёлава. Помнік на брацкай магіле 52 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Абеліск на ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава і яго баявых таварышаў.

ФІЛЁВА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, на р. Серакаротня. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 30 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары хут. Бурдзялі.

ФУРМАНЫ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 11 жыхароў.

ХАМЁНКІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце на шашы Сянно—Багушэўск. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 10 жыхароў. Упамінаецца ў 1665 г. у інвентары маёнтка Нямойта як сяло. У 1939 г. сюды сселены жыхары з хутароў Алькоўка і Семяніца. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска адбудавана. Радзіма вучонага Д. Дз. Буцынава.

ХАРЭЎШЧЫНА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 29 жыхароў.

ХОДАРАЎКА — вёска ў Обальскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 22 двары, 30 жыхароў. Працуюць ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, малочнатаварная ферма.

ХОДАСЫ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 9 двароў, 10 жыхароў. У 1939 г. сюды былі сселены жыхары в. Юркава.

ХОДЦЫ — вёска, цэнтр Ходцаўскага сельсавета. Знаходзіцца на паўночны ўсход ад Сянна, на беразе аднайменнага возера, на шашы Сянно—Віцебск. На 1.1.2003 г. 168 двароў, 397 жыхароў. Вядома з паловы XVI ст. у Віцебскім павеце Віцебскага ваяводства ВКЛ. У 1880-я гг. сяло ў Латыгальскай воласці, праваслаўная Пакроўская царква, вінакурны завод, паравы млын, народнае вучылішча (1869). На пачатку XX ст. у маёнтку Ходцы, які належаў Рэнтэльну. Тут вялася інтэнсіўная гаспадарка са шматпольным севазваротам, меўся паравы млын з крупарушкай, крухмальны завод (1906), лесапільня. У 1900—1913 гг. у маёнтку дзейнічала суконная фабрыка, у 1913 г. было 115 рабочых, выраблена прадукцыі на 100 тыс. рублёў. У Вялікую Айчынную вайну загінула 600 жыхароў сельсавета, з іх 386 не вярнуліся з фронту.

Працуюць машынны двор з майстэрняй, сярэдняя школа, урачэбная амбулаторыя, дзіцячая музычная школа, дзіцячы садок, 2 магазіны, аптэка, Дом культуры, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання. Помнік на брацкай магіле — 56 воінаў і партызан. На заходняй ускраіне сучасных могілак курганны могільнік.

ХАМІНІЧЫ — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 5 жыхароў. Паводле інвентара за 1665 г. уваходзіла ў маёнтак Палонна. На пачатку XX ст. ў Расненскай воласці. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана. Ёсць ферма буйной рагатай жывёлы.

ЦЕЛЯШОЎШЧЫНА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 14 жыхароў.

ЦЕПЛЯКІ — вёска ў Обальскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў. Упамінаецца ў 1591 г. пры падзеле маёнткаў І. І. Сапегі паміж яго сынамі, як вёска Цеплакі, якая адышла ва ўласнасць Рыгора Сапегі. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было 30 двароў, 64 жыхары. У жніўні 1943 г. карнікі спалілі 25 двароў, забілі 16 жыхароў. Пасля вайны аднавіў работу калгас "Чырвоная Зорка".

ЦІМІРАЗЕВА — вёска ў Нямойтаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 8 жыхароў. На паўночнай ускраіне вёскі, часткова на агародах, полі і лузе знаходзіцца курганны могільнік. Мясцовая назва Французскія магілы.

ЦЫГАНКІ — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце, на возеры Бярозаўскае. На 1.1.2003 г. 40 двароў, 95 жыхароў. Працуе пачатковая школа.

ЦЫПКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце на р. Пясочанка. На 1.1.2003 г. 278 двароў, 758 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Серакаратнянскай воласці Аршанскага павета Магілёўскай губерні, з 20.8.1924 г. у Багушэўскім сельсавеце Багушэўскага раёна Аршанскай акругі. У 1939 г. сюды сселены жыхары вёсак Пецькі, Цыпкаўскі Млын. Працуюць магазін, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, бібліятэка.

ЦЯСІШЧА — вёска ў Расненскім сельсавеце, на шашы Сянно—Някрашава. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 21 жыхар.

ЦЯСЫ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 68 двароў, 160 жыхароў.

ЧАРАЎКІ — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 13 жыхароў.

ЧУДНЯ — вёска ў Обальскім сельсавеце, на р. Чудзінка. На 1.1.2003 г. 23 двары, 36 жыхароў. Вядома з 2-й палавіны XVI ст. як сяло ў Віцебскім ваяводстве ВКЛ. Пасля Вялікай Айчыннай вайны адбудавана. Ёсць малочнатаварная ферма, магазін.

ЧУЦЬКІ — вёска ў Расненскім сельсавеце, на нашы Сянно—Орша. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 33 жыхары. Ёсць малочнатаварная ферма.

ЧЫРВОНАЕ СЯЛО — вёска ў Беліцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 39 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Расненскай воласці, 20.8.1924 г. у Расненскім сельсавеце Сенненскага раёна. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хут. Зыбалаўка. Працуе малочнатаварная ферма.

ЧЫРВОНАЯ ЛУКА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 25 жыхароў. На пачатку XX ст. фальварак, уласнасць дваранкі З. Клачкоўскай. Да 1941 г. працаваў ветраны млын. Курганны могільнік (мясцовая назва "Французскія магілы") вядомы з 1873 г.

ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 3 двары, 5 жыхароў.

ШАЛУХІ — вёска ва Ульянавіцкім сельсавеце, на шашы Сянно—Полымя. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 36 жыхароў.

ШЫЦЯНІ — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 24 двары, 35 жыхароў.

ШАШАЛЫ — вёска ў Багданаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 9 двароў, 12 жыхароў.

ШУПЛЯКІ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 6 жыхароў. У 1939 г. у вёску сселены жыхары в. Пікава.

ШЧЫТОЎКА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 19 жыхароў.

ШЧЫТНІКІ — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 12 жыхароў.

ШЫЛЫ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 23 жыхары.

ШЫНКАВА — вёска ў Алексініцкім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва, на правым беразе р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 31 двор, 82 жыхары. Фермы малочнатаварная, 2 па дарошчванні, 1 па адкорму буйной рагатай жывёлы, базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, сельскі клуб, аддзяленне сувязі. Побач з вёскай курганны могільнік.

ШЫПЫ — вёска ў Алексініцкім сельсавеце, на р. Абалянка. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 13 жыхароў. На пачатку XX ст. побач быў фальварак, які належаў дваранцы Э. Шыдлоўскай. Да пачатку XX ст. намаганнямі прадвадзіцеля павятовага дваранства ў вёсцы было адчынена і працавала народнае вучылішча. У 1939 г. у вёску сселены жыхары хутара Кубічына. Пасля вайны адбудавана. Ёсць малочнатаварная ферма.

ШЫРКАЎШЧЫНА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на р. Адроўка, на дарозе Какоўчына—Шыркаўшчына. На 1.1.2003 г. 1 двор, 2 жыхары.

ШЫРКІ — вёска ў Багушэўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 24 жыхары. У 1939 г. сюды сселены жыхары вёсак Ланды, Ліпка. Працуе малочнатаварная ферма. Радзіма Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы П. М. Машэрава.

ШЭМЕТАЎКА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 28 жыхароў. У 1939 г. сюды сселены жыхары населеных пунктаў Бураўцы, Лісы.

ЯКУБОВА — вёска ў Ходцаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 6 жыхароў.

ЯНОВА — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Багушэўск—Какоўчына. На 1.1.2003 г. 320 двароў, 720 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска ў Расненскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. З 1835 г. паблізу вёскі дзейнічала прадпрыемства па вырабу шкла, у 1906 г. працавала сыраварня. Побач быў аднайменны маёнтак памешчыка Сульшынскага, у якім 4.12.1905 г. адбываліся сялянскія хваляванні. З 15.2.1923 г. у Вялікасельскай воласці Аршанскага павета, з 20.9.1924 г. у Сідорніцкім сельсавеце Багушэўскага раёна. У 1939 г. у Будскім сельсавеце. Сюды сселены жыхары хутароў Нярэйша, Янова, пасёлка Янова. Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў аднавіў работу калгас "Пяцігодка ў чатыры гады", працавала пачатковая школа. Пазней тут быў створаны апорны пункт Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута спіртавой прамысловасці (з кастрычніка 1956 г. — доследная гаспадарка). З 1960 г. цэнтр саўгаса "Янова". Працуюць спіртзавод, 2 фермы па адкорму буйной рагатай жывёлы, участковая бальніца, аптэка, сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання, аддзяленне сувязі, АТС. Помнік на брацкай магіле 39 савецкіх воінаў і партызан, што загінулі ў 1943—1944 гг.

ЯНОЎШЧЫНА — вёска ў Багушэўскім сельсавеце, каля р. Пясочанка. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 17 жыхароў.

ЯРОШКІ — вёска ў Обальскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Канстантова—Машканы. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 26 жыхароў. Працуюць малочнатаварная ферма, ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ЯХІМОЎШЧЫНА — вёска ў Студзёнкаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 12 жыхароў.

В. М. Удальцоў.

Асноўныя скарачэнні, прынятыя ў кнізе

абр — артылерыйская брыгада
абс (обс) — асобны батальён сувязі
авд — авіяцыйная дывізія
авіяц. — авіяцыйны
авп — авіяцыйны полк
ад — артылерыйская дывізія
аддз. (отд.) — аддзяленне
азсп — асобны запасны стралковы полк
аінжб — армейскі інжынерны батальён
амарсбр (оморсбр) — асобная марская стралковая брыгада
амедсб (омедсб) — асобны медыка-санітарны батальён
амцб — асобны матацыклетны батальён
амцп — асобны матацыклетны полк
ап — артылерыйскі полк
апс (опс) — асобны полк сувязі
арад — асобная разведвальная дывізія
арб — асобны разведвальны батальён
арс (орс) — асобная рота сувязі
арт. — артылерыйскі
асапб (осапб) — асобны сапёрны батальён
асоб. (отд.) — асобны (отдельный)
асбр (осбр) — асобная сапёрная брыгада
атбр — асобная танкавая брыгада
аўтб (автб) — аўтамабільны батальён
аўтбр (автбр) — аўтамабільная брыгада
аўтп (автп) — аўтамабільны полк
баа (бао) — батальён аэрадромнага абслугоўвання
бад — бамбардзіровачная авіяцыйная дывізія
бап — бамбардзіровачны авіяцыйны полк
бат. — батальён
бр. — брыгада
в. (д) — вёска
ваяв. (воев.) — ваяводства
ВМП — вышэйшая мера пакарання
вобл. (обл.) — вобласць
воп. (оп.) — вопіс
г. — год, горад.
габр — гаўбічная артылерыйская брыгада
гап — гаўбічны артылерыйскі полк
гв. — гвардыі, гвардзейскі
гл. (см.) — глядзі (смотри)
г.п. — гарадскі пасёлак
дбап — далёкабамбардзіровачны авіяцыйны полк
ДнВФл — Дняпроўская ваенная флатылія
драп — далёкаразведвальны авіяцыйны полк
дыв. (див). — дывізія
зенад — зенітная артылерыйская дывізія
зенадн — зенітны артылерыйскі дывізіён
зенап — зенітны артылерыйскі полк
знішч. (истреб.) — знішчальны (истребительный)
зптабр (иптабр) — знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада
зптадн — знішчальны процітанкавы артылерыйскі дывізіён
зптап (иптап) — знішчальны процітанкавы артылерыйскі полк
зсп — запасны стралковы полк
інж. (инж.) — інжынерны
інш. — іншых
ісапб — інжынерна-сапёрны батальён
ісапбр — інжынерна-сапёрная брыгада
кав. — кавалерыйскі
кам. аддз. (ком. отд.) — камандзір аддзялення
кап. — капітан
кап — карпусны артылерыйскі полк
кд — кавалерыйская дывізія
кк — кавалерыйскі корпус

кп — кавалерыйскі полк
л. — ліст
лейт. — лейтэнант
лкп — лёгкі кавалерыйскі полк
м. — мястэчка
мал. (мл.) — малодшы
мбр — механізаваная брыгада
медсб — медыка-санітарны батальён
мінп — мінамётны полк
мінбр — мінамётная брыгада
міндн — мінамётны дывізіён
мк — матарызаваны корпус
мп — матарызаваны полк
мсбр — мотастралковая брыгада
мсп — мотастралковы полк
мтад — міна-тарпедная авіяцыйная дывізія
мтап — міна-тарпедны авіяцыйны полк
мцп — матацыклетны полк
н. (р.) — нарадзіўся
н. п. — населены пункт
падпалк. (подполк.) — падпалкоўнік
палк. (полк.) — палкоўнік
памбр — пантонна-маставая брыгада
памп — пантонна-маставы полк
пас. (пос.) — пасёлак
пдд (вдд) — паветрана-дэсантная дывізія
пдсп (вдсп) — паветрана-дэсантны стралковы полк
п/п — палявая пошта
ппл — папраўча-працоўны лагер
рад. (ряд.) — радавы
развед. — разведвальны
р-н — раён
рап — разведвальны авіяцыйны полк
ру — разведвальны ўзвод
с. — сяло
с. — старонка
с/с — сельсавет
сан. — санітарны
сап. — самаходны артылерыйскі полк
сбр — стралковая брыгада
сд — стралковая дывізія
ск — стралковы корпус
сп — стралковы полк
спр. — справа
ст. — старшы, станцыя, станіца, стагоддзе (стагоддзі)
старш. — старшына
стралк. — стралковы
сярж. (серж.) — сяржант
т. — том
танк. — танкавы
тб — танкавы батальён
тбр — танкавая брыгада
тд — танкавая дывізія
тк — танкавы корпус
тп — танкавы полк
тыс. — тысяча
ф. — фонд
хут. — хутар
цсап (тсап) — цяжкі самаходны полк
цтп (ттп) — цяжкі танкавы полк
штурм. — штурмавы
шад — штурмавая авіяцыйная дывізія
шап — штурмавы авіяцыйны полк
яфр. (ефр.) — яфрэйтар

ЗМЕСТ

Да чытача 17
Сенненскі раён 18
Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел 19
Населеныя пункты раёна, якія зараз не існуюць 19
Прырода Сенненшчыны 21

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ—1917

Зямля нашых продкаў 27
Сляды сівой даўніны 27
Помнікі археалогіі 34
У складзе Полацкага княства 36
У складзе Вялікага княства Літоўскага 37
У складзе Рэчы Паспалітай 39
У складзе Расійскай імперыі (да 1861 г.) 42
Дакументы сведчаць 45
У парэформенны час 49
Дакументы сведчаць 57
Сялянскі рух на Сенненшчыне 59
Дакументы сведчаць 60
Выбары ў Думу 63
ЯНЫ НАРАДЗІЛІСЯ НА СЕННЕНШЧЫНЕ 64
Патрыёт і краязнавец 64
Беларускі скульптар 66
Вызначаўся паэтычным талентам 66
Сацыёлаг, правазнаўца, грамадскі дзеяч 67
ЗВЯЗАНЫ ЛЁСАМ 68
Акадэмік В. М. Севяргін у Сянне 70
Зямны і апошні прытулак паэта 70
Этнограф, фальклярыст, археолаг 71
Яны былі на Сенненшчыне 72

1917—1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Шляхам барацьбы і выпрабаванняў 73
Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны 81
Матрос з "Аўроры" 84
Хадок да Леніна 84
На франтах грамадзянскай 85
Леваэсэраўскі мяцеж у Сянне 86
За народную справу 87
Селянін, марак, рабочы 88
Здзейсненае жаданне 88
Выказвалі волю народа 89
Камбеды на вёсцы 91
Першыя суботнікі 92
Сустрэча з М. І. Калініным 93
Прыфрантавы рэўком 93
Дакументы сведчаць 94
Камсамольцы дваццатых 94
Камунары з Баравікоў 95
Дакументы сведчаць 97
Пайшлі паязды 102
Першая канферэнцыя жанчын-калгасніц 103
Іскры "Факела" 104
Аб чым пісала раённая газета "Камунар" 105
Вернутыя імёны 106
Ваяваў на Халхін-Голе 124
Ураджэнцы Сенненскага раёна, якія загінулі ў час баявых дзеянняў на возеры Хасан, на р. Халхін-Гол, а таксама пры вызваленні Заходняй Беларусі 125
Ураджэнцы Сенненскага раёна, якія загінулі на савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гг. 125

Змест

1941—1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

153-я стралковая дывізія ў баях на Сенненшчыне . . . 137
Імя яго невядома . . . 138
Мой першы бой — ён цяжкі самы . . . 138
Да апошняга снарада . . . 140
У баях за Сянно . . . 141
Лячылі і ратавалі . . . 141
За родную зямлю . . . 142
Дакументы сведчаць . . . 144
Акупацыя: рэжым гвалту і здзекаў . . . 149
Дакументы сведчаць . . . 153
Трагедыя вёскі Прыветак . . . 155
Лічбы на сэрцы . . . 156
Вёскі Сенненшчыны, знішчаныя фашысцкімі захопнікамі . . . 157
Абагульненыя звесткі аб ахвярах фашызму па Багушэўскаму раёну . . . 159
Акт раённай камісіі аб выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі былога Багушэўскага раёна . . . 160
Дакументы абвінавачваюць . . . 161
Падпольны і партызанскі рух . . . 162
Палала зямля Багушэўская . . . 166
Райком партыі аднавіў сваю работу ў падполлі . . . 170
Напярэдадні жаркіх баёў . . . 175
Камсамольскае падполле . . . 177
Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на Сенненшчыне . . . 179
Спачатку нас было 14, потым стала амаль 2000 . . . 226
Апошні бой . . . 231
Лёнька-карачаевец . . . 233
Свая зямля давала сілу . . . 234
Назвалі гармату "Марфутай" . . . 240
І лячылі, і ваявалі... . . . 240
Партызаніла ўся сям'я . . . 241
Баявая вахта разведчыкаў-лявонаўцаў . . . 242
Камандзір атрада . . . 244
Разгром гарнізона ў Лукомлі . . . 245
Мы — падрыўнікі . . . 246
Камбрыг Васіль Комлеў . . . 247
"Паміраю, але не здаюся!" . . . 248
Радыстка Тамара . . . 249
Слова, якое чакалі . . . 249
Не заўсёды спадарожнічала нам удача . . . 254
Самалёты вярнуліся на базу са спазненнем на суткі . . . 255
Шпіталь на вадзе . . . 256
Партызанскі ансамбль . . . 258
Партызанскія танкі . . . 259
16-я партызанская брыгада на Сенненшчыне . . . 260
Дакументы сведчаць . . . 264
Вызваленне . . . 282
Баі за Багушэўск . . . 287
Палкоўнік Аляксандр Данілавіч Чарняхоўскі . . . 289
Лёс камандзіра . . . 289
Дакументы сведчаць . . . 290
Героі-вызваліцелі . . . 292
Яны нарадзіліся на Сенненшчыне . . . 294
Прамой наводкай . . . 301
Лісты з фронту . . . 302
Устаноўленыя імёны . . . 303
Клуб "Памяць" . . . 303
Дакументы сведчаць . . . 304
Толькі два эпізоды . . . 305
Удзельнікі парада Перамогі . . . 306
Яны прайшлі дарогамі вайны . . . 306

Змест

АХВЯРЫ ВАЙНЫ 327
Воіны Чырвонай Арміі і партызаны — ураджэнцы іншых мясцін, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры абароне і вызваленні Сенненскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі 327
Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны 349
Партызаны, падпольшчыкі, асобы, якія садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю, члены іх сем'яў і мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору 465
Мірныя жыхары яўрэйскай нацыянальнасці — ураджэнцы Сенненшчыны, расстраляныя фашыстамі 30 і 31 снежня 1941 г. і пахаваныя каля вёскі Казлоўка 502

1945 — ДА НАШЫХ ДЗЁН

Гады аднаўлення і стварэння 505
Дакументы сведчаць 512
Раённая газета паведамляла 513
Цуран — прозвішча слаўнае 517
Ганаровы чыгуначнік 518
Праз гады і войны 518
Ад бровара — да сучаснага прадпрыемства 520
Багушэўская мэбля 521
Старэйшая школа раёна 521
Мацярынскае сэрца 522
ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ПРАЦАЙ 524
Героі Сацыялістычнай Працы 524
Атрымалі высокія ўрадавыя ўзнагароды 525
Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь 531
ЯНЫ НАРАДЗІЛІСЯ НА СЕННЕНШЧЫНЕ 537
Вайскоўцы 537
Вучоныя 538
Партыйныя і дзяржаўныя дзеячы 542
Ганарымся сваім земляком 545
Творцы 546
ЗВЯЗАНЫ ЛЁСАМ 553
Яны ўзначальвалі раён 555
Старшыні Сенненскага райвыканкома 555
Першыя сакратары Сенненскага райкома партыі 555
Старшыні Багушэўскага райвыканкома 556
Першыя сакратары Багушэўскага райкома партыі 556
ЯНЫ БЫЛІ НА СЕННЕНШЧЫНЕ 557
Верныя воінскаму абавязку 557
Ваеннаслужачыя — ураджэнцы Сенненскага раёна, якія загінулі ў час праходжання службы ў Савецкай Арміі ў пасляваенны перыяд 558
Яны выконвалі інтэрнацыянальны абавязак 558
Ніколі не згладзіцца ў памяці 560
Загінулі ў Афганістане 561
ФІЗКУЛЬТУРНЫ І СПАРТЫЎНЫ РУХ 562
Асілак з Сенненшчыны 565
"Шчаслівы талісман" беларускай каманды 565
Раённая газета паведамляла 566
Сенненшчына сёння 569
З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ 571
Народныя традыцыі і звычаі 571
Ярыла — Юрай 574
Пра што расказваюць узоры 575
Сенненскі строй 576
Народныя мастацкія калектывы Сенненшчыны 576
Душа Багушэўскага народнага 578
Квартэт Кавалёвых 579
Захапленне музыкай 579
Музеі раёна 580
Нястомны краязнаўца 583
З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ 584
АСНОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ Ў КНІЗЕ 610

У зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі "Памяць. Сенненскі раён" прымалі ўдзел:

Дактары гістарычных навук В. К. БАНДАРЧЫК, А. І. ЗАЛЕСКІ, С. С. ЛУКАШОЎ, Э. М. САВІЦКІ, А. М. САМСОНАЎ, кандыдаты гістарычных навук Ул. Д. БУДЗЬКО, Б. Д. ДАЎГАТОВІЧ, Э. А. КАРНІЛОВІЧ, В. Р. ФЕДАРАСАВА, доктар фізіка-матэматычных навук В. П. ГРЫБКОЎСКІ, доктар мастацтвазнаўства Л. Н. ДРОБАЎ, доктар філасофскіх навук М. М. ТАРАТКЕВІЧ, навукоўцы І. М. КАРАНЕЎСКАЯ, В. М. УДАЛЬЦОЎ, журналісты М. М. АСТАПЧЫК, М. БАЗАРЭВІЧ, М. В. БЯЛОЎ, В. ВЕРАС, П. І. ЕРМАШКЕВІЧ, М. А. КРЫЖАНОЎСКІ, Л. С. КРЫШТОПЕНКА, І. Е. ЛАЗУКА, Дз. М. МАРЧАНКА, А. ПАНКРАТАВА, Н. В. ПАЎЛОЎСКАЯ, Ул. Р. СКАПА, А. І. СТУК, Л. СУЗІН; супрацоўнікі архіва Ул. П. КАХАНКА, А. КУТУЗАЎ, А. САВОСІНА; настаўнікі З. БАРАНОЎСКАЯ, Л. А. КАЗЛОЎ, Л. Л. КАЗЛОЎ, Х. А. КУЛІЕЎ, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Я. М. УСЦІНОВІЧ; ваеннаслужачыя генерал-маёр А. М. БЫКАЎ, падпалкоўнік А. В. САПЯЖЫНСКІ, маёр Я. КРАМАРЭНКА.

Прадстаўнікі грамадскасці Сенненскага раёна, якія прымалі актыўны ўдзел у пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць. Сенненскі раён":
К. А. АСІПОВІЧ, П. Л. БАБАК, Т. А. БАЛТОВІЧ, В. В. БАНДАРЭВІЧ, А. П. БЕЛЬСКАЯ, А. У. БЕЛЯШОЎ, Ул. І. БЯЛЯЦКІ, С. В. ВАСІЛЁНАК, С. Д. ВЯРЦІНСКАЯ, В. А. ДЗЕГАЛЕВІЧ, Л. П. ДЗЯНІСАВА, А. П. ЗАЙКО, В. І. ЗЭЛЬМАН, В. А. ІВАШКОВА, Н. Я. КАМАНДЫШКА, М. І. КАРПОВІЧ, Г. В. КУЗНЯЦОВА, А. Ф. КУРС, Л. В. КУЧЫНСКАЯ, А. М. ЛАВІЦКІ, С. С. МЯЦЕЛІЦА, Н. Р. ПАЛІШЧУК, А. Я. УСЦІНОВІЧ, А. В. ШАФРАНСКАЯ, Г. А. ШЫДЛОЎСКАЯ, А. П. ШЫШКІН.

Раённая камісія з удзячнасцю адзначае вялікую працу супрацоўнікаў арганізацыйна-метадычнага цэнтра Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь па пошуку архіўных дакументаў, апрацоўцы матэрыялаў.

Фота: П. І. Ермашкевіч, А. В. Кушнер (слайды), з школьных музеяў і асабістых архіваў.

П 15 **Памяць:** Гіст.-дакум. хроніка Сенненскага раёна.— Мн.: ПК "Паліграфафармленне", 2003. — 616 с.: іл.

ISBN 985-6351-18-9

У кнізе асвятляецца гісторыя Сенненшчыны ад старажытнасці да нашых дзён. У хроніку ўключаны гістарычныя і бяграфічныя нарысы, артыкулы пра цікавыя падзеі, што адбываліся тут, пра знакамітых людзей, якія былі звязаны лёсам з гэтым кутком Беларусі. Выкарыстаны шматлікія дакументы і матэрыялы з архіўных і друкаваных крыніц, газетныя публікацыі розных гадоў, успаміны непасрэдных удзельнікаў падзей.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца спісы партызан, падпольшчыкаў, мірных жыхароў, воінаў Чырвонай Арміі, якія аддалі жыццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ці сталі ахвярамі фашысцкага тэрору, землякоў, якія прайшлі франтавымі дарогамі. Прыводзяцца таксама звесткі пра жыхароў раёна, што сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій. Асобная глава прысвечана матэрыяльнай і духоўнай спадчыне, гісторыі населеных пунктаў.

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)

НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНАЕ ВЫДАННЕ

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна

Рэдактары *З. Г. Дзямешка, Р. А. Чарнаглазава*
Мастацкі рэдактар *А. І. Дрозд*
Тэхнічны рэдактар *Г. М. Раманчук*
Карэктар *Д. П. Зіноўева*

Выданне падрыхтавана на камп'ютэрнай сістэме. Падпісана да друку з арыгінал-макета 9.12.2003. Фармат 70x100 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Кудрашоўская энцыклапедычная. Афсетны друк. Ум.-друк. арк. 49. Ум.-выд. арк. 61,4. Тыраж 3000 экз. Зак. 2999.

Выдавецтва ПК "Паліграфафармленне".
Ліцэнзія ЛВ № 165.
220115, г. Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Друкарня «Перамога». Рэспубліка Беларусь. 222310, г. Маладзечна, вул. В. Таўлая, 11.

ISBN 985-6351-18-9